Рымвідас Пятраўскас

ЛІТОЎСКАЯ ЗНАЦЬ У КАНЦЫ XIV–XV СТ.

СКЛАД - СТРУКТУРА - УЛАДА



Geor Ostyk Rá-
dziwił / Márßa-
łek Nadworny/
Stáro. ná Mere-
czu/tenże Ażkie-
káiá ná Cżárstwo
wsádził Krymskie / 1536. 1440.

Mikołay Rádzi-
wił Ostyk Woie-
wodá Wileński /
Ránclerz Wiel-
kiego X. Litew-
skiego/ 1480.

Mikołay Rádzi-
wił syn tego Wo
iewody Podczáßy
Wielkiego X. Li
tewskiego/ Roku
1499.

Piotr Rádziwił
Ostyk/ Podkomo
czy Wielkiego
X. Litewskiego.
1499.

Gerzy Rádziwił/
Káßtellan Wi-
leński.
1507.

Mikołay Rádzi-
wił Woiew. Wi-
leński / ktory v
Wosnie Tátáry
gromił/z Konstá
tym X. Ostrog-
skim/ 1507.

Mikołay Rádzi-
wił/ ktore° Kro-
mer pißę/ vir illu-
stris & acuti inge-
nij , ktory z nim
w poselstwie do Cesárzá iezdził/1548.
ten sie pisał X. ná Nieswiezu y ná Olice.

Bárbárá Rádzi-
wiłowná Krolá
Polskie° Zygmú-
tá Augustá żoná.

Mikołay Kry-
ßtoff Rádziwił
X. ná Nieświeżu
y Olice/ Márßá-
łek W. Wielkiego

Gerzy Rádziwił
X. ná Nieświeżu
y Olice Biskup
Wileński.
X. Litewskie°.

X P Olbrycht

Рымвідас Пятраўскас

ЛІТОЎСКАЯ ЗНАЦЬ
у канцы XIV—XV ст.

СКЛАД - СТРУКТУРА - УЛАДА

Рымвідас Пятраўскас

ЛІТОЎСКАЯ ЗНАЦЬ
у канцы XIV—XV ст.

СКЛАД - СТРУКТУРА́ - УЛАДА

Смаленск
Інбелкульт
2014

УДК 94(474/476ВКЛ)"13/14"
ББК 63.3 (4Беи), 63.3(4Лит)4
П99

Пятраўскас, Р.

П99 Літоўская знаць у канцы XIV—XV ст.: Склад — структура — улада / Рымвідас Пятраўскас; пераклад з літоўскай мовы Алесь Мікус. — 2-е выд. — Смаленск: Інбелкульт, 2014. — 386 с.

ISBN 978-5-00076-015-4

Праца сучаснага літоўскага гісторыка Рымвідаса Пятраўскага — спроба сінтэзу персанальнай і сацыяльнай гісторыі. З аднаго боку, аўтар імкнецца вызначыць паходжанне літоўскай знаці і паказаць яе генеалагічнае развіццё, а з іншага боку спрабуе раскрыць структурны пералом унутры згаданай знаці, які адбыўся ў XV ст. Абедзве асноўныя праблемы разглядаюцца з улікам досведу еўрапейскай гістарыяграфіі.

УДК 94(474/476ВКЛ)"13/14"
ББК 63.3 (4Беи), 63.3(4Лит)4

Пераклад зроблены паводле выдання: Petrauskas, Rimvydas. Lietuvos diduomenė XIV a. pabaigoje — XV a.: sudėtis — struktūra — valdžia. — Vilnius: Aidai, 2003. — 279, [1] p.

У афармленні першай старонкі вокладкі выкарыстана выява з гербоўніка Барташа Папроцкага «Gniazdo cnoty» (Kraków, 1578).

У афармленні чацвёртай старонкі вокладкі выкарыстана выява генеалагічнага дрэва Казіміра Ягайлавіча з выдання Яна Ласкага «Commune incliti Poloniae regni privilegium constitutionum ed indultuum» (Cracoviae: Johannes Haller, 1506).

ISBN 978-5-00076-015-4

© ТАА «Інбелкульт», 2014
© Рымвідас Пятраўскас, 2014
© Алесь Мікус (пераклад), 2014

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА ДА БЕЛАРУСКАГА ВЫДАННЯ 7

ПРАДМОВА 9

УВОДЗІНЫ 12
Праблема 12
Метады даследавання 25
Гістарыяграфія 27
Крыніцы 44

I. ПАНЯЦЦЕ ЗНАЦІ 51

II. СКЛАД ЗНАЦІ 60
1. Склад эліты ўлады ў канцы XIV—XV ст. 60
а) Сведкі ў гаспадарскіх дакументах 1392—1459 гг.: кантынуітэт эліты ўлады 60
б) Сведкі ў гаспадарскіх дакументах 1460—1492 гг.: кантынуітэт на фоне структурных змен 70
2. Паходжанне знаці эпохі Вітаўта 77
а) Паходжанне знаці канца XIV — пачатку XV ст. 77
б) Геаграфія паходжання знаці 91
3. Праблема «новых людзей» 100

III. СТРУКТУРА ЛІТОЎСКАЙ ЗНАЦІ XV СТ. 105
1. Паняцце роду 105
2. Баярская вотчына 118
3. Памер і структура баярскага землеўладання 127

4. Функцыі роду: сацыяльная стабільнасць,
абарона асобы і памяць 135
5. Жыццё знаці паміж дваром гаспадара і вотчынай 142

IV. УЛАДА ЗНАЦІ 154
1. Ураднікі 154
а) Фармаванне сістэмы ўрадаў 154
б) Вялікі князь і род: падвойная прырода старостваа 161
2. Знаць і ўлада вялікага князя 168
а) Групы знаці канца XIV — пачатку XV ст. 169
б) Знаць у падзеях 1430—1435 гг. 176
в) Забойства Жыгімонта Кейстутавіча і
пачатак панавання Казіміра 182
г) 1447—1492 гг.: кансалідацыя знаці 188
3. Характар улады знаці 195

ЗАКЛЮЧЭННЕ 208

ПРАСАПАГРАФІЯ ЛІТОЎСКАЙ ЗНАЦІ
КАНЦА XIV—XV СТ. (1387—1492) 213

СПІС УРАДНІКАЎ ВКЛ (1387—1492) 320

СКАРАЧЭННІ 338

КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА 339
АСАБОВЫ ПАКАЗАЛЬНІК 367
ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК 382

ПРАДМОВА ДА БЕЛАРУСКАГА ВЫДАННЯ

Апошнім часам даследаванні гісторыі Вялікага Княства Літоўскага перажываюць, бадай, перыяд найбольшага ўздыму. Асабліва інтэнсіўна яны развіваюцца ў краінах, якія традыцыйна ўсведамляюць сябе спадкаемцамі гэтай сярэднявечнай і ранненавачаснай дзяржавы. Павялічваецца колькасць супольных акадэмічных і выдавецкіх ініцыятыў, якія не толькі дазваляюць лепш пазнаёміцца з найноўшымі дасягненнямі іншых нацыянальных гістарыяграфій, але і дапамагаюць стварацъ міжнародную традыцыю даследаванняў Вялікага Княства Літоўскага, якая пераадольвае межы нацыянальных гістарыяграфій. Сучасныя нацыянальныя ўяўленні і паняцці няшмат дапамагаюць зразумець сацыяльнае жыццё людзей дамадэрнага грамадства. Асабліва гэта трэба сказаць пра прадстаўнікоў знаці, ідэнтычнасць якіх была складанаю і пастаянна мянялася. Ад самага пачатку дзяржаўнасці Літвы ў палітычную эліту краю інтэграваліся групы людзей рознага этнічнага паходжання і розных канфесій. Напрыклад, у пачатку XIII ст. літоўскае войска вёў герсіцкі князь Усевалад, ваярамі караля Міндаўга кіраваў Хвал, а знакамітым ураднікам вялікага князя Гедзіміна быў горадзенскі староста Давыд. Спатрэбілася ўсяго толькі адно ці два пакаленні, каб на новым месцы прадстаўнікі знаці змянілі сваю канфесійную і этнічную тоеснасць. Князі Гальшанскія, што паходзілі з глыбіні паганскай Літвы, у XV ст. у Кіеве ўжо трактаваліся як мясцовыя «князі кіеўскія», а Хадкевічы, што паходзілі з праваслаўных зямель, у XVI ст. фіктыўна выводзілі сябе ад «літоўскага» баярына Барэйкі. Даследаванні эліты ўлады выразна паказваюць, што пры фармаванні палітычных груп найзначнейшымі былі крытэрыі роднаснасці і тэрытарыяльныя, а не канфесійныя і нацыянальныя. Разгледжаная ў гэтай кнізе знаць XIV і XV ст. — гэта прадстаўнікі «палітычнай літоўскай нацыі», што нараджалася ў гэты час, яны разам з пануючай дынастыяй Гедзімінавічаў стварылі Вялікае Княства Літоўскае.

З'яўленне перакладу гэтай кнігі важнае і дзеля таго, што немалая частка вотчынных зямель у Вялікім Княстве Літоўскім XV ст. месцілася на тэрыторыі сучаснай Беларусі — у ваколіцах

Ашмянаў, Крэва, Ліды, Наваградка. Жыццё і дзейнасць знаці паміж Вільняй і Геранёнамі, Салечнікамі і Полацкам, Вількамірам і Горадняй, Кернавам і Нясвіжам — гэта цудоўнае сведчанне інтэгральнасці палітычнай прасторы і яе гістарычнай традыцыі. І хоць са спадчыны прадстаўнікоў тагачаснай эліты засталося няшмат, назвы іх маёнткаў нагадваюць пра старыя цэнтры палітычнага і сацыяльнага жыцця.

За ініцыятыву перакласці гэтую кнігу дзякую выдавецтву ARCHE, а за пераклад складанага тэксту — калегу Алесю Мікусу. За час ад з'яўлення кнігі па-літоўску (2003) па гэтай тэме апублікаваныя і новыя даследаванні. Іх вынікі адлюстраваныя ў дапоўненых прасапаграфічным спісе ды спісе ўраднікаў.

Рымвідас Пятраўскас
Вільня, Каляды 2011 г.

ПРАДМОВА

Думка правесці даследаванне знаці ранняй Літвы паўстала падчас семінара Эдвардаса Гудавічуса пра пачатак літоўскай дзяржаўнасці ў 1995 г. Пазнейшыя даследаванні і знаёмства з новымі працамі па гісторыі шляхты дапамаглі выспець гэтай ідэі і заахвоцілі да вывучэння знатных родаў, што ў канцы XIV ст. раптам вынырнулі з ананімнага літоўскага набілітэту паганскіх часоў, а ў XVI ст., акрамя некалькіх выключэнняў, зніклі з гістарычных крыніц і гістарычнай свядомасці. Хоць асноўнай мэтай даследавання было вывучэнне літоўскай знаці XIV—XV ст., больш абстрактны ўзровень гістарычнай памяці/забыцця змусіў пытацца, чаму тыя роды зніклі, а яшчэ важней — чаму яны былі забытыя.

Абароненая на гістарычным факультэце Віленскага ўніверсітэта ў лістападзе 2001 г. дысертацыя стала асновай гэтай манаграфіі. За вялікую падтрымку я ўдзячны праф. Эдвардасу Гудавічусу, які не шкадаваў свайго часу на размовы і кансультацыі. За каштоўныя заўвагі і парады дзякую д-ру Стыфену Роўэлу, праф. Эўгеніі Ульчынайце, праф. Ірэне Валіконіце, праф. Мечыславасу Ючасу, габіл. д-ру Альвідасу Нікжэнтайцісу, д-ру Артурасу Дубонісу, д-ру Айвусу Рагаўскасу, калегам па кафедры старажытнай і сярэднявечнай гісторыі гістарычнага факультэта. Увага супрацоўнікаў выдавецтва «Айдай» суправаджала нас падчас усёй падрыхтоўкі кнігі. Зразумела, што за ўсе недахопы адказвае толькі аўтар.

Асобна хачу падзякаваць супрацоўніцы аддзела міжнародных сувязяў Віленскага ўніверсітэта пані Мілдзе Кайрыце, дзякуючы спрыяльнай дапамозе якой я ажыццяўляў штудыі ў Базельскім і Грайфсвальдскім універсітэтах. Фонду Katolischer Akademischer Ausländer-Dienst я ўдзячны за стыпендыю на стажыроўку ў

берлінскім Свабодным універсітэце і магчымасць працаваць у Таемным архіве культурнай спадчыны Прускай дзяржавы, а фонду Роберта Боша — за стыпендыю на стажыроўку ў Нямецкім інстытуце гісторыі ў Варшаве, падчас якой я мог рабіць даследаванні ў варшаўскім Цэнтральным архіве старажытных актаў.

Накіды гэтай працы абмеркаваныя ў студзені 1999 г. у часе паведамлення ў лейпцыгскім Цэнтры гуманітарнага даследавання гісторыі і культуры Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а таксама ў чэрвені 2000 г. на семінары дактарантаў праф. Кляўса Цэрнака ў Берлінскім універсітэце. Яго ўдзельнікам я таксама ўдзячны за выказаныя заўвагі.

Нарэшце, а па праўдзе найперш, дзякую бацькам, дзякуючы дапамозе якіх гэтая праца агулам стала магчымаю.

Рымвідас Пятраўскас
Вільня, вясна 2013 г.

Gdzie Gasztołtowie, Rekuciowie, Kiesgałowie,
Linicowie, Kościewicowie, Dowojnowie,
Ościkowie, Xiążeta Słuckie, Holsańscy?
Za naszej pamięci domy te wedle świata wielkie,
bohate, zeszły; potomstwą ich nie masz;
periit memoria illorum cum illis...
З мемарыяла канца XVI ст.

УВОДЗІНЫ

ПРАБЛЕМА

Гісторыя XIV—XV ст. у літоўскай гістарычнай свядомасці замацавалася праз вобраз «Літвы князёў». Гэтыя стагоддзі — гэта найперш часы Гедзіміна, Альгерда, Кейстута, Ягайлы, Вітаўта. Часткова такі погляд апраўданы, бо ў Сярэднявеччы манарх атаясамліваўся з самой дзяржавай. Дзяржаву лічылі вотчынай уладара, а ўсіх яе жыхароў — яго падданымі. Гэтая ідэальная тэарэтычная мадэль эпохі ў гістарыяграфіі зрабілася вытлумачальнай канцэпцыяй. Была акрэслена строгая храналагічная мяжа, што адасобіла «першаснае» панаванне вялікіх князёў ад улады знаці, якая толькі пазней ад таго панавання «выбавілася» і яго «дапаўняла». Таму пры даследаванні тагачаснага грамадства ўся ўвага была звернутая на дзейнасць гаспадароў, тым часам гісторыя баяраў, нягледзячы на істотныя асобныя даследаванні, заставалася ў цені прысвечанай князям гістарыяграфіі. Аднак каб адэкватна зразумець сацыяльнае і палітычнае жыццё Сярэднявечча, абавязкова трэба вывучыць групу грамадства, якая, канкуруючы і супрацоўнічаючы з князямі, фармавала парадак жыцця той эпохі. Пры такім падыходзе бачна, што існуе магчымасць зразумець сацыяльную і палітычную гісторыю Сярэднявечча як дуалізм улады манархіі і знаці, улады высакародных (баяраў).

Паняцце пра гісторыю «княскай Літвы» вельмі старое, і, мабыць, я не памылюся, калі скажу, што гэта секулярызаваны варыянт гістарыяграфіі яшчэ той самай сярэднявечнай эпохі, якая гісторыю інтэрпрэтавала як ланцужок поспехаў і параз манархаў. Гэтак паняцце нашай мінуўшчыны ў значнай меры вызначана думкай грамадства (дакладней, часткі яго прадстаўнікоў) мінулай эпохі пра сябе. З аднаго боку, гэта непазбежна, бо іншай думкі ніхто нам не прапануе, аднак замірэнне з гэтай дадзенасцю пагражае аднабаковым трактаваннем рэчаіснасці. Не можа не мець значэння факт, што нашыя веды пра дахрысціянскую Літву абапіраюцца толькі на хронікі чужаземцаў, якія з'яўляюцца цікавай, але разам з тым

і праблемнай крыніцай[1]. У Літве вельмі позна сфармавалася ўласная гістарыяграфічная традыцыя. Тым часам на творы іншаземных аўтараў уплывала існаванне досыць спецыфічных інтарэсаў (найбольш актуальнымі былі ваенныя дзеянні), а таксама абмежаваныя крыніцы інфармацыі. Апісваючы жыццё літоўцаў, яны звычайна згадвалі толькі князёў, іх ваенныя акцыі, міжусобнае змаганне і пад., «выракаючы» на гістарычны нябыт акалічнасці тых падзей ды шматлікіх дзеячаў.

Гэтая крыніцадаследчая рэфлексія дазваляе казаць, што істотная частка мінуўшчыны хавае за тэкстамі хронік ці іх згадкамі тое, што дачыненні ўлады вялікага князя і знаці былі больш складанымі, чым гэта раскрываецца з гаспадарскіх прывілеяў. Яшчэ больш сумненняў узнікае, калі ўявіць сабе ўмовы тагачаснага палітычнага і сацыяльнага жыцця. Князі не маглі абапірацца на яшчэ не сфармаваныя дзяржаўныя структуры і павінны былі самі шукаць выканаўцаў сваёй палітычнай праграмы. Адзінай рэальнай сілай, што магла браць удзел у вырашэнні праблем кіравання, было баярства. Узаемнасць адносінаў князёў і баяраў — гэта заканамерная з'ява ў грамадстве, у якім улада грунтуецца на чалавечых адносінах. Кіраваць мог толькі той, хто меў моцнае заплечча. Пры пастаянным змаганні за ўладу магчымасці таго ці іншага кандыдата залежалі ад сімпатый знаці, якія трэба было і заваяваць, і захаваць. Тэорыя «моцны князь — слабая знаць» з'яўляецца супярэчлівай і не можа патлумачыць механізм ажыццяўлення ўлады.

У гэтым сэнсе даследаванне сацыяльнага і палітычнага становішча знаці XV ст. мае важнае значэнне. З аднаго боку, трэба крытычна даследаваць пануючую ў гістарыяграфіі тэорыю, згодна з якой вярхушка літоўскага баярства толькі каля сярэдзіны XV ст. сфармавала самастойную ўладу. З іншага боку, персанальнае даследаванне літоўскага баярства магчымае толькі з канца XIV ст.

Крыніцы не дазваляюць адэкватна зразумець ролі баяраў у палітычных працэсах XIII—XIV ст. Толькі з канца XIV ст., калі

[1] Пра гістарыяграфію Сярэднявечча гл.: Melville G. Wozu Geschichte schreiben? Stellung und Funktion der Historie im Mittelalter // Theorie der Geschichte. Beiträge zur Historik. Bd. 4: Formen der Geschichtsschreibung / Hrsg. v. R. Koselleck, H. Lutz, J. Rüsen. München, 1982. S. 86—146; Schmale F.-J. Funktion und Formen mittelalterlicher Geschichtsschreibung. Eine Einführung. Darmstadt, 1985.

пісьмовая культура дасягнула літоўскага ўнутранага жыцця, склаўся комплекс крыніц, які некалькі падрабязней адлюстроўвае рэаліі краю. Пачынаючы з гэтага перыяду ў сістэме кіравання адразу робіцца выразным уплыў баяраў. У гістарыяграфіі ўзмацненне баяраў звычайна звязваюць з трыма з'явамі: 1) унія з Польшчай і рэцэпцыя польскіх прававых інстытутаў; 2) новая сацыяльная і палітычная структура, створаная Вітаўтам як процівага ўладзе ўдзельных князёў; 3) змаганне князёў за ўладу ў XV ст. і абумоўленыя гэтым саступкі баярству.

Ланцуг прывілеяў вялікіх князёў, які паступова пашыраў правы баяраў, — гэта асноўны акцэнт такога погляду. Яго сутнаснае прыпушчэнне — наданне асаблівага значэння першаму, 1387 г., прывілею, які ўнёс у літоўскае грамадства новыя паняцці. Гэта быў першы прававы дакумент, што рэгуляваў адносіны вялікага князя і баяраў. Неіснаванне такой рэгламентацыі ў ранейшыя часы, на думку прыхільнікаў гэтай тэорыі, рабіла баяраў проста залежнымі ад волі князя. Аднак гэты погляд не ўлічвае неадпаведнасць прававога статусу і рэальнага сацыяльнага становішча ў тагачасным грамадстве. Бо прывілеі адрасаваліся ўсяму баярству, тым часам уладныя функцыі выконваў толькі верхні яго слой. Тэрміналогія хронік XIV ст., з усімі яе недахопамі, тым не менш, малюе неаднастайную карціну літоўскага баярства (*nobiles, meliores, satrapae* і пад.). Існавала сацыяльная група, што засяродзіла ў сваіх руках асноўныя кіроўныя функцыі (кіраванне ваеннымі атрадамі, замкамі і г.д.).

Прырода ўлады гэтага стану, які я называю знаццю, — найістотнейшая праблема даследавання. Аднак прырода ўлады — гэта абстрактная праблема, яна распадаецца на мноства больш канкрэтных пытанняў. Адно з іх — гэта стабільнасць складу кіроўнай эліты: ці можна казаць, што вялікія князі перыядычна аднаўлялі склад эліты? Ці ёсць адзнакі змагання сацыяльных праслоек, тэндэнцыі пратэжавання сярэдняга і дробнага баярства? Іншая важная праблема — паходжанне прадстаўнікоў знаці часоў Вітаўта: наколькі іх сацыяльнае становішча было вызначана паходжаннем?

Гэтыя пытанні змушаюць ажыццявіць сістэмнае прасапаграфічнае даследаванне, г. зн. разгледзець усіх асоб, якія выконвалі хоць якія ўладныя функцыі. Аднак гэта не

толькі даследаванне персанальнай гісторыі, паколькі важнае значэнне меў не столькі асобны індывід, колькі сацыяльная група, што яго атачала. Таму адна з частак працы прысвячаецца структурам, у якіх пашыралася моц знаці. Неаднастайнасць у слаях імплікавала прыярытэт іншых элементаў сацыяльнай кагерэнцыі ў жыцці людзей. Найперш трэба згадаць супольнасці, сфармаваныя на грунце кроўных сувязяў (роднаснасці). Даследаванне іх значэння ў структуры баярства — адна з асноўных тэм працы. У гістарыяграфіі доўгі час спрачаліся наконт значэння гэтых цяжка вызначальных сацыяльных груп. Родавая структура была сапраўды складанай і зменлівай. Бо аповед пра Кезгайлаў мы пачынаем ад Бушкі, г. зн. ад тых часоў, калі яшчэ не было ніякіх Кезгайлаў. Манівідаў мы сустракаем нават тады, калі род Манівіда вымер. Роды існуюць да свайго «пачатку», і іх гісторыя працягваецца пасля іх смерці. Біялагічная генеалогія людзей пастаянна карэгуецца самасвядомасцю, гэтак узнікаюць і змяняюцца імёны родаў, фіктыўныя традыцыі робяцца жывымі, «сапраўдныя» традыцыі сыходзяць у забыццё. Родавую структуру можна ўхапіць толькі ў канкрэтным моманце гісторыі, таму так важна дэтальна інтэрпрэтаваць нават найдрабнейшыя генеалагічныя факты. Пры такім падыходзе род пазбаўляецца сваёй абстрактнасці і робіцца рэальнай, паслухмянай для гістарычнага аналізу сацыяльнай групай.

Менавіта ў гэткім кантэксце роднаснасці і іншых сацыяльных сувязяў, што дапаўняюць яе, і трэба даследаваць адносіны ўлады вялікага князя і знаці — апошнюю праблему гэтай працы.

Напрыканцы XIV ст. у Літве, на якую ўплываў хрост і унія з Польшчай, адбываліся значныя сацыяльныя, палітычныя, культурныя працэсы. У гэтах працэсах актыўна ўдзельнічала, больш за тое — іх непасрэдна вызначала, знаць. Трэба акрэсліць, у якім сэнсе ў працы выкарыстоўваецца тэрмін «знаць». Гэтае паняцце не зусім тоеснае слову «пан» з крыніц. Разам з тым, гэта і навуковае паняцце, праз выкарыстанне якога можна злучыць у адну групу найбольш уплывовых асоб таго часу. Такое вырашэнне дапамагае больш дакладна абазначыць розныя аспекты сацыяльнага развіцця. Напрыклад, сцвярджэнне пра дробнае землеўладанне бараў у давітаўтавы часы, магчыма, і справядлівае для шырокай баярскай масы, аднак недакладнае, калі гаворка ідзе пра верхні слой баярства. Тэрмін «знаць» у гэ-

тай працы ўжываецца з папраўкай на непазбежнае напружанне, што існуе паміж паняццем з крыніцы і тэрмінам з навуковай мовы. Некалькі забягаючы наперад раздзела, у якім аналізуецца гэтае паняцце, адзначу, што я ўключаю ў яго найбліжэйшых дарадцаў вялікага князя, што выступалі як сведкі ў яго дакументах і бралі ўдзел у пасольствах, а таксама ўраднікаў цэнтральнай і мясцовай улады ды іх родзічаў.

Сацыяльная гісторыя з цяжкасцю мосціць сабе дарогу ў медыявістыцы. Медыявісты, што доўгі час дыктавалі моду ў гістарычнай навуцы, адстаюць ад даследчыкаў Новага часу ў інтэграванні дасягненняў сацыялагічнай навукі. Само сабой зразумела, што да ранейшых грамадстваў цяжэй, чым да Новага часу, непасрэдна дастасаваць сацыялагічныя метады. Але значная не столькі механічная метадалагічная ін'екцыя сацыяльных навук, колькі замацаванне новага погляду на гісторыю, перанясенне акцэнту з інстытуцый на людзей, а дакладней, на групы людзей. Менавіта гэткая, арыентаваная на вывучэнне груп людзей, сацыяльная гісторыя ў наш час з'яўляецца найважнейшай задачай медыявістычных даследаванняў. Аднак істотна адзначыць характар гэтага гістарыяграфічнага павароту. Гэта не вяртанне да старой традыцыйнай біяграфічнай гісторыі людзей, якая звычайна арыентавалася на «вялікіх людзей» ці іх «ідэі». Ужо даўно прыкмечана, што такі погляд празмерна вузкі, аддалены ад гістарычнай рэальнасці, у якой тыя выбітныя людзі жылі. Тым часам група грамадства (шляхецкі род, сялянская супольнасць, рамесніцкі цэх і пад.), у адрозненне ад цяжка ўхапляльных станаў ці класаў, з'яўляецца амаль такой жа рэальнай, як індывід. Але калі даследаванню дзейнасці асобных індывідаў увесь час пагражае небяспека выпусціць з-пад увагі гістарычны кантэкст, дык паняцце групы грамадства ўпаўнаважвае на шырэйшыя сацыяльныя абагульненні[2]. Катэгорыі «станаў» ці «класаў» — гэта феномены «вымысленай» рэчаіснасці (*Otto Gerhard Oexle*), гэта пэўныя кагнітыўныя сродкі, з дапамогай якіх тагачасныя людзі спрабавалі апісаць сваё ўласнае грамадства (напр., тэорыя трох станаў) і дзяку-

[2] Oexle O. G. Soziale Gruppen in der Ständegesellschaft: Lebensformen des Mittelalters und ihre historischen Wirkungen // Die Repräsentation der Gruppen: Texte — Bilder — Objekte / Hrsg. v. O. G. Oexle und A. von Hülsen-Esch. Göttingen, 1998. S. 9—44.

ючы якім цяперашняя навука можа зразумець структуру таго грамадства. Аднак пры даследаванні штодзённых сітуацый, канкрэтных гістарычных выпадкаў гэтыя катэгорыі мала чым дапамагаюць. Таму катэгорыя сацыяльных груп упаўнаважвае на канкрэтызаванне сацыяльнай гісторыі Сярэднявечча.

У гістарыяграфіі Літоўскай Рэспублікі ў першай палове XX ст. сацыяльнай гісторыі па сутнасці не было. У савецкі перыяд сэнс сацыяльнага погляду быў перакручаны, сацыяльны аспект быў рэдукаваны да дыхатаміі «пануючага» і «прыгнечанага» класаў. Гісторыя шляхецкага стану даследавалася толькі як пэўны дадатак пры вывучэнні гісторыі сялянства, як дапаможная дысцыпліна гісторыі сялян. Без сумнення, гісторыкі здолелі неяк больш гнутка апісаць старажытнае літоўскае грамадства, але магчымасцей усебакова яго даследаваць не было. Таму нядзіўна, што ў сучаснай гістарыяграфіі грамадства робіцца адной з найважнейшых праблем даследавання. Гісторыя горада пакрысе робіцца гісторыяй гараджан, гісторыя манастыра — гісторыяй манахаў, гісторыя кнігі — гісторыяй чытачоў, пісьменнікаў, выдаўцоў. Гэтая праца мела б быць унёскам у гістарыяграфію такога кшталту. Вывучэнне гісторыі шляхты — гэта тым больш актуальная праблема, калі мы разумеем, што менавіта гэты стан з'яўляўся сарцавінай сацыяльнага і палітычнага жыцця Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Разам з вывучэннем гісторыі шляхты робяцца больш зразумелымі шмат якія з'явы той эпохі. Шляхта, ці знаць, кіравала адміністрацыйнай структурай краю, займала найвышэйшыя царкоўныя пасады, пашырала сетку парафій, была асноўным замоўцам твораў мастацтва і ўвогуле вызначальнікам культурнага развіцця. У Літве гэтая дзейнасць шляхты зрабілася асабліва выразнай у XVI—XVIII ст. Аднак яе немагчыма належным чынам асэнсаваць без вывучэння ўплываў гэтай сацыяльнай групы. Менавіта ў XV ст. адбываліся працэсы, што вызначылі пазнейшыя формы існавання шляхецкага стану. А разам з тым — і кірунак развіцця ўсёй гісторыі ВКЛ.

Гэтае даследаванне ставіць за мэту раскрыць паходжанне літоўскай знаці, унутраную структуру, перадумовы і характар улады, а таксама перамены ў формах гэтай структуры і ўлады, што адбыліся ў XV ст. Праца палемізуе з пануючай у гістарыяграфіі тэорыяй, якая адносіць генезіс самастойнай ула-

ды літоўскіх баяраў да XV ст. Сітуацыя з крыніцамі вызначыла, што эмпірычнае даследаванне гэтай улады магчымае толькі ад другой паловы XIV ст. Аднак калі браць пад увагу спадчынны характар сацыяльнага становішча знаці, можна зрабіць і больш універсальныя высновы пра сацыяльную структуру дахрысціянскай Літвы.

Гэтая праца — спроба сінтэзу персанальнай і сацыяльнай гісторыі. З аднаго боку, гэта імкненне вызначыць паходжанне літоўскай знаці і паказаць яе генеалагічны кантынуітэт, а з іншага боку, спроба раскрыць структурны пералом унутры знаці, які адбыўся ў XV ст. Вылучыць гэтыя дзве праблемы дазваляе і досвед еўрапейскай гістарыяграфіі. Сацыяльныя змены ў Літве не былі працэсам, ізаляваным ад суседніх краін. Таму важна прадставіць асноўныя кірункі развіцця еўрапейскай шляхты ў эпоху Сярэднявечча.

Калі параўноўваць палітычна-сацыяльную гісторыю літоўскай і еўрапейскай знаці, у вочы кідаецца падабенства пэўных тэндэнцый развіцця. У гістарыяграфіі заходнееўрапейскай шляхты адной з асноўных праблем з'яўляецца захаванне ранняй франкскай знаці ў перыяд кіравання Меравінгаў і Каралінгаў. У цэнтры палемікі апынуліся два пытанні — кантынуітэту знаці і паняцця пра знаць.

Пануючая доўгі час тэорыя сцвярджала, што ў часе аб'яднання дзяржавы вялікая частка старой знаці была знішчаная, а пра шляхту (ням. *Adel*, фр. *noblesse*, анг. *nobility*) у сапраўдным сэнсе гэтага слова (як пра спадчыннае сацыяльнае становішча) можна казаць толькі пачынаючы з рэформаў, што адбыліся ў эпоху Высокага Сярэднявечча. Найбольш уражліва тэорыя шляхецкай рэформы была развіта ў працах французскага медыявіста Марка Блока і нямецкага даследчыка Герда Тыленбаха. Абодва навукоўцы даследавалі розныя аспекты гэтай праблемы і з розных метадалагічных пазіцый.

Адзін з пачынальнікаў «структурнай медыявістыкі» Блок прапанаваў дыстынкцыю шляхты, як катэгорый *classe de fait* і *classe juridique*, і быў схільны казаць пра шляхту ў прававым

сэнсе толькі ад мяжы Высокага Сярэднявечча (XI—XII ст.)[3]. Тым часам Тыленбах, грунтуючыся на сваіх даследаваннях персанальнай гісторыі, датаваў вызначальную сацыяльную рэформу эпохай Каралінгаў. У яго атрымалася вылучыць у франкскай арыстакратыі часоў Каралінгаў групу «імперскай шляхты/арыстакратыі» (*Reichsadel, Reichsaristokratie*)[4]. Гэтая шляхта, што сфармавалася ў ядры франкскай дзяржавы, была асноўнай апорай дынастыі Каралінгаў і папярэдніцай будучых арыстакратычных родаў дзяржаў французаў і немцаў[5]. Дарэчы, традыцыя гэтых двух даследчыкаў моцна паўздзейнічала на кірунке нямецкай і французскай шляхецкай гістарыяграфіі, якія толькі зусім нядаўна, з узмацненнем інтэрнацыяналізацыі гістарычнай навукі, пачалі перакрыжоўвацца.

У працах нямецкіх даследчыкаў вялікая ўвага надавалася ранняй шляхецкай гісторыі. Даследаванні Карла Фердынанда Вернера, Франца Ірзіглера і Вільгельма Шцёрмера найперш былі прысвечаныя абмеркаванню праблемы паняцця шляхты і сацыяльнай структуры франкскага грамадства. Па сутнасці не ставячы пад пытанне тэзы М. Блока пра фармаванне шляхецкага стану ў прававым сэнсе ў XII ст., яны заўважылі, што высунутае познесярэднявечнымі праўнікамі патрабаванне абгрунтоўваць шляхецкі стан (на аснове каралеўскіх дакументаў) не трэба дастасоўваць да ранейшых часоў.

Арыстакратыя часоў Каралінгаў была вынікам працяглага сацыяльнага развіцця і сваімі каранямі ўзыходзіла як да знаці часоў Меравінгаў[6], так і эліты сенатараў Рымскай імперыі[7], а

---

[3] Bloch M. La société féodale. Vol. 1—2. Paris, 1939—1940 [польскі пераклад: Społeczeństwo feudalne. Warszawa, 1981].

[4] Tellenbach G. Vom karolingischen Reichsadel zum deutschen Reichsfürstenstand // Herrschaft und Staat im Mittelalter / Hrsg. v. H. Kämpf. Darmstadt, 1956. S. 191—242; таксама гл. яго метадалагічнае паведамленне: Tellenbach G. Zur Bedeutung der Personenforschung für die Erkenntnis des frühen Mittelalters (= Freiburger Universitätsreden NF. Bd. 25). Freiburg, 1957.

[5] У французскай і бельгійскай гістарыяграфіі да аналагічных высноў прыйшлі: Duby G. Hommes et structures du Moyen Age. Paris, 1973; Genicot L. La noblesse dans l'Occident médiéval. London, 1982.

[6] Irsigler F. Untersuchungen zur Geschichte des frühfränkischen Adels. 2. Aufl. Bonn, 1981. S. 79— 81, 221—254.

[7] Werner K. F. Bedeutende Adelsfamilien im Reich Karls des Großen // Karl der Grosse: Lebenswerk und Nachleben. Bd. 1: Persönlichkeit und Geschichte / Hrsg. v. H. Beumann. Düsseldorf, 1965. S. 83—142.

яе вывядзенне толькі ад службоўцаў каралеўскай дынастыі — неадэкватна складанай структуры франкскага грамадства. Каранямі ўлады знаці быў г. зв. канцэпт «дамовай улады» («дамовай гаспадаркі»), які выразна адасабляў становішча пана і яго людзей. Гэты канцэпт быў вядомы і ў грэцкім, і ў рымскім, і ў германскім грамадствах[8]. Ва ўмовах такога сацыяльнага ладу побач са знаццю і падданымі знаходзіліся таксама і свабодныя.

Калі змяніліся сацыяльныя ўмовы, у XI ст. была сфармуляваная тэорыя «трох станаў», у якой рыцарства ўпершыню было проціпастаўлена і нават субардынавана (з акцэнтам найперш на яго ваенныя заданні) духоўным і манархам. Гэта быў тэарэтычны канцэпт, якім пазней (асабліва ва Францыі) карысталіся каралі, узмацняючы сваю ўладу.

І толькі ў Новы час з'явілася катэгорыя «феадальнай анархіі», якая па-анахранісцку перанесла актуальныя на той час паўстанні супраць абсалютнай каралеўскай улады на часы франкаў, калі пасля смерці Карла Вялікага знаць нібыта неправамоцна ўзурпавала ўладу слабых манархаў. Такім чынам былі забытыя карані ўлады старой знаці.

Вызначэнне структуры арыстакратычнага ранняфранкскага грамадства падштурхнула гісторыкаў да пошуку генеалагічных сувязяў паміж знатнымі родамі франкаў і больш позняга часу. Нягледзячы на складаныя і вымудраныя генеалагічныя рэканструкцыі, фактаграфічна давесці гэтую сувязь у большасці выпадкаў уяўляецца немагчымым. Іменаслоў раннесярэднявечнага рыцарства па сутнасці адрозніваўся ад шляхецкай анамастыкі Высокага і Позняга Сярэднявечча, а тытулы знаці, што дазваляюць ідэнтыфікаваць асоб, далёка не заўсёды запісваліся ў дакументах. Аднак гэтая негатыўная выснова падштурхнула Карла Шміда сфармуляваць тэорыю пра змену структуры шляхты ў Высокім Сярэднявеччы[9]. Ён

[8] Brunner O. Das «Ganze Haus» und die alteuropäische «Ökonomik» // Brunner O. Neue Wege der Verfassungs- und Sozialgeschichte. Aufl. 2. Göttingen, 1968. S. 103—127; Oexle O. G. Haus und Ökonomie im früheren Mittelalter // Person und Gemeinschaft im Mittelalter. Karl Schmid zum fünfundsechzigsten Geburtstag / Hrsg. v. G. Althoff, D. Geuenich, O. G. Oexle und J. Wollasch. Sigmaringen, 1988. S. 101—122.

[9] Schmid K. Zur Problematik von Familie, Sippe und Geschlecht, Haus und Dynastie beim mittelalterlichen Adel // Zeitschrift für die Geschichte des Oberrheins. 1957. Bd. 105. S. 1—62; Schmid K. Über die Struktur des Adels im früheren Mittelalter // Jahrbuch für fränkische Landesforschung. 1959. Bd. 19. S. 1—23; Schmid K. Geblüt, Herrschaft,

заўважыў наступнае: прадстаўнікі знаці, што раней кіравалі дробнымі тэрыторыямі, рассыпанымі па ўсім краі, з X—XI ст. пачынаюць кансалідаваць свае землі ў адным месцы. Цэнтрам (але неабавязкова геаграфічным) гэтых тэрыторый стаў замак, які надаваў спадчыннае імя знатнаму роду (напр., *von Habsburg*). Такім чынам замацоўваецца дынастычнае паняцце роду, у якім дамінуе мужчынская (агнатычная) лінія перадачы ў спадчыну імя і сацыяльнага становішча. З'яўляецца новае паняцце роду, якое суправаджаюць генеалогіі і гербы, што пашырыліся якраз у гэты час. Дзякуючы атрыманым у спадчыну і набытым уладанням гэтая сацыяльная група яшчэ больш адасабляецца ад рэшты рыцарства, пачынаючы працэс іерархізацыі вышэйшага стану. Колькасць дробнай шляхты з бегам часу расце, бо большасць служкаў (міністэрыялаў) манархаў і іншых суверэнаў, дзякуючы прывілеям сваіх сеньёраў, здолелі патрапіць у шляхецкі стан, які ўсё больш замыкаўся. Хоць гэта дробнае рыцарства і пераняла структурныя элементы знаці (родавую структуру, формы землеўладання), тым не менш розніца ў статусе і маёмасці была досыць вялікай для таго, каб узнікла сацыяльная дыферэнцыяцыя ўнутры шляхецкага стану[10]. Але, разам з тым, існавалі супольныя формы шляхецкага жыцця і рэпрэзентацыі, якія адасаблялі гэты арыстакратычны свет ад сялянскай большасці насельніцтва.

Развіццё шляхецкага стану ў цэнтральна- і ўсходнееўрапейскіх дзяржавах у пэўных асноўных рысах нагадвае абмеркаваную гісторыю заходнееўрапейскага сярэднявечнага рыцарства. Гістарыяграфіі гэтых краін таксама ўсё больш схільныя звязваць раннюю гісторыю дзяржавы не толькі з дынастыямі манархаў, але і з уладай знаці[11]. У Цэнтральнай і Усходняй Еўропе таксама з бегам часу адбывалася трансфармацыя структуры знаці, што пачала новы этап развіцця гэтай сацыяльнай групы. Хоць праблема культурнага ўплыву застаецца яшчэ недаследаванай[12], можна

Geschlechterbewusstsein: Grundfragen zum Verständnis des Adels im Mittelalter (= Vorträge und Forschungen. Bd. 44). Sigmaringen, 1998.

[10] Spieß K.-H. Ständische Abgrenzung und soziale Differenzierung zwischen Hochadel und Ritteradel im Spätmittelalter // Rheinische Vierteljahrsblätter. 1992. 56. S. 191—205.

[11] Bieniak J. Polska elita polityczna XII wieku // Społeczeństwo Polski średniowiecznej: zbiór studiów. 1982. T. 2. S. 11—61; 1985. T. 3. S. 13—74.

[12] Адно з першых падрабязных кампаратыўных даследаванняў: Gawlas S. O kształt zjednoczonego Królestwa: niemieckie władztwo terytorialne a geneza społeczno-

меркаваць, што на гэтыя сацыяльныя змены ўздзейнічалі ўсё мацнейшыя кантакты з нямецкімі краямі ды працэс хрысціянізацыі. Так ці інакш, у часе гэтага працэсу ў Польшчы ў XII—XIII ст. пачалі фармавацца агнатычныя рыцарскія роды[13]. Асаблівасцю Польшчы было тое, што ўтвораныя геральдычныя роды доўгі час былі ці не адзіным структурным элементам шляхецкага грамадства. Пашырыўшы свае межы (да некаторых родаў адначасова належала некалькі соцень прадстаўнікоў), яны не дазвалялі ўзнікнуць ленній феадальнай арганізацыі і шляхецкай станавай дыферэнцыяцыі. Традыцыйная спадчынная сістэма вызначала, што ў падзелах родавых уладанняў і далей маглі браць удзел усе родзічы, нягледзячы на ступень блізкасці. У Чэхіі, шчыльна звязанай з тэрыторыяй імперыі, сацыяльныя адрозненні ўнутры вышэйшага стану былі значна больш выразныя. Тут ужо ў XIII—XIV ст. існаваў асобны слой знаці, які некалькі пазней, калі аформіўся інстытут станавых сходаў, вылучыўся ў асобную палату[14]. Істотна зазначыць, што ў Польшчы і асабліва ў Чэхіі ўжо з XII—XIII ст. адбываўся працэс кансалідацыі землеўладання знаці ды стварэння рэзідэнцый. У Чэхіі ў XIII ст. з'яўляюцца ленныя сувязі прыналежнасці паміж асобнымі слаямі рыцарства. Яшчэ больш развітая ленная сістэма існавала на тэрыторыях, ахопленых працэсам нямецкай каланізацыі. Знаць Брандэнбургскай маркі (*Burgherren*) здолела зацвердзіць сваю ўладу адносна ўлады суверэна (Брандэнбургскага маркграфа), заснаваць дастаткова аўтаномныя тэрыторыі пад сваім кіраваннем, згуртаваць супольнасці сваіх васалаў[15]. У Польшчы леннае права, калі не ўлічваць некаторыя памежныя тэрыторыі (найперш

---

ustrojowej odrębności Polski. Warszawa, 1996. Яно прысвечана найперш працэсу тэрытарыялізацыі (фармавання тэрытарыяльнай арганізацыі, унутранай каланізацыі і г.д.) Польшчы і параўнанню формаў дзяржаўнага ладу.

[13] Bieniak J. Rody rycerskie jako czynnik struktury społecznej w Polsce XIII—XV wieku (Uwagi problemowe) // Polska w okresie rozdrobnienia feudalnego / Pod red. H. Łowmiańskiego. Wrocław — Gdańsk, 1973. S. 161—200; Wroniszewski J. Alltagsleben und Privatleben des polnischen Adels im Spätmittelalter // Adelige Welt und familiäre Beziehungen. Aspekte der «privaten Welt» des Adels in böhmischen, polnischen und deutschen Beispielen vom 14. bis zum 16. Jahrhundert / Hrsg. v. H.-D. Heimann. Potsdam, 2000. S. 105—114.

[14] Mezník J. Der böhmische und mährische Adel im 14. Und 15. Jahrhundert // Bohemia. 1987. Bd. 28. S. 69—91.

[15] Hahn P.-M. Adel und Landesherrschaft in der Mark Brandenburg im späten Mittelalter und der frühen Neuzeit // Jahrbuch für brandenburgische Landesgeschichte. 1987. Bd. 38. S. 43—57.

Сілезію), так і не зацвердзілася, аднак і тут у Познім Сярэднявеччы бачныя спробы прадстаўнікоў знаці, што сталі буйнымі землеўласнікамі, адасобіцца ад астатняй часткі шляхты[16]. Месца леннай арганізацыі ў Польшчы займалі кліенцкія адносіны паміж знаццю і дробным рыцарствам[17].

Літва, што з канца XIV ст. жыла ў персанальнай уніі з Польшчай, зведала непасрэдны яе ўплыў, які праяўляўся на фоне розных кантактаў. Нягледзячы на гербавае зрадненне літоўскай і польскай шляхты, што адбылося ў Гародлі, у Літве так і не сфармаваліся шырокія гербавыя шляхецкія роды польскага тыпу. Сацыяльнае развіццё ў тагачаснай Літве ў значнай меры вызначалася ўплывамі Нямецкага ордэна ды Венгрыі з Чэхіяй (праз Валынь і Падолле). Спецыфічны ўнутраны лад дзяржавы Нямецкага ордэна працяглы час замінаў узмацненню мясцовых станавых інстытуцый, аднак шляхецкія формы жыцця тут пашыраліся ўжо адно з той прычыны, што Ордэн і арганізаваныя ім паходы супраць паганцаў сталі неад'емнай часткай жыцця заходнееўрапейскага рыцарства[18]. Літоўскія баяры, што апынуліся на тэрыторыі Ордэна, таксама хутка набывалі рысы еўрапейскай шляхты і пераймалі сацыяльныя структуры заходняга ўзору. У першай палове XIV ст. выхадзец з Жамойці Манста зрабіўся «пачынальнікам» прускага шляхецкага роду Манштайнаў. Адрозна ад тых родзічаў Мансты, што засталіся ў Літве, і далей мянялі імёны, у Прусіі ж імя Мансты стала спадчынным родавым імем. Характэрна, што ў традыцыі гэтага прускага роду літоўскае паходжанне было надоўга выціснутае тэорыяй чэшскага паходжання[19].

Як дазваляе меркаваць дагарадзельская геральдыка некаторых асоб, разнастайнасць кантактаў з суседнімі краямі яшчэ

---

[16] У польскай гістарыяграфіі агляд даследаванняў буйнога землеўладання знаці гл.: Kurtyka J. Posiadłość, dziedziczność i prestiż. Badania nad późnośredniowieczną i wczesnonowożytną wielką własnością możnowładczą w Polsce XIV—XVII wieku // Roczniki historyczne. 1999. R. 65. S. 161—194.

[17] Kurtyka J. Problem klienteli możnowładczej w Polsce późnośredniowiecznej // Genealogia: władza i społeczeństwo w Polsce średniowiecznej / Pod red. A. Radzimińskiego i J. Wroniszewskiego. Toruń, 1999. S. 47—124.

[18] Paravicini W. Die Preußenreisen des europäischen Adels. T. 1—2. Sigmaringen, 1989—1994. Неабходна звярнуць увагу на раскрытае ў працах гэтага гісторыка паняцце еўрапейскай шляхты.

[19] Wenskus R. Studien zur Geschichte der Ritterschaft im Ordensland Preussen. I. Zur mittelalterlichen Geschichte des Geschlechts von Manstein // Altpreußische Geschlechterkunde. 1982. Bd. 13. S. 51—64.

да хросту рабіла ўздзеянне на літоўскую знаць. Узмацненне кантактаў з еўрапейскай шляхтай пасля 1387 г., а таксама палітычныя і сацыяльныя рэформы Вітаўта (фармаванне прыдворнай структуры, бенефіцыяльная палітыка), а таксама прынесеная Касцёлам традыцыя фундацый і тэстаментаў вызначылі сутнасную трансфармацыю знаці. Пераймаючы новыя формы шляхецкага жыцця, нашчадкі раннелітоўскай знаці рабіліся еўрапейскай шляхтай.

У гэткай гістарыяграфічнай перспектыве становяцца зразумелымі асноўныя тэндэнцыі развіцця літоўскага баярства. Гісторыя шляхты — гэта, несумнеўна, адна з найважнейшых тэм сацыяльнай гісторыі Сярэднявечча[20]. Таму новая інтэрпрэтацыя гэтай гісторыі змушае некалькі іначай зірнуць на многія сацыяльна-палітычныя працэсы і падзеі XIV—XV ст. Тут мы падыходзім да межаў дадзенай працы. Яе аб'ект — знаць, а вытлумачэнне далейшых сацыяпалітычных імплікацый вымагае асобных даследаванняў[21]. За межамі даследавання застаюцца таксама князі[22], вялікая частка якіх паходзіла з пануючай дынастыі. Іх статус меў іншы, чым у прадстаўнікоў слоя знаці, сацыяльны грунт, і таму даследаванне падстаў іх улады — гэта асобная праблема. У геаграфічным сэнсе рамкі працы акрэслівае слабая інтэграцыя знаці абласных тэрыторый XIV—XV ст. Хоць эліта рускіх зямель, як паказваюць даследаванні Наталлі Якавенкі, захоўвала на сваіх тэрыторыях высокае становішча і пры панаванні вялікіх князёў літоўскіх, толькі нямногія яе прадстаўнікі да канца XV ст. здолелі зрабіць кар'еру ў ядры дзяржавы[23].

Асаблівасці эвалюцыі літоўскай знаці і сітуацыя з крыніцамі вызначылі храналагічныя рамкі даследавання: канец XIV — XV ст. (больш дакладна 1387—1492 гг.: ад хросту Літвы да

---

[20] Werner K. F. Bedeutende Adelsfamilien... S. 84. Гл. таксама: Borgolte M. Sozialgeschichte des Mittelalters. München, 1996. S. 190—218. Пра значэнне шляхты ў рэгіёне Цэнтральнай і Усходняй Еўропы гл.: Graus F. Die Entstehung der mittelalterlichen Staaten in Mitteleuropa // Historica. 1965. 10. S. 5—65.

[21] Гл. раздзел гэтай кнігі, у якім аналізуюцца адносіны ўлады вялікага князя і знаці.

[22] Яны ўключаныя толькі ў табліцу сведак вялікакняскіх дакументаў.

[23] Пра рускую шляхту ўжо з'явіліся новыя падрабязныя даследаванні: Яковенко Н.М. Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст. (Волинь і Центральна Україна). Київ, 1993; Кром М. М. Меж Русью и Литвой: Западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV — первой трети XVI в. Москва, 1995.

смерці Казіміра). Але, асабліва пры аналізе структуры знаці, у працы выкарыстоўваюцца таксама характэрныя і прыдатныя прыклады некалькі ранейшага ці пазнейшага часу.

Агульная структура працы мае праблемны, а не храналагічны характар, хоць у асобных частках даследаванне храналагічнае. Неакрэсленасць паняцця знаці запатрабавала прысвяціць гэтай праблеме асобную частку працы. Пасля гэтага разглядаюцца склад і паходжанне знаці, аналізуецца яе структура, а завяршае даследаванне праблема ўлады знаці. Напрыканцы працы змешчаны спіс ураднікаў Вялікага Княства Літоўскага 1387—1492 гг. і прасапаграфія прадстаўнікоў літоўскай знаці канца XIV — XV ст.

МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

У гістарыяграфіі шляхты пераважае традыцыйны генеалагічны метад даследавання. Ён неаднаразова паспяхова прымяняўся ў працах польскіх гісторыкаў. Гэты метад дазваляе, дзякуючы даследаванню спадчыннікаў зямельных уладанняў, дапоўніць нашыя абмежаваныя веды пра генеалогію шляхты XV ст. Карыстаючыся гэтым метадам, таксама можна даследаваць развіццё буйнога землеўладання знаці. Абмежаванасць генеалагічнага метаду становіцца відавочнай, калі ўздымаецца пытанне пра паняцце тагачаснага роду, бо застасаванне метаду непазбежна вядзе да акцэнтавання родавай лініі, што найбольш актыўна брала ўдзел у працэсе атрымання маёмасці ў спадчыну. У гэтай працы генеалагічны метад ужываецца пры даследаванні паходжання знаці часоў Вітаўта і геаграфіі гэтага паходжання.

Больш уважлівы позірк на сацыяльнае жыццё сярэднявечных людзей паказвае, што тагачасны індывід адчуваў сябе прадстаўніком больш шырокай групы людзей, у якой непасрэдная, абумоўленая кроўнымі сувязямі роднасць адыгрывала істотную, але далёка не адзіную ролю. Заўважана, што для адэкватнага разумення дзейнасці таго ці іншага чалавека неабходна сабраць звесткі пра ўсё яго атачэнне — у атачэнні якога князя ён з'яўляўся, з чыёй дачкой ці сястрой ажаніўся, за каго выдаў сваіх дзяцей, у чыіх дакументах выступаў у якасці сведкі, дзе фундаваў ці даціраваў касцёлы і г.д. Збіраць і ацэньваць гэтыя

звесткі пра асоб дапамагае прасапаграфічны метад[24]. Напрыканцы працы прадстаўлена прасапаграфія літоўскай знаці XV ст., звесткі з якой пастаянна выкарыстоўваюцца ў аналітычнай частцы працы. Прасапаграфічны метад — адзін з асноўных метадаў даследавання тых перыядаў, што пакінулі мала крыніц. У такіх выпадках нават простыя згадкі ў крыніцах пра асоб, якія з'яўляюцца разам, пры ацэнцы дадатковых звестак пра іх паходжанне ці роднасныя сувязі могуць даць прастору для новых гіпотэз, што тлумачылі б іх дзейнасць. Гісторыя знаці XV ст. — гэта якраз той выпадак, калі нельга спадзявацца на нейкі цэльны корпус крыніц, іменаслоў паноў і іх родзічаў, арыгінальныя генеалогіі, спісы ураднікаў. Звесткі пра знаць раскіданыя ў розных крыніцах. Апроч таго, трэба браць пад увагу і цяжкасці ідэнтыфікацыі асоб, імёны якіх у той час нярэдка запісваліся па-рознаму. Крыніцы XV ст. — гэта своеасаблівыя кароткія водбліскі ў імгле, што асвятляюць сітуацыі, але звычайна не пазначаюць сувязі. Менавіта прасапаграфічнае даследаванне дапамагае высветліць сувязі паміж асобнымі фактамі, змясціць іх у пэўны сацыяльны кантэкст. Яшчэ адна перавага гэтага метаду ў тым, што ён вымагае збору звестак пра ўсіх асоб са складу сацыяльнай групы, якая з'яўляецца прадметам даследавання, а не толькі пра найбольш значных яе прадстаўнікоў. Такім чынам можна атрымаць нашмат больш універсальныя высновы пра становішча сацыяльнай групы.

Іншым шляхам узбагачае сацыяльную гісторыю метадалагічны кірунак, што даследуе развіццё паняццяў. Відавочна, што тэрміны *знаць, баярства (шляхта)* у розны час мелі розныя канатацыі. Таму набліжэнне да адначасовага значэння гэтых паняццяў — гэта ўмова разумення сацыяльнай рэчаіснасці мінуўшчыны. З іншага боку, нельга мірыцца з досыць непаслядоўнай тэрміналогіяй крыніц. Навуковы аналіз патрабуе выразных адрозненняў там, дзе для сучаснікаў больш дакладнае вызначэнне не было такім істотным.

У пэўных аспектах літоўскае грамадства XIV—XVст. было падобнае на заходнееўрапейскае грамадства эпохі Ранняга і Вы-

[24] Prosopographie als Sozialgeschichte? München, 1978; Tellenbach G. Zur Bedeutung der Personenforschung für die Erkenntnis des frühen Mittelalters; Schmid K. Programmatisches zur Erforschung der mittelalterlichen Personen und Personengruppen // Frühmittelalterliche Studien. 1974. Bd. 8. S. 116—130.

сокага Сярэднявечча, таму, калі выкарыстоўваць кампаратыўны метад, структуру гэтага досыць добра даследаванага грамадства варта параўноўваць са структурай літоўскага грамадства.

Існаванне мноства правоў і інстытутаў можна давесці толькі праз выкарыстанне рэтраспектыўнага метаду. Гэты метад сапраўды абавязковы пры даследаванні слаба асветленых у крыніцах перыядаў, аднак яго застасаванне звязана з небяспекамі анахранізму. Таму ў гэтай працы ён выкарыстоўваецца толькі пры абмеркаванні некаторых інстытутаў звычаёвага права, якія не згадваюцца ў ранніх крыніцах, але існаванне якіх у тыя часы не выклікае сумнення.

Магчымасці выкарыстання статыстычнага метаду моцна абмяжоўвае сітуацыя з крыніцамі XV ст. У іх цяжка знайсці абавязковыя для статыстычнага аналізу серыйныя звесткі. Аднак у некаторых выпадках, напр., пры даследаванні матрыманіяльнай палітыкі знаці ці складу кіруючай эліты, можна скарыстацца магчымасцямі, якія дае гэты метад. Але трэба памятаць, што аб'ектыўнасць статыстычнага метаду — таксама ўмоўная рэч, а вынікі такога даследавання робяцца сэнсоўнымі толькі тады, калі існуюць папярэднія веды, сфармаваныя пры дапамозе іншых метадаў (у гэтым сэнсе прасапаграфічны метад — гэта ўмова статыстычнага метаду).

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Як бы гэта ні выглядала парадаксальна, гістарыяграфічны аналіз я пачну з твора, які цалкам абгрунтавана змяшчаецца сярод крыніц. Гэта Хроніка Яна Длугаша, у якой сфармуляваны погляд на перадунійнае літоўскае баярства, што дажыў да нашых дзён. Пры апісанні Гарадзельскай уніі 1413 г. аўтар ахарактарызаваў тагачасных літоўскіх баяраў як такіх, што дагэтуль умелі збіраць даніну і не ведалі стану высакароднасці, гербаў ды правоў: *...qui ante neque conditionem nobilitatis norant, neque insignia seu nobilitatis arma gestare consueverant; largiendo insuper Lithuanorum baronibus iura et libertates optimas... remitendo illis tributa, servitutes et onera, quibus non secus quam emptitii et sclavi*

premebantur[25]. Праўда, гістарыяграфія ўжо даўно «знайшла» літоўскае баярства і да уніі, аднак яго вызначэнне часта амаль не адрозніваецца ад характарыстыкі з польскай хронікі.

Гістарыяграфія, прысвечаная літоўскаму баярству, вялізная. Было б бессэнсоўна называць і абмяркоўваць усе даследаванні па гэтай тэматыцы. Гістарыяграфічнае становішча робіцца больш зразумелым, калі прааналізаваць у першую чаргу творы, што фармавалі гістарыяграфічную традыцыю і вызначалі тыя ці іншыя тэндэнцыі даследаванняў. Таму структуру гэтага гістарыяграфічнага агляду, разам з непазбежным храналагічным прынцыпам, вызначыла спроба акрэсліць найважнейшыя традыцыі даследаванняў.

Найбольшы ўплыў на развіццё гістарыяграфіі мела прапанаваная Мацвеем Любаўскім мадэль генезісу літоўскага парламентарызму. На погляды гэтага гісторыка моцна паўплывалі прынцыпы даследавання крыніц, укаранёныя расійскай праўнагістарычнай школай. Гэтыя прынцыпы аддаюць першынство юрыдычным крыніцам і скептычна ацэньваюць іншыя (асабліва наратыўныя) тэксты. З іншага боку, на погляды яго і многіх іншых гісторыкаў канца XIX — пачатку XX ст. уздзейнічала анахранічнае ўспрыняцце баярства, у рамках якога шляхецкія правы прызнаваліся толькі за асобамі, што мелі адпаведны дакумент ад вялікага князя, а пазней ад цара. Паводле Любаўскага, літоўскі сойм з'явіўся толькі па прычыне уніі з Польшчай. Датуль князі звярталі мала ўвагі на пазіцыю баярства[26]. Прычыны ўзнікнення сойма Любаўскі тлумачыць досыць туманна: пакуль палітыка вялікага князя і яго родзічаў адпавядала нацыянальным інтарэсам, мясцовыя землеўладальнікі былі ім паслухмяныя; калі гэтыя інтарэсы разышліся, апошнія сталі праяўляць палітычную самастойнасць[27]. Як можна зразумець, пачатак палітычнага ўплыву бараў Любаўскі схільны атаясамліваць з генезісам сойма. Блытаніна з паняццямі паўплывала на непаслядоўнасць у змесце. Датаванне першага сойма 1401 г. (г. зн. тады, калі паняцця «сойм»

---

[25] Długossii Joannis Historiae Polonicae libri XII / Ed. A. Przezdziecki. T. 4. Cracoviae, 1877. P. 153.

[26] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. Москва, 1900. С. 10—12. Іншая значная праца гэтага аўтара: Любавский М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русскаго государства ко времени издания перваго Литовскаго статута. Москва, 1892.

[27] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. С. 37—44.

яшчэ не было) паказвае, што Любаўскі выкарыстоўваў гэта слова як тлумачальнае паняцце з навуковай мовы. Адзіны магчымы яго сэнс у такім выпадку ў тым, што сойм — гэта інстытуцыйная праява ўдзелу баярства ў прыняцці палітычных рашэнняў. Але сляды такога ўдзелу (нават калі не прытрымлівацца крытэрыяў зусім неабавязковага з пункту гледжання беспісьмовага грамадства сведчання ў дакументах гаспадара) можна знайсці ў значна ранейшыя часы. Параўнанне з Крэўскай дамовай некарэктнае, бо дакумент не мае ўсіх неабходных прыкмет пацвярджэння. У сваёй кнізе Любаўскі рэгіструе ўсе вядомыя яму «літоўскія соймы». Падаючы сапраўды шмат карыснага матэрыялу, ён апісвае змаганне князёў, у часе якога ўзмацнялася баярства. З больш карысных заўваг трэба вылучыць акцэнт на арыстакратычны характар паноў-рады[28]. Аднак структурныя прычыны гэтай з'явы застаюцца нераскрытымі. Для гэтага аўтара, як, дарэчы, і для ўсёй прадстаўленай ім гістарыяграфічнай школы, характэрна жаданне выкласці «ўвесь матэрыял», гэтым перагрувашчваючы тэкст і паслабляючы аналітычны бок працы. З іншага боку, у яго атрымалася стварыць лагічную на першы погляд карціну росту палітычнага ўплыву баярства, што на доўгі час замацавалася ў гістарыяграфіі.

Многія заўвагі, прысвечаныя даследаванням Любаўскага, актуальныя і для іншых расійскіх гісторыкаў, што пісалі на падобную тэматыку ў канцы XIX — пачатку XX ст. Мікалай Максімейка пярэчыў Любаўскаму, спрабуючы паказаць уплыў «мясцовых соймаў» на жыццё дзяржавы, а таксама значэнне баярства да Крэўскай уніі[29]. Каштоўнасць яго заўваг моцна змяншае абстрактнасць высноў, выкарыстанне крыніц з сумніўнай рэпутацыяй (напр., легендарнай часткі літоўскіх летапісаў), храналагічныя праблемы (у адно месца без тлумачэння зводзіцца матэрыял і XII, і XVI ст.), а таксама абсалютная пагарда да тэрміналогіі[30]. Абгрунтавана крытыкуючы канцэпцыю неабмежаванай улады вялікага князя, ён піша пра ўдзел нейкіх

---

[28] Тамсама. С. 346—352.

[29] Максимейко Н. А. Сеймы Литовско-Русскаго государства до Люблинской унии 1569 г. Харьков, 1902. С. 4—58.

[30] Тамсама. С. 4, 13—15, 25. У якасці прыкладу прывяду адно яго сцвярджэнне, якое працытую на мове арыгінала: «Важнейшие законодательные памятники Литвы, изданные до появления Статута, слагались на местных сеймах» (Тамсама. С. 25). М. Максімейка ўяўляе палітычную структуру ВКЛ XIV—XV ст. як нешта падобнае

ананімных «шырокіх слаёў насельніцтва» ў кіраванні дзяржавай. Такі валюнтарызм прывёў да таго, што рэплікі Максімейкі не былі пачутыя, а некаторыя цікавыя меркаванні патанулі ў моры несістэмнага матэрыялу.

Іншым крытыкам Любаўскага быў Іаанікій Маліноўскі. У сваім імкненні паказаць, што князь, калі прымаў рашэнні, быў пастаянна акружаны знаццю, ён назваў мноства прычын палітычнай актыўнасці баярства[31]. Аднак без разгляду пытання пра падставы палітычнага ўплыву знаці і яе структуру гэты каталог практычна нічога не дае. Рэдкія спробы патлумачыць нейкую з'яву былі зусім непаслядоўнымі (напр., генетычная сувязь паноў-рады з баярскай думай на Русі)[32]. Сцвярджэнне Маліноўскага, што ў некаторыя перыяды ўлада вялікага князя рабілася неабмежаванай (напр., у часы Альгерда і Вітаўта)[33], паказвае, што адносіны ўлады князёў і знаці засталіся для яго незразумелымі.

З расійскіх гісторыкаў неабходна таксама згадаць Фёдара Леантовіча, які даследаваў не толькі традыцыйна актуальную для гістарыяграфіі свайго часу праблему «паноў-рады», але і некаторыя пытанні сацыяльнай гісторыі (напрыклад, структуру панскіх двароў)[34]. Калі яго даследаванне генезісу паноў-рады можна разглядаць як яшчэ адзін выпадак расійскай гістарыяграфічнай традыцыі (рада вялікага князя літоўскага была непасрэднай спадчынніцай старажытнарускай думы, некалькі трансфармаванай у часе уніі з палякамі; гаспадар меў абсалютнае права фармаваць склад рады і г.д.), дык артыкул, прысвечаны панскаму двару, быў новым словам у тагачаснай гістарыяграфіі. Нягледзячы на некаторыя неадрэфлектаваныя праблемы (маёнткі XIV і XVI ст., напэўна, адрозніваліся ў значна большай ступені, чым меркаваў Леантовіч), многія вы-

да сістэмы соймаў і соймікаў канца XVI ст. Ён не ацэньвае фундаментальны ўплыў рэформаў сярэдзіны XVI ст. на адміністрацыйны і прававы лад дзяржавы.

[31] Малиновский И. Рада Великаго Княжества Литовскаго в связи с боярской думой древней России. Ч. 2. Вып. 2. Томск, 1912. С. 40—53, 67—85.

[32] Тамсама. С. 21.

[33] Тамсама. С. 78—79, 131—132.

[34] Леонтович Ф. И. Панский двор в Литовско-русском государстве // Варшавския университетския известия. 1895. № 5. С. 1—59; Леонтович Ф. И. Рада великих князей литовских // Журнал Министерства Народного Просвещения. 1907. № 9. С. 122—178; № 10. С. 273—331.

сновы гэтай працы справядлівыя дагэтуль. Аўтар абгрунтавана з эпістэмалагічнымі мэтамі адасабляў два значэнні двара — як адміністрацыйнага цэнтра і як уладання. У адрозненне ад Любаўскага, Леантовіч таксама ўключаў у паняцце двор прыналежныя да яго вёскі разам з людзьмі[35].

Відавочна, такое багацце і канцэнтрацыя даследаванняў (усе працы, прысвечаныя панам-радзе, з'явіліся практычна на працягу дзесяцігоддзя) дазволілі Івану Лапу напісаць наступнае: «у наш час [г. зн. 1911 г.] пытанне пра літоўска-рускую шляхту і яе землеўладанне эпохі да рэформаў сярэдзіны шасцідзясятых гадоў XVI стагоддзя мы можам лічыць адным з найбольш распрацаваных пытанняў у гістарычнай літаратуры»[36]. Гэта сцвярджэнне выклікае здзіўленне, бо Лапа першы ў гістарыяграфіі канцэптуальна абгрунтаваў значэнне рэформаў сярэдзіны XVI ст. для развіцця дзяржаўнай адміністрацыі і права, што ў сваю чаргу прывяло да неабходнасці шукаць іншую інтэрпрэтацыю структуры «дарэформенай» шляхты. Сам Лапа не ставіў сабе такую задачу, ён даследаваў найперш грамадства другой паловы XVI ст.[37]

Аднак яго погляд быў нашмат больш дыферэнцаваным, а навуковая мова больш дакладнай, чым у іншых расійскіх гісторыкаў.

Палеміка ў рускай гістарыяграфіі па сутнасці не вырашыла праблемы ўлады баярства. Нягледзячы на гэта, дастаткова лагічная тэорыя Любаўскага знайшла нямала прыхільнікаў, а выснова пра паступовы рост моцы паноў стала пачатковай кропкай для амаль усіх будучых даследаванняў.

Праблема пачаткаў літоўскай шляхты больш дакладна была сфармулявана ў Польшчы ў часе дыскусіі Уладзіслава Сямковіча і Оскара Галецкага[38]. Сямковіч высунуў сацыяльна-прававы

---

[35] Леонтович Ф. И. Панский двор... С. 3—12, 15—18.

[36] Лаппо И. И. Великое Княжество Литовское во второй половине XVI столетия. Литовско-русский повет и его сеймик. Юрьев, 1911. С. 202.

[37] Іншая важная праца даследчыка: Лаппо И. И. Великое Княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569—1586). Т. 1. Санкт-Петербург, 1901.

[38] Semkowicz W. W sprawie początków szlachty na Litwie i jej ustroju rodowego // Kwartalnik historyczny. 1915. R. 29. S. 224—256; Halecki O. O początkach szlachty i heraldyki na Litwie // Kwartalnik historyczny. 1915. R. 29. S. 177—207; Halecki O. Kwestje sporne w sprawie początków szlachty litewskiej // Kwartalnik historyczny. 1916. R. 30. S. 62—72.

аспект праблемы баярства: ці былі літоўскія баяры «шляхтай» у заходнім і польскім сэнсе? Неіснаванне закрытага стану дазволіла яму адказаць на гэтае пытанне адмоўна. Паняцце шляхецтва (*szlachectwo*) у Літву прынесла толькі Гарадзельская унія[39]. Галецкі, палемізуючы з гэтым палажэннем Сямковіча, прапанаваў новую, значна больш гнуткую інтэрпрэтацыю паняцця шляхты. Кожная краіна мае толькі для яе характэрныя рысы вышэйшага стану, таму недахоп некаторых класічных прыкмет яшчэ не даказвае, што стан не існуе[40]. Прывілей 1387 г., які адасабляў баяраў ад іншых сацыяльных станаў, — гэта, на думку Галецкага, дастаткова моцны аргумент, каб казаць пра стан з прававога пункту гледжання[41]. Пазіцыі абодвух гісторыкаў былі абумоўлены юрыдычным разуменнем тэрміна шляхта. Галецкі, прызнаўшы спецыфічнасць кожнай краіны, не зрабіў далейшага кроку — высновы, што ў розныя перыяды існавалі розныя ўяўленні пра шляхту. Прапанаваная ім новая храналогія пачатку баярскага стану няшмат што змяняе. Бо, па сутнасці, няма вялікай розніцы, ці яго ўзнікненне датаваць 1387-м або 1413-м годам. Апроч таго, само паняцце «стан» ужыта ім празмерна свабодна. Пытанне ўзнікнення стану беспадстаўна атаясамліваецца з пытаннем улады баяраў. Паняцце «стан» дайшло да Літвы позна, але гэта мала што кажа пра ўладу баяраў у «перадунійнай» Літве.

Тым не менш, важна тое, што гэта дыскусія высунула пытанне пра пачатак літоўскага баярства. Яно нашмат больш істотнае, чым пошукі генезісу паноў-рады, якімі была апанавана расійская гістарыяграфія. Гэтая дыскусія таксама адкрыла шмат новых і каштоўных аспектаў даследавання гісторыі баярства. Найбольш значным аспектам стала пытанне існавання родаў у літоўскім грамадстве. Гэта пытанне запачаткавала больш сістэмнае даследаванне структуры баярства[42].

У гістарыяграфіі міжваеннай Літоўскай Рэспублікі даследаванні гісторыі баярства былі дастаткова блізкімі да польскай традыцыі. Шляхецкая праблематыка была ад-

---

[39] Semkowicz W. W sprawie początków... S. 227—230.

[40] Halecki O. O początkach szlachty... S. 184.

[41] Тамсама. S. 186—189.

[42] Гістарыяграфія гэтай праблемы падрабязна разгледжана ў раздзеле «Структура літоўскай знаці XV ст.».

крыта гісторыкамі, што навучаліся (прынамсі, часткова) у нямецкіх краінах. Гэта нядзіўна, бо, з аднаго боку, у нямецкай гістарыяграфіі вывучэнне гісторыі шляхты мела глыбокія традыцыі, а з іншага боку, даследаванні сацыяльнай гісторыі тут не надта заахвочваліся. Праблематыка і метады прац Марыі Красаўскайце, Канстанцінаса Авіжоніса і Зянонаса Івіньскіса, якія абаранілі дысертацыі ў важных цэнтрах гістарычнай навукі (Цюрыху і Берліне), у асноўным былі запазычаны з нямецкай гістарыяграфіі. Тыя ж тэндэнцыі былі характэрны і для супольнасцей гісторыкаў з іншых краін, у тым ліку польскіх. У згаданай палеміцы Сямковіча і Галецкага абодва бакі часта карысталіся катэгорыямі, «выкаванымі» нямецкімі гісторыкамі[43]. Уплыў нямецкай (а таксама французскай) гістарыяграфіі прасочваецца таксама ў даследаваннях Генрыка Лаўмяньскага.

Дысертацыя Красаўскайце прысвечаная прывілеям літоўскага баярства канца XIV—XV ст.[44]. Ужо сама назва паказвае, што асноўная ўвага скіравана на прававы бок гісторыі баярства, аднак у пачатку працы разгледжаны і карані ўлады гэтага стану. Тагачаснае становішча ў навуцы дыктавала сутнасныя акцэнты. М. Красаўскайце, як і польскія гісторыкі, адмаўляе прававое адасабленне перадунійнага баярства ад іншых станаў. Абсалютызаванне значэння сацыяльнай мабільнасці дазволіла ёй інтэрпрэтаваць канфлікт Ягайлы і Кейстута 1381—1382 гг. як «змаганне вышэйшага стану супраць выхадцаў з ніжніх станаў»[45]. Найважнейшай заслугай Красаўскайце, напэўна, можна лічыць тое, што яна паставіла пад пытанне тэзіс пра новыя адносіны, створаныя для баяраў прывілеем 1387 г. Яна заўважыла дыферэнцыяцыю баярства, але разам з тым пераацаніла значэнне прывілея 1447 г., які, паводле даследчыцы, юрыдычна замацаваў гэту дыферэнцыяцыю[46]. Многія сцвярджэнні Красаўскайце неабходна ацэньваць асцярожна, бо яе кругагляд моцна звужала тое, што яна абмяжоўвалася крыніцамі аднаго тыпу. З іншага боку, аналіз пунктаў прывілеяў вялікага князя, прысвечаных баярам, дагэтуль застаецца вартым увагі.

---

[43] Напр., супрацьпастаўленне «Berufsadel» і «Geburtsadel».

[44] Krasauskaitė M. Die litauischen Adelsprivilegien bis zum Ende des XV. Jahrhunderts. Leipzig, 1927.

[45] Тамсама. S. 4—5.

[46] Тамсама. S. 8—16, 48—49.

Аб'ект даследавання Авіжоніса быў больш шырокі, больш рэпрэзентатыўным быў і склад крыніц. Ён першы паспрабаваў паслядоўна даследаваць гісторыю літоўскага баярства XIII—XIV ст., большую ўвагу прысвяціў таксама праблемам тэрміналогіі. Справядлівую па сутнасці заўвагу, што не унія з Польшчай і не першыя прывілеі стварылі літоўскую шляхту, ён рэлятывізаваў традыцыйнай абмоўкай, што «ў тыя часы яшчэ нельга казаць пра шляхту ў сапраўдным сэнсе гэтага слова, бо яна займала высокае становішча, не маючы станавых правоў з пункту гледжання князя»[47]. Не адмаўляючы таго, што гаспадары радзіліся са знаццю, Авіжоніс лічыў, што ўлада вялікага князя была абсалютнай і толькі яго воля вызначала склад дарадцаў[48]. Вялікія сумненні выклікае яго гіпотэза (дарэчы, гэта ўласціва значнай частцы даследчыкаў), што пасля стварэння дзяржавы ўзнік канфлікт паміж князямі і «нобілямі»[49]. Карані тагачасных канфліктаў ляжалі не ў сферы ўзаемных супярэчнасцей гаспадара і знаці. Калі ўзнікалі канфлікты, прадстаўнікоў знаці можна было знайсці на ўсіх баках, што канфліктавалі.

Баярскую праблематыку закрануў Івіньскіс у дысертацыі, прысвечанай гісторыі сялянскага стану[50]. І на яго погляды ўздзейнічала тэорыя неабмежаванай улады вялікага князя: напрыклад, права вялікага князя адбіраць вотчыны, незаможнасць баяраў да наданняў Вітаўта і Казіміра, ажыццёўленае Вітаўтам пратэжаванне «сярэдняга і дробнага баярства» і інш.[51]. Івіньскіс даследаваў у асноўным адносіны вялікага князя/баярына і селяніна. Гісторыя баярскага стану была хутчэй «другасным» аб'ектам яго даследавання, таму зразумела, што большасць істотных праблем вывучэння баярства засталася па-за межамі яго прац.

Усім абмеркаваным тут даследаванням уласцівыя тыя ж недахопы. Гэта погляд на найбольш раннія часы з перспектывы

---

[47] Avižonis K. Die Entstehung und Entwicklung des litauischen Adels bis zur litauisch-polnischen Union 1385 (= Historische Studien. Bd. 223). Berlin, 1932. S. 70, 154—155.

[48] Тамсама. S. 136—144.

[49] Тамсама. S. 72—73.

[50] Ivinskis Z. Geschichte des Bauernstandes in Litauen. Von den ältesten Zeiten bis zum Anfang des 16. Jahrhunderts (= Historische Studien. Bd. 236). Berlin, 1933.

[51] Тамсама. S. 55—56, 94, 115.

гісторыі канца XV—XVI ст., пошукі правільнага для ўсіх эпох вызначэння шляхты. Аналіз рэальных сацыяльных адносінаў падмяняецца даследаваннем юрыдычных фармулёвак, адсутнічае дастаткова ўважлівае абмеркаванне спецыфічных рыс крыніц. Зусім ігнаравалася (за выключэннем Сямковіча і, часткова, Галецкага) гісторыя персаналій. Апошняя заўвага з першага погляду бянтэжыць, бо гістарыяграфію XIX — першай паловы XX ст. якраз вылучаюць прыярытэты «гісторыі асоб» (напр., серыя манаграфій, прысвечаных вялікім князям). Несумненна, вялікая перашкода на шляху даследавання ранняга баярства — гэта недахоп крыніц. Аднак асноўную праблему складае адасобленасць персанальных і структурных даследаванняў. Адны даследчыкі займаліся толькі інстытуцыямі, а іншыя (Сямковіч) даследавалі персаналіі. Таму працы па «станавай» тэматыцы ці «панам-радзе» былі абстрактнымі, а прысвечаныя «асобам» — бясформеннымі.

Сукупнасць гэтых недахопаў добра раскрываецца ў сінтэтычнай працы Вітальда Камянецкага[52]. Паводле Камянецкага, улада вялікага князя ў Літве была неабмежаванай і татальнай. Канцылярскія фармулёўкі пра згоду бояраў з дзеяннямі князя былі вынікам уплыву польскай канцылярскай мовы і не мелі нічога агульнага з рэальным становішчам[53]. Нават прывілеі канца XIV — пачатку XV ст. нельга лічыць станавымі. Змест паняцця баярын вызначала, паводле аўтара, не паходжанне, а служба князю і валоданне нададзенай яму зямлёй. Толькі дзякуючы польскаму ўплыву паступова адбывалася «эмансіпацыя літоўскага грамадства»[54]. Менавіта па ініцыятыве вялікіх князёў, што мыслілі па-новаму, склаўся стан вялікіх бояраў — паноў. Больш падрабязны каментарый да гэтага сцвярджэння[55], магчыма, дапаможа лепей асэнсаваць механізм «атрымання» Камянецкім высноў. Незразумела, адкуль аўтар ведае, што Ягайла і Вітаўт выбіралі знаць згодна з крытэрыямі асабістых заслуг і здольнасцей. Ён згадвае два выпадкі ўзвышэння асоб напачатку кіравання Ягайлы — Вайдылы і Ганула, і яшчэ два з канца эпохі Вітаўта — шляхціцаў польскага паходжання Якуба з Кабылянаў і Мікалая Дэмбінскага. Але ўплыў першых

[52] Kamieniecki W. Społeczeństwo litewskie w XV wieku. Warszawa, 1947.

[53] Тамсама. S. 27—30.

[54] Тамсама. S. 35—44.

[55] Тамсама. S. 59—61.

двух быў эпізадычным, апроч таго, паходжанне Вайдылы, як паказваюць новыя даследаванні, не было «нізкім». Пра ўплыў апошніх на ўнутранае жыццё краю амаль нічога невядома, акрамя некалькіх згадак у тэстацыйных частках прывілеяў, што адносяцца да нелітоўскіх зямель. Камянецкі не абцяжарвае сябе вывучэннем паходжання знаці, не спрабуе вызначыць ступень уплыву той ці іншай асобы. Найбольш здзіўляе яго адмова прызнаваць мясцовыя карані паняцця высакароднасці і з'яву спадчыннасці сацыяльнага статусу, так характэрную для ранніх грамадстваў. Абстрактнымі тэзісамі аспрэчваецца неаднаразова засведчанае ў крыніцах значэнне роду ў структуры баярства (напр., палажэнні уній 1401 і 1413 г. без значных каментарыяў дысквалiфікуюцца як польскія канцылярскія трафарэты). Нават нельга сцвярджаць, што аўтар дыскрымінуе крыніцы нейкага тыпу — слядоў рэфлексіі над пытаннем пра адбор і выкарыстанне крыніц практычна не бачна.

Асаблівасці даследавання Камянецкага я разгледзеў некалькі больш падрабязна, бо частка яго сцвярджэнняў (некаторыя з іх узыходзяць яшчэ да Любаўскага), нягледзячы на сур'ёзную крытыку з боку Лаўмяньскага[56], дагэтуль блукае па старонках гістарыяграфіі. Лаўмяньскі адным з першых заўважыў, што ў імкненні зразумець літоўскі дзяржаўны лад недастаткова звестак пра княскую ўладу і неабходна браць пад увагу фактар баярства[57]. Ён паставіў пад сумненне пануючую ў навуцы тэорыю пра абсалютную ўладу князя, хоць і прызнаў, што гэтая ўлада была значнай[58]. Сувязь вялікага князя і баяраў была ўзаемнай, яна грунтавалася на адносінах не толькі падданства, але і «сяброўства»[59]. Тым не менш, у Лаўмяньскага не атрымалася да канца развіць пачаткі сваёй тэорыі. Сцвярджаючы, што «баярскія свабоды» — гэта не наступствы уніі, ён

[56] Łowmiański H. Z zagadnień spornych społeczeństwa litewskiego w wieckah średnich // Przegląd historyczny. 1949. T. 40. S. 96—127.

[57] Łowmiański H. Uwagi w sprawie podłoża społecznego i gospodarczego unii Jagiellońskiej. Wilno, 1934. S. 8—10, 21—30. Іншая праца Лаўмяньскага (Łowmiański H. Studja nad początkami społeczeństwa i państwa litewskiego. T. 1—2. Wilno, 1931—1932) прысвечана больш ранняму часу. Некаторыя яе палажэнні я абмяркую ў той частцы кнігі, што прысвечана паняццю роду.

[58] Łowmiański H. Uwagi... S. 4—9.

[59] Тамсама. S. 21—26.

сам жа звузіў паняцце «свабоды»[60]. У гэтым сэнсе яго высновы не пераўзыходзяць сцвярджэнняў Галецкага, Красаўскайце і Авіжоніса. Апроч таго, Лаўмяньскі, як сапраўдны «структурнік», недастаткова ацэньваў важнасць даследаванняў персанальнай гісторыі. Кажучы пра землеўладанне знаці часоў Вітаўта, ён абапіраецца на працы Сямковіча і не ацэньвае складанай структуры гэтага землеўладання[61]. Менавіта даследаванню гэтай структуры землеўладання прысвяцілі свае працы Севярын Віславух, Аліна Ваўжынчык і Ежы Віснеўскі[62]. У гэтых працах выкарыстаны рэтраспектыўны даследчы метад, які дазваляе вызначыць некаторыя прыкметы землеўладання старажытнага літоўскага баярства. Праўда, аб'ектамі ўсіх гэтых даследаванняў лакальнай гісторыі была тэрыторыя Падляшша і яе ўнутраная каланізацыя, таму далёка не ўсе іх высновы прымальныя з пункту гледжання «самых старых» тэрыторый.

Тым часам кірунак даследаванняў Камянецкага працягнуў Ежы Сухоцкі, які спрабаваў новымі аргументамі абгрунтаваць значэнне сацыяльна-палітычных працэсаў XV ст. для фармавання баярства[63]. Абапіраючыся на аналіз паняццяў з першых прывілеяў і літоўскіх летапісаў, ён сцвярджаў, што ў часы Ягайлы і Вітаўта з шырокай баярскай масы вылучыўся якасна новы сацыяльны стан паноў, прызначэннем якога было прадстаўленне інтарэсаў дынастычнай і дзяржаўнай палітыкі. Паны, паводле Сухоцкага, зразумелі ідэю цэнтралізацыі дзяржавы і пачалі ажыццяўляць дзяржаўныя функцыі. Такога адасаблення ў прывілеяванай частцы грамадства ў ранейшыя часы не было[64]. Заснаваныя па сутнасці толькі на даследаванні тэрміналогіі крыніц, у карэктнасці якога я быў бы схільны сумнявацца (чамусьці цалкам ігнаруюцца хронікі Нямецкага ордэна), высновы пра слабы падзел грамадства на станы перад уніяй з Польшчай выклікаюць шмат праблем для самога аўтара. У намаганні заставацца паслядоўным ён піша пра ўтварэнне новых панскіх сем'яў і ставіць пад сумненне значэнне роднасных сувязяў. Тут ён трапляе ў невырашальныя фактаграфічныя супярэчнасці, адну з якіх я буду мець нагоду разгледзець ніжэй.

---

[60] Тамсама. S. 50—52.

[61] Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1. S. 274—281.

[62] Гл. спіс літаратуры.

[63] Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego w Wielkim Księstwie Litewskim późnego średniowiecza // Zapiski historyczne. 1983. T. 48. S. 31—78.

[64] Тамсама. S. 43—49, 55—59.

Сухоцкі, як падаецца, найбольш радыкальна абараняў тэарэтычную мадэль, што ўзыходзіць яшчэ да часоў Любаўскага. Паводле гэтай мадэлі сфарміраваны ў часы Вітаўта стан паноў на працягу ўсяго XV ст. паслядоўна ўзмацняў сваю ўладу. З іншага боку, трэба заўважыць, што гэты гісторык бадай што першым увёў у гістарыяграфію Літвы канцэпт «палітычнай нацыі» і, грунтуючыся на ім, пераканаўча прадэманстраваў інтэграцыю баярства літоўскага і рускага паходжання ў XV—XVI ст.

Некалькі мякчэй фармулююць свае сцвярджэнні Кшыштаф Пяткевіч і Лідзія Корчак. Яны таксама мяркуюць, што сфармаваны ў часы Вітаўта сацыяльны стан надоўга замацаваў сваю ўладу ў дзяржаве. Манаграфія Пяткевіча прысвечана панаванню Аляксандра (на мяжы XV і XVI ст.), аднак аўтар не пазбягае экскурсаў у ранейшыя часы. Яго працу неабходна ацэньваць як новае слова ў гістарыяграфіі, у ёй узгоднены «структурны» і «персанальны» падыходы. І ўсё ж, пры разглядзе больш ранняга часу Пяткевіч ідзе за старой тлумачальнай мадэллю, калі надае асаблівае значэнне гарадзельскай адаптацыі пры фармаванні стану паноў[65]. Таксама яго сцвярджэнне пра «службовы характар літоўскай эліты»[66], магчыма, з пэўнымі абмоўкамі, і актуальна для канца XV ст., але яго нельга пераносіць на ранейшыя часы. Корчак зноў ажыўляе праблематыку рады вялікага князя[67]. Яна пераканаўча апісала працэс інстытуцыяналізацыі рады, даследавала яе склад і функцыі[68]. Гэтая даследчыца адна з першых звярнула ўвагу на гісторыю паняццяў (у гэтым выпадку — «дарадцы»). Аднак яе сцвярджэнне пра першапачатковае права гаспадара абіраць сабе дарадцаў вымагае пэўнага ўдакладнення. У кож-

[65] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellończyka. Poznań, 1995. S. 81.

[66] Тамсама. S. 76—80.

[67] Пасля серыі манаграфій расійскіх гісторыкаў яе падрабязна даследавала толькі Ірэна Валіконіце (Valikonytė I. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės Ponų tarybos vaidmuo valstybiniame ir politiniame gyvenime XV a. antroje pusėje (iki 1492) // Lietuvos TSR aukštųjų mokyklų mokslo darbai. Istorija. 1972. T. 13. P. 71—81) і Стасіс Ваньсявічус (Vansevičius S. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės valstybiniai-teisiniai institutai. Vilnius, 1981. P. 18—27).

[68] Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca w XV wieku. Kraków, 1998. Таксама гл.: Korczak L. Adaptacja polskich wzorów ustrojowych w Wielkim Księstwie Litewskim na przykładzie kształtowania się litewskiej rady wielkoksiążęcej w XV wieku // History, Culture and Language of Lithuania. Poznan, 2000. S. 141—149.

ным разе, наўрад ці можна атаясамліваць раду вялікага князя, як яе разумее аўтарка (уключаючы ў яе сакратароў і некаторых іншых менш уплывовых асоб), з кіруючай элітай. Яна сабрала звесткі пра членаў рады гаспадара XV ст., аднак гэты спіс персаналій мала выкарыстоўваецца ў агульным выкладзе, дзе асноўная ўвага прысвечана аналізу прывілеяў.

У каштоўным артыкуле Збыслава Вайтковяка, прысвечаным даследаванню кіруючай эліты, найбольшая ўвага звяртаецца на складаную сістэму мясцовай улады і тытулатуру яе ўраднікаў[69]. Вайтковяк заўважае ўплыў польскай тэрміналогіі на фармаванне тытулатуры ўраднікаў ВКЛ. Аднак існуючыя ўжо ў Літве палітычныя структуры абумоўлівалі, што перайманыя паняцці маглі набываць іншае, чым у Польшчы, значэнне. Тытулатура ўраднікаў мясцовай улады не была стабільнай, напр., у рускіх крыніцах першай паловы XVI ст. паняцце намесніка было заменена паняццем старосты[70].

Кірунак «структурных» даследаванняў развіваў яшчэ адзін польскі гісторык — Юліуш Бардах. У сваіх працах пра «траціну», інстытуты адаптацыі, непадзелу, узаемных дароў[71] ён па-новаму зірнуў на структуру літоўскага грамадства і яго землеўладання ў XV—XVI ст. Ён першы падрабязна даследаваў «гарызантальныя» сацыяльныя супольнасці, такім чынам прапануючы альтэрнатыўныя шляхі інтэрпрэтацыі гісторыі літоўскага грамадства.

У гэтым кантэксце неабходна згадаць таксама некалькі прац гісторыкаў сучаснай Літвы. Для даследаванняў Канстанцінаса

---

[69] Wojtkowiak Z. Urzędnicy zarządu lokalnego na Litwie. Tytulatura zarządców powiatowych przed reformą administracyjną z lat 1565—1566 // Studia źródłoznawcze. 1979. T. 24. S. 139—155. Артыкул працягвае распачатае Любаўскім даследаванне мясцовай улады ў ВКЛ (Любавский М. К. Областное деление и местное управление...).

[70] Wojtkowiak Z. Urzędnicy zarządu lokalnego na Litwie... S. 141—144.

[71] Bardach J. Adopcja w prawie litewskim XV i XVI w. // Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV—XVII w. Warszawa — Białystok, 1970. S. 191—259; Bardach J. Darowizna wzajemna na Litwie w XV i XVI w. // Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV—XVII w. Warszawa — Białystok, 1970. S. 174—187; Bardach J. Niedział w statutach litewskich na tle praktyki // Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV—XVII w. Warszawa — Białystok, 1970. S. 113—173; Bardach J. Trzecizna — część swobodna w litewskim prawie majątkowym XV—XVI wieku // Bardach J. O dawniej i niedawniej Litwie. Poznań, 1988. S. 120—139. Традыцыю яго даследаванняў працягвае Войцех Кулісевіч (Kulisiewicz W. Zaruka (vadium) w prawie litewskim XV—XVII wieku. Warszawa, 1993).

Яблонскіса, Юозаса Юргініса, Эдвардаса Гудавічуса характэрна ўвага да сацыяльных адносінаў, а асабліва да развіцця «вертыкальных» сацыяльных структур, да працэсу феадалізацыі[72]. Яблонскіс прадставіў табліцу змены сэнсу паняцця баярын[73]. Гудавічус высветліў двухсэнсоўнасць гэтага паняцця[74]. Апроч таго, ён прапанаваў цікавую тэорыю алода[75], абапіраючыся на якую можна лепш зразумець генезіс і развіццё баярскага землеўладання. Мечыслав Ючас сабраў нямала звестак пра гэтае землеўладанне ў перадунійныя часы[76]. Становішча баяраў і іх землеўладанне ў XIV ст. даследаваў Альвідас Нікжэнтайціс[77]. Ірэна Валіконіце асобна разглядала землеўладанне жанчын[78], Юраце Кяўпене — розныя праблемы вышэйшага стану XVI ст.[79].

У даследаванне персаналій літоўскай знаці канца XIV — першай паловы XV ст. найбольшы ўклад унёс Сямковіч[80]. Ён апісаў

---

[72] Jablonskis K. Lietuvos valstybės ir teisės istorija iki XVI a. vidurio // Jablonskis K. Istorija ir jos šaltiniai. Vilnius, 1979. P. 140—218; Jurginis J. Baudžiavos įsigalėjimas Lietuvoje. Vilnius, 1962; Gudavičius E. Šlėktų atsiskyrimas nuo bajorų Lietuvoje XVI a. (1. Bajorų luomo susidarymas XV a.) // Lietuvos TSR Mokslų Akademijos darbai. Serija A. 1975. T. 2. P. 97—106. (2. Dėl XVI a. privilegijuotųjų ir «neprivilegijuotųjų» bajorų) // Lietuvos TSR Mokslų Akademijos darbai. Serija A. 1975. T. 3. P. 65—74.

[73] Jablonskis K. XVI a. belaisviai kaimynai Lietuvoje // Jablonskis K. Istorija ir jos šaltiniai. Vilnius, 1979. P. 19.

[74] Gudavičius E. Šlėktų atsiskyrimas... (1. Bajorų luomo susidarymas XV a.). P. 97—99.

[75] Gudavičius E. Aukščiausia žemės nuosavybė «barbarinėje» Lietuvoje // Lietuvos TSR aukštųjų mokyklų mokslo darbai. Istorija. 1983. T. 23. P. 3—12; Gudavičius E. Baltų alodo paveldėjimas ir disponavimas juo // Lietuvos TSR Mokslų Akademijos darbai. Serija A. 1980. T. 3. 1980. P. 55—62; Gudavičius E. Baltų alodo raida // Lietuvos TSR Mokslų Akademijos darbai. Serija A. 1979. T. 4. P. 95—103; Gudavičius E. Mindaugas. Vilnius, 1998. P. 92—95.

[76] Jučas M. Lietuvos ir Lenkijos unija (XIV a. vid. — XIX a. pr.). Vilnius, 2000. P. 183—191.

[77] Nikžentaitis A. Nuo Daumanto iki Gedimino: ikikrikščioniškos Lietuvos visuomenės bruožai (= Acta historica Universitatis Klaipedensis. T. 5). Klaipėda, 1996. P. 12—16.

[78] Valikonytė I. Ar Lietuvos Didžiojoje Kunigaikštystėje XVI a. moteris buvo pilietė // Lietuvos istorijos studijos. 1994. T. 2. P. 62—73.

[79] Напр.: Kiaupienė J. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės riterio vaizdinys Motiejaus Stryjkovskio tekstuose // Kultūros sankirtos. Skiriama doc. dr. Ingės Lukšaitės 60-mečiui. Vilnius, 2000. P. 117—141.

[80] Да яго літоўскія баярскія роды падрабязна даследавалі толькі Адам Банецкі і Юзаф Вольф. Аднак метады генеалагічных даследаванняў Сямковіча былі больш дасканалымі. Дарэчы, першым «генеолагам» Літвы трэба лічыць Саламона Рысінскага, які ў кнізе, прысвечанай гісторыі Радзівілаў, застасаваў па меншай меры некалькі правілаў генеалагічнага метаду (твор Саламона Рысінскага пра паходжанне роду Радзівілаў: Saliamono Risinskio veikalas apie Radvilų giminės kilmę // Risinskis Saliamonas. Trumpas pasakojimas apie garsiuosius šviesiausiojo didiko Biržų ir Dubingių kunigaikščio Kristupo Radvilos žygius / Parengė, vertė, komentarus ir pratarmę parašė S. Narbutas. Vilnius, 2000.

роды, што ўдзельнічалі ў гарадзельскай гербавай адаптацыі, раскрыў мноства датуль невядомых генеалагічных сувязяў, паспрабаваў зарэгістраваць усе зямельныя ўладанні, што належалі гэтым родам[81]. Яго даследаванням уласцівыя дэскрыпцыйны характар і, на жаль, некалькі анахранісцкае паняцце роду.

Даследаванні Сямковіча дапоўнілі працы польскіх гісторыкаў, якія, акрамя таго, знаходзіліся пад вялікім уплывам Лаўмяньскага. Гэта прысвечаныя розным родам літоўскіх паноў даследаванні Яна Глінкі, Эвы Кельмы, Міраславы Мальчэўскай, Ежы Ахманьскага, Войцеха Пельтца, Кшыштафа Пяткевіча[82]. Усім ім уласцівая генеалагічная праблематыка, а таксама праблематыка ўзнікнення буйнога землеўладання. Гэта прыклады «працы ў рамках адной тэорыі», у якіх быў сабраны багаты новы фактычны матэрыял і ўдасканалена застасаванне генеалагічнага метаду ў адносінах да літоўскага матэрыялу. Гэтыя даследчыкі не задавольваліся апісаннем членаў родаў і іх уладанняў, у сваіх працах яны дзейнічалі ў межах сфармуляванай Лаўмяньскім мадэлі пра генезіс буйнога землеўладання. У апошні час першыя персанальна-генеалагічныя даследаванні гісторыі вышэйшага стану з'явіліся і ў Літве: дысертацыя Раймонды Рагаўскене пра Мікалая Радзівіла Рудога і Неле Асадаўскене пра род Кішкаў у XV—XVII ст.[83].

Побач з гэтымі працамі неабходна таксама згадаць артыкул Уладзімежа Ярмоліка пра дваран Казіміра[84] і артыкул Беаты Мажэйкі пра цікавую акцыю аднаго літоўскага знатнага роду[85].

P. 128—180). Працы Рысінскага і аўтараў гербоўнікаў XVI—XVIII ст. абмяркоўваць тут не буду. Яны цікавая крыніца тагачаснай гістарычнай самасвядомасці, аднак для вывучэння гісторыі знаці XIV—XV ст. не маюць вялікага значэння.

[81] Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle 1413 r. // Miesięcznik heraldyczny. 1913. R. 6. 1914. R. 7; Rocznik polskiego towarzystwa heraldycznego. 1920. T. 5. 1921—1923. T. 6. 1924—1925. T. 7. 1926—1927. T. 8. 1928—1929. T. 9.

[82] Гл. спіс літаратуры.

[83] Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kancleris Mikalojus Radvila Rudasis (apie 1515—1584 m.). Vilnius, 2002; Asadauskienė N. Kiškų giminė LDK XV—XVII a. (genealoginis tyrimas). Vilnius, 2003.

[84] Jarmolik W. Kariery polityczne dworzan litewskich Kazimierza Jagiellończyka // Europa orientalis. Polska i jej sąsiedzi od średniowiecza po współczesność. Studia i materiały ofiarowane Profesorowi Stanisławowi Alexandrowiczowi w 65 rocznicę urodzin. Toruń, 1996. S. 93—101.

[85] Możejko B. Starosta bielski Iwaszko Dowojnowicz w sporze z mieszczanami gdańskimi. Nieznane źródła do badań nad mentalnością szlachecką i bielską hierarchią urzędniczą // Społeczeństwo Polski średniowiecznej: zbiór studiów. 1999. T. 8. S. 207—218.

У Літве склад баярства на мяжы XIV—XV ст. стаў даследаваць Эгідыюс Банёніс, які, на жаль, пакінуў толькі пачаткі працы[86]. Ён праверыў зацверджаную ў гістарыяграфіі версію пра спецыяльны адбор літоўскіх баяраў на гарадзельскую адаптацыю і прыйшоў да высновы, што гэта версія не з'яўляецца абавязковай. Удзел часткі асоб у дамовах такога рангу быў сам сабой зразумелы, а астатнія нічым не адрозніваласа ад шараговых літоўскіх баяраў[87]. Банёніс таксама даследаваў службу паслоў ВКЛ[88]. Праўда, асноўная частка яго манаграфіі прысвечаная познім часам Аляксандра і Жыгімонта Старога.

Розныя аспекты гісторыі літоўскай знаці XV ст. даследавалі Освальд П. Бакус[89] і Стывен К. Роўэл[90]. Апошні гісторык аналізаваў узаемныя адносіны вялікага князя і знаці, і гэтыя адносіны ён разумеў больш дыферэнцавана, чым у ранейшай гістарыяграфіі. Ён заўважыў неаднароднасць літоўскай знаці, і таму ў сваіх даследаваннях выкарыстоўваў катэгорыю груп знаці.

Нягледзячы на гэтыя працы, даследаванні персаналій засталіся на перыферыі гістарыяграфіі. У сінтэтычных працах па палітычнай гісторыі XV ст. толькі зрэдку выкарыстоўваюцца іх вынікі і амаль няма раздзелаў, прысвечаных баярству[91]. Свед-

---

[86] Banionis E. Lietuvos bajorai 1413 m. Horodlėje // Žalgirio laikų Lietuva ir jos kaimynai (= Acta historica Universitatis Klaipedensis. T. 1). Vilnius, 1993. P. 189—203.

[87] Тамсама. P. 197.

[88] Banionis E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės pasiuntinybių tarnyba XV—XVI amžiais. Vilnius, 1998.

[89] Backus O. P. Motives of West Russian Nobles in Deserting Lithuania for Moscow 1377—1514. Kansas — Lawrence, 1957; Backus O. P, Die Rechtsstellung der litauischen Bojaren 1387—1506 // Jahrbücher für Geschichte Osteuropas. 1958. 6. S. 1—32.

[90] Rowell S. C. Išdavystė ar paprasti nesutarimai? Kazimieras Jogailaitis ir Lietuvos diduomenė 1440—1481 metais // Lietuvos valstybė XII — XVIII a. Vilnius, 1997. P. 45—74; Rowell S. C. Rusena karas Žemaičiuose: keletas pastabų apie 1442 m. privilegijos genezę // Žemaičių praeitis. 1998. T. 8. P. 5—28.

[91] Напр.: Lewicki A. Powstanie Świdrygiełły. Kraków, 1892; Prochaska A. Dzieje Witołda w księcia Litwy. Wilno, 1914; Vytautas Didysis / red. P. Šležas. Kaunas, 1930; Jogaila / Red. A. Šapoka. Kaunas, 1935; Matusas J. Švitrigaila Lietuvos didysis kunigaikštis. Kaunas, 1938; Dundulis B. Lietuvos kova dėl valstybinio savarankiškumo XV amžiuje. 2-as leid. Vilnius, 1993 і інш. Можна згадаць толькі некалькі выключэнняў: Барвінський Б. Жігимонт Кейстутович. Жовква, 1905 (спіс прыхільнікаў Жыгімонта Кейстутавіча); Halecki O. Ostatnie lata Świdrygiełły i sprawa wołyńska za Kazimierza Jagiellończyka. Kraków, 1915 (рэестр паплечнікаў Свідрыгайлы).

чаннем гэтага ігнаравання з'яўляюцца шматлікія памылкі на іх старонках.

Склад, структура і ўлада знаці канца XIV—XV ст. — гэта шматслойны аб'ект даследавання. Агляд гістарыяграфіі паказвае, што асобны разгляд такіх пытанняў пакідае шмат нявысветленых праблем. Гэты досвед змушае па-іншаму структураваць працу. Склад і структура знаці — гэта два аспекты аднаго і таго ж даследавання, што тлумачаць і дапаўняюць адзін адно. Звесткі па персаналіях дапамагаюць лепей зразумець сацыяльную гісторыю, і, наадварот, вывучэнне структуры грамадства нярэдка дапамагае дакладней высветліць біяграфічныя факты. Генеалагічныя пошукі дадаюць няшмат, калі не разглядаецца структура роду. Але без дэталёвых генеалагічных даследаванняў нельга заўважыць структурных зрухаў, што адбываюцца. Пастаяннае ўзгадненне «структурнага» і «персанальнага» падыходаў — сутнасны матыў гэтай працы.

Нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці гістарычных прац, знаць канца XIV—XV ст. дагэтуль не стала аб'ектам асобнага даследавання. Даследчыкі звычайна ўдзялялі найбольшую ўвагу радзе гаспадара, урадам і іншым інстытуцыям. Найбольш пытанняў выклікаюць гістарыяграфічныя высновы даследаванняў ранняга перыяду. Баярства перадунійнай эпохі і часоў Вітаўта звычайна ацэньваецца толькі як выканаўца палітыкі вялікага князя, а яго ўплыў на найважнейшыя палітычныя падзеі не разглядаецца асобна. Тым часам, тут знаць разумеецца як самастойны палітычны фактар, які дыспануе ўласнымі сродкамі ўлады.

Аб'ект гэтага даследавання шырэйшы, чым у ранейшых працах, прысвечаных палітычнай эліце. Каб зразумець становішча найбольш уплывовых асоб, абавязкова трэба разгледзець іх сацыяльнае атачэнне, уключаючы ў даследаванне і родзічаў гэтых асоб. Тэарэтычныя прававыя і станавыя адрозненні — гэта элементы «вымысленай» рэчаіснасці, што непасрэдна не ўздзейнічалі на жыццё людзей. Разгляд дзейнасці асобных прадстаўнікоў знаці пастаянна пагражае небяспекай страты шырэйшага гістарычнага кантэксту. Тым часам, сацыяльная група (род, царкоўная супольнасць, палітычная група), будучы такой жа рэальнай, як і індывід, упаўнаважвае на шырэйшыя сацыяльныя абагульненні. Ка-

рыстаючыся катэгорыяй сацыяльнай групы, можна нашмат лепей зразумець працэсы, што адбываюцца, інтэрпрэтаваць палітычныя падзеі і пад.

У даследаваннях становішча знаці амаль заўсёды ігнаруецца феномен самасвядомасці. А менавіта ён па сутнасці і вызначаў дамінаванне прынцыпу высакароднасці ў тагачасным грамадстве. Даследчыкі, якія не бралі пад увагу фактар самасвядомасці знатных родаў, не маглі адэкватна ацаніць спецыфічныя сацыяльныя структуры. З феноменам самасвядомасці шчыльна звязаны яшчэ адзін аспект, які ў даследаваннях літоўскага баярства пакуль што не дачакаўся належнай увагі. Гэта імёны баяраў, змены ў сістэме якіх на мяжы XIV—XV ст. указваюць на істотныя сацыяльныя зрухі, што адбываліся, і іх адлюстраванне ў свядомасці людзей.

КРЫНІЦЫ

Збіраючы звесткі пра літоўскую знаць, неабходна перагледзець па сутнасці ўсе крыніцы эпохі. Акрамя таго, карысна зазіраць і ў пазнейшыя дакументы, дзе нярэдка можна спаткаць адлюстраванне больш старажытных рэалій. У гэтай працы выкарыстаны пісьмовыя крыніцы трох тыпаў: наратыўныя тэксты, лісты і дакументы[92].

Наратыўныя крыніцы — гэта, у першую чаргу, гістарыяграфічныя творы. Для перыяду даследавання важнае значэнне маюць ордэнскія, польскія, рускія і літоўскія хронікі і летапісы. Вельмі карысныя (асабліва да пачатку XV ст.) ордэнскія хронікі: Віганда з Марбурга, Германа з Вартберга і Ёгана Позільге[93]. Апісваючы асноўны аспект дачыненняў з

[92] Тут і далей я выкарыстоўваю гэтае паняцце замест звычайнага для гістарыяграфіі паняцця «акт». У крыніцазнаўстве іншых краін праводзіцца больш дакладная дыферэнцыяцыя крыніцаў, адасабляюцца «дакумент» («дыплом») і «акт» (напр., ням. «Urkunde» і «Akte»). Гэтак тэрміналагічна фіксуецца адрозненне індывідуальнага дакумента, што мае прававую моц і, звычайна, поўны фармуляр, і збору актаў, асноўным прызначэннем якога не з'яўляецца прававы доказ (напр., акты Літоўскай Метрыкі).

[93] Hermann de Wartberge. Chronicon Livoniae // SRP. Bd. 2. S. 21—116; Wigand von Marburg. Cronica nova prutenica // SRP. Bd. 2. S. 453—662; Johann von Posilge. Chronik des Landes Preussen (nebst Fotsetzungen) // SRP. Bd. 3. S. 79—388. Пра гістарыяграфію Нямецкага ордэна гл.: Boockmann H. Die Geschichtsschreibung des Deutschen

літоўцамі — ваенныя дзеянні, яны падаюць карціны пэўных рэальных сітуацый, у якіх высвятляюцца істотныя дэталі ўладных адносінаў унутры краю. Доўгі час інфармацыя з наратыўных крыніц такога кшталту ацэньвалася досыць скептычна, аднак пазней, калі гісторыкі навучыліся адасабляць тэндэнцыі і тэндэнцыйнасць, яна была рэабілітаваная. Больш адэкватнае разуменне гістарычнай культуры сярэднявечнай эпохі дае крытэрыі, абапіраючыся на якія можна паставіць пад пытанне або легітымізаваць сапраўднасць таго ці іншага гістарычнага аповеду. Пры інтэрпрэтацыі гістарыяграфічнага твора неабходна ўвесь час звяртаць увагу на мноства дэталяў — адрасата твора і звязаныя з гэтым праблемы, на мову, стылістыку (напр., ужыванне топасаў), сімволіку лічбаў і пад. Але гэтыя заўвагі не адносяцца выключна да наратыўных тэкстаў, яны ў большай ці меншай ступені актуальныя і для крыніц іншых тыпаў. Мы ўбачым, што нават такая нібыта «аб'ектыўная», правамоцная крыніца, як дакумент, часта змяшчае праблемны тэкст.

У сярэднявечнай польскай гістарыяграфіі вылучаецца хроніка Яна Длугаша[94]. Найбольш інфарматыўная яе частка пачынаецца прыкладна ад пачатку XV ст. Асаблівае значэнне маюць звесткі Длугаша пра ўнутрылітоўскія канфлікты XV ст., гэтыя звесткі дапамагаюць раскрыць іх «групавы» характар. Як і ў выпадку з ордэнскімі аўтарамі, пры ацэнцы асобных заўваг польскага храніста неабходна звяртаць увагу на непазбежныя «трансплантацыі» катэгорый і паняццяў аднаго грамадства на іншае. Прыведзеная напачатку гістарыяграфічнага агляду характарыстыка літоўскіх баяраў — тыповы прыклад такога мыслення. Не выклікае сумнення тое, што паняцце «высакароднасці» ў Яна Длугаша і ў тагачасных літоўцаў было розным. І ў гэтым выпадку неабходна памятаць, што кожны фрагмент гістарычнага твора — гэта складаны прадукт, што прайшоў праз стадыі фармулявання, перакладу, запісу, і таму яго разгляд павінен праводзіцца з улікам розных кантэкстаў (гістарычнага, моўнага і г.д.).

Ordens: Gattungsfragen und «Gebrauchssituationen» // Geschichtsschreibung und Geschichtsbewußtsein im späten Mittelalter / Hrsg. v. H. Patze. Sigmaringen, 1987. S. 447—469.

[94] Długossii Joannis Historiae Polonicae libri XII / Ed. A. Przezdziecki. T. 3—5. Cracoviae, 1876—1878. Гл.: Dąbrowski J. Dawnie dziejopisarstwo polskie (do roku 1480). Wrocław, 1964; Nikodem J. Zbigniew Oleśnicki w historiografii polskiej. Kraków, 2001.

Адной з найважнейшых крыніц з'яўляецца мясцовая гістарыяграфія, якая, як прадукт таго ж грамадства, пазбаўлена некаторых кантэкстуальных неадпаведнасцей. Запозненае пранікненне пісьмовай культуры абумовіла позняе ўзнікненне літоўскай гістарыяграфіі. Гэтай прычынай абумоўлена і фрагментарнасць літоўскіх летапісаў[95]. Часавы гарызонт памяці наўрад ці сягаў значна далей, чым век аднаго пакалення, пры апісанні падзей мінуўшчыны ўзгадняліся характэрныя для сярэднявечнай гістарыяграфіі метады кампіляцыі і фікцыі. Таму запісы ранейшых падзей трэба ацэньваць вельмі асцярожна. Тым часам, найбольш аўтэнтычная частка летапісаў пачынаецца з другога — трэцяга дзесяцігоддзяў XV ст. З пачаткам гэтага перыяду паведамленні робяцца больш дакладнымі, і гэта ўжо неаднаразова заўважана ў гістарыяграфіі. Самае істотнае тое, што яны дазваляюць зразумець аўтэнтычныя асаблівасці ўзаемных адносінаў гістарычных асоб, раскрываюць розныя феномены самасвядомасці. І ўсё ж трэба адзначыць, што ўсім тагачасным гістарыяграфічным творам уласцівая выключная ўвага да канфліктаў, у той жа час феномены мірнага жыцця на іх старонках адлюстроўваюцца значна радзей.

Іншы тып крыніц — лісты. У асноўным гэта перапіска вялікіх князёў літоўскіх, а пазней і прадстаўнікоў літоўскай знаці з магістрамі ды іншымі ўраднікамі Ордэна, з манархамі заходнееўрапейскіх краін, з папам. У гэтую групу можна таксама ўключыць паведамленні ордэнскіх паслоў у Літве свайму кіраўніцтву, службовую перапіску ўнутры Ордэна[96]. Асноўнай

[95] Амаль усе вядомыя іх спісы апублікаваныя: Полное собрание русских летописей. Т. 17. Санкт-Петербург, 1907; Т. 32. Москва, 1975; Т. 35. Москва, 1980. Таксама: Lietuvos metraštis: Bychovco kronika / Vertė, įvadą ir paaiškinimus parašė R. Jasas. Vilnius, 1971. Пра літоўскія летапісы: Jasas R. Bychovco kronika ir jos kilmė // Lietuvos metraštis: Bychovco kronika / Vertė, įvadą ir paaiškinimus parašė R. Jasas. Vilnius, 1971. P. 8—38; Jučas M. Lietuvos metraščiai ir kronikos. Vilnius, 2002.

[96] Найважнейшыя зборы: Codex diplomaticus Prussicus / Hrsg. v. J. Voigt. Bd. 5—6. Königsberg, 1857—1861; Codex epistolaris saeculi decimi quinti. T. 1. / Wyd. A. Sokołowski i J. Szujski. Kraków, 1876. T. 2—3 / Wyd. A. Lewicki. Kraków, 1891—1894; Codex epistolaris Vitoldi magni ducis Lithuaniae 1376—1430 / Ed. A. Prochaska. Cracoviae, 1882; Caro J. Liber cancellariae Stanislai Ciołek // Archiv für österreichische Geschichte. 1871. Bd. 45. 1875. Bd. 52; Liv-, Est, und Curländisches Urkundenbuch / Hrsg. v. F. G. Bunge. Bd. 2—12. Reval—Riga—Moskau, 1855—1910. Пра канцылярыю і лісты Вітаўта: Kosman M. Kancelaria wielkiego księcia Witołda // Studia źródłoznawcze. 1969. T. 14. S. 91—119; Čapaitė R. Vytauto laiškai kaip Viduramžių epistolinio žanro pavyzdys // Metraščiai ir kunigaikščių laiškai. Vilnius, 1996. P. 47—95.

каштоўнасцю гэтых крыніц з'яўляюцца непасрэдныя адносіны да падзей. Лісты і паведамленні звычайна пішуцца адразу пасля здарэнняў, што апісваюцца ў іх. Найбольш цікавыя — рэляцыі ордэнскіх ураднікаў пра літоўскія падзеі, яны ў меншай ступені падлягаюць уздзеянню рытарычных правілаў тагачаснай эпістолікі, абапіраюцца на жывыя сведчанні або нават непасрэднае назіранне за падзеямі. Па зразумелых прычынах яны менш тэндэнцыйныя. Досыць падрабязна пераказваюцца перамовы, а цытаванне выказванняў літоўскіх прадстаўнікоў дазваляе лепей зразумець паняцце ўлады, адносіны паміж гаспадаром і знаццю, ранг асобных прадстаўнікоў знаці. У іх таксама шмат канкрэтнай інфармацыі пра літоўскія ўрады, склад пасольстваў. Інтэрпрэтацыя лістоў вялікіх князёў літоўскіх больш складаная, аднак яны, падобна як і мясцовая гістарыяграфія, змяшчаюць багаты матэрыял для даследавання самасвядомасці. Адмоўная рыса крыніц гэтага жанру — іх дыскрэтны характар, гэта своеасаблівыя тэматычныя разрэзы, для разумення якіх неабходна папярэдне валодаць інфармацыяй пра апісаныя падзеі.

Калектыўныя ці індывідуальныя лісты прадстаўнікоў літоўскай знаці — нешматлікія крыніцы, што непасрэдна адлюстроўваюць іх самасвядомасць. На жаль, гэтых лістоў у XV ст. яшчэ вельмі няшмат, а іх адрасаты — толькі ўраднікі Нямецкага ордэна ці гарады. Збольшага гэтую акалічнасць абумовіла развітая архіўная культура ордэнскай дзяржавы, што моцна закранула суседнія краіны[97]. З іншага боку, пісьмовая камунікацыя ў XV ст. у Літве яшчэ была рэдкай. За выключэннем некалькіх службовых распараджэнняў, амаль адсутнічаюць прыклады ўзаемнай перапіскі прадстаўнікоў знаці. У лістах знатных асоб XV ст. змешчана мала інфармацыі пра іх прыватнае жыццё, у той час яшчэ не было мяжы паміж прыватным лістом і службовым паведамленнем.

---

[97] Большасць гэтых лістоў яшчэ не апублікавана і захоўваецца ў Таемным архіве культурнай спадчыны Пускай дзяржавы ў Берліне. Там жа можна знайсці і неапублікаваныя лісты Вітаўта, Свідрыгайлы, Жыгімонта Кейстутавіча, Казіміра, а таксама перапіску ўраднікаў Ордэна, што закранае Літву. Гэты матэрыял дазваляе істотна паглыбіць веды пра функцыянаванне ўлады літоўскай знаці ды сабраць новыя звесткі да біяграфій яе прадстаўнікоў. Пра гэты архіў і яго літуаніку гл.: Ivinskis Z. Karaliaučiaus archyvo svarba Lietuvos praeičiai // Ivinskis Z. Rinktiniai raštai. T. 2. Roma, 1986. P. 22—32.

Спецыфічная крыніца — апісанні крыжакамі даро г у Літву (*Вегеберыхты*, *Wegeberichte*)[98]. Яны пісаліся з прагматычнымі мэтамі, таму ступень даверу да іх вельмі высокая. *Вегеберыхты* падаюць шмат звестак пра маёнткі літоўскіх баяраў канца XIV — пачатку XV ст., іх тапаграфію. Але інфармацыйныя магчымасці *Вегеберыхтаў* у гістарыяграфіі нярэдка пераацэньваліся. Мэтаю складання апісанняў была не рэгістрацыя ўсіх уладанняў князёў і знаці, а, хутчэй, лакалізацыя асноўных (і, пра што нельга забывацца, размешчаных на шляхах рыцарскіх паходаў) сядзіб. Не зважаючы на гэтую акалічнасць, некаторыя даследчыкі, што працавалі з *Вегеберыхтамі*, прыходзілі да высноў, што сягаюць празмерна далёка.

Апошняя група крыніц, якую трэба абмеркаваць, хіба што, найбольш праблемная. Гэта дакументы канцылярыі вялікага князя і канцылярыі Касцёла (прывілеі, дамовы, наданні)[99]. У сярэдзіне XV ст. з'явіліся першыя дакументы, складзеныя ў маёнтках знаці, але ў гэтым стагоддзі іх было яшчэ вельмі мала.

Асаблівую каштоўнасць для гэтай працы ўяўляюць спісы сведак дакументаў вялікага князя (тэстацыі). Яны — асноўная крыніца пры імкненні высветліць склад кіруючай

---

[98] Die littauischen Wegeberichte // SRP. Bd. 2. S. 664—711. Падрабязней пра гэтую крыніцу і ідэнтыфікацыю многіх мясцовасцей гл.: Biržiška V. Kryžiuočių keliai į Lietuvą XIV a. // Praeitis. 1930. T. 1. P. 1—63.

[99] Зборы: Akta unii Polski z Litwą 1385—1791 / Wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. Kraków, 1932; Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Slawucie / Wyd. Z. L. Radziszewski i in. T. 1—3. Lwów, 1887—1890; Vitoldiana: codex privilegiorum Vitoldi magni ducis Lithuaniae 1386—1430 / Zebrał i wyd. J. Ochmański. Warszawa—Poznań, 1986; Codex diplomaticus Lithuaniae / Ed. E. Raczyński. Vratislaviae, 1845; Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej / Wyd. J. Fijałek i W. Semkowicz. Kraków, 1932—1948; Jablonskis K. Nauji Vytauto laikotarpio aktai // Praeitis. 1933. T. 2. P. 375—411; Napiersky K. E. Russisch-livländische Urkunden. St. Petersburg, 1868; Die Staatsverträge des Deutschen Ordens in Preußen im 15. Jahrhundert / Hrsg. v. E. Weise. T. 1. Königsberg, 1939. T. 2. Marburg, 1955 і інш. Публікацыі кніг Літоўскай Метрыкі XV ст.: Русская историческая библиотека. Т. 27. Санкт-Петербург, 1910; Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3 / Parengė L. Anužytė ir A. Baliulis. Vilnius, 1998. Пра дамовы Нямецкага ордэна і іншыя дакументы ордэнскай канцылярыі: Neitmann K. Die Staatsverträge des Deutschen Ordens in Preußen 1230—1449. Köln—Wien, 1986; Müller U. Das Geleit im Deutschordensland Preußen. Köln—Weimar — Wien, 1991. Пра канцылярыю каралёў Польшчы: Krzyżaniakowa J. Kancelaria królewska Władysława Jagiełły. Cz. 1—2. Poznań, 1972—1979; Sułkowska-Kurasiowa I. Polska kancelaria królewska w latach 1447—1506. Wrocław, 1967.

эліты, дынаміку яго змены, дыферэнцыяцыю ўнутры гэтай групы. Захаваныя арыгіналы міжнародных дамоў і іншых дакументаў з пячаткамі прадстаўнікоў знаці, што выступалі ў ролі сведак, даюць рэдкую магчымасць высветліць генеалагічныя сувязі розных асоб.

Змест прывілеяў і наданняў дазваляе лепей зразумець сацыяльную структуру грамадства. Аднак інтэрпрэтацыя нават гэтых, з першага погляду празрыстых і адназначных, звестак дакументаў павінна праводзіцца з улікам пэўных момантаў. У гэтай працы неаднаразова аналізуецца значэнне пісьмовага дакумента ў жыцці тагачаснага грамадства. Крыніцы, што дайшлі да нас, непазбежна адлюстроўваюць толькі частку сацыяльнай рэчаіснасці, і на гэтую перспектыву, абумоўленую крыніцамі, неабходна абавязкова рабіць папраўку. Існуючы на працягу доўгага часу «канцылярскі манапалізм» вялікага князя (не лічачы дакументаў Касцёла), пэўныя асаблівасці фармавання архіўных фондаў[100] ды ранняе выміранне вялікай часткі знатных родаў[101] абумовілі фармаванне аднабаковай базы крыніц. Адносіны землеўладання дакументаваліся ў першую чаргу ў інтарэсах цэнтральнай улады, а гэта ўжо відавочны выпадак «несвядомага адбору». Дамовы, што не закраналі правы вялікага князя, а таксама дзеянні, якія рэгуляваліся звычаёвым правам, найчасцей заставаліся незафіксаванымі на пергаменце ці паперы.

Іншая праблема — неадпаведнасць рэальнасці і сістэмы паняццяў у канцылярскіх мовах (асабліва лацінскай). Складаныя сацыяльныя і землеўласніцкія адносіны немагчыма было дакладна адлюстраваць адшліфаванымі класічнымі фармулёўкамі, таму даследчык павінен пастаянна памятаць пра правіла «падвойнага перакладу».

Зразумела, што гэтыя праблемы не могуць зменшыць крыніцазнаўчай вартасці дакументаў. Аднак неабходна яшчэ

---

[100] І так нязначная колькасць дакументаў знаці XV ст. яшчэ больш змяншалася. Толькі ў рэдкіх выпадках яны ўключаліся ў архіў канцылярыі ВКЛ — Літоўскую Метрыку (звычайна перапісваліся ў кантэксце нейкіх пазнейшых спраў). Часта яны рабіліся ахвярамі пажараў ці іншых няшчасцяў.

[101] Невыпадкова частка дакументаў знаці XV ст. захавалася толькі дзякуючы іх сувязям з родам Радзівілаў, якія фармавалі і захоўвалі свой архіў. Шляхам шлюбаў у архіў Радзівілаў патрапіла мноства дакументаў іншых родаў. Пра архіў Радзівілаў гл.: Jankowski R. Burzliwe losy archiwum Radziwiłłów z Nieświeża od XV w. do 1838 // Miscellanea historico-archivistica. 2000. T. 11. S. 35—68.

раз зрабіць акцэнт на тым, што даследаванне гэтага небагатага на крыніцы перыяду патрабуе ацэнкі ўсіх магчымых звестак, бо толькі такім чынам магчыма пазбегнуць выкрыўленай перспектывы, створанай праз унутраную супярэчнасць адной групы крыніц.

З трансакцый уладанняў, што ажыццяўляліся прадстаўнікамі знаці, звычайна пісьмова фіксаваліся толькі данацыі на карысць Касцёла[102]. Паны дарылі Касцёлу свае ўладанні, а той, у сваю чаргу, рупіўся пра іх душы. Гэта група дакументаў — найбольш інфарматыўная крыніца для вывучэння менталітэту знаці, роднасных сувязяў, землеўладання. У данацыях апісваюцца (праўда, вельмі сцісла) уладанні паноў, фіксуецца іх статус (вотчынны ці бенефіцыйны), акрэсліваюцца ўмовы перадачы зямлі. Нарэдка ў дакументах згадваюцца члены сям'і, нават далёкія родзічы. Асаблівай увагі вартыя інтытуляцыйныя і тэстацыйныя часткі дакументаў. У інтытуляцыях адлюстроўваецца сацыяльная і палітычная самасвядомасць знаці, тэстацыі дазваляюць уявіць сабе атачэнне данатара. Але і тут патрэбная ўважлівасць. У гэтых дакументах сапраўды нярэдка можна знайсці канкрэтныя асабістыя рысы паноў — ініцыятараў данацый, іх самасвядомасць запаўняе змест тэксту, аднак не трэба забываць, што святары, якія рыхтавалі дакумент, выкарыстоўвалі звыклыя для сябе катэгорыі і фармулёўкі. Акрамя таго, данацыйная дзейнасць тычылася толькі часткі ўладанняў, і, грунтуючыся толькі на ёй, немагчыма зрабіць канчатковыя высновы пра памер зямельных маёнткаў знаці. Тэстацыі дакументаў нярэдка застаюцца маўклівымі, бо названых у іх асоб далёка не заўсёды ўдаецца ідэнтыфікаваць, а прынцыпы складання гэтых спісаў дагэтуль не зусім зразумелыя.

Наўрад ці мае сэнс высвятляць усе асаблівасці крыніц у гэтым раздзеле. Пры разглядзе асобных праблем яны яшчэ будуць неаднаразова аналізавацца. У канкрэтных сітуацыях даследавання крыніцазнаўчыя праблемы павінны стаць нашмат больш зразумелымі. Тут жа істотна канстатаваць, што розныя тыпы крыніц акрэсліваюць спецыфічную траекторыю падыходу, таму ва ўсіх выпадках, калі гэта магчыма, неабходна ўзгадняць інтэрпрэтацыю асобных крыніц.

---

[102] Гл. KDKW. Некалькі неапублікаваных дакументаў захоўваюцца ў калекцыі рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы і ў Цэнтральным архіве старажытных актаў у Варшаве.

I. ПАНЯЦЦЕ ЗНАЦІ

Паняцце «знаці» з'яўляецца праблемным, і яго ўжыванне вымагае асобнага абгрунтавання. Гэтая тэрміналагічная праблема звязваецца з пытаннем асаблівасцей сярэднявечнай сацыяльнай структуры і яе адлюстравання ў свядомасці тагачасных людзей. Гісторык сутыкаецца з абавязковасцю рэфлексіі на трох узроўнях: сацыяльная рэчаіснасць сярэднявечнага грамадства, разуменне людзьмі мінулага гэтай рэчаіснасці і наша інтэрпрэтацыя той рэчаіснасці[1]. Ён можа меркаваць пра мінуўшчыну толькі абапіраючыся на пакінутыя ёю ж апісанні. У некаторых выпадках гэтая акалічнасць не адыгрывае вялікага значэння. Аднак для даследавання больш складаных адносінаў, у тым ліку і сацыяльнай гісторыі, такое пасрэдніцтва мае істотнае значэнне. Сацыяльныя інстытуты існуюць для нас настолькі, наколькі яны існавалі ў свядомасці людзей. Шляхта — гэта выключны сацыяльны стан, які меў асаблівыя формы жыцця і арганізацыі: гэтая выключнасць разумелася самой шляхтай, яе таксама прыпісваў ёй навакольны «нешляхецкі» свет[2]. Таму сацыяльная рэчаіснасць і адначасовая рэфлексія над ёй — гэта асобныя перспектывы адной і той жа праблемы.

Прадстаўнікі літоўскай знаці XIV — пачатку XV ст. не пакінулі сваіх лістоў, іх самасвядомасць можна рэканструяваць толькі на падставе апісанняў іншымі людзьмі (часта прадстаўнікамі іншага грамадства). Важныя крытэрыі дае разгляд сацыяльнай тэрміналогіі. У крыніцах другой паловы XIV — пачатку XV ст.

---

[1] Oexle O. G. Deutungsschemata der sozialen Wirklichkeit im frühen und hohen Mittelalter. Ein Beitrag zur Geschichte des Wissens // Mentalitäten im Mittelalter. Methodische und inhaltliche Probleme / Hrsg. v. F. Graus. (= Vorträge und Forschungen. Bd. 35). Sigmaringen, 1987. S. 68.

[2] Гл. пераканаўчыя выказванні Марка Блока: Блок М. Апология истории или ремесло историка. Москва, 1986. С. 86 і інш. На тым, што шляхта была ў першую чаргу ментальным феноменам або феноменам самасвядомасці, канцэнтруе ўвагу О. Г. Оксле: Oexle O. G. Aspekte der Geschichte des Adels im Mittelalter und in der Frühen Neuzeit // Europäischer Adel 1750—1950 / Hrsg. v. H.-U. Wehler. Göttingen, 1990. S. 19—56. Сацыялагічную тракоўку гэтай праблемы гл.: Berger P. L., Luckmann T. Socialinės tikrovės konstravimas. Žinojimo sociologijos traktatas. Vilnius, 1999. P. 74—90.

часцей за ўсё сустракаюцца такія тэрміны для абазначэння знаці, як *nobiles, bayoren*. Заўвага Эдвардаса Гудавічуса пра напісанне апошняга паняцця ў ордэнскіх крыніцах на літоўскай гаворцы дазваляе сцвярджаць, што гэтае слова было пашырана і ў штодзённай мове[3]. Гэта найбольш агульная назва высакародных. Хронікі Нямецкага ордэна падаюць і іншыя тэрміны — *meliores, proceres, satrapa, nobilis satrapa*, нават *meliores satrapae*. Падаецца, што храністы гэтымі варыяцыямі паняццяў хацелі перадаць розны сацыяльны статус вярхушкі грамадства. Гэта яшчэ не супрацьпастаўляе знаць «звычайным» баярам, бо *nobiles / bayoren* маглі абазначаць як адных, так і другіх. Няма ніякай падставы казаць пра асобны стан знаці. Аднак нельга не заўважыць фактычныя адрозненні ў іх становішчы. Таму можна меркаваць, што існаваў асобны сацыяльны слой, у руках якога знаходзілася выкананне ўладных функцый: яго прадстаўнікі займалі найважнейшыя пасады, складалі раду вялікага князя, валодалі маёнткамі і паступова станавіліся буйнымі землеўласнікамі. Гэты сацыяльны слой і з'яўляецца аб'ектам даследавання.

Звычайна ў гістарыяграфіі існаванне ў XIV — пачатку XV ст. у Літве баярскага стану «ў сапраўдным сэнсе гэтага слова» адмаўляецца праз своеасаблівы погляд «знізу»: стан гэты нібыта не быў закрытым, і ў яго маглі трапіць людзі небаярскага паходжання. Сапраўды, тагачасныя крыніцы апісваюць не адзін выпадак надання баярскіх правоў, асабліва шмат такіх прыкладаў дайшло з часоў Вітаўта. Відавочна, што баярына і селяніна яшчэ не падзяляла непераадольная сацыяльная прорва. Аднак такая аргументацыя небясспрэчная. З аднаго боку, яна прымяняе ў адносінах да грамадства пералому XIV—XV ст. крытэрыі «шляхецтва», якія ўзніклі значна пазней, з іншага боку, ніхто не даказаў пераканаўча, што сацыяльная мабільнасць — прыкмета выключна ранняга Сярэднявечча. Шляхціц у розныя стагоддзі меў спецыфічныя асаблівасці, таму крытэрый станавай закрытасці дзейнічае толькі для эпохі, што яго сфармулявала. Тая ж заўвага актуальна і для выпадку з гербамі. Навейшая гістарыяграфія ўжо падкарэктавала сцвярджэнне Сямковіча пра нібыта не ўсталяваны характар знакаў літоўскіх баяраў да Гарадзельскай уніі. Стылістыка пячатак літоўскай знаці канца XIV — пачатку XV ст. была ўжо

[3] Gudavičius E. Šlėktų atsiskyrimas... (1. Bajorų luomo susidarymas XV a.). P. 98.

зусім іншай у параўнанні з сялянскімі знакамі[4]. Яна прайшла доўгі шлях развіцця. Лёгкая інтэграцыя гарадзельскіх гербаў і факт іх паслядоўнай перадачы ў спадчыну паказвае адпаведнасць мясцовых умоў гэтай «ін'екцыі». Цікава, што храналогія зацвярджэння гербаў блізкая генезісу спадчынных імёнаў знатных родаў. На той час ужо існавала група людзей, прыналежнасць да якой была вызначаная спадчыннасцю сацыяльнага становішча. Прававое замацаванне гэтага становішча — другарадная рэч, якая не мяняе існуючых адносінаў.

Праблемнай з'яўляецца і сама ідэя «баярскага стану». Гэта ўласцівы хрысціянскаму сярэднявечнаму мысленню (і не толькі яму) элемент падзелу грамадства на тры станы — *tres ordines / tria genera hominum — oratores, bellatores, laboratores* (тыя, хто моляцца, ваююць, працуюць). Задачай найбольш папулярнай і звычайнай грамадскай стратыграфіі ў Сярэднявеччы было ў першую чаргу акрэсліць абавязкі асобных членаў соцыуму. На афарбоўку паказвае сам выбар катэгорый (напр., *bellatores*, а не *nobiles*). І гэта нядзіўна, калі памятаць пра паходжанне гэтай ідэі. Першымі яе сфармулявалі хрысціянскія тэарэтыкі (найбольш вядомыя тэксты Адальберона Ланскага і Герарда Камбрэйскага першай паловы XI ст.), што намагаліся аб'яднаць усю хрысціянскую супольнасць у неспакойныя часы. У гістарыяграфіі шырока дыскутуецца пытанне, наколькі гэтая схема адпавядала тагачаснай сацыяльнай рэчаіснасці, ці не была яна толькі пэўным тэарэтычным праектам. Так ці інакш, лічыцца, што гэтая ідэя дапамагла структураваць дастаткова стракатую сацыяльную рэальнасць[5]. У Літве тэарэтычныя рэфлексіі такога кшталту з'явіліся значна пазней. Адным з першых у другой палове XVI ст. падрабязны, але крыху адаптаваны варыянт тэорыі «трох станаў» прадставіў Андрэй Волан, які вылучыў у сучасным яму грамадстве ВКЛ тры станы — высакародных (шляхту), мяшчан і сялян[6].

---

[4] Gudavičius E. Žymenys ir ženklai Lietuvoje XII — XX a. Vilnius, 1980. P. 111—112.

[5] Больш падрабязна гл.: Oexle O. G. Die funktionale Dreiteilung der «Gesellschaft» bei Adalbero von Laon // Frühmittelalterliche Studien. 1978. Bd. 12. S. 1—54; Russocki S. Średniowieczne kondycje i stany // Społeczeństwo Polski średniowiecznej: zbiór studiów. 1985. T. 3. S. 189—218.

[6] Volanas A. Rinktiniai raštai / Sudarė M. Ročka ir I. Lukšaitė. Vilnius, 1996. P. 65. Падрабязней гл.: Petrauskas R. Luomai // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštijos kultūra: tyrinėjimai ir vaizdai. Vilnius, 2001. P. 320.

Тэарэтычнае і прававое паняцце пра стан дасягнула Літвы разам з хрысціянствам. Першыя яго сляды сустракаюцца ў самых ранніх прывілеях вялікіх князёў (асабліва Гарадзельскім прывілеі 1413 г.)[7]. Аднак гэтыя прывілеі яшчэ не з'яўляюцца доказам рэцэпцыі ідэі. Сумніўна, што літоўскія баяры XIV—XV ст. адчувалі сябе прадстаўнікамі нейкага адзінага стану. Абагульняючы іх паняццем стану, мы ігнаравалі б істотныя прынцыпы самаідэнтыфікацыі. Калі ў XV ст. узнікла патрэба акрэсліць сябе, яны ўжывалі формулы *haeres, filius, de*[8], раскрываючы гэтак родавыя прыярытэты самасвядомасці. Аснова іх высакароднасці — не станавая, а родавая прыналежнасць. Таму ў іх адносінах паміж сабой няма прынцыпу станавай роўнасці. Высакароднасць не можа быць аднаразовай і індывідуальнай, яна — спадчынная. Яна можа мець ступені: высакародны, больш высакародны, самы высакародны. Яшчэ ў XVI ст. Альберт Гаштаўт кажа пра большую годнасць свайго роду[9], ступень якой вызначае становішча блізкіх.

Такая выснова змушае шукаць іншую інтэрпрэтацыю паняцця баярства. Магчыма, менавіта матыў паходжання найлепш адлюстроўвае яго змест. Паняцце высакароднасці лагічнае толькі ў кантэксце роду. Баярын — гэта член такога роду, які вылучаецца пэўнымі якасцямі і пэўным становішчам. Прававыя адрозненні ў тым грамадстве не былі адзінымі і нават пераважнымі станавымі адзнакамі. Гамагенны баярскі стан, які апісваецца ў ранніх прывілеях і судзебніках, унутры быў дастаткова разнародным. Рэальнае сацыяпалітычнае адрозненне асобных індывідаў і родаў стварала досыць гетэрагенную карціну сацыяльных адносінаў. Сярод баяраў вылучалася група людзей, уплывовых бацькоў, якія, дзякуючы паспяховым шлюбам і блізкасці да гаспадара, выконвалі найважнейшыя кіраўнічыя функцыі. Гаспадар мог уплываць на размеркаванне рангу ўнутры гэтай групы, аднак істотна змяніць яе склад ён не мог. Можна хутчэй казаць

[7] Напр., 22.02.1387 г. Ягайла ў выдадзеным у сувязі з хростам дакументе згадвае ««omnes nacione Lithvanos utriusque sexus, cuiuscunque status, condicionis aut eminencie» (KDKW. S. 13).

[8] Гл. данацыйныя дакументы знаці у зборы KDKW. Інтытуляцыі дакументаў знаці паказваюць, што звычай пазначаць побач з паходжаннем пасаду і іншыя сацыяльныя атрыбуты з'яўляецца параўнальна позна.

[9] Jasas R. Lietuvos kanclerio Alberto Goštauto memorialas karalienei Bonai (1525) // Mokslinės bibliotekos metraštis. Vilnius, 1972. P. 233 (= Šešioliktojo amžiaus raštija. Vilnius, 2000. P. 33).

пра механізм «самастойнага» самааднаўлення стану эліты (напрыклад, паспяховы шлюб мог значна змяніць становішча асобы). Гэтыя людзі адасаблялі сябе ад іншых баяраў, пазначаючы ў дакументах побач з паходжаннем і сацыяльны статус — *dominus, magnificus, generosus, панъ*. Трэба звярнуць увагу і на паняцце «барон» (*baro/barones*). Прадстаўнікі літоўскай знаці называюцца «баронамі» ўжо ў лістах Вітаўта, але шырэй за ўсё гэта паняцце выкарыстоўвалася ў чужаземных хроніках XV ст. У Заходняй Еўропе гэтую катэгорыю ўжывалі толькі ў адносінах да шляхціцаў высакароднага («свабоднага») паходжання, супрацьпастаўляючы іх асобам «несвабоднага» паходжання, тым, хто выслужыў шляхецтва. Такі тэрміналагічны выбар хаўістаў, верагодна, так ці інакш адлюстроўвае тагачасны статус літоўскай знаці ў грамадстве. Акрамя таго, сацыяльная тэрміналогія звычайна са спазненнем фіксуе змены, што адбыліся. Таму можна абгрунтавана казаць пра сацыяльную дыферэнцыяцыю ўнутры баярства. Яна не была акрэслена ў прававым сэнсе, аднак прававыя бар'еры — не адзіны паказчык адрозненняў паміж сацыяльнымі групамі. Знаць XV ст. ужо пайшла па шляху фармавання стану. Гэта было абумоўлена як унутраным развіццём літоўскага грамадства, так і новым паняццем стану, што прыйшло з хрысціянствам і заходнім уплывам.

Адзін з крытэрыяў, што дазваляе казаць пра фармаванне асобнага слоя найбольш уплывовых людзей, — гэта іх шлюбная палітыка (гл. **дыяграму**)[10].



Дыяграма шлюбных сувязяў літоўскай знаці ў XV ст.

[10] Больш канкрэтныя звесткі пра шлюбы знаці гл. у прасапаграфіі знаці.

Шлюбная палітыка — важны паказчык з'яўлення станавай самасвядомасці. Нягледзячы на тое, што мы маем вартыя даверу звесткі толькі пра 51 шлюб прадстаўнікоў знаці, тэндэнцыя шлюбнай палітыкі відавочная. Толькі невялікая частка звычайнага баярства здолела праз шлюб парадніцца са знаццю. Апроч таго, істотна зазначыць, што амаль ва ўсіх вядомых выпадках у гэтыя няроўныя шлюбы ўступалі дачкі ўплывовых бацькоў. Знаць імкнулася завязаць шлюбныя сувязі з асобамі таго ж стану або з асобамі княскага паходжання. Некалькі вядомых шлюбаў з мазаўшанамі і палякамі таксама неабходна разглядаць як саюзы ў межах таго ж сацыяльнага стану. Пра эндагамную матрыманіяльную палітыку сведчаць і досыць частыя шлюбы сярод сваякоў, што патрабавала асобнага папскага дазволу.

Пра вылучэнне знаці ў асобную сацыяльную групу сведчыць таксама эвалюцыя паняцця «баярын» у XIV—XV ст.[11]. У XIV — пачатку XV ст. гэтым тэрмінам можна было акрэсліць і прадстаўнікоў найвышэйшай групы паноў, але з сярэдзіны XV ст. ён часцей за ўсё ўжываецца толькі ў адносінах да дробнага баярства. Тое, што ўжо на мяжы XIV—XV ст. для пісараў была відавочнай двухсэнсоўнасць паняцця баярын, даказваюць іх спробы яго развіць. У тэксце Гарадзенскага пагаднення 1398 г. было прадугледжана, што да дамовы з Нямецкім ордэнам Вітаўт павінен прыкласці пячатку разам са сваімі «найлепшымі баярамі» (*mit siner besten bajoren*)[12]. Гэтак жа знаць называецца ў лістах 1406 і 1427 г. — «самыя высакародныя і лепшыя баяры» (*dy eldesten und dy besten bayoren*) / «найвышэйшыя баяры» (*upersten beyaren*)[13]. Найбольш высакародныя вылучаюцца нават у радзе вялікага князя (*eldesten aws dem rote*)[14]. Таму наўрад ці абгрунтаваным выглядае пашыранае сцвярджэнне, што вылучэнне знаці з шырокай баярскай масы вызначаў польскі інстытуцыйны ўплыў і атрыманыя ў Гародлі гербы[15]. Як паказвае

[11] Jablonskis K. XVI a. belaisviai kaimynai Lietuvoje... P. 19; Gudavičius E. Šlėktų atsiskyrimas... (2. Dėl XVI a. privilegijuotųjų ir «neprivilegijuotųjų» bajorų). P. 67—73.

[12] LUB. Bd. 4. Reval, 1859. S. 207.

[13] Ліст войта Жамойці вялікаму магістру 29.06.1406 г. (GStA PK. OBA 1200); паведамленне дзюнабургскага комтура магістру Лівоніі 07.03.1427 г. (CEV. S. 757).

[14] Ліст Свідрыгайлы магістру Ордэна 15.06.1431 г. (GStA PK, OBA 5652).

[15] Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego... S. 31—78; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami... S. 80—84.

тэрміналогія ордэнскіх хронік XIV ст., дакументаў і лістоў мяжы XIV—XV ст., дыферэнцыяцыя баярства існавала і раней.

Частка найбольш уплывовых паноў, што жылі ў канцы XIV—XV ст., паходзіла, трэба думаць, са старой родавай знаці. Меркаванне пра тое, што гэта знаць вымерла ці была знішчана, выклікае паважныя сумненні[16]. Праблемай з'яўляецца пытанне прыроды ўлады яе нашчадкаў: наколькі яна была абумоўлена атрыманымі ад гаспадара кіраўнічымі функцыямі, а наколькі — спадчынным правам кіраваць.

Калі няма строга ўсталяваных прававых адрозненняў, складана вылучыць крытэрыі прыналежнасці да знаці. Адным з іх магла б быць наяўнасць пасады. Але такая трактоўка неабгрунтавана звужала б само паняцце «знаці». Колькасць урадаў была абмежаваная, далёка не ўсе сыны знатных бацькоў маглі прэтэндаваць на іх. Сістэма сімвалічных пасад — вынаходніцтва пазнейшых часоў. Апроч таго, па меншай меры з часоў Вітаўта і Жыгімонта Кейстутавіча вядома, што не ўсе найбольш уплывовыя асобы займалі пасады. Таксама недакладна было б атаясамліваць кіруючую эліту з членамі рады вялікага князя. Да інстытуцыялізацыі паноў-рады паняцце дарадцы было вельмі шырокім і неакрэсленым. Дарадцамі маглі стаць сакратары гаспадара ці нават чужаземныя рыцары, што нядоўга жылі пры двары. Такім чынам, катэгорыі ўраднікаў (тых, хто мае пасаду) і членаў рады вялікага князя — недастатковыя для вызначэння знаці. У яе склад трэба ўключаць усіх асоб, што атачалі гаспадара і ўплывалі на яго рашэнні, а таксама іх родзічаў. Крыніцы не заўсёды раскрываюць ролю некаторых асоб, асабліва тых, хто не браў удзелу ў актыўнай «цэнтральнай» палітыцы. Аднак часам дэталі крыніц адлюстроўваюць дзейнасць гэтых людзей. Тады становяцца зразумелымі падставы сацыяльнага становішча найбольш уплывовых прадстаўнікоў знаці — яны з'яўляюцца вяршыняй шырэйшай групы людзей, а іх уладу немагчыма зразумець без вывучэння гэтага сацыяльнага заплечча. Таму знаць — гэта паняцце, шырэйшае за кіруючую эліту, а даследаванне знаці — праблема, шырэйшая за даследаванне кіруючай эліты.

[16] У нямецкай гістарыяграфіі аналагічнае абмеркаванне: Irsigler F. Untersuchungen zur Geschichte... S. 79—81; у польскай: Bieniak J. Rody rycerskie jako czynnik struktury społecznej... S. 171—175.

Адна з асноўных праблем мовы гісторыка — адэкватная перадача тэрміналогіі крыніц праз сучасную мову. Было б бясконца наіўна патрабаваць захоўваць тэрміны з крыніц, бо задача гісторыка — раскрыць іх змест для сучаснасці, а гэта можна зрабіць толькі сучаснымі моўнымі сродкамі. Але, разам з тым, нерэфлексіўнае выкарыстанне сучасных паняццяў вядзе да выкрыўлення істотнай асаблівасці мінуўшчыны — яе «інакшасці», а таксама зацямняе разуменне гістарычнай умоўнасці гэтых паняццяў[17]. Як «баярства», так і «знаць» — гэта тлумачальныя паняцці сучаснай навуковай мовы і, адначасова, тэрміны з крыніц. Ігнараванне таго ці іншага іх боку змяншае аналітычную каштоўнасць працы гісторыка. Звёўшы пытанне фармавання баярства да храналагічнай праблемы з'яўлення баярскага стану ў крыніцах, мы, магчыма, і захаваем «тэрміналагічны пурызм», але рознабаковасць сацыяльных адносінаў застанецца нераскрытай, не будуць узятыя пад увагу ўрокі, якія дае гісторыя паняцця «стан». Баярства, хоць і не з'яўлялася маналітным сацыяльным слоем, разам з пэўным ладам жыцця, які вылучаў яго прадстаўнікоў, мела адну істотную характэрную рысу — права ўладарыць над людзьмі. Большая частка гэтай улады прыпадала на вярхушку баярства — знаць.

Прадстаўнікі гэтай групы ў крыніцах з чацвёртага дзесяцігоддзя XV ст. называюцца «панамі» (*dominus, baro, herr, панъ*). Аднак тэрміналогія крыніц непаслядоўная, «панамі» доўгі час называюцца таксама баяры, што нічым не вылучаюцца[18]. Гэта зразумела, бо гэтае паняцце вызначае пэўнае становішча (напрыклад, у адносінах да залежных людзей), якое было ўласціва ўсім высакародным асобам. Знаць немагчыма акрэсліць пры дапамозе выключна паняццяў з крыніц. Для даследчых мэт мае сэнс папоўніць адлюстраваную ў крыніцах сацыяльную класіфікацыю новымі крытэрыямі. У гэтай працы ў склад знаці ўключаюцца, у першую чаргу, тыя асобы, што ў значнай ступені ўплывалі на

[17] Brunner O. Land und Herrschaft: Grundfragen der territorialen Verfassungsgeschichte Österreichs im Mittelalter. 5. Aufl. Wien, 1965. S. 163—164.

[18] Н. Якавенка схільная звязваць генезіс ужывання паняцця «пан» у ВКЛ з чэшскім уплывам. У цэнтральныя землі ВКЛ гэтае паняцце прыйшло ў сярэдзіне XV ст. праз Валынь (Яковенко Н.М. Українська шляхта... С. 122). Гэта тлумачыць пачатак ужывання рускага слова «пан», аднак сам феномен літоўскай знаці адносіцца, несумненна, да больш ранняга часу. Істотнай з'яўляецца заўвага Якавенка наконт пашырэння семантычнага поля гэтага паняцця (Тамсама. С. 123—124).

жыццё краіны, г. зн. тыя, што былі найбліжэйшымі дарадцамі гаспадара, выступалі як сведкі ў яго дакументах, бралі ўдзел у пасольствах, былі ўраднікамі цэнтральнага і мясцовага ўзроўню. Гэта досыць вузкае кола асоб неабходна дапоўніць іх сваякамі. Такое рашэнне — лагічнае з пункту гледжання грамадства, што мысліла катэгорыямі паходжання. Апроч таго, як ужо згадана, такое рашэнне дазваляе лепей зразумець сацыяльны падмурак улады знаці.

У прасапаграфічным спісе 1387—1492 гг. змешчаны звесткі пра 188 прадстаўнікоў знаці. Адначасова з іх маглі жыць не больш за палову. На жаль, немагчыма дакладна сказаць, якую частку тагачаснага баярства складалі гэтыя асобы. Першай крыніцай, што адлюстроўвала дэмаграфічную сітуацыю ў Літве, быў складзены ў 1528 г. попіс войска ВКЛ. Лаўмяньскі, які аналізаваў яго, вызначыў, што ў той час на тэрыторыі ВКЛ жыло каля 13 тысяч баярскіх сем'яў, з іх 6 тысяч — у г.зв. «сапраўднай» Літве[19]. Колькасць баяраў у XV ст. была, несумненна, меншай. У XV—XVI ст. адбыўся хуткі дэмаграфічны рост, каланізацыя Падляшша, акрамя таго, у гэты час павялічылася колькасць дробнага баярства. Тым не менш, відавочна, што і ў XV ст. доля знаці, нават калі дадаць да яе князёў, не складала больш за адзін працэнт усяго вышэйшага стану. Такія суадносіны характэрныя і для заходнееўрапейскіх краін[20].

[19] Łowmiański H. Zaludnienie państwa litewskiego w wieku XVI. Zaludnienie w roku 1528. Poznań, 1998. S. 159—172.

[20] Paravicini W. Adel im spätmittelalterlichen Frankreich. Zu Philippe Contamines neuestem Buch // Francia. 1999. 25/1. S. 259—270 (тут: 260—261).

II. СКЛАД ЗНАЦІ

1. СКЛАД ЭЛІТЫ ЎЛАДЫ Ў КАНЦЫ XIV—XV СТ.

а) Сведкі ў гаспадарскіх дакументах 1392—1459 гг.: кантынуітэт эліты ўлады

Хоць паняцці знаці і эліты ўлады не супадаюць, склад знаці можна ўстанавіць толькі ў выніку разгляду складу кіруючай эліты. Толькі вызначыўшы найбольш уплывовых асоб краіны, можна рабіць далейшы крок і даследаваць іх сацыяльнае атачэнне.

Самая каштоўная крыніца, што дапамагае раскрыць склад кіруючай эліты, гэта спісы сведак у дакументах гаспадара — тэстацыі. Пералік сведак — частка фармуляра дакумента, адна з формаў яго зацвярджэння. У паняцце сведчання ўваходзіць функцыя нагляду, таму атрымальнік дакумента не ўваходзіць у шэраг тых, чые імёны ўпісаныя ў эсхатакол. Ва ўмовах панавання вуснай культуры, калі рэдкі атрымальнік дакумента ўмеў чытаць, а недасканаласць адміністрацыйных структур рабіла ажыццяўленне прывілеяў ледзьве не асабістай праблемай самога атрымальніка, сведкі былі якраз той інстанцыяй, да якой звярталіся, калі ўзнікала тая ці іншая цяжкасць пры рэалізацыі пастановаў прывілея.

Аднак гэты «погляд з перспектывы атрымальніка» гэтым разам выглядае перыферыйным. Істотнае значэнне мае іншы аспект інфарматыўнасці тэстацый. Яны акрэсліваюць кола людзей, што атачалі гаспадара ў яго пастаянных падарожжах, якія былі штодзённасцю кіравання краінай у Сярэднявеччы, і, разам з тым, вылучаюць з гэтага кола найбольш уплывовых асоб (відавочна, што за словам *praesentibus*, якое пачынае спісы сведак, хаваецца не на шмат больш людзей, чым названа ў дакуменце). Гэтыя звесткі маюць асаблівае значэнне пры разглядзе часоў, што мала асветленыя ў крыніцах, калі такія спісы часта з'яўляюцца адзіным сродкам вызначыць склад эліты ўлады.

Знаходжанне побач з гаспадаром было звязанае з магчымасцю ўздзейнічаць на рашэнні, трапляць у шэраг тых, з кім гаспадар радзіўся (*consiliarii, rath*), таму наўрад ці магчыма адасобіць суправаджэнне вялікага князя і кіруючую эліту. Гэтае сцвярджэнне падмацоўвае тая акалічнасць, што сабраны матэрыял не дазваляе ўбачыць карэляцыі паміж месцам выдачы дакумента і складам сведак. Іншая сітуацыя была ў Польшчы пад панаваннем Ягайлы, дзе знаць асобных правінцый (напр., Велікай і Малой Польшчы) нярэдка дамінавала ў дакументах, што выдаваліся ў гэтых землях[1]. Яшчэ больш сістэма падрыхтоўкі і зацвярджэння дакументаў адрознівалася ў ордэнскай дзяржаве. Як паказвае даследаванне Клауса Найтмана, у канцылярыі вялікага магістра была ўведзена сістэмная рэгламентацыя падрыхтоўкі, зацвярджэння дакументаў і сведчання ў іх. Калі рыхтаваліся дамовы з замежнымі дзяржавамі, у першую чаргу ўдзельнічалі асобы, што займалі пасады ў памежных з гэтымі краінамі раёнах[2]. У канцылярыі вялікага князя літоўскага такая дыферэнцаваная сістэма ніколі не ўводзілася, тыя ж прадстаўнікі знаці сведчылі ў дакументах, падрыхтаваных у розных месцах, выконвалі даручэнні рознага кшталту. У гэтым сэнсе дакументы вялікага князя дастаткова аб'ектыўна адлюстроўваюць склад эліты ўлады. Праўда, гэтая заўвага не актуальная для некаторых прывілеяў Вітаўта, нададзеных баярам аддаленых зямель (напрыклад, Валыні ці Падляшша). У гэтых дакументах у якасці сведак выступала нямала мясцовых баяраў. Але такіх прывілеяў няшмат, акрамя таго, іх змест закранаў толькі ўнутраныя справы гэтых зямель. Можна меркаваць, што гэта быў пэўны сімвалічны рэверанс гаспадара ў бок мясцовай знаці[3]. У кожным разе, гэтыя некалькі прывілеяў не могуць змяніць асноўныя высновы.

Большыя цяжкасці выклікае праблема вылучэння штодзённай (прыдворнай) і шырэйшай («вялікай») рады га-

---

[1] Параўн.: Sułkowska-Kurasiowa I. Doradcy Władysława Jagiełły // Społeczeństwo Polski średniowiecznej: zbiór studiów. 1982. T. 2. S. 187—220; Klimecka G. Czy rzeczywiście «doradcy Władysława Jagiełły» // Społeczeństwo Polski średniowiecznej: zbiór studiów. 1990. T. 4. S. 214—235.

[2] Neitmann K. Die Staatsverträge des Deutschen Ordens...

[3] Падобным чынам паводзілі сябе таксама польскія каралі: Fałkowski W. Elita władzy w Polsce za panowania Kazimierza Jagiellończyka (1447—1492): studium aspektów politycznych. Warszawa, 1992. S. 9—10.

спадара[4]. Прадстаўнікі знаці не заўсёды маглі суправаджаць гаспадара ў яго падарожжах, таму бягучыя справы вялікі князь абмяркоўваў з тымі дарадцамі, што былі на той час пры двары. Гэтыя дарадцы былі вельмі стракатай і хутказменнай сацыяльнай групай, нярэдка ў яе ўключаліся чужаземныя рыцары, што нейкі час жылі пры двары Вітаўта[5]. Тым не менш, аналіз спісаў сведак паказвае, што найважнейшыя рашэнні — абвяшчэнне прывілеяў, наданняў, фундацый, перамовы з замежнымі пасламі і складанне міжнародных дамоў — гаспадары прымалі і выдавалі адпаведныя дакументы пасля таго, як адбывалася шырэйшая рада, г. зн. пасля збору найбольш уплывовых асоб краіны. Напрыклад, у 1432 г. у лісце да вялікага магістра Свідрыгайла сцвярджаў, што пытанне пасольства ён можа вырашыць у Троках разам з сабранай там «нашай поўнай радай» (*volkomlichem unserm rothe*)[6], а праз некалькі месяцаў чакаў у Горадні членаў сваёй рады[7]. Крыніцы часам дазваляюць зірнуць і на механізм падрыхтоўкі такіх нарад, з чаго відаць, што, прынамсі ў найважнейшых выпадках, скліканне вялікай рады было абавязковае. У верасні 1439 г. Жыгімонт Кейстутавіч, які знаходзіўся ў Троках, чакаючы паслоў Ордэна і імператара Святой Рымскай імперыі, сцвярджаў, што не можа прыняць паслоў, бо яшчэ не мае побач сваёй рады і рыхтуецца яе склікаць[8]. Пасля 1447 г., калі Казімір стаў каралём Польшчы і ўжо не жыў стала ў Літве, адносіны прэдыкатаў паняцця рады змяняюцца. Замест «вялікай» рады пачынае пера-

[4] Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 71—72.

[5] Напр., у інструкцыі магістра Ордэна 1416 г. згадваюцца ордэнскія падданыя, якія некалькі гадоў былі дарадцамі Вітаўта і жадалі вярнуцца назад: «Wir mussen unser gelt usgeben, und unser und unsers landes vorreter und houptvinde als den bischoff von Heilisberg und semeliche, dy by herczog [Witowt] wol 2'a jar und in seyme rathe gewest seyn, sollen wir wedir uffnemen und in unser land lasßen» (Neitmann K. Der Deutsche Orden und die Anfänge des ersten Hohenzollern in der Mark Brandenburg // Jahrbuch für brandenburgische Landesgeschichte. 1990. Bd. 41. S. 122).

[6] GStA PK, OBA 6022 (ліст Свідрыгайлы з Доўгаў 27.03.1432 г.).

[7] GStA PK, OBA 6162 (ліст ордэнскага пасла вялікаму магістру 17.07.1432 г.): «her wurde bis freytag das maiste theyl seynes rathes czu Garthen bey em haben».

[8] GStA PK, OBA 7600 (ліст Жыгімонта ордэнскім паслам 04.09.1439 г.): «wir noch nicht unsere rethe bey uns haben.» А. Лявіцкі гэты ліст датуе 19.12.1438 г. (Lewicki A. Przymierze Zygmunta Kiejstutowicza z królem rzymskim Albrechtem II. Kraków, 1899. S. 23—24), але яго можна звязваць з пасольствам брандэнбургскага комтура ў верасні 1439 г. («*nativitatis*» датавання ў такім разе адпавядае дню нараджэння Св. Панны Марыі).

важаць новаўзніклае паняцце «вузкай» рады, да якой належалі толькі некалькі найбольш уплывовых ураднікаў краіны. Гэтая рада ўжо не з'яўляецца неад'емна звязанай з асобай гаспадара і можа збірацца самастойна. Невыпадкова, менавіта ў гэты час з'яўляецца паняцце «рады Вялікага Княства Літоўскага», якое змяняе паняцце рады гаспадара[9]. З іншага боку, можна заўважыць і іншую з'яву — усё часцей склікаецца з'езд прадстаўнікоў усёй тэрыторыі ВКЛ («сойм»). Тэрміналогія крыніц выразна аддзяляе такі з'езд (*dieta, conventum terrarum, convencio generalis, tag*) ад рады (*consilium, rath*). З'езд быў шырэйшым не толькі з пункту гледжання колькасці прадстаўнікоў і геаграфіі паслоў, яго склад быў больш разнастайны ў сэнсе сацыяльнага статусу ўдзельнікаў. Менавіта такі з'езд (*tag*) апісвае рагніцкі комтур у сваім досыць маляўнічым паведамленні 1451 г., згадваючы пры гэтым пра бойку нейкіх двух дробных баяраў, якая скончылася смерцю. Аднак і на гэтых з'ездах адзінымі значнымі фігурамі, як гэта відавочна з таго самага паведамлення, былі прадстаўнікі знаці[10].

Імкнучыся высветліць ступень актыўнасці прадстаўнікоў знаці ў палітычным жыцці, немэтазгодна аддзяляць унутраную дакументацыю ад міжнародных дамоў. Шмат больш сэнсоўным выглядае храналагічнае дыферэнцаванне матэрыялу, што дазваляе непасрэдна адсочваць змены, што адбываліся. Вядома, вылучэнне тых ці іншых храналагічных перыядаў заўсёды можа аспрэчвацца, аднак праблемнасць пэўных дапушчэнняў не можа змяніць сэнс усяго наступнага выкладу. Вылучаны такія перыяды: 1) 1392—1404 гг.: прыход Вітаўта да ўлады вызначае першую дату, а серыя дамоў з Польшчай і Нямецкім ордэнам 1401 і 1404 г. — другую. Акрамя таго, апошняя дата супадае са смерцю некалькіх уплывовых прадстаўнікоў знаці — Андрэя Гаштаўта і Братошы[11]; 2) 1405—1413 гг. (Гарадзельская унія); 3) 1414—1430 гг. (смерць Вітаўта); 4) лістапад 1430 г. — верасень 1432 г.: панаванне Свідрыгайлы; 5) верасень 1432 г. —

[9] Іншыя аспекты гэтай праблемы гл. у падразделе «Характар улады знаці».

[10] LUB. Bd. 11. S. 121—122 (няпоўная публікацыя); GStA PK, OBA 10789 («...uff dem tage, den sie gehalden haben, do haben sich czwene beyoren von der geringsten mitenandir geslagen, so das eyner den andern czu tode geslagen hatt. Sunder der rath und die grosten herren haben sich wol und eyntrechtiglich mitenandir gescheiden»).

[11] Дакладныя даты смерці тагачасных людзей часцей за ўсё застаюцца невядомымі. У такіх выпадках звычайна звяртаюць увагу на апошняе з'яўленне ў крыніцах.

сакавік 1440 г.: панаванне Жыгімонта Кейстутавіча; 6) красавік 1440 г. — 1459 г.: першая палова эпохі Казіміра; акрамя таго, дата апошняга вядомага дакумента гэтага перыяду (1458 г.) супадае са смерцю ваявод віленскага і троцкага Яна Гаштаўта і Яна Манівідавіча. У 1459 г. памёр яшчэ адзін з найбольш уплывовых прадстаўнікоў тагачаснай знаці — маршалак земскі Пётр Манцігердавіч.

У табліцы ўзгоднены ўсе вядомыя дакументы вялікіх князёў, у якіх ёсць тэстацыйныя часткі[12]. Калі на перыяд Вітаўта мы маем два падрабязныя і кампактныя зборы крыніц[13], дык пазнейшыя крыніцы раскіданыя па многіх выданнях або ўвогуле яшчэ не апублікаваныя[14]. Да тэстацый прыраўнаныя таксама некалькі калектыўных лістоў літоўскай знаці да ордэнскіх ураднікаў, што дайшлі да нас з эпохі Казіміра. Гэта дастаткова рэпрезентацыйная колькасць крыніц, таму ўплыў некаторых выпадковых фактараў не мог моцна ўплываць на вынікі даследавання.

У табліцу ўключана і інфармацыя пра ўдзел у пасольствах. Зрабіць гэта змусіла назіранне, што ў XV ст. (асабліва ў першай яго палове) пасламі часцей за ўсё былі найбольш уплывовыя асобы краіны. Такое становішча адрозніваецца ад пазнейшых часоў, калі статус пасла істотна змяніўся[15]. Таксама неабходна адрозніваць паслоў і звычайных дастаўшчыкаў лістоў. Апошнія ў табліцу, несумненна, не ўключаныя. Тым не менш, неабходна зазначыць, што часцейшы ўдзел некаторых асоб у пасольствах быў вызначаны іх пасадамі. У першую чаргу гэта ўласціва для адносінаў з ордэнскай дзяржавай, якія ўжо з часоў Вітаўта найбольш актыўна развівалі старосты жамойцкія і ковенскія.

---

[12] Выкарыстаны толькі дакументы з поўным (або часткова поўным) фармулярам, бо толькі яны дазваляюць рабіць высновы пра склад эліты ўлады. Па гэтай прычыне ў баку былі пакінутыя шматлікія, але лаканічныя наданні Казіміра.

[13] CEV; Vitoldiana...

[14] AU; Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1—3; CEXV. T. 1—3; Dubiński P. Zbiór praw i prywilejów miastu stołecznemu W. X. L. Wilnowi nadanych. Wilno, 1788; KDKW; LUB. Bd. 5—10; Napiersky K. E. Russisch-livländische Urkunden; Die Staatsverträge des Deutschen Ordens in Preußen im 15. Jahrhundert. T. 1—2; Акты Литовской метрики / Собр. Ф. И. Леонтович. Т. 1. Вып. 1—2. Варшава, 1896—1897; РИБ. Т. 27 і інш. Таксама выкарыстаны дакументы са збораў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы, Цэнтральнага архіва старажытных актаў у Варшаве, кракаўскай бібліятэкі Чартарыйскіх і берлінскага Таемнага архіва культурнай спадчыны Прускай дзяржавы.

[15] Banionis E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės pasiuntinybių tarnyba... P. 174—175.

Першы перыяд (9 дакументаў). Сваім уплывам відавочна вылучаецца група з чатырох асоб (Альберт Манівід, Міхаіл Мінігайла, Станіслаў Чупурна, Андрэй Гаштаўт), якія выступаюць як сведкі амаль ва ўсіх тагачасных дакументах Вітаўта. Сярод палітычна актыўных таксама вартыя згадкі Братоша, Крысцін Осцік, Ян Няміра, Жостаўт, Ян Сунгайла і Юрый Гедзігоўд.

Другі перыяд (14 дакументаў). Тут ізноў жа дамінуюць Манівід, Чупурна і Мінігайла. Тым часам, з тэстацый знікаюць Андрэй Гаштаўт і Братоша. Яны не згадваюцца і ў іншых крыніцах, таму можна меркаваць, што ў той час яны ўжо не жылі. Як і раней, уплывовымі застаюцца Сунгайла, Осцік, Няміра, Гедзігоўд. З новых імёнаў варта адзначыць Румбоўда і Кезгайлу Валімонтавічаў, што пачынаюць сваю кар'еру.

Трэці перыяд (25 дакументаў). У вочы кідаецца тое, што больш не згадваюцца Мінігайла і Чупурна. Маўчанне ў крыніцах і ў гэтым выпадку змушае думаць, што прычынай гэтага сыходу была іх смерць. Пра Чупурну захаваліся больш дакладныя звесткі — ён ужо не ўдзельнічаў у Гарадзельскай уніі 1413 г. (згаданы там Чупа — гэта іншая асоба). Ужо з перапіскі ордэнскіх ураднікаў 1407 г. мы ведаем пра цяжкую хваробу Чупурны[16]. У 1412 г. пасаду літоўскага маршалка земскага, кім быў Чупурна, заняў Румбоўд Валімонтавіч[17].

Высокае становішча да самай сваёй смерці ў 1423 г. захоўваў Манівід. На працягу ўсяго перыяду часцей за ўсё згадваюцца Яўнус, Румбоўд і Кезгайла Валімонтавіч, Осцік, Гедзігоўд, Сунгайла. Паступова ў эліту ўключаюцца і баяры новага пакалення: Ян Гаштаўт (сын Андрэя), Радзівіл Осцікавіч. Неабходна адзначыць таксама Яна і Юрыя Бутрымаў. Нечаканым выглядае з'яўленне маршалка дворнага Якуба з Кабылянаў, што меў нелітоўскае паходжанне, і Юрыя Струмілы, пакаёвага / падкаморыя і падскарбія дворнага, у апошнія гады панавання Вітаўта. Аднак можна заўважыць, што ва ўсіх выпадках, за выключэннем надання Вітаўта на карысць жонкі, яны выступалі як сведкі ў

[16] CEV. S. 147—148.

[17] Vitoldiana... S. 32.

дакументах, што датычыліся спраў падляшскіх зямель[18]. Дастаткова шматлікіх польскіх рыцараў, што жылі пры двары Вітаўта, нельга далучаць да прадстаўнікоў эліты ўлады. Праўда, некаторыя з іх (напр., Якуб з Кабылянаў, Гневаш з Далевіцаў, Юрый Струміла) пад канец панавання Вітаўта набылі немалы ўплыў. Аднак служба пры двары вялікага князя звычайна была эпізодам у іх кар'еры, і толькі родзічы Юрыя Струмілы ўліліся ў склад мясцовай знаці[19]. Тым не менш, можна казаць пра адну новую тэндэнцыю: у канцы кіравання Вітаўта ў спісах сведак усё часцей пачынаюць пераважаць асобы, шчыльна звязаныя з яго двором. Выглядае, што Вітаўт, як і іншыя манархі позняга Сярэднявечча, спрабаваў павялічыць уплыў свайго двара на палітычнае жыццё краіны. Аднак гэтая палітыка вялікага князя не атрымала працягу. Асноўнай прычынай гэтага, несумненна, быў заняпад «літоўскага» двара гаспадара ў часы Казіміра Ягелончыка.

Чацвёрты перыяд (3 дакументы). Гэта непрацяглае кіраванне Свідрыгайлы, з якога мы ведаем усяго некалькі дакументаў, таму вызначыць выразныя тэндэнцыі праблематычна. Неабходна адзначыць хіба што большы ўдзел шляхты з рускіх зямель у зацвярджэнні міжнародных дамоў. Аднак і ў гэты перыяд найбольш уплывовымі асобамі засталіся тыя ж, што і раней. Гэта пацвярджае ўжытая Свідрыгайлам у лісце характарыстыка Гедзігоўда і Осціка — «найвышэйшыя дарадцы» (*eldesten aws dem rote*)[20].

Пяты перыяд (22 дакументы) — часы Жыгімонта Кейстутавіча. Часцей за ўсё як сведкі выступаюць: Осцік, Пётр

[18] Большасць дакументаў з поўным фармулярам апошняга перыяду панавання Вітаўта датычыцца спраў Падляшша. Гэта некалькі скажае агульную карціну. Па гэтай прычыне ў табліцу не ўключаны польскія рыцары, што выступалі ў гэтых дакументах як сведкі, але не мелі пасад у Літве. Цікавая праблема ўплыву польскіх рыцараў на кіраванне дзяржавай магла б быць аб'ектам асобнага даследавання.

[19] Падобным чынам паводзілі сябе і сакратары польскага паходжання, якія нярэдка спалучалі службу пры двары вялікага князя з выкананнем абавязкаў у Польшчы, дзе знаходзіліся іх маёнткі (гл.: Szybkowski S. Kariera Mikołaja Cebulki z Czechowa w służbie wielkiego księcia Witolda 1407—1430 // Władcy, mnisi, ryczerze / Red red. B. Śliwińskiego. Gdańsk, 1996. S. 253—320; Szybkowski S. Pozakancelaryjne aspekty życiorysu Mikołaja Cebulki z Czechowa — sekretarza, dyplomaty i doradcy Witolda. Przyczynek do badań nad kręgiem polskich współpracowników wielkiego księcia // Społeczeństwo Polski średniowiecznej: zbiór studiów. 1996. T. 7. S. 243—265).

[20] GStA PK, OBA 5652 (ліст Свідрыгайлы да вялікага магістра 15.06.1431 г.).

Манцігердавіч, Кезгайла, Лелюш, Даўгерд, Ян Гаштаўт, Ходка Юр'евіч, Алехна Давойнавіч, князь Аляксандр Уладзіміравіч, Андрэй Саковіч. Пераважная большасць іх сустракаецца ўжо ў часы Вітаўта. Толькі храналогія ўзвышэння Алехны Давойнавіча і Лелюша супадае з часам панавання Жыгімонта. За гэты перыяд памерлі Сунгайла і Юрый Гедзігоўд, а Яўнус і Румбоўд Валімонтавічы за ўдзел у змове былі пакараныя смерцю.

Шосты перыяд (27 дакументаў) — пачатак панавання Казіміра. Тут сярод першых асоб, якія сустракаліся ўжо ў часы папярэдняга гаспадара: Ян Гаштаўт, Пётр Манцігердавіч, Ян Манівідавіч, Андрэй Саковіч, Судзівой Валімонтавіч, князь Юрый Сямёнавіч Гальшанскі, Наць Гінівілавіч. У 1443 г. памёр Даўгерд, у 1442 г. — Осцік, а Лелюш страціў уплыў за ўдзел у забойстве Жыгімонта Кейстутавіча.

Можам зрабіць пэўныя першыя высновы. Спісы сведак у дакументах вялікіх князёў літоўскіх дазваляюць вылучыць групу асоб, што складала вярхушку тагачаснага баярскага грамадства. Калі супаставіць атрыманыя звесткі з інфармацыяй з іншых крыніц, бачна, што тэстацыі дастаткова аб'ектыўна адлюстроўваюць рэальныя ўладныя адносіны. Грунтуючыся на іх, можна карэктаваць вобраз, што паўстае пры вывучэнні іншых крыніц. Напрыклад, для часоў Жыгімонта Кейстутавіча больш адносным робіцца значэнне Яна Даўгерда[21]. Звесткі тэстацый дазваляюць казаць ужо прынамсі пра роўны ўплыў Осціка, Пятра Манцігердавіча, Кезгайлы, Лелюша і Яна Гаштаўта на жыццё дзяржавы.

У спісах сведак першае месца традыцыйна займалі біскупы[22]. Далей ішлі князі, што паходзілі ад Гедзімінавічаў, а таксама князі Гальшанскія, што былі блізка пародненыя з гаспадарамі. У найбольш раннія часы пасады не адыгрывалі

[21] Параўн.: Semkowicz W. Dowgird // PSB. T. 5. S. 351.

[22] Такі парадак дзейнічаў і ў іншых еўрапейскіх краінах (Fichtenau H. Die Reihung der Zeugen und Konsentienten // Fichtenau H. Beiträge zur Mediävistik. Bd. 3. Stuttgart, 1986. S. 171; Fałkowski W. Elita władzy w Polsce... S. 19). Некаторыя біскупы, асабліва віленскі, былі дастаткова ўплывовымі людзьмі. Але іх уплыў вызначалі своеасаблівыя прычыны: пакуль біскупамі не сталі прадстаўнікі літоўскай знаці, гэты ўплыў не меў якіх-небудзь важных сацыяльных наступстваў. Таму ў гэтай працы ўлада біскупаў асобна не разглядаецца.

вялікай ролі пры запісе сведак, але з цягам часу склаўся дастаткова сталы іерархічны шэраг, на чале якога стаяў ваявода віленскі. Але і тады здараліся адхіленні ад гэтай нормы. Напрыклад, напрыканцы кіравання Казіміра кашталян віленскі і староста жамойцкі Ян Кезгайлавіч звычайна запісваўся перад ваяводам віленскім Алехнам Судзімонтавічам. У гэтым выпадку, верагодна, вызначальным быў крытэрый узросту. Відаць, па той жа прычыне ў часы Жыгімонта Кейстутавіча на чале спісаў сведак стаяў кашталян віленскі Крысцін Осцік. Аналіз спісаў сведак дазваляе казаць, што пісары імкнуліся дакладна перадаць ранг асоб. Праўда, тая акалічнасць, што большасць дакументаў захавалася толькі ў копіях, змушае ўважліва аналізаваць кожны выпадак. Спісы сведак звычайна завяршаліся на сакратарах (пісарах), аднак яны ўпісваліся як асобы, што падрыхтавалі дакумент, і фігуравалі ў ім *ex officio*. Літоўскія гаспадары, асабліва Вітаўт, часта давяралі адукаваным сакратарам важныя заданні, уключалі іх у сваю паўсядзённую раду[23]. Аднак значнай кар'еры ў Літве яны не рабілі і ў шэрагі літоўскай знаці не ўліваліся. Таму яны застаюцца па-за рамкамі гэтага даследавання[24].

Храналагічная дыферэнцыяцыя матэрыялу дазваляе сфармуляваць адну істотную выснову. Падчас усіх шасці перыядаў нельга заўважыць ніводнага раптоўнага злому ў складзе палітычнай эліты. За ахоплены даследаваннем 70-гадовы перыяд (гэта прыблізна два — тры пакаленні людзей) праяўляецца проста класічная мадэль паступовага росту ўплыву. Прывядзём некалькі прыкладаў з табліцы, якія паказваюць колькасць згадак за кожны перыяд[25]:

[23] Асобныя выпадкі гл.: Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 80—102; а таксама цытаваныя працы С. Шыбкоўскага.

[24] Па тых жа прычынах польскі гісторык В. Фалкоўскі пакідае па-за межамі свайго даследавання канцлераў і падканцлераў, якія ў Польшчы выконвалі аналагічныя функцыі па падрыхтоўцы дакументаў (Fałkowski W. Elita władzy w Polsce... S. 17—18).

[25] Гл. табліцу ў канцы гэтага раздзела. Часы Свідрыгайлы і Жыгімонта Кейстутавіча аб'ядноўваюцца. Таксама складваецца колькасць сведчанняў і пасольстваў. У гэтай сітуацыі неістотна, што колькасць дакументаў для кожнага перыяду неаднолькавая — тэндэнцыя росту ліку згадак відавочная.

Румбоўд Валімонтавіч:	2/8/9/5
Кезгайла Валімонтавіч:	2/3/5/15
Крысцін Осцік:	5/4/10/16
Радзівіл Осцікавіч:	1/5/4/8
Ян Даўгерд:	1/0/2/9/2
Ян Гаштаўт:	1/6/10/22
Пётр Манцігердавіч:	3/16/21
Наць Гінівілавіч:	1/0/4/9
Юрый Гальшанскі:	1/1/12
Ян Манівідавіч:	2/17
Судзівой Валімонтавіч:	6/18
Андрэй Саковіч:	7/23

Змяншэнне колькасці згадак амаль ва ўсіх выпадках тлумачыцца смерцю ці фізічнай слабасцю асобы. Бацькі ўсіх лідараў другога пакалення адыгрывалі значную ролю ў часы Вітаўта. Такім чынам іх з'яўленне на грэбні ўлады абумоўлена паходжаннем.

Канчатковы прадукт гэтых назіранняў — гіпатэтычнае вызначэнне ўзросту чалавека, калі ён лічыўся дастаткова сталым для заняцця важных пасад. Мяжой, што аддзяляла непаўналетняга ад паўналетняга, у Літве быў узрост 18 гадоў[26]. Аднак гэтая мяжа, як падаецца, не была адзінай. У свядомасці грамадства існавалі таксама іншыя адрозненні, бо сярод найбольш уплывовых людзей найчасцей сустракаліся мужчыны сярэдняга веку. Нават сыны самых магутных паноў параўнальна позна апыналіся ў першых шэрагах палітычнай эліты. Цікава, што вельмі рэдка на вяршыні ўлады адначасова знаходзіліся бацька і сын, дзядзька і пляменнік. Напрыклад, Ян Манівідавіч упершыню актыўна дзейнічае толькі праз восем гадоў пасля смерці бацькі. Яшчэ большая часавая адлегласць паміж апошняй згадкай пра Андрэя Гаштаўта і першай пра яго сына Яна. Нават у тых выпадках, калі сын трапляе

[26] Loho-Sobolewski J. Prawo opiekuńcze w dawnej Litwie (= Studia nad historją prawa polskiego. T. 15. Z. 2.). Lwów, 1937. S. 19—20.

ў палітычнае жыццё пры яшчэ жывым бацьку, ён звычайна задавольваецца дробнай прыдворнай пасадай, напрыклад, маршалка дворнага. Прыкладам менавіта такога разумення «позняга выспявання для ўлады» з'яўляюцца словы Вітаўта ў яго *Скарзе супраць Ягайлы і Скіргайлы: Wenn her* (маецца на ўвазе Кейстут, размова ідзе пра падзеі пасля смерці Альгерда) *hette gewolt, so hette her Wille genomen. Und herczog Jagal, wo her hette gewolt hette im gegeben ein herczogtum, dorumb das herczog Jagal gar jung was...*[27]. Такое становішча цалкам натуральна для сярэднявечнага грамадства, дзе бацька захоўваў уладу ў сям'і да самай сваёй смерці. З іншага боку, гэтая акалічнасць красамоўна сведчыць пра ўплыў шырэйшага роду на замацаванне складу палітычнай эліты. Смерць уплывовага бацькі не змяншала магчымасцей кар'еры сына, механізм сацыяльнай стабільнасці быў нашмат больш складаны і не паддаваўся ўздзеянню большасці выпадковых фактараў.

б) Сведкі ў гаспадарскіх дакументах 1460—1492 гг.: кантынуітэт на фоне структурных змен

Другая палова панавання Казіміра прынесла важныя змены ў склад кіруючай эліты. У 1458 г. памерлі бадай што самыя выбітныя прадстаўнікі тагачаснай літоўскай знаці — Ян Гаштаўт і Ян Манівідавіч. У 1459 г. памёр Пётр Манцігердавіч, а каля 1465 г. — Андрэй Саковіч. Такім чынам сышло пакаленне знаці, што сфармавалася яшчэ ў эпоху Вітаўта і на працягу доўгага часу засяроджвала ў сваіх руках асноўныя ўладныя рычагі. У гэтай сітуацыі можна было чакаць больш моцных інтэрвенцый гаспадара ў палітычнае жыццё краіны. Але спісы сведак дакументаў Казіміра не даюць ніякіх вялікіх нечаканасцей. У 1460—1475 гг. (13 дакументаў) сваім уплывам вылучаюцца Міхаіл і Ян Кезгайлавічы, Радзівіл Осцікавіч, Алехна Судзімонтавіч і Станіслаў Судзівоевіч. У перыяд 1475—1492 гг. (17 дакументаў), пасля смерці Міхаіла Кезгайлавіча і Радзівіла Осцікавіча, дамінуюць Ян Кезгайлавіч, Алехна Судзімонтавіч,

[27] Alminauskis K. Vytauto skundas // Archivum Philologicum. 1939. Vol. 8. P. 206—207. «Тады наш бацька, калі б захацеў, адняў бы Вільню і князю Ягайлу, калі б захацеў, даў бы княства, бо князь Ягайла быў яшчэ зусім малады» (пер. паводле: Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 179—180).

Багдан Андрэевіч Саковіч і Міхаіл Монтаўтавіч. Усе яны — прадстаўнікі найбольш уплывовых знатных родаў. І тым не менш, можна заўважыць некалькі новых структурных тэндэнцый.

Нагадаем, што Казімір Ягелончык быў першым гаспадаром, які стала не знаходзіўся ў Літве. Таму нядзіўна, што ў часы яго панавання, а асабліва выразна ў другой яго палове, змяніліся некаторыя формы ўлады. Знаць больш не збіраліся так часта на сустрэчы з гаспадаром. Калі не ўлічваць дастаткова рэдкія з'езды літоўскага баярства, гаспадара, што прыязджаў у Літву, звычайна атачала невялікае кола дарадцаў. Менавіта гэтым, па ўсёй верагоднасці, было абумоўлена тое, што ў дакументах гэтага перыяду ўсё часцей сведчылі толькі ўраднікі цэнтральнай улады (канцлеры і маршалкі земскія), а таксама віленскія і троцкія ваяводы / кашталяны. Таму пры даследаванні палітычнай актыўнасці асобных прадстаўнікоў кіруючай эліты тэстацыі гэтага перыяду варта ацэньваць асцярожна. Апроч таго, да нас дайшло няшмат дакументаў гэтага часу, што маюць поўны фармуляр, дакументаў з доўгімі тэстацыямі (напр., некалькі міжнародных дамоў). Грунтуючыся выключна на гэтых дакументах, нельга вызначыць сапраўдную ступень палітычнага ўплыву той ці іншай асобы. Напрыклад, параўнальна рэдкае з'яўленне Марціна Гаштаўта ў тэстацыях гаспадарскіх дакументаў можна патлумачыць тым, што ён правёў значную частку свайго палітычна актыўнага жыцця ў Наваградку і далёкім Кіеве. Але аналіз спісаў сведак у гэтым даследаванні адыгрывае толькі дапаможную ролю. Тэстацыі дапамагаюць акрэсліць кола найбольш уплывовых асоб і робяцца апорным пунктам для далейшага даследавання.

Сведкі ў гаспадарскіх дакументах 1392—1459 гг.

Імя	1392—1404	1405—1413	1414—1430	I.1430—IX.1432	IX.1432—III.1440	IV.1440—1459
Альберт Манівід	9/1	10/1	8/1			
Міхаіл Мінігайла	8	6				
Андрэй Гаштаўт	7					
Станіслаў Чупурна	8/2	9/2				

Ян Сунгайла		3/1	3/2	3/2	1	2
Міхаіл Яўнутавіч	2					
Ян Альгімонтавіч	2					
Братоша	5/1					
Жостаўт	4					
Уладзімір Альгердавіч	1					
Кімант	2/1					
Гінівіл	1					
Валімонт Бушкавіч	2					
Крысцін Осцік	5	4	8/1	2/1	13/1	1
Альберт Карэйва	1	1				
Ян Няміра	4/2	4/1	1			
Вігайла	2					
Гінтаўт	2		2			
Юрый Гедзігоўд	3	4	4/2	2/3	5	
Андрэй Гальшанскі	1					
Сямён Гальшанскі	1		2	1/1	3	
Зяновій Братошыч	1	0/1	1	1	1	
Сямён Ямантавіч	1	1				
Талівойша Гаштаўт	1	1				
Гінейт	1	1			1	
Доўкша Кімантавіч	1	1		1		
Дорг	1					
Кезгайла Валімонтавіч	2	3	2/3	2/1	11/1	0/2
Румбоўд Валімонтавіч	2	7/1	6/3	1	4	
Манцігайла	1				2	
Бутаўт	1	1				
Ян Даўгерд	1		2		8/1	2
Гайлігін Галівойнавіч	1	1			1	

Відзімін Галівойнавіч	2	3				
Ян Манцігердавіч	1					
Алехна Манцігердавіч		2				
Судзімонт Доргевіч		1		2/1	3/1	
Радзівіл Осцікавіч		1	5		4	4/4
Яўнус Валімонтавіч		2	10	1/1	4	
Ян Бутрым		1/1	3/2			
Ян Гаштаўт		1	5/1	1	8/1	20/2
Станіслаў Сак		1	1	1	2	
Наць Гінівілавіч		1		1	3	7/2
Міхаіл Таўцігерд		1			1	
Пётр Манцігердавіч			2/1	2/3	11	19/2
Міхаіл Гальшанскі			2	1		
Аляксандр Уладзіміравіч			1	2/1	5	2
Ян Уладзіміравіч			1	2	2	1
Андрэй Уладзіміравіч			1	1	2	2
Фёдар Карыбутавіч			1	1	2	
Юрый Лугвенавіч			1	1		0/1
Юрый Гальшанскі			1		1	8/4
Аляксандр Монтаўт			1	1	3	
Міхаіл Манівід			1		1	
Якуб з Кабылянаў			7			
Юрый Струміла			7			
Юрый Бутрым			4	0/3	2/1	
Гайлімін Надобавіч			0/1	0/1	3	

Шэдзібор Валімонтавіч			0/4	2/2	1	
Сенька Гедзігоўдавіч			1/2		2	3/2
Ходка Юр'евіч			1	2/2	7	
Васіль Сямёнавіч				2/3		0/3
Ян Манівідавіч			1	2		15/2
Андрэй Неміровіч				2/1	5	5
Манцірым				1	1	
Даўгайла				2	2	
Судзівой Валімонтавіч				2/2	2	13/5
Андрэй Саковіч				2	5	15/8
Некраш Буцівідавіч				2	2	
Юрша			1	1		3
Рагоза				1/3		
Гудзігерд Валімонтавіч			0/1 (?)	1	1	
Гедройці				2	2	
Свірскія				1	2	
Іван Пуцята				1		
Глеб Кіндзеравіч				1		
Фёдар Нясвіжскі				1		
Рыгор Пратасевіч				1/1		
Юрый Рымавідавіч				1		
Ян Давойнавіч				1		
Алехна Давойнавіч					6	3
Пётр Лелюш					11/1	3
Пац Доўкшавіч					2	1
Фёдар Сунгайлавіч					1	
Рачка Табутовіч					2	
Андрэй Давойнавіч					1	1/6
Васіль Астрожскі						1

Рачка Страчэвіч					1	0/1
Глеб Даўгоўдавіч					1	2
Ян Гайцэвіч					3	5/3
Даўгерд					2	1
Наруш					1	
Ян Неміровіч					0/1	3/6
Якуб Неміровіч						1
Мікалай Неміровіч						0/1
Міхаіл Кезгайлавіч						8/1
Ян Кезгайлавіч						2/2
Алехна Судзімонтавіч						4
Альберт Гаштаўт						2
Андрэй Гайлігінавіч						1
Алехна Дыль Гайлігінавіч						1
Ян Вяжэвіч						1
Юрый Гайцэвіч						1
Іван Хадкевіч						1
Алехна Рымавідавіч						1
Рымавід Ягінтавіч						1
Міхаіл Монтаўтавіч						0/2
Таўцівіл Монтаўтавіч						0/1
Барташ Монтаўтавіч						0/1
Станіслаў Мордас						0/2
Гедзігоўд						0/3
Пётр Саковіч						1/1
Ян Саковіч						0/1
Юрый Гетаўтавіч						1

Сведкі ў гаспадарскіх дакументах 1460—1492 гг.

Імя	1460—1475	1476—1492
Юрый Гальшанскі	2	
Міхаіл Кезгайлавіч	12	
Андрэй Саковіч	4	
Радзівіл Осцікавіч	12/1	
Ян Вяжэвіч	3	
Алехна Судзімонтавіч	9	12
Станіслаў Судзівоевіч	5	1
Станіслаў Мордас	1	
Мікалай Неміровіч	2/1	
Ян Кезгайлавіч	6/1	12/2
Марцін Гаштаўт	2/1	2
Багдан Андрэевіч Саковіч	3/2	9/2
Ян Кучуковіч	4/3	
Іван Хадкевіч	4	
Міхаіл Монтаўтавіч	1	7
Таўцівіл Монтаўтавіч	1/1	
Альберт Янавіч Манівід	0/2	
Якуб Янавіч Неміровіч	0/1	2
Пётр Пашкевіч Струміла	0/1	2/2
Ян Саковіч	0/1	
Мікалай Радзівілавіч		4
Ян Іллініч		3
Солтан Аляксандравіч		2/1
Станіслаў Міхайлавіч Пятковіч		2
Барташ Монтаўтавіч		1
Ян Насутавіч		1
Ян Юр'евіч Забярэзінскі		3/2
Станіслаў Янавіч Кезгайлавіч		2/1
Юрый Пацэвіч		2
Пётр Янавіч Манцігердавіч		1
Альберт Кучуковіч		1

Ян Нарбутавіч		0/1
Станіслаў Нарбутавіч		0/1
Ян Андрэевіч Давойнавіч		0/1
Станіслаў Пятровіч Кішка		1/1
Васіль Храбтовіч		0/1
Альберт Клочка		0/1

У табліцах асобы змешчаны ў парадку першай згадкі пра іх у крыніцах. За выключэннем важных асоб, у табліцы не ўключаны тыя, хто выступаў як сведка толькі адзін раз. Таксама не ўключаны святары і сакратары, бо сярод іх яшчэ амаль не трапляюцца прадстаўнікі знаці. Першая лічба абазначае колькасць сведчанняў у гаспадарскіх дакументах, другая — колькасць пасольстваў.

2. ПАХОДЖАННЕ ЗНАЦІ ЭПОХІ ВІТАЎТА

а) Паходжанне знаці канца XIV — пачатку XV ст.

Здавалася б, што стабільнасць складу эліты ўлады канца XIV — пачатку XV ст. пацвярджае думку Сухоцкага пра тое, што ў часы Вітаўта афармілася група знаці (паноў), якая сваім уплывам і становішчам вылучалася з шырокай баярскай масы[28]. Пытанне фармавання баярскай эліты звязана з наданнем станавых прывілеяў, што ў сваю чаргу тлумачыцца ў кантэксце сацыяльнай палітыкі вялікага князя Вітаўта і паслягарадзельскага інстытуцыйнага ўплыву палякаў: 1) так званая палітыка цэнтралізацыі Вітаўта: замена князёў, што паходзілі з роду Гедзімінавічаў, намеснікамі баярскага паходжання; 2) падчас Гарадзельскай уніі 1413 г. 47 родаў літоўскіх баяраў атрымалі польскія гербы, замацоўваючы такім чынам палітычнае значэнне гэтах родаў у дзяржаве. Цікава, што сучасная гістарыяграфія Літвы робіць акцэнт на першы чыннік, тым часам як гісторыкі Польшчы больш схільныя падкрэсліваць значэнне Гарадзельскай уніі, падчас якой з агулу баярства была вылучаная група

[28] Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego... S. 31—78.

людзей, што сталі пачынальнікамі будучых родаў знаці[29].

Неабходна праверыць гэтую тэорыю, вытокі якой сягаюць да мадэлі генезісу літоўскага парламентарызму, сканструяванай Любаўскім на мяжы стагоддзяў[30]. Для гэтага патрэбна правесці даследаванне паходжання найбольш уплывовых баяраў часоў Вітаўта. Інакш кажучы, трэба шукаць бацькоў гэтых баяраў. Гэта поле персанальнай гісторыі, але вывучэнне гістарычных асоб не самамэта. Такое даследаванне можа дапамагчы лепей зразумець тагачасную сацыяльную структуру, механізмы ажыццяўлення ўлады.

Пры выкананні гэтай задачы паўстаюць грунтоўныя крыніцазнаўчыя пытанні, якія тут варта эксплікаваць. Імёны літоўскіх баяраў другой паловы XIV ст. (да хросту) сустракаюцца толькі ў некалькіх хроніках Нямецкага ордэна[31]. Пошукі ў польскіх[32] і рускіх[33] хроніках і летапісах не былі надта выніковымі. Тым часам, мясцовая гістарыяграфія, якая, як паказвае вопыт іншых краін, асвятляе ўнутранае жыццё краю на прынцыпова новым узроўні[34], у Літве ўзнікла вельмі позна. Таму тыя яе ўрыўкавыя звесткі, што закранаюць найбольш раннія часы, неабходна ацэньваць як дадатковыя. Вядома таксама некалькі міжнародных дамоў, у якіх у якасці сведак выступаюць літоўскія князі і баяры: дамова паміж Кейстутам і

[29] Avižonis K. Die Entstehung und Entwicklung des litauischen Adels... S. 140—155; Ivinskis Z. Geschichte des Bauernstandes in Litauen... S. 94—95; Dundulis B. Lietuvos kova dėl valstybinio... Vilnius, 1993. P. 39—40; Banionis E. Lietuvos bajorai 1413 m. Horodlėje... P. 189; Semkowicz W. Braterstwo szlachty polskiej z bojarstwem litewskim w unji horodelskiej 1413 roku // Polska i Litwa w dziejowym stosunku. Warszawa—Kraków, 1914. S. 393—446; Halecki O. Dzieje Unii Jagiellońskiej. T. 1. Kraków, 1919. S. 252—263; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami... S. 81; Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 18 і ранейшая літаратура.

[30] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм...

[31] Hermann de Wartberge. Chronicon Livoniae... S. 21—116; Wigand von Marburg. Cronica nova prutenica... S. 453—662. У Хроніцы Ёгана Позільге новай інфармацыі па гэтым пытанні няма (Johann von Posilge. Chronik des Landes Preussen... S. 79—388).

[32] Найважнейшыя польскія хронікі выдадзены ў серыі Monumenta Poloniae Historica (далей — MPH).

[33] Гл. тамы: Полное собрание русских летописей (далей — ПСРЛ).

[34] Хронікі палякаў Гала Ананіма, Вінцэнта Кадлубка, Яна Длугаша, чэхаў Казьмы Пражскага, Даліміла абмяжоўваюцца толькі самымі выразнымі прыкладамі з суседніх краін.

князем Мазовіі Земавітам 1358 г.[35], замірэнне Альгерда і Кейстута з Лівонскім ордэнам 1367 г.[36], Троцкая дамова Ягайлы і Кейстута з Нямецкім ордэнам 1379 г.[37]. На гэтым, бадай, што і сканчаецца спіс крыніц, у якіх згадваюцца імёны літоўскіх баяраў давітаўтавых часоў.

Іншая праблема звязана з сістэмай асабістых імёнаў у тагачаснай паганскай Літве. Як і ў іншых краінах з падобным развіццём, літоўцы мелі адно імя, але, у адрозненне ад некаторых іншых краін, гэтае імя звычайна не перадавалася з пакалення ў пакаленне; не было і варыянтнага прынцыпу складання імёнаў. Калі ўвогуле і існавала нейкая логіка надання імёнаў, сучасны стан нашых ведаў не дазваляе яе зразумець. У такім разе, калі мы не маем дадатковых звестак, найчасцей аказваецца немагчымым раскрыць раннія генеалагічныя сувязі асоб. Ва ўмовах аднайменнасці мы не маем магчымасцей вызначыць сярод баяраў эпохі Гедзіміна і Альгерда прабацькаў будучых уплывовых панскіх родаў. Але ў гэтых умовах нельга казаць і пра вымірание нейкага роду ці ўзвышэнне іншых, што нярэдка прымаецца за відавочны факт. Нават у асабліва рэдкіх выпадках, калі крыніцы пазначаюць, што тая ці іншая асоба памерла без нашчадкаў, аказваецца магчымым цалкам абгрунтаванае дапушчэнне, што род працягвала іншая лінія — з дзядзькаў і пляменнікаў. Найбольшае, чаго можна дасягнуць, прытрымліваючыся метадалагічнай строгасці, гэта праверыць, ці сустракаюцца таксама раней самыя ўплывовыя асобы часоў Вітаўта ды іх бацькі. Станоўчы адказ дазволіў бы казаць пра арыстакратычнае паходжанне літоўскай знаці ў «княскія часы».

Манівід і Гедзігоўд. Упершыню Манівід згадваецца каля 1387—1389 гг., г. зн. да прыходу Вітаўта да ўлады. Тады ён выступае ў шэрагу асоб, што паручыліся за Грыцку Канстанцінавіча[38]. Неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на пазначэнне імя бацькі — Гайлігін (*Монивид Коиликинович*). Складальнік дакумента

[35] Kodeks dyplomatyczny Księstwa Mazowieckiego / Wyd. J. T. Lubomirski. Warszawa, 1863. S. 73.

[36] LUB. Bd. 2. S. 772 —773.

[37] Codex diplomaticus Lithuaniae... S. 55.

[38] Prochaska A. Rokosz Hryćka Konstantynowicza 1387—1390 // Kwartalnik historyczny. 1908. R. 22. S. 395.

павінен быў ведаць пра значэнне бацькі, калі вырашыў яго пазначыць[39]. Высакароднае паходжанне Манівіда раскрываецца з яго шлюбных сувязяў. Звесткі пра яго жонак супярэчлівыя, але магчыма зрабіць пэўныя высновы. Адзін з самых старых тэкстаў літоўскай гістарыяграфіі *Origo regis Jagyelo et Wytholdi ducum Lithuanie*, напісаны ў 2—3 дзесяцігоддзях XV ст., апісвае помсту Ягайлы за забойства Вайдылы і адзначае, што быў пакараны смерцю пляменнік маці Вітаўта Бутрым, *qui habuit Vlianam, que fuit Munuidi*[40]. Звесткі Яна Длугаша некалькі іншыя. Апавядаючы пра аблогу Вільні ў 1390 г., ён адзначае, што загінуў князь Нарымонт, *cuius uxorem Iulianam, sororem germanam Annae consortis Withawdi ducis, Monivid Lithuanus processu temporis in uxorem habuerat*[41]. Гэта паведамленне Длугаша пра сваяцкія сувязі Вітаўта і Манівіда цалкам заслугоўвае даверу. Храніст не меў ніякай патрэбы выдумляць фіктыўныя сувязі Манівіда, да таго ж, верагоднае сваяцтва Вітаўта і Манівіда добра адпавядае іх агульнай палітычнай дзейнасці.

Верагодна, што з князёўнай ажаніўся таксама брат Манівіда Гедзігоўд: у сярэдзіне XV ст. згадваецца *кнегиня Кгедикголдова*[42]. З гэтых крыніц вядома, што жонка Гедзігоўда Анастасія валодала маёнткам Талочышкі, з якога ў 1442 г. прызначыла дзесяціну віленскай капліцы Св. Альберта і Св. Юрыя[43]. Гэты тапонім нагадвае пра згаданага ў канцы XIV ст. паплечніка

---

[39] Імёнамі па бацьку «ўпрыгожваецца» толькі невялікая частка паручыцеляў. У выпадку з князямі гэта было амаль правілам. У гэтым кантэксце трэба падаць і інтэрпрэтацыю слова «сын». Увогуле ўважлівы крыніцазнаўца Э. Банёніс неабгрунтавана тлумачыць гэты дадатак да імя ў катэгорыях узросту: ён нібыта быў адзнакай «дзяцей баяраў», кар'ера якіх толькі пачалася (Banionis E. Lietuvos bajorai 1413 m. Horodlėje... P. 191—192). Памылковасць гэтай інтэрпрэтацыі можна даказаць на матэрыяле таго ж Горадзенскага папярэдняга міру 1398 г., на які абапіраецца Банёніс (CEV. S. 54). Сын Альгімонта Ян не мог быць маладым, бо ўжо ў 1401 г. у Віленскай дамове як сведкі выступаюць яго сыны Андрэй і Сямён (AU. S. 37). Тое ж можна сказаць і пра сына Бушкі Валімонта, сыны якога Кезгайла і Румбоўд таксама ўдзельнічалі ў згаданай Віленскай уніі (Тамсама. S. 38). У гэтых выпадках больш верагодна, што Альгімонт і Бушка ў часе складання Горадзенскай дамовы ўжо не жылі, а акцэнтаванне іх імёнаў тлумачыцца былой уплывовасцю.

[40] ПСРЛ. Т. 35. С. 117 («які ажаніўся з Юллянай, што [пазней выйшла] за Манівіда»).

[41] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 3. P. 491 («з жонкай якога Юллянай, сапраўднай сястрой жонкі князя Вітаўта Ганны, праз нейкі час ажаніўся Манівід Ліцвін»).

[42] РИБ. Т. 27. С. 30.

[43] KDKW. S. 197.

Вітаўта князя Талочку[44]. Можна меркаваць, што Гедзігоўдава была яго дачкой.

Мінігайла ўжо ў 1387 г. быў адным з найбольш уплывовых прадстаўнікоў літоўскай знаці. Ён адзіны з бояраў выступае як сведка ў тагачасным прывілеі Ягайлы Віленскай кафедры[45]. Тут згадваецца таксама імя яго бацькі — Гедзігоўд, якога не варта блытаць з цёзкам — братам Манівіда[46]. У гэтым прывілеі Мінігайла названы старостам ашмянскім. Ён мог удзельнічаць і ў працэсе падрыхтоўкі Крэўскай уніі, бо Мінігайла ў 1413 г. у Гародлі атрымаў герб Рава, які прадстаўляў кашталян кракаўскі Крысцін з Острава, што таксама браў удзел у крэўскіх падзеях[47]. У часы Вітаўта Мінігайла захаваў свае пазіцыі. Хоць часам і не займаючы ніякіх пасад, у спісах сведак дакументаў вялікага князя ён выступае перад такімі асобамі, як Манівід, Чупурна, Андрэй Гаштаўт. Напрыклад, у данацыі Віленскай кафедры 1395 г. — Мінігайла, Гаштаўт, Манівід, Чупурна[48]; віленскай капітуле 1407 г. — Мінігайла, Манівід, Румбоўд[49]; у Салінскім міры 1398 г. — Мінігайла, Манівід, Братоша і г.д.[50]. Вітаўт, верагодна, павінен быў талераваць гэтую асобу, якая мела высокае становішча і якую наўрад ці можна было б назваць чалавекам атачэння Вітаўта. Вітаўт не даваў яму важных даручэнняў: ён не браў удзелу ні ў адным пасольстве. Характэрна, што рускія летапісы далучаюць Мінігайлу да сыноў Альгерда[51], пацвярджаючы тым самым яго сувязь з гэтай сям'ёй.

---

[44] Тамсама. S. 35, 66. Пра князя Юрыя Талочку гл.: Petrauskas R. Giminaičiai ir pavaldiniai: Lietuvos bajorų grupės XIV a. pab. — XV a. I pusėje // Lietuva ir jos kaimynai. Nuo normanų iki Napoleono: prof. Broniaus Dundulio atminimui. Vilnius, 2001. P. 110.

[45] KDKW. S. 6.

[46] Гэтыя адносіны вызначыў яшчэ У. Сямковіч. Гл.: Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 51—52. Гэтага не ўлічваюць Э. Банёніс (Banionis E. Lietuvos bajorai 1413 m. Horodlėje... P. 193) і Е. Сухоцкі (Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego... S. 52—53).

[47] Halecki O. Przyczynki genealogiczne do dziejów układu krewskiego // Miesięcznik heraldyczny. 1935. R. 14. S. 110—111.

[48] Vitoldiana... S. 19.

[49] Тамсама. S. 25—26.

[50] LUB. Bd. 4. S. 226—227.

[51] ПСРЛ. Т. 7. С. 256.

Андрэй Гаштаўт упершыню згадваецца ў прывілеі Ягайлы касцёлу ў Абольцах 1387 г. як староста віленскі[52]. Паміж 1387 і 1389 г. ён паручыўся за Грыцку Канстанцінавіча[53]. Віганд з Марбурга, апісваючы ў сваёй хроніцы падзеі 1364 г., устаўляе эпізод пра абаронцу вяленскага замка Гаштаўта[54]. Ёсць падставы меркаваць, што гэта быў бацька Андрэя Гаштаўта. На працэсе пачатку XV ст. пра мяжу паміж Жамойцю і Куроніяй сведкі прусы сцвярджалі, што 40 гадоў таму Вялену занялі крыжакі, што імёны замкавых старостаў былі — Сурмін, *Mattewike* (?) і Гаштаўт (*Gawstad*) — і што ўсе яны былі літоўцамі (у гэтым кантэксце — не жамойтамі), а іх роды дагэтуль жывуць у Літве ў Кульваўскай зямлі ля Вількаміра[55]. Наўрад ці мясцовыя прусы былі добра інфармаваныя пра актуальныя месцы жыхарства гэтых літоўскіх родаў; для іх было важна канстатаваць, што яны не былі з Жамойці. У кожным разе гэтая заўвага магла закранаць толькі першыя роды, бо слядоў Гаштаўтаў у вількамірскім краі няма[56]. Моцна інтрыгуе аповед Хронікі Быхаўца, якая пісалася ў асяроддзі Альберта Гаштаўта — праўнука Андрэя Гаштаўта, пра абаронцу Коўна Гаштаўта[57]. Аблогі Коўна і Вялены храналагічна блізкія адна да адной, абедзве яны апісаныя ў хроніцы Віганда з Марбурга[58]. Ад Віганда гэтую інфармацыю пераняў (праз Яна Длугаша) Мацей з Мехава[59], а прыкметы выкарыстання гэтай хронікі ёсць у тэксце Хронікі Быхаўца[60]. Аднак верагодная сувязь паведамлення ў літоўскім летапісе з хронікай Мацея з Мехава не супярэчыць магчымай сувязі Гаштаўтаў з абаронцам Вялены. Калі гэтыя разважанні правільныя, тады мы мелі б першы выпадак атрымання ў спадчыну імя (ці трансфармацыі бацькавага імя) у Літве. Тое, што гэтае «першынство» невыпадковае, паказвае далейшы іменаслоў роду. Гэты род першым з родаў літоўскай знаці ўжываў сталае родавае імя: Андрэй Гаштаўт →

[52] KDKW. S. 19.

[53] Prochaska A. Rokosz Hryćka Konstantynowicza... S. 395.

[54] SRP. Bd. 2. S. 547.

[55] Тамсама. S. 711.

[56] Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 6. S. 123—124.

[57] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 67.

[58] SRP. Bd. 2. S. 537—539, 547.

[59] Mathias de Miechow. Chronica Polonorum. Cracoviae, 1519. S. 244.

[60] Jasas R. Bychovco kronika ir jos kilmė... P. 37—38.

Ян Гаштаўт → Марцін Гаштаўт → Альберт Гаштаўт[61]. Усё гэта дазволіла б лічыць вяленскага Гаштаўта пачынальнікам гэтага выбітнага панскага роду.

Осцік. У. Сямковіч сфармуляваў тэорыю княскага паходжання Осцікаў-Радзівілаў[62]. Адпраўная кропка гэтай тэорыі — ліст Жыгімонта Старога Юрыю Осціку («пану Сірпуцію») 1533 г.[63]. Прыдомкам Сірпуцій пастаянна карыстаўся таксама яго сын Мікалай Осцік[64]. У 1385 г. крыжацкія *Вегеберыхты* згадваюць *Sirputtindorff* у ваколіцах Кернава, а на пячатцы Крысціна Осціка напісана *de Kernow*[65]. Апошняе звяно — гэта паведамленне Іпацьеўскага летапісу пра брата Трайдзена Сірпуція (сам Трайдзен паходзіў з таго ж Кернава)[66]. Гэта найбольш сумнеўнае месца гэтай тэорыі, хоць яно і не супярэчыць двум важным правілам генеалогіі, якія дазваляюць выяўляць сувязь паміж асобамі, — правілу ўжывання рэдкага імя і правілу геаграфічнай тоеснасці. Тым часам, у канцы XIV ст. злучэнне Сірпуцій-Осцік можна ацэньваць як карэктнае[67]. Сапраўды, інакш цяжка патлумачыць, адкуль у першай палове XVI ст. Осцікі мелі гэтае імя. Логіка такіх разваг змушае ўпісаць у шэраг гістарычных асоб і бацьку Сірпуція Віршулу. Саламон Рысінскі і Альберт Віюк-Каяловіч падаюць такую генеалагічную схему: Ліздзейка — Віршула — Сірпуцій — Осцік — Радзівіл. Пра першую постаць нельга сказаць нічога пэўнага. Віршуламі Осцікі называюцца ўжо ў 1507 г.[68]. Гэтае імя яны ўжываюць і пазней.

---

[61] Гл.: Petrauskas R. XV amžiaus Lietuvos bajorijos struktūra: giminės problema // Tarp istorijos ir būtovės. Studijos prof. Edvardo Gudavičiaus 70-mečiui / Sudarė A. Bumblauskas ir R. Petrauskas. Vilnius, 1999. P. 133—136.

[62] Semkowicz W. Tradycja o kniaziowskiem pochodzeniu Radziwiłłów w świetle krytyki historycznej. Lwów, 1921.

[63] Тамсама. S. 16.

[64] Aścik K. O pochodzeniu rodu Ościków (Legendy a rzeczywistość) // Acta Baltico-Slavica. 1977. T. 11. S. 319.

[65] Semkowicz W. Tradycja... S. 12—15.

[66] Тамсама. S. 21—22.

[67] З гэтым згодна таксама M. Мальчэўска: Malczewska M. Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. Warszawa—Poznań, 1985. S. 25; Jablonskis K. Istorija ir jos šaltiniai. Vilnius, 1979. P. 243—244.

[68] Semkowicz W. Tradycja... S. 22; Malczewska M. Początki rodu Radziwiłłów. Przegląd i krytyka badań // Zeszyty naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. Historia. 1971. Nr. 11. S. 17.

Згадаю толькі некалькі не зафіксаваных яшчэ ў літаратуры выпадкаў: ліст князя Прусіі да ўраднікаў ВКЛ ад 26.10.1546 г., сярод якіх — *domino Wirsula*; лісты Жыгімонта Аўгуста 1549 г., у якіх згадваецца пан Віршула[69]. Недалёка ад Кернава вядомыя вёскі з назвамі Осцікі, Віршулі, Віршулішкі[70]. Такім чынам, мы мелі б імёны дзеда і бацькі Осціка, з якіх прынамсі Сірпуцій быў важнай асобай, пазначыць сядзібу якой аўтары *Вегеберыхтаў* палічылі істотным[71].

Чупурна ўпершыню згадваецца ў данацыі Вітаўта Віленскай кафедры 1395 г.[72]. Да дакумента 1398 г. прывешана яго пячатка з гербам няпольскага паходжання. На жаль, імя па бацьку на надпісе было непазнавальна скажона пры скарачэнні[73]. У ордэнскіх апісаннях дарог знаходзім *Czapornendorff* недалёка ад Салечнікаў[74]. Гэтае паведамленне (№ 79) не датаванае,

---

[69] Elementa ad fontium editiones. Vol. 61 / Ed. C. Lanckorońska et L. Olech. Romae, 1985. P. 117; Listy króla Zygmunta Augusta do Radziwiłłów / Oprac. I. Kaniewska. Kraków, 1999. S. 114, 119.

[70] Aścik K. O pochodzeniu rodu Ościków... S. 321—322.

[71] Апублікаваны адзін дакумент 1359 г., у якім як сведка выступае сын Ліздзейкі Віршула (Prochaska A. Czy istniał Krywe na Litwie // Kwartalnik historyczny. 1904. R. 18. S. 485—486). Але гэта фальсіфікат не XV ст., як мяркуюць некаторыя даследчыкі (Aścik K. O pochodzeniu rodu Ościków... S. 321), а Тэадора Нарбута.
У наш час Тадэвуш Васілеўскі высунуў гіпотэзу мяшчанскага паходжання Осцікаў (Wasilewski T. Pochodzenie rodu Radziwiłłów-Ościków // Miscellanea historico-archivistica. 1997. T. 7. S. 11—17). Баронячы гэтую не пацверджаную крыніцамі тэорыю, ён абапіраецца на дапушчэнне, што ў 1413 г. у Гародлі Осцікаў свядома адаптаваў род польскіх шляхціцаў «нізкага» паходжання з Трубаў. Але Банёніс пераканаўча паказаў, што выбар літоўскімі і польскімі знатнымі родамі адзін аднаго збольшага меў выпадковы характар (Banionis E. Lietuvos bajorai 1413 m. Horodlėje... P. 198—199). Тое, што пазней у Літве гербам Трубы карысталіся некаторыя дробныя баярскія роды, нічога не кажа пра паходжанне Осцікаў, бо няма ніякіх звестак пра іх роднасць. Адзін і той жа герб у Літве выкарыстоўвалі роды зусім рознага сацыяльнага статусу, таму гербавы крытэрый (асабліва ў адносінах да пазнейшых часоў) недастатковы для вызначэння генеалагічных сувязяў. Памылковы характар мае таксама інтэрпрэтацыя Васілеўскім спіса сведак Торуньскай дамовы 1411 г. (CEXV. T. 2. S. 42). Пасля Осціка павінна быць коска, як, дарэчы, і пасля Румбоўда. У адваротным выпадку бацькам Румбоўда павінен быў быць Сунгайла, тым часам з іншых крыніц добра вядома, што Румбоўд быў сынам Валімонта. Пра тое, што Радзівіл Осцікавіч у крыніцах з'яўляецца каля 1411 г., сведчыць таксама адзін недатаваны ордэнскі спіс, складзены да 1412 г. (згадваецца Станіслаў Чупурна) (GStA PK, OBA 29038).

[72] Vitoldiana... S. 19. Таксама гл.: Halecki O. Czupurna // PSB. T. 4. S. 373.

[73] Semkowicz W. Braterstwo szlachty polskiej... S. 411.

[74] SRP. Bd. 2. S. 698.

але іншыя апісанні гэтых мясцінаў (№ 80, 81, 82) датаваныя 1385—1387 гг.[75] Такім чынам, першую згадку пра Чупурну трэба адносіць да канца 9-га дзесяцігоддзя XIV ст.

Валімонт і Валімонтавічы. У Горадзенскай дамове 1398 г. як сведка выступае Валімонт *Buschken son*[76], бацька ўплывовых прадстаўнікоў знаці эпохі Вітаўта — маршалка земскага Румбоўда, старосты жамойцкага Кезгайлы, ваяводы троцкага Яўнуса, старосты ковенскага Шэдзібора, Гудзігерда, кашталяна віленскага і старосты ковенскага Судзівоя[77]. Пра продка Валімонта Бушку захавалася параўнальна шмат звестак. У Троцкай дамове 1379 г. удзельнічаў баярын *Buschke*[78]. У 1365 г. Віганд з Марбурга згадвае ў Майшагольскай зямлі (па суседстве з якой, як мы ўбачым, была вотчына Валімонта) напатканы крыжакамі атрад з 400 літоўцаў, якімі кіраваў *Busko*[79]. У 1385 г. *Вегеберыхты* ў Дзяволтваўскай зямлі лакалізуюць *Busekindorf*[80]. Гэта, несумненна, быў продак Валімонтавічаў, бо ў дакументах іх паходжанне нярэдка акрэсліваецца як *з Дзяволтвы*.

Братоша. Вядомы дакумент паручыцельства за Братошу часоў кіравання Скіргайлы[81], які, верагодна, звязаны з тагачаснымі канфліктамі ў сям'і Ягайлы[82]. У 1388 г. Братоша разам з Янам Альгімонтавічам ездзіў паслом у Ноўгарад[83]. Дастаткова рана — у 1396 і 1401 г. — згадваюцца яго сыны Іван[84]

---

[75] Тамсама. S. 699—700.

[76] CEV. S. 54.

[77] Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 7—13; Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium do połowy XVI wieku. Poznań, 1982. S. 13—28.

[78] Codex diplomaticus Lithuaniae... S. 55.

[79] SRP. Bd. 2. S. 554.

[80] Тамсама. S. 694.

[81] Halecki O. Z Jana Zamoyskiego inwentarza Archiwum Koronnego. Materyały do dziejów Rusi i Litwy z XV wieku // Archiwum Komisji Historycznej. 1938. T. 12. S. 166.

[82] У пачатку 9-га дзесяцігоддзя XIV ст. Братоша выступіў як сведка ў адным дакуменце Андрэя Альгердавіча (Полоцкие грамоты XIII — начала XVI вв. / Изд. А.Л. Хорошкевич. Вып. 1. Москва, 1977. С. 44). Падрабязней гл.: Petrauskas R. Giminaičiai ir pavaldiniai... P. 109—110.

[83] ПСРЛ. Т. 25. С. 214.

[84] Antanavičius D. Du neskelbti 1396 m. Vytauto raštai // Lietuvos istorijos metraštis. 1993. Vilnius, 1994. P. 145.

і Зяновій[85]. Паходжанне гэтага роду дакладна не высветлена. У XVI ст. яго выводзілі з сербскіх князёў, што жылі ў Малдавіі[86]. Нашчадкі Братошы не ўдзельнічалі ў Гарадзельскай гербавай акцыі; гэта тлумачыцца толькі іх некаталіцкай канфесіяй. Зяновій Братошыч у той час быў дастаткова важнай асобай. Напрыклад, у 1411 г. ён быў пасланы на перамовы ў Ноўгарад[87]. У 1432 г. Зяновій выступіў як сведка ў акце Горадзенскай уніі, але, як можна меркаваць з пададзеных выдаўцамі апісанняў пячатак, герба тады ён не меў[88]. Толькі ў 1434 г. на пячатцы яго сына Івашкі, прывешанай да дакумента аднаўлення Горадзенскай уніі, з'явіўся іх герб, што не належыць да польскай геральдычнай традыцыі[89]. Гэтыя факты, а таксама чужое літоўскай сістэме асабістых імёнаў (і, дарэчы, уласцівае сербскай) імя Братоша, дазваляюць высунуць гіпотэзу пра яго нелітоўскае паходжанне. Тады гэта быў бы ўнікальны выпадак для эліты ўлады эпохі Вітаўта, які трэба тлумачыць нетрадыцыйным высокім паходжаннем, рэмінісцэнцыі якога захаваліся ў пазнейшай легендзе.

Сунгайла і Свірскія. Сунгайла ў крыніцах з'яўляецца ў 1398 г.[90]. Пра яго паходжанне мы маем толькі ўскосныя звесткі. Атрыманы ім у 1413 г. у Гародлі герб Ліс выкарыстоўвалі князі Свірскія[91]. Іх роднасць пацвярджаюць і дадзеныя землеўладання — суседства ўладанняў у Віленскім і Свянцянскім паветах, напрыклад, Свіраны ў Сунгайлаў і Свір у Свірскіх[92]. Ксяндзом касцёла ў Варнянах, які фундавала жонка Сунгайлы ў 1462 г., быў князь Андрэй Пецькавіч Свірскі[93]. Каталікам літоўскага паходжання Свірскім не была патрэбная пасляга-радзельская адаптацыя, таму ўжыванне агульнага герба сведчыць пра іх роднасныя сувязі.

---

[85] AU. S. 37.

[86] Пташицкий С. Л. Деспоты Зеновичи в конце XVI и начале XVII вв. // Русская старина. 1878. Т. XXI. С. 125; Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. Kraków, 1858. S. 859.

[87] ПСРЛ. Т. 25. С. 241.

[88] Няма інфармацыі пра тое, што прывешвалася яго пячатка (AU. S. 78).

[89] Тамсама. S. 101.

[90] CEV. S. 54.

[91] Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 56—57.

[92] Тамсама. S. 56—58.

[93] KDKW. S. 277.

Ян Няміра. Вызначыць паходжанне гэтай асобы замінае пашыранасць імя Няміра. У той самы час іншыя Няміры вядомыя на Валыні[94], у Мазовіі[95], на землях Ордэна[96].

Манцігерд. Датаванае 1385 г. паведамленне *Вегеберыхтаў* згадвае *Mantigirdendorf*[97]. У 1396 г. Манцігерд ужо займаў пасаду намесніка полацкага[98]. Яго сын Пётр Манцігердавіч ажаніўся з дачкой князя Фёдара Карыбута Ганнай[99].

Даўгерд і Сак/Саковічы. Нявысветлена, ці Даўгерд Солкулавіч, які ў канцы XIV ст. паручыўся за Братошу, звязаны з Даўгердам часоў Вітаўта. У 1386 г. *Вегеберыхты* лакалізуюць недалёка ад р. Вяллі *Degirdendorf*[100] (магчыма, гэта Доўгірдзішкі недалёка ад Сямелішак). Маршалак дворны і староста падольскі[101] Ян Даўгерд (будучы ваявода віленскі), які актыўна дзейнічаў у канцы панавання Вітаўта, мог быць сынам першага. Роднасць Даўгердаў і Саковічаў: 1) агульны герб — Помян, які ў Гародлі атрымаў Сак; 2) тапаграфія ўладанняў — Няменчын у Саковічаў і Свіраны ў Даўгердаў[102]; 3) Даўгерд выступае як сведка ў данацыі Андрэя Саковіча Віленскай кафедры 1434 г.[103].

Ян Бутрым. Ён таксама ўпершыню згадваецца ў паручыцельстве за Братошу ў давітаўтавы часы. Цалкам магчыма, што яго родзічам (бацькам ?) быў пляменнік маці Вітаўта Бутрым,

---

[94] РИБ. Т. 27. С. 96.

[95] CEV. S. 771.

[96] Тамсама. S. 972.

[97] SRP. Bd. 2. S. 699.

[98] Wolff J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego 1386—1795. Kraków, 1885. S. 44.

[99] Semkowicz W. Łosk i wygaśnięcie Kaributowiczów // Rocznik polskiego towarzystwa heraldycznego. 1924—1925. T. 7. S. 197—209.

[100] SRP. Bd. 2. S. 686.

[101] Старостам падольскім ён мог быць ужо ў 1427 г. Пад дакументам Вітаўта ад 17.09.1427 г., якім надаваліся маёнткі на Падоллі, той жа рукой запісана: «Давкгардъ правил» (Biblioteka XX. Czartoryskich w Krakowie, perg. № 361).

[102] Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 135—138.

[103] KDKW. S. 150.

забіты па загадзе Ягайлы ў 1382 г.[104]. Гэтаму не супярэчыць той факт, што апошні Бутрым паходзіў, верагодней за ўсё, з Жамойці, а Ян Бутрым падпісваўся як «з Жырмунаў» (у Лідскім павеце)[105]. Такія міграцыі ў той час былі дастаткова частай з'явай. Пра блізкасць да Вітаўта сведчыць пасольства Бутрыма ў 1410 г. да караля Чэхіі Вацлава[106], а пра сувязі з Жамойцю — згадка Мацея Стрыйкоўскага пра *жамойцкага пана Юрыя Бутрыма*[107], які быў сынам Яна Бутрыма. Родзічам Яна Бутрыма быў **Аляксандр Монтаўт**, які ў крыніцах упершыню сустракаецца ў 1422 г. сярод сведак Мельнскага міру[108]. На жаль, мы не ведаем яго імя па бацьку, але той жа герб Сякера і знаходжанне ўладанняў па суседстве сведчаць пра сувязі з родам Бутрыма.

Наць Гінівілавіч удзельнічаў у Гарадзельскай уніі, але вяршыні кар'еры дасягнуў у часы Жыгімонта Кейстутавіча і Казіміра. У 1452 г. стаў каштalянам троцкім[109]. Бацька Наця Гінівіл сустракаецца ўжо ў самым пачатку панавання Вітаўта. Спіс Кароткага ізводу літоўскіх летапісаў, які ў літаратуры называецца спісам Аўрамкі — Віленскім спісам, згадвае Васіля Барэйкавіча і Гінівіла, высланых Вітаўтам супраць Карыбута Альгердавіча, у канцы XIV ст.[110]. У 1398 г. Гінівіл быў старостам троцкім[111].

Судзімонт. Важна звярнуць увагу на паходжанне гэтага баярына эпохі Вітаўта, бо яго сын Алехна Судзімонтавіч у канцы панавання Казіміра стаў адным з лідараў знаці ВКЛ. Яшчэ ў перыяд змагання Вітаўта за спадчыну бацькі вядомы эйшышкскі (*Wesisken*) князь

---

[104] ПСРЛ. Т. 35. С. 117.

[105] Vitoldiana... S. 87.

[106] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 2.

[107] Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi. T. 2. Warszawa, 1846. S. 186. Праўда, гэтая інфармацыя Мацея Стрыйкоўскага можа быць вынікам яго ж кампіляцыйнага даследавання, калі ён злучаў усіх вядомых яму Бутрымаў у адзін род.

[108] LUB. Bd. 5. S. 888—889.

[109] Ю. Вольф памылкова адзначае, што гэтую пасаду займаў Пац (Wolff J. Senatorowie i dygnitarze... S. 62). Гл.: АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 31; KDKW. S. 236.

[110] ПСРЛ. Т. 35. С. 89

[111] LUB. Bd. 4. S. 226—227. Яшчэ адзначу, што яго імя — не *Кімант Гінівіл* (так у Ю. Вольфа: Wolff J. Senatorowie i dygnitarze... S. 55), а толькі *Гінівіл*. Пасля *Кімант* патрэбна ставіць коску. Так мяркуюць і выдаўцы нямецкага тэксту дамовы (Die Staatsverträge des Deutschen Ordens in Preußen im 15. Jahrhundert. T. 1. S. 12).

Судзімонт[112], з сястрой якога, як мяркуе Ігнас Янінас, быў жанаты Вітаўт[113]. Гэта гіпотэза грунтуецца на Старэйшай хроніцы вялікага магістра, якая характарызуе Судзімонта як Вітаўтавага *swoger*[114]. Іх адносіны роднаснасці акрэслівае таксама *Summarium von Jagel und Wytaut*[115]. Слова *swager* у тагачаснай нямецкай мове абазначала асобу, якая парадніла з іншай праз шлюб — гэта мог быць цесць, зяць, муж сястры жонкі і інш.[116]. Тым часам, напісаная ў 1416 г. апалогія Ордэна называе Судзімонта Вітаўтавым *magen*[117]. *Mage* абазначала роднасць увогуле (найчасцей роднасць па крыві)[118]. Такім чынам, ступень роднасці Вітаўта і Судзімонта нявысветлена[119]; для нас будзе дастаткова самога пацвярджэння роднасці. У 1394 г. гэты Судзімонт быў забіты крыжакамі[120].

Верагодна, што падчашы двара Вітаўта, а ў часы Жыгімонта Кейстутавіча староста крэўскі, Судзімонт — не родзіч згаданага князя. Не засталося ніякай княскай традыцыі гэтых Судзімонтаў, нічога таксама невядома пра іх роднасць з Вітаўтам.

Матэрыял дамоў з Ордэнам і Польшчай 1431—1434 гг. дазволіў Юзафу Пузыну і, пазней, Марцэлію Антаневічу сфармуляваць новую гіпотэзу паходжання гэтага Судзімонта[121]. У Троцкай і Горадзенскай уніях 1433 і 1434 г. удзельнічаў староста крэўскі Судзімонт[122]. Тым часам, у дамовах з Ордэнам 1431

[112] SRP. Bd. 2. S. 626; CEV. S. 4 і інш.

[113] Jonynas I. Vytauto šeimyna // Jonynas I. Istorijos baruose. Vilnius, 1984. P. 57—66.

[114] SRP. Bd. 3. S. 605.

[115] SRP. Bd. 5. S. 224.

[116] Mittelniederdeutsches Wörterbuch / K. Schiller und A. Lübben. Bd. 4. Münster, 1931. S. 482; Lexer M. Mittelhochdeutsches Taschenwörterbuch. Stuttgart, 1992. S. 259.

[117] Prochaska A. Z Archiwum Zakonu Niemieckiego. Analecta z wieku XIV i XV // Archiwum Komisji Historycznej. 1909—1913. T. 11. S. 252.

[118] Mittelniederdeutsches Wörterbuch. Bd. 3. S. 5; Lexer M. Mittelhochdeutsches Taschenwörterbuch. S. 153.

[119] Таксама мяркуе і С. К. Роўэл (Rowell S. C. Gediminaičių dinastinė politika Žemaitijoje 1350—1430 m. // Žemaičių praeitis. 1994. T. 3. P. 133—134). Таксама гл.: Tęgowski J. Małżeństwa księcia Witolda Kiejstutowicza // Rocznik polskiego towarzystwa heraldycznego. N. S. 1995. T. 2 (13). S. 178—179.

[120] SRP. Bd. 3. S. 194.

[121] Puzyna J. Herb złożony Pawła Holszańskiego, biskupa wileńskiego // Miesięcznik heraldyczny. 1932. R. 11. S. 126—128; Antoniewicz M. Manifestacja genealogiczna w herbie złożonym biskupa Pawła Olgimunta księcia Holszańskiego // Prace naukowe Wyższej szkoły pedagogicznej w Częstochowie. 1997. Z. 4. S. 406—408.

[122] AU. S. 94, 105.

і 1432 г. як сведка выступае Судзімонт Доргевіч[123]. У апошніх дамовах мясцовыя пасады не пазначаныя (за выключэннем Вільні і Жамойці). У крыніцах таго часу вядомы толькі адзін баярын з такім імем. Такім чынам, хутчэй за ўсё, гэта адна і тая ж асоба. У адваротным выпадку было б дастаткова дзіўным храналагічнае супадзенне сыходу аднаго Судзімонта з палітычнай арэны і ўступленне на яе іншага. *Пан Судзімонт Доргевіч* сустракаецца таксама ў кнізе «данін» Казіміра[124]. Калі мы сутыкнёмся з дапушчэннем пра ідэнтычнасць гэтых Судзімонтаў, паўстае пытанне — кім быў яго бацька Дорг? У Віленскай уніі 1401 г. удзельнічаў Осцік з братам Доргам[125], пра якога мы не маем больш ніякіх звестак. Ці можа наш Судзімонт быць пляменнікам Осціка і стрыечным братам Радзівіла Осцікавіча? З першага погляду, сур'ёзным аргументам супраць гэтага з'яўляецца пячатка Судзімонта 1434 г. (у дакументах 1431—1433 гг. яна або не захавалася, або непазнавальная), на якой выяўлены знак негарадзельскага паходжання[126]. Осцікі, як вядома, мелі герб Трубы. Але выкарыстанне знака мясцовага паходжання яшчэ не абавязвае рабіць адназначныя высновы. Напрыклад, староста жамойцкі Гайлімін Надобавіч у дакументе 1432 г. выкарыстоўваў гарадзельскі герб Дубна, а ў 1434 г. — зусім іншы знак[127]. Тым часам, сын Судзімонта Алехна выкарыстоўваў пячатку з гербам Трубы[128].

Гайлімін быў адным з найважнейшых жамойцкіх баяраў. У 1416 г. у Канстанцы ён узначальваў жамойцкую дэлегацыю[129].

---

[123] Бучинський Б. Кілька причинків до часів вел. князя Свитригайла (1430—1433) // Записки Наукового Товариства імени Шевченка. 1907. Т. 76. С. 135; Napiersky K. E. Russisch-livländische Urkunden. S. 191.

[124] РИБ. Т. 27. С. 22.

[125] «Astyk cum fratre germano Dorgy» (AU. S. 37).

[126] AU. S. 101. Праўда, поўнай упэўненасці, што гэта менавіта пячатка Судзімонта, няма, бо надпіс немагчыма дакладна прачытаць.

[127] AU. S. 78, 100.

[128] Antoniewicz M. Manifestacja genealogiczna... S. 407; Хорошкевич А. Л. Печати полоцких грамот XIV — XV вв. // Вспомогательные исторические дисциплины. Т. 4. 1972. С. 134—135. Можна дадаць, што дачка Алехны Судзімонтавіча Ядвіга таксама выкарыстоўвала пячатку з гербам Трубы (GStA PK, OBA 18388).

[129] Piekosiński F. Goście polscy na soborze konstancyjskim // Rozprawy Akademii Umiejętnosci. Wydział historyczno-filozoficzny. 1899. T. 37. S. 147; Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 196.

З 1433 г. быў старостам жамойцкім[130]. У крыніцах ён часта называецца Надобавічам[131]. Яго бацька Станіслаў Надоба (*Nadobe*) разам з іншымі жамойцкімі правадырамі ў 1413 г. выказаў свае прэтэнзіі на літоўска-крыжацкім працэсе[132].

Гінейт Канцэвіч упершыню згадваецца ва ўжо неаднойчы цытаваным паручыцельстве за Братошу часоў Скіргайлы. У 1390 г. ён разам з іншымі жамойтамі прысягае на вернасць Вітаўту і крыжакам[133]. Яго жамойцкае паходжанне пацвярджаюць і *Вегеберыхты*, што згадваюць мясцовасць *Gnethen* у Жамойці[134]. З сынам Мілусам Гінейт браў удзел у уніі 1401 г.[135]. У 1433 г. быў старостам ковенскім[136].

Прыклады Гайліміна і Гінейта паказваюць, што сярод жамойцкага баярства становішча на вяршыні ўлады таксама перадавалася ў спадчыну, а гэта дазваляе некалькі падкарэктаваць меркаванне Кшыштафа Пяткевіча пра трансфармацыю жамойцкай знаці ў часы Вітаўта[137].

б) Геаграфія паходжання знаці

Праблемы з інтэрпрэтацыяй крыніц тут яшчэ больш складаныя. Значныя цяжкасці паўстаюць пры адасабленні наданняў гаспадара і вотчынных зямель. Гэтае сцвярджэнне ілюструе наданне Жыгімонта Кейстутавіча Яну Гаштаўту 1433 г.[138], калі частка «падараваных» зямель ужо належала яго бацьку. Тэрміналогія, што ўжывалася ў канцылярыі гаспадара[139], была непаслядоўнай, мала

---

[130] AU. S. 94..

[131] CEV. S. 180; AU. S. 81; 100.

[132] Lites ac res gestae inter Polonos Ordinemque Cruciferorum. T. 2. Posnaniae, 1892. P. 147.

[133] CEV. S. 23—24.

[134] SRP. Bd. 2. S. 664—665.

[135] AU. S. 37.

[136] Тамсама. S. 94.

[137] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami... S. 134—135.

[138] Описание документов и бумаг, хранящихся в Московском архиве Министерства Юстиции. Кн. 21. Москва, 1915. С. 332.

[139] Пра яе гл.: Kosman M. Kancelaria wielkiego księcia... S. 91—119; Kosman M. Dokumenty wielkiego księcia Witołda // Studia źródłoznawcze. 1971. T. 16. S. 139—168.

дыферэнцаванай, не прыдатнай для вылучэння розных формаў уласнасці. Мовы, што ўжываліся ў канцылярыі (асабліва лацінская), не маглі адэкватна перадаць складаныя і «некласічныя» сацыяльныя землеўласніцкія адносіны. Шматлікія наватворы літоўскага і славянскага паходжання адлюстроўваюць спробы пісараў выкруціцца з заблытанай моўнай сітуацыі, перакласці тое, што, па сутнасці, не можа перакладацца. Напр., стыль канцылярскай мовы аднаго з нешматлікіх захаваных прывілеяў Вітаўта Альберту Манівіду з поўным фармулярам (13.01.1407 г.): *...quod consideratis et in acie mentis nostre bene revolutis, ymo perpensius compensatis fidelibus obsequiis et laboribus indefessi solercia, quibus... Albertus alias Monywid... coram nobis plurimum complacuit et in futurum aucto fidelitatis... poterit complacere... sibi possesiones, villas et hereditates infrascriptas videlicet Geranonsky cum aliis villis ad ipsam spectantibus* (далей ідзе пералічэнне ўсіх нададзеных мясцовасцей) *cum omni dominio et proprietate rite et racionabiliter dedimus, contulimus et donavimus...*[140].

Князь дае за службу ўладанні, статус якіх недыферэнцаваны, няма ніякіх згадак пра сувязь Манівіда з гэтымі ці блізкімі землямі. Тым часам з ордэнскіх апісанняў дарог (*Вегеберыхтаў*) вядома, што Манівід ужо ў канцы XIV ст. валодаў вёскай у ваколіцах Геранёнаў[141].

Гэты прыклад паказвае, як асцярожна неабходна ацэньваць асобныя месцы ў дакументах. Фрагментарнасць крыніц не дазваляе дакладна рэканструяваць уладанні знаці. Даследчыкі звычайна моўчкі пагаджаюцца з гэтай непазбежнасцю. Але такая нерэфлектаваная рэканструкцыя, калі абапірацца на захаваны дакументальны матэрыял, можа сказіць вобраз. Застаецца неагаворанай акалічнасць, што толькі малая частка тагачасных перадач фіксавалася пісьмова. Частка вотчынных уладанняў з'яўляецца ў крыніцах толькі тады, калі з-за іх узнікаюць канфлікты[142]. Фрагментарнасць крыніц — гэта наступства не адных толькі «страт» (хоць, несумненна, іх было нямала). Іншы бок з'явы становіцца

[140] Vitoldiana... S. 70—71.

[141] SRP. Bd. 2. S. 704—705.

[142] Па гэтай прычыне Р. Саблонір нават мяркуе, што дакументальны матэрыял часцей адлюстроўвае спрэчныя, а не рэальныя ўладанні. Пісьмовы дакумент прызначаны стварыць традыцыю легітымізацыі, а не зафіксаваць існуючы стан (Sablonier R. Schriftlichkeit, Adelsbesitz und adliges Handeln im 13. Jahrhundert // Nobilitas: Funktion und Repräsentation des Adels in Alteuropa / Hrsg. v. O. G. Oexle und W. Paravicini. Göttingen, 1997. S. 85—93).

зразумелым, калі паставіць пытанне, што ўвогуле ў той час магло / мела запісвацца. У адрозненне ад уладанняў гаспадароў і Касцёла, землеўладанне баярства XV ст. асветлена вельмі малой колькасцю непасрэдных крыніц. Вывучэнне яго структуры магчыма толькі пры дапамозе аналізу данацый Касцёлу і наданняў вялікага князя. Пры даследаванні ўладанняў баярства неабходна ўвесь час памятаць пра гэтую «выкрыўленую» канфігурацыю крыніц.

Грунтуючыся на крыніцах аднаго тыпу, нельга рабіць радыкальных высноў, прывілеі гаспадара неабходна інтэрпрэтаваць у кантэксце паведамленняў з *Вегеберыхтаў*, хронік, царкоўных фундацый. Толькі тады магчымыя больш дыферэнцаваныя высновы пра тагачасную структуру ўладанняў знаці.

Манівід і Гедзігоўд. Апісанні дарог крыжакамі канца XIV — пачатку XV ст. лакалізуюць непадалёк ад Геранёнаў, за 1,5 мілі ад вёскі Гаштаўта, *Manewidendorf*[143]. Недалёка знаходзіцца Вішнева, з якога пісаліся брат Манівіда Гедзігоўд і яго сын Пётр Сенька Гедзігоўдавіч[144]. На думку Войцеха Пельтца, які даследаваў гісторыю сям'і Гедзігоўда, гэта не было вотчыннае ўладанне[145]. Але нядаўна апублікаваная дамова Вітаўта з біскупам, капітулай і мяшчанамі Тарту 1396 г. дазваляе карэктаваць гэтую высноў. У дамове як сведка выступаў *Albertus Monwid de Wischna*[146]. *Wischna* — гэта, несумненна, скажонае Вішнева. Такім чынам, пацвярджаецца ранняя прыналежнасць гэтага ўладання роду Манівіда. Разам з.тым, гэты матэрыял — важны крыніцазнаўчы аргумент для абгрунтавання «вотчыннага статусу» ўладанняў з дадаткам *de, haeres de*. Яшчэ адно значнае вотчыннае ўладанне ў Ашмянскім павеце — Жупраны. Гэту мясцовасць у траўні 1423 г. на сваёй пячатцы, прывешанай да Мельнскай дамовы 1422 г., абазначыў сын Альберта Манівіда Ян (*de Szupran*)[147].

---

[143] SRP. Bd. 2. S. 704—705.

[144] «Georgio alias Gedigoldo de Wisniowo» (1435 г. — KDKW. S. 158); «Petrus Sienko haeres de Wisniowo» (1447 г. — Тамсама. S. 212).

[145] Peltz W. Ród Giedygołda i jego majętności. Z dziejów tworzenia się wielkiej własności ziemskiej w Wielkim Księstwie Litewskim w XV wieku // Zeszyty naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. Historia. 1971. Nr. 11. S. 29.

[146] Antanavičius D. Du neskelbti 1396 m. Vytauto raštai... P. 145.

[147] Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju melneńskiego z 1422 roku / Wyd. P. Nowak i P. Pokora. Poznań, 2004. Выказваю ўдзячнасць д-ру П. Новаку і маг. П. Пакоры за магчымасць азнаёміцца з падрыхтаванай да публікацыі кнігай.

Мінігайла ў некаторых дакументах тытулуецца *de Dewenyszki*[148]. Дзявенішкі знаходзіліся недалёка ад Ашмянаў, старостам якіх Мінігайла называецца ўжо ў 1387 г.[149]. Акрамя гэтай асноўнай сядзібы, ён мог мець уладанні ў Салечніцкім краі, дзе крыжацкія шпегі знайшлі дзве вёскі Мінігайлы (*Mynegalia*)[150].

Андрэй Гаштаўт. У *Вегеберыхтах* згадваецца вёска (двор) Гаштаўта ў Геранёнскім краі (*Gasztowtendorff im gebite czu Geranenen*)[151]. У дамове 1396 г. Андрэй Гаштаўт згадваецца як *de Manibus*[152] (*Gerananibus*). Геранёнскімі пісаліся ўсе Гаштаўты: Ян, Марцін, Юрый[153]. У XVI ст. Альберт Гаштаўт карыстаўся тытулам графа Мураваных Геранёнаў[154]. Магчыма, што яшчэ ад часу займання пасады старосты вяленскага ў руках роду засталіся ўладанні ў вяленскіх ваколіцах, дзе яшчэ ў 1413 г. была вёска Гаштаўта (*villa dicta Gastowdi*)[155] (хоць гэта магло быць і следам ранейшай уласнасці). Гаштаўты мелі ўладанні ў Вільні, якія згадваюцца ў прывілеі Ягайлы віленскаму біскупу 1387 г.[156]

Спасылка на вотчыну **Осціка** — надпіс на яго пячатцы 1432 г. *de Kernow*[157]. Двор, што верагодна належаў бацьку Осціка Сірпуцію, па звестках апісанняў дароў крыжакамі, быў непадалёк ад Кернава[158]. У запісе Осціка сваёй жонцы 1436 г. вотчынным уладаннем называецца двор Даўклібішкі[159]. Міраслава Мальчэўска, якая празмерна просталінейна ішла за тэорыяй Лаўмяньскага, мяркуе, што гэта мог быць адзіны двор, атрыманы Осцікам у спадчыну ад бацькі[160]. Такая выснова, што грунтуецца на асобным дакуменце,

---

[148] Vitoldiana... S. 31.

[149] KDKW. S. 9.

[150] SRP. Bd. 2. S. 699—700.

[151] Тамсама. S. 704.

[152] Antanavičius D. Du neskelbti 1396 m. Vytauto raštai... P. 145.

[153] KDKW. S. 146, 300, 318.

[154] Kuźmińska M. Olbracht Marcinowicz Gasztołd // Ateneum Wileńskie. 1927. R. 4. S. 347—391; 1928. R. 5. Z. 14. S. 120—174.

[155] Lites ac res gestae... T. 2. P. 137.

[156] KDKW. S. 5.

[157] AU. S. 78.

[158] SRP. Bd. 2. S. 695.

[159] Daniłowicz I. Skarbiec diplomatów etc. posługujących do krytycznego wyjaśnienia dziejów Litwy, Rusi Litewskiej i ościennych im krajów. T. 2. Wilno, 1862. S. 168.

[160] Malczewska M. Latyfundium Radziwiłłów... S. 44.

не можа лічыцца абавязковай. У тым жа запісе згадваецца таксама адно наданае вялікім князем уладанне, але гэта яшчэ не значыць, што яно было толькі адно. На жаль, тэстамент Осціка 1442 г. вядомы толькі з апублікаванага Сямковічам рэестра[161], які не дазваляе вызначыць статус яго зямель.

Чупурна. Паміж Рудамінай і Салечнікамі, ля ракі Мерач [літ. *Merkys*], *Вегеберыхты* згадваюць *Czapornendorff*, верагодна ідэнтычны Таборышкам[162]. Засведчаная ў іншых крыніцах сувязь Чупурны з Салечнікамі яшчэ раз пацвярджае дакладнасць крыжацкіх рапартаў. Даңацыйны дакумент віленскім францішканам Чупурна выдае ў 1410 г. у сваім салечніцкім маёнтку (*in Solcznik in curia nostra*)[163]. Яго двор (той жа?) знаходзіўся на шляху паміж Варшавай і Вільняй[164].

Валімонтавічы месцам свайго паходжання лічылі Дзяволтву: 1431 г. — Румбоўд *de Viltothowo* (*Dawiltowo*)[165], 1434 г. — Кезгайла з Дзяволтвы[166], 1434 г. — Судзівой з Дзяволтвы[167]. У 1444 г. Кезгайла фундаваў парафіяльны касцёл у Дзяволтве[168]. У сярэдзіне XV ст. Міхаіл Румбоўдавіч атрымаў сем чалавек у Вількаміры *его жъ отчина*[169]. Вотчынны статус Дзяволтвы пацвярджае ордэнская рэляцыя, што ў гэтай зямлі лакалізуе *Busekindorf* (Бушка — дзед Валімонтавічаў)[170].

Братоша ў Салінскай дамове 1398 г. фігуруе як *Bratus de Mys*[171]. Яшчэ ў 1395 г. яго сын Ян пісаўся як *de Musa*[172], а ў спісе

---

[161] Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 5. S. 43—44.

[162] SRP. Bd. 2. S. 698.

[163] KDKW. S. 83—84.

[164] «In veniendo de Wilna ad Warschowiam in domo Czupurne» (Lites ac res gestae... T. 2. P. 164).

[165] CEXV. T. 1. S. 75.

[166] Описание документов и бумаг... Кн. 21. С. 328; KDKW. S. 154.

[167] AU. S. 101.

[168] Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium... S. 22.

[169] РИБ. Т. 27. С. 122.

[170] SRP. Bd. 2. S. 694.

[171] LUB. Bd. 4. S. 226—227.

[172] Antanavičius D. Du neskelbti 1396 m. Vytauto raštai... P. 145.

вотчынных уладанняў 1414 г., пацверджаным Вітаўтам Зяновію Братошычу, паперадзе ідзе *Mysz*[173]. Мыш знаходзіцца паміж Наваградкам і Слонімам.

Уладанні **Сунгайлы** вядомыя толькі з позняй (1462 г.) касцёльнай фундацыі яго ўдавы Марыны, таму немагчыма аддзяліць вотчынныя землі ад нададзеных. І ўсё ж факт фундацыі касцёла ў Варнянах, напісанне дакумента ў тым жа месцы і адзнака, што Варняны — гэта бацькава вотчына, дазваляюць выводзіць Сунгайлу з гэтых мясцін[174]. Гэтае дапушчэнне пацвярджае і яго суседства з уладаннямі родзічаў — князёў Свірскіх[175]. Згаданы ў канцы XIV ст. паміж Гарадняй і Наваградкам *Sangailsdorf* (Ліпічна)[176] быў іншым яго ўладаннем.

Ян Няміра, а пазней яго сыны Андрэй і Мікалай пісаліся з Уселюба[177], які знаходзіўся ў Наваградскім павеце.

Пра вотчыну **Манцігерда** *Вегеберыхты* (1385 г.) паведамляюць: *Mantegirdindorff* у Салечніцкай зямлі[178]. Пазнейшыя Манцігерды падпісваліся як *з Іўя*[179]. Праўда, 24.08.1434 г. вялікі князь Жыгімонт Кейстутавіч надаў Пятру Манцігердавічу Іўе разам з некаторымі іншымі маёнткамі. Але ў гэтым выпадку, верагодней за ўсё, мы маем справу з выкананай у той час гэтым князем акцыяй па пацвярджэнні вотчынных уладанняў[180]. Пра гэта ў 1434 г. згадвае таксама ордэнскі пасол, пераказваючы сваю размову з літоўскімі панамі[181].

---

[173] Vitoldiana... S. 74 (Mysz, Czordlone, Wiszniew, etc.).

[174] KDKW. S. 274—275.

[175] Гл.: Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 56—58.

[176] SRP. Bd. 2. S. 707—708.

[177] Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju melneńskiego...; AU. S. 101; KDKW. S. 222—223.

[178] SRP. Bd. 2. S. 699.

[179] KDKW. S. 379.

[180] AGAD, dok. perg., № 7297. Гл. довады ў тэксце пры спасылцы № 138.

[181] «Item so gebet her [Жыгімонт] alle den, dy ir veterliche erbe besitczen, gutthe hantfeste... und ouch alle den, den zein bruder belent hot, derglichen» (LUB. Bd. 8. S. 502).

Сын **Яна Даўгерда** Андрэй Даўгердавіч сваімі вотчыннымі землямі называў Свіраны і Лынтупы[182]. У Лынтупах ён фундаваў парафіяльны касцёл. Тое, што гэтыя землі ўжо нейкі час былі ў руках роду, відаць з тапаграфіі ўладанняў яго родзічаў **Саковічаў**[183]. У 1434 г. Андрэй Саковіч называе сябе панам няменчынскім (*heres de Nemenczina*)[184]. Ён таксама меў уладанні ў размешчаным побач Мядзеле, дзе ён і яго сын Багдан займалі пасаду старосты. Частка вотчынных уладанняў Андрэя Саковіча знаходзілася ў Ашмянскім павеце, бо ў 1443 г. ён тытулаваўся ўжо як *heres de Hrusdowo*[185], дзе быў пабудаваны касцёл.

Ян і Юрый Бутрымы разам з тытулам маршалка дворнага рэгулярна згадвалі месца свайго паходжання — *de Zirmuni*[186] (Жырмуны недалёка ад Ліды). Іх магчымая сувязь з Жамойцю разгледжана ў прысвечанай паходжанню знаці частцы працы. Сваю частку ў Жырмунах мелі і **Монтаўты**, асноўная сядзіба якіх знаходзілася ў Салечніках[187].

Адзіная згадка пра вотчыну **Наця Гінівілавіча** — гэта фундацыя касцёла ў Жослах, вядомая з пацвярджэння яго нашчадкаў Міхаіла і Яна[188].

Сын старосты крэўскага **Судзімонта** Алехна ў 1448 г. называўся як *з Хажова*[189]. Захаваўся дакумент (дакладней, згадка ў рэестры) Жыгімонта Кейстутавіча, які надае Судзімонту хажоўскі маёнтак[190]. Але, як паказвае наданне

[182] KDKW. S. 255, 271—273.

[183] Kelma E. Ród Sakowiczów i jego majętności w XV i pierwszej połowie XVI wieku // Lituano-Slavica Posnaniensia: Studia historica. 1989. Vol. 3. S. 155—177.

[184] KDKW. S. 150.

[185] Тамсама. S. 200—201.

[186] Vitoldiana... S. 87, 104—105 і інш.; Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 173—174.

[187] Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 5. S. 48—49.

[188] Mokslų Akademijos biblioteka, Rankraščių skyrius (далей — MAB RS), F 256—2747.

[189] KDKW. S. 214.

[190] Описание документов и бумаг... Кн. 21. С. 328.

Жыгімонта падобнай формы і даты Яну Гаштаўту[191], гэта магло быць пацвярджэннем ранейшага валодання або надзяленне новымі тэрыторыі па суседстве са старымі. У святле гэтага надання характарыстыка Алехны Судзімонтавіча як *de Chozova* робіць апошнюю думку цалкам верагоднай. Частку вотчынных уладанняў Судзімонт, родзіч Осцікаў, хутчэй за ўсё меў таксама ў кернаўскіх ваколіцах.

Рэканструкцыя вотчынных зямель літоўскай знаці канца XIV — пачатку XV ст. дазваляе зрабіць некалькіх важных высноў. Па-першае, амаль усе вотчынныя ўладанні лакалізуюцца на адносна кампактнай тэрыторыі, якая ў асноўным супадае з землямі «сапраўднай» Літвы (альбо Літвы ў вузкім сэнсе). Па-другое, ужо ў гэты час вярхушка літоўскага баярства мела значную колькасць маёнткаў, характэрнай рысай якіх была тапаграфічная няцэльнасць[192]. Відавочна вотчыннае паходжанне часткі гэтых зямель дапаўняе ранейшыя развагі пра паходжанне знаці часоў Вітаўта. Не выклікае сумнення, што панаванне Вітаўта спрычынілася да значнага ўзмацнення баярства, але даследаванне паходжання найбольш уплывовых прадстаўнікоў знаці паказвае, што тэорыя пра істотныя змены ў складзе літоўскай эліты ўлады, што адбыліся ў эпоху Вітаўта, неабгрунтаваная. Звесткі з крыніц не дазваляюць вызначыць генеалагічныя сувязі больш ранняга часу. Кантынуітэт знаці можна дакazаць толькі пачынаючы з другой паловы XIV ст. Пра знаць эпохі Вітаўта ўжо можна казаць, што яе прадстаўнікі з'яўляюцца нашчадкамі высакародных і захоўваюць сваё высокае становішча для сваіх дзяцей. Распаўсюджаныя ў літаратуры гіпотэзы пра вызначальны ўплыў гарадзельскай акцыі або сфармаванага Вітаўтам новага сацыяльнага стану на ўзнікненне гэтай групы не пацвярджаюцца звесткамі з крыніц. Стаўшы вялікім князем, Вітаўт сутыкнуўся з усталяванай уладнай іерархіяй, якую павінен быў паважаць. Гэтая выснова не пярэчыць добра адлюстраванай у крыніцах

[191] Тамсама. С. 332.

[192] Пра структурныя прычыны гэтай з'явы гл.: Petrauskas R. « XV amžiaus Lietuvos bajorijos struktūra... P. 143—149. Таксама гл. частку гэтай працы, прысвечаную структуры знаці.

вялікай уладзе Вітаўта, у тым ліку, уладзе ў адносінах да баярства. Але гэтая выснова дапамагае лепей зразумець адносіны ўлады вялікага князя і арыстакратыі, якія былі нашмат больш складанымі, чым лічылася ў ранейшай гістарыяграфіі.



Вотчыны літоўскай знаці канца XIV — пачатку XV ст. (карта-схема)

♦ — вотчыны

За дапамогу ў складанні карты-схемы дзякую Рэмігіюсу Чэрнюсу

3. ПРАБЛЕМА «НОВЫХ ЛЮДЗЕЙ»

Частка даследавання складу эліты ўлады — гэта разгляд магчымасцей узвышэння «новых людзей». У польскай гістарыяграфіі праблемны артыкул на гэтую тэму апублікаваў Антоні Гансяроўскі[193]. Ён заўважыў перыядычныя змены складу пануючага стану ў сярэднявечнай польскай дзяржаве, абумоўленыя пратэжаваннем, якое ажыццяўлялі новыя манархі ў дачыненні да адданых ім людзей. Хоць аўтар прэтэндуе на ахоп усёй сярэднявечнай гісторыі Польшчы, аднак часцей за ўсё падае прыклады з XV—XVIII ст.[194]. Неабходна адзначыць, што больш за ўсё «новых людзей» Гансяроўскі знаходзіць сярод біскупаў, а таксама ў канцылярыі і скарбе манарха. Але ён не зважае на існаванне спецыфічных патрабаванняў (напр., адукацыйных) у гэтых інстытуцыях. Асабліва складанымі былі намінацыі біскупаў, бо іх прызначэнне зацвярджаў папа. Важнае іншае назіранне Гансяроўскага: сярод мясцовых ураднікаў (каштalянаў, ваявод) працэнт «новых людзей» быў меншы[195]. Недастатковае, па меншай меры для ранняга часу, такое азначэнне «новых людзей», як дзеці асоб, што не займалі высокіх пасад. Яно абумоўлена штучным адасабленнем паняццяў пануючага класа і пануючай эліты[196]. Абапіраючыся на гэтае азначэнне, неабходна было б выключыць з эліты ўлады часоў Вітаўта Мінігайлу і Братошу, якія не займалі ніякіх пасад, з часоў Жыгімонта Кейстутавіча — Кезгайлу, Ходку Юр'евіча і іншых. Звесткі тэстацый ствараюць больш надзейныя падставы для вырашэння праблемы «новых людзей».

Даследаванне паходжання найбольш уплывовых прадстаўнікоў знаці эпохі Вітаўта паказала, што высокае становішча ўсіх іх тлумачыцца паходжаннем. Няма падстаў лічыць іх выхадцамі з сярэдняга баярства і, тым больш, казаць пра стварэнне новага сацыяльнага стану, нібыта здзейсненае Вітаўтам. Характэрна, што ў традыцыі самых знатных родаў не фіксуецца нейкая выключнасць часоў Вітаўта. У адрознен-

[193] Gąsiorowski A. Rotacja elity władzy w średniowiecznej Polsce // Społeczeństwo Polski średniowiecznej: zbiór studiów. 1981. T. 1. S. 264—290.

[194] Тамсама. S. 271—272.

[195] Тамсама. S. 281—283.

[196] Тамсама. S. 265.

не ад гэтага, для большасці прадстаўнікоў дробнага баярства прывілеі Вітаўта сталі асновай легітымацыі іх статусу[197]. Няма якіх-небудзь слядоў рэформаў, што закранулі верхні слой баярства, і ў самых ранніх тэкстах літоўскай гістарыяграфіі — літоўскіх летапісах.

У тэстацыях гаспадарскіх дакументаў мы таксама не знаходзім нечаканых імёнаў. Браты Манівід і Гедзігоўд актыўна дзейнічаюць да самай смерці. Не пакідаюць сваіх пазіцый Валімонтавічы — Румбоўд, Кезгайла, Яўнус, пазней Шэдзібор і Судзівой. У канцы панавання Вітаўта ў кола найбольш уплывовых асоб трапляюць Ян Гаштаўт (сын Андрэя), Радзівіл Осцікавіч, Юрый Бутрым. Ніякіх значных змен не адбываецца таксама ў часы Свідрыгайлы і Жыгімонта Кейстутавіча. Асабліва трэба было б чакаць ініцыяваных апошнім гаспадаром рэформаў на вяршыні ўлады, бо менавіта з яго імем пазнейшая традыцыя звязвае пратэжаванне дробнага і сярэдняга баярства. Найбольш падрабязным варыянтам гэтай традыцыі з'яўляецца аповед Хронікі Быхаўца пра забойства Жыгімонта[198]. Гэта не самастойны твор, а кампіляцыя паведамленняў рускага і польскага паходжання, дапоўненая мясцовымі матывамі. У гістарыяграфіі заўважана, што да фармавання гэтага цыкла аповедаў мелі адносіны самі арганізатары забойства, напр., па ініцыятыве Аляксандра Чартарыйскага, які стаў наўгародскім намеснікам, у летапісе з'явілася адмоўная характарыстыка Кейстутавіча[199]. Відавочна, што перад уключэннем у склад Хронікі Быхаўца (3 дзесяцігоддзе XVI ст.) аповед зведаў розныя трансфармацыі, што, несумненна, не магло не адбіцца на яго каштоўнасці як крыніцы. Нельга адмаўляць засведчаную таксама ў іншых крыніцах жорсткасць Жыгімонта, але для доказу знішчэння (ці яго падрыхтоўкі) баярскай эліты недастаткова інфармацыі з крыніцы, што не цалкам заслугоўвае даверу. У часы Жыгімонта склад сведак дакументаў застаецца стабільным. Напр., сведкі апошняга вядомага дакумента Жыгімонта Кейстутавіча (прысяга на вер-

[197] Маю на ўвазе мноства дакументаў канца XV — пачатку XVI ст., у якіх дробныя баяры даказваюць свае правы, звяртаючыся да прывілеяў, атрыманых ад Вітаўта іх продкамі.

[198] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 124—126.

[199] Chodyńcki K. Geneza i rozwój podania o zabójstwie Zygmunta Kiejstutowicza // Ateneum Wileńskie. 1928. R. 5. Z. 15. S. 91—92.

насць каралю Уладзіславу 06.12.1437 г.): віленскі біскуп Мацей, кашталян віленскі Осцік, ваявода віленскі Даўгерд, Кезгайла Валімонтавіч[200]. Усе яны вядомыя ўжо ў часы Вітаўта, і іх высокае становішча не абумоўлена сімпатыямі новага князя. Асабліва Кезгайлу ніяк нельга далучаць да фаварытаў гаспадара. За ўдзел у змове ў канцы 1432 г. былі забітыя яго браты Яўнус і Румбоўд, а ён сам быў пазбаўлены пасады старосты жамойцкага[201]. Але падчас усяго панавання Жыгімонта ён не пакідае эсхатаколу княскіх дакументаў, яму нават даверяюць дыпламатычныя місіі[202]. Да сваёй смерці (1435 г.) у спісах сведак сустракаецца Юрый Гедзігоўд, які з самага пачатку абраў бок Свідрыгайлы[203]. Яго сыну Сеньку Жыгімонт у 1434 г. аддае Мір[204]. Такую талерантнасць гаспадара ў адносінах да няверных падданых мог гарантаваць толькі створаны соцыумам механізм кантролю, што ў нялёгкай штодзённасці даваў чалавеку пачуццё стабільнасці. Гэтыя структуры будуць разглядацца ў іншых раздзелах.

Сярод прадстаўнікоў знаці часоў Жыгімонта Кейстутавіча ёсць толькі адзін чалавек, акалічнасці ўзвышэння якога незразумелыя[205]. **Пётр Лелюш** упершыню згадваецца ў дакументе Троцкай уніі 20.01.1433 г. адразу як ваявода троцкі[206]. Нічога невядома ні пра яго бацькоў, ні пра нашчадкаў. Проста ідэальны тып «новага чалавека». Але самае дзіўнае тое, што Хроніка Быхаўца называе яго адным з трох арганізатараў забойства Жыгімонта[207]. Інфармацыю Хронікі пацвярджае факт пазбаўлення яго пасады троцкага ваяводы за ўдзел у змове. У 13.07.1440 г. троцкім ваяводам быў ужо Ян Гаштаўт[208], у той жа

---

[200] AU. S. 108.

[201] LUB. Bd. 8. S. 373.

[202] Тамсама. Bd. 9. S. 116.

[203] Описание документов и бумаг... Кн. 21. С. 328; Барвінський Б. Кілька документів і заміток до часів вел. князів Свитригайла и Жигимонта Кейстутовича // Записки Наукового Товариства імени Шевченка. 1913. Т. 115. С. 22; KDKW. S. 158.

[204] Karczewski J. Replika ze strony jeneralnego prokuratora... funduszów... x. Stefanii Radziwiłłowny.... Wilno, 1824. S. 139—140; AGAD, dok. perg., № 7269.

[205] Выпадак з Ходкам Юр'евічам мае іншы характар. Гэты чалавек вядомы ўжо ў канцы эпохі Вітаўта і з'яўляецца найбольш раннім, пасля Братошы, прыкладам паспяховай інтэграцыі прадстаўніка рускай знаці ў кола літоўскіх паноў.

[206] AU. S. 94.

[207] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 125.

[208] KDKW. S. 189.

час вядома, што Лелюш яшчэ жыў да 1452 г.[209]. Узвышэнне Лелюша засталося эпізадычным, яго нашчадкі (калі ён іх меў) у шэрагу паноў больш не з'яўляліся.

У часы панавання Казіміра Ягелончыка сярод найбольш уплывовых асоб бачым тых жа людзей або іх нашчадкаў — Ян Гаштаўт і яго сын Марцін, Ян Манівідавіч, Пётр Манцігердавіч, Андрэй Саковіч і яго сын Багдан, Міхаіл і Ян Кезгайлавічы, Радзівіл Осцікавіч, Алехна Судзімонтавіч, Міхаіл, Таўцівіл і Барташ Монтаўтавічы. Нейкі час таму У. Ярмолік паспрабаваў даследаваць развіццё кар'еры дваран літоўскага паходжання эпохі Казіміра. Яго выснова: пры двары Казіміра існавалі магчымасці зрабіць палітычную кар'еру, бо яе ў значнай ступені вызначалі заслугі перад гаспадаром[210]. Ён падрабязна разгледзеў выпадкі з Алехнам Судзімонтавічам, Багданам Андрэевічам, Янам Кучуковічам, Станькам Касцевічам і Янам Іллінічам. Гэтыя асобы былі сучаснікамі Казіміра, што доўгі час жылі пры яго двары[211]. Але ці толькі гэты фактар абумовіў іх узвышэнне? Ярмолік, ідучы следам за тэндэнцыйным паведамленнем Яна Длугаша пра нізкае паходжанне Алехны Судзімонтавіча[212], няправільна інтэрпрэтаваў акалічнасці яго ўзвышэння на пасадах. Як мы бачылі, Алехна Судзімонтавіч быў сынам уплывовага пана эпохі Вітаўта Судзімонта, родзічам Осцікаў/Радзівілаў, а яго жонкай была дачка Яна Манівідавіча Ядвіга. Багдан Андрэевіч з'яўляўся сынам пана Андрэя Саковіча. Ян Кучуковіч быў блізкім родзічам Монтаўтам і Бутрымам. Яго бацька мог быць братам Аляксандра Монтаўта[213]. Акрамя таго, Ян Кучуковіч ажаніўся з дачкой Яна Гаштаўта, з якой яго звязвалі як кроўныя, так і шлюбна-роднасныя сувязі[214].

---

[209] РИБ. Т. 27. С. 8, 106; KDKW. S. 194; Bullarium Poloniae / Ed. I. Sułkowska-Kuraś et S. Kuraś. 6 (1447—1464). Romae — Lublin, 1998. S. 92. Таму сумненні Я. Нікадэма ў дакладнасці гэтага эпізоду аповеду наўрад ці абгрунтаваныя (Nikodem J. Przyczyny zamordowania Zygmunta Kiejstutowicza // Białoruskie zeszyty historyczne. 2002. Nr. 17. S. 13—14).

[210] Jarmolik W. Kariery polityczne dworzan litewskich... S. 93—101.

[211] Таксама. S. 96.

[212] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 228. Гэтая традыцыя перайшла ў творы Мацея Стрыйкоўскага (Stryjkowski M. O początkach, wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego / Oprac. J. Radziszewska. Warszawa, 1978. S. 494).

[213] Гл. прасапаграфію знаці.

[214] Bullarium Poloniae... 6. S. 258 (супліка папу 1458 г. наконт шлюбнай роднасці і IV ступені кроўнай роднасці ў тых, хто бярэ шлюб).

Менш зразумелае паходжанне Станькі Касцевіча і Яна Іллініча. Але на кар'еру Яна Іллініча, верагодна, не менш за службу пры каралеўскім двары паўплываў удалы шлюб. У літаратуры згадваецца яго шлюб з дачкой Андрэя Даўгердавіча. Але гэта быў ужо другі яго шлюб. Паходжанне першай жонкі дапамагаюць вызначыць некалькі архіўных дакументаў. У 1476 г. дачка Бутрыма Кезгайлавіча Ганна называе Юрыя Янавіча Іллініча братам (*frater*)[215]. Зразумела, што паняцце «брат» тут ужыта ў звычайным для Сярэднявечча шырэйшым сэнсе — родзічы аднаго пакалення (стрыечныя браты, нават браты ў наступнай стрыечы). Яшчэ дакладней гаворыць пра роднасную сувязь тэстамент 1485 г. Мілохны, удавы Пятра Сенькі Гедзігоўдавіча. У дакуменце яна называе Юрыя, сына Яна Іллініча, сваім пляменнікам, сынам сястры (*sororinus*)[216]. Мілохна Гедзігоўдава была дачкой Кезгайлы Валімонтавіча[217]. Такім чынам, першай жонкай Яна Іллініча была невядомая з іншых крыніц сястра Мілохны і дачка Кезгайлы Валімонтавіча. Так ці інакш, і Яна Іллініча, і Станьку Касцевіча наўрад ці можна залічыць у шэраг найбольш уплывовых літоўскіх паноў эпохі Казіміра.

Не выклікае сумнення, што знаходжанне ў атачэнні Казіміра магло паспрыяць узвышэнню той ці іншай асобы. Тым не менш, як паказвае гісторыя, многія іншыя яго дваране[218] так і засталіся за рамкамі эліты ўлады. Не двор гаспадара быў істотным фактарам кар'еры. Ужо ў часы панавання Вітаўта з'явіўся звычай дасылаць сыноў знатных бацькоў на двор гаспадара[219]. У эпоху Казіміра сыны знатных паноў нярэдка ехалі на польскі каралеўскі двор[220]. Але гэта быў толькі першы этап іх актыўнага палітычнага жыцця. Траекторыі гэтага жыцця вызначаліся іншымі прычынамі. Іх можна зразумець толькі разгледзеўшы структуру знаці.

---

[215] AGAD, dok. perg., № 7348.

[216] AGAD, dok. perg., № 7371.

[217] Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium... S. 33.

[218] Імёны дваран літоўскага паходжання эпохі Казіміра можна знайсці ў яго скарбовых кнігах (гл.: Rachunki królewskie z lat 1471—1472 i 1476—1478 / Oprac. S. Gawęda, Z. Perzanowski, A. Strzelecka. Wrocław—Kraków, 1960).

[219] Напр., пасланы Вітаўтам у 1429 г. да імператара Святой Рымскай імперыі Жыгімонта «familiaris Senko» (CEV. S. 820), несумненна, ідэнтычны Пятру Сеньку Гедзігоўдавічу — сыну прадстаўніка знаці часоў Вітаўта Юрыя Гедзігоўда.

[220] Напр., сын ваяводы віленскага і канцлера ВКЛ Мікалая Радзівілавіча Ян (AGAD, dok. perg., № 665).

III. СТРУКТУРА ЛІТОЎСКАЙ ЗНАЦІ XV СТ.

Паняцце баярства з'яўляецца лагічным толькі ў кантэксце роду. Баярын — гэта член роду, які вылучаецца пэўнымі якасцямі, пэўным становішчам і, дзякуючы сваёй прыналежнасці да роду, мае прывілеяванае становішча і права на ўладу. Таму праблема роду з'яўляецца асноўнай праблемай пры даследаванні структуры баярства.

1. ПАНЯЦЦЕ РОДУ

Ужо першая канцэптуальная дыскусія па пытаннях літоўскага баярства высветліла актуальнасць пытання роду. Маю на ўвазе палеміку Уладзіслава Сямковіча і Оскара Галецкага наконт пачатку літоўскай шляхты[1]. Стваральнік польскай генеалагічнай школы Сямковіч паслядоўна абараняў тэорыю родавай структуры літоўскага баярства, грунтуючы яе на шматлікіх даследаваннях пра «гарадзельскія» літоўскія роды[2]. Нягледзячы на істотныя назіранні за рознымі аспектамі родавых сувязяў, Сямковічу не ўдалося абвергнуць некаторыя контраргументы Галецкага. Апошні цалкам абгрунтавана крытыкаваў празмерна просталінейную кваліфікацыю грамадства часоў Ягайлы і Вітаўта ў катэгорыях родавага ладу[3]. Сапраўды, цяжка даказаць існаванне такога ладу, калі няма агульнага родавага імя і адзінай родавай арганізацыі. Але крытыка Галецкага адштурхоўвалася толькі ад тэзісаў апанента. Узяўшы ролю крытыка, ён не заўважыў, што рухаецца ў акрэсленым другім удзельнікам дыскусіі коле паняццяў: першасны род — сям'я, нават у форме агаворкі не згадваючы пра магчымасць эвалюцыі родавай структуры.

---

[1] Semkowicz W. W sprawie początków... S. 224—256; Halecki O. O początkach szlachty... S. 177—207; Halecki O. Kwestje sporne... S. 62—72.

[2] Semkowicz W. O litewskich rodach... // Miesięcznik heraldyczny. 1913. R. 6. 1914. R. 7; Rocznik polskiego towarzystwa heraldycznego. 1920. T. 5. 1921—1923. T. 6. 1924—1925. T. 7. 1926—1927. T. 8. 1928—1929. T. 9.

[3] Halecki O. O początkach szlachty... S. 190—194; Semkowicz W. W sprawie początków... S. 242—243.

На новы ўзровень дыскусію ўзнялі Генрык Лаўмяньскі і Вітальд Камянецкі. Апошні падаў хіба што самы радыкальны прыклад крытыкі існавання роду. Грунтуючыся на даследаванні Пшэмыслава Дамбкоўскага пра родавыя ўладанні ў праве ВКЛ[4], ён адмаўляе рэальнасць родавай уласнасці ў якой бы то ні было форме і права яе пераходу ў спадчыну (напр., першачарговае права на набыццё ці выкуп)[5]. Пераходзячы да абсалютна дагматычнага выкладання, ён тлумачыў, што ў пачатку XV ст. літоўскія баяры былі свабоднымі ад усялякіх родавых сувязяў, не абапіраліся на братоў і дзядзькаў, а таксама не падтрымлівалі іх дзяцей. Гэта былі пачынальнікі новых сем'яў[6]. Сэнс гэтых разваг Камянецкага высвятляецца ў межах сфармуляванай ім канцэпцыі пра рэвалюцыйныя інавацыі ў сацыяльнай структуры, якія ажыццяўлялі Ягайла і Вітаўт, абапіраючыся на мадэль польскага грамадства. Гэтая канцэпцыя стала аб'ектам вострай крытыкі Лаўмяньскага, што, апроч іншага, праявілася таксама ў цікавым для нас аспекце[7]. Тэрміналогія дакументаў уніі 1401 і 1413 г. не дазваляла яму сумнявацца ў функцыянаванні родавай арганізацыі сярод баярства. Удала кампенсуючы прагалы ў крыніцах рэтраспектыўным метадам даследавання, ён раскрывае разнастайнасць функцый роду ў XIII—XVI ст. у літоўскай гісторыі. Ход яго думак быў прыблізна наступным: з усіх сацыяльных груп, якія існавалі ў XVI ст. у Літве, дробнае баярства было несумненна самым архаічным тыпам, найменей аддаленым ад пляменнай эпохі. Найбольшая канцэнтрацыя дробнага баярства назіралася ў Ковенскім павеце, дзе нават ў XVIII ст. дымы шляхты складалі 1/4 усіх вясковых дымоў. Лаўмяньскі адзначыў, што ў кнігах перапісаў войска ВКЛ XVI ст. баяры гэтага павета ў адным спісе зарэгістраваныя родамі. Разглядаючы канкрэтныя выпадкі з грамадскага жыцця дробнага баярства гэтага стагоддзя, ён заўважыў, што, нягледзячы на тэрытарыяльную асобнасць і неіснаванне родавага імя, родзічаў яднала пачуццё адзінства і звязаныя з гэтым правы і абавязкі[8].

---

[4] Dąbkowski P. Dobra rodowe i nabyte w prawie litewskim od XIV do XVI wieku (= Studya nad historyą prawa polskiego. T. 6. Z. 3). Lwów, 1916.

[5] Kamieniecki W. Społeczeństwo litewskie... S. 62—71.

[6] Тамсама. S. 64.

[7] Łowmiański H. Z zagadnień spornych społeczeństwa litewskiego... S. 96—127. Таксама гл. раздзел «Род» у працы: Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1.

[8] Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1. S. 338—367.

Падобны вобраз ён рэканструяваў для прускага і літоўскага грамадства XIII ст.[9].

Тэорыю Камянецкага нядаўна актуалізаваў Ежы Сухоцкі, які падкрэсліў значэнне адміністрацыйна-палітычных працэсаў XV ст. для крышталізацыі дагэтуль бясформеннага літоўскага грамадства[10]. У часы Вітаўта сфармавалася група паноў, у якую патрапілі ўзвышаныя Вітаўтам асобы і іх нашчадкі. Атрыбуты stirps, cognatio, genelogia, якія часам дастасоўваліся да гэтых асоб, Сухоцкі лічыць неадэкватнымі тагачаснай рэальнасці Літвы[11]. Для гарадзельскай адаптацыі, на яго думку, Вітаўт ажыццявіў індывідуальны адбор асоб, а не родаў, як паказвае тэкст дакумента[12].

Гэты сціслы і фрагментарны рэферат дыскусіі паказвае праблемнасць паняцця роду. Можна заўважыць, што пазіцыя, выбраная ў гэтым пытанні, вызначае асноўныя кірункі канцэпцыі сацыяльных адносінаў. Таму істотна яшчэ раз уважліва прасачыць, што кажуць пра роды тагачасныя крыніцы. Гэтак, магчыма, удасца пазбегнуць дакору ў тым, што рэканструкцыя гіпатэтычных родаў — не што іншае, як генеалагічная фікцыя.

У Віленскай уніі 1401 г. літоўскія баяры ўдзельнічаюць *cum cognationibus et geneloys suis*[13]. Адаптаваныя ў 1413 г. у Гародлі літоўскія роды: *...primo domus... nobilium Lelywa cum domo et stirpe nobilis Monywid palatini Wilnensis. Item arma Zadora cum stirpe et genelogia Jawni palatini Trocensis...*[14]. Інтэрпрэтатары згаданых фрагментаў тэксту нярэдка сцвярджаюць, што гэта польскія канцылярскія трафарэты, дастасаваныя да літоўскага баярства з цалкам іншай структурай[15]. Не ўздымаючы тут праблемы неадпаведнасці актуальнай мовы пісараў і «рэальнасці», пазначу, тым не менш, што сярэднявечных пісараў нельга абвінаваціць у неабмежаваным сваволлі пры запісванні

[9] Тамсама. S. 363—370 і далей.

[10] Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego... S. 43.

[11] Тамсама. S. 49—51.

[12] Тамсама. S. 51—52.

[13] AU. S. 38.

[14] Тамсама. S. 54.

[15] Halecki O. O początkach szlachty... S. 192—193; Kamieniecki W. Społeczeństwo litewskie... S. 62—63.

дакументаў. Грунтуючыся на наяўных стэрэатыпных формулах, зборах трафарэтаў, яны намагаліся выбраць наколькі магчыма бліжэйшыя да штодзённай мовы паняцці. Канстатацыя ўжывання стэрэатыпных формул, якая ўжо сама зрабілася стэрэатыпам, яшчэ не тлумачыць, чаму выбіралі тое ці іншае «трафарэтнае» паняцце ці характарыстыку. Гісторыя выкарыстання гербаў адмаўляе тэорыю «індывідуальнай адаптацыі» (напр., выпадак Альберта Манівіда і Юрыя Гедзігоўда). Сухоцкі цалкам памыляецца ў ідэнтыфікацыі апошняга, звязваючы яго з бацькам Мінігайлы, які меў такое ж імя, і не згадваючы, што ён быў братам Манівіда[16]. Ён толькі заўважае, што сын Юрыя Гедзігоўда Пётр Сенька Гедзігоўдавіч пазней атрымаў герб Ляліва, які ў Гародлі адышоў да Манівіда. Несумненна, такі падыход карысны для Сухоцкага, каб падтрымаць тэорыю індывідуальнага паходжання гербаў. Але ён ігнаруе тое, што Юрый Гедзігоўд, як адзначыў у сваёй хроніцы Ульрых Рыхенталь, меў згаданы герб ужо ў 1416 г. у Канстанцы[17]. Герб Ляліва прысутнічае і на яго пячатцы, прывешанай да Чартарыйскай дамовы 1431 г.[18]. Братэрства Манівіда і Гедзігоўда пацвярджаюць таксама імёны святых, у гонар якіх была названа капліца, заснаваная Манівідам і даціраваная ўдавой Гедзігоўда Анастасіяй, — Св. Альберт і Св. Юрый[19]. Братамі іх называе дакумент уніі 1401 г., які, праўда, захаваўся ў форме некалькі незразумелай копіі 1432 г.[20]. Усе сумненні адкідвае ліст Свідрыгайлы ад 03.09.1432 г. да магістра Лівоніі, дзе паплечнікамі названы ваявода віленскі Гедзігоўд і *Iwaschkone Monywidowitz nepote suo*[21].

Гэты экскурс ілюструе праблемы прыхільнікаў «індывідуальнай адаптацыі». Без асаблівых цяжкасцей можна згадаць і іншыя выпадкі выкарыстання агульнага герба членамі адной і той жа сям'і або роду ўжо ў першыя дзесяцігоддзі пасля Гарадзельскай уніі. Напрыклад, усе вядомыя Валімонтавічы выкарыстоўвалі пячаткі з гербам Задора, які атрымаў ад палякаў Яўнус Валімонтавіч. Калі б мы ўслед за Сухоцкім

[16] Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego... S. 52—53.

[17] Piekosiński F. Goście polscy na soborze... S. 148.

[18] Бучинський Б. Кілька причинків до часів вел. князя Свитригайла... С. 136—137.

[19] Jablonskis K. Nauji Vytauto laikotarpio... P. 403—404; KDKW. S. 187.

[20] AU. S. 37.

[21] LUB. Bd. 8. S. 366.

сказалі, што Вітаўт выбіраў атрымальнікаў гербаў згодна з іх асабістымі заслугамі, было б цяжка патлумачыць, чаму з трох актыўных сыноў Валімонта ў адаптацыі ўдзельнічаў толькі Яўнус, які ў той час па значэнні не быў роўным сваім братам Румбоўду і Кезгайлу. Відавочна, што гіпотэза пра фармаванне новых панскіх сем'яў у часы Вітаўта фактаграфічна небездакорная. Цяжка ўявіць, як вялікаму князю ў імя нейкай містычнай ідэі дзяржаўнай цэнтралізацыі ўдалося разарваць усе сацыяльныя сувязі, што існавалі раней. Штучная для тагачасных людзей класіфікацыя на сем'і (Гедзігоўдавічы, Манівідавічы) была б незразумелая. У прадыктаваным спецыфічнымі ўмовамі лісце да магістра (два дні пасля пераваротy!) Свідрыгайла чамусьці не забывае сказаць пра роднасныя адносіны Юрыя Гедзігоўда і Яна (Івашкі) Манівідавіча.

Што ж гэта за *stirps, domus*, якіх прадстаўляюць удзельнікі Гарадзельскай уніі? Гэтыя тэрміны нельга перакласці як «сям'я». Нават лацінскае слова *familia* на той час было дастаткова шматзначным (несвабодная чэлядзь; людзі, што жывуць пад адным дахам, і інш.). Адзіным прыдатным перакладам згаданых паняццяў быў бы тэрмін «род». Але што гэта за род? Калі ўздымаецца такое пытанне, высвятляецца, што ўся дыскусія пакінула неагавораную праблему гістарычнасці роду. Для Сямковіча гэта яшчэ не было праблемай, пра роды пачатку XV ст. ён казаў як пра такія, што захавалі першабытныя структуры, як пра закрытыя і палітычна салідарныя групы. Пазней усе апаненты, прыняўшы гэтае азначэнне, ставілі пад сумненне значэнне роду ў тагачасным грамадстве і блыталі дзве праблемы — крытыкі «сямковіцкага» разумення роду і гістарычнага роду.

У гэтым месцы зробім яшчэ адзін экскурс, які дазволіць больш дакладна акрэсліць паняцце роду. Дакумент спадчыннікаў Ваверкі 1463 г. пралівае святло на тое, што ў крыніцах звычайна хаваецца за няяркімі фразамі кшталту *amicorum fretus consilio maturaque deliberacione prehabitis*, якія сведчаць пра згоду родзічаў[22]. Касцёл у Ваверцы даціруюць прадстаўнікі некалькіх сем'яў — Гайлігінаў, Рачковічаў, Нямейкавічаў, Радзевічаў,

[22] KDKW. S. 282—286. Пра гэты род больш падрабязна гл.: Glinka J. Ród Klausucia w wiekach XIII—XVI. Ze studiów nad kształtowaniem się i różnicowaniem społecznym bojarstwa litewskiego // Studia źródłoznawcze. 1959. T. 4. S. 85—107; 1960. T. 5. S. 35—55.

якія названы вотчыннікамі Ваверкі (*heredes de Vawierka*), што можна зразумець як знак іх роднаснасці[23]. Гэта былі нашчадкі ўдзельніка Гарадзельскай уніі Андрэя Гайлігіна, які атрымаў герб Лебедзь. Яго сын Міхаіл Гайлігінавіч адыграў важную ролю ў падзеях пасля забойства Жыгімонта Кейстутавіча[24]. Сын Міхаіла Жыгімонт і ёсць той першай згаданай у данацыі 1463 г. асобай, якая пацвярджае агульнае наданне свайго бацькі і яго братоў Сутка, Дыля і Андрэя. Акт агульнага надання ў дакуменце выказаны праз формулу «агульна надаў» (*communiter dederant*). Далей ідзе данацыя братоў Юндзіла, Мікалая і Вацлава Рачковічаў. Яны — сыны Рачкі Табутовіча, стрыечнага брата Міхаіла Гайлігінавіча[25]. Неабходна звярнуць увагу на парадак імёнаў у тэксце — Вацлаў згадваецца апошнім, хоць ён быў біскупам у Луцку (звычайна біскупы заўсёды стаяць у пачатку спісаў контрагентаў ці сведак). Данацыю завяршае сын Нямейкі Шэмет, Даўгерд і Алехна Радзевічы. Усе пары братоў у дакуменце (адна адной яны могуць быць братамі ў наступнай стрыечы) маюць агульныя ўладанні, але, як паказвае асобны запіс Міхаіла Гайлігінавіча, гэта не было адзінай формай валодання. Найчасцей непадзеленай маёмасцю валодалі толькі сапраўдныя браты. Тым не менш, апошняя частка — запіс корчмаў — сведчыць пра магчымасць існавання агульных правоў іх усіх (нагадаю — у лепшым разе братоў наступнай стрыечы) на пэўны аб'ект маёмасці: *Item etiam omnes et singuli supradicti consencientes dedimus perpetue et ascribimus tabernam circa ecclesiam...*[26]. Але найбольш выразна адносіны гэтых асоб дэманструе інтытуляцыя дакумента (яна адначасова і феномен самасвядомасці), якая вызначае іх як спадчыннікаў Ваверкі і акцэнтуе суадказнасць данацыі. Такім чынам, ускосна пазначаюцца іх правы на вотчынныя землі, а гэта — вынік роднасных сувязяў.

Данатары касцёла ў Ваверцы называюць сябе толькі па імёнах па бацьку. Яшчэ не сустракаецца выпадкаў атрымання ў спадчыну імя, але гэта не замінае існаванню родавай самасвядомасці. Магчыма, што частка контрагентаў звязана

[23] KDKW. S. 283—284.

[24] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 657.

[25] Glinka J. Ród Klausucia w wiekach XIII — XVI... T. 5. S. 35—38.

[26] KDKW. S. 286 («а таксама ўсе згаданыя разам і кожны асобна на вечныя часы надаём і запісваем карчму каля касцёла»).

шлюбнай роднасцю, бо агнатычныя сувязі можна даказаць толькі ў выпадку прамых нашчадкаў Гайлігіна і Рачкі. Ян Глінка дапускае, што існавала іерархічная структура роду, пэўнае старэйшынства[27], але падрабязнасці іерархічных адносінаў у тэксце не раскрывае. У іншых крыніцах згадак пра старэйшыну ці старасту роду таксама няма. Хутчэй можна казаць пра болей ці менеў уплывовых членаў роду, значэнне якіх у палітычным жыцці краю нярэдка абумоўлівала пазіцыі ў самім родзе.

Гэты прыклад вядзе да сутнасці нашай праблемы. Самая малая форма роднасных сувязяў, якую можна лёгка ўхапіць, гэта сям'я. Але пры ўжыванні выключна гэтага паняцця зразумець сацыяльнае і палітычнае жыццё Сярэднявечча нельга. Крыніцы таго часу кажуць пра сацыяпалітычную актыўнасць і значэнне больш шырокай супольнасці людзей. Але калі паняцце сям'і дастаткова зразумелае, пра род гэтага сказаць нельга. Відавочную іерархію сям'і (бацька — глава сям'і) нельга без агаворак застасаваць у адносінах да роду. На гэтай альтэрнатыве скончылася дыскусія Сямковіча і яго крытыкаў. Каб актуалізаваць праблематыку роду, неабходна шукаць новыя падыходы, што дазволілі б пераадолець рамкі згаданай палемікі.

Даследаванні заходніх медыявістаў выявілі раннесярэднявечную «адкрытую структуру роду», што адрозніваецца і ад адносінаў эпохі першабытнага грамадства, і ад пазнейшага агнатычнага роду[28]. Тагачасныя роды не былі юрыдычна акрэсленымі статычнымі адзінкамі, але пастаянна мяняліся. Родзічы маці ў іх адыгрывалі не меншае значэнне, чым родзічы бацькі. Структура такога роду па сутнасці не магла быць стабільнай, бо кожнае пакаленне існавала ўжо ў іншай

[27] Glinka J. Ród Klausucia w wiekach XIII — XVI... T. 5. S. 55.

[28] Schmid K. Zur Problematik von Familie, Sippe und Geschlecht... S. 1—62; Schmid K. Über die Struktur des Adels... S. 1—23; Duby G. Lignage, Adel und Rittertum im 12. Jahrhundert in der Gegend von Macon // Schrift und Materie der Geschichte / Hrsg. v. C. Honegger. Frankfurt am Main, 1977. S. 415—439; Althoff G. Verwandte, Freunde und Getreue. Zum politischen Stellenwert der Gruppenbildungen im früheren Mittelalter. Darmstadt, 1990. Гэтую тэорыю некалькі рэлятывізуюць, не змяняючы яе асноўных высноў: Störmer W. Früher Adel: Studie zur politischen Führungsschicht im fränkisch-deutschen Reich vom 8. bis 11. Jahrhundert. Stuttgart, 1973. S. 40—45, 92 і далей; Spieß K.-H. Familie und Verwandschaft im deutschen Hochadel des Spätmittelalters. 13. bis Anfang des 16. Jahrhunderts. Stuttgart, 1993. S. 494—531.

родавай кансталяцыі. Тое ж трэба сказаць і пра зямельныя ўладанні, склад якіх змяняўся з кожным новым падзелам, шлюбам ці спадчынай. У такіх умовах не магло ўзнікнуць спадчынных родавых імёнаў, адсутнасць якіх больш за ўсё трапляла пад крытыку значэння роду, не магло таксама ўзнікнуць і субстанцыйных доўгачасовых «родавых гнёздаў».

Неабходна ўвесь час памятаць, што такія паняцці, як «Гедзімінавічы», «Альгердавічы», ужываліся сучаснікамі толькі ў адносінах да прамых нашчадкаў, а іх перанос — праца пазнейшых гісторыкаў. Адсутнасць спадчыннага імя дае важныя падставы для разумення родавай структуры і родавай самасвядомасці. У гэтай самасвядомасці слаба функцыянаваў такі, відавочна, важны для роду аспект, як генеалагічны. Каб абгрунтаваць гэтае сцвярджэнне, прывяду самую раннюю гістарычную традыцыю літоўскіх гаспадароў. Створаны ў атачэнні Вітаўта *Летапіс вялікіх князёў*, які пачынае «гісторыю Вітаўта» ўжо ад яго дзеда Гедзіміна, пра ранейшыя часы не згадвае. Гэты факт нельга патлумачыць, напрыклад, тым, што паходжанне Гедзіміна падавалася яго нашчадкам непрыдатным, бо гісторыкі дастаткова цвёрда вызначылі, што па меншай меры бацька Гедзіміна быў літоўскім гаспадаром[29]. Магчыма, для тагачаснага чалавека не было патрэбна памятаць родзічаў, далейшых за дзеда, бо такая памяць не магла змяніць яго цяперашняга становішча. Толькі кансталяцыя роду ў адно пакаленне была функцыянальнай, у іншым пакаленні яго склад непазбежна змяняўся. Гэты працэс удала характарызуе аўтарытэтны Карл Шмід: *Geschlechter dauern fort, bilden sich neu oder sterben aus, Sippen wandeln sich*[30].

Пры недахопе непасрэдных крыніц для даследавання структуры роду і яго самасвядомасці неабходна шукаць іншыя апорныя кропкі. Важныя звесткі дае інтэрпрэтацыя сістэмы літоўскіх баярскіх імёнаў. Да канца XIV ст. у Літве панавала адначленнае імя. На пераломе XIV—XV ст. павялічваецца колькасць выпадкаў выкарыстання двух імёнаў (сярод баяраў робіцца папулярнай мадэль імя + імя па бацьку). У канцы XV — пачатку XVI ст. нека-

[29] Nikžentaitis A. Gediminas. Vilnius, 1989. P. 5—9.

[30] Schmid K. Zur Problematik von Familie, Sippe und Geschlecht... S. 4. Нямецкая мова дазваляе семантычна адрозніваць кагнатычны («Sippe») і агнатычны («Geschlecht») род.

торыя прадстаўнікі знаці ўжо маюць спадчынныя родавыя імёны (прозвішчы)[31]. Гэтыя змены ў сістэме імёнаў адлюстроўваюць працэсы змен у сацыяльнай структуры. Узнікненне перадачы імя ў спадчыну з пакалення ў пакаленне храналагічна супадае з некаторымі аспектамі развіцця роду (напр., менавіта ў гэты час узнікае г. зв. «палажэнне пра траціну», якое пачало абмяжоўваць кампетэнцыю родзічаў пры распараджэнні зямельнымі ўладаннямі). Усё гэта дазваляе даследаваць імёны літоўскіх баяраў з пункту гледжання сацыяльнай гісторыі ў кантэксце комплексных сістэмных змен[32]. Тут я разгледжу сістэму імёнаў некалькіх родаў, але тая ж сістэма характэрна і для іншых родаў. Метадалагічна важна адрозніваць тое, як чалавек называе самога сябе (у інтытуляцыях яго ўласных дакументаў) і як яго называюць у іншых крыніцах. Валімонт у крыніцах згадваецца, як *Buschken son*[33]. Яго сыны — Яўнус, Румбоўд, Кезгайла, Судзівой і іншыя — ужывалі імя па бацьку «Валімонтавіч». Тым часам, імёны асобнаступнага пакалення былі: Міхаіл Румбоўдавіч[34], Ян і Міхаіл Кезгайлавічы[35], Станька Судзівоевіч[36]. Яшчэ больш цікава, што сыноў Яна Кезгайлавіча сучаснікі называлі Станіславам і Мікалаем Янавічамі[37], хоць, здавалася б, увядзенне «Кезгайлы» ў сваё імя зрабіла б тое імя больш паважным, чым вельмі пашыранае «Янавіч». Але мыслілі, зразумела, не ў такіх катэгорыях[38]. Іншы прыклад — Манцігерд і яго нашчадкі. Сынам Манцігерда быў Пётр Манцігердавіч, тым часам, імя яго ўнука было Ян Пятровіч. А сын апошняга ў дакументах называецца Пятром

---

[31] Maciejauskienė V. Lietuvių pavardžių susidarymas XIII — XVIII a. Vilnius, 1991. P. 20—33, 50—60.

[32] Добрыя прыклады такога аналізу падае заходнееўрапейская медыявістыка: Störmer W. Adel und Ministerialität im Spiegel der bayerischen Namengebung // Deutsche Archiv für Erforschung des Mittelalters. 1977. Bd. 33. S. 84—152; Bourin M. Ein europäisches Projekt zur Erforschung der mittelalterlichen Ursprünge moderner Namengebung // Memoria in der Gesellschaft des Mittelalters / Hrsg. v. D. Geuenich und O. G. Oexle. Göttingen, 1994. S. 361—371. Агульную сацыяльную гісторыю імёнаў гл.: Mitterauer M. Ahnen und Heilige: Namengebung in der europäischen Geschichte. München, 1993.

[33] CEV. S. 54.

[34] РИБ. Т. 27. С. 122.

[35] KDKW. S. 348, 748—749 і інш.; MAB RS. F 37—798—800.

[36] KDKW. S. 311.

[37] KDKW. S. 443, 516; AU. S. 127 і інш.; MAB RS. F 37—797, 5964.

[38] Разам з тым, гэты прыклад паказвае, што ўвядзенне імя па бацьку нельга адназначна звязваць толькі з імкненнем адасобіць пэўнага чалавека з тым жа імем ад другога, бо такое імя па бацьку наўрад ці моцна дапамагала адасобіць чалавека.

Янавічам[39]. Такім чынам, звесткі з тагачасных крыніц паказваюць, што абагульненне розных пакаленняў імёнамі «Кезгайла / Кезгайлавіч», «Манцігерд / Манцігердавіч» — гэта з'ява позняя. Тое ж можна сказаць пра нашчадкаў Сака, Осціка, Братошы і іншых прадстаўнікоў знаці пачатку XV ст. Выключэнне складае выпадак Гаштаўтаў, якія вельмі рана набылі спадчыннае імя. На працягу ўсяго XV ст. Гаштаўты выкарыстоўвалі толькі гэтае спадчыннае імя. Крыніцы не дазваляюць раскрыць генезіс гэтай традыцыі. Верагодна, на гэта магла паўплываць магчымая роднасць з польскімі шляхціцамі[40].



Традыцыя імёнаў такога кшталту дазваляе акрэсліць контуры самасвядомасці роду XIV—XV ст. Гэта, перш за ўсё, «гарызантальная», а не «вертыкальная» самасвядомасць, калі ведаюць сваяцкіх (шлюбных) родзічаў, родзічаў з пабочных ліній аднаго пакалення, але забываюцца пра прабацькаў. Не засведчана ніякая культурная форма, што магла б захаваць веды пра далёкае мінулае асобы. Асабліва істотны фактар — адсутнасць пісьмовай культуры, бо магчымасці вуснай культуры, на існаванні якой нярэдка грунтуецца «гістарычнасць» той ці іншай пазней зафіксаванай падзеі, вельмі абмежаваныя[41]. Літоўскія летапісы пачатку XVI ст. не запісваюць, а ствараюць

[39] Напр.: AU. S. 53—54; KDKW. S. 379, 444.

[40] Напр., аповед літоўскіх летапісаў пра шлюб Гаштаўта і дачкі Бучацкага (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 77). Таксама гл.: Trajdos T. M. Kościół Katolicki na ziemiach ruskich Korony i Litwy za panowania Władysława II Jagiełły (1386—1434). T. 1. Wrocław, 1983. S. 125—128.

[41] У гэтым сэнсе ў Літве сітуацыя была некалькі іншай, чым у раннесярэднявечнай Заходняй Еўропе, дзе пачаткі генеалагічнай (агнатычнай) самасвядомасці знаходзяць тады, калі яшчэ панаваў род з «адкрытай структурай» (гл.: Störmer W. Früher Adel... S. 44—45). Пра гістарычную свядомасць у Літве гл.: Petrauskas R. Istoriškumas // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštijos kultūra: tyrinėjimai ir vaizdai. Vilnius, 2001. P. 207—217.

гістарычную традыцыю літоўскіх панскіх родаў. Аснову працы аўтараў гэтых гістарыяграфічных твораў складае спалучэнне кампіляцыі і фікцыі, што выяўляецца ў замене паведамленняў з ранейшых твораў новымі аповедамі, якія не пярэчылі тагачаснаму разуменню праўды.

«Гарызантальнасць» роду не трэба разумець празмерна просталінейна. Гэта, перш за ўсё, не біялагічная, а сацыяльная катэгорыя, сутнасць якой абумоўлівае спецыфічная самасвядомасць. Для гэтай самасвядомасці характэрны пэўны адбор пры захаванні і развіцці адносінаў, які надае вялікае значэнне роднасці з боку маці. Імкненне выдаць замуж усіх дачок часта абумоўлівала тое, што высокае становішча чалавека ў значнай меры пераходзіла ў спадчыну ад роду маці. На жаль, крыніцы не згадваюць імёны маці прадстаўнікоў знаці часоў Вітаўта і толькі ў рэдкіх выпадках называюць іх жонак і дачок. Але і тыя некалькі вядомых фактаў сведчаць пра важнасць сувязяў, якія завязваліся пры дапамозе жанчын. Узвышэнне Судзімонта і Яна Альгімонтавіча неабходна тлумачыць не столькі княскім паходжаннем, колькі сваяцкімі адносінамі (у гэтым выпадку няважна, у якой форме) з Вітаўтам[42]. Няма ніякіх сумненняў, што на кар'еру Манівіда ўплывала паходжанне яго жонак[43]. Падобна, што з князёўнай ажаніўся яго брат Юрый Гедзігоўд[44]. Другой жонкай Пятра Манцігердавіча была дачка князя Фёдара Карыбутавіча Ганна[45]. Праз сваю жонку з князямі парадніўся і Андрэй Неміровіч[46].

Такія роды не былі надта шырокімі і шматлікімі, але, як паказвае прыклад спадчыннікаў Ваверкі, іх склад не заканчваўся на братах і стрыечных братах. Але незразумелай застаецца палітычная каардынацыя ўнутры роду. Дынастыя Гедзімінавічаў, што запанавала, наўрад ці магла талераваць закрытыя і палітычна чынныя супольнасці. Знутры іх павінен быў разбураць расклад у сістэме пасад, бо іх нельга

[42] Jonynas I. Vytauto šeimyna... P. 53—55, 57—66; Rowell S. C. Gediminaičių dinastinė politika... P. 131—134.

[43] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 3. P. 491; ПСРЛ. Т. 35. С. 117.

[44] РИБ. Т. 27. С. 30.

[45] Гл.: Semkowicz W. Łosk i wygaśnięcie Kaributowiczów... S. 197—209.

[46] Слуцкий Помянник — MAB RS. F 21—799. P. 12. Праўда, тут мог згадвацца і Андрэй Якубавіч Неміровіч, які жыў у першай палове XVI ст.

было займаць агульна, таксама не маглі існаваць правы ўсіх родзічаў на іх. Такім чынам, была запраграмавана трансфармацыя «адкрытай структуры роду» ў строга структураваны абмежаваны спадчынай мужчынскай лініі агнатычна баярскі род. Першыя адзнакі гэтай змены, як таго і трэба было чакаць, можна ўбачыць у вялікняскім родзе. Яшчэ Гедзімін падзяліў краіну паміж сваімі сям'ю сынамі. Тым часам, пад канец панавання Альгерда і Кейстута сітуацыя з атрыманнем спадчыны радыкальна змянілася. Усё больш замацоўваўся прынцып вылучэння аднаго сына (хоць яшчэ неабавязкова першанароджанага). Пабочныя лініі ўвогуле пазбыліся падыходу да ўлады. Неабходна згадаць пра паводзіны Ягайлы са сваімі братамі. Ён падтрымліваў блізкія сувязі і дзяліўся нейкай істотнай часткай улады толькі з нежанатым Скіргайлам і Свідрыгайлам. Варта памятаць, што і Вітаўт не меў нашчадкаў мужчынскага полу.

Прыклад князёў мог быць навукай для баяраў. Прагалы ў крыніцах XV ст. значна абмяжоўваюць нашыя магчымасці прасачыць лёс большасці нашчадкаў знаці[47], але ў некаторых выпадках маўчанне крыніц дазваляе рабіць пэўныя высновы. Ізноў жа скарыстаюся гісторыяй роду Гаштаўтаў, у якой можна ўбачыць карэляцыю паміж існаваннем пастаяннага спадчыннага родавага імя і новай палітыкай роду. Нягледзячы на тое, што ў кожным пакаленні вядома па некалькі прадстаўнікоў Гаштаўтаў (сыны Андрэя Гаштаўта — Ян, Талівойша, Пётр; Яна Гаштаўта — Марцін, Альберт, Юрый[48]), нашчадкаў заўсёды меў толькі адзін з іх, а гэта, несумненна, служыла канцэнтрацыі ўладанняў роду. Нельга адназначна сказаць, ці гэта свядомая матрыманіяльная палітыка, ці звычайны факт вымірання, але некаторыя дэталі біяграфіі дзяцей Яна Гаштаўта пацвярджаюць дапушчэнне пра свядомую стратэгію. Яго сын Юрый стаў святаром. Пра гэта сведчыць адзін ліст венецыянцаў[49] і паведамленне Амброзіё Кантарыні пра біскупа, які быў братам кіеўскага пана

[47] Не выклікае сумнення, што крыніцы (па меншай меры XV ст.) згадваюць толькі невялікую частку дзяцей (асабліва дачок). Пра гэта неабходна ўвесь час памятаць пры размове пра структуру баярскага роду.

[48] Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 6. S. 119—123.

[49] Fontes rerum Polonicarum e tabulario Reipublicae Venetae / Ed. A. Cieszkowski. Ser. 1a. Fasc. 3. Posnaniae, 1891. P. 173.

Марціна (несумненна, Гаштаўта)[50]. Так пачалі выкарыстоўваць дадзеныя Касцёлам магчымасці заняць не прызначаных для шлюбу сыноў. Характэрны таксама лёс дачок Яна Гаштаўта. Адна з іх (Марыя) выйшла за князя Сямёна Алелькавіча, другая (Марына) — за Яна Кучуковіча[51]. Трэцяя (Аляксандра) пайшла ў францішканскі кляштар[52]. Можна меркаваць, што ў выпадку адсутнасці адпаведнай партыі дачок не выдавалі замуж, абы выдаць, і былі схільныя пакідаць іх незамужнімі. Так пазбягалі большага падзелу ўладанняў. Менавіта такая шлюбная палітыка дазваляла доўгі час засяроджваць у руках адной асобы ўсе родавыя ўладанні (найбольш выразны прыклад — Альберт Гаштаўт), але гэта ў сваю чаргу павялічвала небяспеку вымірання роду. Як вядома, з Гаштаўтамі так і здарылася ў 1542 г.

Яшчэ адзін прыклад — Радзівілы. Тут таксама можна назіраць сувязь узнікнення спадчыннага імя з новай самасвядомасцю роду. У канцы XV — пачатку XVI ст. у гэтым родзе паступова запанавала ўжыванне спадчыннага імя. Сын Мікалая Радзівілавіча Мікалай у крыніцах часцей за ўсё фігуруе як *Миколай Миколаевичъ Радивиловича*[53], *Nicolaus Nicolai Raduilovicz*[54]. На пераходны этап фармавання імя паказвае родны склон у рускім запісе. Прывядзём яшчэ некалькі фактаў з тагачаснай генеалогіі Радзівілаў. Вядомыя чатыры сыны Мікалая Радзівілавіча. Тры з іх ажаніліся і мелі нашчадкаў. Тым часам Альберт быў выбраны для духоўнай кар'еры. Ён стаў луцкім, пазней віленскім біскупам. Дачка Ганна выйшла за мазавецкага князя Конрада і прынесла яму 20 тысяч дукатаў пасагу[55]. Гэта быў прэстыжны шлюб. Іншая дачка Барбара стала манашкай і заснавальніцай першага ў Літве жаночага

---

[50] Contarini A. Viaggio in Persia // Барбаро и Контарини о России. Ленинград, 1971. Гл. 3.

[51] Bullarium Poloniae... 6. S. 258. Дарэчы, гэтая пара звярнулася да папы па дазвол жаніцца, нягледзячы на IV ступень роднасці. У гэтым выпадку можна таксама бачыць тэндэнцыю родавай палітыкі. Шлюб з родзічам дазваляў пакідаць уладанні ў межах, па меншай меры, шырэйшага роду.

[52] Matricularum regni Poloniae summaria / Ed. T. Wierzbowski. Pars 2. Varsoviae, 1907. S. 108; Memoriale Ordinis Fratrum minorum a fr. Ioanne de Komorowo compilatum // MPH. T. 5. Lwów, 1888. S. 225.

[53] АЛМ. Т. 1. Вып. 2. С. 350, 394.

[54] AU. S. 127.

[55] Halecki O. Anna z Radziwiłłów // PSB. T. 1. S. 125.

кляштара (бернардзінскага)[56]. Дарэчы, манашкай пасля смерці свайго мужа Пецькі Ягайлавіча стала яе цётка, сястра Мікалая Радзівілавіча Ганна[57]. Паказчык новай родавай самасвядомасці — узмацненне прынцыпу першанародзінаў. У родзе Радзівілаў замацавалася традыцыя даваць першаму сыну імя Мікалай. Гэтая традыцыя працягвалася праз усё XVI ст. і нават пазней. Нададзены нямецкімі імператарамі тытул князя яшчэ больш павялічыў значэнне агнатычнага прынцыпу роднасці. Ілюстрацыяй такой самасвядомасці маглі б быць надмагіллі дзяцей Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі ў Нясвіжы. Надмагілле хлопчыка (Мікалая) стаіць у капліцы Св. Крыжа нясвіжскага касцёла Божага Цела, у гэтай капліцы быў своеасаблівы родавы маўзалей. Ужо само імя кажа пра выключнасць хлопчыка. Ён быў першанароджаным сынам, які павінен быў зрабіцца працягвальнікам княскай лініі і атрымаць у спадчыну Нясвіж. Выбар месца яго пахавання і тэкст надмагілля паказваюць асаблівыя адносіны бацькі да яго[58].

XV ст. — гэта пачатак працэсу трансфармацыі структуры роду. Адкрыты агнатычны род яшчэ доўга захоўваў сваё значэнне[59]. Ён не з'яўляўся, кажучы сённяшнімі катэгорыямі, суб'ектам права, але меў пэўную юрыдычную моц. Гэта лепей за ўсё бачна на прыкладзе землеўласніцкіх адносінаў.

2. БАЯРСКАЯ ВОТЧЫНА

Найбольш канцэптуальную і ўплывовую мадэль развіцця вотчыны прапанаваў Лаўмяньскі. Ён сфармуляваў дзве фундаментальныя праблемы: 1) уласнасць — групавая ці

[56] Kurczewski J. Biskupstwo wileńskie. Wilno, 1912. S. 264. Тое, што гэтая дачка Мікалая Радзівілавіча не згадваецца ў генеалогіі Радзівілаў, не выклікае здзіўлення, бо ў іх запісваліся далёка не ўсе дачкі (асабліва незамужнія). Сведчаннем тагачасных сувязяў Радзівілаў з бернардзінцамі служыць пахаванне Мікалая Радзівілавіча ў віленскім бернардзінскім касцёле (Malczewska M. Latyfundium Radziwiłłów...).

[57] AGAD, dok. perg., № 7385: дакумент ад 26.11.1492 г. вялікага князя Аляксандра Мікалаю Радзівілавічу, у якім Аляксандр пацвярджае апошняму ўладанне яго сястры Ганны. Ганна тут названа як «religiosa»; у кантэксце дакумента гэта слова, несумненна, абазначае манашку.

[58] Bernatowicz T. Nagrobki dziecięce Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki // Lituano-Slavica Posnaniensia: Studia historica. 1991 (Wyd. 1992). Vol. 5. S. 69—80.

[59] Значэнне агнатычных сувязяў роднасці не знікае на працягу ўсяго перыяду ВКЛ, але структура роду ўсё больш фармавалася ў катэгорыях агнатычнага разумення.

індывідуальная; 2) перадача ў спадчыну. Мноства каштоўных заўваг усё ж не ліквідуе пэўнай непаслядоўнасці ў сканструяванай ім мадэлі. З аднаго боку, Лаўмяньскі канстатуе, што індывідуальная ўласнасць, як паказваюць ордэнскія прывілеі прусам, была найболей пашыранай, нават тыповай формай уласнасці[60], але, разам з тым, кажа пра землеўласніцкія правы роду нават у XVI ст. Ён карыстаецца нягнуткай схемай супрацьпастаўлення індывідуальнай сям'і і роду, якая не з'яўляецца прыдатнай для ўсіх стагоддзяў. Таксама неабходна адасобіць індывідуальную ўласнасць ад права на ўладу. Першы інстытут неўласцівы для «варварскага» грамадства ўжо толькі таму, што не існавала патэнцыяльнага суб'екта для ўласнасці такога кшталту — свабоднай ад абавязковых сацыяльных сувязяў асобы. Зразумела, кожнае грамадства мае сваіх крытыкаў, што спрабуюць зламаць усталяваны сацыяльны лад. У канфліктны перыяд (у гэты раз ва ўмовах інтэрвенцыі Нямецкага ордэна), калі станавіліся магчымымі розныя альтэрнатывы, колькасць прыкладаў «нонканфармізму» магла істотна павялічвацца, але «эпізод з Нялюбам» у Пятра з Дусбурга, які апісвае выгнанне асобы, што не паслухалася волі роду, выяўляе тыповы лёс такога чалавека[61].

Вяртаючыся да землеўладання, згадаю ўжо замацаванае ў гістарыяграфіі палажэнне, што ў XIII ст. у Літве панавала індывідуальная апрацоўка зямлі і індывідуальнае атрыманне яе ў спадчыну. Але ў спадчыну пераходзіў не сам надзел (алод), а права карыстацца ім. Арон Гурэвіч вылучае ранні алод, які з'яўляецца ўласнасцю не асобнага чалавека, а роду. Індывідуальнае атрыманне спадчыны яшчэ не абазначае права на адчужэнне алоду (продаж, дарэнне). З цягам часу такое права ўзнікае, але для гэтага неабходна згода родзічаў[62]. Гурэвіч апісвае ранні алод на падставе вынікаў даследавання скандынаўскага одалю. Ён мяркуе, што праз тыя ж перыяды развіцця прайшоў і франкскі алод, і таму прапануе лічыць одаль сінонімам ранняга алоду. Тыпалагічнае ўжыванне паняцця одаль было б абгрунтавана пры разглядзе сацыяльных адносінаў тых краін, для якіх

[60] Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1. S. 393—395.

[61] SRP. Bd. 1. S. 105.

[62] Гуревич А. Я. Проблемы генезиса феодализма в Западной Европе. Москва, 1970. С. 35—36.

уласцівыя: 1) слабы ўплыў рымскага права; 2) слабое развіццё дзяржаўна-адміністрацыйных структур.

У канцы XV ст. у Літве ўзнікае інстытут гэтак званай «траціны», у рамках якога баярын мог свабодна распараджацца 1/3 часткай сваіх зямель. Юозас Юргініс адным з першых ацаніў гэту норму як пашырэнне правоў баярства і інтэрпрэтаваў яе ў кантэксце адносінаў вялікі князь — баярын[63]. Юліуш Бардах і Эдвардас Гудавічус, на даследаванні якіх я тут у значнай ступені абапіраюся, абгрунтавана змяшчаюць згаданую прававую норму ў сферу адносінаў індывід — родзічы: ад гэтага часу 1/3 часткай уладанняў дазвалялася распараджацца без згоды родзічаў[64]. Можна далей развіць гэтую тэорыю, звязваючы паняцце траціны са з'явай адаптацыі (усынаўлення) у літоўскім праве[65]. Усынаўленне — гэта стары інстытут родавага права, які з прычыны сваёй вуснай традыцыі доўгі час не фіксаваўся ў крыніцах. Упершыню ён згадваецца ў адным пацверджаным вялікім князем дакуменце 1460 г., але пацвярджалася не само ўсынаўленне (гэтага не патрабавалася), а акт перадачы зямель[66]. У ранейшыя часы ўсынаўленне разглядалася як уваход у род і сям'ю таго, хто ўсынаўляў, што ў сваю чаргу азначала выхад з першага роду і сям'і. Гэты акт павінен быў суправаджацца рытуальнымі дзеяннямі, а паміж тым, хто ўсынаўляў, і тым, хто ўсынаўляўся, складваліся бацькоўска-сыноўнія адносіны з усімі іх наступствамі. Такі сын рабіўся законным спадчыннікам. Спадчына для нас асацыіруецца найперш з зямельным надзелам. Зразумела, той, каго ўсынаўлялі, атрымліваў яго ў спадчыну, але асноўная функцыя адаптацыі, верагодна, ляжала не ў сферы маёмасных адносінаў. У спадчыну перадавалася перш за ўсё становішча ў грамадстве. Той жа, хто ўсынаўляў, забяспечваў сабе працяг роду і захаванне культу продкаў (пры адсутнасці царкоўных устаноў гэты клопат павінен быў быць актуальным). Нават у дакументах XV—XVI ст. клопат пра душу памерлага вы-

[63] Jurginis J. Baudžiavos įsigalėjimas Lietuvoje... P. 164—165.

[64] Bardach J. Trzecizna — część swobodna... S. 137—138; Gudavičius E. Baltų alodo paveldėjimas... P. 61. Таксама гл.: Gudavičius E. Baltų alodo raida... P. 95—103; Gudavičius E. Aukščiausia žemės... P. 3—12.

[65] Значэнне ўсынаўлення ў праве ВКЛ узорна даследаваў Бардах: Bardach J. Adopcja w prawie litewskim XV i XVI w. // Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV—XVII w. Warszawa—Białystok, 1970. S. 191—259.

[66] Тамсама. S. 193—194.

ступае як адна з асноўных прычын адаптацыі, таму намагаліся ўсынаўляць асобу той жа веры. Клопат выяўляўся ў замаўленні набажэнстваў як за таго, хто ўсынавіў, так і за яго бацькоў[67].

Істотнае значэнне мае заўвага Бардаха пра паходжанне «траціны». Гэтае паняцце трапіла ў Літву праз Польшчу, дзе яно ўзнікла ў другой палове XIV ст., у першую чаргу, пад уплывам Касцёла[68]. Касцёл у Літве таксама здолеў адыграць ролю пасрэдніка, але хуткае перайманне згаданай нормы паказвае, што гэтаму спрыялі мясцовыя ўмовы. Тут уплывалі інтарэсы не толькі ўласніка, але і самога роду, для якога такое «скарачэнне» правоў у новых абставінах было нават пажаданым. Такую сітуацыю абумовілі новыя сацыяльна-эканамічныя працэсы, што праявіліся ў XV ст. і трансфармавалі структуру роду. Многія функцыі роду пачалі выконваць дзяржаўныя інстытуцыі. Асабліва істотным было пранікненне маёмасных адносін, сістэмы куплі-продажу ў літоўскае грамадства. З сямейнага права ўсынаўленне эвалюцыянуе ў маёмаснае[69]. Як падаецца, кульмінацыя гэтага працэсу наступіла ў другой палове XV ст., пацверджаннем чаго служыць заўважаны Бардахам факт, што той, каго ўсынаўлялі, ужо не выходзіў са свайго ранейшага роду[70]. Адносіны бацька — сын замяняліся адносінамі апякун — апекаваны (напр., пашыраныя ўсынаўленні сярод знаці). Намінальнае ўсынаўленне дазваляла пазбягаць забароны адчужаць землі роду. Вось чаму норма пра траціну пачала быць цікавай таксама родзічам — адаптацыйны запіс быў прыраўнаны да звычайнага запісу і стаў падлягаць абмежаванню ў 1/3. Цікава, што такая адаптацыя захоўвалася і далей, хоць фармальна 1/3 частку мог атрымаць любы.

Гэтыя назіранні вядуць да высновы, што па меншай меры да другой паловы XV ст. зямельнае ўладанне не магло адасабляцца ад роду. Такім чынам, асноўная тыпалагічная прыкмета адалю — гэта не першаснае права родзічаў на набыццё ці выкуп[71], а выключэнне магчымасці адчужэння зямельнага ўладання без

[67] Тамсама. S. 231—232.

[68] Тамсама. S. 213—214.

[69] Тамсама. S. 192.

[70] Тамсама. S. 205.

[71] Гуревич А. Я. Большая семья в Северо-Западной Норвегии в ранее средневековье (по судебнику Фростатинга) // Средние века. 1956. Вып. 8. С. 91; Gudavičius E. Baltų alodo paveldėjimas... P. 59.

згоды родзічаў. Праўда, існаваў яшчэ і такі інстытут звычаёвага права, як узаемнае дарэнне, але, як дазваляюць меркаваць пададзеныя Бардахам звесткі, спачатку зямля такім шляхам магла быць падараванай толькі Касцёлу[72]. Істотнае значэнне мае заўвага Гудавічуса пра тое, што нават у данацыях Касцёлу ў XV ст. пануюць наданні не зямлі, а данін[73]. Да тых жа высноў прыводзіць і гісторыя інстытута закладу[74]. Тым часам, кантроль родзічаў за распараджэннем вотчыннымі землямі вядомы і ў галіне раманізаванага алоду. Яшчэ Генрых Брунэр звярнуў увагу на тое, што дарэнне зямель у франкскай дзяржаве ў VIII—IX ст. (можна дадаць — і ў пазнейшы час) яшчэ не сведчыць пра неабмежаванасць карыстання імі. Напрыклад, падараваныя кляштару землі забаранялася перадаваць іншым, разам з тым, захоўвалася права іх выкупу[75].

Вотчынныя землі ў Літве доўгі час таксама не маглі зрабіцца таварам. З імі звязвалася цэлая сістэма ўяўленняў, забарон, абавязкаў, якая кансервавалася адносінамі землеўпарадкавання. Гэтая сістэма складалася з правоў г. зв. *laudatio parentum* (згоды родзічаў), а таксама выкупу, першачарговага набыцця. Паводле Бардаха, фармулёўка згоды родзічаў на запіс зямлі ў дакументах ВКЛ з'яўляецца ў 8 дзесяцігоддзі XV ст.[76]. Але можна знайсці і ранейшыя прыклады. У 1437 г. Даўгайла Гердавіч робіць наданне віленскім францішканцам *consangwineorum maturo prehabito consilio*[77], у 1449 г. Дорг Гетаўтавіч прадае сваю вёску *meorum amicorum et consangwineorum maturo consilio prehabito*[78], у 1459 г. Алехна Давойнавіч запісвае сваёй жонцы вотчынную вёску *ex mea mera et spontanea voluntate, nostrorum amicorum salubri consilio prehabito... nihil iuris, proprietatis et dominio pro nobis et nostris consanguineis... penitus reservando*[79], у 1455/1465 г. Міхаіл і Ян Нацевічы адзначаюць, што запісваюць *de speciali*

[72] Bardach J. Darowizna wzajemna na Litwie... S. 176.

[73] Gudavičius E. Baltų alodo paveldėjimas... P. 61.

[74] Adamus J. Zastaw w prawie litewskim XV i XVI w. Lwów, 1925.

[75] Гуревич А. Я. Проблемы генезиса феодализма... С. 37—38.

[76] Bardach J. Trzecizna — część swobodna... S. 126.

[77] KDKW. S. 168.

[78] Тамсама. S. 221.

[79] Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 51—52.

consilio et consensu amicorum nostrorum[80] і інш.

Таксама параўнальна рана засведчана права на выкуп. У 1470 г. яго прадугледжвае дакумент Міхаіла Яковіча пра продаж зямлі[81], а ў 1473 г. князь Аляксандр Гальшанскі ў сваім наданні Віленскай кафедры падрабязна абгаворвае яго ўмовы: *iesly braczya my y blyszny moy chczyelyby tho ymyanye othkupycz, tedy mayut othlozycz xyądzu Janu nynyeyszemu byskupu* 200 коп шырокіх грошаў[82]. У наданні францішканцам другой паловы XV ст. сцвярджаецца: *...si quis ex proximioribus suis istuc habere velit, debet trecentas sexagenas reponere ecclesie predicte*[83]. Запіс Альберта Юшковіча 1489 г. жонцы таксама пакідае братам і родзічам (*fratres et consanguinei*) права выкупіць частку зямель[84]. Такім чынам, сцвярджэнне Камянецкага, што ў XV ст. у Літве родавыя рамкі не абмяжоўвалі баярскага землеўладання[85], пярэчыць звесткам з крыніц. Акрамя таго, неабходна звяртаць увагу на тое, што прававыя дзеянні, якія закраналі справы роду, не заўсёды ўключаліся ў змест дакумента, які, па меншай меры спачатку, часцей за ўсё пісаўся для патрэб канцылярыі гаспадара. Важныя для штодзённага жыцця пастановы, дамовы і інш. заставаліся ў памяці людзей, яны не фіксаваліся пісьмова. Да другой паловы XV ст. пісьмовы дакумент яшчэ амаль не функцыянуе ва ўнутраным жыцці (за выключэннем касцёльных дакументаў), таму дату першага запісу прававой нормы нельга атаясамліваць з датай яе ўзнікнення. Запіс княгіні Агаф'і 1461 г. выразна акрэслівае сітуацыю, калі правы роду перастаюць дзейнічаць: *волна по моем животе кому отдати, продати, по душе дати, бо то не ест отчина мужа моего ани детей моих, бо то ми дал господарь мой княз великий Витовтъ*[86]. Згадаем таксама прааналізаваны вышэй дакумент спадчыннікаў Ваверкі, у якім можна ўбачыць нават правы родзічаў пабочных ліній на

[80] MAB RS. F 256—2747.

[81] KDKW. S. 306—307.

[82] Тамсама. S. 329—330.

[83] MAB RS. F 43—21114 («калі хто-небудзь з яго блізкіх захоча гэта мець, павінен даць згаданаму касцёлу трыста коп грошаў»).

[84] KDKW. S. 424—425.

[85] Kamieniecki W. Społeczeństwo litewskie...; Kamieniecki W. Rozwój własności na Litwie w dobie przed I Statutem // Rozprawy Akademii Umiejętności. Wydział historyczno-filozoficzny. 1914. T. 57.

[86] Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 53.

вотчынныя ўладанні.

Такім чынам, можам сцвярджаць, што вотчынныя землі доўгі час былі аб'ектам права роду. Па ініцыятыве дзяржаўных структур, Касцёла і самой знаці паступова адбываўся працэс «індывідуалізацыі». Асабліва важную ролю адыгралі новаўвядзенні, прыўнесеныя Касцёлам. Касцёл, верагодна, быў асноўным каналам пранікнення рымскага права і звязанага з ім прававога мыслення ў літоўскае грамадства. Не толькі сітуацыя з крыніцамі абумовіла тое, што Касцёл з'яўляецца адным з контрагентных бакоў абсалютнай большасці вядомых перадач зямельных уладанняў першай паловы XV ст. Менавіта Касцёл прынёс звычай упарадкавання спадчыны праз тэстамент, які даў індывіду больш свабоды ў выяўленні сваёй апошняй волі. Не трэба забываць пра індывідуалістычны характар хрысціянскай веры, арэал дзеяння якой (была моцна інтэгравана ў сістэму выхавання) сягаў не толькі рэлігійнай сферы (калі ўвогуле такое вылучэнне абгрунтаванае). З іншага боку, на гэтыя змены ўплывала ўжо абмеркаваная трансфармацыя самога роду. Прадстаўнікам знаці ўсё больш перашкаджалі абмежаванні старога парадку землеўладання.

Адносіны пачатку XV ст. не змяшчаюцца ў акрэсленыя рымскім правам рамкі супрацьпастаўлення асабістай і калектыўнай уласнасці. Зямельнае ўладанне — гэта не асабістая ўласнасць, бо, як мы бачылі, распараджэнне ёю абмяжоўвалі правы родзічаў. Але гэта і не калектыўная ўласнасць, бо рэальныя правы кожнага родзіча на распараджэнне асобнымі ўладаннямі адрозніваліся. Калі казаць пра часы «да рымскага права», слова «ўласнасць» неабходна ўжываць вельмі асцярожна. Правы роду — гэта спецыфіка ранніх часоў, і на іх пераадоленне спатрэбілася паўтара стагоддзі. Неабходна адзначыць, што абмежаванні на свабоднае распараджэнне сваёй зямлёй скасаваў II Літоўскі Статут (дакладней — яго берасцейская папраўка)[87], які вылучаецца з шэрагу іншых судзебнікаў большай ступенню ўплыву рымскага права[88].

Важная частка сацыяльнай структуры — права на атрыманне

[87] Bardach J. Trzecizna — część swobodna... S. 136.

[88] Bardach J. Geneza romanizacji II Statutu litewskiego // Dawnie prawo i myśl prawnicza: prace historyczno-prawne poświęcone pamięci Wojciecha Marii Bartla. Kraków, 1995. S. 191—206; Bardach J. Statuty litewskie a prawo rzymskie. Warszawa, 1999.

спадчыны. Паводле дзеючай на той час сістэмы перадачы спадчыны ўсе сыны мелі роўныя правы на вотчынныя ўладанні. Дарэчы, спачатку дзялілася кожнае ўладанне, а не комплексы ўладанняў. Гэта магло мець катастрафічныя наступствы для захавання сацыяльнага статусу роду[89]. Няцяжка ўявіць, як змяняўся маёмасны стан роду пры наяўнасці шматлікіх нашчадкаў, калі вотчынная маёмасць расколвалася на некалькі частак. Новыя выслужаныя ўладанні ці паспяховыя шлюбныя праекты маглі зменшыць небяспеку, выкліканую такой сітуацыяй. Яшчэ адным рашэннем было застасаванне прынцыпу «непадзелу»[90]. Падчас працэсу канцэнтрацыі ўладанняў паступова абмяжоўвалася права жанчын валодаць зямлёй[91]. Але самыя значныя змены былі ізноў жа звязаны з уведзеным Касцёлам тэстаментным спосабам распараджэння спадчынай, які, па меншай меры часткова, дазваляў змякчаць балючую праблему падзелу[92]. З канца XV ст. у тэстаментах можна заўважыць тэндэнцыю да перадачы атрымальнікам спадчыны асобных непадзеленых маёнткаў. Праблема падзеленага зямельнага ўладання была настолькі актуальнай, што часам у змест дакумента ўпісвалася катэгарычнае патрабаванне пазбягаць падзелу маёнткаў. Неабходна адзначыць уплыў родавай самасвядомасці: у спіс непадзельных траплялі ў першую чаргу найбольш важныя рэзідэнцыйныя ўладанні, што здаўна знаходзіліся ў руках роду.

---

[89] Права ўсіх сыноў на спадчыну было лагічнай падставай тагачаснага сацыяльнага парадку. Гэта яшчэ раз пацвярджае істотнасць крытэрыю паходжання ў вызначэнні вышэйшага стану.

[90] Гл.: Bardach J. Niedział w statutach litewskich... S. 113—173. Зразумець рэальнае значэнне гэтага інстытута перашкаджае тая акалічнасць, што ўнутраная структура вотчынных зямель вельмі слаба адлюстравана ў крыніцах. Некаторыя звесткі, а таксама частыя згадкі пра братоў у фундацыйных дакументах дазваляюць сцвярджаць, што непадзел быў распаўсюджаны дастаткова шырока.

[91] Гл.: Valikonytė I. Ar Lietuvos Didžiojoje Kunigaikštystėje... P. 62—73. Для гэтай мэты маглі служыць жаночыя кляштары, што засноўваліся. Акрамя ўжо згаданых Аляксандры Гаштаўтаўны, Ганны і Барбары Радзівілаўнаў, манашкамі сталі дачка Алехны Судзімонтавіча Ганна, сястра князя Аляксандра Юр'евіча Гальшанскага Барбара (Kantak K. Bernardyni polscy. T. 1 (1453—1572). Lwów, 1933. S. 266—267), дачка Станькі Касцевіча Сусана (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 140; AGAD, dok. perg., № 7470). На жаль, крыніцы гэтага часу і пазнейшыя генеалагічныя творы згадваюць такіх жанчын вельмі рэдка.
Тэндэнцыю абмежавання жаночага землекарыстання ў часе працэсу феадалізацыі можна таксама заўважыць у Заходняй Еўропе (Spieß K.-H. Familie und Verwandschaft... S. 331—342).

[92] Іншыя спосабы вырашэння гэтай праблемы разгледжаны ў падраздзеле «Паняцце роду».

Шматлікія ўладанні ваяводы віленскага і канцлера ВКЛ Алехны Судзімонтавіча, які памёр у 1490 г., падзялілі яго дачкі. У астрошыцкім і сямяціцкім маёнтках свае часткі атрымалі жонка Станіслава Янавіча Кезгайлавіча і жонка ўплывовага польскага пана Мікалая Цянчынскага. Ужо ў пачатку 1492 г. гэтыя пары ажыццявілі перадачу, імкнучыся засяродзіць асобныя маёнткі ў адных руках: Астрошыцы адышлі Кезгайлам, а Сямяцічы — Цянчынскім[93]. Па інфармацыі некаторых дакументаў можна меркаваць, што гэты абмен быў часткай больш шырокай здзелкі, у якой удзельнічалі іншыя родзічы і кароль Казімір. Палову Воўпы, атрыманую Цянчынскім і яго жонкай Аляксандрай, яны прадалі каралю, пасля смерці якога яго сын, вялікі князь Аляксандр, у той жа год перадаў гэтае ўладанне іншай дачцэ Алехны Судзімонтавіча — Сафіі[94]. Жывучы ў Польшчы, Аляксандра ў сваіх дакументах па прыкладзе бацькі падпісвалася як спадчынніца Хажова (хоць Хажова атрымала ў спадчыну яе згаданая сястра Сафія, жонка князя Аляксандра Гальшанскага) або Сямяцічаў, а ў сваім запісе дачцэ адзначыла, што сямяціцкі маёнтак, які знаходзіцца на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, не павінен прадавацца нашчадкамі па-за межы роду або дзяліцца[95]. Падобны механізм перадачы маёнткаў нашчадкам прадугледжваў некалькі пазнейшы тэстамент Пятра Станіслававіча Кішкі 1534 г. У ім адзначана, што дзеці, якія дасягнулі паўналетняга ўзросту, не павінны дзяліць яго асноўныя ўладанні[96].

Іншым шляхам, які вёў да зніжэння вастрыні праблемы падзелу, а таксама да канцэнтрацыі ўлады, было валоданне бенефіцыямі. Выслужаныя маёнткі былі непадзельнымі, а прадстаўнік кожнага пакалення пасля смерці бацькі павінен быў атрымліваць іх ад гаспадара ізноў.

---

[93] AGAD, dok. perg., № 6725, 6730; Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 15 / Parengė A. Dubonis. Vilnius, 2002. P. 119—120.

[94] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1 / Parengė A. Baliulis ir R. Firkovičius. Vilnius, 1998. P. 71, 83.

[95] AGAD, dok. perg., № 6795.

[96] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 15... P. 245 («не мают они именья, а звлаща дворов моихъ головных по частеи делити»). У XV ст. падобная палітыка непадзелу асноўных уладанняў пачала ажыццяўляцца таксама ў Польшчы (Koczerska M. Świadomość genealogiczna możnowładztwa polskiego w XV wieku: podstawy i środki wyrazu // Społeczeństwo Polski średniowiecznej: zbiór studiów. 1982. T. 2. S. 273—275).

3. ПАМЕР І СТРУКТУРА БАЯРСКАГА ЗЕМЛЕЎЛАДАННЯ

Сцвярджэнне Г. Лаўмяньскага пра дробны памер зямельных маёнткаў літоўскага баярства эпохі Вітаўта аказала моцны ўплыў на гістарыяграфію[97]. Можна пагадзіцца з тым, што панаванне гэтага князя паспрыяла фарміраванню буйнога землеўладання. Іншая справа — генезіс гэтага землеўладання. Нават рэдкія звесткі пра літоўскае землеўладанне XIV ст. прадстаўляюць дастаткова дыферэнцаваную сітуацыю. Прадстаўнікі літоўскай знаці, што ўцякалі ў Прусію, атрымлівалі там неаднолькавыя ўладанні. Напрыклад, Манста ў 1321 г. атрымаў ажно 25 сохаў зямлі, а звычайныя баяры задавольваліся 1—3 сохамі[98]. Адзначым, што землі такога ж аб'ёму атрымлівалі і ўцекачы пачатку XV ст.[99]. Таму кажучы пра ранняе землеўладанне баяраў, неабходна звяртаць увагу на іх розны сацыяльны статус. Вотчынныя ўладанні знатнага чалавека эпохі Вітаўта часта не былі адзіным маёнткам. Крыніцазнаўчыя праблемы я разгледзеў у той частцы працы, што прысвечана паходжанню знаці, і таму тут абмяжуюся толькі асобнымі высновамі[100].

Манівід, несумненна, меў некалькі вотчынных двароў — Геранёны і Вішнева. Магчыма, іх было болей. Сцвярджаць пра гэта дазваляюць некалькі згадак у крыніцах. У 1418 г. агент лівонскага магістра ў сваёй рэляцыі згадвае ўладанні Манівіда ў Вільні[101]. У 1500 г. вялікі князь Аляксандр пацвердзіў старую фундацыю ваяводы віленскага Манівіда браслаўскаму касцёлу. У дакуменце адзначана, што Манівід *держал Браславль у отчызну*[102]. Гэта позняе сведчанне пацвярджаецца паведамленнем дзінабургскага комтура 1420 г., у якім напісана, што Манівід, нягледзячы на небяспеку вайны з Лівонскім ордэнам, загадаў

---

[97] Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1. S. 274—281. Гл. працы М. Мальчэўскай, К. Пяткевіча, В. Пельтца, Э. Кельмы.

[98] Codex diplomaticus Warmiensis / Hrsg. v. C. P. Woelky und J. M. Saage. Bd. 1. Mainz, 1860. S. 358; Preussisches Urkundenbuch. Bd. 5 / Hrsg. v. K. Conrad und H. Koeppen. Marburg, 1969. S. 91, 93, 168, 350 і інш. Аналіз гэтых наданняў гл.: Nikžentaitis A. Nuo Daumanto iki Gedimino... P. 13—14.

[99] Гл. фатакопію дакумента магістра Ордэна 1413 г. — MAB RS. F 256—1092, l. 6.

[100] Дакументуюцца толькі незгаданыя раней факты.

[101] LUB. Bd. 5. S. 340—341.

[102] РИБ. Т. 27. С. 806—807.

сваім людзям працягваць працы[103]. Гэта заўвага лагічная толькі для зямель, што знаходзіліся на памежжы з Ордэнам, а Браслаў адпавядае гэтай умове. У добра захаваных дакументах наданняў Вітаўта Манівіду гэтыя ўладанні не фігуруюць. Таму яны маглі быць вотчыннымі землямі. Пра тое, што ў пэўным месцы знаходзіліся вялікія ўладанні знаці, сведчыць ліст маршала Ордэна 1409 г., у якім згадваецца тэрыторыя, куды маглі ўцякаць людзі з Горадні, Мерачы, Коўна і Трокаў. Асаблівай рысай гэтай тэрыторыі («кута») былі вёскі Осціка[104].

Некалькі двароў, верагодна, атрымаў у спадчыну і Мінігайла. *Вегеберыхты* згадваюць дзве яго вёскі (*Mynegalia dorf*) у ваколіцах Салечнікаў. Акрамя таго, яму належалі Дзявенішкі. Андрэй Гаштаўт разам з найважнейшым геранёнскім маёнткам мог мець уладанні ў Вільні і Вялене. Чупурна валодаў Салечнікамі і нейкай вёскай паміж Рудамінай і Салечнікамі. Асноўныя ўладанні Сунгайлы знаходзіліся ў свянцянскай зямлі, у той жа час крыжацкія агенты ведалі пра яго двор (*Sangailsdorf*) паміж Горадняй і Наваградкам. Андрэй Саковіч лічыў дзве свае сядзібы (няменчынскую і груздаўскую) вотчыннымі. У 1414 г. Вітаўт пацвердзіў Зяновію Братошычу ўсе яго вотчынныя землі[105]. Родзіч Осцікаў Судзімонт, акрамя старых уладанняў у ваколіцах Кернава, меў Хажова. Яго сын Алехна Судзімонтавіч лічыў месцам свайго паходжання і Хажова, і Ратамку, што непадалёк ад Менска[106]. Згодна з ордэнскім паведамленнем, вотчына Гайліміна Надобавіча знаходзілася ў Айраголе[107]. Тым часам, яго бацька паходзіў з Відукле[108]. Гайлімін меў таксама ўладанні ў Вялене[109].

Цікавым з'яўляецца пытанне пра ўладанні Валімонтавічаў. Вядома, што яны лічылі месцам свайго паходжання Дзяволтву. Але можна меркаваць, што частка іх вотчынных зямель ляжала ў Жамойці. У другім дзесяцігоддзі XV ст. Вітаўт надаў жонцы Кезгайлы некалькі ўладанняў у гэтым краі, сярод якіх было *се-*

[103] LUB. Bd. 5. S. 621 («seinen leuten in dem vorlande losin sagen, das sie ir arbeit thun und haken»).

[104] CEV. S. 187 («in den winkel, do Astyg dorffer inne legen»).

[105] Vitoldiana... S. 74 («Mysz, Czordlone, Wiszniew etc».).

[106] Biskup M. Spisy jeńców polskich z bitwy pod Chojnicami // Przegląd historyczny. 1965. T. 56. S. 102.

[107] CEV. S. 185.

[108] Lites ac res gestae... T. 2. P. 147.

[109] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 48.

лищо Мозкгина, деда пана Кезкгайлова[110]. Сляды Валімонтавічаў у Жамойці захавалі некаторыя тапонімы. У акце, які датуецца 1522 г., названы *три двори Крожские — Крожи, Ромболтишъки, Евънишъки*[111]. Дзве апошнія назвы ўтвораны ад імёнаў Румбоўда і Яўнуса Валімонтавічаў. Палітычная роля Румбоўда ў Жамойці была эпізадычнай, а дзейнасць Яўнуса ў тых краях увогуле невядомая. Праўда, Ян Длугаш адзначае, што Кезгайла быў панам літоўскага паходжання[112] (маецца на ўвазе апазіцыя літовец — жамойт). Але не выключана, што маці Валімонтавічаў паходзіла з Жамойці. Гэта магло б патлумачыць тоеснасць Мазгіна (як вядома, дзедам Кезгайлы з боку бацькі быў Бушка), а таксама пропуск аднаго генеалагічнага звяна, г. зн. маці Кезгайлы, у згаданым наданні яго жонцы. Існаванне сувязяў з жамойцкімі баярамі магло падштурхнуць Вітаўта прызначыць Валімонтавічаў старостамі жамойцкімі: у 1409 г. — Румбоўда, у 1412 г. — Кезгайлу. Дарэчы, Румбоўд меў яшчэ адзін маёнтак у Свіслацкай воласці[113].

Падобным, верагодна, быў таксама выпадак Бутрымаў. У дакументах яны падпісваліся *de Zirmuni*, але маглі быць звязаны з родзічам маці Вітаўта жамойтам Бутрымам[114].

Яшчэ адзін прыклад такой «міграцыі» — Андрэй Гайлігін. Яго нашчадкі жылі ў Лідскім павеце — у Ваверцы. Як вынікае са зместу іх дакумента 1463 г., гэтыя ўладанні знаходзіліся ў руках роду па меншай меры на працягу некалькіх пакаленняў[115]. Андрэй Гайлігін (*Andreas dictus Golykunth*) выступае як сведка ў працэсе над крыжакамі 1413 г. сярод жамойтаў[116].

Крыніцы раскрываюць складаную структуру ўладанняў у Літве пачатку XV ст., якая не можа быць адэкватна прадстаўлена праз формулу: адзін шляхціц — адзін двор / маёнтак. Характэрнай рысай структуры вотчынных уладанняў была іх тапаграфічная няцэльнасць. Землі баяраў былі раскіданыя па

---

[110] РИБ. Т. 27. С. 83. Гэты прыклад яшчэ раз паказвае, як асцярожна трэба ставіцца да зместу данацыйных прывілеяў.

[111] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 10 / Parengė E. Banionis ir A. Baliulis. Vilnius, 1997. P. 100, 111.

[112] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 163 («unus ex Lithuaniae baronibus»).

[113] Ён згадваецца ў наданні Вітаўта 1411 г. Віленскай кафедры (KDKW. S. 86).

[114] Гл. частку працы, прысвечаную паходжанню знаці.

[115] KDKW. S. 283—286.

[116] Lites ac res gestae... T. 2. P. 147.

розных мясцовасцях краіны. Гэта заканамерна — згадаем «адкрытую» кагнатычную структуру тагачаснага роду. З прычыны падзелаў, шлюбаў і інш. склад уладанняў у кожнага новага пакалення адрозніваўся ад ранейшага. Асабліва значным быў шлюб з высакароднай жанчынай, што валодала мноствам маёнткаў. Такі шлюб адбіваўся ў самасвядомасці роду. Напрыклад, Пётр Манцігердавіч, ажаніўшыся з дачкой князя Фёдара Карыбутавіча Ганнай (гэты князь, які паходзіў з Гедзімінавічаў, не меў нашчадкаў мужчынскага полу), апроч іншага, атрымаў маёнтак у Лоску. Праз нейкі час гэты маёнтак стаў адным з найважнейшых «вотчынных» уладанняў яго нашчадкаў. Таму паняцце баярскіх «гнёздаў» неабходна разглядаць менавіта ў кантэксце гэтай з'явы — бацькі бояраў маглі паходзіць з іншых месцаў. Тое, што знаць эпохі Вітаўта валодала землямі ў розных месцах Літвы, не было выпікам свядомай палітыкі князя (імкнення пазбегнуць канцэнтрацыі ўладанняў у адным месцы). Тады небяспекі такой канцэнтрацыі яшчэ не існавала. Акрамя таго, заўважана, што Вітаўт імкнуўся раздаваць маёнткі на далёкіх, звычайна памежных тэрыторыях[117]. Тым часам, прааналізаваныя выпадкі часцей за ўсё датычацца цэнтральных зямель дзяржавы. Крыніцы іншага тыпу таксама сведчаць пра тое, што маёнткі бояраў Вітаўта былі раскідання па тэрыторыі краіны. У 1407 г. войт Жамойці ў сваім лісце да магістра Ордэна піша пра *alle schelunge, di wir habin gehat von sinen* [Вітаўта] *baioren, di do in dem lande czu Sumaythen gut unde erbe hatten*[118]. У 1427 г. польская каралева Сафія (Гальшанская), рэкамендуючы папу свайго родзіча Германа, адзначае, што ён адмовіўся ад усіх вотчынных зямель, якія меў у Русі і Літве (*bonis et dominiis suis hereditariis in terris Russie et Lithwanie habitis renuncians...*)[119]. Такі характар зямельнага ўладання знаці дазваляў ёй умацоўваць сваю ўладу ў розных рэгіёнах краіны.

Калі адбываўся працэс канцэнтрацыі землеўладання знаці, пачалі больш дакладна вылучацца асноўныя ўладанні. Адлюстраванне гэтага працэсу — утвораныя ад назваў маёнткаў родавыя імёны (Забярэзінскія, Касцевічы). Хоць

[117] Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1. S. 280—281; Ivinskis Z. Geschichte des Bauernstandes in Litauen... S. 99.

[118] CEV. S. 144 («пра спрэчкі з баярамі Вітаўта, якія ў Жамойцкім краі маюць свае ўладанні і вотчыны»).

[119] Тамсама. S. 766.

землеўладанне заставалася раскіданым і ў пазнейшыя часы, можна заўважыць імкненне да канцэнтрацыі (шляхам падзелу ці абмену) уладанняў, а таксама да скупкі зямель у больш дробных суседзяў. У цэнтры такіх буйных і цэльных уладанняў засноўваўся рэзідэнцыйны маёнтак, будаваўся касцёл, якія адыгрывалі важную ролю ў інтэграцыі прадстаўнікоў агнатычнага роду. У XV ст. мы бачым толькі першыя прыкметы такога развіцця, але менавіта ў гэтым стагоддзі сфармаваліся ўмовы для такіх перамен.

Унутраную структуру баярскага землеўладання без археалагічных даследаванняў цяжка аднавіць дакладна. У дакументах баяраў звычайна згадваюцца іх маёнткі (*curia*) і вёскі навокал іх (*villa*). Напрыклад, у запісе Мікалая Неміровіча ад 10.06.1471 г. жонцы і ішкалдскаму касцёлу прызначаецца асноўны ішкалдскі маёнтак з прыналежнымі да яго вёскамі[120]. У XV ст. маёнткі яшчэ вельмі падобныя да апісаных на пераломе XIV—XV ст. у *Вегеберыхтах* баярскіх двароў. Але дзякуючы палітыцы падзелаў і ўнутранай каланізацыі побач з гэтымі дварамі павялічвалася колькасць новых зямель. Землі баяраў апрацоўвала несвабодная сям'я, а таксама атрыманыя ад гаспадара падданыя[121]. Пашырэнне загаспадараваных зямель (унутраная каланізацыя), якое разам з наданнямі гаспадароў было асноўным сродкам павелічэння ўладанняў, рабілася магчымым толькі пры наяўнасці дастатковай колькасці людзей[122]. Таму асноўным клопатам баяраў было атрымаць ці пераманіць да сябе сялян, асабліва такіх, што жылі недалёка ад вотчын. Нярэдка яны самавольна сялілі на каланізаваных землях сялян і толькі пасля гэтага

[120] «...quia hereditatem meam paternam seu curiam dictam Hiskolth cum curiis seu villis Lissicza, Lulyn et Lulynyecz parva, Thvhanowczi ad eandem Hiskolth curiam maiorem adiacentibus» (KDKW. S. 315). Несумненна, «вёскі» і іх арганізацыю ў XV ст. нельга атаясамліваць з вёскамі новага тыпу з акрэсленай структурай, што паўсталі ў часе валочнай памеры.

[121] Землеўладанне XV ст. і яго развіццё — гэта аб'ект асобнага даследавання. Тут абмяжуюся толькі некалькімі заўвагамі. Пра сацыяльную структуру баярскіх вотчын, а таксама пра суадносіны паняццяў «вёска» — «маёнтак» гл.: Jurginis J. Baudžiavos įsigalėjimas Lietuvoje... P. 159—165, 224—238. Таксама гл.: Леонтович Ф. И. Панский двор... С. 1—59.

[122] Прыкладам такой «мясцовай» каланізацыі могуць служыць згаданыя ў цытаваным раней дакуменце (спасылка 120) «Лулін» і «малы Лулінец».

клапаціліся пра прававое замацаванне новага становішча[123]. У маёнтку размяшчалася сядзіба баярына, але ў гэтае паняцце ўваходзіла і несвабодная сям'я, што апрацоўвала землі маёнтка. У маёнтках знаці жылі службовыя людзі розных катэгорый. З фундацыйных дакументаў XV ст. мы ведаем пра касцёлы ў панскіх маёнтках.

Важнасць атрыманых у спадчыну ўладанняў (у крыніцах яны, між іншым, часцей за ўсё называліся вотчынамі — *patrimonium, veterliche erbe, отчина*) добра праглядаецца ў крыніцах, што адлюстроўваюць самасвядомасць людзей. У скарзе жамойтаў Канстанцкаму з'езду 1416 г. валоданне атрыманымі ў спадчыну вотчынамі разумеецца як адно з асноўных сведчанняў свабоды і высакароднасці: *Und alleyne das wir von anbeginsste unsers orsprunges woren und syn edele und recht fry, und unser veterliche gutere, von anfallunge mit erbrechte, und mit czemlicher und mit ganczer fryheit besessen han fredlich und getruet, und woren keynem vorbunden czu dynste*[124]. Адабранне вотчыны — гэта самая вялікая крыўда ці пакаранне, што мог учыніць гаспадар. Вітаўт у сваёй *Скарзе* быў узрушаны паводзінамі Ягайлы з яго прыхільнікамі, у якіх ён адбіраў іх вотчынныя ўладанні[125].

Значэнне вотчынных зямель зразумелае. Яны былі асноўным гарантам захавання сацыяльнага статусу. Таму я сумняваюся ў слушнасці сцвярджэння, што з цягам часу ў Літве перасталі вылучаць вотчынныя і бенефіцыйныя ўладанні[126]. Сапраўды, у канцылярыі гаспадара не заўсёды звярталася ўвага

[123] Напрыклад, дакумент Казіміра ад 14.04.1455/70 (індыкт 3) Радзівілу Осцікавічу, якім Казімір пацвярджае апошняму шэсць сялян, паселеных Радзівілам на сваёй зямлі, «непадалёк ад нямецкай мяжы» (AGAD, Archiwum Radziwiłłów, spr. XI/9, ark. 7).

[124] Doubek Fr. A. Skarga żmudzinów i odpowiedź Zakonu Niemieckiego z roku 1416 // Ateneum Wileńskie. 1930. R. 7. Z. 3—4. S. 876. Лацінскі тэкст апублікаваны ў CEV: «Nam licet a primordiis nostre originis fuimus prout sumus ingénui et liberi, bona nostra ex successione paterna iure hereditario et modis licitis cum plena et perfecta libertate possidemus» (CEV. S. 1019).

[125] Alminauskis K. Vytauto skundas... P. 215 («...und was do y woren myner vrunde von allen nam herczog Jagal ire fetirlich erbe»).

[126] Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1. S. 286. Праўда, неабходна памятаць, што нададзеныя «на вечныя часы» ўладанні ўжо ў наступным пакаленні набывалі статус вотчынных.

на спецыфіку асобных уладанняў, таму нярэдка сярод нованададзеных маёнткаў згадваліся і такія, якімі валодалі раней. Але гэта яшчэ не значыць, што ў рэальным жыцці чалавек «забываў», якія землі былі атрыманы ад гаспадара, а якія — у спадчыну. І Літоўскі Статут ужо сістэмна раздзяляе вотчыннае, выслужанае і набытае. Рэдкасць згадак пра вотчыны ў крыніцах тлумачыцца тым, што для пісараў вялікага князя большае значэнне мелі гаспадарскія маёнткі. Родавыя ўладанні іх не цікавілі. «Канцылярскі манапалізм» вялікага князя выключае магчымасці іншай перспектывы ў крыніцах. Гэта па сутнасці абумовіла сітуацыю з крыніцамі, якая, у сваю чаргу, дыктавала тэндэнцыі ў даследаваннях. Адсутнасць увагі на аднабаковы характар крыніц прывяла да аднабаковых высноў. Добрым прыкладам магло б быць уведзенае вялікім князем абмежаванне распараджацца землямі, вядомае з розных прывілеяў шляхце. З тэксту прывілеяў незразумела, якіх уладанняў датычыліся гэтыя артыкулы прывілеяў. Па-за ўвагай гістарыяграфіі засталася адна альтэрнатыва — магчыма, гаворка тут ідзе толькі пра выслугі? Цяжка ўявіць, што ва ўмовах XV ст. (асабліва яго першай паловы) у кожным выпадку магчыма было дайсці да князя або яго прадстаўніка.

У гістарыяграфіі звычайна адмаўляюцца правы пабочных родзічаў на атрыманне спадчыны[127]. Тым часам, некаторыя звесткі дазваляюць казаць пра правы родзічаў з пабочных ліній на вотчынныя землі (калі памёр прамы нашчадак), што было б дастаткова праблематычным, калі б вотчынныя землі не адрознівалі ад выслужаных. Напрыклад, частка маёмасці бяздзетнага Пятра Сенькі Гедзігоўдавіча адышла яго стрыечнаму брату Яну Манівідавічу, ад якога пазней яе атрымалі ў спадчыну сыны апошняга (іншая частка адышла

[127] Уплывовым застаецца тэзіс П. Дамбкоўскага, што на інтарэсы родзічаў з пабочных ліній пачалі звяртаць увагу толькі ў II Літоўскім Статуце (Dąbkowski P. Dobra rodowe i nabyte... S. 14—15). Высновы гэтага гісторыка права былі асабліва аднабаковымі, бо ён амаль выключна абапіраўся на юрыдычныя ў вузкім сэнсе слова крыніцы. Яго сцвярджэнні паўтараюць Г. Лаўмяньскі (Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1. S. 286), К. Пяткевіч (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium... S. 67—68) і інш. Крытычны падыход да высноў Дамброўскага — Wawrzyńczyk A. Rozwój wielkiej własności na Podlasiu w XV i XVI w. Wrocław, 1951. S. 141. Там жа (S. 143—144) гл. таксама пра эвалюцыю ўяўленняў пра вотчынныя землі.

жонцы Гедзігоўдавіча Мілохне)[128]. Важна канстатаваць, што менавіта Яну Манівідавічу адышлі вотчынныя землі (напрыклад, Вішнева). Землямі Станькі Судзівоевіча, які памёр без нашчадкаў, валодаў яго пляменнік Ян Кезгайлавіч[129]. На думку Пяткевіча, гэта адбылося наступным чынам: спачатку ўладанні, паводле тагачаснага звычаю, адышлі да вялікага князя, і толькі потым Кезгайлавіч вярнуў іх сабе. Але існаванне такога звычаю ў XV ст. яшчэ трэба даказаць. Спасылка на Дамбкоўскага нічога не дае, бо апошні не даследаваў фактычных землеўласніцкіх адносінаў, а абмяжоўваўся аналізам прывілеяў вялікага князя і Літоўскіх Статутаў. У крыніцах няма ніякіх сведчанняў таго, што гаспадар у гэтым выпадку ўмешваўся ў справу атрымання спадчыны. Увага родзічаў і іх клопат пра вотчыны (клаўзулы ў дакументах для перадачы іх згоды, сведчанне пры гэтых дзеяннях) могуць быць зразумелымі толькі пры наяўнасці права на спадчыну. Між іншым, родзічы з пабочных ліній часам атрымлівалі ў спадчыну і выслужаныя землі. У такім выпадку згода гаспадара была абавязковай, але неабходна адзначыць само існаванне такой магчымасці. У 1451 г. Міхаіл Кезгайлавіч атрымаў ад Казіміра маёнтак у Ельні з правам перадаваць яго нашчадкам. Пасля таго як Міхаіл Кезгайлавіч памёр бяздзетным, у 1498 г. гэты маёнтак, несумненна, належаў яго пляменніку Мікалаю Янавічу, які заснаваў алтар у касцёле ў Ельні[130].

Нават далёкія родзічы ўзаемна клапаціліся пра свае вотчыны і імкнуліся вярнуць адасобленыя землі роду. У 1499 г. Мікалай Юндзілавіч набыў у Сёмкі Янавіча зямельнае ўладанне, якое таму за службу запісаў Мікалай Жыгімонтавіч. Апошні быў братам у далёкай стрыечы Мікалая Юндзілавіча[131].

Незразумела, наколькі далёка заходзілі правы вялікага князя адносна вотчын. Наўрад ці ён мог адбіраць гэтыя землі або

---

[128] Peltz W. Ród Giedygołda i jego majętności... S. 39—41; Semkowicz W. Przywileje Witołda dla Moniwida, starosty wileńskiego i testament jego syna Jana Moniwidowicza // Ateneum Wileńskie. 1923. R. 1. S. 261—262.

[129] Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium... S. 67—68, 74. Гл.: Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1... P. 101. У гэтым дакументе размова ідзе пра выслужаны маёнтак Батакі, таму ўмяшанне гаспадара зразумелае.

[130] GStA PK, Coll. Zasztowt, № 5; KDKW. S. 529—530.

[131] АЛМ. Т. 1. Вып. 2. С. 35—36. Пра адносіны роднасці гэтых асоб гл.: Glinka J. Ród Klausucia w wiekach XIII — XVI... T. 4. S. 96—97.

абмяжоўваць правы на перадачу ў спадчыну і распараджэнне імі. Апеляцыя Вітаўта да Ордэна пра несправядліва адабраныя Ягайлам вотчыны яго баяраў супрацьпастаўляла правы баяраў княскаму сваволлю[132]. Румбоўд Валімонтавіч, часова выпушчаны з польскай няволі ў 1432 г., абяцаў вярнуцца па патрабаванні караля. Калі б ён не выканаў абяцанне, кароль мог адабраць яго ўладанні[133]. Такім чынам, прадугледжваецца права гаспадара адбіраць маёмасць падданага, які правініўся, але яно мае сэнс толькі ў тым выпадку, калі неабгрунтаваныя дзеянні вялікага князя лічацца несправядлівымі.

Даследаванне пацвердзіла неад'емную сувязь вотчыны і роду ў Літве XV ст. Тапаграфічная няцэльнасць складу вотчын добра суадносіцца са структурнымі асаблівасцямі тагачаснага роду. Роля роду ў сацыяльных адносінах становіцца больш зразумелай.

4. ФУНКЦЫІ РОДУ: САЦЫЯЛЬНАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ, АБАРОНА АСОБЫ І ПАМЯЦЬ

У канцы XIV — пачатку XV ст. род ужо не быў шырокай супольнасцю, у межах якой пануе права і мір. Можна казаць толькі пра некаторыя функцыі роду, што даюць яго членам пачуццё бяспекі ў перыяд фармавання дзяржаўных структур. Калі нават вялікі князь пры персанальным падборы сваіх ураднікаў павінен быў звяртаць увагу на ўмовы функцыянавання мясцовай улады, для насельніцтва захаванне прававога парадку было штодзённай праблемай. Нават без строгай родавай прававой сістэмы прыналежнасць да кола родзічаў была пэўнай гарантыяй пры ўзнікненні канфліктнай сітуацыі.

Функцыя сацыяльнай бяспекі больш характэрна для збяднелых родаў, калі паўставала пагроза сацыяльнай дэградацыі. З двух дакументаў пералому XV і XVI ст. бачны механізм гэтай падтрымкі. Грамата вялікага князя Аляксандра 1496 г. гаворыць, што адзін смаленскі баярын назваў іншага купцом. Пакрыўджаны баярын спаслаўся на сваіх родзічаў, дзякуючы з'яўленню якіх ён спадзяваўся «ачысціць» сваю запэцканую

[132] Гл. спасылку 125.

[133] CEXV. T. 1. S. 75.

шляхетнасць: *Ростегались передъ е. м. боярe Смоленский... Сенко Плешкинъ приганилъ Богдану, а назвалъ его коробейникомъ, купцомъ. И Богданъ поведилъ передъ господаремъ родъ свой, племя, кровныи, кимъ ся маеть выправити и шляхетство свое очистити*[134]. Рашэнне гаспадара 1510 г. больш канкрэтна характарызуе ступень роднасці такіх сведак: *...тотъ Мартинъ родъ свои, дяди и брату, добрихъ людеи шляхтичовъ... поставилъ*[135]. Прысяга родзічаў-шляхціцаў гарантавала прызнанне асобы шляхціцам. Прававая падтрымка родзічаў была патрэбная і для больш знатных асоб. Як можна меркаваць па згадках у крыніцах, яны часта выконвалі функцыю пасрэдніцтва[136], якая ў тагачаснай прававой сістэме адыгрывала важную ролю. Уплывовыя родзічы былі найлепшымі пасрэднікамі пры вырашэнні праблем рознага ўзроўню. Напрыклад, жонка мазавецкага князя Конрада III Ганна Радзівілаўна, шукаючы заступніцтва вялікага князя літоўскага Аляксандра, звярнулася да яго праз свайго бацьку Мікалая[137].

Дзяржава ў Сярэднявеччы не мела манаполіі на выкарыстанне легітымнай сілы[138]. З пункту гледжання больш пазітывісцкага права Новага часу, парадзяржаўнае ажыццяўленне права, па сутнасці, супярэчыць разуменню правапарадку. Тым часам, у сярэднявечным грамадстве цалкам легальнымі былі гвалтоўныя дзеянні іншых суб'ектаў, звернутыя супраць асоб, што парушылі іх правы ці нанеслі шкоду маёмасці. Прававое праследаванне сваім значэннем саступае іншым спосабам ажыццяўлення справядлівасці (помста, выкуп і інш.). Недахоп дзяржаўных судоў кампенсавалі групы блізкіх асоб, з якіх найважнейшай (хоць і не адзінай) быў род. Гэтая інстытуцыя ажыццяўлення справядлівасці дзейнічала побач з дзяржавай, таму яна не абмяжоўвалася межамі дзяржавы. У лісце 1408 г.

---

[134] АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 128—129.

[135] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 8 / Parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius. Vilnius, 1995. S. 370.

[136] «...приступили есмо с обу сторонъ у еднанье промежи старших приятелей наших» (справа князёў Міхаіла Збараскага і Марыі Каладзенскай — Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 79).

[137] Materiały do dziejów dyplomacji Polskiej z lat 1486—1516 (Kodeks zagrzebski) / Oprac. J. Garbacik. Wrocław—Warszawa, 1966. S. 63: «mediante domino palatino Vilnensi» [Мікалай Радзівілавіч].

[138] Гл. фундаментальную працу О. Брунера: Brunner O. Land und Herrschaft... S. 17—19, 41 і далей.

войт Жамойці апавядае свайму начальніку, магістру Ордэна, пра адзін суд, на якім нашчадкам забітага прысудзілі 30 марак, бо ён быў «добры чалавек». Але брат забітага, «жыхар краю Вітаўта», з дзевяццю супольнікамі напаў на братоў забойцы і моцна іх параніў[139]. Ян Длугаш, апісваючы падзеі 1446 г., адзначае, што літоўцаў напалохаў намер палякаў каранаваць мазавецкага князя Баляслава, бо было вядома, што Міхаіл Жыгімонтавіч доўгі час жыў у Мазовіі (*ducem Michaelem... longum in Masovia tenuisse domicilium*) і што ён быў *generus et alumnus* Баляслава[140].

Тое, што дзеянні помсты маглі пагражаць самому гаспадару, сцвярджае згаданы Длугаш. У 1433 г. Жыгімонт Кейстутавіч не адважыўся ўступіць у бітву са Свідрыгайлам, бо здагадваўся пра настроі тых, якіх звязвала роднасць (*qui illis consanguinitate iunctierant*) з нядаўна пакаранымі Валімонтавічамі[141]. Далейшыя «талерантныя» дзеянні Кейстутавіча адносна некаторых нелаяльных, асабліва калі браць пад увагу яго рэзкі характар, тлумачацца толькі ўплывам іх «родзічаў і сяброў» на рашэнні князя.

Акрамя гэтай функцыі па абароне асобы і яе сацыяльнага статусу, родныя сувязі гарантавалі пэўнасць і спакой на тым свеце. Ян Длугаш апісвае культ памерлых, які існаваў яшчэ ў паганскія часы. Ён згадвае жамойтаў, што маюць у лясах сямейныя і родавыя агмяні (*in silvis praefatis focos in familias et domos destinetos*), на якіх спальвалі целы блізкіх і членаў сям'і (*omnium charorum et familiarium cadavera*)[142]. З'яўленне касцёльных інстытуцый дазволіла перадаць ім частку клопатаў па захаванні памяці (*memoria*), але родзічы і далей засталіся ініцыятарамі гэтай памяці. Гэта выяўлялася ў форме фундацый і данацый на карысць касцёла. Данатар звычайна тлумачыў свае дзеянні жаданнем збавіць душы не толькі членаў сваёй сям'і, але і блізкіх. Часам у такіх наданнях лаканічныя канцылярскія трафарэты замяняліся некалькі больш падрабязнымі пералікамі родзічаў, але ў дакументах не імкнуліся падаць іх поўны спіс. Прыкладам такога надання магла б быць данацыя ўдавы Ягінта Магдалены і яе сыноў віленскім францішканцам:

[139] CEV. S. 164—165 (апублікаваны толькі рэестр ліста). Арыгінал — GStA PK, OBA 10250.

[140] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 21—22.

[141] Тамсама. T. 4. P. 519.

[142] Тамсама. P. 160.

Quomodo cupientes subvenire saluti nostre et amicorum nostrorum tam vivorum quam defunctorum, precipue saluti predecessorum nostrorum, videlicet domini Sudynth cum pueris eius, et domini Jagint et filiorum meorum et filiarum mearum et aliorum amicorum meorum et omnis genologie mee...[143]. Гэтая цытата яшчэ раз дазваляе абгрунтаваць кагнатычнае разуменне роду — клапаціліся пра род не толькі са свайго боку, але і з боку мужа. Таксама можна заўважыць, што памяць сягае толькі да дзеда (праўда, у гэтым выпадку маглі брацца пад увагу і канфесійныя прычыны). Падобны таксама фундацыйны дакумент Ганны Мілохны Рачкоўны 1433 г.: *А тот попъ, при той церкви будучи, завсегды за душу деда моего Богдана, бабки моей Варвары, матки моей Марьи, мужа моего Глеба и за всихъ моихъ приятель, да и за мою душу, как умру, Бога просить и у суботникъ уписати велела...*[144]. Фундацыйныя дакументы, якія складаліся духоўнымі асобамі, звычайна не даюць магчымасці зразумець увесь аб'ём і кантэкст канкрэтнай фундацыі. Толькі выпадковыя сведчанні ў іншых крыніцах дазваляюць казаць пра ўклад родзічаў. У 1460 г. удава Яна Давойнавіча зрабіла фундацыйны запіс на карысць касцёла ў Крупе (Лідскі павет). Гэты факт так і застаўся б для нас індывідуальным, каб не адзін ліст 1454 г. Ян Давойнавіч, які намагаўся замовіць касцёльны звон, звяртаецца да жыхароў Гданьска ад імя сваіх братоў і родзічаў[145]. Можна дапусціць, што фундацыя крупскага касцёла ажыццяўлялася па ініцыятыве ўсяго роду.

Даўгавечнасць фундацыі і, адначасова, клопат пра душы родзічаў імкнуліся гарантаваць праз захаванне правоў патранату для нашчадкаў. Часам такія прэтэнзіі выказваюцца наўпрост. У якасці прыкладу можна прывесці вытрымку з данацыі Алехны Гайлігінавіча 1460 г.: *Volo autem, ut collacio predicte ecclesie sive ius patronatus per me taliter fundate et dotate ad me et meos legittimos successores et consangwineos legittimam propinquitatem habentes dewolvatur*[146]. Тое ж прадугледжвала і данацыя Баўтрамея[147].

---

[143] KDKW. S. 240—241.

[144] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. 11. Вильна, 1880. С. 6—7.

[145] Możejko B. Starosta bielski Iwaszko Dowojnowicz... S. 213.

[146] KDKW. S. 269—270. Упершыню правы патранату знаці прадугледжаны ў фундацыі 1423 г. Альберта Манівіда капліцы Віленскага кафедральнага касцёла (KDKW. S. 745).

[147] Тамсама. S. 281—282.

Сувязь фундатараў і іх родзічаў з патранаванымі касцёламі ці капліцамі, што засноўваліся часцей за ўсё ў вотчынных уладаннях, нярэдка адлюстроўваецца ў імёнах святых, у гонар якіх асвячаліся гэтыя касцёлы. Адным з найбольш ранніх прыкладаў з'яўляецца фундаваная ваяводам віленскім Манівідам капліца Віленскага кафедральнага касцёла, асвечаная ў гонар Св. Альберта і Св. Юрыя (хрысціянскія імёны Манівіда і яго брата Гедзігоўда)[148]. Імёны святых касцёла ў Палонцы, заснаванага Пятром Рачкам Страчэвічам у 1437 г., — Пётр, Павел і Юрый[149]. Пабудаваны ў 1449 г. Мікалаем Неміровічам касцёл у Ішкалдзі асвечаны ў імя Св. Мікалая[150]. Імёны святых парафіяльнага касцёла ў Зябярэззі, заснаванага ў 1456 г. продкамі Забярэзінскіх, таксама супадаюць з імёнамі фундатараў (Юрый Рымавідавіч і яго сын Ян — Св. Ян Хрысціцель і Св. Юрый)[151]. У 1468 г. Юрый Гетаўтавіч і яго маці Ганна зрабілі ахвяраванне на алтары Св. Юрыя і Св. Ганны ў Крэве[152].

Іншай формай захавання памяці было ўпісанне ў царкоўныя кнігі. На праваслаўных літоўскіх землях гэта практыка была шырока распаўсюджаная[153]. Захавалася слуцкая памянная кніга пачатку XVI ст. (*Слуцкий Помянник*)[154], у якой асобы падзелены на роды (напрыклад: *Родъ князя Георгия Ивановичя Дубровицкаго*). Такая ж практыка існавала ў Кіева-Пячорскім[155] і Гарадзішчанскім[156] манастырах.

У каталіцкіх крыніцах ВКЛ XV ст. такія просьбы вядомыя ў запісах, прызначаных францішканцам[157]. Напрыклад, у 1439 г.

---

[148] Jablonskis K. Nauji Vytauto laikotarpio... P. 403— 404.

[149] KDKW. S. 170.

[150] Тамсама. S. 222.

[151] Тамсама. S. 248—249.

[152] Тамсама. S. 293.

[153] Steindorff L. Memoria in Altrußland: Untersuchungen zu den Formen christlicher Totensorge (= Quellen und Studien zur Geschichte des östlichen Europa. Bd. 38). Stuttgart, 1994.

[154] MAB RS. F 21—799.

[155] У 1486 г. Юрый Янавіч Зяновіч ахвяраваў гэтаму манастыру вотчынныя ўладанні. За гэта манахі павінны былі згадваць у сваіх малітвах яго продкаў і ўвесь яго род — «память чинити за предковъ моихъ и за весь родъ мой» (Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. 1. Санкт-Петербург, 1846. С. 105—106).

[156] Pomianyk of Horodyshche. Part 1: a. D. 1484 / Ed. by J. B. Rudnyćkyj. Winnipeg, 1962.

[157] Акрамя таго, вядома, што кнігу мёртвых членаў мела брацтва пры віленскім касцёле Св. Яна (Codex Mednicensis seu Semogitiae Dioecesis. 1 / Ed. P. Jatulis. Roma, 1984. P. 125).

Юрый і Станіслаў Радзівілавічы прасілі пасля іх смерці ўпісаць іх у памянныя кнігі францішканцаў (*...post obitum vero nostrum animas nostras suis libris ascribent*)[158]. Захаваліся рэшткі календара віленскіх францішканцаў, дзе запісаны асобы, якіх манахам патрэбна было згадваць у малітвах[159]. Неабходна адзначыць, што толькі ў рэдкіх выпадках тут трапляюцца асобныя імёны, часцей — асобы ў атачэнні родзічаў. Часам сустракаецца нават *tota parantela sua*[160]. Характэрная рыса календара — агульная згадка жывых і нябожчыкаў. Гэта звязана з асаблівасцямі тагачаснага светапогляду, які не адасабляў памерлых ад свету жывых суцэльнай заслонай. Рысы памерлых паўтараюцца ў іх нашчадках, а яны згадваюць бацькоў у сваіх малітвах. Клопат пра пасмяротны спакой душы быў адным з асноўных матываў пры ўсынаўленні, які не страціў сваёй актуальнасці нават калі змяніліся ўмовы ўсынаўлення.

Такія мемарыяльныя запісы рабіліся і за межамі краіны. Па ініцыятыве жонкі старосты жамойцкага Кезгайлы Алены ў 1445 г. у кнігі Кракаўскага ўніверсітэта была ўпісана група іх родзічаў[161]. У памянной кнізе брацтва кракаўскага касцёла Св. Панны Марыі згадваюцца кашталян віленскі Осцік з жонкай Ганнай, сын Кезгайлы Бутрым, бацька Пятра Манцігердавіча[162]. У 1495 г. у брацтва Св. Духа ў Рыме разам з жонкай Анастасіяй, сынам Мікалаем, групай кіеўскіх святароў і баяраў упісаўся староста наваградскі Юрый Пацэвіч. Некалькі пазней, у 1503 г., тое ж зрабіў кухмістр двара вялікага князя Пётр Алехнавіч[163].

---

[158] KDKW. S. 172. Таксама гл.: S. 190, 192, 202, 203 і інш. Падрабязней пра гэта гл.: Rowell S. C. Winning the Living by Remembering the Dead? Fransiscan Tactics and Social Change in Fifteenth-century Vilnius // Tarp istorijos ir būtovės. Studijos prof. Edvardo Gudavičiaus 70-mečiui / Sudarė A. Bumblauskas ir R. Petrauskas. Vilnius, 1999. P. 87—121.

[159] Dunin-Kozicki Z. Szczątek kalendarza Franciszkanów wileńskich z XV wieku // Kwartalnik litewski. 1910. R. 1. T. 4. S. 9—11.

[160] Тамсама. S. 9.

[161] Fijałek J. Kościoł rzymsko-katolicki na Litwie. Uchrześcijanienie Litwy przez Polske i zachowanie w niej języku ludu po koniec Rzeczypospolitej // Polska i Litwa w dziejowym stosunku. Warszawa—Kraków, 1914. S. 129—130.

[162] Mitkowski J. Księga zmarłych bractwa kościoła Panny Marii w Krakowie (wiek XIV—XVIII) // Studia historyczne. 1968. R. 11. S. 85; Rowell S. C. Winning the Living... P. 97.

[163] Schäfer K. H. Die deutschen Mitglieder der Heiliggeist-Bruderschaft zu Rom am Ausgang des Mittelalters. Padeborn, 1913. S. 43; Wiesiołowski J. Pielgrzymowanie Polaków do Rzymu na przełomie XV i XVI wieku (1478—1526) // Peregrinationes: pielgrzymki w kulturze dawnej Europy / Pod red. H. Manikowskiej i H. Zaremskiej. Warszawa, 1995. S. 163.

Больш відавочна клопат пра памерлых выяўляўся, калі адзін з членаў роду рабіўся святаром. Акрамя эканамічнай матывацыі, гэта магло быць прычынай, што штурхала баяраў абіраць сваім дзецям духоўную кар'еру. Я ўжо згадваў выпадак з Гаштаўтамі. Святарамі сталі некалькі князёў Гедройцяў, свірскі князь Андрэй Пецькавіч, а Вацлаў Рачковіч стаў біскупам у Луцку[164]. Цікава, што баяры эканамічна падтрымлівалі сваіх родзічаў, якія сталі манахамі. У 1489 г. Альберт Юшковіч у запісе на карысць сваёй жонкі абавязаў яе маліцца за яго, калі ён памрэ раней за яе, а таксама ўтрымліваць яго сястру — манашку[165].

У XV ст. род па-ранейшаму выконваў важныя функцыі ў жыцці грамадства. Нягледзячы на дастаткова неакрэслены прававы статус, па сваім уплыве на асобнага індывіда ён пераўзыходзіў усе іншыя сацыяльныя структуры. Мадэль роду была выкарыстана пры стварэнні новых, «гарызантальна» структураваных супольнасцей — брацтваў, таварыстваў, манаства, якія перанялі частку яго прэрагатыў. Іншая частка функцый роду з цягам часу адышла да сфармаваных дзяржаўных інстытуцый. Змяніўся і сам род. Шырокая сетка родавых сувязяў, якая некалі ляжала ў падмурку яго моцы, зрабілася неактуальнай. Яе замяніла жаданне канцэнтраваць значэнне і маёмасць роду ў адных руках, пазбягаючы такім чынам магчымага падзелу вотчын. *Рыфмаваная хроніка Лівоніі* XIII ст., каб падкрэсліць моц ліва Каўпа, кажа, што яго род шырокі[166]. У канцы XV ст. дзяржаўныя структуры перанялі большасць функцый, якія раней маглі выконваць толькі родзічы. У часе гэтай трансфармацыі адным родам (Гаштаўтам, Кезгайлам, Радзівілам) — што праводзілі паспяховую шлюбную палітыку, выкарыстоўвалі новае разуменне роднасці, падтрымку гаспадара — удалося захаваць сваю ўладу і маёмасць, тым часам, іншыя (Саковічы, Свірскія) не здолелі застацца на тым жа ўзроўні. Адны пачалі самі ствараць свае гісторыі[167], знайсці іншых прыйшлося пазнейшым генеолагам.

---

[164] KDKW. S. 228, 277.

[165] Тамсама. S. 424—425.

[166] Livländische Reimchronik / Hrsg. v. L. Meyer. Padeborn, 1876. S. 9 («sin geslechte daz ist breit»).

[167] З XVI ст. вядомыя генеалогіі Гаштаўтаў, Кезгайлаў, Радзівілаў і інш.

5. ЖЫЦЦЁ ЗНАЦІ ПАМІЖ ДВАРОМ ГАСПАДАРА І ВОТЧЫНАЙ

Пра штодзённае жыццё прадстаўнікоў знаці, асабліва пра гады іх юнацтва, крыніцы XV ст. амаль не гавораць. Можна меркаваць, што сярод знаці быў шырока распаўсюджаны звычай дасылаць сыноў на двор гаспадара. У часы Казіміра сыны паноў выязджалі на каралеўскі двор у Польшчу. Яны служылі там у асабістым атачэнні гаспадара, пакаёвымі караля і каралевы, часам займаючы і дробныя прыдворныя пасады. Каралеўскімі дваранамі былі Алехна Судзімонтавіч, Багдан Андрэевіч Саковіч, Ян Іллініч, Ян Кучуковіч, Станіслаў Касцевіч, Леў Багавіцінавіч, сын Мікалая Радзівілавіча Ян і інш. Прыналежнасць да групы каралеўскіх дваран сама па сабе не абумоўлівала кар'еру[168], але асабістыя сувязі, што ўзнікалі паміж гаспадаром і яго дваранамі, не перарывалася і тады, калі апошнія вярталіся ў Літву. Гаспадар асабіста займаўся праблемамі сваіх дваран, напрыклад, імкнуўся вызваліць з ордэнскага палону або клапаціўся пра іх маёмасныя справы. Верагодна, з падзеямі пад Хойніцамі падчас Трынаццацігадовай вайны звязаны ліст Казіміра ад 29.12.1454 г. да гарадской рады Торуні, у якім Казімір загадаў вярнуць падчашаму літоўскаму Алехну Судзімонтавічу рэчы, якія захоўваліся ў аднаго торунскага мешчаніна[169]. Казімір пастаянна падтрымліваў кантакты са сваімі дваранамі, якія вярнуліся ў Літву, дасылаў ім дары[170]. Некаторыя дакументы гаспадара сведчаць пра яго актыўны ўдзел у сямейных справах былых ці актуальных дваран. Напрыклад, у 1484 г. Казімір зацвердзіў дамову пра шлюб дачкі Алехны Судзімонтавіча Аляксандры з уплывовым польскім панам Мікалаем Цянчынскім[171], а ў 1492 г. выставіў падобны дакумент з нагоды шлюбу свайго дваранiна і сына Мікалая Радзівілавіча

[168] Гл. раздзел «Праблема новых людзей».

[169] Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 88—103; Radzimiński A., Tandecki J. Katalog dokumentów i listów królewskich z Archiwum Państwowego w Toruniu (1345—1789). Warszawa, 1999. № 52. S. 25. Блізкія сувязі Казіміра і Алехны Судзімонтавіча бачныя таксама з характарыстыкі апошняга ў 1449 г. як «supremus et specialis cubiculiarius» (Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV—XVIII wieku: spisy / Oprac. H. Lulewicz i A. Rachuba. Kórnik, 1994. S. 150).

[170] Rachunki królewskie z lat 1471—1472... S. 110, 227, 228 (дары Яну Кучуковічу і яго паслу).

[171] Matricularum regni Poloniae summaria... Pars 1. № 1654.

Яна з Эльжбетай Гаштаўтаўнай[172]. Магчыма, што ў гэтым выпадку дзейнічаў падвойны матыў для клопату: пазней убачым, што яго дваранінам некалі быў і бацька Эльжбеты, Марцін Гаштаўт, які ў 1492 г. ужо не жыў.

Пра юнацтва дачок знаці звестак яшчэ менеў. Верагодна, што і яны некаторы час жылі пры двары караля. Але, як падаецца, часцей іх на пэўны час адсылалі ў маёнткі іншых родзічаў, як гэта зрабіў Марцін Гаштаўт, дачка якога Эльжбета пражывала ў сваёй цёткі княжны Марыны Трабскай[173].

Далейшае жыццё знатнага чалавека праходзіла паміж дваром гаспадара і вотчынай. Тэстацыі дакументаў вялікага князя паказваюць, што прадстаўнікі знаці часта суправаджалі гаспадара ў яго падарожжах па краіне[174]. Яны выконвалі і іншыя даручэнні, удзельнічалі ў пасольствах і інш. Але былі пэўныя перыяды, калі яны з'язджалі ўпарадкоўваць свае справы ў вотчынах. Праўда, гэтыя іх паездкі былі звязаныя таксама з выкананнем «дзяржаўных» функцый. Як убачым пазней, значная частка паноў кіравала староствамі, што знаходзіліся побач з іх вотчыннымі ўладаннямі, таму строга падзяляць публічныя і прыватныя справы было б недакладна. Ужо неаднойчы апісаная сітуацыя з крыніцамі XV ст. не дазваляе скласці поўны спіс прадстаўнікоў знаці, разлічыць, якую частку часу яны праводзілі ў вотчынах. Так ці інакш, наведванне імі сваіх дамоў было абавязковым, і з гэтай прычыны іх на некаторы час нават вызвалялі з няволі[175]. Калі Казімір стаў каралём Польшчы, сістэма кіравання змянілася. Тая акалічнасць, што гаспадар не жыў стала ў краіне, часткова абумовіла рацыяналізацыю кіравання. Падобна, што знатныя паны ўзгаднялі рытмы сваіх падарожжаў, і для гэтага нават выкарыстоўвалася рэдкая яшчэ

[172] AGAD, dok. perg., № 665 (дакумент Казіміра ад 10.05.1492 г.).

[173] AGAD, dok. perg., № 739 . Княгіня Марына называе Эльжбету сваёй выхаванкай («domicella»).

[174] У 1409 г. Вітаўт пісаў магістру Ордэна, што яго людзям нязручна кожны раз прасіць дазвол на выезд у Жамойць у Сунгайлы ці Кезгайлы, бо тыя часцей за ўсё бываюць з ім у падарожжах («wend is geschiet ofte, das wir unde leichte also wol Sungail und Kisingail mit uns in der reise sein adir sost verre von heime») (CEV. S. 167).

[175] У 1432 г. Румбоўд Валімонтавіч быў выпушчаны з польскай няволі, каб упарадкаваць свае дамовыя справы: «ut possemus infra hoc tempus [г. зн. пакуль будзе на свабодзе] ad nostram domum in terram Lithvanie libere equitare et nostra negotia peragere» (CEXV. T. 1. S. 75).

пісьмовая камунікацыя. У 1466 г. староста ковенскі Станька Мордас пісаў лабяўскаму (*Labiau*) комтуру Ордэна, што паны раз'ехаліся, і таму ён прачытаў адрасаваны ўсёй радзе ліст. Ён паведамляў, што копіі гэтага ліста ён дашле віленскаму біскупу, ваяводзе і іншым панам, якія паведамяць ордэнскім паслам месца сустрэчы[176]. 25.11.1477 г. ваявода віленскі Алехна Судзімонтавіч адказаў на пытанне магістра Лівоніі наконт тэрміну будучага ордэнскага пасольства, што ў абазначаны час ён, як і іншыя паны, будзе адсутнічаць у Вільні па прычыне выезду ў свае маёнткі[177]. Тагачасная сістэма кіравання патрабавала, каб кожны баярын перыядычна аб'язджаў свае землі. Зразумела, што знаць, па меншай меры ў асноўных уладаннях, мела сваіх прадстаўнікоў. Найбольш вернымі прадстаўнікамі былі родзічы[178]. Але такое прадстаўніцтва не магло замяніць асабісты ўдзел пана. Асабліва цяжкім было адміністраванне ўладанняў на далёкіх тэрыторыях. У гэтым сэнсе перыядычны аб'езд уладанняў быў абавязковым дзеяннем пры жаданні захаваць сваю ўладу ў адносінах да іх. Гэтага патрабавалі несупынныя канфлікты вакол зямельных маёнткаў і іх межаў. Складзенага некалі дакумента, калі такі ўвогуле існаваў, было недастатко́ва, каб даказаць свае правы на спрэчныя землі. У канцы XV ст. староста жамойцкі Станіслаў Янавіч Кезгайлавіч прапануе мужу дачкі сваёй сястры Пятру Алехнавічу выехаць на Валынь і паклапаціцца пра яе маёмасць (яна была дачкой знатнага валынскага пана Івана Юршы), бо суседзі чыняць шмат крыўдаў[179]. І гэта нягледзячы на факт, што ў тыя ўладанні быў прызначаны намеснік.

Наведванне маёнткаў адначасова было добрай нагодай сустрэцца з родзічамі і сябрамі, узяць удзел у сямейных святах,

---

[176] «Das wir isczwnt zcur czeyt seiner herlicheith nicht screyben konnen, wenne dy heren isczwnt nicht zcusamene sint und wir den briff... an den bisschoff gesant haben und Rwssche briwe noch louthe des briwes an den woyghewoden zcur Wille und an andir heren gesch(r)eben habe, das sy sich zcusamene werden fughen off eine stadt, do is en bekweme worde sein, off dy vorbenunthe gescreben czeyt einen tagk adir czwene dornoch. Und wen den euwir bothen her zcu uns komen, so werde wir en den wol bescheiden, wo sy dy heren zcusamene winden werden» (GStA PK, OBA 16030).

[177] «...wir auch auff disse zceit disses brives van der Wille in unsir gutter geczogen seynt» (GStA PK, OBA 16692).

[178] Напрыклад, Струміла, які ў 1433 г. выязджае ў ваенны паход, пакідае ў сваім замку пляменніка (GStA PK, OBA 6626).

[179] АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 163.

абмеркаваць розныя праблемы, што датычыліся членаў роду. Спісы сведак фундацыйных і данацыйных дакументаў знаці кажуць пра з'езды, якія адбываліся з гэтай нагоды і ў якіх, акрамя членаў сям'і і паплечнікаў, удзельнічалі таксама мясцовыя баяры, звязаныя са знатнымі панамі асабістымі сувязямі. Акрамя таго, у далёкіх ад Вільні маёнтках можна было стварыць асяродкі для нефармальных размоў ці нават змоў. Падобна, што з такой мэтай у Ляхавічы, маёнтак князя Аляксандра (Алелька) Уладзіміравіча з роду Гедзімінавічаў, прыехаў ваявода віленскі Ян Гаштаўт, які трапіў у няміласць гаспадара. Напісаны пісарам Гаштаўта Пенязем дакумент князя паказвае, што ў сустрэчы таксама ўдзельнічалі намеснік віцебскі Ян Гайцэвіч і падскарбі земскі Аляксандр Юр'евіч[180]. Гэты выпадак дадае новыя звесткі для разумення сістэмы кіравання. Падобна, што прадстаўнікоў знаці ў падарожжах суправаджалі і іх пісары, а гэта дазваляе меркаваць, што некаторыя справы кіравання маглі вырашацца па дарозе (у крыніцах як месца выдачы дакументаў знаці фігуруе, як правіла, Вільня, пазначаюцца пасада надаўцы ці галоўная вотчына). Пра падарожжы вялікакняскай канцылярыі разам з вялікім князем мы ведаем ужо з часоў Вітаўта; магчыма, што з сярэдзіны XV ст. гэтую практыку пераняла таксама знаць. На жаль, гэтая «дробная дакументацыя», што не трапіла ў Літоўскую Метрыку, па ўсёй верагоднасці, назаўсёды страчана.

Акрамя вотчынных двароў, літоўская знаць ужо з канца XIV ст. пачала абасноўвацца ў Вільні, што рабілася сталіцай дзяржавы. Неабходнасць мець двор у Вільні была абумоўлена практычнымі патрэбамі і прэстыжам. Дом ці двор побач з замкам ці нават на тэрыторыі замка тапаграфічна ілюстравалі ўплыў пана, яго адносіны з гаспадаром. У прывілеі Ягайлы 1387 г. віленскаму біскупу згадваецца сад Андрэя Гаштаўта ля замка[181]. Уладанне ля замка меў таксама іншы ўплывовы пан часоў Вітаўта Альберт Манівід[182]. Пасол імператара Святой Рымскай імперыі Жыгімонта Бенедыкт Макра, які ў 1413 г. судзіў

[180] Наданне князя Аляксандра Уладзіміравіча Міцьку Іванавічу Гушчу (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 25 / Parengė D. Antanavičius ir A. Baliulis. Vilnius, 1998. P. 113). Дачка Яна Гаштаўта Марыя выйшла замуж за Сямёна, сына Аляксандра Уладзіміравіча.

[181] KDKW. S. 5.

[182] Тамсама. S. 744.

справу з Ордэнам, напісаў адзін дакумент у доме Чупурны, што знаходзіўся ў віленскім замку[183]. Знаходжанне прадстаўнікоў знаці ў галоўным палітычным месцы краіны працягвалася і пасля іх смерці. Альберт Манівід заснаваў капліцу ў віленскім замку, дзе і быў пахаваны разам са сваім братам Юрыем Гедзігоўдам[184]. У канцы XV ст. у капліцы вялікакняскага замка фундаваў алтар ваявода віленскі Алехна Судзімонтавіч. Там была пахавана яго жонка і, як можна меркаваць, месца свайго апошняга спачыну знайшоў ён сам[185]. У гэтым выпадку выбар магла абумовіць традыцыя роду — жонка Алехны Ядвіга была дачкой Яна Манівідавіча.

Як ужо гаварылася ў размове пра сістэму кіравання ў Сярэднявеччы, нельга строга аддзяліць «прыватную» і «публічную» сферы. Прадстаўнікі знаці, што выязджалі ў якасці паслоў, карысталіся нагодай упарадкаваць свае справы, як гэта ў часе пасольства 1446 г. рабіў Судзівой Валімонтавіч, спрабуючы вярнуць назад сваіх людзей, што ўцяклі ў Рагніт[186]. Адміністраванне вотчынных уладанняў і старостваў — вельмі блізкія дзеянні, што часам нават супадалі. Кіраванне было звязана не толькі з прыбыткамі, але і з выдаткамі[187]. Але выдаткі кампенсавала ўзмацненне сацыяльнага прэстыжу. Даглядаць размешчаныя ў розных месцах краіны ўладанні было складана, але, з іншага боку, гэта дазваляла сфармаваць сваю ўладу на шырокай тэрыторыі, завязаць больш шчыльныя сувязі з мясцовым баярствам. Гэтыя фактары былі важнай падставай улады знаці.

Яшчэ адной прычынай мабільнасці прадстаўнікоў знаці было іх жыццё ў прызначаных месцах, далёкіх ад цэнтральных зямель — на Валыні, Падоллі, у Кіеве, Смаленску, Полацку. Кіраванне гэтымі тэрыторыямі было ганаровай справай, але яно абмяжоўвала магчымасці ўдзельнічаць у палітычным унутра-

---

[183] Lites ac res gestae... T. 2. P. 152 («in domo Czupurne in castro Wilnensi»). Падобна, што такім чынам знаць паводзіла сябе і ў іншых месцах. Напрыклад, Станька Судзівоевіч, сын старосты ковенскага Судзівоя Валімонтавіча, у 1471 г. перадаў бернардзінцам сваё ўладанне ля Ковенскага замка (KDKW. S. 311).

[184] KDKW. S. 197, 744—745.

[185] Запіс Алехны Судзімонтавіча ад 15.05.1489 г. дачкам (AGAD, dok. perg., № 6725).

[186] GStA PK, OF 15. S. 427—432.

[187] У 1484 г. Юрый Гетаўтавіч быў вымушаны прадаць некаторыя вотчынныя ўладанні віленскаму біскупу, жадаючы, акрамя іншага, атрымаць сродкі «propter expedicionem itineris et servitutis regialis et terrestris» (KDKW. S. 395).

ным жыцці краю і ўскладняла догляд за вотчыннымі землямі. Тым не менш, ажыццяўленне адміністрацыйных функцый у адносінах да вялікіх і нярэдка багатых зямель давала арыстакратам магчымасці весці рэпрэзентатыўны стыль жыцця. Ужо ў 1421 г. англійскі і французскі пасол Жыльбер дэ Лануа апісаў прыём у старосты падольскага Гедзігоўда[188]. Яшчэ больш падрабязнае апісанне пакінуў пасол Венецыі Амброзіё Кантарыні, які быў у Кіеве ў 1474 г. Ваявода кіеўскі Марцін Гаштаўт, відаць, засвоіў прыняты на каралеўскім двары цырыманіял прыёму ганаровых паслоў. Прыезджых сустрэлі дасланыя ваяводам дваране (*gentilhuomini*), якія суправадзілі іх на абед у рэзідэнцыю пана ў замку. Там казалі вітальныя прамовы, абменьваліся дарамі. Важна адзначыць, што ваявода абедае ў атачэнні мясцовых баяраў і святароў, згаданыя нават музыкі[189].

Не будучы ў стане самастойна выканаць заданні і абавязкі, якіх станавілася ўсё больш, прадстаўнікі знаці ўсё часцей выкарыстоўвалі сваіх паслоў[190]. Імі рабіліся слугі, нярэдка баярскага паходжання, якія жылі ў дварах паноў. Некаторыя з гэтых слуг суправаджалі прадстаўнікоў знаці ад самога юнацтва: разам са сваімі панамі яны прысутнічалі на каралеўскім двары[191]. Такім чынам, пад уплывам гаспадарскага двара ствараласа структура двароў арыстакратаў. Насельніцтва такога двара можна падзяліць на некалькі груп. Перш за ўсё — родзічы знатных паноў, якія па розных прычынах выбралі жыццё пад апекай больш магутнай асобы. Як ужо казалася ў папярэднім раздзеле, апекаванне родзічамі, што не маглі паклапаціцца пра сябе, было адным з асноўных сацыяльных абавязкаў асобы. Другая група — высакародныя, што служылі пры двары[192]. Як і ў выпадку з дваром гаспадара, служба тут таксама нярэдка была неад'емна звязана з паняццем выхавання. Пра гэта распавядае

[188] Klimas P. Ghillebert de Lannoy. Dvi jo kelionės Lietuvon Vytauto Didžiojo laikais (1413—1414 ir 1421 metais). Kaunas, 1931. P. 65—66.

[189] Contarini A. Viaggio in Persia... Гл. 3.

[190] Напрыклад, паслы Міхаіла Кезгайлавіча і Марціна Гаштаўта да караля згадваюцца ў кнізе каралеўскіх выдаткаў (Rachunki królewskie z lat 1471—1472... S. 120, 121).

[191] Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102 (слуга Яна Іллініча Мішка); Rachunki królewskie z lat 1471—1472... S. 264 (слуга каралеўскага пакаёвага Іллініча, верагодна Юрыя, Андрэй).

[192] Падрабязней пра баяраў, што служылі ў маёнтках знаці гл. у раздзеле «Характар улады знаці».

гісторыя жыцця князёўны Марыны Горскай. Яшчэ ў юнацтве бацька аддаў яе ў дом жонкі Марціна Гаштаўта Ганны, па словах яе самой, «для выхавання і службы» (*ку выхованью и ку служ-бе*). Можна меркаваць, што там яна пасябравала з Эльжбетай, дачкой Гаштаўта. У кожным разе, калі Эльжбета выйшла замуж за Яна Мікалаевіча Радзівіла, разам з ёй у маёнтак яе мужа перасялілася і згаданая Марына. Калі Эльжбета памерла, Марына жыла ў свякрові Эльжбеты — жонкі Мікалая Радзівілавіча[193]. Трэцюю групу складалі слугі ніжэйшага паходжання і рамеснікі. З іх вылучаліся сакольнічыя, што сустракаюцца нават сярод асоб, якіх адорваў гаспадар[194]. У жыцці знаці паляванне займала значнае месца. Гэта быў папулярны спосаб бавіць час, а з прычыны манаполіі вышэйшага стану на паляванне — і пэўны сродак зацвярджэння сацыяльнага статусу. Нагадаем, што ордэнскія магістры, якія ў сваёй палітыцы шырока прымянялі практыку дарэння сокалаў, дасылалі іх і прадстаўнікам літоўскай знаці[195].

Асобна трэба згадаць святароў і пісараў, што жылі ў маёнтках знаці. Дзякуючы спрыяльнай сітуацыі з касцёльнымі крыніцамі мы маем параўнальна шмат інфармацыі пра касцёлы і капліцы, пабудаваныя ў маёнтках знаці. Літоўская знаць, несумненна, была знаёма з хрысціянствам яшчэ да хросту Літвы, таму поспехі хрысціянізацыі прадстаўнікоў гэтай сацыяльнай групы былі вельмі выразнымі. Невыпадкова, першымі вядомымі пісьмовымі дакументамі ўплывовых літоўскіх паноў былі наданні Касцёлу. У XV ст. многія знатныя роды ў сваіх вотчынных уладаннях мелі касцёлы і капліцы, падтрымлівалі каталіцкія (перш за ўсё францішканскія і бернардзінскія) кляштары і праваслаўныя манастыры[196]. Капліца пры двары вялікага князя была важнай часткай рэлігійнага жыцця і прыдворнай культуры, следам за гаспадаром сваіх капеланаў выбіралі таксама прадстаўнікі знаці. Прыдворныя капліцы былі найбольш прыдатным месцам для выяўлення іх пабожнасці. У дакуменце Конрада Кучука 1436 г. як

---

[193] Lietuvos Metrika. 8-oji Teismų bylų knyga / Parengė S. Lazutka, I. Valikonytė ir N. Šlimienė. Vilnius, 1999. P. 92.

[194] РИБ. Т. 27. С. 276, 295 (наданне Казіміра сакольнічым Алехны Судзімонтавіча Дзедзеву і Мікалаю).

[195] GStA PK, OF 16. S. 1154 (у 1446 г. вялікі магістр падараваў Яну Гаштаўту двух сокалаў).

[196] Сабраны матэрыял пра фундацыйную дзейнасць знаці змешчаны ў прасапаграфічным спісе.

сведка выступае яго духоўнік, францішканскі манах Станіслаў[197]. У 1439 г. папа дазволіў Аляксандру Монтаўту і ўдаве Яна Няміры Ганне выбраць сабе духоўніка[198]. Па некалькі капеланаў мелі Пётр Сенька Гедзігоўдавіч, Марцін Гаштаўт, Алехна Судзімонтавіч[199]. З ростам патрэбы ў пісьмовай дакументацыі і камунікацыі гэтыя святары, звязаныя з маёнткам, пачалі выконваць і функцыі пісараў. Акрамя іх, у крыніцах сустракаюцца і «прафесійныя» пісары знаці. Сваіх пісараў мелі Ян Гаштаўт, Міхаіл Кезгайлавіч, Альберт Янавіч Манівід, Марцін Гаштаўт, Мікалай Радзівілавіч, Станька Касцевіч[200]. Ян Кезгайлавіч, відаць, меў двух асобных — рускага і нямецкага — пісараў[201]. Другім, верагодна, быў выхадзец з тэрыторыі Ордэна, з якім Кезгайлавіч падтрымліваў шчыльныя сувязі. Тым не менш, такое маглі дазволіць сабе толькі нямногія прадстаўнікі знаці, таму родзічы «пазычалі» пісараў адзін аднаму. Напрыклад, дакумент Яна Іллініча 1467 г. склаў «дзяк пані Алехнавай» (несумненна, яго сястры, жонкі Алехны Давойнавіча)[202].

Важная роля хрысціянскіх каштоўнасцей у жыцці знаці адлюстроўваецца не толькі ў фундацыйных дакументах, якія пісаліся паводле ўжо даўно выпрацаваных хрысціянскай традыцыяй фармуляраў і дастаткова рэдка раскрываюць індывідуальныя рысы пабожнасці фундатараў. Нашмат больш цікавыя хрысціянскія матывы сустракаюцца ў яшчэ нешматлікай прыватнай карэспандэнцыі знатных паноў. Староста жамойцкі Ян Кезгайлавіч у сваім лісце да вялікага магістра Ордэна, напісаным у пачатку 1484 г., адзначае, што ў выпадку неабходнасці ён гатовы браць удзел у паходзе магістра супраць паганства (*hadenschoft*), бо хрысціянства моцна сасла-

[197] KDKW. S. 166.

[198] Bullarium Poloniae... 5. S. 286.

[199] У тэстаменце Пятра Сенькі Гедзігоўдавіча 1451 г. сведкамі выступаюць яго капеланы Якуб і Міхаіл (AGAD, dok. perg., № 7310), у дакументах 1459 і 1462 г. сведкам быў алтарнік Судзівоя Валімонтавіча Мацей (KDKW. S. 255, 275), 1474 г. — ксёндз хажоўскага маёнтка Алехны Судзімонтавіча Ян («plebano nostro Chozovyensi») (AGAD, dok. perg., № 6725).

[200] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 25... P. 113; Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 41, 82; Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 84; KDKW. S. 267; MAB RS. F 256—2275.

[201] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 76; АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 17; GStA PK, OBA 16948.

[202] Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 138.

бела і нельга дазваляць яму слабець далей[203]. У канцы ліста ён яшчэ раз сцвярджае, што ён добры хрысціянін і хоча паводзіць сябе па-хрысціянску. Праўда, гэтыя яго заявы робяцца больш зразумелымі ў кантэксце тагачасных канфліктаў вакол кандыдатуры рыжскага арцыбіскупа. З іншага ліста Яна Кезгайлавіча робіцца зразумелым, што папа даручыў літоўскім панам дапамагаць арцыбіскупу выконваць свае абавязкі, і з гэтай прычыны ўзнікла спрэчка з магістрам Лівоніі[204]. Такія папскія лісты да літоўскай знаці не былі навіною. Яшчэ ў 1443 г. папа Яўген IV звярнуўся да ваяводы віленскага Яна Даўгерда з пытаннем пра вызваленне мітрапаліта Ісідора з маскоўскага палону[205]. У 1482 г. папа Сікст IV адрасаваў сваё брэве наконт крыжовага паходу супраць туркаў ваяводам віленскаму і троцкаму Алехну Судзімонтавічу і Марціну Гаштаўту[206].

Нягледзячы на тое, што большая частка літоўскіх паноў была каталікамі, многія з іх у паўсядзённым жыцці сутыкаліся са складанай і разнастайнай канфесійнай сітуацыяй у ВКЛ. Прадстаўнікі знаці, што выязджалі намеснікамі і ваяводамі ў рускія вобласці, павінны былі зжывацца з мясцовай праваслаўнай элітай. Не падобна, што з-за гэтага ўзнікалі нейкія праблемы. Шлюбы каталікоў і праваслаўных былі дастаткова частай з'явай. Некаторыя прадстаўнікі знаці рускага паходжання, скарыстаўшыся кантактамі з літоўскімі панамі, праз адаптацыю здолелі ўвайсці ў іх роды. Падобна, што менавіта такім шляхам герб Ляліва атрымалі Тышкевічы. Гэта магло адбыцца ў 1432—1440 гг., калі ў маёнтку Свідрыгайлы «на выгнанні» сустрэліся «пачынальнік» Тышкевічаў Каленік Мішкавіч, які займаў там важную пасаду, і Ян Манівідавіч, сын віленскага ваяводы Манівіда, які ў Гародлі атрымаў герб Ляліва. Літоўскія паны, што жылі на рускіх землях, не пазбягалі шчыльных сувязяў з іерархамі праваслаўнай царквы. У 1485 г. намеснік смаленскі Мікалай Радзівілавіч увайшоў у стан духоўнай роднасці са смаленскім праваслаўным епіскапам Іакімам, які стаў хросным бацькам яго сына Юрыя

[203] GStA PK, OBA 17114: «Got weis von himel, wen es kweme, das ewer groszmeichtikeit solde czin kein dy hadenschoft, wir welden selbest ewer wirdikeit gerne dinen, wen doch dy kristenheit leider genuck geswecht wirt und man sy nicht forder dorften swechen».

[204] GStA PK, OBA 16948 (ліст Яна Кезгайлавіча ад 04.02.1481 г. да вялікага магістра).

[205] Bullarium Poloniae... 5. S. 201.

[206] Elementa ad fontium editiones. Vol. 64: Brevia Romanorum Pontificum ad Poloniam spectantia (Vol. 1: Brevia saeculi XV) / Coll. et red. H. D. Wojtyska CP. Romae, 1986. P. 52.

і з гэтай нагоды падараваў апошняму маёнтак[207]. Прадстаўнікі літоўскай знаці праваслаўнага паходжання ў сваіх маёнтках заснoўвалі каталіцкія касцёлы для сваіх падданых[208]. Відавочна, што пра рэлігійнасць сваіх праваслаўных сялян павінны былі клапаціцца і паны-каталікі, што набылі маёнткі ў рускіх землях.

З самага пачатку заснавання кляштараў у Літве іх актыўна падтрымлівалі прадстаўнікі знаці. Наданні францішканскім кляштарам рабілі Манівід, Чупурна, Ян і Юрый Гаштаўты, Станіслаў Даўгайла, Конрад Кучук, Аляксандр Монтаўт; адны з першых бернардзінскіх кляштараў у Літве (у Коўне і Тыкоціне) заснавалі Станька Судзівоевіч і Марцін Гаштаўт[209]. Нярэдка прадстаўнікі знаці абіралі месца свайго вечнага спачыну ў касцёлах пры кляштарах (напрыклад, Мікалай Радзівілавіч, Якуб Ганусавіч Даўгердавіч, Альберт Кучуковіч — у бернардзінскім касцёле ў Вільні, а жонка Барташа Монтаўтавіча Юлляна — у віленскім францішканскім касцёле). Папулярнасць кляштараў манахаў-«жабракоў» цалкам зразумелая. Менавіта ў гэтых манаскіх супольнасцях на той час шырока практыкаваліся малітвы за памяць данатараў. Пахаваны ўнутры касцёла пры кляштары мог спадзявацца не толькі на тое, што ён пастаянна будзе згадвацца ў малітвах манахаў, але і на тое, што праз шторазовы «ўдзел» у імшы ён паспрыяе збаўленню сваёй душы. Часам адносіны арыстакратаў і манахаў праяўляліся ў дастаткова нечаканых формах. Напрыклад, існаваў звычай захоўваць у кляштарах свой скарб. Часцей за ўсё, скарб захоўвалі ў францішканцаў і бернардзінцаў, што мелі мураваныя закрыстыі[210].

Пасля хросту Літвы і павелічэння колькасці кантактаў з заходнім светам пачаліся падарожжы літоўскіх паноў за мяжу. Такія падарожжы, звязаныя галоўным чынам з пасольствамі вялікага князя, таксама можна інтэрпрэтаваць як удзел у жыцці гаспадарскага двара. Іх маршруты часцей за ўсё вялі ў суседнія краіны: Польшчу, Русь або Ордэнскую дзяржаву.

---

[207] AGAD, dok. perg., № 7370.

[208] Напрыклад, фундацыю касцёла у Смаргоні ў 1503 г. ажыццявіў Юрый Зяновіч (Зяноўевіч) (KDKW. S. 688—689).

[209] Дакументацыю гл. у прасапаграфіі знаці.

[210] У тэстаменце 1499 г. Юлляна Монтаўтава адзначыла, што трымае свой скарб у віленскім францішканскім касцёле. З дакумента вынікае, што яна прасіла пахаваць яе ў тым жа кляштары (KDKW. S. 546—547).

Тым не менш, некаторыя прадстаўнікі знаці дастаткова рана здзейснілі падарожжы ў яшчэ больш аддаленыя краіны[211]. У 1410 г. Ян Бутрым ездзіў да караля Чэхіі Вацлава ў Прагу. У часе гэтага падарожжа ён мог знайсці службу для сына Юрыя, які, паводле Яна Длугаша, у юнацтве доўгі час жыў за мяжой. У 1411 г. Юрый Гедзігоўд разам з польскімі пасламі ездзіў у Венгрыю, у 1416 г. той жа Гедзігоўд і Юрый Гайлімін удзельнічалі ў Канстанцкім царкоўным саборы. У 1419—1430 гг. прадстаўнікі маладзейшага пакалення знаці і дваране Вітаўта Сенька Гедзігоўдавіч і Шэдзібор Валімонтавіч ездзілі да імператара Святой Рымскай імперыі Жыгімонта і папы. У 1453 г. Андрэй Саковіч і Ян Неміровіч удзельнічалі ў перагаворах пра шлюб Казіміра з дачкой імператара Альбрэхта II. Альберт Янавіч Манівід у 1460 г. разам з Марцінам Гаштаўтам і польскімі шляхціцамі ездзіў на перагаворы з чэхамі, а ў 1475 г. суправаджаў каралеву Ядвігу да яе жаніха ў Баварыю[212]. Важным кірункам падарожжаў літоўскіх паноў быў Рым. Тэксты суплік да папы часта не дазваляюць дакладна сказаць, ці бывалі ў Рыме асабіста тыя, хто звяртаўся з просьбамі. Але падобна, што Станька Судзівоевіч, які ў 1469 г. аднавіў фундацыю касцёла ў Дзяволтве, асабіста наведаў папу і паклапаціўся пра абвяшчэнне касцёльных свят у Дзяволтве. Найбольш вядомае падарожжа Аляксандра Солтана, які ў 1467—1469 гг. наведаў Святую Зямлю, двары рымскага папы і шэрагу заходнееўрапейскіх манархаў[213]. У 1471 г. шляхам брата ў Рым выправіўся Ян Солтан. Пра тое, што такіх падарожжаў рабілася ўсё больш, сведчыць прывілей Казіміра 1447 г., які, акрамя іншага, дазваляў літоўскім баярам выязджаць у замежныя краіны, каб удасканальваць свае рыцарскія навыкі. У часе гэтых падарожжаў прадстаўнікі знаці мелі магчымасць паглыбіць свае веды пра еўрапейскую рыцарскую культуру, пе-

[211] Спасылкі на крыніцы таксама гл. у прасапаграфічным спісе.

[212] Пра гэта падарожжа гл. таксама ў раздзеле «Характар улады знаці».

[213] Падрабязней гл.: Trimonienė R. Vakarų Europos valdovų rekomendaciniai raštai Lietuvos didžiojo kunigaikščio Kazimiero dvariškiui: Aleksandro Soltano politinės veiklos štrichai // Lietuvos istorijos studijos. 1996. T. 3. P. 101—119; Paravicini A., Paravicini W. «Alexander Soltan ex Lithuania ritum grecorum sectans». Eine ruthenisch-polnische Reise zu den Höfen Europas und zum Heiligen Land 1467—1469 // Zwischen Christianisierung und Europäisierung: Beiträge zur Geschichte Osteuropas in Mittelalter und Früher Neuzeit. Festschrift für Peter Nitsche zum 65. Geburtstag / Hrsg. v. E. Hübner, E. Klug, J. Kusber. Stuttgart, 1998. S. 367—401.

раймаць новыя формы гэтай культуры, а магчыма, і завязваць кантакты, якімі ўжо ў XVI ст. скарыстаюцца іх нашчадкі. Яшчэ больш шырокае кола асоб сутыкалася з заходняй арыстакратыяй у самой Літве, куды з часоў Вітаўта прыязджалі рыцары з розных еўрапейскіх краін[214]. Колькасць такіх падарожжаў не зменшылася і пасля смерці Вітаўта. Напрыклад, у рэкамендацыйных лістах 1446 г. магістра Ордэна да вялікага князя Казіміра і ваяводы віленскага Яна Гаштаўта згадваюцца высакародныя рыцары Ганс Маршалк і Еніх з Таргавіцы, што мелі намер наведаць двор гаспадара Літвы, двары іншых паноў і князёў, каб папрактыкавацца ў рыцарскіх навыках: *Die edelen und vesten Hans Marschalk und Jenichen von Tergouitz... haben liebe und lust und sint geneiget euwer grosmechtikeit und anderen heren und fursten hoeffe, landt und gegenaten zcu besushen, sich darinne zcu sehen und ritterschaft zcu uben*[215]. Пра жыццё такіх вандроўнікаў у Літве амаль нічога невядома. Але няцяжка ўявіць, што ранняя літоўская знаць, якая дзякуючы такой камунікацыі ўлівалася ў шэрагі еўрапейскага рыцарства і пераймала яго лад жыцця, у значнай ступені паўплывала на трансфармацыю літоўскага грамадства.

[214] Адзін з найбольш цікавых выпадкаў — прыезд іспанца Альфонса Мудары на двор Вітаўта ў 1412 г. (пра гэтага кастыльскага рыцара і яго падарожжа гл.: Paravicini W. Fürschriften und Testimonia. Der Dokumentationskreislauf der spätmittelalterlichen Adelsreise am Beispiel des kastilischen Ritters Alfonso Mudarra 1411—1412 // Studien zum 15. Jahrhundert. Festschrift für Erich Meuthen / Hrsg. v. J. Helmrath und H. Müller. Bd. 2. München, 1994. S. 903—936).

[215] GStA PK, OF 16. S. 1152—1154.

IV. УЛАДА ЗНАЦІ

1. УРАДНІКІ

У гістарыяграфіі замацавалася тэорыя пра «службовы» характар літоўскага баярства, згодна з якой прыналежнасць да эліты ўлады Вялікага Княства Літоўскага XV ст. была абумоўлена займанням пэўных свецкіх ці духоўных пасад[1]. У раздзелах гэтай працы, прысвечаных паходжанню і структуры знаці, я імкнуўся паказаць, што высокае сацыяльнае і палітычнае становішча літоўскага баярства было абумоўлена ў першую чаргу паходжаннем, а тут хачу больш уважліва разгледзець, якое месца ў структуры ўлады канца XIV — пачатку XV ст. займалі ўраднікі. Спачатку звернем увагу на фармаванне сістэмы пасад у Літве і некаторыя яе асаблівасці. Падрабязны аналіз сістэмы пасад у Літве XV ст. запатрабаваў бы асобнага даследавання. У гэтай працы яна разглядаецца настолькі, наколькі таго вымагае асноўная тэма даследавання — падставы ўлады ўраднікаў.

а) Фармаванне сістэмы ўрадаў

У канцы XIV — першай палове XV ст. сістэма пасад у Літве толькі складвалася. Лакальныя ўраднікі былі вядомыя і раней, напрыклад, вяленскі староста Гаштаўт — 1364 г.[2], віленскі староста (*hauptmanne zur Wilde*) Дзірсун — 1365 г.[3], паштаўскі староста (*capitaneus castri Pasten*) Гірдаў — 1369 г.[4], троцкі староста (*advocatus in Trakken*) Пекста (*Pexte*) — 1377 г.[5], але адміністрацыйную структуру цэнтральнай улады пачаў

[1] Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego... S. 31—78; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami... (раздзел «Urzędniczy character elity litewskiej»). S. 76—80.

[2] SRP. Bd. 2. S. 547.

[3] Тамсама. S. 553.

[4] Тамсама. S. 565.

[5] Тамсама. S. 113.

фармаваць Вітаўт. У 1395 г. упершыню як маршалак (дворны) гаспадара (*marschalcus curie*) згадваецца Чупурна[6]. У 1407 г. той жа Чупурна выступае як вялікі (земскі) маршалак (*marschalcus terre Lithwanie*)[7]. У 1398 г. у крыніцах з'яўляецца канюшы дворны (*pferdemarschalk*) Ян Няміра[8], у 1409 г. — чашнік дворны (*pincerna curie*) Судзімонт і кухмістр (*magister coquine*) Мікалай[9], у 1410 г. — падчашы (*subpincerna*) Алехна Манцігердавіч[10], у 1413 г. — харужы земскі літоўскі (*vexillifer terre Lithuanie*) Станіслаў Даўгайла[11], у 1428 г. — найвышэйшы пакаёвы / падкаморый (*supremus cubicularius*) Юрый Струміла[12], у 1429 г. — падскарбі (*thesaurarius*) — той жа Юрый Струміла[13]. Дарэчы, апошні выпадак паказвае, што на літоўскім двары, як і на многіх іншых дварах Заходняй Еўропы ў ранняй фазе іх развіцця, функцыі пакаёвага / падкаморыя і падскарбія супадалі. У першай палове XV ст. гэта сістэма была яшчэ вельмі неразвітая, спецыфіка пасад не была да канца зразумелай і для саміх выканаўцаў. Так, у 1409 г. у адным дакуменце Чупурна называецца маршалкам земскім, а ў іншым «прыніжаецца» да маршалка дворнага[14]. Праўда, неабходна адзначыць, што пасада маршалка лягчэй за ўсё прыжылася пры двары гаспадара. Маршалак гаспадара быў найважнейшым прыдворным ураднікам, які, акрамя рэпрэзентацыйных, выконваў некаторыя адміністрацыйныя і судовыя функцыі. Пасада маршалка была вельмі шчыльна звязана з асобай манарха. З той прычыны, што гэтая сістэма дазваляла гаспадару адначасова мець некалькі маршалкаў (у часы Казіміра Ягелончыка іх было амаль 30), яны нярэдка спалучалі пасады маршалка з адміністраваннем староствамі. Скажам

---

[6] Urzędnicy centralni... S. 80; Vitoldiana... S. 19.

[7] Тамсама. S. 72. Гл.: Korczak L. Marszałkowie ziemscy w Wielkim Księstwie Litewskim w XV wieku // Cracovia — Polonia — Europa. Studia z dziejów średniowiecza ofiarowane Jerzemu Wyrozumskiemu w 65-rocznicę urodzin i 40-lecie pracy naukowei. Kraków, 1995. S. 373—376.

[8] Urzędnicy centralni... S. 54; Die Staatsverträge des Deutschen Ordens in Preußen im 15. Jahrhundert. T. 1. S. 12.

[9] Urzędnicy centralni... S. 33, 62; Vitoldiana... S. 74.

[10] Тамсама. S. 30.

[11] Kamieniecki W. Chorążowie z parlamentaryzmie litewskim przed unią lubelską // Antemurale. Romae, 1965. S. 174; Lites ac res gestae... T. 2. P. 136.

[12] Urzędnicy centralni... S. 149; Vitoldiana... S. 13.

[13] Urzędnicy centralni... S. 155; Vitoldiana... S. 105.

[14] Vitoldiana... S. 28, 73—74.

некалькі слоў пра паходжанне гэтай пасады. У XIV ст. урад маршалка з Нямеччыны праз Чэхію прыйшоў у Польшчу. На гэты момант слова ўжо страціла свой першапачатковы сэнс (*marescalcus* — канюшы) і абазначала асобу, што распараджалася прыдворнымі справамі[15]. Менавіта такая кампетэнцыя маршалка ад самых пачаткаў замацавалася ў Літве. Яшчэ ў часы Вітаўта пачалі дастаткова дакладна раздзяляць пасады маршалка земскага і маршалка гаспадарскага. Цяжка сказаць нешта больш канкрэтнае пра адрозненне іх функцый у той час. Падобна, што літоўскім земскім маршалкам рабіўся найбольш паважаны з маршалкаў гаспадара, якіх звычайна было некалькі. Дарэчы, часам і сярод іх існавала пэўная іерархія, калі вылучаўся найвышэйшы маршалак гаспадара[16]. Свайго найвышэйшага маршалка меў таксама зрынуты Свідрыгайла[17].

Прыдворныя пасады падскарбія, чашніка, пасцельнічага і інш. сустракаюцца спарадычна[18]. Да ўжо згаданых урадаў двара Казіміра можна дадаць яшчэ мечніка[19]. Рэгулярна згадваюцца толькі сакратары, якія вылучаліся сваёй адукацыяй і ажыццяўлялі разнастайную дзейнасць (падрыхтоўка дакументаў, пасольствы і інш.).

У пачатку панавання Казіміра ўпершыню сустракаюцца канцлеры: у 1441 г. Судзівой Валімонтавіч[20]; у 1444 г. — яго пляменнік Міхаіл Кезгайлавіч[21]. Неўзабаве ўзнікае і пасада кіраўніка войска. У гістарыяграфіі сцвярджаецца, што пасада гетмана была створаная каля 1497 г., і першым гетманам стаў князь Канстанцін

---

[15] Halbach U. Der russische Fürstenhof vor dem 16 Jh. Eine vergleichende Untersuchung zur politischen Lexikologie und Verfassungsgeschichte der Alten Rus'. Stuttgart, 1985. S. 27, 277.

[16] Адзін з аўтараў ліста літоўскіх паноў да магістра Ордэна ад 22.11.1474 г. Станіслаў Судзівоевіч «koniglicher gnadin oberste marschalk» (CEXV. T. 3. S. 213).

[17] 23.11.1433 г. Свідрыгайла дасылае на перагаворы паміж Ордэнам і Польшчай свайго «obersten marschall» Юрыя Пецькавіча (Die Berichte der Generalprokuratoren des Deutschen Ordens an der Kurie. 4 / Bearb. v. K. Forstreuter und H. Koeppen. Göttingen, 1976. S. 650).

[18] Гл.: Urzędnicy centralni..., а таксама спіс ураднікаў у гэтай працы.

[19] Каля 1482 г. у ордэнскім запісе згадваецца «hern Stenczil Littuwischen swertfurer» (Acten der Ständetage Preussens unter der Herrschaft des Deutschen Ordens / Hrsg. v. M. Töppen. Bd. 5. Leipzig, 1886. S. 383).

[20] Urzędnicy centralni... S. 51; KDKW. S. 191.

[21] Urzędnicy centralni... S. 51; KDKW. S. 204.

Астрожскі[22]. Але наўрад ці факт такога «стварэння» меў месца. Пастаянны ўрад гетмана паступова развіўся з часова прызначаных ваенных кіраўнікоў, і толькі ў другой палове XVI ст. гетмана пачалі прызначаць пажыццёва. Такі характар гэтай пасады добра адлюстроўвае паходжанне слова «гетман». У славянскія мовы (чэшскую, польскую, рускую) яно прыйшло са старанямецкай мовы ад слова *hauptman, hovetman* (у самым агульным значэнні — «кіраўнік»)[23]. Адзін з аўтараў ліста літоўскіх паноў да вялікага магістра Ордэна ад 28 траўня 1455 г. — *doctor supremus exercitus* («найвышэйшы ваенны кіраўнік») Андрэй Саковіч[24]. У лісце вялікага магістра Ордэна да магістра Лівоніі ад 8 лютага 1493 г. згадваецца «дворны і ваенны кіраўнік» вялікага князя літоўскага Дабрагост Нарбутавіч[25]. Асабліва цікавы першы выпадак. Найвышэйшым кіраўніком войска літоўскага ў інтытуляцыі афіцыйнага дакумента названы адзін з найбольш уплывовых тагачасных прадстаўнікоў знаці Вялікага Княства Андрэй Саковіч. У пазнейшых дакументах ён гэтак ужо не тытулуецца, але ў 1455 г. назва яго пасады гучыць амаль ідэнтычна назве пасады Канстанціна Астрожскага ў 1497 г.

Структура мясцовых пасад была больш развітай у параўнанні з цэнтральнай. Прыклад Вільні, Трокаў і Вялены паказвае, што сістэма XV ст. часткова магла быць спадчынай папярэдняга стагоддзя. Уведзеныя ў 1413 г. у Гародлі пасады віленскага і троцкага ваявод ды каштэлянаў толькі замянілі старостаў гэтых акруг. У 1415 г. магістр Ордэна працягвае адрасаваць лісты віленскаму старосту (*houptman*) Манівіду[26]. У 1409 г. упершыню згадваецца староста жамойцкі (*houbtman czu Samaithen*) Румбоўд[27]. Намеснікі вялікіх зямель (напрыклад, Кіеўскай, Смаленскай, Полацкай, Віцебскай, Наваградскай) з цягам часу сталі ваяводамі. Меншымі адміністрацыйнымі структурамі кіравалі старосты або намеснікі.

[22] Напрыклад: Avižonis K. Rinktiniai raštai. T. 4. Vilnius, 1994. P. 117. Параўн.: Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami... S. 99 (тытул Канстанціна Астрожскага ў 1497 г. — «supremus campiductor magni ducatus Lituanie»).

[23] Brückner A. Słownik etymologiczny języka polskiego. Warszawa, 1974. S. 171.

[24] GStA PK, OBA 13725.

[25] GStA PK, OF 18b. S. 147: «des irluchsten groszfursten in Littauwen hoffsdyner und felthouptmann.»

[26] CEV. S. 327.

[27] Тамсама. S. 183.

У кампетэнцыі мясцовых ураднікаў знаходзілася адміністраванне маёнткамі вялікага князя, выкананне судовых функцый, захаванне міру. Яны былі прадстаўнікамі гаспадара і павінны былі клапаціцца пра яго інтарэсы.

Але сістэма мясцовых ураднікаў таксама была дастаткова супярэчлівай. Згодна са справядлівай заўвагай Збыслава Вайтковяка, праблемы выклікала сама тытулатура ўраднікаў[28]. У гістарыяграфіі адсутнічае пераканаўчы разгляд суадносінаў паняццяў «староста» і «намеснік». На думку Любаўскага, паняцце старосты пазнейшае, чым намесніка. Яно было запазычана з Польшчы і спачатку доўга выкарыстоўвалася, каб характарызаваць толькі кіраўнікоў найбуйнейшых цэнтраў[29]. Але больш уважлівы аналіз тэрміналогіі крыніц не пацвярджае гэтай высновы Любаўскага. Разглядаючы тагачасную тэрміналогію, неабходна браць пад увагу некалькі асаблівасцей моўнай сітуацыі. Перш за ўсё, трэба зважаць на неадпаведнасць размоўнай і пісьмовай моў у Літве і на звязаную з гэтым праблемнасць «перакладу». Акрамя таго, у тагачасным ВКЛ выкарыстоўвалася па меншай меры некалькі пісьмовых моў, паняцці якіх былі абумоўлены гісторыяй кожнай з іх. У лацінскіх дакументах канца XIV — першай паловы XV ст. мясцовы ўраднік часцей за ўсё называецца словам *capitaneus* (часам *tenutarius*), у нямецкіх — *hauptmann*, у рускіх — *наместник*. Нельга ўбачыць ніякага храналагічнага «першынства». Той факт, што ў канцы XIV — сярэдзіне XV ст. у ВКЛ дакументы ці лісты часцей за ўсё пісаліся па-лацінску ці па-нямецку, вызначыла прыярытэтнае ўжыванне паняццяў *capitaneus* / *hauptmann*. У першай палове XVI ст. у рускіх крыніцах паняцце старосты (*староста*) выціскае паняцце намесніка (*наместник*)[30]. Тут сапраўды можна казаць пра польскі ўплыў, але ў пытанні «першаснага» тытула мясцовага ўрадніка гэта эвалюцыя ні пра што не сведчыць. Таму, у адрозненне ад Вайтковяка, які схільны называць ураднікаў XV ст. толькі намеснікамі, я мяркую, што роўна гэтак жа абгрунтавана можна ўжываць паняцце старосты.

Ранняя сістэма мясцовых урадаў у ВКЛ была супярэчлівай таксама з іншага пункту гледжання. Некаторыя прыклады

[28] Wojtkowiak Z. Urzędnicy zarządu lokalnego na Litwie... S. 139.

[29] Любавский М. К. Областное деление и местное управление... С. 64—67.

[30] Wojtkowiak Z. Urzędnicy zarządu lokalnego na Litwie... S. 141—144.

паказваюць, што адначасова адну і тую ж пасаду маглі займаць некалькі чалавек. Напрыклад, з 1398 г. па 1423 г. старостам ковенскім быў Ян Суйгайла, але ў адным дакуменце пачатку XV ст. сцвярджаецца, што Вітаўт прызначыў старостам ковенскім пляменніка Чупурны Гінтаўта[31], а ў 1418 г. ковенскім старостам тытулуецца Шэдзібор Валімонтавіч[32]. У перагаворах 4–5 траўня 1431 г. з вялікім магістрам удзельнічае староста ковенскі Судзівой Валімонтавіч[33], у той жа час, у лісце мемельскага комтура да вялікага магістра (лістапад 1432 г.) старостам ковенскім ізноў названы яго брат Шэдзібор[34]. Падобна, што абодва браты займалі гэтую пасаду адначасова, а ў канцы 1432 г., пасля змовы Валімонтавічаў, Жыгімонт Кейстутавіч пазбавіў іх яе[35]. Цікава, што ў 1447 г., ужо ў часы панавання Казіміра, Судзівой вярнуўся на гэтую пасаду[36].

Цяжка сказаць, ці існавала іерархія такіх старостаў, але градацыя старостаў жамойцкіх у сярэдзіне XV ст. дазваляла б на гэтае пытанне адказаць станоўча[37]. Аналагічныя выпадкі сустракаюцца і ў іншых месцах. Напрыклад, 9 траўня 1451 г. Казімір дае рэкамендацыю *generoso Iwassko Sakowycz vicesgerenti in curia nostra Wilkynyssky*, які выехаў да вялікага магістра Ордэна[38]. Такіх выпадкаў магло быць і болей, але на той час гэта былі хутчэй выключэнні, звязаныя з нейкімі асаблівымі даручэннямі вялікага князя. Цікава, што *vicesgerens* у крыніцах часам атаясамліваецца

[31] GStA PK, OBA 28512.

[32] CEV. S. 413.

[33] GStA PK, OBA 5636 («her Sudywoy woywode czu Kauwen»).

[34] GStA PK, OBA 6896 («Schedebar hoptman von Kaywen»). У вопісе дакумента пазначана дата 1434 г., але з тэксту вынікае, што ліст быў напісаны ў 1432 г.

[35] GStA PK, OBA 6312: канец ліста не захаваўся, таму дакладная дата, аўтар і адрасат невядомыя. Па некаторых звестках з крыніц можна меркаваць, што гэта ліст да вялікага магістра Ордэна, які ў канцы 1432 г. пісаў рагніцкі комтур. У ім сцвярджаецца, што Жыгімонт прызначыў новага ковенскага старосту (хутчэй за ўсё, Гінейта) («hertczog Segemunt, der newe grosfurste, hot eynen newen houbtman gesant kegen Cauwen») і цытуюцца размовы нямецкіх купцоў з Судзівоем і Шэдзіборам.

[36] LUB. Bd. 10. S. 273.

[37] У сярэдзіне XV ст. у Жамойці адначасова выконвалі свае абавязкі некалькі старостаў. Напрыклад, у дакуменце ад 08.08.1452 г. выступаюць «obirsterhouptmann» Ян Кезгайлавіч і «houptmann» Контаўт (Index corporis historico-diplomatici Livoniae, Esthoniae, Curoniae / Ed. C. E. Napiersky. Tl. 2. Riga—Dorpat, 1835. S. 16. № 1890). Падрабязней гл.: Rowell S. C. Rusena karas Žemaičiuose... P. 9—11.

[38] GStA PK, OBA 10693.

з «намеснікам»[39]. Дарэчы, тут мог мецца на ўвазе «намеснік намесніка (ваяводы)»[40]. Відавочна, што тытул «намесніка» быў шматзначны, таму нядзіўна, што ад пачатку XVI ст. ён усё болей выціскаецца таксама з рускіх дакументаў. З другой паловы XV ст. можна заўважаць тэндэнцыю да «здрабнення» гэтага паняцця. У рускіх дакументах пачынаюць блытацца паняцці намесніка і цівуна[41]. Між іншым, нямецкія крыніцы дазваляюць убачыць яшчэ адно тонкае тэрміналагічнае адрозненне. 1 красавіка 1506 г. староста жамойцкі Станіслаў Янавіч Кезгайлавіч у лісце да вялікага магістра, каб ахарактарызаваць свайго намесніка, выбірае паняцце *stadhelder* (намеснік)[42], што яшчэ больш узмацняе абгрунтаванасць перакладу «*capitaneus / hauptmann* = староста». Паняцце «намеснік» прадугледжвае безумоўны аўтарытэт вялікага князя ў адносінах да ўрадніка[43], але суадносіны ўлады вялікага князя і прадстаўніка мясцовай знаці, як мы ўбачым, былі больш складанымі. Таму паняцце «староста» больш адэкватнае для тагачаснай сацыяпалітычнай рэчаіснасці.

Структура мясцовай улады ў XV ст. была яшчэ вельмі простай, крыніцы толькі ў вельмі рэдкіх выпадках згадваюць падданых старостам ураднікаў. Таму паўстае пытанне пра падставы ўлады старостаў.

---

[39] Дакумент ад 26.09.1479 г. выдадзены са сведчаннем «domino Ivaszko tunc existente vicegerens alias namyeszthnykyem in Nova Throky» (KDKW. S. 371). 29.02.1476 г. згадваецца таксама «vicegerens» віленскага замка Альберт (Тамсама. S. 352), а 15.05.1489 г. — «Sdanus Woythowycz vicesgerens» Vilnensis (AGAD, dok. perg. № 6725).

[40] Напрыклад, «наместникъ Виленский пана воеводы Виленского Богданъ Кевлан» (дакумент вялікага князя Аляксандра ад 29.04.1495 г. — РИБ. Т. 27. С. 599). Для адрознення намеснікаў рознага ўзроўню часта ўжываецца памяншальнае слова «наместничокъ» (РИБ. Т. 20. Санкт-Петербург, 1903. С. 135, 414, 858). Пра такіх намеснікаў гл.: Любавский М. К. Областное деление и местное управление... С. 663, 771—772.

[41] Напрыклад, у канцы XV ст. Станіслаў Дукурна, які кіраваў Крэвам, называецца і намеснікам (AGAD, dok. perg., № 7381), і цівуном (РИБ. Т. 27. С. 770). Неабходна адзначыць, што ў лацінскім дакументе ён названы нязвыклым тэрмінам «procurator» (KDKW. S. 423 — дакумент з'яўляецца фальсіфікатам, але, несумненна, грунтуецца на арыгінале; спіс сведак не выклікае падазрэння).

[42] GStA PK, OBA 19099.

[43] Паняцце «намеснік» цалкам прыдатнае для характарыстыкі кіраўнікоў буйных рускіх тэрыторый. У гэтым разе цяжка казаць пра магчымую сувязь літоўскіх ураднікаў з гэтымі землямі. Характэрна, што ў адным нямецкім лісце 1400 г. намеснік полацкі названы словам «namesnik» (LUB. Bd. 6. S. 317).

б) Вялікі князь і род: падвойная прырода старостваў

Прызначэнне ўраднікаў было правам вялікага князя. Па сутнасці, тут гаспадара не абмяжоўвалі ніякія прававыя нормы, за выключэннем таго, што, паводле прывілея Аляксандра 1492 г., ён меў радзіцца з панамі-радай. Акрамя таго, Гарадзельскі прывілей (1413 г.) не дазваляў прызначаць на найвышэйшыя пасады некаталікоў, а прывілей Казіміра (1447 г.) — чужаземцаў. Акрамя гэтых прававых нормаў, выбар гаспадара абмяжоўвала нямала моцных, хоць нідзе адкрыта не зафіксаваных звычаяў. Перш за ўсё, найбольш важныя пасады заўсёды займалі толькі асобы самага высакароднага паходжання. Знаць замацавала практыку злучэння некалькіх урадаў у адных руках. Сфармавалася традыцыя паступовага ўзвышэння па ўрадах (ад ніжэйшых цэнтральных і тэрытарыяльных да найвышэйшых). Спіс ураднікаў канца XIV—XV ст.[44] сведчыць, што існавала карэляцыя паміж персаналіямі ўраднікаў і роднаснымі сувязямі.

Канцлера Судзівоя Валімонтавіча замяніў на гэтай пасадзе яго пляменнік Міхаіл Кезгайлавіч. Маршалкамі земскімі былі Румбоўд Валімонтавіч, яго пляменнік Станька Судзівоевіч і іх родзіч Марцін Гаштаўт; таксама Пётр Манцігердавіч і яго ўнук Пётр Янавіч Манцігердавіч.

Гэта залежнасць асабліва характэрна для лакальных урадаў. Першага ваяводу віленскага Альберта Манівіда пасля смерці замяніў яго брат Юрый Гедзігоўд. Гэтая паслядоўнасць перапынілася, калі Гедзігоўд перайшоў на бок Свідрыгайлы. У 1443 г. ваяводам стаў Ян Гаштаўт, які працягнуў традыцыю свайго роду — у 1387 г. віленскім старостам быў яго бацька Андрэй[45]. Калі Ян Гаштаўт памёр, пасаду ваяводы «вярнулі» сабе Манівіды (Ян Манівідавіч). Потым ім быў Міхаіл Кезгайлавіч, адна сястра якога выйшла замуж за Яна Гаштаўта[46], а другая — за Пятра Сеньку Гедзігоўдавіча[47]. Жонкамі перадапошняга і апошняга віленскіх ваяводаў XV ст. Алехны Судзімонтавіча і Мікалая Радзівілавіча былі дачкі Яна Манівідавіча. Тое ж

---

[44] Гл. спіс ураднікаў у канцы кнігі.

[45] Ваявода віленскі ў 1433—1443 г. Ян Даўтерд, па ўсёй верагоднасці, быў жанаты з дачкой Андрэя Гаштаўта (Petrauskas R. Giminaičiai ir pavaldiniai... P. 117, 124).

[46] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami... S. 83.

[47] Peltz W. Ród Giedygołda i jego majętności... S. 28.

бачым і сярод кашталянаў. Імі былі (па чарзе) Мінігайла (памёр без нашчадкаў, роднасныя сувязі незразумелыя), Крысцін Осцік, Кезгайла Валімонтавіч, Пётр Сенька Гедзігоўдавіч, Судзівой Валімонтавіч, Добка Кезгайлавіч, Альберт Янавіч Манівід, Радзівіл Осцікавіч, Ян Кезгайлавіч, князь Аляксандр Юр'евіч Гальшанскі (жанаты з дачкою віленскага ваяводы Алехны Судзімонтавіча[48]).



Схема роднасных сувязяў віленскіх старостаў / ваяводаў канца XIV—XV ст.

Спіс троцкіх ураднікаў не адлюстроўвае такой выразнай тэндэнцыі. Але і тут трапляюцца паслядоўнасці родзічаў. Сын Гінівіла, першага троцкага старосты, Наць Гінівілавіч, у 1452 г. стаў троцкім кашталянам. Родзіч Яўнуса Валімонтавіча, другога старосты і першага ваяводы троцкага, Ян Гаштаўт займаў пасаду ваяводы з 1440 г. (яго сын Марцін Гаштаўт — з 1480 г.). Пасля смерці Яна Манівідавіча ваяводам быў яго родзіч (той жа герб) Ян Вяжэвіч, які быў жанаты з дачкою Судзівоя Валімонтавіча[49]. Станька Судзівоевіч стаў ваяводам троцкім у 1478 г., а ў 1490 г. ваяводам быў прызначаны Пётр Янавіч Манцігердавіч (жанаты з дачкой Яна Вяжэвіча). Ваяводамі былі таксама бацька і сын Саковічы (Андрэй і Багдан).

У гістарыяграфіі даўно заўважана, што Кезгайлы доўгі час трымалі ў сваіх руках жамойцкае староства.

Увагу прыцягвае праблема персаналій старостаў, бо тут, акрамя іншага, неабходна чакаць сувязі з геаграфічным размяшчэннем вотчын. З 1440 г. да канца стагоддзя старостамі

[48] Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. Warszawa, 1895. S. 102.
[49] Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium... S. 34; KDKW. S. 380.

анікштаўскімі былі Осцікі, што мелі свае ўладанні непадалёк[50]. У 1398 г. Крысцін Осцік першы раз тытулуецца як староста ўшпольскі. Рыгор Осцікавіч і Мікалай II Радзівіл кіравалі тут яшчэ ў 2—3 дзесяцігоддзях XVI ст., працягваючы бесперапынны ланцуг Осцікаў-Радзівілаў[51].

Вількамірскімі старостамі былі два Валімонтавічы — Кезгайла і Шэдзібор[52]. Як вядома, у гэтым павеце было іх вотчыннае ўладанне. У сярэдзіне XV ст. у Вількаміры іх пляменнік Міхаіл Румбоўдавіч атрымаў 8 чалавек; у запісе пазначана, што гэта яго вотчына[53]. Шэдзібор і Судзівой Валімонтавічы кіравалі ў Коўне[54], а жонка Кезгайлы атрымала пяць чалавек у Ковенскай воласці[55].

Вотчынныя землі Мінігайлы (Дзявенішкі) знаходзіліся па суседстве з Ашмянамі, а ў 1387 і 1398 г. ён згадваецца як староста ашмянскі.

Старостам у Салечніках быў Аляксандр Монтаўт. Яго родзічы Бутрымы (той жа герб Сякера) мелі вотчыну ў недалёкіх адтуль Жырмунах. Барташ Монтаўтавіч, які ўдзельнічаў у перагаворах з Ордэнам, паходзіў *з Салечнікаў*[56].

Вышэй ужо разглядаліся сувязі Манівіда з Браславам[57]. Нейкі час тут быў старостам яго (гербавы) родзіч Ян Вяжэвіч[58], а таксама Юрый Гетаўтавіч, сын якога аднойчы падпісаўся як вотчыннік вішнеўскі (старое ўладанне Манівідаў)[59], і Пётр Янавіч Манцігердавіч, жанаты з дачкою Вяжэвіча.

У часы Казіміра старостам у вотчынным Мядзеле быў прызначаны Андрэй Саковіч. Пасля гэтую пасаду займаў яго

---

[50] Wojtkowiak Z. Urzędnicy zarządu lokalnego na Litwie... S. 150.

[51] Boniecki A. Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI wieku. Warszawa, 1887. S. 36 (дадатак).

[52] CEV. S. 643, 709.

[53] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 68.

[54] CEV. S. 413; LUB. Bd. 10. S. 248 і інш.

[55] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 22.

[56] GStA PK, OBA 12336, 12378 («von der Solcze»).

[57] Гл. часткі кнігі, прысвечаныя паходжанню і структуры знаці. Там, а таксама ў прасапаграфіі знаці прыведзена больш падрабязная дакументацыя па пытаннях вотчынных уладанняў знаці.

[58] Backus O. P. Motives of West Russian Nobles... P. 62.

[59] KDKW. S. 293—294.

сын Багдан Андрэевіч[60]. Андрэй Саковіч змяніў свайго бацьку Станіслава Сака ў Дубініцкім старостве.

Старостамі лідскімі былі Ягінт і яго сын Рымавід. Пазнейшы староста Ян Кучуковіч меў цэлы шэраг вотчынных уладанняў у гэтым павеце.

Прадстаўнікоў аднаго роду знаходзім таксама сярод намеснікаў рускіх зямель, прызначаючы якія князь меў значна больш свабоды. Смаленскімі намеснікамі былі абодва вядомыя Бутрымы, Юрый Гедзігоўд і яго сын Пётр Сенька, Судзівой Валімонтавіч і яго пляменнік Міхаіл Кезгайлавіч. Кіеўскімі ваяводамі (ці князямі) — Ян Альгімонтавіч і Міхаіл Янавіч (Гальшанскія); Аляксандр (Алелька) Уладзіміравіч і Сямён Алелькавіч[61]; Марцін Гаштаўт, сястра якога выйшла замуж за Сямёна Алелькавіча, а абедзве жонкі былі родзічамі Гальшанскіх[62]; Ян Хадкевіч, жанаты з дачкою Яна (Бельскага), брата Алелькі Уладзіміравіча[63].

Разгляд персанальнага складу дэманструе ўплыў роднасных сувязяў на ратацыю ўраднікаў. Роднасць з папярэднікам — гэта не *conditio sine qua non*, каб заняць тую ці іншую пасаду. Вялікі князь, несумненна, мог надаць яе «пабочнай» асобе. Гэта ён рабіў неаднойчы, калі жадаў узмацніць найбольш адданых яму прадстаўнікоў знаці. Але частыя выпадкі перадачы ў спадчыну пасад (вялікая іх частка застаецца нераскрытай, бо нічога не вядома пра паходжанне жонак многіх паноў XV ст.) сведчаць пра тое, што гаспадар звычайна не быў зацікаўлены змяняць усталяваныя ўладныя адносіны на месцах.

Такія яго паводзіны стануць больш зразумелымі, калі мы ўявім умовы функцыянавання ўлады ў сярэднявечнай Літве. Вялікі князь, не маючы адміністрацыйнай структуры, што ахоплівала ўсю краіну, перыядычна аб'язджаў яе, зацвярджаючы сваю ўладу на месцах. Пра забеспячэнне гэтай улады ў штодзённым жыцці ён клапаціцца не мог і таму, непазбеж-

[60] Boniecki A. Poczet rodów... S. 33.

[61] Бацька Аляксандра Уладзімір Альгердавіч у 1362—1395 гг. быў кіеўскім удзельным князем.

[62] Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 6. S. 122—123.

[63] Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy... S. 4.

на, павінен быў шукаць апору сярод мясцовага баярства. Наўрад ці яму было карысна ламаць усталяваныя іерархічныя адносіны ў землях, паветах, валасцях. Больш зручна было карыстацца імі пры стварэнні сваёй («дзяржаўнай») сістэмы ўлады. Ён ствараў палітычныя інстытуты «другой ступені», якія ў рэальным жыцці падлягалі правілу звычаю і зліваліся з першаснымі мясцовымі інстытутамі. Таму можна казаць пра падвойную прыроду старостваа — дэлегаваная князем улада абапіралася на ўжо існуючыя сацыяпалітычныя адносіны.

Віганд з Марбурга апавядае пра сустрэты ў 1365 г. у Майшагольскай зямлі атрад з 400 літоўцаў, якім кіраваў Бушка (*Busko*)[64]. Гэты атрад, хутчэй за ўсё, дзейнічаў з ведама князя, але кіраваў ім прадстаўнік мясцовай знаці. У 1385 г. у суседняй Дзяволтваўскай зямлі ордэнскія *Вегеберыхты* згадваюць *Busekindorf*[65]. Адным з цэнтральных на той час паветаў, Ашмянскім, кіраваў Мінігайла, вотчына якога знаходзілася непадалёк. Старостам жамойцкім быў прызначаны Кезгайла, маці якога, відавочна, паходзіла з мясцовых баяраў[66]. Такую логіку выбару ўраднікаў адлюстроўвае эпізод з літоўскага летапісу пра прызначэнне новага старосты жамойцкага. Ян Гаштаўт раіць Казіміру прызначыць старостам Контаўта, бо цяпер там кіруе яго родзіч[67]. Гэты аповед у гістарыяграфіі лічыцца вартым даверу[68], але ў кожным разе ён каштоўны як тэкст, які раскрывае палітычную самасвядомасць. Можна меркаваць, што найбольш шанцаў стаць наступнікам старосты мелі яго нашчадкі і што такая практыка лічылася слушнай. Таксама можна сцвярджаць, што старосты на падначаленых ім тэрыторыях звычайна мелі алаідальныя ўладанні. Гаспадар, па ўсёй верагоднасці, знаходзіў магчымасці пратэжыраваць найболей адданых яму асоб, але яго свабода пры выбары службоўцаў была абмежаваная. Чалавеку, які не належаў да мясцовай знаці, было надта цяжка паспяхова прадстаўляць княскую ўладу. Паўстае ўсё тая ж праблема «інстытуцыйнага вакууму». У крыніцах першай паловы XV ст.

---

[64] SRP. Bd. 2. S. 554.

[65] Тамсама. S. 694.

[66] Petrauskas R. Vytauto laikų didikų kilmė // Lituanistica. 2000. Nr. 1/2. P. 24.

[67] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 131.

[68] Halecki O. Litwa, Ruś i Żmudź jako części składowe Wielkiego Księstwa Litewskiego. Kraków, 1916. S. 31.

няма звестак пра існаванне груп асоб, падуладных старосту, а калі так — хто тады складаў апору яго ўлады? Ва ўмовах пастаяннай вонкавай пагрозы гэта пытанне было вельмі актуальным. Можна было спадзявацца толькі на падтрымку родзічаў і саюзнікаў, што ў крыніцах выступаюць як *amici, frunde, приятели*. Апошнія па сваіх функцыях ненашмат адрозніваліся ад родзічаў. Заснаваныя на «сяброўстве» сацыяльныя адносіны, па сутнасці, паўтаралі мадэль родавых сувязяў — і для адных, і для другіх характэрна гарызантальнасць адносінаў. Гэта своеасаблівая пашыраная роднасць. Нездарма ў крыніцах гэтыя паняцці маглі значыць і родзічаў па крыві.

Калі разглядаць спіс ураднікаў XV ст., нельга не заўважыць, што асобныя староствы згадваюцца ў крыніцах вельмі неаднастайна. У некаторых выпадках мы можам скласці спіс старостаў амаль без прабелаў, а ў іншых — можам назваць ледзьве аднаго ці двух старостаў. Гэтага нельга патлумачыць выключна прагаламі ў крыніцах. Малая колькасць старостаў асабліва характэрная для тэрыторыі «сапраўднай» Літвы, у якой свае вотчынныя землі мела большасць літоўскіх паноў. Падобна, што часам сферы ўплываў старостаў былі абумоўлены сітуацыяй у родах мясцовай знаці. Напрыклад, калі прыблізна ў 1442 г. памёр Крысцін Осцік, анікштаўскім старостам стаў яго сын Міцька, а ўшпольскім і пянянскім — іншы сын Радзівіл. Анікшты знаходзяцца паміж Ушполем і Пянянамі, і таму можна меркаваць, што існуючы дагэтуль адзіны павет (ушпольска-пянянскі, якім кіраваў Осцік) быў падзелены на дзве часткі. Прычынай гэтага сталі асаблівасці падзелу спадчыны ў сям'і Осціка. Разам з тым, мы бачым, што тэрыторыя паветаў тады не была закрытай і строга абмежаванай, а іх структура была дастаткова свабоднай. У тых выпадках, калі вотчыны знаці знаходзіліся ў цэнтрах паветаў, асобнага тытула старосты магло ўвогуле не быць. Напрыклад, вількамірскімі старостамі ў часы Вітаўта былі Валімонтавічы — Кезгайла і Шэдзібор, вотчынныя землі якіх ляжалі тут жа. Таму не выклікае здзіўлення тое, што пасля 1433—1434 гг. (калі, верагодна пасля змовы Валімонтавічаў[69], вількамірскім старостам ненадоўга стаў Манцігайла) і да 1488 г. (у 1476 г. памёр Міхаіл Кезгайлавіч, а ў 1478 г. — Ян Кезгайлавіч, і вотчыннае значэнне гэтых зямель

[69] Petrauskas R. Giminaičiai ir pavaldiniai... P. 114—115.

у родзе магло зменшыцца[70]) вількамірскіх старостаў у крыніцах мы не сустракаем. Але нашчадкі Валімонта ўвесь час захоўвалі тут уладу. Напрыклад, вядомыя некалькі судовых выракаў, што датычыліся вількамірскіх дробных баяраў. Першае рашэнне прымалі Судзівой Валімонтавіч і яго пляменнік Конрад Гудзігердавіч (разам з Радзівілам Осцікавічам), а другое — Ян Кезгайлавіч[71].

Асабліва рэдка згадваюцца старосты ў Ашмянах, Кернаве, Крэве, Медніках, Салечніках і інш., г. зн. там, дзе былі найважнейшыя ўладанні знаці. Адміністрацыйная структура была яшчэ вельмі неразвітай, структура паветаў не пакрывала ўсю краіну, таму ў некаторых выпадках пэўныя тэрыторыі існавалі «побач» з паветамі. Толькі з цягам часу кіраванне краінай было ўніфікавана, а канчатковай кропкай гэтага працэсу стала адміністрацыйная рэформа 1564 г.

Тое, што баярства мела выключныя правы на заняцце ўрадаў, не з'яўляецца сведчаннем службовай прыроды. Наадварот, на навастворапыя вышэйшыя пасады прызначаліся асобы самага высакароднага паходжання. І пазней найбольш важныя пасады атрымлівалі прадстаўнікі толькі некалькіх самых уплывовых родаў, а працэнт «новых людзей» тут быў нязначны. Такім чынам, вярхушка баярства выдзелілася не толькі таму, што яе прадстаўнікі калісьці былі прызначаны гаспадаром на вышэйшыя пасады, але і таму, што, прызначаючы іх, вялікі князь быў звязаны пэўным разуменнем пра тое, каму і якія правы ўвогуле можна дэлегаваць. Сцвярджэнне пра «службовы характар літоўскага баярства» спрашчае сацыяльныя і палітычныя адносіны ў літоўскім грамадстве. У склад эліты ўлады маглі таксама ўвайсці асобы, што не займалі пасад (напрыклад, Мінігайла ў пачатку XV ст. або Кезгайла і Юрый Гедзігоўд у часы панавання Жыгімонта Кейстутавіча), а яе іерархія не супадала з вядомай у пазнейшыя часы градацыяй пасад (важнейшая асоба — віленскі ваявода альбо канцлер, etc.). У 1387 г. найбольш уплывовым прадстаўніком знаці быў «усяго толькі» староста ашмянскі. У 1440 г., пры вылучэнні

[70] Пра пастаянную змену складу вотчынных зямель і праблематыку паняцця «родавага гнязда» гл.: Petrauskas R. XV amžiaus Lietuvos bajorijos struktūra...; а таксама раздзел гэтай працы, прысвечаны паняццю роду.

[71] РИБ. Т. 20. С. 1377—1378.

кандыдатуры Казіміра на літоўскі трон, вельмі істотную ролю адыграў смаленскі намеснік Ян Гаштаўт, а таксама Кезгайла, Ян Манівідавіч, Радзівіл Осцікавіч і Мікалай Неміровіч, якія не займалі важных урадаў. Іерархія урадаў у той час яшчэ толькі фармавалася[72], што пацвярджае далейшая гісторыя некаторых згаданых асоб, але яе нельга пераносіць на ранейшыя часы. Аналіз сістэмы мясцовых урадаў паказвае, што тапаграфія акруг, падпарадкаваных старостам, звязана з геаграфіяй іх паходжання. Таму можна сцвярджаць, што ўжо ў канцы XIV — пачатку XV ст. улада прадстаўнікоў літоўскай знаці была ў значнай ступені абумоўлена іх спадчыннымі правамі, а прывілеі вялікага князя толькі развівалі і інстытуцыяналізавалі гэтыя правы.

У 1479 г. староста жамойцкі Ян Кезгайлавіч, рэагуючы на папрокі з боку вялікага магістра Ордэна пра крыўды яго падданым, пісаў апошняму, што ў той час ён адсутнічаў і пра гэта яму невядома. А потым дадаў: «Вашая вялікасць можа зразумець, як кіруецца народ, калі пана няма ўдому»[73]. Старосты XV ст., магчыма, не заўсёды адчувалі сябе «панамі на сваёй зямлі», але для ўраднікаў, што ажыццяўлялі ўладныя паўнамоцтвы побач са сваімі вотчынамі, такая характарыстыка магла быць цалкам слушнай.

2. ЗНАЦЬ І ЎЛАДА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ

XV ст. у гістарыяграфіі звычайна ацэньваецца як перыяд узмацнення ўлады паноў. Асноўны крытэрый — паступовы рост значэння паноў-рады, адлюстраваны ў прывілеях вялікага князя[74]. Абгрунтаванасць гэтых высноў не выклікае сумненняў, але такі погляд, што часцей за ўсё грунтуецца на юрыдычных крыніцах, не ахоплівае ўсіх рэальных праблем, звязаных з уладнымі адносінамі. Застаецца незразумелым, якім чынам на эвалюцыю гэтых адносінаў уздзейнічала тое, што гаспадар не жыў пастаянна ў дзяржаве? Наколькі палітычнае і сацыяльнае развіццё было

[72] Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 45—49.

[73] GStA PK, OBA 16803: «Im sulchen kann ewer groszmechtikeit wol erkennen und wissen, wy sich es folck reigirt im lande also eyn here nicht in heimisch ist».

[74] Krasauskaitė M. Die litauischen Adelsprivilegien...; Valikonytė I. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės Ponų tarybos...; Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca...

абумоўлена прыняццем польскіх узораў, а наколькі — мясцовай спадчынай? Кропка адліку большасці даследаванняў — прывілей Ягайлы баярству 1387 г. — гэта ўжо гістарыяграфічная тэорыя, паводле якой згаданы прывілей прынёс шмат якасна новага ў грамадскае жыццё ВКЛ. Прывілеі — гэта заўсёды аднабаковая крыніца, бо яны трактуюць баярства як цэльную групу. У той жа час, сведчаннем відавочных адрозненняў у статусе з'яўляецца само існаванне верхняга слоя баярства — знаці. Адрозненні яшчэ больш паглыбляліся праз існаванне розных груповак знаці, што нярэдка гуртаваліся вакол якога-небудзь аднаго князя[75]. Даследаванне такіх груп дазваляе лепш зразумець уладныя адносіны вялікага князя і знаці. Разам з тым, такое даследаванне павінна раскрыць асноўныя прынцыпы фармавання груп знаці, знайсці новыя катэгорыі, каб інтэрпрэтаваць палітычныя падзеі ў Літве ў канцы XIV—XV ст.

а) Групы знаці канца XIV — пачатку XV ст.

У хроніцы Віганда з Марбурга пры апісанні падзей 1365 г. у Літве згадваецца адна дэталь, што раскрывае істотны аспект адносінаў вялікага князя і баяраў. *Accidit, quod quidam de paganis rex Butaw dictus, cum Kynstut esset in expedicione, domi maneret et cum bayoribus suis et aliis* вырашыў перайсці на бок Ордэна[76]. *Des Kynstouds hauptmanne zur Wilde mit nahmen Dirsuno wart heimlich verkuntschafftet, das Butaw solche dinge willens were anzustaffieren, aber von dem andern bruder vnd den mittverwanten bajoren war yhm nicht wissentlich...*[77]. Перш за ўсё, неабходна

[75] Акцэнт на важнасць даследавання палітыкі асобных груп літоўскай знаці: Rowell S. C. Išdavystė ar paprasti nesutarimai? Kazimieras Jogailaitis... P. 46—48. Метадалагічнае абгрунтаванне ўвядзення катэгорыі груп: Oexle O. G. Soziale Gruppen in der Ständegesellschaft... S. 9—44; Althoff G. Verwandte, Freunde und Getreue...; Schmid K. Programmatisches zur Erforschung der mittelalterlichen Personen.... S. 116—130.

[76] «Здарылася, што, калі Кейстут выправіўся ў паход, адзін паганскі кароль, імем Бутаўт, застаўся дома і са сваімі баярамі і іншымі...» (пераклад паводле: Vygandas Marburgietis. Naujoji Prūsijos kronika / Vertė R. Jasas. Vilnius, 1999. P. 130). Далей буду абапірацца на нямецкі пераказ хронікі Каспара Шутца, бо ў лацінскім перакладзе ход падзей цалкам пераблытаны — SRP. Bd. 2. S. 550—553.

[77] Тамсама. S. 553. «Пра тое, што Бутаўт наважыўся на такі паход, было таемна паведамлена старосце Кейстута ў Вільні Дзірсуну, але пра іншага брата і зродненых баяраў яму не было вядома...» (пераклад паводле: Vygandas Marburgietis. Naujoji Prūsijos kronika... P. 240).

звярнуць увагу на характарыстыку Дзірсуна — *староста Кейстута ў Вільні*[78]. Вільня, як вядома, была рэзідэнцыяй Альгерда. Але тагачасным адносінам не супярэчыць падпарадкаванне часткі Вільні Кейстуту, пра што сведчыць гэта месца хронікі. Згадка імя Кейстута ў тытулатуры Дзірсуна паказвае на іх узаемную сувязь. Гэта староста Кейстута, а не, скажам, Альгерда. Падобная таксама характарыстыка Пекста (*Pexte*): *advocatus regis Keinstut in Trakken*[79] (намеснік Кейстута ў Троках). Такая характарыстыка выключае магчымасць маністычнага разгляду адносінаў «вялікі князь — баярын». Цэльнага баярскага стану не існавала. Становішча баярына ў грамадстве вызначалася сувяззю з князем і роднаснымі сувязямі[80]. Ад узмацнення князя залежала кар'ера бояраў яго акружэння, але, з іншага боку, гэта ўзмацненне ў значнай ступені было абумоўлена вагой групоўкі, што падтрымлівала князя.

Такім чынам, залежнасць гаспадара і знаці была ўзаемнай. Невыпадкова ад самага пачатку дынастыі Гедзімінавічаў няма ніводнага выпадку неканфліктнага атрымання княскага стала ў спадчыну. Кожная смерць гаспадара выклікала змаганне розных груп, якое чужаземныя храністы называлі спрэчкамі князёў[81]. У прыведзеным фрагменце Віганда з Марбурга згадваецца пра бояраў Бутаўта, якія пайшлі з ім у ордэнскія землі. Калі ў 1381 г. Кейстут заняў Вільню, ён загадаў усім васалам Ягайлы прысягнуць яму на вернасць[82]. Польскі храніст Ян з Чарнкава сцвярджае, што Ягайла вярнуўся са згоды знаці (*cum favore procerum*)[83].

---

[78] Дзірсун і яго неназваны сын згадваецца ў некалькіх месцах хронікі — SRP. Bd. 2. S. 557, 570, 572. Торунскія аналы датуюць смерць «вялікага пераследніка хрысціян Дзірсуна» 1375 г. (Тамсама. Bd. 3. S. 95).

[79] Тамсама. Bd. 2. S. 113. У крыніцах XIV ст. (да уніі з Польшчай і магдэбургскіх прывілеяў, якія прынеслі іншае значэнне гэтага слова) гэта ўсяго другі вядомы мне выпадак ужывання тэрміна «advocatus». Параўн.: Gedimino laiškai / Parengė V. Pašuta ir I. Štal. Vilnius, 1966. P. 135, 137. Яго значэнне хутчэй адпавядае значэнню паняцця староста («capitaneus», «hauptmann»).

[80] Падрабязней пра гэта гл.: Petrauskas R. XV amžiaus Lietuvos bajorijos struktūra... P. 123—158.

[81] Першым гэта змаганне за княскі стол заўважыў Г. Лаўмяньскі (Łowmiański H. Z zagadnień spornych społeczeństwa litewskiego... S. 106—107).

[82] Codex diplomaticus Prussicus... Bd. 6. S. 2. Пра датаванне гэтай крыніцы гл.: Smolka S. Kiejstut i Jagiełło. Kraków, 1888. S. 61—63. Таксама — SRP. Bd. 2. S. 608 (спасылка 1471).

[83] MPH. T. 2. / Wyd. A. Bielowski. Lwów, 1872. S. 719.

Крыніцы канца XIV ст. дазваляюць больш канкрэтна даследаваць склад такіх груп. У Троцкай дамове Ягайлы і Кейстута з Ордэнам 1379 г. як сведкі выступілі: *unsir lieben baiaren Jorge Kasusna, Waydelo, Iwan Augemunten son unde Buseke des obirsten herczogen baiaren unde Saymunt Girduthen son unde Jadint Surkanten son unde andir vil unsir baiaren*[84]. Вылучаная ўстаўка можа мець сэнс толькі ў тым выпадку, калі складальнік дакумента хацеў адасобіць ёю баяраў Ягайлы (*найвышэйшага князя*) і Кейстута. Звесткі з іншых крыніц пра гэтых асоб не пярэчаць гэтаму. Адносіны Вайдылы і Ягайлы не патрабуюць асобнага тлумачэння. Ян Альгімонтавіч, якога пазней сустракаем сярод прыхільнікаў Вітаўта, спачатку сапраўды мог быць блізкім да Ягайлы чалавекам[85]: 1) ён удзельнічаў у перагаворах у Давыдзішках у 1380 г.[86]; 2) у 1385 г. ён быў у складзе пасольства Ягайлы ў Польшчу па пытанні шлюбу[87]; 3) у 1388 г. брат Ягайлы Сямён Лутвен даслаў у Ноўгарад Яна Альгімонтавіча і Братошу[88]; 4) падчас першых уцёкаў Вітаўта да крыжакоў сярод тых, хто яго суправаджаў, няма Яна Альгімонтавіча[89]; 5) у 1393 г. (калі Альгімонтавіч ужо супрацоўнічаў з Вітаўтам) Ягайла асабіста дасылае князю Яну каня ў дар[90].

Вайдыла і Ян Альгімонтавіч былі вельмі ўплывовымі асобамі, іх неаднойчы згадваюць ордэнскія крыніцы. Інфармацыя літоўскіх летапісаў пра «нізкае» паходжанне Вайдылы тэндэнцыйная. У 1376 г. Віганд з Марбурга згадвае людзей *баярына Вайдылы*[91]. Ордэнскія *Вегеберыхты* лакалізуюць недалёка ад Дзяволтвы *Wayteldorff*, іншае яго ўладанне знаходзілася ў ваколіцах Ліды[92]. Добра вядомы і Ян Альгімонтавіч. Герман з

---

[84] Codex diplomaticus Lithuaniae... S. 55. Правапіс удакладнены паводле арыгінала: GStA PK, Perg. Urk., Schiebl. 52, № 3.

[85] Супрацьлеглы погляд: Rowell S. C. Gediminaičių dinastinė politika... P. 131—133.

[86] SRP. Bd. 2. S. 604.

[87] МРН. Т. 2. S. 909.

[88] ПСРЛ. Т. 25. Москва—Ленинград, 1949. С. 214. Акалічнасці гэтага пасольства: Krupa K. Książęta litewscy w Nowogrodzie Wielkim do 1430 roku // Kwartalnik historyczny. 1993. R. 100. S. 36—38.

[89] Гл. дакумент Вітаўта 1384 г.: CEV. S. 4.

[90] Rachunki dworu króla Władysława Jagiełły i królowej Jadwigi z lat 1388 do 1420 / Wyd. F. Piekosiński. Kraków, 1896. S. 168.

[91] SRP. Bd. 2. S. 576.

[92] SRP. Bd. 2. S. 695; KDKW. S. 4—5. Пра Вайдылу гл.: Rowell S. C. Gediminaičių dinastinė politika... P. 129—130.

Вартберга называе яго бацьку *magnus satrapa*[93], што меў землі ў Арыставе і Гальшанах[94].

У дакументах Ягайлы 1387 г. як сведкі выступаюць яшчэ два звязаныя з ім прадстаўнікі знаці: Мінігайла і Андрэй Гаштаўт[95]. У прысязе Дзмітрыя Альгердавіча на вернасць Ягайлу 1388 г. згадваюцца сведкі *bojare brata [—] Minihajlo, knjaz Jurji Kozyno Iwanowicz*[96]. Несумненна, так называліся людзі з атачэння Ягайлы. У 1393 г. у каралеўскай рахунковай кнізе фіксуецца наданне віленскаму старосту Мінігайлу[97]. На сувязь з сям'ёй Ягайлы ўказвае тое, што рускія летапісы далучаюць Мінігайлу да сыноў Альгерда[98]. Прыхільнасць яго і Андрэя Гаштаўта да Ягайлы пацвярджаецца фактам страты важных урадаў у пачатку панавання Вітаўта. Зямля ля Віленскага замка, што знаходзілася ва ўласнасці Андрэя Гаштаўта ў 1387 г., тапаграфічна асвятляе гэтую сувязь. Мінігайла і Гаштаўт маглі быць родзічамі. На гэта ўказваюць іх зямельныя ўладанні. Мінігайла ўвесь час падпісваўся *з Дзявенішак*, а ў 1437 г. Ян Гаштаўт выдаў данацыйны дакумент у сваім (*in curia nostra*) маёнтку Дзявенішкі[99].

У крыніцах згадваюцца і імёны некаторых прадстаўнікоў знаці атачэння Скіргайлы. У паручыцельстве за Братошу 9 дзесяцігоддзя XIV ст. удзельнічаў баярын вялікага князя Скіргайлы Манцівіл (*Montwil magni ducis Skirgalonis baiori*)[100]. Цікава, што Братоша ў пачатку гэтага дзесяцігоддзя выступаў як сведка ў адным дакуменце Андрэя Альгердавіча[101]. Магчыма, згаданае паручыцельства звязана з пазіцыяй Братошы ў змаганні Альгердавічаў за ўладу. Відавочна, яно дапамагло, і з таго часу Братоша пастаянна сустракаецца ў шэрагу найбольш уплывовых літоўскіх баяраў.

Тагачасныя паручыцельствы, што захаваліся ў некалькіх рэестрах, паказваюць, што прадстаўнікі розных груп знаці супрацоўнічалі пры абароне той ці іншай асобы. Князь

[93] SRP. Bd. 2. S. 98—99.

[94] Тамсама. S. 707.

[95] KDKW. S. 6, 19.

[96] AU. S. 22.

[97] Rachunki dworu króla Władysława Jagiełły... S. 169.

[98] ПСРЛ. Т. 7. Санкт-Петербург, 1856. С. 256.

[99] KDKW. S. 748—749.

[100] Halecki O. Z Jana Zamoyskiego inwentarza... S. 166.

[101] Полоцкие грамоты... Вып. 1. С. 44.

быў зацікаўлены ў аслабленні супрацьлеглай партыі. Пра ажыццяўленне такой палітыкі падчас канфлікту Ягайлы і Вітаўта гаворыць дакумент Ягайлы 1391 г.[102]. Ім Віленскай кафедры надаецца Стрэшынская воласць (*districtus*), якой перад тым валодаў *Georgius dictus Toloczko*. У 1399 г. Вітаўт згадвае, што ён надаў князю Талочку суседняе ўладанне Бярэзіна[103]. Можна дапусціць, што Ягайла забраў у Талочкі ўладанне за падтрымку Вітаўта. Вярнуўшыся, Вітаўт даў свайму саюзніку суседнія землі.

Вітаўт апісвае ганенні на сваіх прыхільнікаў падчас панавання Ягайлы і Скіргайлы ў сваёй *Скарзе*: *...und nach mer numen sy mine baiorn ane mynen willen und marterten sy mit wasser und smitten sy in isen und saczten sy in temenitczen... und was do y woren myner vrunde von allen nam herczog Jagal ire fetirlich erbe*[104]. Рускі летапіс, апавядаючы пра падзеі 1381 г., адзначае: *...и убиша князя великого Кеститиа Гедиминовича, и бояръ его избиша*[105].

Такія дзеянні Ягайлы ў адносінах да бояраў Кейстута цалкам зразумелыя. Менавіта ў гэтым асяроддзі магла нарадзіцца рэальная апазіцыя яго панаванню. Пазнейшы нямецкі храніст Альберт Крантц, які часцей за ўсё абапіраўся на вартыя даверу крыніцы, сцвярджае, што Вітаўт змог згуртаваць вакол сябе сяброў бацькі[106]. Прыхільнікі суправаджалі яго ў зямлю Ордэна[107]. Толькі дзякуючы ім Вітаўт здолеў вярнуць уладу. Гэтая падтрымка не магла не ўздзейнічаць на далейшыя рашэнні новага князя. Замену ўдзельных князёў намеснікамі дыктавала не столькі абстрактнае імкненне да цэнтралізацыі дзяржавы, колькі фактычная ці патэнцыяльная нелаяльнасць першых (нагадаем, што многія з іх былі Альгердавічамі). Выбар Вітаўта абмяжоўвала тая акалічнасць, што ён не меў дастатко-

---

[102] KDKW. S. 35.

[103] Тамсама. S. 66. Таксама гл.: Halecki O. Na marginesie najdawniejszych diplomów katedry wileńskiej // Ateneum Wileńskie. 1935. R. 10. S. 67.

[104] Alminauskis K. Vytauto skundas... P. 212—213, 214—215. «Яшчэ болей: яны схапілі маіх баяраў без майго дазволу, катавалі іх вадой, акоўвалі жалезам і кідалі іх у цямніцы... І колькі яшчэ маіх сяброў засталося, у тых усіх князь Ягайла адабраў іх вотчыны» (пераклад паводле: Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 182—183).

[105] ПСРЛ. Т. 3. Санкт-Петербург, 1841. С. 92.

[106] Krantz Albertus. Wandalia. Coloniae, 1519. Lib. 9. Cap. 11: «Vitoldus autem patrios circumiens amicos, auxilium implorabat.»

[107] SRP. Bd. 3. S. 162, 167—168.

вай колькасці братоў і пляменнікаў. З пяці яго братоў у жывых застаўся толькі Жыгімонт, які доўгі час правёў у ордэнскім палоне[108]. Вітаўту давялося дасылаць у рускія землі прадстаўнікоў знаці, якім ён гэтак адплочваў за дапамогу ў змаганні за ўладу. Неабходна адзначыць, што і тут Вітаўт перш за ўсё абапіраўся на родзічаў. Намеснікам кіеўскім стаў муж сястры жонкі Ян Альгімонтавіч, смаленскім — Ян Бутрым. Шлюбнае сваяцтва звязвала яго з віленскім ваяводам Манівідам.

Разуменне важнасці роднасных сувязяў для фармавання палітычных саюзаў выразна прасочваецца ў наступных словах Вітаўта: *...an ein meidelin min tochterchin hatt ich und an dem selben hatte ich keinen willen, nicht das ichs mochte geben weme ich wolde und man bat si von mir fil...ich solde sy nicht weg geben und vorchten sich des, das mir von irenthalben frunde mochten werden*[109]. Прыкладам стварэння саюзу такога кшталту магла б быць складзеная ў канцы XIV ст. дамова са штэцінскімі князямі, якую Вітаўт замацаваў, выдаўшы сваю пляменніцу (верагодна дачку Таўцівіла) за аднаго з гэтых князёў[110].

Звесткі з крыніц дазваляюць толькі гіпатэтычна рэканструяваць узаемныя адносіны прадстаўнікоў знаці з атачэння Вітаўта. Рэканструкцыі такога кшталту маюць сэнс пры імкненні адэкватна зразумець асаблівасці тагачасных сацыяльных адносінаў. Пры такой пастаноўцы пытання істотна ў атачэнні колькіх чалавек з'яўляецца той ці іншы індывід, па суседстве з кім ён жыве, з чыёй дачкой ці сястрой жанаты, хто выступае як сведка ў яго дакументах. У пачатку панавання Вітаўта найбольшы ўплыў мелі Манівід і Чупурна. Яны ўдзельнічалі амаль ва ўсіх судовых рашэннях гаспадара, у падрыхтоўцы дамоў і інш. У вочы кідаецца тое, што ва ўсіх тэстацыях, за выключэннем дакумента Салінскага міру,

[108] Wolff J. Ród Gedimina. Dodatki i poprawki do dzieł hr. K. Stadnickiego. Kraków, 1886. S. 47—69.

[109] Alminauskis K. Vytauto skundas... P. 214—215. «Я меў дзяўчынку, сваю дачушку; і на яе не меў сваёй волі, каб мог яе аддаць каму пажадаю, а прасілі яе ў мяне надта. Яны забаранілі мне і змусілі мяне, каб я яе не аддаваў мужу, баючыся, каб праз яе не набыў сабе сяброў» (пераклад паводле: Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 183).

[110] «der jungiste von Stetyn hat sich gefrundet mit Wytawten, und hat genomen eine Ruschkynne» (LUB. Bd. 4. S. 200).

яны запісваюцца адзін побач з адным. Такая паслядоўнасць не можа тлумачыцца толькі прынцыпам градацыі паводле займаных пасад, бо сістэма рангаў такога кшталту ў дакументах яшчэ не была да канца ўсталяваная. На лад мыслення тых, хто рыхтаваў такія спісы, уплывалі нейкія іншыя фактары. Цікава, што ў наданні Манівіда францішканцам 1407 г. Чупурна стаіць у пачатку спіса сведак перад братам Манівіда Гедзігоўдам[111]. Брат Чупурны Вігайла быў вількамірскім старостам, пляменнік Гінтаўт — ковенскім[112]. Магчыма, што іх родзічам быў староста салечніцкі Аляксандр Монтаўт. У Салечніках свае вотчынныя землі мелі і Чупурна, і Монтаўты[113]. Калі дадаць Яна і Юрыя Бутрымаў, што мелі герб Сякера, атрымліваецца сапраўды моцная група знаці часоў Вітаўта.

Іншыя два лідары літоўскага баярства пералому XIV—XV ст. Мінігайла і Андрэй Гаштаўт, нягледзячы на іх «праягайлаўскае» мінулае, захавалі сваё становішча. Хоць і не займаючы высокіх пасад, яны пастаянна выступалі як сведкі ў дакументах вялікага князя, удзельнічалі ў нарадах і перагаворах. Захаваць статус ім маглі дапамагчы толькі шчыльныя сувязі з іншымі прадстаўнікамі знаці. Адзначым, што аўтары крыжацкіх апісанняў дарог лакалізуюць вёску Манівіда ўсяго за 1,5 мілі ад маёнтка Гаштаўта. Уласнасць Мінігайлы Дзявенішкі таксама знаходзіліся непадалёк. Сын Андрэя Гаштаўта Ян ажаніўся з прадстаўніцай іншага ўплывовага роду — Кезгайлаўнай.

Такім чынам, робіцца відавочным існаванне сістэмы сацыяльных адносінаў, незалежнай ад дзяржаўных структур. Сетка гарызантальных сувязяў, што звязвала асоб, была найбольш дзейснай структурай штодзённага жыцця, якая дзякуючы свайму спецыфічнаму характару аб'ядноўвала індывідаў у адно цэлае.

---

[111] MAB RS. F 276—1494. P. 3—4.

[112] Гэтыя роднасныя дачыненні раскрывае недатаваны ліст рагніцкага комтура да вялікага магістра: «Ouch erwirdig(ir) gnedig(ir) meister wisset, das herczog Withawt hat eynen nuwin houptman gemacht czu Cawin und der ist Ginthawt genant und ist Czepornin brudir son» (GStA PK, OBA 28512). Падчас напісання ліста Чупурна, верагодна, яшчэ быў жывы (памёр перад 1412 г.). Гінтаўт названы сынам Вігайлы ў дакуменце Салінскай дамовы 1398 г. (LUB. Bd. 8. S. 226—227).

[113] На жаль, нельга дакладна сказаць, ці прывешаная пад дакументам Мельнскага міру пячатка з гербам Сякера сапраўды належыць Гінтаўту. Як вядома, герб Сякера ў Гародлі атрымаў Ян Бутрым, ім карысталіся ўсе вядомыя Монтаўты (гл. прасапаграфічны спіс).

Іерархічныя адносіны не маглі выконваць такой функцыі, бо яны па сваёй прыродзе былі наступствам дамовы толькі дзвюх асоб — сеньёра і васала. Яны не стваралі супольнасці (васалы аднаго сеньёра самі па сабе не складалі адзінай групы). Лаўмяньскі мае рацыю, калі кажа, што адносіны князя і баяраў былі ўзаемнымі[114]. Выяўленая ў своеасаблівай форме іерархія (*мой баярын*) гэта толькі адзін з іх аспектаў. Іншы складае іх сувязь «сяброўства», вытвор агульнага палітычнага лёсу. На існаванне такога разумення ўказвае абяцанне Ягайлы Скіргайлу *слухаць яго больш за ўсіх сяброў і братоў*[115]. Сяброўства не супярэчыць існаванню падданства, гэтыя катэгорыі хутчэй дапаўняюць адна адну. Ва ўмовах панавання міжасабовай камунікацыі было натуральна завязваць сувязі, якія дапаўнялі падданства. Гэтым шляхам было магчыма захаваць такую праблемную ў тыя часы палітычную і сацыяльную стабільнасць.

б) Знаць у падзеях 1430—1435 гг.

Важная роля баярства ў падзеях пасля смерці Вітаўта добра вядома. На думку многіх гісторыкаў, менавіта змаганне Свідрыгайлы і Жыгімонта Кейстутавіча за вялікакняскі стол адкрыла прадстаўнікам літоўскай знаці новыя палітычныя магчымасці. Іх пазіцыя часта вызначала ўзмацненне таго ці іншага князя, што змушала князёў надаваць ім усё новыя свабоды. Такое сцвярджэнне па сутнасці не з'яўляецца няправільным, але яно хавае асноўную праблему — якія механізмы ўладных адносінаў уплывалі на паводзіны і выбар людзей. Так ці інакш, барацьба згаданых князёў не была адзіным эпізодам змагання за ўладу ў сярэднявечнай Літве. Хутчэй можна казаць, што гэта была натуральная сітуацыя міжуладдзя ў дынастыі, якая не стварыла парадку строгай спадчыннасці. Толькі калі гісторыя ранейшых канфліктаў (Гедзімін — Жвелгайт (?), Яўнут — Кейстут / Альгерд, Кейстут / Вітаўт — Ягайла) нам амаль невядомая, змаганне часоў Свідрыгайлы і Жыгімонта і яго ўдзельнікі адносна добра адлюстраваныя ў крыніцах. Спрыяльная сітуацыя з крыніцамі дазваляе вызначыць асноўных суб'ектаў канфлікту. Гэта не толькі міжусобная барацьба князёў, пад-

[114] Łowmiański H. Uwagi... S. 21—23.

[115] Jakubowski J. Opis księstwa Trockiego z r. 1387 // Przegląd historyczny. 1907. T. 5. S. 44 («слушати его боле всехъ своихъ приятелеи и братьи»).

час якой баяры выбіраюць кропкі для сваіх будучых заваёў[116]. Падзеі 4—5 дзесяцігоддзяў XV ст. можна інтэрпрэтаваць як сутыкненні розных груп. Такі позірк дазваляе пазбегнуць шматлікіх супярэчанняў, уласцівых іншым тэорыям[117].

Свідрыгайла стаў вялікім князем з ведама і згоды літоўскіх паноў. Пра значэнне гэтых фармальных ці нефармальных выбараў сведчаць некалькі крыніц. Асаблівую цікавасць уяўляе храналагічна блізкі падзеям 1432 г. крыжацкі мемарыял дацкаму каралю Эрыку, у якім падрабязна характарызуюцца настроі літоўскай знаці пасля смерці Вітаўта. Прадстаўнікі літоўска-рускай знаці, не жадаючы прызнаваць Ягайлу гаспадаром, сцвярджаюць, што калі ён стаў каралём Польшчы, то пакінуў іх; гаспадаром яны вырашаюць абраць яго брата Свідрыгайлу, які мае на гэтыя землі такія ж прыродныя правы, як і Ягайла (*...tunc rex Polonie fuit in terra Littwanie postulans terram; tunc terre Russie et Lithwanie eum in dominum suscipere noluerunt et dixerunt, quod eos obmisisset cum suscepit regnum Polonie, ad quod eum ipsi promoverunt; ex dixerunt, ipsi fratrem suum vellent Switrigal pro domino suscipere, qui ad ipsas terras ita propinque natus est sicut et ipse*)[118]. Добра інфармаваны аўтар устаўкі таго ж часу ў зборы ордэнскіх актаў таксама адзначае, што пры выбары новага гаспадара пазіцыя знаці была вызначальнай: *Dye Lyttaweschen herren, so schyre der herre yr grosfurste was vorscheyden, dy vorsamelthen sich mit den Rewschen herren... koren czu eyme grosfursten Boleslaum andirs Swydirgail*[119]. У лісце 1431 г. да магістра Ордэна Ягайла згадвае пра актыўныя дзеянні прыхільнікаў (*complices*) Свідрыгайлы[120]. Сам Свідрыгайла таксама падкрэслівае важнасць згоды баяраў[121].

---

[116] Пра рэлігійную (ці нацыянальную) падставу гэтага канфлікту казаць не буду. Яе перыферыйнасць не выклікае пытанняў. Гл.: Halecki O. Dzieje Unii... T. 1. S. 270—278; Jablonowski H. Westrussland zwischen Wilna und Moskau: Die politische Stellung und die politischen Tendenzen der russischen Bevölkerung des Grossfürstentums Litauen im 15. Jh. Leiden, 1955. S. 140—145.

[117] Напрыклад, сацыяльныя супярэчнасці паміж знаццю, з аднаго боку, сярэднім і дробным баярствам, з іншага. Крытыка гэтай канцэпцыі: Jablonowski H. Westrussland zwischen Wilna und Moskau... S. 144—145.

[118] CEXV. T. 2. S. 300—301.

[119] SRP. Bd. 3. S. 494 («літоўскія паны, ледзьве толькі памёр іх вялікі князь, сабраліся з рускімі панамі і выбралі вялікім князем Баляслава, інакш Свідрыгайлу»).

[120] CEXV. T. 2. S. 259.

...mit entracht der herrn bayare, rittere und knechte» (LUB. Bd. 8. S. 212).

Некалькі захаваных дакументаў часоў яго панавання ўказваюць на спадчыннасць эліты ўлады. Праўда, у іх можна ўбачыць новыя рускія імёны, большасць з якіх трапляецца толькі ў яго дакументах. Гэта, несумненна, старыя паплечнікі Свідрыгайлы, што згрупаваліся вакол яго падчас панавання на рускіх землях. Напрыклад, сведкі Хрыстмемельскай дамовы 1432 г. Шыла Кердзеевіч і Іван Гулевіч паходзілі з Валыні, Васіль Корсак і Мікалай Курэйшавіч — з Полацка[122]. Усё гэта арэал актыўнай дзейнасці Свідрыгайлы. Можна дапусціць, што менавіта гэтае «папаўненне» складу эліты ўлады было адной з прычын змовы супраць Свідрыгайлы.

Літоўскія карані гэтага пераварота не выклікаюць сумненняў. У гістарыяграфіі яскрава прадстаўлена роля пасла Ягайлы Зарэмбы ў падрыхтоўцы змовы[123]. Ян Длугаш, які ў гэтым выпадку з'яўляецца найважнейшай крыніцай, адназначна піша, што Ягайла даслаў Зарэмбу толькі тады, калі ўжо ведаў, што літоўцы падрыхтавалі змову[124]. Згаданая ўстаўка ў ордэнскую хроніку адзначае, што ўсе літоўцы і некаторыя русіны сталі на бок новага князя, бо ранейшы вялікі князь прынёс ім шмат несправядлівасці і пакут (*der alde grosfurste den Littawschen herren vele unrecht unde lut hatte czugeczogen*)[125]. Вернымі Свідрыгайлу засталіся толькі Юрый Гедзігоўд і яго пляменнік Ян Манівідавіч. Цяжка сказаць, што вызначыла іх выбар. Магчыма, шляхі Гедзігоўда і Свідрыгайлы перакрыжоўваліся ў Падоллі. Роднасць з Манівідамі магла прывесці ў гэтую групоўку Яна Вяжэвіча[126]. Важна адзначыць, што крыніцы таго часу не сведчаць пра нейкую палітыку Свідрыгайлы, скіраваную супраць старой эліты эпохі Вітаўта. Знаць Вітаўта і далей займала асноўныя пасады ў дзяржаве. Верагодна, тут мы маем справу з незадаволенасцю пэўнай часткі знаці ўладай вялікага князя.

Спіс асноўных удзельнікаў змовы пададзены ў рэляцыі ордэнскага ўрадніка: лісце войта мясцовасці *Brattian* да магістра

---

[122] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. С. 68.

[123] Напрыклад, Ё. Матусас гэтыя падзеі называе проста «пераваротам Зарэмбы» (Matusas J. Švitrigaila Lietuvos didysis kunigaikštis. 2-as leid. Vilnius, 1991. P. 72—86).

[124] «...iam ad id noverat eos [г. зн. літоўцаў] conspirasse» (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 479).

[125] SRP. Bd. 3. S. 498.

[126] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 120—121.

Ордэна ад 04.09.1432 г.[127]. Гэты ліст напісаны ў Вільні адразу пасля пераваротy, а каштоўнасць гэтай крыніцы павялічвае тое, што войт *Brattian* доўгі час жыў пры двары вялікага князя[128] і добра арыентаваўся ва ўнутранай сітуацыі ВКЛ. Ён не згадвае ніякага ўплыву польскіх паслоў пры падрыхтоўцы пераваротy. Змоўшчыкамі ён называе князя Сямёна (Гальшанскага), князя Аляксандра Уладзіміравіча, Пятра Манцігердавіча, Яна Гаштаўта. Сямён Гальшанскі быў родзічам Ягайлы і Вітаўта (а значыцца, і Жыгімонта Кейстутавіча). Блізкія сувязі маглі звязваць Пятра Манцігердавіча і Яна Гаштаўта. Напрыклад, Пётр Манцігердавіч выступае як сведка ў данацыі Пятра Гаштаўта Віленскай кафедры ад 31.07.1433 г.[129].

Яшчэ ў 1432 г. сувязі з групай Свідрыгайлы завязалі Валімонтавічы. Два з іх — Румбоўд і Яўнус — заплацілі за гэта сваімі галовамі[130]. Такія паводзіны Валімонтавічаў не былі нечаканымі. У часе сваёй доўгай палітычнай актыўнасці яны былі асноўнымі куратарамі адносінаў з Ордэнам. Шэдзібор ажно чатыры разы ездзіў як пасол да вялікага магістра, а Кезгайла — пяць[131]. Апошні камунікаваў з нямецкімі ўраднікамі непасрэдна[132]. Пазней гэтыя сувязі развіваў іх малодшы брат Судзівой, асабліва добразычлівыя паводзіны якога былі адзначаны ордэнскімі пасламі ў паведамленні 1447 г.[133]. Акалічнасці ўзмацнення Жыгімонта пагражалі стабільным сувязям з крыжакамі, якія былі рэальнай супрацьвагай польскаму ціску. З групай Свідрыгайлы Валімонтавічаў звязвалі таксама асабістыя сувязі. Пётр Сенька Гедзігоўдавіч быў жаната з дачкой Кезгайлы Мілохнай. У 1429 г. Румбоўд і Гедзігоўд абвяшчалі каранацыйную палітыку Вітаўта ў Польшчы[134], а ў 1430 г. Пётр Сенька Гедзігоўдавіч і Шэдзібор ездзілі па той жа

[127] Kotzebue A. von. Switrigail, ein Beytrag zu den Geschichten von Littauen, Russland, Polen und Preussen. Leipzig, 1820. S. 83—84. Гэтая публікацыя няпоўная. Арыгінал ліста: GStA PK, OBA 6210.

[128] Напрыклад, яго лісты ад 08.02.1432 г. і 20.08.1432 г. з Ваўкавыска і Трокаў (GStA PK, OBA 5950 і 6198).

[129] KDKW. S. 147.

[130] LUB. Bd. 8. S. 373.

[131] CEV. S. 337, 643, 699, 709, 921; LUB. Bd. 8. S. 212; Bd. 9. S. 116; Bd. 10. S. 35.

[132] LUB. Bd. 8. S. 419.

[133] Тамсама. Bd. 10. S. 272—273.

[134] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 375.

справе ў Рым[135]. Жыгімонт Кейстутавіч, верагодна, прымаючы пад увагу ўсё гэта, ужо ў першыя дні пасля пераваротy, спрабуючы прыцягнуць сімпатыі Валімонтавічаў і ўзмацніць свае пазіцыі ў Троках, перадаў троцкаму ваяводу Яўнусу кіраванне Вільняй[136]. Удзельнікам змовы ад Валімонтавічаў мог быць Юрый Бутрым. Калі Свідрыгайлу скінулі, ён беспаспяхова спрабаваў пасярэднічаць на перагаворах прадстаўніка Ордэна з Жыгімонтам[137]. Магчыма, менавіта гэтая няўдача падштурхнула Валімонтавічаў да падрыхтоўкі новай змовы. У чэрвені 1433 г. Бутрым ужо знаходзіўся ў лагеры Свідрыгайлы[138].

У 1437 г. Бутрым згадваецца ў дакуменце Яна Гаштаўта як *frater* Міхаіла Кезгайлавіча[139]. Ганна Бутрымаўна была ўзята Пятром Сенькам Гедзігоўдавічам і Мілохнай Кезгайлаўнай у якасці прыёмнай дачкі; Гедзігоўдавіч называе яе *bratanna žony*[140], што магло азначаць нявестку жонкі ці родзічку жонкі брата. Калі б гэты Бутрым быў звязаны са згаданым вышэй Юрыем Бутрымам, мы б мелі яшчэ адзін прыклад палітычнай дзейснасці роднасных сувязяў.

Тым з Валімонтавічаў, хто застаўся жывы, удалося захаваць палітычны ўплыў і маёмасць. Кезгайла, хоць і страціў жамойцкае староства, пастаянна сустракаецца ў дакумента Жыгімонта. Яму і далей давяраюць быць паслом (у той жа Ордэн). Блізкія

---

[135] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 115.

[136] Пра гэта дазваляе сцвярджаць згаданае паведамленне войта мясцовасці «Brattian»: «Seine durchluchtikeit [Жыгімонт Кейстутавіч] hat inne die beiden sloszer czu Tracken, und die Wille hatte is geschoben an den houptman von Tracken. Were is, das der seiner herlikeith die hwszir czu Tracken wurde wfftragen, so welden sie em die Wille ouch wfftragen. Nw hat sich der sich der houptman von Tracken dem heren grosfursten Segemunde gancz dirgeben, umb deswillen haben sie em die Wille ouch wffgetragen, so, das seine herlikeith die hwszer alsampt inne hat. Und die hwszer czu Tracken hat sine mechtik(eit) bevolen dem heren herczog Allexander und deme houptmann von Tracken» (GStA PK, OBA 6210). «Старостам» троцкім (так ордэнскія ўраднікі называлі троцкага ваяводу) на той час быў Яўнус Валімонтавіч.

[137] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 482. Перагаворы адбываліся ў канцы верасня 1432 г. (гл. ліст ордэнскага пасла меўскага комтура Людвіка з Ландзэе, высланы з Трокаў да лівонскага магістра (LUB. Bd. 8. S. 368).

[138] Bullarium Poloniae... 5. S. 251.

[139] KDKW. S. 749. Таксама гл.: Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium... S. 13—14. У гэтым дакуменце слова «frater» ужываецца ў значэнні «родзіч». Судзівой таксама характарызуецца як «брат» Кезгайлы, хоць быў яго дзядзькам. Тым не менш, новае даследаванне С. Роўэла паказвае, што гэты Бутрым быў сынам Кезгайлы (Rowell S. C. Winning the Living... P. 97—98).

[140] Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium... S. 33.

сувязі з іншымі прадстаўнікамі знаці, што знаходзіліся пры ўладзе, кампенсавалі яго праблемы, выкліканыя няласкай гаспадара. Нагадаю, што з дачкой Кезгайлы быў жанаты Ян Гаштаўт. Тыя ж прэвентыўныя пазіцыі соцыуму дазволілі пазней Гедзігоўдам, якія вярнуліся, без праблем інтэгравацца ў атачэнне Жыгімонта Кейстутавіча.

Адзін ліст, напісаны ў разгар канфлікту, паказвае камунікацыю супрацьлеглых лагераў пры ажыццяўленні механізму сацыяльнай абароны. У 1434 г. прадстаўнік групы Свідрыгайлы, яго шматгадовы саюзнік князь Федзька Нясвіжскі, піша да падданага польскага караля Грыцкі Кірдзеевіча і прапануе яму, нягледзячы на ваенныя дзеянні, захоўваць сяброўства[141]: *...ut sinant bellum progredi, ut libeat, ipsi vero inter se amicitiam colant, nec se in hoc negotium intromittant, sed dominis suis serviant; se operam daturum, ne quid possessiones ipsius detrimenti capiant, hoc idem sibi praestet; patere se, ut fratrem suum Iuaskonem fideiussoria cautione pro illo facta ad se recipiat, nec tamen gravem captivitatem pati sinat, illumque ad se dimittat...* Умовы сяброўства ўключаюць недатыкальнасць уладанняў, клопат пра родзічаў адзін аднаго. Федзька просіць пра ўдзел Кірдзеевіча ў паручыцельстве за яго брата, каб той пазбегнуў цяжкасцей няволі. Просьба прадугледжвае, што іх узаемныя адносіны не застануцца невядомымі вялікаму князю. Відаць, такія паводзіны не лічыліся праявай нелаяльнасці да свайго манарха і маглі легальна існаваць побач з сувязямі падданства.

У крыніцах можна знайсці болей прыкладаў такіх паручыцельстваў (нямала іх захавалася з часоў Скіргайлы). Акрамя таго, неабходна адзначыць, што гэты прававы акт не мусіў фіксавацца пісьмова (Румбоўд і Гаштаўт, знаходзячыся ў польскім палоне, прысягаюць за іншых палонных «вуснамі і рукой» — *ore et manu*[142]). Падобна, што шырока распаўсюджаным шляхам было *cautio fideiussoria* (паручыцельства; вядомы і рускі адпаведнік — *zabezepieczina*[143]) бараніць чалавека са свайго атачэння ад пагрозы. Цікава, што падобныя механізмы дзейнічалі і ў іншых дзяржавах. Так, у 1431 г. літоўскія князі і баяры

[141] Halecki O. Z Jana Zamoyskiego inwentarza... S. 217—218. Захаваўся толькі пераказ ліста.

[142] CEXV. T. 1. S. 71—72.

[143] Halecki O. Z Jana Zamoyskiego inwentarza... S. 166.

паручыліся перад палякамі за літоўскіх палонных[144]. Яшчэ раз маем магчымасць пераканацца, што ў тыя часы ажыццяўленню асабістых абавязкаў не заміналі ні дзяржаўныя межы, ні розны выбар у часе канфлікту.

в) Забойства Жыгімонта Кейстутавіча і пачатак панавання Казіміра

Гістарычныя крыніцы паказваюць, што няма падставы разглядаць панаванне Жыгімонта Кейстутавіча як перыяд рэформаў на вяршыні ўлады. Кар'ера ўсіх уплывовых асоб (за выключэннем Лелюша) пачалася яшчэ ў часы Вітаўта[145]. Звесткі з літоўскіх летапісаў трэцяга дзесяцігоддзя XVI ст., у якіх, у адрозненне ад іншых крыніц, згадваецца пра новаўвядзенні Жыгімонта, маюць супярэчлівы характар. У сярэднім ізводзе сцвярджаецца, што вялікі князь быў забіты па волі ўсіх князёў і паноў[146], тым часам, паводле шырокага ізводу (Хроніка Быхаўца), замах рыхтавала толькі кола з некалькіх прадстаўнікоў знаці[147]. Можна прывесці і больш спасылак на тое, што ў змове ўдзельнічала канкрэтная група асоб, якая імкнулася да ажыццяўлення сваіх мэт. Наўрад ці тады было магчыма казаць пра ўзгодненую думку «ўсіх паноў». Я сумняваюся, што існаваў цэльны панскі слой. Інтэрпрэтацыя ранейшых, а таксама пазнейшых падзей з выкарыстаннем катэгорыі «груп баяраў / знаці» больш блізкая да тагачаснай рэальнасці.

Яшчэ 22.09.1439 г. брандэнбургскі комтур паведаміў ордэнскім магістрам пра розныя настроі ў літоўцаў. Па яго звестках, частка літоўскай знаці была схільна пагадзіцца з палякамі, а іншая знаходзілася на баку вялікага князя: *Ouch so sint dy hern und das lant czu Littaw nicht gantcz eyns undir sich, eins teyls seyn uf*

---

[144] CEXV. T. 1. S. 70.

[145] Нярэдкія ў гістарыяграфіі згадкі пра ўзвышэнцаў часоў Жыгімонта часцей за ўсё грунтуюцца на кепскіх даследаваннях персаналій. Напрыклад, «homo novus» Гайлімін у Ёнаса Матусаса (Matusas J. Švitrigaila Lietuvos didysis kunigaikštis... P. 95) яшчэ ў 1416 г. узначальваў жамойцкую дэлегацыю ў Канстанцы.

[146] ПСРЛ. Т. 35. С. 164.

[147] Тамсама. Т. 32. С. 155—156. Сумненні Я. Нікадэма наконт праўдзівасці гэтай крыніцы не з'яўляюцца пераканаўчымі (Nikodem J. Przyczyny zamordowania... S. 10—14). Пра час і акалічнасці стварэння Хронікі Быхаўца гл.: Jasas R. Bychovco kronika ir jos kilmė... P. 8—38; Lazutka S., Gudavičius E. Albertas Goštautas ir Lietuvos istoriografija (друкапіс).

der Polen seythe geneyget und eyns teyles uf des grosforsten genaden seythe. Жыгімонт Кейстутавіч спрабаваў пакараць асоб, якія яму апаніравалі (*semeliche wirt lossen stroffen, dy uf seyne seythe nicht een seyn*)[148]. Рэмінісцэнцыі пра гэты канфлікт маглі дапамагчы панам стварыць вобраз непрыхільнага Жыгімонта ў Хроніцы Быхаўца. Тым часам, бліжэйшы да падзей Ян Длугаш гаворыць толькі пра змову некалькіх прадстаўнікоў знаці: *князь Іван Чартарыйскі, рускай веры і паходжання, з некаторымі літоўцамі і русінамі стварыў змову супраць Жыгімонта* (*...dux Iwan Czarthorysky ritus et generis Ruthenici, cum nonnulis Lithuanis et Ruthenis conspirationem contra Sigismundum... fecit*). Праўда, і ён адзначае жорсткасць Жыгімонта (яна вядомая з розных крыніц і, верагодна, была абумоўленая доўгімі гадамі ордэнскай няволі) ды намер забіць найбольш уплывовых паноў[149]. Але ўвесь кантэкст і, асабліва, далейшае развіццё падзей паказваюць, што гэта былі дзеянні, скіраваныя толькі супраць апазіцыйных да яго прадстаўнікоў знаці, згаданых у цытаваным крыжацкім лісце[150].

Ян Длугаш падае склад груп літоўскіх паноў. У першай былі віленскі біскуп Мацей, Осцік, Ян Гаштаўт, Ян Манівідавіч, Пётр Манцігердавіч. Пазней да яе далучыліся Пётр Сенька Гедзігоўдавіч, князі Алелька Уладзіміравіч, Юрый Сямёнавіч (Гальшанскі), Васіль Пуцята, Фёдар Карыбутавіч[151]. Хроніка Быхаўца ўключае ў шэраг гэтых асоб таксама Кезгайлу, Мікалая Неміровіча і Радзівіла Осцікавіча[152]. Гэтая, несумненна, самая моцная група падтрымлівала ў барацьбе за вялікакняскі стол кандыдатуру Казіміра.

Склад іншай групы — саюзнікаў Міхаіла Жыгімонтавіча — дакладна невядомы. Длугаш сцвярджае, што гэта было ніжэйшае, узвышанае Жыгімонтам баярства, а таксама жамойты. Але згаданыя ім самім два прадстаўнікі гэтай групы — Наць Гінівілавіч

[148] Lewicki A. Przymierze Zygmunta Kiejstutowicza... S. 28.

[149] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 619—620. Аналіз гэтай крыніцы гл.: Nikodem J. Przyczyny zamordowania... S. 6—10.

[150] На жаль, мы не ведаем версію змовы 1440 г. з пункту гледжання Ордэна, які ў гэтай сітуацыі быў найменш старонны. Інфармацыйную каштоўнасць Ноўгарадскага летапісу змяншае тое, што ён быў створаны ў асяроддзі аднаго з ініцыятараў забойства — Аляксандра Чартарыйскага (Chodynicki K. Geneza i rozwój podania... S. 91—92). Таксама гл. падраздзел «Праблема новых людзей» гэтай кнігі.

[151] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 621, 655.

[152] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 127.

і Міхаіл Гайлігінавіч — былі прадстаўнікамі слоя знаці[153]. Няма падстаў сцвярджаць, што Жыгімонт Кейстутавіч абапіраўся на дробнае і сярэдняе баярства, хоць, зразумела, выпадкі пратэжавання асобных былых членаў яго суправаджэння[154] маглі мець месца. Такім фаварытам, магчыма, быў ваявода троцкі Пётр Лелюш, але ён быў адным з самых актыўных прыхільнікаў змовы. Яшчэ адзін чалавек з яго атачэння, Нарбут, пасля змовы 1440 г. заняў для Міхаіла Жыгімонтавіча віленскі Верхні замак[155].

Трэцюю групу складалі прыхільнікі Свідрыгайлы. Менавіта яны, верагодна, і былі ініцыятарамі забойства, імкнучыся, каб папярэдні гаспадар вярнуўся на вялікакняскі стол. На гэта ўказваюць дзеянні Івана Чартарыйскага. Заняўшы для Свідрыгайлы троцкі Вялікі замак (на паўвостраве), ён трымаў яго з дапамогай сваіх сяброў (*per amicos et faventes sibi*) і доўга не ўпускаў прыхільнікаў Казіміра, якія перанялі ініцыятыву[156]. Дарэчы, і іншы змоўшчык — ваявода віленскі Ян Даўгерд — імем Свідрыгайлы трымаў віленскі замак[157].

Такі спектр розных арыентацый пацвярджаецца інфармацыяй Хронікі Быхаўца пра тое, што змова была акцыяй адной групы. Факт, што за ўдзел у змове Лелюш быў пазбаўлены троцкага ваяводства[158], наводзіць на думку, што гэтыя дзеянні разумеліся як незаконныя. Тым часам, Даўгерду ўдалося пазбегнуць пакарання. Літоўскі летапіс адзначае, што ён быў вельмі ўплывовым сярод паноў[159]. Падобна, што

---

[153] Бацька Наця Гінівіл у 1398 г. быў старостам троцкім, а Гайлігін удзельнічаў у уніях 1401, 1413 і 1433 гг.

[154] Згадка ў рахунковай кнізе Ягайлы (Rachunki dworu króla Władysława Jagiełły... S. 456).

[155] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 126.

[156] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 657—658.

[157] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 126.

[158] Тамсама. P. 130. Паведамленне гэтай хронікі пацвярджаюць іншыя крыніцы: ужо 13.07.1440 г. ваяводам троцкім быў Ян Гаштаўт (KDKW. S. 189), а Лелюш у крыніцах згадваецца да 1452 г. (РИБ. Т. 27. С. 8, 106; KDKW. S. 194; Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 48). На тое, што згаданы ў гэтых крыніцах гарадзенскі староста Лелюш ідэнтычны былому ваяводу троцкаму, указвае супліка ад 03.06.1450 г., у якой згадваецца яго хрысціянскае імя — Пётр (Bullarium Poloniae... 6. S. 92).

[159] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 130. На мове арыгінала — «możen u bractwe» (ПСРЛ. Т. 32. С. 157). Мацей Стрыйкоўскі пераказвае гэтае летапіснае паведамленне так: «A ten Dawgierd był możny w przyjaźń ludzką i niemało miał powinnych w radzie» (Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, żmódzka... T. 2. S. 207).

ён быў жанаты з нейкай з Гаштаўтаўнаў[160]. Тут спрацаваў той жа механізм сацыяльнай абароны (асабістыя сувязі з іншымі прадстаўнікамі знаці)[161], якімі якраз і не мог пахваліцца Лелюш. Пасярэдніцтва блізкіх сяброў было найлепшым сродкам вярнуць ласку вялікага князя. Спачатку непакорны Казіміру князь Юрый Лугвенавіч звярнуўся да хроснага бацькі сваіх дзяцей Яна Гаштаўта, просячы заступіцца за яго перад гаспадаром[162]. Толькі забяспечыўшы падтрымку знаці, можна было спадзявацца на спрыяльнае рашэнне.

Прынцыпы стварэння груп былі наступствам роднасных або сяброўскіх адносінаў. Калі пасля забойства вялікага князя склалася незразумелае становішча, Ян Гаштаўт выпраўляецца не кудысьці, а да свайго родзіча князя Юрыя Сямёнавіча Гальшанскага[163]. Яны запрашаюць у Гальшаны Кезгайлу, Мікалая Неміровіча і Радзівіла Осцікавіча. Імкнуліся радзіцца толькі з самымі блізкімі людзьмі, бо толькі на іх можна было спадзявацца. Вось у такіх сітуацыях неабходна было мець «шмат сяброў і родзічаў», каб кола вартых даверу людзей было дастаткова салідным. Можна яшчэ раз нагадаць, што жонкай Яна Гаштаўта была дачка Кезгайлы. Магчыма, Андрэй Неміровіч быў жанаты з нейкай з Гальшанскіх князёўнаў[164]. Блізкія сувязі звязвалі таксама іншых прадстаўнікоў гэтай групоўкі. Пётр Манцігердавіч быў жанаты з адной дачкой князя Фёдара Карыбутавіча Ганнай,

---

[160] MAB RS. F 256—2920: тэстамент дачкі віленскага ваяводы Даўтерда Багданы 1485 г., у якім яна называе Гаштаўтаўну сваёй маці. Праўда, гэты дакумент захаваўся толькі ў познім рэестры 1634 г., але некаторыя іншыя звесткі пацвярджаюць магчымую роднасць Гаштаўтаў і Даўгердаў (верагодна, згаданая Гаштаўтаўна была дачкой Андрэя Гаштаўта і сястрой Яна Гаштаўта). У данацыі Яна Гаштаўта Віленскай кафедры ад 31.07.1433 г. першым сярод свецкіх сведак выступае ваявода віленскі Даўтерд (KDKW. S. 147). У 1443 г. Ян Гаштаўт замяніў Даўтерда на пасадзе ваяводы віленскага. Сын Даўтерда Андрэй Даўгердавіч мог атрымаць у спадчыну імя дзеда па лініі маці.

[161] Ён быў пароднены таксама з Саковічамі (агульны герб, суседства ўладанняў).

[162] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 134. Пра тое, што Казімір вярнуў яму вотчыну, згадвае таксама ліст магістра Ордэна лівонскаму магістру (LUB. Bd. 10. S. 209).

[163] Lietuvos metraštis: Bychovco krónika... P. 127. Сын Яна Гаштаўта Марцін быў жанаты з дачкой Юрыя Сямёнавіча Ганнай.

[164] У «Слуцкай памянной кнізе» пачатку XVI ст., у якой асобы запісаны паводле сваёй родавай прыналежнасці, ля тытула «Родъ пани Андреевои Немировои» запісаны князі Сямён, Агрыпіна, Ян (MAB RS. F 21—799). Такое спалучэнне імёнаў характэрна толькі для Гальшанскіх. Праўда, тут маглі мець на ўвазе і Андрэя Якубавіча Неміровіча, які жыў у першай палове XVI ст.

а пасля яго смерці стаў апекуном астатніх дзвюх. Ёсць падстава меркаваць, што маці Ганны паходзіла з роду Гальшанскіх[165]. Ян Гаштаўт выдаў сваю дачку за князя Сямёна Алелькавіча (праўда, у гэтым выпадку шлюб мог адбыцца і пасля разгледжаных падзей). Мужам другой дачкі Кезгайлы быў Пётр Сенька Гедзігоўдавіч, стрыечным братам якога быў Ян Манівідавіч. У 1456 г. Длугаш вылучае групу на чале з Янам Манівідавічам, да якой адносіць перш за ўсё канцлера (Міхаіла Кезгайлавіча) і яго родзічаў (*et aliis de genere suo*)[166]. Такім чынам, нават далёка няпоўныя звесткі з крыніц дазваляюць раскрыць узаемныя адносіны прадстаўнікоў знаці, што грунтаваліся на роднасных сувязях. Разам з тым бачна, што эліта ўлады шырока практыкавала эндагамную матрыманіяльную палітыку, якая кансервавала склад знаці.

Персанальны склад групы Міхаіла Жыгімонтавіча вядомы не так добра, таму цяжка сказаць пра прынцыпы яе складання нешта пэўнае. Хоць Ян Длугаш і сцвярджае, што Жыгімонтавіча падтрымлівалі жамойты, іншыя крыніцы паказваюць іх дастаткова амбівалентную пазіцыю. Асабістыя адносіны з жамойтамі былі амаль перарваныя (жамойцкае паходжанне мела толькі бабуля Міхаіла). Група была ў большай ступені звязана з мазавецкімі князямі, якія сталі асноўнымі яе пратэктарамі.

Жамойцкія баяры вырашалі свае праблемы, імкнучыся як мага лепей выкарыстаць наяўныя акалічнасці. На гэта павінны былі звяртаць увагу і прадстаўнікі літоўскай знаці, і яны спачатку вярнулі Контаўта, які падтрымліваў Міхаіла Жыгімонтавіча, на пасаду старосты (замест абранага жамойтамі Даўмонта, які быў родзічам Контаўта)[167]. Нягледзячы на пазнейшую «рэстаўрацыю» Кезгайлаў, Контаўт застаўся на пасадзе жа-

[165] Tęgowski J. Pochodzenie kniaziów Iwana i Fiodora Nieświckich // Genealogia: studia i materiały historyczne. 1996. T. 7. S. 129.

[166] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 228. Гэта вылучэнне, як пазней убачым, не зусім дакладна адлюстроўвае сітуацыю ў літоўскай палітычнай эліце, сама адсылка да роднасных сувязяў вартая ўвагі.

[167] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 131. Добры аналіз гэтых падзей гл.: Halecki O. Litwa, Ruś i Żmudź.... Таксама: Rowell S. C. Išdavystė ar paprasti nesutarimai? Kazimieras Jogailaitis... P. 49—53; Rowell S. C. Rusena karas Žemaičiuose....

мойцкага старосты[168]. Гісторыя яго роду, хоць і вядомая вельмі фрагментарна, таксама дапамагае лепей уявіць сабе тагачасную структуру літоўскай знаці. Жамойцкае паходжанне Контаўта не выклікае сумненняў. У сярэдзіне XV ст. яго брат Даўят памяняўся з жамойцкім біскупам атрыманымі ў спадчыну ад бацькі землямі ў Расейнах[169]. У наданні Жыгімонта Кейстутавіча іншаму яго брату Біралу Гейтутавічу 1436 г. згадваецца таксама яго імя па бацьку[170]. Сын Контаўта Ян пазней ажаніўся з дачкой Алехны Судзімонтавіча, а яго ўласная дачка выйшла замуж за Шэмета[171]. Апошні ў сваю чаргу ідэнтычны Шэмету Нямейкавічу, родзічу Гайлігінаў, згаданаму сярод спадчыннікаў Ваверкі (у Ліцкім павеце)[172]. Андрэй Гайлігін у 1413 г. браў удзел у жамойцкай дэлегацыі на працэс з крыжакамі. У Гародлі ён атрымаў герб Лебедзь, якім карысталіся пазнейшыя Шэметы. Гэты прыклад паказвае, што ў родзе Гайлігінаў захоўвалася сувязь са старой вотчынай і яе баярамі, а таксама тлумачыць шлюбную стратэгію Контаўта.

Такая генеалагічная сувязь дазваляе ў некаторай ступені зразумець «цёмную» групоўку Міхаіла Жыгімонтавіча. Контаўт стаў жамойцкім старостам яшчэ ў часы Жыгімонта Кейстутавіча[173]. Наданні гэтага князя яму і яго брату пацвярджаюць прыхільнасць гаспадара. Міхаіл Гайлігінавіч вядомы як прыхільнік Міхаіла Жыгімонтавіча[174]. У святле сувязяў з Жыгімонтам цікавым уяўляецца выбар імя сына Гайлігінавіча — Жыгімонт, якое было дастаткова рэдкім у тагачаснай Літве[175]. Магчыма, не будзе занад-

---

[168] Верагодна, спецыяльна для яго была ўведзена градацыя жамойцкіх старостаў, напрыклад, дакумент ад 08.08.1452 г.: «obirsterhouptmann» — Ян Кезгайлавіч і «houptmann» — Контаўт (Index corporis historico-diplomatici Livoniae, Esthoniae, Curoniae... T. 2. S. 16. № 1890).

[169] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 40.

[170] MAB RS. F 256—3528. Магчыма, што імя па бацьку скажонае, бо вядома толькі позняя копія дакумента.

[171] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami... S. 134.

[172] KDKW. S. 284—285.

[173] Lietuvos Metrika. 6-oji Teismų bylų knyga / Parengė S. Lazutka ir I. Valikonytė. Vilnius, 1995. P. 269, 271—272.

[174] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 657.

[175] Наданне імя сеньёра нашчадку васала было пашыранай з'явай у феадальнай Еўропе. Гл.: Mitterauer M. «Senioris sui nomine». Zur Verbreitung von Fürstennamen durch das Lehenswesen // Mitteilungen des Instituts für österreichische Geschichtsforschung. 1988. Bd. 96. S. 275—330.

та смелым дапусціць, што выбар імя нейкім чынам звязаны (напрыклад, праз хрост) з кантактамі гэтых асоб.

Нельга сцвярджаць, што ў выпадку раскрыцця асабістых сувязяў знаці самі сабой стануць зразумелымі палітычныя падзеі канца XIV — першай паловы XV ст. Гэта толькі адзін з аспектаў даследавання, якому ў гістарыяграфіі надаецца недастаткова ўвагі. Асноўная яго перавага — гэта магчымасць звярнуць увагу на групавыя палітычныя структуры знаці, якія, як паказваюць вынікі гэтага даследавання, з'яўляюцца больш прыдатнымі інтэрпрэтацыйнымі катэгорыямі, чым цяжка дыферэнцаваныя паняцці стану, слоя. Гэтыя групы часцей за ўсё структураваліся на падставе роднасці і, разам з тым, мелі сувязі з якім-небудзь прадстаўніком дынастыі Гедзімінавічаў. Такія «падвойныя» сувязі гарантавалі бяспеку ў часе канфліктных сітуацый. Усе тры прааналізаваныя прыклады не пацвярджаюць гіпотэзу пра змаганне сацыяльных слаёў (напрыклад, буйнога і сярэдняга ці дробнага баярства). Вялікія князі не ажыццяўлялі перыядычнага абнаўлення складу пануючай эліты. У сярэдзіне XV ст. мы сустракаем у яе складзе ўсё тых жа асоб пералому XIV—XV ст. або іх нашчадкаў. Эндагамная матрыманіяльная палітыка сведчыць пра разуменне гэтымі асобамі выключнасці свайго становішча.

г) 1447—1492 гг.: кансалідацыя знаці

Згодна са сцвярджэннем Роўэла, які даследаваў адносіны Казіміра Ягелончыка і прадстаўнікоў літоўскай знаці, у гэты перыяд фармуецца закрытае кола літоўскіх паноў[176]. Ці ўказвае гэта на тое, што разнастайныя групы замяняюцца адзіным шырокім станам знаці? А калі так, у які час гэта адбываецца? Першыя рысы кансалідацыі знаці можна заўважыць ужо ў пачатку панавання Казіміра. Самыя ўплывовыя прыхільнікі Міхаіла Жыгімонтавіча — Наць Гінівілавіч, Міхаіл Гайлігінавіч, Контаўт і Нарбут — дастаткова хутка перайшлі на бок групоўкі, што перамагла. Наць Гінівілавіч і Контаўт захавалі пасады берасцейскага і жамойцкага старостаў. Міхаіл Гайлігінавіч стаў старостам

[176] Rowell S. C. Išdavystė ar paprasti nesutarimai? Kazimieras Jogailaitis... P. 55—56, 59.

дарагічынскім. Усе яны былі адораныя новымі ўладаннямі[177]. Сярод тых, хто падтрымліваў Міхаіла Жыгімонтавіча, прадстаўнікоў знаці больш не засталося[178]. Ордэнскі ўраднік таксама звярнуў увагу на згоду літоўскай знаці[179].

Тое, што літоўская знаць у шостым дзесяцігоддзі XV ст. была расколата, можна даказаць, грунтуючыся на паведамленні Яна Длугаша пад 1456 г. пра існаванне дзвюх груп паноў. Першая, на чале якой стаялі Ян Манівідавіч і Міхаіл Кезгайлавіч, была верная Казіміру. Тым часам, згуртаваная вакол Яна Гаштаўта група імкнулася зрабіць вялікім князем Сямёна Алелькавіча[180]. Не дзіўна, што ў некаторых пытаннях меркаванні прадстаўнікоў знаці разыходзіліся. Ян Гаштаўт ужо ў 1453 г. трапіў у нямілась да гаспадара[181]. Гісторыкі, што даследавалі падзеі гэтага перыяду, выказваюць думкі, што менавіта Ян Гаштаўт быў ініцыятарам замаху на жыццё Казіміра ў тым годзе[182]. Але ў лісце торунскага комтура, на які спасылаюцца гэтыя даследчыкі, няма размовы пра планаванне замаху. Наколькі можна зразумець з «патрапанага» тэксту, Казімір пацярпеў, уключыўшыся ў нейкую спрэчку. Тое, што ордэнскія інфарматары перабольшылі пагрозу для Казіміра ў Літве, паказваюць яго ўласныя паводзіны: яшчэ ў тым жа годзе Казімір спакойна паляваў у Літве[183]. У кожным выпадку, ніякіх захадаў супраць Гаштаўта не было прынята. Ве-

---

[177] Напрыклад: Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 49, 63, 64. Наданне Нарбуту: Тамсама. P. 27, 68.

[178] Па звестках мемельскага комтура, на пераломе 1445–1446 гг. Контаўт яшчэ спрабаваў радзіцца з Жыгімонтавічамі і па гэтай справе ездзіў у Трокі (LUB. Bd. 10. S. 127). Магчыма, гэта была спроба пасярэдніцтва пра мір, а не абяцанне вялікакняскага стала, як меркаваў комтур. У іншым ордэнскім паведамленні (1447 г.) размова ідзе пра тое, што ўплывовыя літоўцы не жадаюць вяртання Міхаіла (Тамсама. S. 231).

[179] Ліст рагніцкага комтура магістру Ордэна ад 29.06.1451 г. (GStA PK, OBA 10789): «der rath und die grosten herren haben sich wol und eyntrechtiglich mitenandir gescheiden».

[180] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 228. Гл.: Halecki O. Dzieje Unii... T. 1. S. 394—395; Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego za Jagiellonów. T. 1. Warszawa, 1930. S. 291—292.

[181] GStA PK, OBA 12573; Rowell S. C. Išdavystė ar paprasti nesutarimai? Kazimieras Jogailaitis... P. 54.

[182] Halecki O. Ostatnie lata Świdrygiełły... S. 210—211; Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... T. 1. S. 273. Яны грунтуюцца на паведамленні торунскага комтура (Caro J. Geschichte Polens. Bd. 5. Gotha, 1886. S. 481—482).

[183] GStA PK, OBA 12556.

рагодна, у нямілась ён трапіў у чэрвені, калі адмовіўся ехаць на Парчэўскі з'езд. Ордэнскі сведка тых падзей інфармаваў вялікага магістра, што з'езд пакінула не толькі літоўская дэлегацыя, але і тыя літоўцы, што былі пры двары Казіміра, за выключэннем некаторых каралеўскіх слуг нізкага паходжання[184]. Як мы ўбачым пазней, каралеўскія прыдворныя засталіся, але прадстаўнікі літоўскай знаці ў Парчэве дзейнічалі адзінадушна. Сітуацыю ўскладняла спрэчка з палякамі наконт Валыні пасля смерці Свідрыгайлы ў 1452 г. Калі праз год сітуацыя засталася нявырашанай, літоўцы нават пачалі збіраць войска для паходу на Луцк[185]. У жніўні таго ж года прадстаўнікі літоўскай знаці (князь Юрый Сямёнавіч Гальшанскі, Ян Гаштаўт, Ян Манівідавіч, Пётр Манцігердавіч) дэманстратыўна самастойна напісалі ліст да магістра Ордэна, у якім выказалі жаданне ўмацаваць сувязі з Ордэнам, і даслалі да яго сваіх прадстаўнікоў на чале з Барташам Монтаўтавічам[186]. Літоўскія паслы скардзіліся на палякаў, якія нібыта лічылі іх сваімі падначаленымі, у той час, калі яны прызнавалі ўладу толькі свайго вялікага князя[187].

Літоўская знаць адзінадушна дзейнічала і пазней[188]. Таму неабходна асцярожна ацэньваць сцвярджэнне Длугаша пра існаванне асобных груп. Наўрад ці існавалі нейкія супярэчнасці наконт кандыдатуры Сямёна Алелькавіча (а пазней Радзівіла Осцікавіча). Верагодна, гэта было добра апрабаваным сродкам ціску на Казіміра (неаднойчы выкарыстоўвалася і пазней), каб змусіць яго больш займацца справамі Літвы[189]. Адкрытай канфрантацыі з каралём пазбягалі, а дэманстратыўныя

[184] GStA PK, OBA 12131; Halecki O. Ostatnie lata Świdrygiełły... S. 212; Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... T. 1. S. 273—274. Сп. 8.

[185] GStA PK, OBA 12395 (паведамленне пра падрыхтоўку ў Жамойці).

[186] GStA PK, OBA 12336.

[187] GStA PK, OBA 12392; Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... T. 1. S. 277—278. Сп. 1; Rowell S. C. Išdavystė ar paprasti nesutarimai? Kazimieras Jogailaitis... P. 54.

[188] Параўн. аўтараў лістоў магістру Ордэна і эльбінгскаму комтуру ад 28.05.1455 г. і 15.09.1456 г. (віленскі біскуп Мікалай, Судзівой, Ян Гаштаўт, Ян Манівідавіч, Наць [ён згадваецца толькі ў першым лісце, на момант напісання другога, верагодна, ужо памёр], Пётр Манцігердавіч, Андрэй Саковіч) (GStA PK, OBA 13725 і 14635). Неабходна адзначыць, што разам дзейнічалі Ян Гаштаўт і прадстаўнікі г. зв. «групоўкі Казіміра» Ян Манівідавіч і Андрэй Саковіч.

[189] У 1461 г. (калі Ян Гаштаўт ужо не жыў) літоўцы, паводле Яна Длугаша, ізноў патрабавалі, каб Казімір пастаянна знаходзіўся ў Літве або каб вялікім князем быў абвешчаны Сямён Алелькавіч (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 314).

крокі суправаджаліся жэстамі, скіраванымі на ўлагоджванне канфлікту. У той час, калі Ян Гаштаўт не пагаджаўся з каралём, Андрэй Саковіч і Ян Неміровіч дапамагалі ажыццяўляць шлюбную палітыку Казіміра[190]. Існавалі таксама іншыя магчымасці ўрэгулявання канфлікту. Цалкам верагодна, што сярод прыдворных Казіміра быў сын Яна Гаштаўта Марцін, які ў 1460 г. разам з нашчадкам іншага знатнага роду Альбертам Янавічам Манівідам знаходзіўся ў складзе пасольства Казіміра на перагаворах з чэхамі[191]. Толькі так можна патлумачыць уключэнне гэтых асоб, што раней практычна не сустракаюцца ў крыніцах, у дэлегацыю[192]. Гэту гіпотэзу ўскосна пацвярджае шлюб паміж сястрой Марціна Гаштаўта Марынай і іншым прыдворным Казіміра Янам Кучуковічам у 1458 г.[193].

Такая тактыка лавіравання дазволіла літоўскай знаці абараніць свае інтарэсы на Валыні і развіць самастойную палітыку ў адносінах з Ордэнам. Даследчыкі схільныя казаць пра антыкрыжацкую палітыку Кезгайлавічаў, супрацьпастаўляючы яе тактыцы перагавораў з Ордэнам «групоўкі Яна Гаштаўта»[194]. Сапраўды, жамойты пастаянна нападалі на тэрыторыю Лівоніі, перашкаджалі камунікацыі галін Ордэна. Дзеянні жамойцкага старосты Яна Кезгайлавіча нельга інтэрпрэтаваць як безумоўную падтрымку Казіміра і Польшчы ў Трынаццацігадовай вайне. Па-першае, прыгадаем, што яго бацьку Міхаіла Кезгайлавіча і дзядзьку Судзівоя Валімонтавіча здаўна звязвалі сяброўскія адносіны з ордэнскімі ўраднікамі[195]. Сам Ян Кезгайлавіч у часе вайны камунікаваў з магістрам Ордэна, самастойна дасылаючы да яго паслоў[196]. Яго паводзіны былі дастаткова амбівалентнымі. Ён не мог пярэчыць гаспадару, акрамя таго, яму было цяж-

[190] Перагаворы наконт шлюбу Казіміра з дачкой Альбрэхта II Эльжбетай. Адзначым, што сын Андрэя Багдан на той час быў гаспадарскім пакаёвым (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102).

[191] Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 144.

[192] Альберт Янавіч Манівід перад гэтым згадваецца толькі ў тэстаменце бацькі Яна Манівідавіча 1458 г. (Semkowicz W. Przywileje Witołda dla Moniwida... S. 261—262).

[193] Bullarium Poloniae... 6. S. 258.

[194] Halecki O. Dzieje Unii... T. 1. S. 395; Pietkiewicz K. Kieżgajłowie i ich latyfundium... S. 31; Dundulis B. Lietuvos kova dėl valstybinio... Vilnius, 1993. P. 208—211.

[195] Гл. спасылку 133.

[196] GStA PK, OBA 15620, 15855, 27876; LUB. Bd. 11. S. 652—653.

ка стрымліваць сваіх падначаленых. Яго адказы магістру, аргументаваныя няведаннем ці ад'ездам, можна ацэньваць як дыпламатычную рыторыку, але цяжка не заўважыць жадання захаваць добрыя адносіны з магістрам. Яшчэ перад пачаткам вайны ўлады Ордэна трактавалі літоўскую знаць як магчымых пасярэднікаў у канфлікце, які выспяваў[197], а каля 1459 г. праз сваіх паслоў дзякавалі літоўцам за іх паводзіны і абяцалі хваліць іх перад папам, імператарам, іншымі каралямі і князямі[198]. Закрыццё меж ордэнскія ўраднікі не лічылі ваеннымі дзеяннямі[199], а напады жамойтаў не былі нейкай асаблівай з'явай, характэрнай толькі для Трынаццацігадовай вайны[200]. Самым гучным іх чынам стаў напад на Мемель у канцы 1455 г.[201]. Але ў крыніцах няма звестак, што гэтай акцыяй кіраваў Ян Кезгайлавіч. Верагодна, гэта быў шараговы напад жамойтаў[202]. Нельга разглядаць гэты напад на Мемель як «стратэгічны». Літоўцы, за выключэннем перыяду канфлікту Вітаўта з Ордэнам, ніколі не прад'яўлялі правоў на гэтыя землі. Прапанову Казіміра за падтрымку яго палітыкі ўзяць сабе Усходнюю Прусію, а Ордэн перасяліць на Падолле літоўскія паны адкінулі[203]. На наваградскім з'ездзе 1457 г. знаць у прысутнасці гаспадара адмовілася ўдзельнічаць у вайне супраць Ордэна і згадзілася выконваць свае ваенныя

---

[197] Ліст прадстаўнікоў Ордэна да вялікага магістра ад 20.05.1453 г. (Rowell S. C. Išdavystė ar paprasti nesutarimai? Kazimiéras Jogailaitis... P. 70. Дадатак № 6). Неабходна звярнуць увагу на характарыстыку літоўскіх арыстакратаў: «dy wegisten littauwisschen herren», г. зн. найбольш уплывовыя літоўскія паны.

[198] GStA PK, OBA 27945 (недатаваная інструкцыя ордэнскім паслам).

[199] 30.04.1457 г. эльбінгскі комтур пісаў магістру Ордэна: «das die Littawen zcu desen gescheften [вайна з палякамі] stille sitczen. Sunder sie lossen nymanden herap zcu uns zcyhen adir uns zcufuren. Und sie wollen ouch den ewigen frede unnorbrochen halden» (GStA PK, OBA 14881).

[200] Жамойты часта дзейнічалі цалкам самастойна, і вялікі князь не заўсёды кантраляваў іх дзеянні. Напрыклад, у 1438 г. Жыгімонт Кейстутавіч пры выдачы мітрапаліту Ісідору дазволу падарожнічаць праз сваю краіну заўважыў, што за жамойтаў паручыцца не можа, бо яны «an nichtis begunden und vorsuchten adir diplich teten» (LUB. Bd. 9. S. 159).

[201] LUB. Bd. 11. S. 382—384.

[202] Напады жамойтаў згадваюць у жніўні-верасні 1452 г. (г. зн. яшчэ напярэдадні Трынаццацігадовай вайны) у сваіх лістах да вялікага магістра мемельскі і рагніцкі комтуры. Характэрна, што абодва ўраднікі спадзяюцца, што гэтая справа будзе вырашана на перагаворах вялікага магістра і жамойцкіх старостаў (GStA PK, OBA 11345, 11392).

[203] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... T. 1. S. 294—295.

абавязкі згодна са старым звычаем толькі ў Літве (*manschafft im felde tzu Littawen nach alder gewonheit tzu geleysten*)[204]. У баявых дзеяннях удзельнічалі толькі прадстаўнікі літоўскай знаці маладзейшага пакалення, што жылі пры двары Казіміра і служылі ў асабістай харугве караля[205].

Такім чынам, аналіз крыніц не дае падставы казаць пра нейкія канфлікты сярод прадстаўнікоў эліты ўлады. Параўнанне персанальнага складу ўраднікаў у Польшчы і Літве паказвае, што Казімір значна больш актыўна ажыццяўляў развіццё палітычнай эліты Польшчы. Абапіраючыся толькі на польскія аналогіі і заўвагу Яна Длугаша, які глядзеў з польскай перспектывы, нельга казаць пра існаванне «каралеўскай групоўкі» ў Літве. Тым не менш, літоўская знаць і Казімір, нягледзячы на непаразуменні, якія часам узнікалі, здолелі стварыць дастаткова цвёрды палітычны кансэнсус, які задавальняў абодва бакі. Літоўскія паны падтрымлівалі дынастычную палітыку Казіміра, а той забяспечваў іх дамінуючае становішча ва ўладных структурах. Знаць падтрымала Казіміра пры ліквідацыі ім удзельнага Кіеўскага княства, таксама ў 1481 г., калі ён стлуміў змову Міхаіла Алелькавіча, Яна Юр'евіча Гальшанскага і Фёдара Бельскага[206], і, што самае істотнае, у 1492 г., калі вялікім князем быў адзінадушна абраны сын Казіміра Аляксандр. Варта адзначыць, што гэта быў хіба што першы выпадак мірнай перадачы вялікакняскага стала ў спадчыну з моманту прыходу да ўлады Гедзімінавічаў. Часткова гэта было абумоўлена палітыкай самой дынастыі[207], дзякуючы якой была сфармулявана ідэя, што

---

[204] GStA PK, OBA 14822.

[205] Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102; Jarmolik W. Kariery polityczne dworzan litewskich... S. 94—96. Толькі ў самым канцы вайны ў 1466 г. пад Хойніцамі змагаўся літоўска-татарскі атрад на чале з Янам Хадкевічам (асоба кіраўніка сведчыць пра тое, што гэта было падраздзяленне наймітаў) (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 441).

[206] Гэту змову гістарыяграфія абгрунтавана трактуе як праяву незадаволенасці некалькіх князёў, якой скарыстаўся вялікі князь маскоўскі Іван III (Papée F. Polska i Litwa na przełomie wieków średnich. Kraków, 1904. S. 66—82; Halecki O. Dzieje Unii... T. 1. S. 427; Krupska A. W sprawie genezy tzw. spisku książąt litewskich w 1480—1481 roku. Przyczynek do dziejów walki o «dominium Russiae» // Roczniki historyczne. 1982. R. 48. S. 121—146). Цікава, што іх родзічы захавалі свой уплыў і вотчынныя ўладанні. Напрыклад, Аляксандр Юр'евіч Гальшанскі ў 1486 г. стаў старостам горадзенскім, а ў 1492 г. — віленскім каштalянам.

[207] Rowell S. C. Dynastic Bluff? The Road to Mielnik, 1385—1501 // Lithuanian Historical Studies. 2001. Vol. 6. P. 1—22.

гаспадарамі могуць стаць толькі прамыя нашчадкі Ягайлы. Але перамога гэтай ідэі не ўяўляецца магчымай без згоды знаці.

Кансалідацыя знаці лепш за ўсё раскрываецца пры разглядзе яе асабістых сувязяў. Калі ў 1458 г. памерлі Ян Гаштаўт і Ян Манівідавіч, віленскім ваяводам стаў сваяк першага Міхаіл Кезгайлавіч. Дачкі Яна Манівідавіча выйшлі замуж за Алехну Судзімонтавіча і Мікалая Радзівілавіча, дачка Яна Кезгайлавіча — за сына Міхаіла Монтаўтавіча. З дачкой Алехны Судзімонтавіча пазней ажаніўся сын Яна Кезгайлавіча Станіслаў, а з дачкой Альберта Янавіча Манівіда — брат Станіслава Мікалай. Жонкай Пятра Янавіча Манцігердавіча была дачка Судзівоеўны, стрыечнай сястры родзіча Манівідаў Яна Вяжэвіча і Кезгайлавічаў[208]. Перапляценне шлюбных сувязяў знаці непазбежна вяло да шлюбаў родзічаў, што былі забаронены Касцёлам. Просьбы пра дазвол на адрас папы сведчылі, што гэта была актуальная праблема.

Працэс гэтай кансалідацыі пачаўся даўно. Ужо знаць эпохі Вітаўта была прадстаўнікамі выключнага слоя высакародных. Канкурэнцыя ў дынастыі Гедзімінавічаў, слабыя кантакты паміж рознымі рэгіёнамі краіны, старая родавая структура не дазвалялі сфармавацца адзінаму стану знаці. Але ў часы Казіміра становішча змянілася, і знаць пачала новы этап свайго развіцця. Групы паноў не зніклі, але змяніліся прынцыпы іх фармавання. Узнікненне станавых структур стварыла ўмовы для прамой камунікацыі. Характэрна, што каля сярэдзіны XV ст. паняцце «вялікакняскай рады» пачынае замяняцца паняццем «рады Вялікага Княства Літоўскага». 28.05.1455 г. літоўскія паны дасылаюць ліст як *totaque com(m)vnitas consilii terre ducatus magni Littvanie*, а мяшчане Гданьска ў 1459 г. скіроўваюць свой ліст да *den rethen des forstenthums zcu Lithawen*[209]. Знаць усё больш асэнсоўвае сябе як супольнасць, побач з родам і падданствам умацоўваецца ідэя адзінага стану.

---

[208] Спасылкі на крыніцы і літаратуру гл. у прасапаграфіі знаці.

[209] GStA PK, OBA 13725; Hansisches Urkundenbuch. Bd. 8 / Bearb. v. W. Stein. Leipzig, 1899. S. 475. У 1459 г. Алехна Давойнавіч запісвае жонцы ўладанні «з радою брати своей панов рады великого княжества» (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 52).

3. ХАРАКТАР УЛАДЫ ЗНАЦІ

Адносіны вялікага князя і баярына часцей за ўсё разглядаюцца без увагі на істотныя элементы структуры баярства. Дзякуючы такой перспектыве зацвердзілася тэорыя неабмежаванай улады вялікага князя (на думку некаторых гісторыкаў, таксама яго роду) да рэформаў XV ст. Першым яе сфармуляваў Ян Длугаш у тым жа XV ст. Але аднабаковая перспектыва «вялікі князь — баярын» скажае вобраз сацыяльнай рэчаіснасці. Адсутнасць станавых прывілеяў яшчэ не сведчыць пра тое, што баярства не мела палітычных і сацыяльных правоў. Прывілей 1387 г. быў інавацыйным, бо прынёс разуменне цэльнага стану. Улада вялікага князя, не абапертая на развітыя дзяржаўна-адміністрацыйныя структуры, не магла ажыццяўляць такі прававы кантроль, пра які гавораць раннія прывілеі. Вялікі князь мог ажыццяўляць уладу толькі пры дапамозе той ці іншай знаці. Тэарэтычна гаспадары маглі рэгуляваць склад эліты ўлады, але даследаванне паходжання знаці эпохі Вітаўта паказала, што на практыцы яны рэдка калі маглі карыстацца гэтым правам. Сацыяльная мабільнасць існавала, але наступствы ўзвышэння залежалі ад здольнасці інтэгравацца ва ўжо зацверджаныя сацыяльныя структуры.

Улада знаці была рэальным палітычным чыннікам на пераломе XIV—XV ст. Згоды з ёю шукаў кожны гаспадар, што ўзыходзіў на вялікакняскі стол. У 1431 г. Ягайла, апісваючы пачатак свайго кіравання, адзначаў, што ён стаў вялікім князем з волі і згоды свайго бацькі Альгерда, князёў і баяраў: *quod nos ex genitoris nostri olim magni ducis Lythwanie Olgerdi, ducum et boyarorum unanimi accedente consensu eleccione constitucione approbacione et ligittima successione, semper suppremus princeps heres verus legittimus et dominus naturalis magni ducatus Lythwanie Russieque terrarum fuimus*[210]. Падобны механізм, верагодна, меў на ўвазе і Вітаўт, калі ў 1398 г. рыхтаваў акцыю па абвяшчэнні сябе каралём. Хроніст Ёган Позільге яскрава перадаў рэакцыю літоўцаў на патрабаванне палякаў плаціць ім чынш: *sie waren fry gewesin und eldern... und weldin blibin by irre irsten fryheit*[211].

[210] CEXV. T. 2. S. 257—258.

[211] SRP. Bd. 3. S. 219 («яны і іх бацькі заўсёды былі свабоднымі... і яны хочуць застацца пры сваёй першаснай свабодзе»).

Устаўка ў зборы ордэнскіх актаў 1430 г. раскрывае змест гэтай свабоды. Прадстаўнікі літоўскай знаці сцвярджаюць, што яны з самых даўніх часоў былі свабоднымі, мелі вялікага князя, а калі той памыліў, абіралі іншага[212]. Гэта не было толькі пустой рыторыкай. Парадак спадчыннасці ў дынастыі Гедзімінавічаў пакідаў нямала прасторы для выяўлення волі знаці. Прынцып перадачы ў спадчыну, як сведчаць цытаваныя вышэй словы Ягайлы, не супярэчыць магчымасці выбараў. Іх суіснаванне ў сярэдневечнай манархіі — гэта, хутчэй, не выключэнне, а правіла[213]. Свабоду выбару абмяжоўвалі выключныя правы Гедзімінавічаў на кіраванне дзяржавай, але *dominus naturalis* адначасова маглі адчуваць сябе некалькі асоб. Ва ўмовах такой канкурэнцыі здольнасць заваёўваць сімпатыі эліты рабілася першачарговай праблемай кожнага прэтэндэнта, якую пачыналі вырашаць яшчэ калі папярэднік быў жывы (групоўкі і інш.). Пра тое, што іх кандыдатуры на вялікакняскі стол вылучылі прадстаўнікі знаці, ясна кажуць Свідрыгайла і Казімір[214].

У крыніцах захавалася нямала прыкладаў, якія сведчаць пра ўплыў знаці на рашэнні вялікага князя. У 1396 г. літоўскія паны прысягаюць трымацца перамір'я з Нямецкім ордэнам і заклікаюць Вітаўта зрабіць гэта[215]. У паведамленні прадстаўніка Ордэна 1401 г. пра перагаворы з літоўцамі прыведзены словы Мінігайлы, які ад імя знаці абяцае паспрыяць, каб Вітаўт не адступаў ад права ў сваіх дзеяннях: *wir sehen unsern heren* [Вітаўт] *nicht unrecht thun, tete er unrecht, wir welden in gerne czum halden dorczu, das her recht tuen sulde*[216]. Прысягу Вітаўта імператару Святой Рымскай імперыі Жыгімонту ў 1412 г. асобна пацвердзілі сваімі гарантыямі прадстаўнікі літоўскай знаці[217]. Вераагодна, такія прысягі мелі сэнс, калі яны патрабаваліся. На пра-

---

[212] Тамсама. S. 493: «Dye herren von Lyttawen unde Rewsen goben vor, das sye von angenge unde y weren freye herren gewest, eynen grosfursten sye vor eren herren hylden, wen der abegynge, sye eyn andern mochten yrwelen, den vor eren herren welden halden».

[213] Bloch M. Społeczeństwo feudalne. Warszawa, 1981. S. 566—568.

[214] Гл. спасылку 121. Заява Казіміра — GStA PK. OF 15. S. 280—282.

[215] GStA PK. OF 2c. S. 11 («gelouben Gote, das wir besunderen unszeren heren Wytawt und alle, die wir vormogen, in unszerem lande dorczu halden wellen nach allen unszeren vormogen»).

[216] CEV. S. 79.

[217] «...ipsum dominum Allexandrum magnum ducem Lithuanie... ad hoc tenebimus et nostris hortamentis inducemus» (CEXV. T. 2. S. 55).

цэсе 1413 г. сваю пазіцыю па пытанні старых наданняў Міндоўга літоўцы аргументавалі тым, што гэтыя наданні былі зроблены без згоды знаці[218]. Нарады вялікага князя з прадстаўнікамі знаці абавязкова папярэднічалі кожнаму важнаму кроку. У крыніцах пастаянна сустракаюцца звесткі пра нарады, дарадцаў (*consiliarii, rath, rathen* і інш.). Інстытуцыялізацыя рады вялікага князя[219] была важнай, але не вызначальнай падзеяй у палітычным жыцці краіны. Вызначэнне прэрагатыў рады ў законах было абумоўлена зацвярджэннем пісьмовай культуры ў жыцці дзяржавы, а таксама нязручнасцямі, што былі выкліканы сталым знаходжаннем гаспадара ў іншай краіне. Але гэта не было якаснай трансфармацыяй кіравання. Інстытут нарад у Сярэднявеччы быў умовай існавання ўсякай улады, а няўдзел у прыняцці рашэнняў у некаторых выпадках мог нават быць падставай для іх ігнаравання. Зразумела, што рэальныя акалічнасці звычайна абмяжоўвалі ажыццяўленне такой магчымасці, але парушаць інтарэсы значных асоб было небяспечна.

У паведамленнях замежных паслоў часта фіксуюцца абставіны і дэталі такіх нарад. Калі ў 1418 г. Свідрыгайла ўцёк з турмы, *licht Vitovte sulve to Trakken, und is seer bedrövet umme des willen..., wente he sik seer besorget vor verretnisse, und heft Mannewiten und de uppersten meenliken bi sik to Trakken und geit alle dage mit en to rade*[220]. Неабходна звярнуць увагу на тое, што Вітаўт, які баіцца здрады, трымае *найвышэйшых мужоў* пры сабе і штодня з імі радзіцца. Такія пасяджэнні звычайна былі таемнымі, у іх удзельнічалі толькі найбольш уплывовыя асобы[221]. Падчас нарад прымаюцца важныя для жыцця дзяржавы рашэнні, як, напрыклад, пазіцыя па пытанні каранацыі Вітаўта[222], а таксама абмяркоўваюцца паводзіны ў надзвычайных сітуацыях[223]. Па звестках рагніцкага комтура, дзяку-

[218] Lites ac res gestae... T. 2. P. 298.

[219] Пра гэта гл.: Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 10—22.

[220] LUB. Bd. 5. S. 340—341.

[221] «Und Vytout hadde to der tid sin upersten beyaren all to hope gheladen, und wat zée dedinghen, dat en konde numment vervaren, dat was all heimelik» (CEV. S. 757).

[222] «...cum subditis nostris desuper tractare, quomodo confusionem et illibertatem quibus ipse dominus rex Polonie nos et terras nostras innodare et opprimere niteretur» (ліст Вітаўта да польскіх паноў 1429 г. — Тамсама. S. 837).

[223] У 1383 г. Ягайла апраўдваўся, што не можа прыехаць да магістра Ордэна, бо «mine herin die wellin mirs nicht gestaten» (LUB. Bd. 3. S. 492).

ючы парадзе Манівіда і Сунгайлы было заключана перамір'е з жамойтамі[224]. Верагодна, з гэтай падзеяй звязаны запіс пад тым жа месяцам (чэрвень 1404 г.) у кнізе ордэнскага скарбніка, паводле якога магістр даслаў жонцы Манівіда спецыяльна набытую ў Гданьску дарагую тканіну з Араса[225]. Паслы замежных краін нярэдка спачатку наведвалі якога-небудзь знаёмага прадстаўніка літоўскай знаці, каб лепш зразумець сітуацыю на перагаворах. У 1399 г. рыжскія паслы па дарозе да Вітаўта спачатку наведалі Мінігайлу ў Ашмянах[226]. У 1421 г., калі ўзрасла напружанасць паміж Ордэнам і Літвой, да Манівіда прыехалі ордэнскія паслы[227], мэтай якіх, верагодна, было схіліць яго да пасярэдніцтва ў перагаворах з Вітаўтам. І пазней улады Ордэна, спрабуючы вырашаць палітычныя праблемы і пашырыць сетку сваіх саюзнікаў, неаднойчы выкарыстоўвалі кантакты з прыхільнымі да іх прадстаўнікамі знаці. Напрыклад, Судзівой Валімонтавіч, які здаўна падтрымліваў шчыльныя сувязі з ордэнскімі ўраднікамі, напярэдадні Трынаццацігадовай вайны размаўляў з каралём, які прыехаў у Літву, па справе Ордэна. У сваім лісце да маршала Ордэна ён, акрамя іншага, дзякаваў за дары і абяцаў перадаць іншыя Яну Гаштаўту[228].

Наўрад ці можна пагадзіцца з катэгарычным меркаваннем Авіжоніса і значнай часткі іншых гісторыкаў, што вялікі князь радзіўся са знаццю толькі тады, калі сам таго жадаў, і што ён не быў звязаны ніякімі абмежаваннямі адносна персанальнага складу такіх нарад[229]. Непадобна, што канцылярыя

[224] Ліст магістра Ордэна да Манівіда ад 30.06.1404 г.: «de consilio vestri et nobilis Sungayl cum Samaythensibus treugas pacis statuit» (CEV. S. 100).

[225] Das Marienburger Tresslerbuch der Jahre 1399—1409 / Hrsg. v. E. Joachim. Königsberg, 1896. S. 308.

[226] LUB. Bd. 6. S. 312.

[227] LUB. Bd. 5. S. 725.

[228] Ліст Судзівоя Валімонтавіча да маршала Ордэна ад 22.11.1453 г. (Górski K. Kilka dokumentów toruńskich z r. 1453 // Zapiski Towarzystwa naukowego w Toruniu. 1949. T. 15. S. 181—186). У лісце да вялікага магістра Ордэна маршал адзначае, што Судзівой не дазволіў яго паслу ехаць наўпрост да Гаштаўта (Судзівой згадвае пра кепскія дарогі). Магчыма, што гэткім чынам ён спрабаваў абараніць прадстаўнікоў Ордэна ад кантактаў з Гаштаўтам, які трапіў у няміласць да гаспадара (01.12.1253 г. — GStA PK, OBA 12573).

[229] Avižonis K. Die Entstehung und Entwicklung des litauischen Adels... S. 76, 143—144. Падобныя думкі выказвае таксама аўтар навейшай працы пра вялікакняскую раду: Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 65—75.

вялікага князя строга ўжывала тытул «дарадцы» (*conciliarius*)[230]. Параўнанне з сітуацыяй на нямецкіх землях паказвае, што інстытуцыяналізацыя рады і дарадцаў была доўгачасовым працэсам, які скончыўся толькі ў эпоху ранняга Новага часу. Да самага канца XV ст. рада манарха не была рэгулярна скліканай інстытуцыяй з дакладна акрэсленай колькасцю членаў і кампетэнцыяй[231]. Фармуючы свой двор па заходнім прыкладзе[232], Вітаўт спрабаваў увесці інстытут пастаянных дарадцаў, але і ў яго часы нельга правесці выразную мяжу паміж дарадцамі, што пастаянна жылі пры двары і часта працавалі ў канцылярыі, і шырэйшай радай, што збіралася час ад часу. Згаданы Манівід ніколі ясна не называецца дарадцам, а Сунгайла названы гэтак толькі аднойчы напрыканцы жыцця. Не тытулаваліся дарадцамі і ўплывовыя прадстаўнікі знаці эпохі Вітаўта Чупурна і Мінігайла. Паняцце дарадцы, як і многія іншыя паняцці, доўгі час ужывалася без асаблівай дакладнасці. Гэты тытул часта прапускаўся нават у дакументах гаспадара, асабліва калі адпаведная асоба займала нейкую пасаду. Вялікі князь сапраўды фармальна мог адзін вызначаць склад рады. Але пры скліканні нарад ён павінен быў зважаць на рэальны палітычны ўплыў той ці іншай асобы. Толькі ў такім выпадку рашэнні яго рады былі дзейснымі. Склад гэтых рад — штодзённай (прыдворнай) і шырэйшай (з прадстаўнікоў знаці) — нярэдка перакрыжоўваўся, але адрозненні ў іх функцыях і аўтарытэце разумеліся ўжо тады. Найбольш важныя дзяржаўныя справы гаспадар вырашаў толькі з другой радай. Менавіта яе меў на ўвазе Свідрыгайла, калі пасля свайго абрання прапаноўваў Ягайлу сустрэцца з удзелам «вялікай ці вышэйшай рады» (*maiore et seniore consilio*) з абодвух бакоў[233].

---

[230] Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 24. Л. Корчак першая ў гістарыяграфіі падрабязна разгледзела ўжыванне паняцця «дарадцы» ў вялікакняскай канцылярыі.

[231] Ahrens K.-H. Residenz und Herrschaft: Studien zur Herrschaftsorganisation, Herrschaftpraxis und Residenzbildung der Markgrafen von Brandenburg im späten Mittelalter. Frankfurt am Main, 1990. S. 89—92; Lackner Ch. Hof und Herrschaft. Rat, Kanzlei und Regierung der österreichischen Herzoge (1365—1406). München, 2002. S. 115—124.

[232] Petrauskas R. Vytauto dvaras: struktūra ir kasdienybė // Naujasis Židinys-Aidai. 2003. Nr. 1—2. P. 39—44.

[233] AGAD, dok. perg., № 4450; Бучинський Б. Кілька причинків до часів вел. князя Свитригайла... С. 117—142 (дакумент Свідрыгайлы ад 07.11.1430 г.).

Магістры Ордэна, якія добра ведалі пра ўплыў знаці на кіраванне дзяржавай, асабіста дасылалі ім лісты, у якіх называлі іх сваімі любымі сябрамі і магутнымі панамі (*amicus noster, grosmechtiger herre und libir frundt*)[234]. Тых, хто прыязджаў у якасці паслоў, часам прымалі паводле цырыманіялу сустрэчы манарха. Такую сустрэчу ўлетку 1430 г. у Кёнігсбергу арганізаваў маршал Ордэна, які ў атачэнні членаў канвента і мяшчан выйшаў сустракаць літоўскіх паноў, якія прыехалі ў суправаджэнні, што налічвала 100 коней (!)[235]. Цікава, што прадстаўнікі знаці непасрэдна камунікавалі з вышэйшымі ўладамі Ордэна, а не з мясцовымі ўраднікамі «свайго ўзроўню»[236], адпраўлялі да магістраў паслоў, абменьваліся дарамі, нават давалі дазвол на свабодны праезд праз тэрыторыю краіны[237].

Хоць наданне зямель было правам вялікага князя, знаць і тут нярэдка дзейнічала дастаткова самастойна. Вядома, што ў часы Вітаўта Манівід надаў поле віленскаму мешчаніну, а пазней гэта рашэнне пацвердзіў Міхаіл Кезгайлавіч[238]. Падобна паводзілі сябе Пётр Манцігердавіч і Ян Кезгайлавіч[239]. Не заўсёды было магчыма дайсці да вялікага князя, таму ініцыятыву бралі ў свае рукі мясцовыя ўраднікі. Верагодна, падобная практыка дзейнічала і ў выпадку з судом. Гаспадар прызначаў суддзяў і прымаў канчатковыя судовыя рашэнні. Але ён звычайна абіраў на пасады суддзяў прадстаўнікоў мясцовай знаці, якія добра ведалі справы і часам судзілі самастойна[240]. На жаль, мы ведаем толькі нязначную частку рашэнняў і наданняў прадстаўнікоў знаці XV ст. Нямала загадаў тады аддавалася вусна, а копіі створаных знаццю дакументаў рэдка траплялі ў дзяржаўны архіў.

Адсутнасць вялікіх латыфундый у перыяд да Вітаўта для абсалютнай большасці даследчыкаў з'яўляецца паказчыкам

---

[234] Ліст магістра Ордэна да Манівіда 1404 г., яго ліст да Манівіда і Сунгайлы 1415 г. (CEV. S. 100, 327) і інш.

[235] GStA PK, OBA 5406, 5410.

[236] Часам мемельскі ці рагніцкі комтуры нават прасілі магістра, каб ён сам напісаў да старосты жамойцкага (GStA PK, OBA 11345 і 11392).

[237] GStA PK, OBA 15620.

[238] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 7. Вильна, 1870. С. 2; AGAD, Archiwum Radziwiłłów, spr. XI/57, ark. 9.

[239] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 39; MAB RS. F 256—4214, 4216, 4255, 4297.

[240] Напрыклад, у справе 1482 г., разгледжанай Янам Кезгайлавічам, няма спасылкі на даручэнне вялікага князя (MAB RS. F 37—798).

незаможнасці знаці[241]. Але наўрад ці ў тыя часы зямля з'яўлялася адзіным крытэрыем заможнасці. Многае вызначала права на падзел ваеннай здабычы, атрыманне данін ці дароў. У 1427 г. наўгародцы прывезлі дары не толькі Вітаўту, але і яго вышэйшым баярам (*ok so begiffteden zee ffuste all meistlich sin upersten beyaren*)[242]. Ян Длугаш пастаянна падкрэсліваў шчодрасць Ягайлы і Вітаўта ў адносінах да сваіх баяраў[243]. Гэтым спосабам не толькі адплочвалі саюзнікам, але і вербавалі новых прыхільнікаў. Магістр Ордэна скардзіўся бургундскаму герцагу, што Вітаўт незаконнымі абяцанкамі і дарамі вярбуе ордэнскіх падданых: *maximam multitudinem paganorum partim neophitorum subditorum ordinis nostri falsis promissionibus et muneribus exquisistis clandestine nobis ignorantibus sibi alliciens*...[244]. Такую палітыку праводзілі таксама пазнейшыя князі, як, напрыклад, Міхаіл Жыгімонтавіч, які, паводле Яна Длугаша, таксама заахвочваў сваіх прыхільнікаў дарамі і абяцанкамі (*muneribus et promissis*)[245].

Вялікакняская «рэформа» землеўладання часткова была абумоўленая тым жа абавязкам адплочваць сваім падданым. Змяншэнне колькасці ваенных выпраў у канцы XIV ст. змусіла ўлады шукаць новыя формы наданняў. Пачаўся падзел зямель з людзьмі, што яе апрацоўвалі. Зямля паступова станавілася крытэрыем заможнасці. Поспех панавання таго ці іншага князя, калі глядзець вачыма прадстаўніка знаці, залежаў ад палітыкі зямельных наданняў, якую ажыццяўляў князь. У 1434 г. пасол Ордэна Ганс Балга цытаваў сваю таемную размову з Андрэем Саковічам і сынам Няміры, якія параўноўвалі часы Жыгімонта Кейстутавіча і Свідрыгайлы праз прызму прывілеяў на землі, якія яны раздавалі: *Item so gebet her* [Жыгімонт] *alle den, dy ir veterliche erbe besitczen, gutthe hantfeste... und ouch alle den, den zein bruder belent hot, derglichen. Demethe machet her dy luthe willig... wy lip hot uns unser herre, das tate Switrigalle nicht*[246].

---

[241] Напрыклад: Łowmiański H. Studja nad początkami... T. 1. S. 274—280; Ivinskis Z. Geschichte des Bauernstandes in Litauen... S. 115.

[242] CEV. S. 757.

[243] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 421, 534—535.

[244] Codex diplomaticus Prussicus... Bd. 5. S. 156.

[245] Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 43.

[246] LUB. Bd. 8. S. 502. Цікава, што можна знайсці нават непасрэдныя сведчанні прыхільнасці Жыгімонта Кейстутавіча да родзічаў гэтых людзей. Напрыклад, ён надаў брату Андрэя Саковіча Станьку маёнтак Ула (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 29).

Але самай вялікай каштоўнасцю лічыліся не землі (свабоднай зямлі не бракавала), а залежныя людзі. Храністы Нямецкага ордэна XIV ст. нярэдка згадваюць чэлядзь прадстаўнікоў літоўскай знаці[247]. Слова *familia* добра перадае сувязь паміж баярынам і яго людзьмі. Апошнія ідэнтыфікавалі сябе са сваім панам. Віганд з Марбурга апавядае, што схопленыя падчас адной выправы людзі на пытанне, чые яны, адказалі: баярына Вайдылы[248]. Дзінабургскі комтур вёў перагаворы пра выплату за забітых людзей, што належалі Манівіду, непасрэдна з ім[249]. Можна дапусціць, што Манівід прэтэндаваў на пэўную кампенсацыю за гэта злачынства, што робіць выдавочнымі яго судовыя функцыі ў адносінах да залежных людзей.

Асабліва істотна тое, што акрамя несвабоднай чэлядзі пры дварах знаці служылі таксама баяры. У XV ст. з'яўляюцца першыя наданні знаці сваім слугам[250]. Пры разглядзе сістэмы пасад я згадваў пра падвойную прыроду старостваў. Гэта шчыльна звязана з праблемай кіравання людзьмі. Лакальная ўлада знаці абапіралася не толькі на дэлегаваныя гаспадаром правы, але і на існаванне мясцовай іерархіі. Атрад з 400 воінаў на чале з Бушкам дзейнічаў па суседстве з яго вотчыннымі землямі, таму ўзаемная сувязь гэтага атрада і яго кіраўніка, верагодна, не была наступствам толькі даверанай вялікім князем улады. Несумненна, гэты атрад не супадаў з Бушкавай *familia*, але апошняя не ахоплівала ўсяго магчымага спектра адносінаў залежнасці. Сацыяльная дыферэнцыяцыя высакародных не магла не ўплываць на сістэму мясцовай улады. Як «дзяржаўная» сістэма пасад дубліравала мясцовыя структуры, так і княская ўлада над людзьмі магла «перакрыжоўвацца» з уладай знаці. У 1455 г. Ян Гаштаўт прызнае правы на вёску Тыкоцін (дакладней, яе частку) за сваім падданым (*fideli dilecti*) баярынам Мацеем[251].

---

[247] Напрыклад, у Хроніцы Германа з Вартберга (SRP. Bd. 2. S. 113): «Fuit eciam tunc capta uxor cujusdam satrape nomine Kanthalge cum filiis ac tota familia (тады схапілі жонку аднаго баярына Канталга з сынамі і ўсёй чэлядзю)».

[248] Тамсама. S. 576.

[249] LUB. Bd. 5. S. 195—196.

[250] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1... P. 122; KDKW. S. 245, 249. Параўн. таксама пазнейшую сітуацыю XVI ст.: Sienkiewicz W. Bojarzy-szlachta i ziemianie w dobrach prywatnych w Wielkim Księstwie Litewskim w I połowie XVI w. // Zapiski historyczne. 1983. T. 48. S. 31—65.

[251] Biblioteka XX. Czartoryskich w Krakowie. Teki Naruszewicza. Vol. 18. № 184.

Абставіны гэтай падзеі не зусім зразумелыя. Верагодна, Ян Гаштаўт дапамог свайму падданаму вярнуць сабе зямлю, якую ён калісьці страціў. Ствараецца ўражанне, што пан аказвае падтрымку сваім людзям у мясцовых справах. Між іншым, у якасці сведак у дакуменце выступаюць яго служылыя баяры. Захаваўся яшчэ адзін дакумент пра дзейнасць Яна Гаштаўта ў гэтай падляшскай мясцовасці, якую ён атрымаў як бенефіцый. У 1436 г., займаючы пасаду намесніка ў далёкай смаленскай зямлі, ён сваім аўтарытэтам пацвярджае баярыну і свайму падданаму (*nostri fideli*) Пятру і яго нашчадкам Тыкоцінскае войтаўства, нададзенае вялікім князем Вітаўтам і мазавецкім князем Янушам Старэйшым[252]. Гэты дакумент, фармуляр якога нагадвае граматы, што выдаваліся ў канцылярыі вялікага князя, яскрава сведчыць пра ўладу прадстаўніка знаці над мясцовымі баярамі.

У крыніцах XV ст. сустракаюцца звесткі і пра іншых баяраў, што служылі ўплывовым панам. Пад 1416 г. у люблінскіх земскіх кнігах згадваецца *cliens* Гедзігоўда *Pirko*[253]. У 1432 г. Кезгайла дасылае свайго слугу (*dyner*) у Мемель[254]. Пэўныя даручэнні на тэрыторыі Ордэна выконваў слуга Судзівоя[255]. На тое, што такія слугі былі баярамі, указвае атрыманне імі зямель. Напрыклад, слуга Контаўта Мікалай атрымаў ад свайго пана вёску[256]. У 1461 г. Андрэй Даўгердавіч адарыў групу сваіх слуг, у 1485 г. тое ж зрабіла Мілохна Гедзігоўдава[257]. Напісаны Казімірам каля 1485 г. ліст да старосты ковенскага Станькі Касцевіча сведчыць, што дробныя баяры часам пераходзілі на службу да прадстаўнікоў знаці цэлымі сем'ямі. Баяры Нартаўтавічы скардзіліся, што іх прымушаюць служыць, хоць яны былі *у племени пану Станку Судвоевичу*. Гэта пацвярджае таксама стрыечны брат Станькі

[252] AGAD, dok. perg., № 780 (захавалася пячатка Яна Гаштаўта з гербам Абданк).

[253] Цыт. паводле: Sochacka A. Zjazdy polsko-litewskie w Lublinie i Parczewie w czasach Władysława Jagiełły // Annales Universitatis Mariae Curie-Skłodowska. Sectio F. 1986—1987. Vol. 41—42. S. 73.

[254] GStA PK, OBA 6896.

[255] GStA PK, OBA 15287. Яго слуга згадваецца таксама ў лісце 1453 г. (Górski K. Kilka dokumentów... S. 185).

[256] Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 43.

[257] KDKW. S. 245; MAB RS. F 6—38, F 43—17943, F 256—1730, F 318—23839; РИБ. Т. 20. S. 386.

Судзівоевіча Ян Кезгайлавіч[258]. Тры браты Пяткевічы служылі ў Алехны Судзімонтавіча[259]. Па ўсёй верагоднасці, у Літве пачынаў пашырацца звычай «медыятызацыі» дробных баяраў. Такія баяры, не маючы магчымасці самастойна валодаць сваімі землямі ці даказаць высакароднае паходжанне, пераходзілі служыць да прадстаўнікоў знаці і, магчыма, нават атрымлівалі іх гербы. Паны даручалі ім кіраваць сваімі маёнткамі (напрыклад, у 1490 г. згадваецца ўраднік маёнтка Мікалая Радзівілавіча — кіраўнік райгарадскага маёнтка[260]), давяралі адміністрацыйныя функцыі (у 1460 г. Альберт Янавіч Манівід даслаў сваіх баяраў вызначыць межы паміж яго уладаннямі і землямі віленскага арцыдыякана Мацея[261]), фармавалі з іх атрады для ваенных экспедыцый[262]. У выпадку неабходнасці яны прадстаўлялі знаць на з'ездах родзічаў. У 1485 г., верагодна, ужо цяжка хворы (памёр у тым жа годзе) Ян Кезгайлавіч даслаў свайго слугу баярына (*nobilis*) Паўла Езяроўскага ўдзельнічаць у данацыі сваёй сястры Мілохны Гедзігоўдавай касцёлу ў Радашкавічах[263].

Асабліва істотным быў рэпрезентацыйны аспект баярскага суправаджэння. З'яўляючыся ў атачэнні вялікай групы людзей, прадстаўнік знаці ў штодзённай сітуацыі дэманстраваў выключнасць свайго становішча, падкрэсліваў сваю ўладу, як над залежнымі людзьмі, так і над баярамі. Разам з родзічамі і сябрамі яны складалі тое атачэнне, у якім прадстаўнік знаці мог бяспечна жыць нават будучы ў апазіцыі да гаспадара. З іншага боку, з такім суправаджэннем паны маглі падтрымліваць свой статус на міжнародных з'ездах, адчуваць сябе роўнымі прадстаўнікамі верхняга слоя вышэйшага стану. Крыніцы і ў гэтым выпадку не

---

[258] MAB RS. F 256—2272—2273.

[259] У 1486 г. згадваецца яго баярын («дворянин») Сёмка Пяткевіч (AGAD, dok. perg., № 7374), а ў 1489 г. — Станіслаў і Жура Пяткевічы (AGAD, dok. perg., № 6725).

[260] GStA PK, OF 18b. S. 271—271v: «anwald czu Reygrot» (у лацінскім перакладзе таго часу — «officialis»). У 1487 г. смаленскі намеснік Ян Іллініч даслаў ліст кіраўніку («служебник») аднаго двара Станьку (MAB RS. F 31—1234).

[261] KDKW. S. 266—268.

[262] У 1471 г. Мікалай Неміровіч дае распараджэнне сваёй жонцы, каб яна пасля яго смерці далей «duas hastas pro expedicione belli solitas ordinare et expedire debebit, ad quas bellorum expediciones seu terrestria negocia boyari et servitores Zuchowiczczi et Tuchanowczy et Lissiczczi et quicunque alii ad eandem Hiskolth spectant et pertinent» (KDKW. S. 316).

[263] KDKW. S. 400.

надта шчодрыя, у іх рэдкá з'яўляюцца паведамленні пра суправаджэнне прадстаўнікоў знаці. Тым не менш, з аднаго падрабязнага спіса, складзенага пры двары баварскага герцага, можна даведацца пра ўдзельніка цырымоніі шлюбу ў Ландсхуце каля 1475 г. — Альберта Янавіча Манівіда. На двор баварскага герцага Манівід прыехаў у атачэнні 50 людзей, якія сваёй шматлікасцю вылучалі яго з шэрага іншых польскіх паноў, што суправаджалі дачку Казіміра Ядвігу, якая выходзіла замуж за баварскага герцага Юрыя. Гэта выклікала павагу мясцовай знаці[264].

Колькасць службовых баяраў у маёнтках знаці ўсё павялічвалася, і таму нядзіўна, што ў адным дакуменце 1488 г. сустракаецца маршалак Пятра Янавіча Манцігердавіча[265]. Цяжка сказаць, у якім сэнсе было ўжыта гэтае паняцце. У гэтым выпадку магло мець значэнне месца стварэння дакумента. Пётр Янавіч Манцігердавіч у той год быў старостам луцкім і маршалкам Валынскай зямлі, дзе яшчэ з часоў Свідрыгайлы магло існаваць «шырэйшае» разуменне пасады маршалка. З іншага боку, сваіх прыдворных маршалкаў мелі таксама староста жамойцкі Ян Кезгайлавіч[266] і ваявода віленскі Алехна Судзімонтавіч[267]. Выбар гэтага паняцця сведчыць пра тое, што знаць, па прыкладзе гаспадара, пачала фармаваць уласныя двары, на чале якіх стаялі старэйшыя прыдворныя ўраднікі.

Такіх службовых баяраў (*armigeri alias boiari*) прадстаўнікі знаці нават перадавалі адзін аднаму разам з маёнткамі, як у 1492 г. гэта зрабіла Сафія Манівідаўна Радзівілава. Яна адзначыла, што ў выпадку непаслухмянасці баяраў іх павінен будзе супакоіць сваім аўтарытэтам яе муж ваявода віленскі[268]. Несумненна, службовыя баяры захоўвалі права сысці ад пана, але ў

[264] Hiereth S. Zeitgenössische Quellen zur Landshuter Fürstenhochzeit. Landshut, 1959; Biskup M. Wokół «Landshuckiego wesela» 1475 roku // Biskup M., Górski K. Kazimierz Jagiellończyk. Zbiór studiów o Polsce drugiej połowy XV wieku. Warszawa, 1987. S. 297—298.

[265] Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 141—142.

[266] У 1457 г. дакумент выдадзены пры ўдзеле «domino Minelgo marchione domini capitanei Samogitiae» (Codex Mednicensis... 1. P. 100). Гэты дакумент — фальсіфікат, але, хутчэй за ўсё, грунтуецца на ранейшай фундацыі меншага аб'ёму. Спіс сведак, за выключэннем няправільна запісанага пазнейшым пісарам паняцця маршалка, не выклікае паважных сумненняў.

[267] У яго дакуменце ад 15.05.1489 г. як сведка выступае «Zura marschalkoni curie nostre» (AGAD, dok. perg., № 6725).

[268] AGAD, dok. perg., № 7386.

такім выпадку, калі толькі ранейшы прывілей не прадугледжваў адваротнага, яны пазбаўляліся нададзеных ім маёнткаў. У другой палове XV ст., пры наданні панам буйных уладанняў, вялікі князь адначасова перадаваў ім і мясцовых баяраў[269].

Выпадкі «перадачы ў спадчыну» ўрадаў, ператварэнне бенефіцыяў у феоды, узнікненне службовага баярства паказвае, што ў XV ст. у Літве склаліся ўмовы для фармавання федальнай сістэмы (васалітэту). Цікава, што самі прадстаўнікі знаці ведалі прынцыпы такой сістэмы. Мікалай Неміровіч ва ўжо цытаваным дакуменце 1471 г. сцвярджаў, што баяры служаць яму *ex iure feodali*[270]. Ужо ў XIV ст. баярства было сацыяльна неаднародным. Узнікненне новай сацыяльнай групы — службовага баярства — істотна паглыбіла гэта расслаенне. Семантычна гэтае адасабленне азначае тое, што ў другой палове XV ст. прадстаўнікі знаці ўжо нідзе не называліся баярамі. Складзеныя з баяраў атрады (харугвы) сталі адной з асноўных вызначальных рыс атачэння знатнага пана. Рэпрэзентацыйная і ваенная вага гэтага суправаджэння і імкненне больш дакладна акрэсліць паняцце «пан», што ўсё больш пашырала сваё семантычнае поле і нават стала адметнай рысай сярэдняга баярства, абумовіла тое, што ў пачатку XVI ст. літоўская знаць пачала выкарыстоўваць пераняты з Польшчы і Чэхіі тытул «харугоўны пан».

Можна было б сцвярджаць, што ўсё гэта — вынік дэвальвацыі ўлады вялікага князя, што адбылася ў XV ст. Але некалькі эпізодаў з хронік Нямецкага ордэна паказваюць, што такое разуменне ўлады нашмат больш старажытнае. Храніст Нямецкага ордэна Герман з Вартберга апісвае экспедыцыю крыжакоў 1360 г. на двор прадстаўніка літоўскай знаці Эйгінта, якога ён называе *satrapa*. Той, паводле храніста, хваліўся *se posse et velle omnes christianos et Theutonicos ex Livonia exterminare, iam castris per eum suis consanguineis et amicis deputatis*[271]. Прадстаўнік літоўскай знаці мысліў у катэгорыях улады, калі

[269] Напрыклад, 02.06.1494 г. вялікі князь Аляксандр пацвердзіў Ганне, жонцы Марціна Гаштаўта, правы на Дарагабуж, якім перад тым валодаў Ян Гаштаўт і яго сын Марцін, «з мясцовымі баярамі» («cum boyaris terrigenis») (AGAD, dok. perg., № 4784).

[270] KDKW. S. 317.

[271] SRP. Bd. 2. S. 80.

збіраўся прызначыць у замкі на заваяванай тэрыторыі сваіх родзічаў і сяброў. Эйгінт нават не згадвае пра правы вялікага князя, якія, зразумела, павінны былі ўлічвацца. Але яны — гэта толькі вышэйшы ўзровень улады (часам амаль абстрактны). У рэальнасці ўлады гаспадара і знаці функцыянавалі адна побач адной. Вяленскі староста і продак слыннага роду Гаштаўт, які ў 1364 г. здаўся ў палон крыжакам, звярнуўся пры гэтым да маршала Ордэна, каб той абыходзіўся з ім з павагай, як належыць[272]. Маршал выканаў гэта і даслаў яго ў свой намёт. У гэтым эпізодзе мы бачым камунікацыю двух высакародных з розных грамадстваў, якая грунтуецца на ўзаемнай павазе і прызнанні. У паводзінах Гаштаўта адлюстроўваецца разуменне высакароднасці літоўскай знаці, што з'яўляецца падставай улады, у ёй можна ўбачыць правобраз велічы будучых пакаленняў.

[272] Тамсама. S. 547 («ut ob honorem et laudem, sicut decerunt, eum captivum accipere dignaretur»).

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Мэта гэтай працы — крытыка пануючай у гістарыяграфіі тэорыі, паводле якой вярхушка літоўскага баярства толькі каля сярэдзіны XV ст. сфармавала сваю самастойную ўладу. Крыніцы не дазваляюць адэкватна зразумець ролю знаці ў палітычных працэсах XIII—XIV ст. Толькі з канца XIV ст., калі пісьмовая культура ўвайшла ва ўнутранае жыццё Літвы, склаўся комплекс крыніц, які больш падрабязна адлюстроўвае рэаліі краіны. З пачаткам гэтага перыяду робіцца зразумелым уплыў прадстаўнікоў знаці на сістэму кіравання. Таму можна казаць пра скажоную перспектыву ранніх крыніц. У кнізе акрэсліваецца паняцце знаці, разглядаецца паходжанне, склад і структура літоўскай знаці канца XIV—XV ст. Вызначэнне складу і структуры знаці дазваляе зразумець падставы ўлады гэтай сацыяльнай групы і казаць пра дуалізм улады вялікага князя і знаці. Можна вылучыць дзве асноўныя тэндэнцыі развіцця літоўскай знаці ў XV ст. — персанальны кантынуітэт і ўнутраную трансфармацыю (структуры роду), якія адпавядаюць працэсам, што адбываліся сярод заходне- і сярэднееўрапейскай шляхты.

У другой палове XIV ст. літоўскае баярства было значным сацыяпалітычным фактарам. Тэрміналогія хронік Нямецкага ордэна сведчыць, што ўжо тады яно было дастаткова дыферэнцаванай сацыяльнай групай. Прадстаўнікі яе вышэйшага слоя засяродзілі ў сваіх руках асноўныя ўладныя функцыі. Яны кіравалі ваеннымі атрадамі, замкамі, мясцовымі палітычнымі структурамі.

Прадстаўнікі гэтага слоя ў крыніцах XIV ст. называюцца баярамі, аднак у тым жа стагоддзі ўжываліся паняцці, што падкрэслівалі іх высокі статус (*meliores, proceres, satrapa, nobilis satrapa, meliores satrapae*). У XV ст. адбыўся працэс дэвальвацыі паняцця «баярын», у часе якога яно хоць і засталося агульнай назвай усяго вышэйшага стану, але ў паўсядзённым жыцці стала сінонімам дробнага баярства.

Спісы сведак гаспадарскіх дакументаў (тэстацыі) дазваляюць вылучыць групу асоб, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў

кіраванні дзяржавай. На працягу ўсяго перыяду даследавання ў гэтых спісах сустракаюцца прадстаўнікі адных і тых жа родаў. Пра выключнасць гэтай групы (знаці) сведчыць шлюбная палітыка яе прадстаўнікоў, асноўным прынцыпам якой было заключэнне шлюбаў з асобамі таго ж рангу або княскага паходжання. Хоць гэтая сацыяльная група і не была акрэслена ў прававым сэнсе, а дробныя баяры тэарэтычна маглі трапіць у яе склад, вынікі даследавання паказалі, што гэта ўдалося зрабіць толькі вельмі нязначнай частцы ніжэйшага баярства.

Стабільнасць складу знаці пацвярджаецца спадчыннай прыродай гэтага сацыяльнага слоя. Брак крыніц і іменаслоў баярства не дазваляюць вызначыць генеалагічныя сувязі ранняга перыяду. Тым часам, пра знаць эпохі Вітаўта можна цвёрда сказаць, што яна складалася з нашчадкаў высакародных. Гіпотэза пра знішчэнне ці выміранне старой [родавай] знаці неабгрунтаваная. Крыніцы нічога не кажуць пра ажыццяўленне вялікім князем экстэрмінацыі знаці; немагчыма таксама даказаць тэзіс пра «выміранне».

Асноўныя вотчынныя ўладанні знаці эпохі Вітаўта размяшчаліся на тэрыторыі г. зв. «сапраўднай» Літвы. З цягам часу шляхам шлюбаў ці гаспадарскіх наданняў яны здолелі пашырыць свае ўладанні па ўсім Вялікім Княстве.

Распаўсюджаная ў гістарыяграфіі тэорыя пра першапачатковасць улады вялікага князя, з якой выводзіцца ўся структура кіравання грамадствам, неадэкватна адлюстроўвае складанае пытанне пра функцыянаванне ўлады ў сярэднявечнай Літве. Замест строгай храналагічнай мяжы, якая адасабляе «першасную» ўладу князёў і «другасную» ўладу баярства, можна хутчэй казаць пра розную ступень гэтых улад і іх суіснаванне. Улада знаці мела свае карані. Гаспадар мог пашырыць межы гэтай улады або, наадварот, зменшыць палітычны ўплыў пэўнай асобы, але пазбавіцца знаці або знішчыць яе ён не мог. І ўвогуле, тэорыя пра канкурэнцыю гаспадара і знаці наўрад ці абгрунтаваная. Вялікія князі не ажыццяўлялі свядомага абнаўлення эліты ўлады, а знаць, безумоўна, прызнавала вышэйшую ўладу вялікага князя. Канфлікты XIV—XV ст. нельга інтэрпрэтаваць як рэакцыю знаці супраць гаспадара. Прадстаўнікі знаці паўставалі супраць таго вялікага князя, які парушаў іх правы, але гэтымі змовамі не ставілі пад пытанне права дынастыі Гедзімінавічаў на ўладу. Было б цал-

кам памылковым супрацьпастаўляць гаспадара, што клапаціўся пра цэльнасць дзяржавы, знаці, што падтрымлівала тэндэнцыі дэцэнтралізацыі. Несумненна, знаць імкнулася як мага больш цвёрда ўмацавацца на ўласных землях, але цэласці дзяржавы гэта не пагражала. Прадстаўнікі знаці, што канцэнтравалі свае ўладанні ў розных рэгіёнах краіны і завязвалі роднасныя сувязі з мясцовай эліtай, былі зацікаўлены ў захаванні адзінай цэнтральнай улады.

Дзейнасць прадстаўнікоў знаці нельга зразумець, калі разглядаць іх асобна ад сацыяльнага атачэння. Прасапаграфічнае даследаванне паказвае, што структурнай умовай улады знаці быў род. Грамадскія сувязі, што паўставалі дзякуючы роднасці, дазвалялі фармаваць функцыянальную ўладу на месцах і ўмацоўваць уплыў асобных прадстаўнікоў знаці на жыццё дзяржавы.

Тагачасны род не быў першабытнай закрытай супольнасцю, але пастаянна зменнай групай людзей з «адкрытай структурай», дзе роднасць з бакоў бацькі і маці мела прыблізна аднолькавае значэнне. Структура такога роду не была стабільнай, бо кожнае пакаленне існавала ў новай родавай канстэляцыі. Па гэтай прычыне землеўладанне тагачаснага роду не было стабільным, і яго склад мяняўся з кожным новым падзелам, шлюбам ці перадачай у спадчыну. У такіх умовах доўгі час не маглі ўзнікнуць спадчынныя родавыя імёны, а таксама доўгачасовыя «родавыя гнёзды». Гэтая акалічнасць абумовіла «раскіданую» структуру землеўладання знаці. Палітычная каардынацыя ўнутры роду не з'яўляецца сама сабой зразумелай рэччу, але відавочна, што роднаснымі сувязямі паслугоўваліся пры фармаванні палітычных груп. Асноўнымі функцыямі роду было забеспячэнне сваім членам сацыяльнай стабільнасці, абароны асоб і клопат пра іх памяць.

Са стварэннем новых дзяржаўных структур і ўкараненнем сістэмы ўрадаў адбывалася непазбежная трансфармацыя старога роду ў строга структураваны агнатычны род, у якім дамінавала мужчынская спадчынная лінія. Гэтую трансфармацыю, звязаную з працэсам канцэнтрацыі ўлады ў руках асобных галін знатных родаў, адлюстроўвае ўзнікненне спадчынных родавых імёнаў («прозвішчаў») і генеалагічнай самасвядомасці.

Аналіз сістэмы мясцовых урадаў паказвае, што тапаграфія кіравання старостаў звязана з геаграфіяй іх паходжання, г. зн. старостамі звычайна прызначалі асоб, што мелі ў тых месцах

вотчынныя ўладанні. Гэта дазволіла сфармуляваць гіпотэзу пра падвойную прыроду староства. У тагачасных умовах пры стварэнні дзяржаўных адміністрацыйных структур было проста неабходным узяць на дапамогу мясцовую іерархію. Таму сцвярджэнне пра «службовы характар літоўскага баярства» спрашчае сацыяльныя і палітычныя адносіны ў літоўскім грамадстве. Праўда, у другой палове панавання Казіміра можна заўважыць рост значэння цэнтральных урадаў. Гэта звязана з тагачаснымі працэсамі цэнтралізацыі дзяржавы, фармавання адміністрацыйных інстытуцый.

Тая акалічнасць, што свае ўладанні (якія ўжо ў часы Вітаўта не былі такімі малымі, як пра гэта гаворыць старэйшая гістарыяграфія) знаць у XV ст. мела ў розных частках краіны, дазваляла ёй умацоўваць сваю ўладу ў рэгіёнах, а таксама завязваць асабістыя сувязі з мясцовым баярствам. Акрамя таго, гэта было важным фактарам інтэграцыі Вялікага Княства Літоўскага.

Рытм жыцця прадстаўнікоў знаці XV ст. дыктавала выкананне даручэнняў гаспадара і кіраванне вотчынамі. У тагачасным грамадстве вотчына была асноўнай кропкай сацыяльнай камунікацыі: тут быў цэнтр мясцовай палітычнай улады, складваліся адносіны падданства, узводзіліся касцёлы. У другой палове XV ст. некаторыя прадстаўнікі знаці следам за гаспадаром ужо мелі дастаткова развітую структуру маёнтка.

Улада знаці існавала побач з уладай вялікага князя. Канкурэнцыя ў дынастыі Гедзімінавічаў дала значную прастору для выяўлення волі знаці. Разам з тым, гэта канкурэнцыя, як і роднасныя сувязі, вызначала склад груп знаці. Менавіта катэгорыя груп знаці, на чале якіх стаяў князь з роду Гедзімінавічаў, дазваляе значна больш дакладна інтэрпрэтаваць многія найважнейшыя палітычныя падзеі XV ст. Змены, што ў эпоху доўгага панавання Казіміра закранулі як пануючую дынастыю, так і знаць, прывялі да іншых прынцыпаў утварэння груп і (што яшчэ больш істотна) кансалідацыі пануючага слоя. Прадстаўнікі знаці і далей змагаліся паміж сабой за вышэйшае становішча, але, разам з тым, у другой палове XV ст. яны пачынаюць адчуваць сябе прадстаўнікамі аднаго стану.

Выпадкі «атрымання ў спадчыну» ўрадаў, ператварэнне бенефіцыяў у феоды, узнікненне службовага баярства паказва-

юць, што ў XV ст. у Літве склаліся ўмовы для фармавання феадальнай сістэмы. Гэтаму працэсу спрыялі кантакты са шляхтай суседніх і заходнееўрапейскіх краін, перайманне элементаў рыцарскай культуры, з'яўленне ў пачатку XVI ст. іерархіі тытулаў. Нашчадкі ранняга літоўскага грамадства паступова пераймалі новыя формы жыцця вышэйшага стану і станавіліся еўрапейскай шляхтай.

Змены XV ст. у сацыяльных і палітычных структурах не паўплывалі на сацыяльную кансістэнцыю знаці і яе склад. У канцы XV ст. на вяршыні ўлады мы сустракаем унукаў і праўнукаў тых знатных асоб, што жылі ў другой палове XIV ст. Дэлегаваная гаспадарскімі прывілеямі ўлада толькі ўмацоўвала, дапаўняла і прыстасоўвала да новых умоў ужо існуючыя адносіны. Аднак змянілася структура знаці: улада і маёмасць усё больш засяроджваліся ў руках адной галіны роду. Гэта зрабіла асобных прадстаўнікоў роду значна больш важнымі гістарычнымі асобамі, чым іх продкі. З іншага боку, такое развіццё мела таксама адмоўныя наступствы для сацыяльнага становішча знаці. Трансфармацыя структуры роду павялічвала небяспеку вымірання асобных родаў, а змяншэнне значэння шырокай сеткі роднасных сувязяў (неразвітая феадальная сістэма так і не здолела замяніць яе цалкам) стала адной з прычын пройгрышу знаці ў гады рэформаў сярэдзіны XVI ст.

ПРАСАПАГРАФІЯ ЛІТОЎСКАЙ ЗНАЦІ КАНЦА XIV—XV СТ. (1387—1492)

У дадзенай прасапаграфіі прадстаўлены роднасныя сувязі літоўскай знаці XV ст., асноўныя біяграфічныя звесткі, інфармацыя пра палітычную і фундацыйную дзейнасць. Гіпатэтычныя ці вартыя меншага даверу факты звычайна выносяцца ў спасылкі. Туды выносяцца таксама больш падрабязныя тлумачэнні. Канфесійная прыналежнасць пазначаецца толькі ў незразумелых выпадках. Усе прадстаўнікі літоўскай знаці, за выключэннем Братошы, Ходкі, Юршы, нашчадкаў Солтанаў, Рыгора Пратасевіча і Алізара Шыловіча, былі каталікамі. Мэта сабраць поўныя звесткі пра ўладанні (асабліва бенефіцыйныя) не ставілася. Спасылкі, што датычацца пасад, гл. у спісе пасад.

1. Імя

1а. Варыянты імя ў крыніцах

2. Герб

3. Даты жыцця

4. Роднасць:

а) бацькі

б) браты / сёстры

в) жонка (-і)

г) дзеці

5. Асноўныя вотчынныя ўладанні

6. Пасады

7. Пасольствы і інш. палітычная дзейнасць

8. *Memoria* і фундацыі

1. Осцік Крысцін

1а. Cristinus alias Ostyk, Ostik, Hostik, Ostig, Astig, Astyg, Astik, Остик.

2. Герб — Трубы.

3. Упершыню згадваецца ў дакуменце Салінскай дамовы (LUB. Bd. 4. S. 227—227). Памёр у 1442 г.

4. Бацька — Сірпуцій. Брат — Дорг (гл. пра яго). Жонка — Ганна (паходжанне не высветлена)[1]. Сыны — Радзівіл, Станька (Станіслаў), Міцька, Бартка (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 5. S. 39—41).

5. Дакладна вядома адно яго вотчыннае ўладанне — вёска Даўклібішкі (непадалёк ад Майшаголы — Jaworski R. Z najdawniejszych... S. 111). Яго бацька меў уладанні паміж Кернавам [літ. *Kernavė*] і Вількамірам [літ. *Ukmergė*] (*Sirputtindorff*) (SRP. Bd. 2. S. 695).

6. 1398—1442 г. — староста ўшпольскі [літ. *Užpaliai*] і пянянскі [літ. *Pienionys*]. 1418—1442 гг. — віленскі каштэлян.

7. Пасольствы да магістра Ордэна: 1426, 1431 і 1437 г. (CEV. S. 732; GstA PK. OBA 5636; LUB. Bd. 9. S. 116).

Адзін з найбольш уплывовых прадстаўнікоў літоўскай знаці эпохі Вітаўта і Жыгімонта Кейстутавіча.

8. Разам з жонкай згадваецца ў памянной кнізе брацтва кракаўскага Касцёла Марыі (Mitkowski J. Księga zmarłych... S. 85; Rowell S. C. Winning the Living... P. 97).

1. Осцікавіч Радзівіл (Мікалай)

1а. Radiwil Ostikowicz / Hostikowicz, Radywil, Pa(o)дивил Остикович.

2. Герб — Трубы.

3. Упершыню згадваецца ў 1411 г. у дакуменце Торунскай дамовы (CEXV. T. 2. S. 42). Як нябожчык згадваецца 13 жніўня 1477 г. (Rachunki królewskie z lat 1471—1472... S. 182).

4. Бацька — Крысцін Осцік. Браты — Станіслаў (Станька), Міцька, Барташ (Бартка). Імя і паходжанне жонкі не высветлены. На думку Тэнгоўскага, яна была дачкой Судзімонта

[1] Саламон Рысінскі ў пачатку XVII ст. у генеалогіі Радзівілаў адзначыў, што Осцік ажаніўся двойчы і з кожнай жонкай меў па тры сыны (твор пра паходжанне роду Радзівілаў: Risinskis Saliamonas. Trumpas pasakojimas apie garsiuosius šviesiausiojo didiko Biržų ir Dubingių kunigaikščio Kristupo Radvilos žygius / Parengė, vertė, komentarus ir pratarmę parašė S. Narbutas. Vilnius, 2000. P. 135). Цяжка сказаць, якімі крыніцамі карыстаўся Рысінскі, але ён слушна называе імёны трох малавядомых сыноў Осціка.

(Tęgowski J. Ślub tajemny... S. 249—252). Сын — Мікалай (гл. Мікалай Радзівілавіч)[2]. Дачка — Ганна, выйшла замуж за Пецьку Ягайлавіча (на думку Тэнгоўскага, прадстаўніка роду Давойнаў — гл. тамсама), пазней манашка (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 70; AGAD, dok. perg., № 7385).

5. Вотчынныя землі знаходзіліся ў ваколіцах Кернава, Анікштаў [літ. *Anikščiai*] і Ушполя.

6. 1420—1429 і 1440—1452 гг. — маршалак гаспадарскі. 1433—1434 і 1463—1474 гг. — маршалак земскі. 1442—1477 гг. — староста ўшпольскі і пянянскі. 1466—1477 гг. — ваявода троцкі. 1475—1477 гг. — кашталян віленскі.

7. Пасольствы да магістра Ордэна: 1446 г. (GStA PK. OF 15. S. 447—448); 1447 г. (GStA PK. OBA 9394); 1448 г. (LUB. Bd. 10. S. 288). У 1473 г. удзельнічаў у вызначэнні мяжы з Лівоніяй (Описание... Вып. 3. С. 41—42). Пасольства да татарскага хана: 1452 г. (LUB. Bd. 11. S. 262).

У 1445 г. быў адным з кіраўнікоў літоўскага войска ў вайне з Масквой (ПСРЛ. Т. 18. С. 192).

16 і 26 студзеня 1451 г. — дзве суплікі да папы. У іх прысутнічае хрысціянскае імя Радзівіла (*Nicolao Radywil domino loci de Upynyki*) (Bullarium Poloniae... 6. S. 112—113). Упнікі [літ. *Upninkai*] былі адным з вотчынных уладанняў Радзівіла Осцікавіча (Malczewska M. Latyfundium... S. 44—45).

8. Радзівіл Осцікавіч з'яўляўся фундатарам парафіяльнага касцёла ва Упніках (пацверджанне сына Мікалая 1482 г. — KDKW. S. 381—382).

1. Осцікавіч Станіслаў (Станька)

1а. Stanislaus Ostykowicz, Станько Остикович.

2. Герб — Трубы.

3. Згадваецца ў тэстаменце бацькі 1442 г. У 1446—1447 гг. разам з братамі Міцькам і Барткам атрымаў даніннікаў (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 25). У 1460 г. выступае як сведка ў данацыі ўдавы Яна Давойнавіча Ганны Крупскаму касцёлу (KDKW. S. 263).

[2] Саламон Рысінскі прыпісвае Радзівілу Осцікавічу яшчэ аднаго сына Юрыя — святара (Тамсама. P. 137, 140).

4. Бацька — Крысцін Осцік. Пра імя і паходжанне жонкі нічога не вядома. Пачынальнік лініі Осцікавічаў. Сын — Рыгор. Дачка — Ганна, жонка Юрыя Янавіча Зяновіча (АЗР. Т. 1. С. 105—106).

7. У палітычным жыцці краіны актыўна не ўдзельнічаў.

1. Барэйкавіч Васіль

1а. Wayssel filius Boreyken, Waissil Boreiken son, Васили Бореикович.

2. —

3. У канцы XIV ст. Вітаўт дасылаў яго разам з князем Яманам кіраваць Смаленскам (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 101), а з Гінвілам — ваяваць супраць Карыбута Альгердавіча (ПСРЛ. Т. 35. С. 89). Выступае як сведка ў Салінскай дамове 1398 г. (LUB. Bd. 4. S. 226—227).

4. Бацька — Барэйка (пра яго аўтэнтычных звестак не захавалася)[3]. Брат — Стрыгівіл, згаданы толькі ў Віленска-Радамскай дамове 1401 г. (AU. S. 37).

5. У канцы XIV ст. у крыжацкіх апісаннях дарог у Жамойці згадваецца поле Барэйкі (SRP. Bd. 2. S. 664—665). Аднак іншых звестак, якія б звязвалі гэты род з Жамойцю, не выяўлена.

1. Братоша

1а. Bratus, Bratusch, Pratusch, Brathus, Brathoscha, Братоша.

2. —

3. У крыніцах згадваецца ў канцы XIV — пачатку XV ст. як пачынальнік роду Зяновічаў (Зяноўевічаў). Упершыню сустракаецца ў пачатку 9-га дзесяцігоддзя XIV ст. у дакуменце Андрэя Альгердавіча (Полоцкие грамоты... Вып. 1. С. 44).

4. Паходжанне не высветлена. У XVI ст. яго нашчадкаў выводзілі з сербскіх князёў, што жылі ў Малдавіі. Імя Брато-

[3] У віленскім францішканскім календары згадваюцца Барэйка і яго жонка Ганна, упісаныя па ініцыятыве дачкі Барэйкі Алехнавай (Dunin-Kozicki Z. Szczątek kalendarza... S. 9). Магчыма, гэта бацькі Васіля. У такім выпадку мы мелі б звесткі пра яго веру. Летапісцы XVI ст. выводзілі ад Барэйкі Хадкевічаў. Маскоўскі летапісец Спірыдон Сава, што жыў у Літве ў канцы XV ст., згадвае Барэйку, які жыў у часы Гедзіміна (Дмитриева Р. П. Сказание о князьях... С. 167).

ша, неўласцівае для літоўскай сістэмы асабістых імёнаў, таксама сведчыць пра нелітоўскае паходжанне. Бацька — Kojlut. Сыны — Зяновій і Ян.

5. У дакументах адзначаецца, што ён «з Мышы» (*Bratus de Mys*) (LUB. Bd. 4. S. 226—227), таму яго асноўныя вотчынныя ўладанні можна лакалізаваць у гэтай мясцовасці паміж Навагрудкам і Слонімам.

7. У 1388 г. ездзіў як пасол у Ноўгарад (ПСРЛ. Т. 25. С. 214); у 1399 г. па даручэнні Вітаўта суправаджаў рыжскіх паслоў у Полацк (LUB. Bd. 6. S. 312, 314). Падчас войнаў паміж Альгердавічамі за ўладу Братоша, хутчэй за ўсё, належаў да лагера Андрэя Альгердавіча, бо з часоў Скіргайлы дайшло паручыцельства літоўскага баярства за яго (Halecki O. Z Jana Zamoyskiego... S. 166). Паручыцельства, верагодна, дапамагло, і з таго часу Братоша пастаянна сустракаецца сярод самых уплывовых прадстаўнікоў літоўскай знаці. У 1398 г. выступае як сведка ў дакументах Горадзенскага і Салінскага міру з крыжакамі, у 1401 г. — у Віленскай дамове з палякамі. Тое, што прадстаўнікі роду не ўдзельнічалі ў Гарадзельскай гербавай акцыі (1413 г.), тлумачыцца іх прыналежнасцю да праваслаўнай канфесіі.

1. Братошыч Ян

1а. Jan Barthoszkowicz.

2. —

3. Адзін раз згадваецца ў 1396 г. у дамове Вітаўта з біскупам і горадам Тарту (*Jan Barthoszkowicz de Musa*) (Antanavičius D. Du neskelbti... P. 145).

4. Бацька — Братоша. Брат — Зяновій.

5. Вотчыннае ўладанне — Мыш.

1. Братошыч Зяновій

1а. Zynowey Brathoschicz, Zenowe Brathosschicz, Zenovius, Зиновии Братошич.

2. Пад дакументам Мельнскага міру 1422 г. змешчана пячатка з гербам негарадзельскага паходжання (Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju melneńskiego...).

3. Упершыню згадваецца ў Віленскай дамове 1401 г. з Польшчай (AU. S. 37). Апошні раз — у Горадзенскай дамове 1432 г. (AU. S. 81).

4. Бацька — Братоша. Брат — Ян. Імя і паходжанне жонкі не высветлена. Сыны — Івашка і Васіль.

5. У 1414 г. атрымаў ад Вітаўта пацверджанне на вотчынныя землі — *Mysz, Czordlone, Wiszniew* і інш. (Vitoldiana... S. 74).

7. У 1411 г. ездзіў з пасольствам у Ноўгарад (ПСРЛ. Т. 25. С. 241).

1. [Братошыч] Зяноўевіч Івашка

1а. Iwaschko Senowigewicz, Ивашко Зеновъевич.

2. Прыклаў пячатку з гербам, што не належыць да польскай геральдычнай традыцыі, да дамовы з Польшчай 1434 г. (Semkowicz W. Braterstwo... S. 407). Пазней Зяновічы выкарыстоўвалі на пячатках герб Дэспат.

3. Упершыню выступае ў згаданай дамове (AU. S. 105). Жыў яшчэ ў сярэдзіне XV ст. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 23).

4. Бацька — Зяновій Братошыч. Брат — Васіль, які ў часы Свідрыгайлы і Жыгімонта Кейстутавіча супернічаў за крэўскае староства (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 25... P. 268). Імя і паходжанне жонкі не высветлены. Сын — Юрый. У справе 1486 г. згадваецца ранейшы запіс Яна Зяноўевіча *дядковичу своёму* (у іншым месцы — *братаничу*) Алехну Пугачу (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 23).

8. Гл. пра Юрыя Іванавіча Зяновіча.

1. [Братошыч] Юрый Іванавіч Зяновіч/Зяноўевіч

1а. Georgius Zenowycz, Юри Иванович Зеновъевич.

3. Упершыню згадваецца ў 1467 г. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 25... P. 268). Памёр каля 1516 г.

4. Бацька — Івашка Зяноўевіч. Жонка — Ганна, сястра Рыгора Осцікавіча[4]. Сыны — Юрый, Міхаіл, Мікалай, Ян (Lietuvos

[4] 16 сакавіка 1486 г. у дакуменце Юрыя Іванавіча Зяновіча як сведка выступае яго *шуринъ* (брат жонкі) Рыгор Осцікавіч (АЗР. Т. 1. С. 105—106).

Metrika. Įrašų knyga 11... P. 138—139; Boniecki A. Poczet rodów... S. 419).

6. 1488—1500 гг. — браслаўскі староста.

7. У 1467 г. судзіўся з Алехнам Судзімонтавічам. У гэтай справе згадваецца яго прысяга з удзелам праваслаўнага святара (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 25... P. 268—270).

Прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці ў часы панавання вялікага князя Аляксандра.

8. 16.03.1486 г. з жонкай і дзецьмі перадаў частку вотчынных уладанняў Кіева-Пячорскаму манастыру, пры гэтым абапіраўся на ранейшую данацыю свайго бацькі (АЗР. Т. 1. С. 105—106).

02.10.1503 г. фундаваў каталіцкі касцёл для сваіх падданых у Смаргоні (KDKW. S. 688—689). 26.01.1516 г. разам з сынамі фундаваў Пастаўскі касцёл, а 27.02.1522 г. усе яго сыны пацвердзілі гэту фундацыю (Błaszczyk G. Regesty... № 68, 147).

1. Бутаўт Манцігайлавіч

1а. Butowd Montigalowicz, Butold.

2. У Гародлі (1413 г.) атрымаў герб Грыф (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 211).

3. Упершыню згадваецца ў дамове 1401 г. (AU. S. 38).

4. Паходжанне не высветлена. Верагодна, яго можна ідэнтыфікаваць з жамойцкім баярынам *Bernardus dictus Buthouth*, які выступаў як сведка на працэсе супраць Нямецкага ордэна (Lites ac res gestae... T. 2. P. 147).

1. Бутрым Ян

1а. Johannes Butrim, Butrym, Buttrym.

2. У Гародлі атрымаў герб Сякера.

3. Упершыню ў крыніцах сустракаецца ў канцы XIV ст. у паручыцельстве за Братошу Кайлутавіча (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 5. S. 47). Памёр да 1428 г.

4. Яго бацькам, магчыма, быў пляменнік маці Вітаўта Бутрым, што быў забіты па загадзе Ягайлы ў 1382 г. (ПСРЛ. Т. 35. С. 117). Звесткі пра яго жонку (другую?) утрымлівае прысве-

чаная яму папская була ад 31 жніўня 1418 г., дзе сцвярджаецца, што ён ажаніўся з русінкай. Калі тая адмовілася перайсці ў каталіцтва, Ян Бутрым прасіў папскага дазволу скасаваць шлюб (Bullarium Poloniae... 4. S. 61). Сын — Юрый.

Роднасныя сувязі звязваюць яго з Монтаўтамі (той жа герб Сякера).

5. У дакументах пісаўся як «з Жырмунаў» (Лідскі павет). Магчыма, меў сувязі з Жамойцю.

6. 1412—1420 гг. — гаспадарскі маршалак. 1422—1423 гг. — намеснік у Смаленску.

7. Ездзіў з пасольствамі: у 1410 г. — да караля Чэхіі Вацлава ў Прагу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 2); у 1416 г. — да магістра Ордэна (CEV. S. 371); у 1419 г. — у Маскву (LUB. Bd. 5. S. 448).

У 1414 г. трапіў у ордэнскі палон (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 173—174; CEV. S. 297, 301, 311).

1. Бутрым Юрый

1а. Jorge Butrym, Georgius Butrym, Jurga.

2. Герб — Сякера.

3. Упершыню згадваецца ў дакуменце Вітаўта 1428 г. (*Iurga de Zermoni*) (Vitoldiana... S. 13—14).

4. Бацька — Ян Бутрым. Звесткі пра жонку адсутнічаюць. Сын — магчыма, Трэць (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 5. S. 48).

Магчыма, меў сувязі з Валімонтавічамі.

5. Як і бацька, меў вотчыну ў Жырмунах.

6. У 1428—1429 гг. — гаспадарскі маршалак. У 1435 г. — смаленскі ваявода (у лагеры Свідрыгайлы) (Forstreuter K. Der Deutsche Orden... S. 138; Berichte... 4. S. 794—795). Не выключана, што староста слонімскі і здзітаўскі ў 1440—1447 гг. Бутрым — гэта тая ж асоба (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 10... P. 87).

7. У 1431 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна(GStA PK. OBA 5606); у 1432 г. быў накіраваны туды яшчэ раз (GStA PK. OBA 6114). У 1432 г. як літоўскі прадстаўнік браў удзел у перагаворах з Польшчай і Ордэнам (GStA PK. OBA 6191). У

1432 г., неўзабаве пасля ашмянскага пераваротy, Жыгімонт Кейстутавіч даслаў яго на перагаворы з магістрам Ордэна (GStA PK, OF 14. S. 705—706).

Паводле Яна Длугаша, Юрый Бутрым у маладосці доўгі час жыў за мяжой і вылучаўся сваёй адукаванасцю (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 482). Хутчэй за ўсё, гэта вызначыла яго ўдзел у розных перагаворах і пасольствах.

Пасля пераваротy Жыгімонта Кейстутавіча ён нейкі час выконваў яго даручэнні, але ў канцы 1433 г. перайшоў на бок Свідрыгайлы. 16.06.1433 г. ён прысутнічае сярод паплечнікаў Свідрыгайлы, што даслалі ліст на Базельскі царкоўны сход (Bullarium Poloniae... 5. S. 251). У канцы 1435 г. Юрый Бутрым ізноў знаходзіўся ў лагеры Жыгімонта (LUB. Bd. 8. S. 611).

1. Валімонт Станіслаў

1a. Walmundt Buschken son, Walimund Buschken son, Stanislaus alias Volymonth.

2. —

3. Выступае як сведка ў Горадзенскай і Салінскай дамовах з Ордэнам 1398 г. (CEV. S. 54; LUB. Bd. 4. S. 226—227).

4. Бацька — Бушка, прадстаўнік знаці часоў Альгерда і Кейстута. Жонка, хутчэй за ўсё, дачка жамойцкага баярына Мазігіна (гл.: Petrauskas R. Vytauto laikų... P. 24). Сыны — Румбоўд, Кезгайла, Яўнус, Шэдзібор, Гудзігерд, Судзівой.

5. Вотчына — Дзяволтва (каля Вількаміра). У Дзяволтваўскай зямлі ордэнскія шпіёны лакалізавалі *Busekindorf* (SRP. Bd. 2. S. 694).

8. Згаданы ў 1445 г. у памянным запісе жонкі Кезгайлы Алены ў кнізе Кракаўскага ўніверсітэта. З гэтага запісу вядома яго хрысціянскае імя (Fijałek J. Kościoł... S. 129—130).

1. Вігайла

1a. Wygel, Wigail.

2. —

3. Выступае як сведка ў Горадзенскай і Салінскай дамовах з Ордэнам 1398 г. (CEV. S. 54; LUB. Bd. 4. S. 226—227).

4. Імя бацькі невядома. У дакуменце Салінскага міру 1398 г. як сведка выступае яго сын Гінтаўт (імя Вігайлы больш дакладна запісана ў нямецкім дакуменце — Die Staatsverträge des Deutschen Ordens in Preußen im 15. Jahrhundert. T. 1. S. 12). У недатаваным лісце рагніцкага комтура да магістра Ордэна адзначана, што Гінтаўт — пляменнік Чупурны (GStA PK, OBA 28512). Такім чынам, Вігайла быў братам Чупурны.

У дакуменце Чартарыйскага міру 1431 г. як сведка выступае Таліят Вігайлавіч (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135). Невядома, ці быў ён сынам гэтага Вігайлы.

5. Гл. пра Чупурну.

6. 1398 г. — староста вількамірскі.

1. Відзімін

1а. Wydimyn, Widimyn, Vyndimyn, Wydymen.

2. Яго брат Андрэй Гайлігін у Гародлі атрымаў герб Лебедзь, аднак не высветлена, ці жыў яшчэ Відзімін на той момант.

3. У крыніцах з'яўляецца ў дамове з Польшчай 1401 г. (AU. S. 38). Апошні раз згадваецца ў 1410 г. (KDKW. S. 78).

4. Бацька — Гайлівойна (вядомы толькі з імя па бацьку). Браты — Андрэй Гайлігін і Урдзіць, якія таксама ўдзельнічалі ў дамове 1401 г. Сын — Андрэй (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 51).

5. Паходзіў з Жамойці (гл. пра Гайлігіна).

7. Часта выступае як сведка ў дакументах і дамовах Вітаўта, напрыклад, у дакуменце 1404 г., што тычыўся пунктаў Рацёнжскага міру (CEV. S. 103).

1. Візігерд

1а. Wyssegerd.

2. У Гародлі атрымаў герб Адравонж.

4. Незразумела, ці гэты Візігерд быў бацькам Давойны Візігердавіча. Пазнейшыя Давойны карысталіся іншым гербам. Нешта больш канкрэтнае пра гэтага Візігерда і яго нашчадкаў сказаць цяжка, бо ў той час было некалькі асоб з такім імем.

5. У *Вегеберыхтах* Нямецкага ордэна ёсць паведамленне пра *Wissigirdendorff* недалёка ад Салечнікаў (SRP. Bd. 2. S. 700).

1. Вяжэвіч Глеб

1а. Глеб Вяжевич.

2. Герб — Ляліва.

4. Паходжанне — гл. пра Яна Вяжэвіча.

Пачынальнік лініі Глябовічаў. Жонка — Ганна-Мілохна Рачкоўна, дачка Рачкі Страчэвіча. Сыны — Юрый, Станіслаў, Пётр. Дачка — Марына, выйшла замуж за Альберта Янавіча Клочку (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 89).

8. У 1433 г. яго жонка зрабіла ахвяраванне на царкву ў Сулятычах (Акты, издаваемые Виленскою комиссиею... Т. 11. С. 6—7).

1. Вяжэвіч Ян (Івашка)

1а. Iwaschko Wyazewicz, Иван (Ивашко) Вяжевич.

2. Герб — Ляліва.

3. Упершыню згадваецца ў 1432 г. Памёр да 30.05.1482 г. (KDKW. S. 379).

4. Пра дзейнасць бацькі звестак няма[5]. Брат — Глеб. Жонка — дачка (імя невядома) Судзівоя Валімонтавіча[6]. Іх дачка — Ганна, выйшла замуж за Пятра Янавіча Манцігердавіча.

Родныя сувязі (той жа герб) звязваюць яго з Манівідамі.

5. У. Сямковіч меркаваў, што Вяжэвічы паходзілі са Смаленскай зямлі (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 6. S. 187—189), але К. Пяткевіч пераканаўча даказаў, што гэты род меў літоўскае паходжанне (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 88—89).

6. 1452—1470 гг. — маршалак гаспадарскі. 1453 г. — староста браслаўскі. 1460—1472 гг. — намеснік смаленскі. Каля 1465 г. — ваявода троцкі.

---

[5] Верагодна, яго можна ідэнтыфікаваць з удзельнікам Мельнскага міру 1422 г. «Michael alias Waszus», які прывесіў да дакумента пячатку з гербам Ляліва (Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju melneńskiego...).

[6] Дачка Яна Вяжэвіча Ганна называла Станьку Судзівоевіча дзядзькам («avunculus») (KDKW. S. 380).

7. Разам са сваімі родзічамі Юрыем Гедзігоўдам і Янам Манівідавічам пасля пераваротy Жыгімонта Кейстутавіча застаўся на баку Свідрыгайлы, але ў 1432 г. падчас бітвы пад Ашмянамі трапіў у палон да Жыгімонта (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 120—121). У 1477 г. згадваецца сярод суддзяў у судовай справе, якую разглядаў ваявода троцкі Радзівіл Осцікавіч (Lietuvos Metrika. 12-oji Teismų bylų knyga... S. 97).

8. 25.07.1464 г. супліка Яна Вяжэвіча да папы ліквідуе ўсе сумненні адносна яго канфесійнай прыналежнасці (Bullarium Poloniae... 6. S. 420).

1. Гайлігін Андрэй

1а. Andreas dictus Golykunth, Golgen Goyliwoynowicz, Goligunt, Golygin, Golgen.

2. У Гародлі атрымаў герб Лебедзь.

3. Упершыню згадваецца ў дамове 1401 г. (AU. S. 38). Памёр пасля 1433 г.

4. Бацька — Гайлівойна (вядома толькі імя). Браты — Урдзіць і Відзімін, што таксама ўдзельнічалі ў дамове 1401 г. Сыны — Міхаіл, Алехна Дыль, Андрэй, Сутка. Родзічы — Табутовічы, Шэметы (гл. пра іх) і інш. (Glinka J. Ród Klausucia...).

5. Паходзіў з Жамойці: на працэсе 1413 г. з крыжакамі сведчыў *Andreas dictus Golykunth* (Lites ac res gestae... T. 2. P. 147). Пазней атрымаў уладанні ў Ваверцы (Лідскі павет), якая стала новым родавым «гняздом» (Glinka J. Ród Klausucia...; Wiśniewski J. Dobra Dowspudzkie... S. 448).

1. Гайлігінавіч Алехна Дыль

1а. Olechno Goliginovicz, Olechno Dyl, Олехно Кголикгинович.

2. Герб — Лебедзь.

4. Бацька — Андрэй Гайлігін. Жонка — Сафія. Не меў нашчадкаў. У 1471 г. яшчэ жыў (KDKW. S. 315).

5. Вотчына — Ваверка.

7. Вучыўся ў Кракаўскім універсітэце (Glinka J. Ród Klausucia... T. 4. S. 102).

8. У 1460 г. фундаваў касцёл у Новай (Малой) Ваверцы (інакш — у Гарадзішчы) (KDKW. S. 268—270), які ў 1477 г. даціравала яго ўдава Сафія (Тамсама. S. 360—361).

1. Гайлігінавіч Андрэй

1а. Andreas Goliginovicz, Andruszko Golgynovicz.

2. Герб — Лебедзь.

3. Бацька — Андрэй Гайлігін. Звесткі пра шлюб адсутнічаюць.

5. Вотчына — Ваверка.

6. 1446—1450 гг. — кухмістр гаспадарскага двара (Urzędnicy centralni... S. 62; Bullarium Poloniae... 6. S. 92).

1. Гайлігінавіч Міхаіл

1а. Michael Golgynovicz, Michael Goligin.

2. Герб — Лебедзь.

4. Бацька — Андрэй Гайлігін. Жонка — Сафія (паходжанне не высветлена). Сын — Жыгімонт.

5. Вотчына — Ваверка (Лідскі павет). Меў бенефіцыйныя маёнткі ў Дарагічыне.

6. 1445—1448 гг. — староста дарагічынскі. Магчыма, каля 1435 г. быў старостам бельскім — у крыніцы змешчана толькі імя Міхаіл (Szybkowski S. Rec.... S. 158).

7. У часе канфлікту 1440 г. быў на баку Міхаіла Жыгімонтавіча, заняў ад яго імя замак у Троках (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 657). Пазней перайшоў на бок прыхільнікаў Казіміра, які перамог.

8. Разам з братамі і іншымі родзічамі фундаваў касцёл у Ваверцы, які пазней даціраваўся іх нашчадкамі (KDKW. S. 283—286). У 1458 г. фундаваў касцёл у Будзішыне на Падляшшы (Jaszczołt T. Fundacje kościelne... S. 33).

1. Гайлігінавіч Сутка

1а. Sutko Goliginovicz.

2. Герб — Лебедзь.

4. Бацька — Андрэй Гайлігінавіч. Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Дачкі — Сафія, Духна і Фенька.

5. Вотчына — Ваверка.

1. Гайлімін (Юрый) Надобавіч

1а. Goylimin Nadobowicz, Geilemin Nadaps sone, Jorge Gailemynne, Golymyn, Goleminne, Galeminne, Поилыминъ.

2. Герб — Дубна (напрыклад, у хроніцы Ульрыха Рыхенталя) (Piekosiński F. Goście polscy na soborze... S. 147). Пячатка з тым жа гербам прывешана да дакумента Горадзенскай дамовы 1432 г., аднак у 1434 г. выкарыстоўваў іншы знак (AU. S. 78, 100).

3. Упершыню ў крыніцах з'яўляецца ў 1409 г., калі выконваў даручэнні Вітаўта ў Жамойці (CEV. S. 180). Памёр пасля 1434 г.

4. Бацька — Станіслаў-Надоба (*Nadobe*), які ў 1413 г. браў удзел у справе супраць Нямецкага ордэна (Lites ac res gestae... T. 2. P. 147). Брат — Станіслаў, які разам з бацькам выступаў як сведка на гэтым працэсе (Тамсама). Пра жонку і нашчадкаў звестак няма.

Знаходзіўся ў роднасных сувязях з Альбертам Карэйвам, які ў Гародлі атрымаў герб Дубна.

5. У 1409 г. у паведамленні Ордэна сцвярджаецца, што ён быў з Айраголы [літ. *Ariogala*] (CEV. S. 185). Яго бацька паходзіў з Відуклі [літ. *Viduklė*] (Lites ac res gestae... T. 2. P. 147). Хутчэй за ўсё, меў вотчынныя ўладанні ў абедзвюх землях. Меў маёнткі ў Вялене [літ. *Veliuona*] (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 48).

6. У 1432 г. — староста вяленскі. 1433—1434 гг. — староста жамойцкі.

7. Адзін з лідараў жамойцкага баярства, кіраваў жамойцкай дэлегацыяй на Канстанцкім царкоўным саборы (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 196). У 1432 г. Свідрыгайла даслаў яго на перагаворы з магістрам Ордэна (LUB. Bd. 8. S. 363).

1. Гайцэвіч Юрый (Юшка)

1а. Georgius (Juszko) Goyczowicz, Юшко Кгоицевич.

2. Гл. пра яго брата Яна.

3. Упершыню згадваецца ў 1442 г. як фундатар Крошынскага касцёла. Памёр пасля 1461 г.

4. Браты — Ян і Фёдар. Жонка — Ганна, дачка Андрэя Даўгердавіча. Пасля яго смерці яна другі раз выйшла замуж за Яна Іллініча (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 28; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 91). Не меў нашчадкаў.

5. Вотчынныя землі, верагодна, знаходзіліся ў Наваградскім павеце. Ад Жыгімонта Кейстутавіча атрымаў маёнтак Рэпухаў (РИБ. Т. 27. С. 378—379), а ад Казіміра ў 1440—1443 гг. — вёску каля Слоніма (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 19). Яго ўладанне ў Слонімскім павеце — Ласосна (Wysłouch S. Z dziejów Łososny... S. 1—2).

6. 1461 г. — намеснік наваградскі.

8. 02.08.1442 г. Юрый Гайцэвіч фундаваў касцёл у сваёй вёсцы Крошын (Наваградскі павет). Сярод сведак быў яго брат Федзька (KDKW. S. 194—196). Значыцца, Гайцэвічы былі каталікамі.

1. Гайцэвіч Ян (Івашка)

1а. Iwaschko Goyczewicz, Ивашко Кгоицевич.

2. На момант складання дамовы 1433 г. карыстаўся гербам негарадзельскага паходжання (AU. S. 91). На думку Б. Мажэйкі, гэты герб нагадвае герб Давойнаў, таму, магчыма, меў з імі роднасныя сувязі (Możejko B. Starosta bielski... S. 208—209). Звесткі па тапаграфіі ўладанняў і пасадах ускосна пацвярджаюць гэту гіпотэзу.

3. Упершыню згадваецца ў Троцкай дамове з Польшчай 1433 г. (AU. S. 94). Памёр пасля 1452 г.

4. Паходжанне не высветлена. Браты — Юрый (Юшка) і Фёдар (Федзька). Ажаніўся з дачкой князя Васіля Астрожскага Агрыпінай (Кацярынай), якая пазней выходзіла замуж яшчэ двойчы (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 53; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 111). Не меў нашчадкаў.

5. Вотчынныя землі, верагодна, знаходзіліся ў Наваградскім павеце.

6. 1433—1435 гг. — староста навагрудскі. 1441—1444 гг. — намеснік полацкі. 1445—1452 гг. — намеснік віцебскі.

7. Неаднаразова ўдзельнічаў у пасольствах да магістра Ордэна: у 1445 і 1446 г. (LUB. Bd. 10. S. 108; GStA PK, OF 15. S. 427—432). У 1447 г. удзельнічаў у перагаворах па пытанні мяжы з прадстаўнікамі Лівоніі (LUB. Bd. 10. S. 248).

У 1445 г. быў адным з кіраўнікоў літоўскага войска ў вайне супраць Масквы (ПСРЛ. Т. 23. С. 151).

1. Гаштаўт Андрэй

1a. Andreas alias Gastold, Gastold, Gastod, Gastudt, Кгастовтъ.

2. —

3. Упершыню згадваецца ў 1387 г. у прывілеі Ягайлы касцёлу ў Абольцах як староста віленскі (KDKW. S. 19). У 1387 / 1389 г. паручыўся за князя Грыцку Канстанцінавіча (Prochaska A. Rokosz... S. 395). Памёр пасля 1404 г.

4. Бацька — Гаштаўт, у 1364 г. староста вяленскі (SRP. Bd. 2. S. 547). Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Паводле Хронікі Быхаўца, адзін з Гаштаўтаў ажаніўся з дачкой польскага шляхціца Міхаіла Бучацкага (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 77). Сыны — Талівойша, Ян і Пётр. Дачка — жонка Яна Даўгерда.

5. У ордэнскіх *Вегеберыхтах* згадваецца *Gasztowtendorff im gebite czu Geranenen* (SRP. Bd. 2. S. 704). Андрэй Гаштаўт пісаўся як «геранёнскі» таксама ў дамове 1396 г. (Antanavičius D. Du neskelbti... P. 145). Магчыма, меў маёнтак у Вялене (Lites ac res gestae... T. 2. P. 137). Меў зямлю ў Вільні (KDKW. S. 5).

6. 1387 г. — староста віленскі. 1398—1401 гг. — староста крэўскі.

Верагодна, з самага пачатку быў чалавекам атачэння Ягайлы, пра што ўскосна сведчыць страта пасады старосты віленскага пасля прыходу да ўлады Вітаўта (больш падрабязна гл.: Petrauskas R. Giminaičiai ir pavaldiniai... P. 109).

1. Гаштаўт Пётр

1a. Petrus Gastold.

2. Герб — Абданк.

3. У 1431 г. разам з Румбоўдам трапіў у ордэнскі палон (CEXV. T. 1. S. 70).

4. Бацька — Андрэй Гаштаўт. Пра жонку і нашчадкаў звестак няма[7].

6. Магчыма, ён у 1432 / 40 г. быў старостам слонімскім.

1. (Гаштаўт) Талівойша

1a. Taliwusch, Thalywosch.

2. —

3. Згадваецца разам з бацькам Андрэем Гаштаўтам у дамове 1401 г. (AU. S. 37), у дакуменце Вітаўта 1407 г. (Vitoldiana... S. 72), а таксама ў недатаваным, складзеным каля 1411 г. у зямлі Ордэна, спісе літоўскага кіраўніцтва (GStA PK, OBA 29038).

4. Бацька — Андрэй Гаштаўт. Цяжка сказаць, ці можна звязваць пазнейшых Талівойшаў з гэтым прадстаўніком роду Гаштаўтаў.

1. Гаштаўт Ян

1a. Johannes Gasztold, Iwaschko Gastold, Johannes Gastawdus, Johannes Gastowt, Gastoldt, Иванъ Кгастовтъ.

2. У Гародлі атрымаў герб Абданк.

У сярэдзіне XV ст., падчас канфлікту з Польшчай, выкарыстоўваў пячатку з рэвізаваным гербам Абданк (дакумент ад 28.05.1455 г. — GstA PK, OBA 13725).

3. Упершыню з'яўляецца ў 1413 г. у Гародлі (AU. S. 54). Памёр у 1458 г.

4. Бацька — Андрэй Гаштаўт. Жонка — Даратэя[8], дачка Кезгайлы Валімонтавіча. Сыны — Марцін, Альберт, Юрый. Дачкі —

[7] Згаданы ў 1468 г. Ян Пятровіч Гаштаўтавіч (KDKW. S. 295—296), верагодна, не належыць да гэтага роду.

[8] Часам сцвярджаюць, што ў другім шлюбе быў жанаты з Эльжбетай, якая нібыта пакінула тэстамент (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1... P. 128). Гэта яўная памылка, тут, хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе Эльжбета, дачка Марціна Гаштаўта. Даратэя Гаштаўтава яшчэ жыла пэўны час пасля смерці мужа. Вядомыя дзве (1460 і 1461 г.) яе суплікі да папы (Bullarium Poloniae... 6. S. 327, 354).

Марыя, што выйшла замуж за князя Сямёна Алелькавіча, Аляксандра — манашка-бернардзінка (Matricularum regni Poloniae... Pars 2. S. 108; MPH. T. 5. S. 225), Марына, з якой каля 1458 г. ажаніўся Ян Кучуковіч (Bullarium Poloniae... 6. S. 258).

5. Асноўным вотчынным уладаннем Ян Гаштаўт лічыў Геранёны (напрыклад, KDKW. S. 146).

6. 1422—1423 гг. — староста суражскі. 1426—1435 гг. — маршалак гаспадарскі. 1436—1440 гг. — намеснік смаленскі. 1440—1443 гг. — ваявода троцкі. 1443—1458 гг. — ваявода віленскі.

7. Часта браў удзел у пасольствах: у 1430 г. ездзіў на перагаворы з польскім каралём (CEXV. T. 2. S. 243—244; GStA PK, OBA 5399); Жыгімонт Кейстутавіч дасылаў яго ў Польшчу на пачатку свайго панавання (LUB. Bd. 8. S. 379); у 1446 г. ездзіў на перагаворы з прадстаўнікамі Ордэна (GStA PK, OF 15. S. 447—448); а ў 1448 г. — на агульны з палякамі з'езд у Любліне (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 45).

Адыграў важную ролю падчас барацьбы 1432 і 1440 г. за вялікакняскі стол. Самы ўплывовы прадстаўнік літоўскай знаці пачатку панавання Казіміра. Такім яго лічылі і за мяжой. Да яго асабіста ў лістах нярэдка звяртаўся магістр Ордэна (напрыклад, GStA PK, OF 16. S. 1222—1223; OF 17. S. 846). У 1452 г. прускія купцы называюць яго найвышэйшым *(an den obirsten)* літоўскім ураднікам (HUB. Bd. 8. S. 125).

8. 31.07.1433 г. Ян Гаштаўт зрабіў ахвяраванне Віленскай кафедры (KDKW. S. 146—147), а 19.04.1437 г. — віленскім францішканцам, за што апошнія павінны былі ўнесці імёны яго самога і яго блізкіх у свае памянныя кнігі (Тамсама. S. 748—749). 25.10.1437 г. ён фундаваў касцёл у Тыкоціне, а ў 1452 г. — алтар там жа (Jaszczołt T. Fundacje kościelne... S. 45). У 1445 г. з ініцыятывы Алены Кезгайлавай разам з жонкай быў упісаны ў кнігі Кракаўскага ўніверсітэта (Fijałek J. Kościoł... S. 129—130)[9].

1. Гаштаўт Альберт

1а. Воитко Кгастовтович.

2. Герб — Абданк.

[9] Верагодна, фундаваў касцёл у сваім геранёнскім маёнтку (Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 66).

3. Згадваецца ў першыя гады панавання Казіміра.

4. Бацька — Ян Гаштаўт. Звесткі пра жонку і дзяцей адсутнічаюць.

6. 1443—1447 гг. — гаспадарскі маршалак.

1. Гаштаўт Марцін

1а. Martinus Gas(z)told, Martinus Gastowthowicz, Мартин Кгастовтович.

2. Герб — Абданк.

3. Упершыню згадваецца ў 1460 г. Памёр у 1483 г.

4. Бацька — Ян Гаштаўт. Быў двойчы жанаты: першай жонкай была дачка князя Сямёна Сямёнавіча Гальшанскага (імя невядомае), другой — дачка князя Юрыя Сямёнавіча Гальшанскага Ганна (дзеці з гэтага шлюбу — AGAD, dok. perg., № 665, 7391). Сын — Альберт. Дачка — Эльжбета, што выйшла замуж за Яна Мікалаевіча Радзівіла (дакумент шлюбнай дамовы 1492 г. — AGAD, dok. perg., № 665).

5. Як і іншыя Гаштаўты, асноўным вотчынным уладаннем лічыў Геранёны (напрыклад, KDKW. S. 318).

6. 1464—1471 гг. — староста наваградскі. 1471—1480 гг. — ваявода кіеўскі. 1477—1479 гг. — маршалак земскі. 1480—1483 гг. — ваявода троцкі.

7. У 1460 г. разам з Альбертам Янавічам Манівідам і польскімі шляхціцамі ездзіў на перагаворы з чэхамі (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 144).

Уплывовы прадстаўнік літоўскай знаці, якому ў 1482 г. папа Сікст IV адрасаваў асобнае брэвэ па пытанні экспедыцыі супраць туркаў (Elementa ad fontium editiones. Vol. 64. P. 52).

8. У 1479 г. Марцін Гаштаўтавіч фундаваў бернардзінскі кляштар у Тыкоціне (МРН. Т. 5. S. 224). Паводле бернардзінскага храніста Яна Камароўскага, ён вельмі любіў гэты манаскі ордэн, шмат яму ахвяраваў, вазіў некалькі яго членаў з сабой у Кіеў (Тамсама. S. 224—225).

16.06.1471(72?) г. фундаваў алтар у Дзявенішкскім [літ. *Dieveniškės*] касцёле (KDKW. S. 318), які, па ўсёй верагоднасці, сам і заснаваў. 15.06.1474 г. яшчэ раз зрабіў ахвяраванні на карысць гэ-

тага касцёла (Тамсама. S. 331—332). У 1469 г. даціраваў Астравецкі касцёл, які, верагодна, таксама фундаваў сам (MAB RS. F 43—5434).

1. Гаштаўт Юрый

1а. Georgius Gastold.

2. Герб — Абданк.

3. Прэпазіт Віленскай кафедры. Амброзіё Кантарыні сцвярджае, што брат ваяводы кіеўскага Марціна Гаштаўта быў біскупам (Fontes rerum Polonicarum... Ser. 1a. Fasc. 3. P. 173; Contarini A. Viaggio in Persia... Гл. 3).

4. Бацька — Ян Гаштаўт.

5. Сваім вотчынным уладаннем лічыў Геранёны (*heres in Goronany*) (KDKW. S. 300—301).

8. Згадваецца ў календары віленскіх францішканцаў (Dunin-Kozicki Z. Szczątek kalendarza... S. 11).

У 1468 г. фундаваў Астравецкі касцёл (KDKW. S. 300—301).

1. Гедзігоўд (Пётр)

1а. Gedegolt, Gedgaut, Gudegan, Gedekant.

2. ?

3. У 1441 г. пасля паўстання жамойтаў па пагадненні абодвух бакоў стаў старостам жамойцкім (Rowell S. C. Išdavystė... P. 63—64).

4. Вядомае імя яго бацькі — *Tivlowicz* (MAB RS. F 256—3528, l. 14).

5. Несумненна паходзіў з Жамойці, верагодна, з Расейнскай зямлі. У Расейнскім [літ. *Raseiniai*] раёне ёсць вёска Гедгаўдзішкі.

6. 1441 г. — староста жамойцкі[10]. 1446—1453 гг. — староста хрыстмемельскі [літ. *Skirsnemūnė*]. На гэтай пасадзе кіраваў таксама Расейнамі (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 20).

7. Некалькі разоў ездзіў паслом у Ордэнскую дзяржаву: 1446, 1447 і 1451 г. (GStA PK, OF 15. S. 447—448; Тамсама, OBA 9394 і OBA 10789).

[10] Старостам жамойцкім названы таксама ў недатаваным лісце мемельскага комтура (GStA PK, OBA 27881).

8. 18.09.1457 г. Пётр Гедзігоўд (*Petrus Giedygolth*) з Гейшаў (каля Расейнаў) фундаваў Шылаўскі [літ. *Šiluva*] касцёл (Codex Mednicensis... 1. P. 98—100)[11].

1. Гедзігоўд Юрый

1а. Georgius alias Gedigold, Gedigolt, Bedigold, Gedegow, Дедикголд.

2. Герб — Ляліва (напрыклад, у працы Ульрыха Рыхенталя, храніста Канстанцкага царкоўнага сабору, гл.: Piekosiński F. Goście polscy na soborze... S. 148).

3. Упершыню згадваецца ў Віленскай дамове з Польшчай 1401 г. (AU. S. 37). Памёр каля 1435 г.

4. Бацька — Гайлігін. Брат — Альберт Манівід. Жонка — Анастасія, магчыма, дачка князя Юрыя Талочкі (гл.: Petrauskas R. Vytauto laikų... P. 17). Сын — Пётр-Сямён (Сенька).

5. Вотчынныя землі канцэнтраваліся ў Крэўскім / Ашмянскім паветах. Асноўным маёнткам сваіх вотчынных зямель лічыў Вішнева (KDKW. S. 158).

6. 1401 г. — маршалак гаспадарскі. Перад 1411 г. — ваявода кіеўскі. 1411—1423 гг. — староста падольскі. Каля 1424 г. — намеснік смаленскі. 1425—1432 гг. — ваявода віленскі.

7. Неаднойчы ўдзельнічаў у пасольствах: у 1411 г. па даручэнні Ягайлы разам з некалькімі польскімі шляхціцамі ездзіў у Венгрыю (Dokumenty polskie z archiwów... S. 55, 57); туды ж выязджаў у 1423 г. (CEXV. T. 2. № 126); у 1416 г. Вітаўт даслаў яго на чале літоўскай дэлегацыі на Канстанцкі царкоўны сабор (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 196); у верасні 1422 г. удзельнічаў у Мельнскіх перагаворах (Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju melneńskiego... S. 2); ў 1429, 1431 і 1432 г. ездзіў у Польшчу (CEV. S. 842; Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 452; GStA PK, OF 14. S. 691—692); у 1432 г. — да магістра Ордэна (LUB. Bd. 8. S. 344—345).

Разам з братам Манівідам быў адным з найбольш уплывовых прадстаўнікоў знаці Літвы. Пасля змовы Жыгімонта

[11] Захаваны дакумент — фальсіфікат. Аднак сам факт фундацыі не выклікае паважных сумненняў. Шылаўскі ксёндз згадваецца ўжо ў 1466 г. (Codex Mednicensis... 1. P. 105).

Кейстутавіча Гедзігоўд быў сярод нешматлікіх прадстаўнікоў пануючай эліты, што засталіся на баку Свідрыгайлы. У 1432 г. у бітве пад Ашмянамі трапіў у палон да Жыгімонта (LUB. Bd. 8. S. 378) і з таго часу пастаянна выступаў як сведка ў яго дакументах. Блізкія сувязі з іншымі прадстаўнікамі знаці дазволілі яму захаваць уплыў і маёмасць.

8. 30.09.1442 г. удава Гедзігоўда Анастасія зрабіла ахвяраванне на капліцу Св. Альберта і Св. Юрыя ў Віленскім замку, дзе Гедзігоўд быў пахаваны (фундаваў капліцу яго брат Манівід) (KDKW. S. 197).

1. Гедзігоўдавіч Пётр Сямён (Сенька)

1а. Petrus Senko Gedigoldowicz, Сенько (Семен) Кгедикголдович.

2. Герб — Ляліва.

3. У крыніцах з'яўляецца ў 1429 г. (CEV. S. 815—816). Памёр у 1451 г. (вядомы яго тэстамент, складзены ў гэтым годзе) (AGAD, dok. perg., № 7310).

4. Бацька — Гедзігоўд Юрый. Жонка — Мілохна, дачка Кезгайлы Валімонтавіча (яшчэ жыла ў 1485 г. — KDKW. S. 400). Не меў нашчадкаў. Разам з жонкай удачарыў родзічку Валімонтавічаў (верагодна, дачку брата жонкі) Ганну Бутрымаўну (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie... S. 33; AGAD, dok. perg., № 7310). Пасля яе смерці Мілохна ўсынавіла свайго пляменніка Юрыя Іллініча (AGAD, dok. perg., № 7371).

5. Як і бацька, асноўным вотчынным уладаннем лічыў Вішнева (KDKW. S. 212).

6. 1429 г. — маршалак гаспадарскі. 1440 г. — намеснік полацкі. 1447 —1451 гг. — намеснік смаленскі. 1451 г. — каштэлян віленскі.

7. У апошнія гады панавання Вітаўта браў удзел у двух вельмі важных пасольствах: у пачатку 1429 г. — да імператара Святой Рымскай імперыі Жыгімонта (CEV. S. 815—816), а ў 1430 г. — да папы (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 115). У 1447 г. суправаджаў вялікага князя Казіміра на каранацыю ў Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 33). У 1448 г. ездзіў паслом у Маскву (ПСРЛ. Т. 18. С. 204).

8. 29.10.1447 г. фундаваў касцёл у Радашковічах (KDKW. S. 211—212). 09.04.1451 г. фундаваў касцёл у Вішневе (Тамсама. С. 230—231)[12].

У 1475 г. яго жонка Мілохна зрабіла ахвяраванне на Віленскую кафедру (MAB RS. F 43—420), а 08.03.1485 г. — на касцёл у Радашковічах (KDKW. S. 400).

1. Гердуць

1а. Gerdud, Кгирдуть, Кердити.

2. У Гародлі атрымаў герб Яліта.

3. У 1390 г. паручыўся за Грыцку Канстанцінавіча (Prochaska A. Rokosz... S. 395). Пасля Гарадзельскай дамовы больш не згадваецца.

4. Бацька — Скомант, які выступаў як сведка яшчэ ў 1379 г. у Троцкай дамове[13]. Дзед Гердуць у 1369 г. быў старостам паштаўскім (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 8. S. 253). Памёр бяздзетным, а пасля смерці жонкі гаспадар аддаў яго маёнтак свайму пісару (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 24).

5. Пра яго ўладанні вядома толькі тое, што ён меў маёнтак *на Березини*, які атрымала ў спадчыну жонка (Тамсама).

1. Гетаўт

1а. Gethowoth, Gettoth.

2. У Гародлі атрымаў герб Копач.

3. У 1409 г. Вітаўт даслаў яго з іншымі жамойцкімі баярамі ў Жамойць. Гетаўт названы тут як *kemmerer von Birsten* (CEV. S. 185).

4. Звесткі пра бацьку адсутнічаюць. Сыны — Юрый і Дорг (KDKW. S. 202, 221—222, 236).

5. Гэта яшчэ адзін выпадак перасялення жамойцкага баярына, хоць сувязі з Жамойцю не былі перарваныя: там Вітаўт надаў

[12] Е. Ахманьскі залічвае на яго рахунак фундацыі касцёлаў у Налібоках і Камені (Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 66).

[13] Як сын Скоманта Гердуць выступае ў тэксце Салінскай мірнай дамовы 1398 г. (LUB. Bd. 4. S. 226—227).

яму землі (Vitoldiana... S. 117). Унук Гетаўта Юрый называў сябе ўжо «Вішнеўскім вотчыннікам» (KDKW. S. 293)[14].

1. Гетаўтавіч Юрый

1а. Georgius Gotoltowycz, Juszko Gethowtovicz.

2. Герб — Копач.

3. У 1443 г. выступае як сведка ў дакуменце свірскага князя Яна Грыга (KDKW. S. 202).

4. Бацька — Гетаўт. Жонка — Ганна (паходжанне не высветлена). Сын — Юрый.

5. Яго сын лічыў вотчынным уладаннем Вішнева (KDKW. S. 293).

6. 1452 г. — староста браслаўскі.

8. 24.06.1468 г. і 22.05.1478 г. яго ўдава Ганна разам з сынам Юрыем зрабілі ахвяраванне на касцёл у Крэве (KDKW. S. 293—294, 365—366).

1. Гінейт Канцэвіч

1а. Gyneth Konczewicz, Gineth, Gyneid, Gyneoth.

2. У Гародлі атрымаў герб Зарэмба.

3. Упершыню згадваецца ў канцы XIV ст. у паручыцельстве за Братошу (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 213) і ў 1390 г. сярод верных Вітаўту жамойтаў (CEV. S. 23—24). Памёр пасля 1433 г.

4. Пра бацьку акрамя імя нічога невядома. Сын — Мілус (*Milus*) (у 1395 г. — маршалак гаспадарскі), разам з якім выступаў як сведка ў дамове 1401 г. (AU. S. 37). Цяжка сказаць, ці можна звязваць Гінейтаў другой паловы XV ст. з гэтым родам.

5. У згаданым дакуменце 1390 г. сцвярджаецца, што ён быў з Айраголы.

6. 1433 г. — староста ковенскі.

---

[14] Назва герба Гетаўта сама па сабе не дае падстаў ідэнтыфікаваць яго з Копачам, што жыў у Слонімскім павеце (Topolska M. B. Dobra dereczyńskie... S. 47—48). Апошні, хутчэй за ўсё, меў рускае паходжанне.

1. Гінівіл

1а. Gynewille, Кгинивил.

2. —

3. У Салінскай дамове 1398 г. староста троцкі Гінівіл выступае як сведка (LUB. Bd. 4. S. 226—227). У канцы XIV ст. Вітаўт даслаў яго разам з Васілём Барэйкавічам ваяваць супраць Карыбута Альгердавіча (ПСРЛ. Т. 35. С. 89).

4. Звесткі пра бацьку адсутнічаюць. Сын — Начка (Наць) Пётр.

5. Гл. пра сына Наця.

6. 1398 г. — староста троцкі[15].

1. Гінівілавіч Наць Пётр

1а. Naczus Gynivilowicz, Petrus Nacz, Onacz(ko), Naczko, Наць Кгинивилович.

2. У Гародлі атрымаў герб Даліва.

3. Упершыню згадваецца ў 1413 г. у Гародлі (AU. S. 54). Памёр пасля 1455 г.

4. Бацька — Гінівіл. Жонка — Ганна Багдана, дачка Карэйвы[16]. Сыны — Андрэй, Міхаіл, Якуб, Ян і Мікалай (Błaszczyk G. Regesty... № 4, 7).

Роднасць з Пятром Лелюшам: той жа герб, які, між іншым, адзін раз — у 1434 г. у Горадні — Лелюш прывесіў за Наця (AU. S. 101).

5. Адсылкай да ўладанняў Наця Гінівілавіча з'яўляецца фундацыя касцёла ў Жосле [літ. *Žasliai*], вядомая з пацверджання яго сыноў Міхаіла і Яна (MAB RS. F 256—2747; таксама гл.: Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 32). Меў дом у Вільні (KDKW. S. 499). Ад вялікіх князёў атрымаў шматлікія маёнткі на Падляшшы, якія, калі вымерла мужчынская лінія роду, вярнуліся да гаспадароў (Wawrzyńczyk A. Rozwój wielkiej własności... S. 121).

[15] Існуе пазнейшая легенда пра ковенскага абаронцу Гурда Гінівілавіча (Ochmański J. Historia Litwy... S. 119). Магчыма, гэта перароблены традыцыяй староста троцкі Гінівіл, згаданы ў летапісах.

[16] Магчыма, яна была дачкой удзельніка Гарадзельскай дамовы Альберта Карэйвы (герб Дубна). Вядома, што ён меў уладанні ў Кернаве. Ганна Багдана фундавала алтар за кошт вотчынных уладанняў у Кернаве (KDKW. S. 498—499).

6. 1433—1446 гг. — староста берасцейскі. 1452 г. — намеснік віцебскі. 1452—1455 гг. — кашталян троцкі. Ёсць згадкі пра тое, што ў часы Вітаўта і Жыгімонта Кейстутавіча з'яўляўся старостам дарагічынскім (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 6... P. 336).

7. У 1446 і 1453 г. браў удзел у пасольствах у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 12, 136).

Уплывовы прадстаўнік літоўскай знаці эпохі Жыгімонта Кейстутавіча і Казіміра. У 1440 г. падтрымаў Міхаіла Жыгімонтавіча, але пройгрыш гэтага князя не пашкодзіў кар'еры Наця.

8. Фундаваў касцёл у Жосле (MAB RS. F 256—2747).

23.06.1495 г. яго ўдава Ганна ў сваім тэстамеце фундавала алтар у кернаўскім касцёле, алтарнік якога павінен быў клапаціцца пра памяць яе і блізкіх. Жадала быць пахаванай у касцёле ў Кернаве (KDKW. S. 498—499).

1. [Гінівілавіч] Міхаіл Нацэвіч

1a. Michael Naczowicz, Михаил Нацевич.

2. Герб — Даліва.

3. Упершыню згадваецца ў часы Свідрыгайлы. У 1478 г. ужо не жыў.

4. Бацька — Наць Пётр Гінівілавіч. Браты — Андрэй, Якуб, Ян. Жонка — Кацярына, дачка князя Васіля Астрожскага (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 111). Яе першым мужам быў Ян Гайцэвіч, а трэцім — Альберт Янавіч Клочка (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 8... P. 231). Дачка — Ганна, што выйшла замуж за Мікалая Янавіча Іллініча (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 3. S. 136—137). Верагодна, быў апошнім прадстаўніком мужчынскай лініі Гінівілаў, бо браты, мяркуючы па ўсім, памерлі бяздзетнымі.

Меў блізкія сувязі з родам Копачаў рускага паходжання. У часы Свідрыгайлы Міхаіл Нацэвіч быў хросным бацькам Яцкі, сына Васіля Капачэвіча (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 3. S. 16—17).

5. Меў вотчынныя ўладанні ў Жосле і Зэльве.

6. Не браў актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці.

8. Каля 1455/1470 гг. разам з братам Янам зрабіў ахвяраванне на касцёл у Жосле, які фундаваў яго бацька (MAB RS. F 256—2747). У 1470 г. фундаваў касцёл у Зэльве (Ваўкавыскі павет), які знаходзіўся ў межах яго ўладанняў (KDKW. S. 308).

1. Гінтаўт Ян

1a. Johannes Ginthold, Gintold, Ginthawt, Gyntawt, Gynthowd.

2. Цяжка сказаць, ці належала яму прыкладзеная да Мельнскай дамовы 1422 г. пячатка з гербам Сякера, бо надпіс не чытаецца (Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju melneńskiego...).

3. У крыніцах з'яўляецца ў 1398 г. як сведка Салінскай дамовы (LUB. Bd. 4. S. 226—227). Памёр пасля 1424 г.

4. Бацька — Вігайла (Тамсама). У недатаваным лісце рагніцкага комтура да магістра Ордэна адзначана, што Гінтаўт — пляменнік Чупурны (GStA PK, OBA 28512). Гінтаўтавічы, што жылі ў сярэдзіне XV ст., наўрад ці з'яўляюцца яго сынамі.

Уладанне Гінтаўта ў Рудаміне (*без наследка*) у 1445—1446 гг. атрымаў Конрад Монтаўтавіч (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 20), што сведчыць пра магчымую роднасць з Монтаўтамі і Бутрымамі. Гэтаму не супярэчыць таксама блізкасць маёнткаў. Нашчадкі Монтаўта ў дакументах падпісваліся як «з Салечнікаў» (параўн. з Чупурнам). Гэта гіпотэза можа патлумачыць, чаму Гінтаўт не ўдзельнічаў у Гарадзельскай гербавай акцыі.

5. У 1424 г. у дакуменце Вітаўта згадваецца як *Gintoldo de Zirutin* (Шырвінты, Жупраны, Жырмуны?) (Vitoldiana... S. 96).

6. У пачатку XV ст. — староста ковенскі (GStA PK, OBA 28512).

1. Гудзігерд Валімонтавіч

1a. Gudigert Wolumontowicz, Gudigird.

2. Герб — Задора.

3. Згадваецца ў 1432 г. у Хрыстмемельскай і Горадзенскай дамовах (Napiersky K. E. Russisch-livländische Urkunden... S. 191; AU. S. 81).

4. Бацька — Валімонт. Браты — Румбоўд, Кезгайла, Яўнус, Шэдзібор, Судзівой. Імя і паходжанне жонкі не высветлены.

Сыны — Конрад і Завіша. Магчыма, таксама Даўгайла *Girdowicz* (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie... S. 27).

5. Вотчынныя землі знаходзіліся ў ваколіцах Вількаміра.

7. Магчыма, што гэта ён (*Guthger*) разам з Румбоўдам у 1416 г. ездзіў паслом у Польшчу (Rachunki dworu króla Władysława Jagiełły... S. 490, 493).

1. Гудзігердавіч Завіша

1а. Завиша.

2. Герб — Задора.

3. Вядомы з патроніма сыноў (KDKW. S. 418). Несумненна, гэта ён (*пан Завиша*) у 1443 г. атрымаў дзесяць чалавек у Жэймах непадалёк ад Дзяволтвы (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 67).

4. Бацька — Гудзігерд Валімонтавіч. Сыны — Херубін і Серафін.

1. Гудзігердавіч Конрад

1а. Conradus Gudigirdowycz, Кудрат Кгуркгирдович.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў данацыі 1437 г. родзіча Станіслава Даўгайлы Віленскай кафедры (KDKW. S. 167).

4. Бацька — Гудзігерд Валімонтавіч. Звесткі пра імя і паходжанне жонкі адсутнічаюць. Сыны — Сямён Конрадавіч Гудзігердавіч (РИБ. Т. 27. С. 251) і Станіслаў (Станька) (Тамсама. С. 253).

5. У 1476 г. Міхаіл і Ян Кезгайлавічы адзначылі, што набылі ў «брата» (г. зн. стрыечнага брата) Конрада некаторыя землі (KDKW. S. 351). Яго сын Станіслаў меў вотчынны маёнтак у Дзяволтве [літ. *Deltuva*] (АЛМ. Т. 1. Вып. 2. С. 194—195).

7. Не прымаў актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці.

Вядомае пра адно яго судовае рашэнне (разам з Судзівоем Валімонтавічам і Радзівілам Осцікавічам) (РИБ. Т. 20. С. 1377—1378).

1. Давойна Візігердавіч

1а. Dowoyn Wysigirdonis.

2. Пытанне з гербам цяжкае. Хроніка Быхаўца прыпісвае Давойнам герб Дубна (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 90—91). У. Сямковіч меркаваў, што Давойны карысталіся гербам Зарэмба (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 214). На думку Б. Мажэйкі, іх герб быў некалькі іншым (Możejko B. Starosta bielski... S. 208—209). Сітуацыю яшчэ больш ускладняе тое, што верагодны бацька Давойны Візігерд у 1413 г. у Гародлі атрымаў герб Адравонж.

3. Згадваецца толькі ў дамове з Польшчай 1401 г. (AU. S. 38).

4. Бацька — Візігерд (гл. пра яго). Звестак пра паходжанне жонкі няма. Сыны — Ян (Івашка), Алехна, Андрэй.

5. Пра маёнткі Давойнаў ранняга перыяду дакладных звестак няма. Хутчэй за ўсё, яны знаходзіліся ў ваколіцах Ліды. Яго сыны зрабілі ахвяраванне на касцёл у Крупе (Лідскі павет), а Алехна Давойнавіч быў старостам лідскім.

1. Давойнавіч Алехна

1а. Olechno Dowoynowicz, Олехно Довоинович.

2. ?

3. Упершыню згадваецца ў дакументах Вітаўта 1420 г. (Szybkowski S. Rec.... S. 158), пазней у Горадзенскай дамове з Польшчай 15.10.1432 г. (AU. S. 81). Памёр пасля 1460 г. У 1464 г. згадваецца як нябожчык.

4. Бацька — Давойна Візігердавіч. Жонка — Барбара (Васька) (сястра Яна Іллініча). Верагодна, не меў нашчадкаў, бо жонка пасля яго смерці запісала свае ўладанні Яну Іллінічу і Яну Кучуковічу (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 24).

6. 1432 г. — староста дарагічынскі. 1434—1435 гг. — староста лідскі. 1452 г. — староста берасцейскі. 1459 г. — староста наваградскі. 1459 г. — кашталян троцкі.

8. Пра яго памяць павінен быў клапаціцца алтарнік, якога прызначаў Ян Іллініч (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 65—67).

1. Давойнавіч Андрэй (Андрушка)

1а. Andruschko Dowoynowicz, Ондрюшка Довоинович.

2. ?

3. Упершыню згадваецца ў дамове з Польшчай 27.02.1434 г. (AU. S. 105). Памёр пасля 1452 г.

4. Бацька — Давойна Візігердавіч. Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Сыны — Ян і, верагодна, Якуб.

6. У 1438 г. — староста дарагічынскі; 1440/42—1448 гг. — староста горадзенскі.

7. Удзельнічаў у розных пасольствах: у 1440 г. ездзіў у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 629); у 1442 г. — да магістра Ордэна (Rowell S. C. Išdavystė... P. 64); у 1446 г. быў у ліку літоўскіх паслоў на Пётркаўскім сойме (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 12); у 1446 і 1448 г. ізноў ездзіў да магістра Ордэна (GStA PK, OF 15. S. 447—448; Możejko B. Starosta bielski... S. 210); у 1452 г. — у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 114).

1. Давойнавіч Ян (Івашка)

1а. Iwaschko Dowoynowicz, Ивашко Довоинович.

2. ?

3. Упершыню згадваецца ў Чартарыйскай дамове 01.09.1431 г. (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135). Памёр у 1459/60 г.

4. Бацька — Давойна Візігердавіч. Жонка — Ганна (паходжанне не высветлена). Сын — Пётр, які ажаніўся з Ганнай Радзівілаўнай (магчыма, як сцвярджае Тэнгоўскі, сястрой Мікалая Радзівілавіча) і стаў пачынальнікам новай галіны Крупскіх (ад вотчыннага ўладання ў Крупе). У іх быў сын Фелікс (Шчасны) Крупскі і чатыры дачкі — Эльжбета, Сафія, Ганна і Кацярына (Tęgowski J. Ślub tajemny... S. 255—257). Дачкі — Алена і Юлляна (KDKW. S. 261—263).

6. 1434 г. — староста горадзенскі (?)[17]. 1448—1454 гг. — староста бельскі.

[17] У дамове з Польшчай 27.02.1434 г. згадваецца горадзенскі староста Івашка (AU. S. 104—105). Пазней горадзенскім старостам быў брат Івашкі Давойнавіча Андрэй.

7. Вядома пра яго дыпламатычныя і гандлёвыя кантакты з Гданьскам (гл.: Możejko B. Starosta bielski... S. 207 і далей).

8. 25.05.1460 г. жонка Ганна пасля яго смерці зрабіла ахвяраванне на Крупскі касцёл (Лідскі павет) (KDKW. S. 261—263). Як можна зразумець з ліста Івашкі Давойнавіча да мяшчан Гданьска, гэты касцёл ён фундаваў разам са сваімі братамі і іншымі родзічамі (Możejko B. Starosta bielski... S. 213—215).

1. Давойнавіч Якуб [Андрэевіч]

1а. Jacobus Dowoynowycz, Якуб Довоинович.

4. Бацькам, хутчэй за ўсё, быў Андрэй Давойнавіч. Жонка — дачка прадстаўніка падляшскай знаці Федзька Ганна Карчоўская (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 132). Сыны — Андрэй, Юрый і Станіслаў.

6. 1481—1499 гг. — староста дарагічынскі.

1. Давойнавіч Ян Андрэевіч

1а. Johannes Andrei Dowoynowicz, Ян Довоинович.

4. Бацька — Андрэй (Андрушка) Давойнавіч. Паходжанне жонкі Ганны не высветлена. Вядома, што яна была маці Міхны Доргавіча. Сыны — Андрэй і Ян. Дачкі — Эльжбета, Ядвіга, Ганна і Маргарыта (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 20).

6. 1478—1494 гг. — староста ваўкавыскі.

7. У 1486 г. ездзіў паслом да татараў у Крым (РИБ. Т. 27. С. 451).

1. Даўгайла Станіслаў

1а. Stanislaus alias Dowgalo, Dowgal Gyrdowicz, Dovgal.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў 1413 г.: уваходзіў у склад дэлегацыі, якую Вітаўт даслаў на перагаворы (Lites ac res gestae... Т. 2. P. 136). Пасля 1437 г. не згадваецца.

4. Бацька — Гірд (вядома толькі імя — *Gyrdowicz*). Жонка — Алушка (KDKW. S. 168). Сын — Юрый (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 15—16).

Меў роднасныя сувязі з Валімонтавічамі: Даўгайла карыстаўся пячаткай з гербам Задора, які ў Гародлі атрымаў Яўнус Валімонтавіч; некалькі Валімонтавічаў выступілі як сведкі ў яго наданні Віленскай кафедры (KDKW. S. 167).

5. Незразумела, дзе былі вотчынныя землі Даўгайлы. На думку У. Сямковіча, яны маглі знаходзіцца ў ваколіцах Вількаміра. Але ён мог паходзіць з Жамойці і быць звязаным з Валімонтавічамі па матчынай лініі.

6. 1413 г. — харужы земскі літоўскі (Lites ac res gestae... T. 2. P. 136). 1431—1437 гг. — харужы віленскі (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135; KDKW. S. 167).

7. У 1413 г. знаходзіўся ў складзе літоўскіх перагаворшчыкаў пры разглядзе справы Бенедзікта Макры (Lites ac res gestae... T. 2. P. 136).

8. У 1437 г. ажыццявіў наданні Віленскай кафедры і віленскім францішканцам (KDKW. S. 167—168).

1. Даўгерд Ян

1а. Johannes alias Dawgerd, Dawgerd, Dowgird, Dolgerd, Довкгирдъ, Довкгардъ, Долъкгиръд.

2. Герб — Помян.

3. Цяжка сказаць, ці звязаны Даўгерд Солкулавіч, які паручыўся за Братошу ў канцы XIV ст., з Даўгердам часоў Вітаўта. У 1401 г. Даўгерд выступае як сведка ў дамове з Польшчай (AU. S. 38). Памёр каля 1443 г. (Semkowicz W. Dowgird... S. 350—351).

4. Звесткі пра бацьку адсутнічаюць. Жонкай, хутчэй за ўсё, была дачка Андрэя Гаштаўта (MAB RS. F 256—2920; больш падрабязна гл.: Petrauskas R. Giminaičiai ir pavaldiniai... P. 117, 124). Сын — Андрэй. Дачка — Багдана.

Меў роднасныя сувязі з Саковічамі: той жа герб Помян, які ў Гародлі атрымаў Сак; тапаграфія ўладанняў (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 135—138); Даўгерд выступае як сведка ў данацыі Андрэя Саковіча Віленскай катэдры (KDKW. S. 150).

5. Сын Даўгерда Андрэй Даўгердавіч называў сваімі вотчыннымі землямі Свіраны і Лынтупы (Тамсама. S. 255, 271, 273). Маёнткі Саковічаў знаходзіліся непадалёк.

6. 1424 г. — маршалак гаспадарскі. 1427—1430 гг. — староста падольскі. 1433—1443 гг. — ваявода віленскі.

7. У 1434 г. ездзіў з пасольствам у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 542).

Распачаў кар'еру ў часы Вітаўта. Пасля смерці гэтага вялікага князя змагаўся з палякамі за Падолле і трапіў у палон.

Адзін з найбольш уплывовых прадстаўнікоў знаці ў гады панавання Жыгімонта Кейстутавіча, пастаянна выступае як сведка ў яго дакументах, атрымаў ад гаспадара нямала маёнткаў. У 1437 г. Даўгерд індывідуальна прысягнуў на вернасць Жыгімонту і каралю Польшчы (AU. S. 106). У 1443 г. да яго звярнуўся папа Яўген IV па пытанні вызвалення мітрапаліта Ісідора (Bullarium Poloniae... 5. S. 201). Нягледзячы на блізкасць да Жыгімонта, браў удзел у змове супраць яго, пасля чаго, у адрозненне ад іншых змоўшчыкаў, захаваў пасаду ваяводы віленскага і ўплыў. Гэта можна патлумачыць толькі яго сувязямі (у тым ліку, роднаснымі) з іншымі прадстаўнікамі літоўскай знаці.

1. Даўгердавіч Андрэй

1а. Andreas (Andruszko) Dowgyrdowycz, Андреи Довъкгирдович.

2. Герб — Помян.

3. Згадваецца ў некалькіх наданнях Касцёлу і сваім служкам. Памёр у 1461 г.

4. Бацька — Даўгерд Ян. Жонка — Свянтохна (паходжанне не высветлена). Пазней яна выйшла замуж за Якуба Янавіча Неміровіча (РИБ. Т. 27. С. 820—821). Дачкі — Ганна (выйшла замуж за Юрыя Гайцевіча, а пазней — за Яна Іллініча) і Алена (выйшла замуж за князя Пецьку Свірскага).

5. Называў сябе «панам / вотчыннікам на Свіранах і Лынтупах» (KDKW. S. 245, 255, 271—273).

7. У палітычным жыцці з незразумелых прычын не ўдзельнічаў.

8. 14.01.1459 г. і ў 1461 г. зрабіў ахвяраванні на фундаваны ім жа касцёл у Лынтупах; у 1461 г. — на Віленскую кафедру (KDKW. S. 255, 271—273).

1. Даўгердавіч Міхаіл

1а. Michalo Dewgerdowicz.

2. ?

3. Згадваецца толькі ў Хрыстмемельскай дамове з Ордэнам 15.05.1432 г. (Napiersky K. E. Russisch-livländische Urkunden... S. 191).

4. Сувязі з іншымі вядомымі Даўгердамі не высветлены.

1. Даўгерд

1а. Dewgerd, Degerd.

2. Карыстаўся знакам негарадзельскага паходжання (AU. S. 101).

3. Упершыню згадваецца ў Горадзенскай дамове з Польшчай 27.02.1434 г. (AU. S. 105), апошні раз — 16.04.1444 г. (KDKW. S. 206).

4. Паходжанне не высветлена. Браты — Наруш і Доўкша[18]. Сыны — Ганус (Ян) Даўгердавіч і Фёдар (Федзька). Дачка — Кацярына, што была жонкай Савіча і Андрэя Масцівілавіча (KDKW. S. 637—639; РИБ. Т. 20. С. 1111).

6. 1434—1444 гг. — староста ашмянскі.

1. Даўгердавіч Ганус (Ян)

1а. Hannus Dagirdowicz, Ганус Дякгирдович.

2. ?

3. Бацька — староста ашмянскі Даўгерд. Сын — Якуб[19].

5. Вотчынныя ўладанні — у Ашмянскім павеце (перш за ўсё — Відзы) (KDKW. S. 372—374).

---

[18] Генеалогія канца XVII — пач. XVIII ст., што рэканструявала гаспадароў маёнтка Відзы, называе Даўгерда і Наруша братамі (MAB RS. F 273—1122). У часы Жыгімонта Старога Павел Нарушавіч называў унука Даўгерда Якуба Ганусавіча дзядзькам (РИБ. Т. 20. С. 1197—1198). Генеалогія называе трэцім братам Даўгерда і Наруша Доўкшу, які меў сына Станіслава (гэтага Доўкшу нельга атаясамліваць з Доўкшам Кімантавічам). Дакумент XVI ст. згадвае наданне Жыгімонта Кейстутавіча Даўгерду, Нарушу і Доўкшу, а таксама іх сыноў Гануса, Яна і Станіслава (MAB RS. F 256—2070).

[19] Такую паслядоўнасць пацвярджае таксама згаданая генеалогія (MAB RS. F 273—1122).

6. 1481 г. — староста мерацкі [літ. *Merkys*].

8. 06.02.1481 г. разам з братам Федзькам фундаваў касцёл у Відзах (KDKW. S. 372—373); 05.03.1481 г. датуецца яшчэ адно яго наданне гэтаму касцёлу (Тамсама. S. 374).

1. [Даўгердавіч] Якуб Ганусавіч

1а. Jacobus Hannussowicz, Якуб Ганусович.

2. ?

3. Бацька — Ганус (Ян) Даўгердавіч (РИБ. Т. 27. С. 662—663). Жонка — Сафія (паходжанне не высветлена) (KDKW. S. 525—526). Не меў нашчадкаў. Якуба Ганусавіча маглі звязваць блізкія сувязі з віленскім біскупам Альбертам Табарам, бо ён не толькі запісаў біскупу значную частку сваіх вотчынных уладанняў, але таксама адарыў некаторых яго слуг (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 97).

5. Асноўныя вотчыны — у Ашмянскім павеце (KDKW. S. 448—449).

6. 1482 —1492 гг. — маршалак гаспадарскі. 1486—1492 гг. — староста эйшышкскі.

8. 26.09.1492 г. Якуб Ганусавіч запісаў выканаўцу тэстамента віленскаму біскупу Альберту Табару маёнтак Відзы і іншыя землі, што складалі трэцюю частку яго ўладанняў. Хацеў быць пахаваным у віленскім бернардзінскім касцёле, запісаў бернардзінам пэўную грашовую суму (KDKW. S. 447—449). Віленскі біскуп павінен быў клапаціцца пра памяць яго блізкіх (Тамсама. S. 525—526; Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 6... P. 198).

1. Дорг

1а. Dorgy.

2. —

3. Згадваецца ў дамове з Польшчай 1401 г. разам з братам Осцікам (AU. S. 37). Цяжка сказаць, ці звязаны з гэтай асобай Доргі / Доргавічы (за выключэнем Судзімонта), што згадваюцца пазней.

4. Бацька — Сірпуцій. Брат — Осцік. Сын — Судзімонт (гл. пра яго).

5. Вотчынныя землі знаходзіліся ў ваколіцах Кернава.

1. Доўкша Кімантавіч

1а. Dauxha, Dawkscha, Dewclxis Kimontowicz.

2. У Гародлі атрымаў герб *Pirzchala*.

3. У Віленскай дамове 1401 г. як сведкі выступаюць Кімант з сынам Доўкшам (AU. S. 37). Апошні раз Доўкша Кімантавіч згадваецца ў Хрыстмемельскай дамове 1432 г. (Napiersky K. E. Russisch-livländische Urkunden... S. 191)[20].

4. Бацька — Кімант (гл. пра яго). Сын — Пац (гл. пра яго). Згаданы ў 1474 г. ашмянскі баярын Станіслаў Доўкшавіч (KDKW. S. 332—334) не быў сынам гэтага Доўкшы.

У. Сямковіч схільны звязваць гарадзельскага Доўкшу з Доўкшам, што згаданы ў 1390 г. сярод жамойтаў атачэння Вітаўта (CEV. S. 23—24). Аднак сувязь з Кімантам больш верагодная.

5. Яго бацька Кімант, па ўсёй верагоднасці, паходзіў з Горадні.

1. Жостаўт

1а. Saystod, Zastold, Szastold.

2. —

3. Упершыню згадваецца (*Saystod*) у Горадзенскай дамове з Ордэнам 1398 г. (CEV. S. 54). Памёр пасля 1404 г.

4. Звесткі пра паходжанне адсутнічаюць. У Віленскай дамове 1401 г. як сведка выступіў *Zastold* з братам *Przezhgindo* (AU. S. 37—38). Гэтае імя падобнае на імя намесніка полацкага 1439 г. Прыжкінта (Полоцкие грамоты... Вып. 1. С. 139). Цяжка сказаць, ці быў яго сынам *Szastoltone de Geydrothy*, які выступіў як сведка ў данацыі Даўтайлы 1437 г. (KDKW. S. 168).

7. Выступае як сведка ў некалькіх дакументах Вітаўта, у тым ліку ў Рацёнжскім міры 1404 г. (LUB. Bd. 4. S. 459).

1. Забярэзінскі Ян Юр'евіч

1а. Johannes Zabrzezinski, Johannes de Zabrzezye, Ян Юрьевич Заберезинскии.

[20] У 1450 г. Доўкша ўпарадкоўваў справы ў Крамянцы (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 41). Але не выключана, што гэта быў яго сын Пац Доўкшавіч.

2. Герб — Ляліва.

3. Упершыню згадваецца ў данацыі 1456 г. Забіты слугамі Міхаіла Глінскага ў 1508 г.

4. Бацька — Юрый Рымавідавіч (гл. пра яго). Жонка — Ганна, дачка Яна Насутавіча. Сыны — Юрый, Ян, Станіслаў. Дачка — Ядвіга, што выйшла за Юрыя Янавіча Іллініча (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 90—91).

5. Асноўная вотчына, што дала прозвішча роду, — Забярэззе (Ашмянскі павет).

6. 1482—1496 гг. — маршалак гаспадарскі. 1484—1496 гг. — намеснік полацкі. 1492—1498 гг. — кашталян троцкі. 1498—1505 гг. — ваявода троцкі. 1498—1508 гг. — маршалак земскі.

7. У 1484 г. ездзіў паслом у Маскоўскую дзяржаву (Banionis E. Lietuvos Didžiosios... P. 205), у 1486 г. — у Польшчу (РИБ. Т. 27. С. 461—463). Вяршыні палітычнага ўплыву дасягнуў у часы Аляксандра.

8. 13.06.1456 г. разам з маці Аляксандрай фундаваў касцёл у Забярэззі (KDKW. S. 248—250). У 1506 г. зрабіў ахвяраванне на касцёл у Міжрэччы (Дарагічынская зямля), які фундаваў яго цесць Ян Насутавіч (Wawrzyńczyk A. Rozwój wielkiej własności... S. 42).

1. Іллініч Ян (Івашка)

1a. Johannes Ilynycz, Johannes Hylinicz, Iwaschko Ilinicz, Iwanus Gilgycz, Ивашко Ильиничь.

2. Герб — Корчак.

3. Упершыню згадваецца ў 1440/47 г. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 31), потым — як пакаёвы караля — у 1454 г. у спісе палонных пасля Хойніцкай бітвы (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102; таксама гл.: Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 142). Пазней сустракаецца ў 1470—1488 гг.

4. Вартыя даверу звесткі пра бацьку адсутнічаюць. Сястра — Барбара (Васька), што выйшла замуж за Алехну Давойнавіча. Верагодна, быў жанаты двойчы: першай жонкай была дачка Кезгайлы Валімонтавіча (імя невядома)[21], другая — Ганна, дачка

[21] Іншая дачка Кезгайлы Мілохна Гедзігоўдава ў 1485 г. называе Юрыя, сына Івана Іллініча, сваім пляменнікам («sororinus») (AGAD, dok. perg., № 7371), а дачка

Андрэя Даўгердавіча (яе першым мужам быў Юрый Гайцэвіч). Сыны — Мікалай і Юрый (напрыклад, РИБ. Т. 27. С. 249). Дачка Барбара — жонка Дабрагоста Нарбутавіча (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 122—123).

5. У гістарыяграфіі сцвярджаецца, што Іллінічы паходзяць са Смаленскай зямлі (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 91; Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 85).

Аднак у спісе палонных 1454 г. адзначана, што Ян Іллініч быў *heres de Polubrzehy* (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102). Гэта вёска знаходзіцца ў Наваградскім павеце (Jurginytė K. Iljiničiai ir jų žemėvalda...)[22]. Ад Казіміра атрымаў маёнткі на Падляшшы, у Берасцейскім павеце (Wawrzyńczyk A. Rozwój wielkiej własności... S. 33—34).

6. 1470—1473 гг. — староста ваўкавыскі. 1475—1478 гг. — староста дарагічынскі. 1483 г. — намеснік віцебскі. 1486 г. — староста браслаўскі. 1487—1488 гг. — намеснік смаленскі.

8. 05.05.1471 г. фундаваў касцёл у Чарнаўчыцах (паміж Берасцем і Камянцом) (AGAD, dok. perg., № 7336)[23]. 09.05.1509 г. гэтаму ж касцёлу зрабіў ахвяраванне яго сын Юрый (AGAD, dok. perg., № 7438).

09.10.1486 г. разам з жонкай Ганнай фундаваў алтар касцёла ў Лынтупах (KDKW. S. 411—412). 25.07.1495 г. ахвяраванне гэтаму ж касцёлу зрабіў яго сын Мікалай (Тамсама. S. 507—508).

19.07.1470 г. сястра Яна Іллініча Барбара (жонка Алехны Давойнавіча), перадала брату ўладанні, што падараваў ёй муж, і адзначыла, што ён будзе павінен утрымліваць алтарніка, які будзе клапаціцца пра памяць яе самой, яе мужа і блізкіх (Archiwum książat Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 65—67).

Гэтыя звесткі сведчаць пра тое, што Ян Іллініч быў католікам. Згаданы ў слуцкай памянной праваслаўнай кнізе пачатку XVI ст. Іван Ільіч, верагодна, не ідэнтычны гэтаму Іллінічу.

Бутрыма Кезгайлавіча Ганна ў 1476 г. называе Юрыя Іллініча братам («frater») (AGAD, dok. perg., № 7348).

[22] 25 ліпеня 1495 г. яго сын Мікалай называе сябе «heres de Bolbrzek» (KDKW. S. 507). Гэта, несумненна, тая ж мясцовасць.

[23] А. Ваўжынчык сцвярджае, што Іван Іллініч набыў Чарнаўчыцы ў 1477 г. Аднак дакумент, на які яна спасылаецца, недатаваны, а выдаўцы паставілі 1477 г. толькі як дату «ante quem» (Archiwum książat Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 73).

1. Карэйва Альберт

1а. Albracht Korewa, Careybo, Coreiko, Koreyko.

2. У Гародлі атрымаў герб Дубна.

3. Верагодна, ідэнтычны старосту медніцкаму Карэйву (*Careybo*), які выступаў як сведка ў Салінскай дамове 1398 г. (LUB. Bd. 4. S. 226—227). Пасля Гарадзельскай уніі ў крыніцах больш не сустракаецца.

4. У дакуменце Гарадзельскай уніі адзначана, што ён паходзіў з Соўгуцяў (AU. S. 53—54). Згаданы пад 1386 г. жыхар жамойцкай вёскі *Girstawtendorff* Соўгуць, хутчэй за ўсё, быў яго бацькам (SRP. Bd. 2. S. 669; Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 5. S. 53—54). Брат — Трумп. Сыны — Ян (*Iwaschko Korewicz*), які выступае як сведка ў Хрыстмемельскай дамове 1432 г. (Napiersky K. E. Russisch-livländische Urkunden... S. 191), і Фёдар[24]. Магчыма, яго дачкой была Ганна Багдана, жонка Наця Гінівілавіча.

Роднасныя сувязі (той жа герб) лучылі яго з адным з найбольш уплывовых жамойцкіх баяраў Гайлімінам. Брат Карэйвы Трумп у 1409 г. разам з Гайлімінам ездзіў уздымаць паўстанне жамойтаў (CEV. S. 180).

5. Паходзіў з Жамойці, але вотчынныя землі меў таксама ў Аўкштоце: *Вегеберыхты* згадваюць непадалёк ад Кернава *Sowguttindorff* (SRP. Bd. 2. S. 694—695).

6. 1398 г. — староста медніцкі. 1412 г. — староста вяленскі (разам з Якубам Мінігайлам).

7. Яшчэ адзін баярын, звязаны як з Жамойцю, так і з Аўкштотай. Кантактаваў з немцамі (GStA PK, OBA 836).

1. Касцевіч Станіслаў (Станька)

1а. Stanislaus Kostewicz, Станько Костевич.

2. ?[25]

3. Упершыню згадваецца як каралеўскі дваранін у спісе

[24] У дакуменце Жыгімонта Кейстутавіча 1434 г. згадваецца, што Івашка і Федзька Карэйвічы мелі вёску ў Медніцкай [літ. *Medininkai*] воласці (Віленскага ваяводства) (KDKW. S. 154).

[25] А. Банецкі сцвярджае, што гэты род карыстаўся гербам Ляліва, але не абгрунтоўвае свайго меркавання (Boniecki A. Herbarz polski. T. 11. S. 350).

палонных 1454 г, пасля Хойніцкай бітвы (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102). Пасля гэтага выступае як сведка ў дакуменце 1464 г. Марціна Гаштаўта (KDKW. S. 280). Памёр каля 1498 г.

4. Звесткі пра паходжанне адсутнічаюць. Браты — Алехна, згаданы ў некалькіх дакументах сярэдзіны XV ст. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 60—61), і, магчыма, Якуб (РИБ. Т. 27. С. 253). Паходжанне і імя жонкі таксама не высветлены. Сыны — Вацлаў і Ян. Адзін з іх, па ўсёй верагоднасці, служыў у 1487 г. пры польскім двары Казіміра (Teki Pawińskiego. T. 2. S. 172). Дачка — Сусана, з ордэна францішканаў-тэрцыярыяў (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 3. S. 140; AGAD, dok. perg., № 7470).

Роднасныя сувязі маглі звязваць яго з Лелюшам, бо ў 1522 г. яго сын Ян Станіслававіч Касцевіч судзіўся за *его близкость по пану Лелюши* (Lietuvos Metrika. Įrašų knyga 11... P. 108).

5. У спісе палонных пазначана паходжанне *heres de Costanyowicz* (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102). Касцяневічы — у Ашмянскім павеце.

6. 1481/85—1498 гг. — староста ковенскі. 1492 г. — маршалак гаспадарскі.

1. Кезгайла Валімонтавіч (Міхаіл)

1а. Michael alias Keszgal, Kesgaylo Wolymunthowicz, Kesgal, Kinsgail, Kinsgal, Kynsegal, Kisegal, Kiesgal, Кезкгаил(о).

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў Віленскай дамове з Польшчай 1401 г. (AU. S. 38). Памёр каля 1449 г.

4. Бацька — Валімонт. Браты — Румбоўд, Яўнус, Шэдзібор, Гудзігерд, Судзівой. Жонка — Алена (паходжанне не высветлена). Сыны — Міхаіл, Ян, Пётр, Дабяслаў (Добка), Бутрым, Таліят(?). Дачкі — Даратэя (жонка Яна Гаштаўта) і Мілохна (жонка Пятра Сенькі Гедзігоўдавіча)[26].

5. У дакументах называў асноўным вотчынным уладаннем Дзяволтву (напрыклад, KDKW. S. 154).

6. 1410 г. — староста вількамірскі. 1412—1432 гг., 1440 г. і 1443—1449 гг. — староста жамойцкі. 1413 г. — маршалак

[26] Верагодна, меў яшчэ адну дачку, жонку Яна Іллініча (гл. пра яго).

гаспадарскі (Lites ac res gestae... T. 2. P. 148). 1444—1449 гг. — кашталян віленскі.

7. Часта браў удзел у пасольствах: у 1425 г. двойчы ездзіў да магістра Ордэна (CEV. S. 699, 709); туды ж — у 1430, 1437, 1444 і 1446 г. (Тамсама. S. 921; LUB. Bd. 9. S. 116; GStA PK, OF 15. S. 441—446, 447—448). У 1413 г. як прадстаўнік літоўскай дэлегацыі ўдзельнічаў у вырашэнні справы Бенедыкта Макры (Lites ac res gestae... T. 2. P. 136). У 1431 г. быў у складзе пасольства да караля Польшчы (GStA PK. OBA 5633).

Адзін з найбольш уплывовых прадстаўнікоў літоўскай знаці, які захоўваў свой палітычны ўплыў пры чатырох вялікіх князях. Адзін з тых, хто фармаваў заходнюю палітыку Літвы. Непасрэдна кантактаваў з прадстаўнікамі Ордэна.

8. У 1444 г. фундаваў касцёл у Дзяволтве (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie... S. 22). Па ўсёй верагоднасці, фундаваў касцёл у Крожах (Błaszczyk G. Diecezja żmudzka... S. 145).

У 1445 г. з ініцыятывы жонкі Алены быў упісаны ў кнігі Кракаўскага ўніверсітэта (Fijałek J. Kościoł... S. 129—130).

1. Кезгайлавіч Бутрым Уладзіслаў

1а. Wladislaus alias Butrin, Butrim.

2. Герб — Задора.

3. У 1437 г. згадваецца ў данацыі Яна Гаштаўта як брат Міхаіла і Яна Кезгайлавічаў (KDKW. S. 748—749). Памёр да 1445 г.

4. Бацька — Кезгайла Валімонтавіч. Верагодна, яго дачку Ганну Бутрымаўну ўзялі да сябе Пётр Сенька Гедзігоўдавіч і Мілохна Кезгайлаўна (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie... S. 33). У 1476 г. Ганна Бутрымаўна ў тэстаменце запісала свае ўладанні цётцы Гедзігоўдавай, а пасля яе смерці — свайму «брату» Юрыю Іллінічу (AGAD, dok. perg., № 7348).

8. Як сын ваяводы жамойцкага (*her Butrinco*) згадваецца ў памянной кнізе брацтва кракаўскага касцёла Марыі (Mitkowski J. Księga zmarłych... S. 85; Rowell S. C. Winning the Living... P. 97—98).

У 1445 г. у мемарыяльным запісе Алены Кезгайлавай у кнізе Кракаўскага ўніверсітэта згадваецца родзіч (які ўжо памёр) *Wladislaus alias Butrin* (Fijałek J. Kościoł... S. 129—130).

1. Кезгайлавіч Дабяслаў (Добка)

1а. Dobeslaus filius domini Kiesgal.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў данацыйным дакуменце 1442 г. Анастасіі Гедзігоўдавай для капліцы Віленскай кафедры (KDKW. S. 197). Памёр каля 1460 г.

4. Бацька — Кезгайла Валімонтавіч. Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

6. 01.09.1458 г. у тэстаменце Яна Манівідавіча ён выступае як староста віленскага Верхняга замка (Semkowicz W. Przywileje Witołda dla Moniwida... S. 261—262)[27].

1. Кезгайлавіч Міхаіл

1а. Mich(a)el Kenszgaylowicz / Kezigalowicz, Михаил(о) Кезкгаилович.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў наданні Яна Гаштаўта 1437 г. віленскім францішканцам (KDKW. S. 748—749). Памёр у 1476 г.[28].

4. Бацька — Кезгайла Валімонтавіч. Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

5. Асноўнае вотчыннае ўладанне — Дзяволтва. Атрымаў шмат вялікакняскіх наданняў у часы Казіміра. Напрыклад, адразу пасля таго як стаў намеснікам смаленскім, у 1451 г. у той зямлі атрымаў маёнтак Ельня; тым жа прывілеем яму былі нададзены маёнткі ў Жалезніцы[29], Асціловічах і 21 чалавек у Лукомлі (GStA PK, Coll. Zasztowt, № 5).

6. 1444—1476 гг. — канцлер ВКЛ. 1450—1458 гг. — намеснік смаленскі. 1459—1476 гг. — ваявода віленскі.

7. У 1440 г. разам з братам Янам ездзіў у Польшчу, дзе

---

[27] Незвычайная назва пасады нагадвае кашталяна, але кашталянам на той момант быў яго родзіч Судзівой Валімонтавіч.

[28] 19 сакавіка 1476 г. у рахунковай кнізе гаспадара ён згадваецца як нябожчык (Rachunki królewskie z lat 1471—1472... S. 121).

[29] У 1459 г. гаспадар яшчэ раз надаў яму ўладанне ў Жалезніцы (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 88; AGAD, dok. perg., № 5854). Магчыма, гэта было дапаўненне ранейшага надання, але не выключана, што Кезгайлавіч не рэалізаваў першы прывілей.

ўдзельнічаў у перагаворах пра прыезд каралевіча Казіміра ў Літву (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 127). Адзін з найбольш уплывовых прадстаўнікоў знаці эпохі Казіміра. На пасадзе канцлера актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы дакументаў.

8. 22.02.1476 г. Міхаіл Кезгайлавіч ізноў фундаваў капліцу Кезгайлаў у Віленскім кафедральным касцёле (KDKW. S. 348—350). 29.02.1476 г. з братам Янам зрабіў ахвяраванне на касцёл у Дзяволтве (Тамсама. S. 350—352). Верагодна, ён фундаваў таксама касцёл у Ельні, у якім пазней заснаваў алтар яго пляменнік Мікалай Янавіч Кезгайлавіч (гл. пра яго).

1. Кезгайлавіч Пётр

1а. Petrus Kensgalowicz.

2. Герб — Задора.

3. Згадваецца толькі ў данацыйным дакуменце 1437 г. родзіча (той жа герб) Станіслава Даўгайлы (KDKW. S. 167). Верагодна, гэта яго (*her Knyssegalowitcz*) у 1481 г. у сваім лісце да магістра Ордэна згадвае Ян Кезгайлавіч (GStA PK. OBA 16947).

4. Бацька — Кезгайла Валімонтавіч. Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

1. Кезгайлавіч Таліят

1а. Талят Кезкгаилович.

3. У сярэдзіне XV ст. атрымаў пяць чалавек у Троцкай воласці (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 32)[30].

4. Бацькам, верагодна, быў Кезгайла Валімонтавіч.

6. Цяжка сказаць, ці згаданы ў лісце 1481 г. Яна Кезгайлавіча цівун айрагольскі Таліят ідэнтычны гэтай асобе (MAB RS. F 256—3528, l. 20).

[30] У 1433 г. Таліят (*Taleiothe*) згадваецца сярод некалькіх літоўскіх кіраўнікоў, што ўварваліся ў землі Ордэна (GStA PK, OBA 6561). Аднак на той час былі вядомыя некалькі Таліятаў, напрыклад, у Чартарыйскай дамове 1431 г. згадваецца Таліят Вігайлавіч (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135).

1. Кезгайлавіч Ян

1а. Johann(es) Kenszgal / Kenszgaylowicz, Johannes Kinsygal, Johan Kynszegallowitcz, Johan Knyssegalowitcz, Ян Кезкгаилович.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў наданні Яна Гаштаўта 1437 г. віленскім францішканцам (KDKW. S. 748—749). Памёр у 1485 г.

4. Бацька — Кезгайла Валімонтавіч. Імя і паходжанне жонкі не высветлены[31]. Сыны — Мікалай, Станіслаў і яшчэ адзін сын (імя невядома), які ажаніўся з дачкой Альберта Янавіча Манівіда Ганнай і памёр да 1492 г. (Ochmański J. Moniwid i jego ród... S. 30—31). Дачкі — Алена, што выйшла замуж за Юрыя Міхайлавіча Монтаўтавіча (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie... S. 32; параўн.: Lietuvos Metrika. 12-oji Teismų bylų knyga... P. 181), і другая, імя якой невядома, што выйшла замуж за Івана Юршу (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 163).

5. Як і іншыя Валімонтавічы / Кезгайлавічы, асноўным вотчынным уладаннем лічыў Дзяволтву. Меў таксама маёнткі ў Жамойці.

6. 1449—1485 гг. — староста жамойцкі. 1477 г. — каштэлян троцкі. 1478—1485 гг. — каштэлян віленскі.

7. У 1440 г. разам з братам Міхаілам ездзіў у Польшчу, дзе ўдзельнічаў у перагаворах пра прыезд каралевіча Казіміра ў Літву (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 127); у 1458 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна (LUB. Bd. 11. S. 586—587). У 1473 г. удзельнічаў у вызначэнні мяжы з Лівоніяй (Описание... Вып. 3. С. 41—42). У 1477 і 1481 г. таксама ўдзельнічаў у перагаворах пра межы (GStA PK, OBA 16656, OBA 16948).

Нягледзячы на памежныя канфлікты, падтрымліваў сяброўскія адносіны і перапісваўся з рознымі ордэнскімі ўраднікамі. Пасля смерці бацькі атрымаў ад яго ў спадчыну ўрад старосты жамойцкага і задачу курыраваць заходнюю палітыку Літвы.

8. 29.02.1476 г. Ян Кезгайлавіч з братам Міхаілам зрабілі наданне касцёлу ў Дзяволтве, які фундаваў іх бацька (KDKW. S. 350—352). Фундаваў касцёл у Мсцібаве (згадка пра гэта ёсць у данацыі яго сына Станіслава: KDKW. S. 443—444). Фундаваў алтар у Крожах (Błaszczyk G. Diecezja żmudzka... S. 201).

[31] Вядома, што яна памерла каля 1477 г. (GStA PK, OBA 16705, OBA 16803).

1. Кезгайлавіч Мікалай Янавіч

1а. Nicolaus Janowicz, Nicolaus Kyesgal.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў 1481 г. як маршалак гаспадарскі (GStA PK. OBA 16947). Памёр у 1512 г.

4. Бацька — Ян Кезгайлавіч. Быў жанаты з дачкой князя Пецькі Свірскага (Tęgowski J. Rodowód kniaziów Świrskich... S. 105). Прызначыў брата Станіслава апекуном сваіх малых дзяцей (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie... S. 40—41).

5. У дакументах называў сваёй асноўнай вотчынай Крожы (*heres de Kroze*) (KDKW. S. 529).

6. 1481 г. — маршалак гаспадарскі. 1509—1512 гг. — маршалак земскі.

8. 09.05.1498 г. фундаваў алтар у касцёле ў Ельні (KDKW. S. 529—530).

1. Кезгайлавіч Станіслаў Янавіч

1а. Stanislaus Janowicz, Станислав Янович.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў 1481 г. (GStA PK. OBA 16947). Памёр у 1527 г., пахаваны ў Віленскім кафедральным касцёле (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie... S. 39).

4. Бацька — Ян Кезгайлавіч. Першай жонкай была дачка Алехны Судзімонтавіча (імя невядома), другой — Ядвіга (сястра першай). Сыны — Міхаіл, Ян, Станіслаў. Дачка — Барбара, што выйшла замуж за Яна Янавіча Забярэзінскага (Pietkiewicz K. Kieżgajłowie... S. 38—39; Tęgowski J. Rodowód kniaziów Świrskich... S. 105).

5. Асноўнае вотчыннае ўладанне — Крожы.

6. 1486—1527 гг. — староста жамойцкі. 1499—1522 гг. — кашталян троцкі. 1501—1503 гг. — гетман літоўскі. 1522—1527 гг. — кашталян віленскі.

7. У 1487 г. дасланы на перагаворы з прадстаўнікамі Ордэна (GStA PK. OBA 17295).

Вяршыні сваёй палітычнай кар'еры дасягнуў у часы Аляксандра і Жыгімонта Старога.

8. 07.06.1492 г. зрабіў ахвяраванне на касцёл у Мсцібаве, які фундаваў яго бацька (данацыйны дакумент складзены ў Горадні ў той жа дзень, калі там памёр кароль Казімір: KDKW. S. 443—444).

1. Кімант

1а. Kymunt, Kymundt, Kynmud.

2. —

3. Упершыню згадваецца ў 1388 г. у прывілеі Вітаўта яўрэям (Vitoldiana... S. 174). Апошні — у 1401 г. у Віленска-Радамскай дамове (AU. S. 37).

4. Звесткі пра бацьку адсутнічаюць. Сын — Доўкша (гл. пра яго).

5. Крыжацкія апісанні дарог згадваюць непадалёк ад Горадні *Kymundsdorf* і *Kymont Rasanenhoff* (SRP. Bd. 2. S. 705, 706).

7. У 1396 г. прызначаны Вітаўтам кіраўніком дэлегацыі на перагаворы з Ордэнам пра межы (CDP. Bd. 5. S. 106—107).

1. Клаўсігайла Бернард

1а. Berhardus dictus Clausgel, Clawssegail, Clawsigal, Clausigal.

2. —

3. Упершыню згадваецца ў 1390 г. сярод верных Вітаўту жамойтаў (CEV. S. 23—24). У справе 1413 г. супраць Нямецкага ордэна выступае як *Berhardus dictus Clausgel de Rosseyne* (Lites ac res gestae... T. 2. P. 147). Памёр пасля 1413 г.

4. Звесткі пра бацьку і жонку адсутнічаюць. Сын — Ян Мінімонт (гл. пра яго).

5. У дакументах 1390, 1409 і 1413 г. адзначана, што ён паходзіў з Расейнаў.

7. Уплывовы жамойцкі баярын. У 1409 г. Вітаўт, рыхтуючы паўстанне жамойтаў, даслаў яго ў Жамойць (CEV. S. 185). У лісце рагніцкага комтура да вялікага магістра згадваецца пра яго актыўныя дзеянні ў Жамойці ў 1409 г. (GStA PK, OBA 28563).

1. Контаўт Міхаіл

1а. Kantolt, Kunttolt, Cantawt, Canttaute, Контолт, Контовт.

2. ?

3. Упершыню згадваецца ў наданні Жыгімонта Кейстутавіча яго брату Біралу (MAB RS. F 256—3528, l. 1). Памёр пасля 1453 г.

4. Звесткі пра бацьку адсутнічаюць[32]. Брат — Бірал (магчыма, ідэнтычны ковенскаму войту з тым жа імем). Сын Ян, які ажаніўся з дачкой Алехны Судзімонтавіча Ядвігай (пасля яго смерці яна другі раз выйшла замуж за Станіслава Барташавіча з Монтаўтавічаў). З яго дачкай ажаніўся Шэмет (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 134). Хрысціянскае імя Міхаіл вядома з вартай даверу генеалогіі XVI ст. (MAB RS. F 256—3637).

5. Меў вотчынныя ўладанні ў Крожах, Паюрах [літ. *Pajūris*], Паланзе (Rowell S. C. Rusena karas Žemaičiuose... P. 8—9, 23).

6. 1436—1440, 1441 гг. — староста жамойцкі. 1452—1453 гг. — староста жамойцкі (разам з галоўным старостам Янам Кезгайлавічам).

1. Кучуковіч Юрый

1а. Юрьи Кучюкович.

2. Герб — Сякера.

3. Упершыню згадваецца ў дакуменце князя Васіля Збараскага 1481 г. (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 80).

4. Бацька — Конрад Кучук. Брат — Ян. Пра жонку і нашчадкаў нічога не вядома.

6. 1482 г. — маршалак гаспадарскі.

1. Кучуковіч Ян

1а. Johannes Kuczuk, Johannes Kuczukowicz, Kuczek, Ян Кучюк, Кучук.

---

[32] Вядомае наданне Жыгімонта Кейстутавіча Біралу Гейтутавічу (MAB RS. F 256—3528). Бацькам Контаўта і Бірала, магчыма, быў Гейтуць. Праўда, у позніх спісе дакумента імя можа быць скажоным.

2. Герб — Сякера[33].

3. Упершыню згадваецца ў 1454 г. сярод каралеўскіх дваран, якія ўдзельнічалі ў Хойніцкай бітве (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 142). У Літве з'яўляецца ў 1458 г. (супліка да папы: Bullarium Poloniae... 6. S. 258). Памёр пасля 1478 г.

4. Пра бацьку, Конрада Кучука (*Cunradus alias Kuczuc*), мы ведаем толькі з яго надання 1436 г. віленскім францішканцам (KDKW. S. 166). На думку У. Сямковіча, ён мог быць сынам Аляксандра Монтаўта (Тамсама. Спас. 1) (гл. Конрад Монтаўтавіч). Храналагічна хутчэй мог быць братам Монтаўта.

Брат — Юрый. Жонка — дачка Яна Гаштаўта Марына, з якой яго звязвала кроўная і шлюбная роднасць (Bullarium Poloniae... 6. S. 258; РИБ. Т. 20. С. 1118). Сын — Альберт. Дачкі — Ганна (жонка Станіслава Пятровіча Кішкі) і Барбара Гінівілава (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 101).

5. Яго бацька лічыў вотчынным уладаннем Жырмуны (*heres de Szyrmuni*) (KDKW. S. 166), а ён сам — Салечнікі (*de Solcznyky*) (Zbiór dyplomatów rządowych... S. 24—25). Гэтыя звесткі, як і герб Сякера, з'яўляюцца пацверджаннем блізкай роднасці Кучукаў з Монтаўтамі і Бутрымамі.

Іншыя ўладанні яго бацькі — Дакудава непадалёк ад Ліды (KDKW. S. 166) і Жыдкавічы (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 6... P. 223).

6. 1469 г. — староста вількейскі [літ. *Vilkija*]. 1469—1478 гг. — маршалак гаспадарскі. 1473—1478 гг. — староста лідскі. 1478 г. — староста горадзенскі.

7. У 1463 г. ездзіў з пасольствам да палякаў (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 366); у 1468 г. ездзіў з пасольствам да крымскіх татараў (Pułaski K. Stosunki... S. 293); у 1473 г. удзельнічаў у вызначэнні мяжы з Лівоніяй (Описание... Вып. 3. С. 41—42). Ёсць згадкі пра яго пасольства ў Чэхію (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 6... P. 223).

8. 01.07.1436 г. яго бацька Конрад Кучук зрабіў наданне віленскім францішканцам. Да дакумента ён прыклаў пячатку

[33] Пячатку з гэтым гербам выкарыстоўвалі як яго бацька Конрад (KDKW. S. 165), так і сын Альберт (AU. S. 132).

з гербам Сякера (KDKW. S. 165—166)[34].

Храніст бернардзінцаў Ян Камароўскі называе Кучуковіча (верагодна, Альберта) адным з галоўных дабрадзеяў бернардзінцаў. Ён быў пахаваны ў віленскім бернардзінскім касцёле, ва ўзвядзенні якога актыўна ўдзельнічаў (MPH. T. 5. S. 200).

1. Лелюш Пётр

1а. Petrus alias Lelusch, Leluschius, Лелюш(и).

2. Герб — Даліва (27.02.1434 г. — AU. S. 100). Аднак на пячатцы, прывешанай 31.12.1435 г. у Берасці, іншы герб (GStA PK, Perg. Urk., Schiebl. 66, № 19).

3. Упершыню згадваецца ў 1433 г. як ваявода троцкі (AU. S. 94). Памёр пасля 1452 г.

4. Паходжанне не высветлена. Звесткі пра нашчадкаў адсутнічаюць[35]. У адным дакуменце згадваецца брат Крэм (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 21).

Родныя сувязі, магчыма, звязвалі яго з Нацем Гінівілавічам, які ў Гародлі атрымаў герб Даліва.

5. Яго вотчыны можна лакалізаваць па наданні касцёлу ў Шчучыне (Лідскі павет). У сярэдзіне XV ст. атрымаў людзей у Астрыне, што знаходзіцца непадалёк (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 61). Меў уладанні ў Зубарэвічах паміж Мазыром і Бабруйскам (Lietuvos Metrika. Įrašų knyga 11... P. 108)[36].

6. 1433—1440 гг. — ваявода троцкі. 1450—1452 гг. — староста горадзенскі.

7. У 1436 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна (Golębiowski Ł. Dzieje Polski. T. 2. S. 40; GStA PK, OBA 7217).

Зрабіў імклівую кар'еру ў часы Жыгімонта Кейстутавіча, але ўдзельнічаў у змове супраць яго (Lietuvos metraštis: Bychovco

[34] Е. Ахманьскі прыпісвае Альберту Кучуковічу фундацыю касцёла ў Жырмунах 1437 г. (Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 64). Фундатарам мог быць толькі Конрад Кучук.

[35] 03.06.1450 г. у супліцы Пятра Лелюша да папы згадваецца жонка, імя якой не называецца (Bullarium Poloniae... 6. S. 92).

[36] Г. Мортэнсэн схільная атаясамліваць адзначаную ў ордэнскіх «Вегеберыхтах» пад нумарам 73 мясцовасць «Leyentracken» з прынёманскімі Лелюшамі (Mortensen G. Beiträge... S. 66). Аднак што звязвае гэтую мясцовасць з Пятром Лелюшам, незразумела.

kronika... P. 125), пасля чаго страціў пасаду ваяводы троцкага і свой уплыў.

8. У 1442 г. зрабіў наданне касцёлу ў Шчучыне (KDKW. S. 194)[37].

1. Манівід Альберт

1а. Albertus alias Moniwid, Albertus Monywid, Moniwyd, Monwide, Manwid, Manwede, Mannewid, Manewyde, Монивид Коиликинович.

2. Герб — Ляліва, які атрымаў у Гародлі. Меў таксама дагарадзельскі герб еўрапейскай традыцыі (Semkowicz W. Braterstwo... S. 414). Герб Ляліва выкарыстоўваў ужо ў студзені 1414 г. (Biblioteka XX. Czartoryskich w Krakowie, perg. № 302).

3. Упершыню згадваецца ў паручыцельстве за князя Грыцку Канстанцінавіча 1387/89 г. (Prochaska A. Rokosz... S. 395). Памёр у 1423 г.

4. Бацька — Гайлігін. Брат — Юрый Гедзігоўд. Быў двойчы жанаты: з Ядвігай[38] і Юллянай. Юлляна была родзічкай Вітаўта, верагодна, сястрой жонкі Вітаўта Ганны (гл.: Petrauskas R. Vytauto laikų... P. 17). Сын — Ян (Івашка).

5. У канцы XIV — пачатку XV ст. *Вегеберыхты* лакалізуюць непадалёк ад Геранёнаў *Manewidendorf* (SRP. Bd. 2. S. 704—705). Вотчынныя ўладанні Манівіда канцэнтраваліся ў Ашмянскім павеце (напрыклад, Вішнева). Меў землі ў Вільні, Браславе (Petrauskas R. Vytauto laikų... P. 23).

6. 1396—1423 гг. — староста і (з 1413 г.) ваявода віленскі. У часы Вітаўта — староста браслаўскі (KDKW. S. 745—746).

7. У 1404 і 1405 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна (CEV. S. 99, 121); у 1420 г. — у Маскву (LUB. Bd. 5. S. 617). У 1404 г. разам з Чупурнам і Сунгайлам пасярэднічаў пры заключэнні перамір'я паміж жамойтамі і Ордэнам (CEV. S. 100,

[37] Аўтэнтычнасць дакумента выклікае сумненні. Лелюш тады ўжо не быў ваяводам троцкім. Аднак сам факт надання, напэўна, меў месца. Пазнейшыя фальсіфікатары часта карысталіся аўтэнтычнымі дакументамі. Е. Ахманьскі адзначае, што гэты касцёл Лелюш фундаваў у 1436 г. (Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 64).

[38] Аргументы на карысць яе ідэнтыфікацыі з польскай шляхцянкай Ядвігай з Лежаніц, ад якой Манівід атрымаў герб Ляліва ў Гародлі (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 6. S. 183; Antoniewicz M. Manifestacja... S. 409—410), непераканаўчыя.

121). У 1413 г. быў у складзе літоўскай дэлегацыі пры вырашэнні справы Бенедыкта Макры (Lites ac res gestae... T. 2. P. 136).

Уплывовы прадстаўнік знаці эпохі Вітаўта, да якога па важных пытаннях звярталіся нават кіраўнікі іншых дзяржаў (напрыклад, магістр Ордэна). Верагодна, быў адным з камандуючых літоўскім войскам у Грунвальдскай бітве (CEV. S. 209; GStA PK, OBA 1305; Ochmański J. Manivydas... P. 113).

8. 24.07.1407 г. Альберт Манівід надаў вёску ашмянскім францішканцам (MAB RS. F 276—1494, l. 3—4). У 1423 г. фундаваў капліцу Св. Альберта і Св. Юрыя (KDKW. S. 745—746)[39], дзе пазней быў пахаваны. Таксама фундаваў касцёл у Браславе (Тамсама. S. 745—746).

Магчыма, з'яўляўся фундатарам касцёла ў вотчынных Геранёнах (Суботніках) (Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 62).

1. Манівідавіч Ян (Івашка)

1a. Johannes (Iwaschko) Moniwidowicz, Johannes Monividi, Ywaschko Monywidowicz, Ивашко Монивидович.

2. Герб — Ляліва.

3. У траўні 1423 г. прыклаў пячатку да Мельнскай дамовы 1422 г. (Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju melneńskiego...)[40]. У 1431 г. удзельнічаў у складанні Чартарыйскай дамовы (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135). Памёр у 1458 г.

4. Бацька — Альберт Манівід. Жонка — Ганна (паходжанне не высветлена), якая ў 1476 г. у тэстаменце запісала свае маёнткі дачкам (AGAD, dok. perg., № 7347). Сыны — Ян і Альберт. Дачкі — Ядвіга (выйшла замуж за Алехну Судзімонтавіча) і Сафія (выйшла замуж за Мікалая Радзівілавіча).

5. Вотчынныя землі знаходзіліся, галоўным чынам, у Ашмянскім павеце. Асноўным вотчынным уладаннем (пячатка 1423 г., тэстамент 1458 г.) называў Жупраны (*heres in Zuprani* — Semkowicz W. Przywileje Witołda dla Moniwida... S. 261). Ад стрыечнага брата Пятра Сенькі Гедзігоўдавіча атрымаў у спадчыну родавае ўладанне Вішнева.

---

[39] Магчыма, што фундаваў дзве капліцы — у Віленскай кафедры і Віленскім замку (KDKW. S. 197).

[40] У спісе сведак дамовы яго імя няма. Магчыма, прыкладаў пячатку за свайго дзядзьку Юрыя Гедзігоўда.

6. 1436—1437 гг. — староста падольскі (у лагеры Свідрыгайлы) (GStA PK, OBA 7170; Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. № 36). 1437 г. — староста крамянецкі (Тамсама). 1443—1458 гг. — ваявода троцкі. 1458 г. — ваявода віленскі.

7. У 1447 г. удзельнічаў у перагаворах пра межы з прадстаўнікамі Лівоніі (LUB. Bd. 10. S. 248). У 1448 г. ездзіў на агульны з палякамі з'езд у Люблін (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 45).

Актыўную палітычную дзейнасць распачаў у часы Свідрыгайлы. Разам са сваім дзядзькам Юрыем Гедзігоўдам пасля змовы Жыгімонта Кейстутавіча застаўся верны Свідрыгайлу. У 1440 г. далучыўся да прыхільнікаў Казіміра і з таго часу знаходзіўся ў ліку найбольш уплывовых прадстаўнікоў літоўскай знаці.

1. Манівід Альберт Янавіч

1а. Albertus Moniwid, Воитех Монивидович.

2. Герб — Ляліва.

3. Упершыню згадваецца ў тэстаменце бацькі 1458 г. (Semkowicz W. Przywileje Witołda dla Moniwida... S. 261—262). Ян Длугаш адзначае, што Альберт Манівідавіч памёр у канцы 1475 г. падчас падарожжа з Баварыі ад эпідэміі (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 635).

4. Бацька — Ян Манівідавіч. Паходжанне жонкі Эльжбеты не высветлена (яна жыла яшчэ ў 1492 г.) (Wolff J. Senatorowie... S. 78). Дачка — Ганна (выйшла за аднаго з Кезгайлавічаў).

5. Вотчынныя землі знаходзіліся, галоўным чынам, у Ашмянскім павеце. Асноўным вотчынным маёнткам лічыў Геранёны (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1... P. 128). Меў рэзідэнцыю ў Вільні (AGAD, dok. perg., № 7347; Ochmański J. Moniwid i jego ród... S. 58).

6. 1461 г. — кашталян віленскі. 1473—1475 гг. — староста наваградскі. 1475 г. — падстолі гаспадарскі (Wolff J. Senatorowie... S. 78).

7. У 1460 г. разам з Марцінам Гаштаўтам і польскімі шляхціцамі ездзіў на перагаворы з чэхамі (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 144). У 1475 г. суправаджаў каралеўну Ядвігу да яе жаніха ў Баварыю (Długossii Joannis Historiae

Polonicae... T. 5. P. 634).

Пра яго рыцарскія чыны гл: Petrauskas R. Knighthood in the Grand Duchy...

8. Верагодна, быў фундатарам касцёла ў Валожыне (Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 66).

1. Манівід Ян Янавіч

1а. Joannes filius domini Monywyd.

2. Герб — Ляліва.

3. Упершыню згадваецца ў тэстаменце бацькі 1458 г. (Semkowicz W. Przywileje Witołda dla Moniwida... S. 261—262). Потым з'яўляецца толькі ў фундацыйным дакуменце 1460 г. Вайдылы з Ушакова, зяця Андрэя Саковіча (KDKW. S. 260). Верагодна, неўзабаве памёр.

4. Бацька — Ян Манівідавіч.

1. Манівід Міхаіл

1а. Michael alias Moniwid, Manewyd.

2. Герб — Паўказа.

3. Упершыню згадваецца ў Мельнскай дамове 1422 г. як староста горадзенскі (LUB. Bd. 5. S. 889), апошні раз — у 1433 г.

4. Паходжанне не высветлена. Не належаў да роду Альберта Манівіда.

6. 1422—1433 гг. — староста горадзенскі.

7. Увесну 1433 г. арганізаваў некалькі паходаў на землі Ордэна (GStA PK, OBA 6587 і 6601).

1. Манцігайла

1а. Montigal, Montigaylo.

2. Пытанне з яго гербам не вырашана. У 1433 г. выкарыстоўваў пячатку з гербам Сякера, а ў 1434 г. — зусім іншы знак (AU. S. 91, 101).

3. Упершыню згадваецца ў Віленскай дамове 1401 г. (AU. S. 38). Потым з'яўляецца толькі ў 1433 г. у Троцкай дамове з Польшчай 1433 г. (Тамсама. S. 94).

4. У сярэдзіне XV ст. Манцігайла Урдавіч (*Монътикгаил Урдович*) атрымаў людзей у Кернаве (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 68). Калі гэта тая ж асоба, мы маем імя бацькі Манцігайлы. Пра нашчадкаў нічога не вядома.

5. Вотчынныя землі, верагодна, меў у кернаўскавількамірскім краі.

6. 1433—1434 гг. — староста вількамірскі.

7. Па ўсёй верагоднасці, менавіта яго (*Montegal*) у 1441 г. Казімір даслаў на перагаворы з узбунтаванымі жамойтамі (Rowell S. C. Rusena karas Žemaičiuose... P. 9, 18).

1. Манцігайла Жукевіч

1а. Mondigal, Монътикгаил.

2. На прывешанай да Горадзенскай дамовы (1434 г.) пячатцы — знак негарадзельскага паходжання (AU. S. 101).

3. Упершыню згадваецца ў дамове 1434 г. (Тамсама. S. 105).

4. На пячатцы пазначана імя бацькі — Жукевіч (*Жюкевич*).

5. 1434 г. — староста страўніцкі [літ. *Strėvininkai*]. Страўніцкім ён называецца ў наданнях гаспадара сярэдзіны XV ст. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 32, 33, 51).

1. Манцігерд (Монгірд)

1а. Montigerd, Mantedirg, Muntigirde, Монтигирд.

2. Меў дагарадзельскі герб (Semkowicz W. Braterstwo... S. 411).

3. Датаванае 1385 г. паведамленне *Вегеберыхтаў* згадвае *Mantegirdendorff* (SRP. Bd. 2. S. 699). У 1410 г. быў ужо нябожчыкам, бо ў дакуменце Вітаўта як сведка выступаў *Olechno filius olim Montigerdi* (Vitoldiana... S. 30).

4. Імёны бацькі і жонкі невядомыя. Сыны — Ян (Ганус), Алехна і Пётр.

5. Вёска Манцігерда знаходзілася ў Салечніцкай зямлі. Лакалізаваны побач *Iwanendorff*, магчыма, быў вёскай яго сына Яна Манцігердавіча (SRP. Bd. 2. S. 699).

6. 1396 г. — намеснік полацкі.

8. Згадваецца ў памянной кнізе брацтва кракаўскага касцёла Марыі (Mitkowski J. Księga zmarłych... S. 85).

1. Манцігердавіч Алехна

1а. Olechno filius Montigerdi.

2. —

3. Упершыню згадваецца ў дакуменце Вітаўта 1408 г. (Vitoldiana... S. 151), апошні раз — у 1410 г.

4. Бацька — Манцігерд.

6. 1410 г. — падчашы пры двары гаспадара (Vitoldiana... S. 30).

1. Манцігердавіч Пётр

1а. Petrus Montigerdowicz, Petrassius Montigirdowicz, Petrus Mongyrdowicz, Petrasch Montigirth, Пётр / Петраш Монтикгирдович.

2. У Гародлі атрымаў герб Вадвіч.

3. Упершыню згадваецца ў 1413 г. у Гародлі (AU. S. 53—54). Памёр у 1459 г.

4. Бацька — Манцігерд. Імя і паходжанне першай жонкі не высветлены, другой была дачка князя Фёдара Карыбутавіча Ганна (Semkowicz W. Łosk i wygaśnięcie Kaributowiczów...). Сын — Ян (ад першага шлюбу).

5. Вотчынныя землі знаходзіліся ў ваколіцах Салечнікаў і Ашмянаў. Маці другой жонкі, княгіня Анастасія Карыбутава, падарыла яму Лоск (Ашмянскі павет) і абавязала яго апекавацца дзвюма іншымі яе дачкамі (Тамсама). У 1434 г. Жыгімонт Кейстутавіч надаў яму двор Іўе (Ашмянскі павет), аднак гэты факт мог быць пацверджаннем вотчыннага ўладання (AGAD, dok. perg., № 7297). Менавіта з Іўя выводзілі сябе яго нашчадкі.

6. У часы Вітаўта (каля 1424—1426 гг.) — староста падольскі. 1422/23 г. — маршалак дворны. 1430—1432 і 1445—1456 гг. — староста наваградскі. 1434—1459 гг. — маршалак земскі. 1435 г. — староста капыльскі. 1459 г. — намеснік полацкі.

7. У 1430 г. ездзіў да палякаў у справе каранацыі Вітаўта (CEXV. T. 2. S. 243—244). У 1431 г. як пасол Свідрыгайлы быў у татараў

(Тамсама. S. 256). Напачатку 1432 г. быў у складзе літоўскай дэлегацыі, што вяла перагаворы з палякамі (GStA PK, OF 14. S. 691—692). У 1432 г. па даручэнні Свідрыгайлы яшчэ раз ездзіў у Польшчу (Тамсама. S. 693). У часы Казіміра вядома два яго пасольствы: 1444 г. — у Ордэн (GStA PK. OF 15. S. 441—446) і 1448 г. — у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 45).

Адзін з найбольш уплывовых прадстаўнікоў знаці часоў Вітаўта, Свідрыгайлы, Жыгімонта Кейстутавіча і Казіміра. Удзельнічаў у перавароце супраць Свідрыгайлы. Камандваў войскам Жыгімонта (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 121).

1. Манцігердавіч Ян (Ганус)

1а. Hannus Montigerdi.

2. —

3. Згадваецца толькі ў дамове з Польшчай 1401 г. (AU. S. 38).

4. Бацька — Манцігерд. Браты — Алехна і Пётр.

1. [Манцігердавіч] Ян Пятровіч

2. Герб — Вадвіч.

3. Звесткі пра яго жыццё адсутнічаюць. Магчыма, памёр маладым.

4. Бацька — Пётр Манцігердавіч. Сын — Пётр.

1. [Манцігердавіч] Пётр Янавіч

1а. Petrus Janowicz, Петр Янович.

2. Герб — Вадвіч.

3. Упершыню згадваецца ў 1476 г. Памёр пасля 1497 г.

4. Бацька — Ян Пятровіч [Манцігердавіч]. Быў жанаты двойчы: першай жонкай была дачка Яна Вяжэвіча Ганна (дзеці нарадзіліся з гэтага шлюбу), другой — дачка князя Аляксандра Юр'евіча Гальшанскага Ганна. Сын — Ян. Дачка (імя невядома) выйшла замуж за Станіслава Пятровіча Кішку (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 88—89).

5. Асноўным вотчынным уладаннем было Іўе (Ашмянскі павет). Напрыклад, *de Iwie* (KDKW. S. 379).

6. 1476—1482 гг. — староста браслаўскі. 1480—1482 гг. — маршалак гаспадарскі. 1486—1489 гг. — староста луцкі. 1487—1489 гг. — маршалак Валынскай зямлі. 1490—1497 гг. — ваявода троцкі. 1491—1497 гг. — маршалак земскі. Літоўская традыцыя XVI ст. называе яго гетманам Літвы, які перад сваёй смерцю рэкамендаваў вялікаму князю Аляксандру на гэту пасаду князя Канстанціна Астрожскага (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 152). Верагодна, адначасова з'яўляўся камандуючым войскам ВКЛ.

8. 30.05.1482 г. яго жонка Ганна даціравала капліцу Св. Тройцы ў Віленскай кафедры (KDKW. S. 379—380). 12.05.1499 сын Ян, выконваючы апошнюю волю бацькі, надаў некалькі маёнткаў касцёлу ў Іўі (Тамсама. С. 539—542).

1. Манцірым

1а. Montrim.

2. Герб — Сякера.

3. Выступае як сведка ў Чартарыйскай (1431 г.) і Горадзенскай (1434 г.) дамовах (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135; AU. S. 104—105).

4. Паходжанне не высветлена. Гербавая роднасць з Бутрымамі і Монтаўтамі. Пра іх роднасць сведчыць таксама блізкасць уладанняў: Маркаў непадалёк ад Салечнікаў і Жырмунаў. Сын — Багдан, які ў 1440/47 г. быў старостам ваўкавыскім[41].

5. Вотчына, хутчэй за ўсё, знаходзілася ў Маркаве.

6. 1434 г. — староста маркаўскі.

1. Мікіта

1а. Mikitha.

3. Упершыню згадваецца ў 1407 г.

4. Пра паходжанне і роднасныя сувязі нічога невядома.

6. 1407 г. — староста бельскі. 1416 г. — староста дарагічынскі (Szybkowski S. Rec.... S. 158).

[41] Манцірым з сынам Багданам выступаюць як сведкі ў наданні Юрыя і Станіслава Радзівілавічаў віленскім францішканцам 01.08.1439 г. Дакумент быў напісаны ў Салечніках (KDKW. S. 172).

7. У 1414 г. разам з Янам Бутрымам трапіў у ордэнскі палон (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 173—174).

1. Мінігайла Міхаіл

1а. Michael alias Minigail(o), Minigal, Myngal, Mynnegal, Mynnegeil, Mynegayl.

2. У Гародлі атрымаў герб Равіч. Да гэтага меў іншы герб (CEV. S. 56).

3. Упершыню згадваецца ў 1387 г. у прывілеі Ягайлы Віленскай кафедры (KDKW. S. 6). Памёр пасля 1413 г.

4. Імя бацькі — Гедзігоўд. Брат — Сурвіла (выступаў як сведка ў Віленскай дамове 1401 г. — AU. S. 37). Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

5. У дакументах тытулаваўся *de Dewenyszki* (Vitoldiana... S. 31) (Дзявенішкі непадалёк ад Ашмянаў). Акрамя гэтага маёнтка меў уладанні ў Салечніцкім краі, дзе крыжацкія шпіёны лакалізавалі дзве вёскі Мінігайлы (SRP. Bd. 2. S. 699—700).

6. 1387—1399 гг. — староста ашмянскі. 1393 г. — староста віленскі. 1413 г. — каштэлян віленскі.

7. Прадстаўнік знаці з атачэння Ягайлы, які захаваў свой уплыў у эпоху Вітаўта (гл.: Petrauskas R. Giminaičiai ir pavaldiniai... P. 109—111).

1. Мінігайла Якуб

1а. Jacobus Mynigel, Myngayl.

2. У Гародлі атрымаў герб Сыракомля.

3. Магчыма, ідэнтычны з жамойцкім баярынам Мігайлам (*Migail, Migal*), што ў 1406—1408 гг. згадваецца ў ордэнскіх крыніцах (CEV. S. 129, 159—160 (памылкова прачытана *Nigail*). Параўн. арыг.: GStA PK, OBA 1213; Das Marienburger Tresslerbuch... S. 421).

4. Брат — Пётр Візбар, сын — Кестаўт, які ў 1415 г. атрымаў ад Вітаўта людзей у Калтынянах (Vitoldiana... S. 85).

5. На працэсе 1413 г. з Нямецкім ордэнам сярод жамойцкіх бараў выступае, верагодна, яго брат *Petrus dictus Vissabor de Scoconawow* (Lites ac res gestae... T. 2. P. 147). У 1446 г. Візбар

атрымаў землі і людзей у Расейнах і Калтынянах (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 39, 49, 50).

6. 1412 г. — староста вяленскі (разам з Альбертам Карэйвам).

1. Мінімонт Ян

1а. Johannes Minimunth, Mynimund, Ян Кловзкгаилович, Ян Кловъсикаило.

2. У Гародлі атрымаў герб Окша.

3. У 1413 г. разам з бацькам выступаў як сведка на працэсе супраць Нямецкага ордэна (*Iohannes dictus Minimunth* — Lites ac res gestae... T. 2. P. 147).

4. Бацька — Клаўсігайла (гл. пра яго)[42]. Сын — Кібарт.

5. Вотчынныя землі — у Расейнах. У 1440/50 г. атрымаў ва ўладанне Расейны (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 20). У Гародлі названы як *Sessnykowicz*, таму можна дапусціць, што валодаў таксама Сесікамі [літ. *Siesikai*] (AU. S. 54).

1. Мінімонтавіч Кібарт

1а. Киборт Минимонтович.

2. Герб — Окша.

4. Бацька — Ян Мінімонт. Сын — Міхаіл.

5. Вотчынныя землі — у Расейнах. Меў таксама вотчынныя землі ў Кернаве і Крожах (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 67—68). Атрымаў ад гаспадара людзей у Эйшышках (Тамсама. P. 47) і Радуні (AGAD, dok. perg., № 7419).

6. Верагодна, яго можна ідэнтыфікаваць з расейнскім цівуном 1470/71 г. Кібартам (MAB RS. F 256—3526, l. 40)[43].

1. Монтаўт Аляксандр

1а. Allexander alias Muntholt, Alexander Monthowd, Montolth, Mantaw, Монътовт.

---

[42] Каля сярэдзіны XVст. староста жамойцкі Ян Кезгайлавіч пацвердзіў Мінімонту людзей, што былі нададзены Вітаўтам яго бацьку Клаўсігайлу (Описание документов и бумаг... Кн. 21. С. 537).

[43] Ліст старосты жамойцкага Яна Кезгайлавіча, датаваны 4 індыктам (падыходзіць таксама 1455/56 г.).

2. Герб — Сякера.

3. Упершыню згадваецца ў Мельнскай дамове 1422 г. (LUB. Bd. 5. S. 888—889). Памёр пасля 1440 г.

4. Звесткі пра бацьку адсутнічаюць. Брат (верагодна) — Конрад Кучук. Жонка — Алена (паходжанне не высветлена). Сыны — Міхаіл, Таўцівіл (Ян), Барташ, Конрад.

Роднасць з Бутрымамі (той жа герб, геаграфічная блізкасць уладанняў), а таксама, магчыма, з Чупурнам і Гінтаўтам.

5. Вотчынныя ўладанні знаходзіліся ў ваколіцах Салечнікаў. Таксама меў па меншай меры адну вёску ў Ашмянскім павеце (KDKW. S. 190).

6. 1422/23—1435 гг. — староста салечніцкі. 1440 г. — староста эйшышкскі.

8. 21.10.1440 г. Аляксандр Монтаўт з жонкай з сынамі ажыццявіў наданне віленскім францішканцам. Францішканцы павінны былі ўпісаць іх у свае памянныя кнігі (KDKW. S. 190).

11.07.1439 г. прасіў папу дазволіць абраць сабе духоўніка (Bullarium Poloniae... 5. S. 286).

1. Монтаўтавіч Барташ (Баўтрамей)

1а. Bartosch Mantholtowicz, Bartholomeus, Bartusch, Бартош Монътовтович.

2. Герб — Сякера.

3. Упершыню згадваецца ў 1440 г. у наданні яго бацькі віленскім францішканцам. Памёр пасля 1486 г.

4. Бацька — Аляксандр Монтаўт. Быў двойчы жанаты: імя і паходжанне першай жонкі невядомыя, другой была сястра Багдана Храбтовіча Юлляна Духна[44]. Сын — Станіслаў[45] (ажаніўся з дачкой Алехны Судзімонтавіча Ядвігай). Дачка — Барбара, жонка Станіслава Доўкшы (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 5... P. 265).

[44] 13.08.1499 г. Юлляна Духна ў сваім тэстаменце згадвае брата Багдана (несумненна, Храбтовіча). Вышэй згадваецца староста ўладзімірскі Васіль [Храбтовіч] (KDKW. S. 545—547). Сына Багдана, Яна Літавора Храбтовіча, яна ў тым жа годзе назначыла апекуном сваіх зямель (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 8... P. 371—372). Яна не была першай жонкай Барташа, бо называе Станіслава Барташэвіча пасынкам (Тамсама).

[45] 24.04.1492 г. — староста майшагольскі (AGAD, dok. perg., № 7386).

З другой жонкай Юлляна удачарыў дачку яе брата Алену (KDKW. S. 546—547).

5. Вотчынныя ўладанні — у Салечніках (*Bartesch von der Solcze* — GStA PK, OBA 12336).

6. 1469 г. — староста пуньскі [літ. *Punia*]. 1477 г. — староста дубініцкі [літ. *Dubingiai*] і майшагольскі. 1482—1486 гг. — староста бельскі.

7. У 1453 г., падчас канфлікту з палякамі, літоўскія паны даслалі яго да магістра Ордэна (GStA PK. OBA 12336).

8. 13.08.1499 г. яго жонка Юлляна ў сваім тэстаменце запісала асноўную частку маёмасці сваёй прыёмнай дачцэ Алене, якая, акрамя іншага, павінна была захоўваць памяць яе і яе блізкіх. Хацела, каб яе пахавалі ў віленскім францішканскім касцёле (KDKW. S. 546—547).

Барташ Монтаўтавіч мог быць адным з фундатараў касцёла Св. Баўтрамея ў Малых Салечніках, які згадваецца ў дакуменце 1542 г. (Lietuvos Metrika. 11-oji Teismų bylų knyga... P. 15).

1. Монтаўтавіч Конрад

1а. Cunrad, Кондрат Монътовтович.

2. Герб — Сякера.

3. Згадваецца ў 1440 г. у наданні яго бацькі віленскім францішканцам.

4. Бацька — Аляксандр Монтаўт.

5. У 1445/46 г. атрымаў ад гаспадара ўладанне ў Рудамінскай воласці (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 20).

1. Монтаўтавіч Міхаіл

1а. Michael Muntholtowicz, Михаил(о) Монътовтович.

2. Герб — Сякера.

3. Упершыню згадваецца ў 1440 г. у наданні яго бацькі віленскім францішканцам. Памёр пасля 1484 г.

4. Бацька — Аляксандр Монтаўт. Імя і паходжанне жонкі не высветлены. Сыны — Юрый (ажаніўся з дачкой Яна Кезгайлавіча Аленай), Якуб (жонка — Маргарыта), Мацей (згадваецца адзін

раз у 1488 г.: РИБ. Т. 27. С. 250—251) і Станіслаў, які ў 1499 г. ужо быў нябожчыкам (KDKW. S. 546—547).

5. Вотчынныя землі — у Салечніках. Меў уладанні ў Жырмунах.

6. 1463—1477 гг. — староста луцкі. 1482 г. — маршалак гаспадарскі. 1482—1484 гг. — староста наваградскі. 1483—1484 гг. — кашталян троцкі.

7. У 1446 г. у складзе літоўскай дэлегацыі ездзіў на агульны з палякамі сойм у Пётркаў (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 12). Таксама ездзіў у Польшчу ў 1452 г. (Там-сама. P. 114).

1. Монтаўтавіч Таўцівіл (Ян)

1а. Johannes alias Thautwil, Thotwil, Товтвил Моңътовтович.

2. Герб — Сякера.

3. Упершыню згадваецца ў 1440 г. у наданні яго бацькі віленскім францішканцам. Памёр пасля 1481 г.

4. Бацька — Аляксандр Монтаўт. Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

6. 1481 г. — хлебарэз пры двары гаспадара (Urzędnicy centralni... S. 57).

7. У 1456 і 1463 г. ездзіў з пасольствамі ў Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 227, 366).

1. Мордас Станіслаў (Станька)

1а. Stanko Mordasch, Станько Мордас.

2. ?[46]

3. Упершыню згадваецца ў 1440/43 г. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 20). Памёр пасля 1467 г.

4. Звесткі пра паходжанне адсутнічаюць. Брат — Андрэй (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 27). Сын — Ян[47] (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1... P. 82). Магчымая адсылка да яго

[46] Пячатка, прыкладзеная да яго ліста ад 05.03.1466 г. да лабяўскага (*Labiau*) комтура, пакрашылася.

[47] У дакуменце Аляксандра 1502 г. адзначана, што пан Мордас меў сына Станіслава (АЛМ. Т. 1. Вып. 2. С. 108). Гэта або згадка пра другога яго сына, або памылка пісара.

роднасных сувязяў — гэта тое, што ў 1498 г. з-за яго маёнтка ў Гегужыне [літ. *Gegužinė*] судзіліся Рыгор Станіслававіч Осцікавіч і Станіслаў Касцевіч (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. № 382).

6. 1444—1453 гг. — староста вяленскі. 1463—1467 гг. — староста ковенскі.

7. У 1444 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна (LUB. Bd. 10. S. 16—17); у 1446 г. знаходзіўся ў складзе літоўскай дэлегацыі, што вяла перагаворы з прадстаўнікамі Ордэна (GStA PK. OF 15. S. 447—448).

8. Станіслаў Мордас быў фундатарам алтара ў ковенскім касцёле Св. Пятра, апеку над якім вялікі князь Аляксандр перадаў Рыгору Станіслававічу Осцікавічу (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 25... P. 170). Цяжка сказаць, было гэта наступствам роднасных сувязяў ці перадачы ўладання ў Гегужыне.

1. Нарбут

1а. Нарибут.

2. ?

3. Упершыню згадваецца ў 1440 г.

4. Звесткі пра паходжанне адсутнічаюць[48]. Сыны — Дабрагост, Ян, Станіслаў, Мікалай, Юрый, Альберт.

5. Вотчынныя землі, па ўсёй верагоднасці, знаходзіліся ў ваколіцах Няменчына [літ. *Nemenčinė*] і Лынкменаў [літ. *Linkmenys*], дзе ў 1440/43 г. яму былі нададзены людзі (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 27, 68).

7. У Хроніцы Быхаўца напісана, што ў 1440 г., пасля забойства Жыгімонта Кейстутавіча, Нарбут заняў для Міхаіла Жыгімонтавіча віленскі Верхні замак (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 126). Потым, верагодна, перайшоў на бок Казіміра, бо праз некалькі гадоў атрымаў наданні ад гаспадара.

Яго сын ці сыны не нашмат перажылі бацьку і памерлі, не пакінуўшы нашчадкаў, бо яго маёнткамі пазней распараджаліся іншыя асобы.

[48] У наданні Аляксандра Монтаўта віленскім францішканцам ад 21.10.1440 г. згадваецца Нарбут Ятаўтавіч (*Iatoltowicz*) (KDKW. S. 190). Ён таксама выступае як сведка ў дакументе Багдана Андрэевіча Саковіча ад 24.06.1486 г. (AGAD, dok. perg., № 8403). У фундацыйным дакументе Андрэя Даўгердавіча ад 14.01.1459 г. выступае Нарбут *Calatowicz* (KDKW. S. 255). Цяжка сказаць, ці быў хтосьці з іх бацькам пазнейшых Нарбутавічаў.

Яго сыны часта ездзілі на перагаворы з ураднікамі Ордэна.

1. Нарбутавіч Альберт

1a. Albrecht Narbutowitz/Narbotowitz, Воитех Нарбутович.

3. Упершыню згадваецца[49] ў тым жа данацыйным дакуменце 1488 г. (РИБ. Т. 27. С. 250).

4. Бацька — Нарбут. Жонка — Ганна, дачка нейкага слонімскага баярына (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 61, 112). Сыны — Альберт, Мікалай, Ян, Багдан (Boniecki A. Poczet rodów... S. 196).

6. 1498—1509 гг. — староста ясвойнаўскі [літ. *Josvainiai*]. 1501—1505 гг. — харужы гаспадарскага двара. 1505—1509 гг. — маршалак гаспадарскі.

7. У 1509 г. ездзіў на перагаворы з магістрам Ордэна (LUB. Abt. 2. Bd. 3. S. 384, 402—403).

8. 21/25.07.1505 г. са сваёй жонкай Ганнай фундаваў касцёл у Луконіцы (Слонімскі павет) (KDKW. S. 701).

1. Нарбутавіч Дабрагост Пётр

1a. Petrus alias Dobrogost Narbutowicz, Dobergast Narbutowicz, Доброгост Нарбутович.

3. Упершыню згадваецца ў 1471 г. (KDKW. S. 320).

4. Бацька — Нарбут. Жонка — дачка Яна Іллініча Барбара (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 122—123; Błaszczyk G. Regesty... № 29). Сыны — Мацей і Крыштап (Boniecki A. Poczet rodów... S. 196).

5. Разам з братамі атрымаў у спадчыну маёнткі бацькі ў Арнянах [літ. *Arnionys*], Калтынянах, Лынгмянах (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 163—164).

6. 1501 г. — староста дарсунішкскі.

7. У 1493 г. вялікі князь Аляксандр даслаў яго на перагаворы з магістрам Лівоніі. Ён названы дваранінам вялікага князя і ваенным камандуючым (*hoffsdyner und felthouptmann*) (GStA PK. OF 18b. S. 147). У тым жа годзе ездзіў і да вялікага магістра (Тамсама. S. 160—160v).

[49] Ян Длугаш сцвярджае, што Альберт Нарбутавіч (з роду герба Сякера) у 1473 г. стаў кіеўскім біскупам (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 583). Гэта, несумненна, іншая асоба.

8. 03.06.1511 г. яго (ён названы Баніфацыем Нарбутавічам) удава Барбара разам з сынамі Мацеем і Крыштапам фундавала касцёл у Сенішках (Błaszczyk G. Regesty... № 29).

1. Нарбутавіч Мікалай

1а. Nicolaus Narbutowicz, Миколаи Нарбутович.

3. Упершыню згадваецца ў 1488 г. (РИБ. Т. 27. С. 250).

4. Бацька — Нарбут. Сын — Пётр (Boniecki A. Poczet rodów... S. 196).

6. У апошнія гады панавання Казіміра быў цівуном віленскім (АЛМ. Т. 1. Вып. 2. С. 90); 1503—1504 гг. — староста сямелішскі [літ. *Semeliškės*] (GStA PK, OBA 18880).

7. У 1501 г. ездзіў з пасольствам у Лівонію (Lietuvos didžiojo kunigaikščio Aleksandro Jogailaičio dvaro sąskaitų knygos... P. 277). У 1504 г. ездзіў да магістра Ордэна (GStA PK, OBA 18880).

1. Нарбутавіч Станіслаў

1а. Stanislaus Narbuth, Станислав Нарбутович.

3. Упершыню згадваецца ў 1482 г. (РИБ. Т. 27. С. 186).

4. Бацька — Нарбут. Сын — Станіслаў (Boniecki A. Poczet rodów... S. 196).

6. 1494—1501 гг. — староста крэўскі.

7. У 1491 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна (GStA PK, OBA 17645).

1. Нарбутавіч Юрый

1а. Юри Нарбутович.

3. Разам з братамі згадваецца ў 1488 г. (РИБ. Т. 27. С. 250). У наданні вялікага князя Аляксандра Нарбутавічам 1498 г. Юрый ужо не згадваецца (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 163).

4. Бацька — Нарбут. Звесткі пра нашчадкаў адсутнічаюць.

1. Нарбутавіч Ян

1а. Jan Narbotowicz/Narbuth.

3. Адзінкавая згадка ў крыніцах пад 1475 г.[50].

7. У 1475 г. Ян Нарбутавіч ездзіў з пасольствам да лівонскага магістра і рыжскага арцыбіскупа (GStA PK, OBA 16569). Магістр Лівоніі ў сваім лісце да вялікага магістра сцвярджае, што Ян Нарбутавіч па дарозе ад яго да арцыбіскупа быў забіты слугамі апошняга (Тамсама).

1. Наруш

1а. Narusch, Нарушис.

2. Герб — Агоньчык.

3. Упершыню згадваецца ў дамове 1434 г. з Польшчай як староста медніцкі (AU. S. 105).

4. На прыкладзенай да дамовы 1434 г. пячатцы ёсць імя бацькі — Гінтаўтавіч (Тамсама. S. 101) (няма падстаў звязваць яго са стрыечным братам Чупурны Гінтаўтам). Жонкай, магчыма, была Кацярына. Цяжка сказаць, ці быў Альберт Нарушавіч, які ў 1482 г. атрымаў прыбыткі з медніцкіх корчмаў (РИБ. Т. 27. С. 186), сынам гэтага Наруша (гл. таксама пра Даўтерда).

6. 1434 г. — староста медніцкі.

8. У 1445 г. Мацей Наруш з ініцыятывы жонкі Кацярыны быў упісаны ў каляндар віленскіх францішканцаў (Dunin-Kozicki Z. Szczątek kalendarza... S. 10). Незразумела, ці ідэнтычны гэты Наруш старосту медніцкаму 1434 г.

1. Насута Мікалай

1а. Nassutha, Nassotthe, Насута.

2. ?

3. Упершыню згадваецца ў дакуменце Вітаўта 1430 г. як староста дарагічынскі (Vitoldiana... S. 158).

4. Бацька — Насута (CEV. S. 1). Сын — Ян.

[50] У 1461 г. у спісы Кракаўскага ўніверсітэта быў уключаны «Johannes Johannis Naributh de Nyemenczyn» (Index studenów Uniwersytetu krakowskiego... S. 132). Калі гэта той жа Ян Нарбут, мы маем хрысціянскае імя яго бацькі і інфармацыю пра вотчыну.

5. Род паходзіў з Мазовіі і меў вялікія ўладанні на Падляшшы.

6. 1430 г. — староста дарагічынскі.

7. У 1440 г., пасля забойства Жыгімонта Кейстутавіча, Насута з Дарагічынам здаўся мазавецкаму князю Баляславу.

1. Насутавіч Ян

1а. Johannes Nasuthowicz, Ян Насутович, Ян Носутич, Носута.

2. ?

3. Упершыню згадваецца ў 1438 г. Памёр у 1484 г., і вядома, што гэта здарылася ў Горадні (Acta capitulorum... Vol. 3. P. 141—142).

4. Бацька — Мікалай Насута. Жонка (імя невядомае) — дачка Судзімонта (Tęgowski J. Ślub tajemny... S. 249—253). Адзіная дачка — Ганна, якая выйшла замуж за Яна Юр'евіча Забярэзінскага (Тамсама).

5. Вотчынныя ўладанні — на Падляшшы (Wysłouch S. Dobra Szereszewskie... S. 57—59).

6. 1440—1458 гг. — староста дарагічынскі. 1444 г. — староста камянецкі. 1475 г. — староста берасцейскі. 1482—1484 гг. — староста горадзенскі. 1482—1484 гг. — маршалак гаспадарскі (Szybkowski S. Rec.... S. 158).

8. У 1477 г. фундаваў касцёл у Міжрэччы (Дарагічынская зямля) (Wawrzyńczyk A. Rozwój wielkiej własności... S. 40). Таксама фундаваў касцёл у Нямойках на Падляшшы (Jaszczołt T. Fundacje kościelne... S. 31).

1. Некраш (Міхаіл) Буцівідавіч

1а. Nekrasch Butwidowicz, Nekrassius, Nebrasius, Некраш.

2. Герб — Ляліва (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 6. S. 87).

3. Упершыню згадваецца ў Чартарыйскай дамове 1431 г. (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135).

4. Бацька — Буцівід Рэкуцевіч, які ў канцы XIV ст. удзельнічаў у паручыцельстве за Братошу (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 6. S. 87). Брат — Ян, які ў сярэдзіне XV ст. атрымаў людзей у Вяленскай воласці (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga

3... P. 27)[51]. Роднасныя сувязі лучаць яго з Манівідамі: той жа герб; блізкасць уладанняў (Жупраны).

5. Месцам свайго паходжання лічыў Жупраны (KDKW. S. 199, 201).

6. 1434 г. — староста васілішкскі. 1437 г. — маршалак гаспадарскі.

8. У 1447 г. Міхаіл Некраш быў упісаны ў каляндар віленскіх францішканцаў (Dunin-Kozicki Z. Szczątek kalendarza... S. 10). І ў гэтым выпадку няма ўпэўненасці, што гэта асоба ідэнтычна старосту васілішкскаму і маршалку гаспадарскаму.

1. Няміра Ян

1а. Johannes alias Niemir, Nemer, Nemyr, Namir, Nammir, Nemerza, Немира.

2. У Гародлі атрымаў герб Ястрабец. Аднак меў таксама дагарадзельскі герб (CEV. S. 231).

3. Упершыню згадваецца ў Салінскай дамове 1398 г. як канюшы дворны (Die Staatsverträge des Deutschen Ordens in Preußen im 15. Jahrhundert. T. 1. S. 12). Апошні раз сустракаецца ў Мельнскай мірнай дамове 1422 г. (LUB. Bd. 5. S. 888—889).

4. Імя і паходжанне бацькі невядомыя. Цяжка сказаць, ці быў братам гэтага Няміры Чыж, які выступае як сведка ў Троцкай дамове 1433 г. (AU. S. 94). Некалькі неназваных братоў Яна Няміры згадваюцца ў Віленскай дамове 1401 г. (Тамсама. S. 37—38). Жонка — Ганна (паходжанне не высветлена) яшчэ жыла ў 1439 г. (Bullarium Poloniae... 5. S. 286). Сыны — Андрэй, Мікалай, Ян, Фёдар (Федзька), Якуб.

5. На яго пячатцы, прывешанай да Мельнскай дамовы 1422 г., адзначаны *Johannis de Wselub* (Dokumenty strony polsko-litewskiej pokoju melneńskiego...). Яго сыны таксама выводзілі сябе з Уселюба, што ў Наваградскім павеце[52].

---

[51] Тое, што ў XV ст. жыло некалькі Некрашаў (напрыклад, у 1440/43 г. староста ваўкавыскі Некраш Валовіч), не дазваляе звязваць усіх Некрашавічаў сярэдзіны XV ст. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 24, 48) з Некрашам Буцівідавічам.

[52] Даследаванне ранняй гісторыі роду Няміраў ускладняе тое, што ў той час вядома па меншай меры некалькі Няміраў, з якіх самай заўважнай фігурай быў пакаёвы («cubicularius») Свідрыгайлы Няміра, які ў 1432 г. быў дасланы гэтым вялікім князем да Ягайлы (GStA PK, OBA 5934), а ў 1434 г. як маршалак і староста бранскі – да татарскага хана (GStA PK, OBA 6799).

6. 1398 г. — канюшы дворны. 1412—1413 гг. — намеснік полацкі.

7. У 1401 і 1404 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна (CEV. S. 78, 967); у 1411 г. — у Ноўгарад (ПСРЛ. Т. 25. С. 241).

8. Вядома пра яго пілігрымку ў Вілснак, што ў Брандэнбургу (Starnawska M. Die Beziehungen... S. 85—86).

1. Немірович Андрэй

1а. Andrusko Nyemirovicz, Andruschko Nyemirowitcz, Andreas Nemiri, Андреи Немирович.

2. Герб — Ястрабец.

3. Упершыню згадваецца[53] ў 1431 г. у Чартарыйскай дамове як пасол Свідрыгайлы да Ягайлы (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135). Памёр пасля 1452 г. (KDKW. S. 236).

4. Бацька — Ян Няміра. Імя і паходжанне жонкі не высветлены[54]. Сын — Юрый (1479—1480 гг. — староста дарагічынскі).

5. На прывешанай да Горадзенскай дамовы 1434 г. пячатцы адзначана, што ён паходзіў з Уселюба (Наваградскі павет) (AU. S. 101).

7. У 1431 г. ездзіў з пасольствам да Ягайлы (GStA PK. OF 14. S. 627—629). У 1431 г. разам з іншымі літоўскімі князямі і баярамі паручыўся перад каралём Польшчы за літоўскіх палонных (CEXV. T. 1. S. 70).

Л. Корчак лічыць, што Андрэй Немірович займаў нейкую пасаду (Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 93), але для тлумачэння яго ўплыву рабіць такое дапушчэнне неабавязкова.

1. Немірович Мікалай

1а. Nicolaus Nyemyrowicz, Миколаи Немирович.

2. Герб — Ястрабец.

---

[53] Анекдатычны аповед Хронікі Быхаўца пра ўдзельніка вайны з Масквой часоў Вітаўта Андрэя Няміру (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 106—107) мог быць рэмінісцэнцыяй падзей, звязаных толькі з Янам Нямірам.

[54] У слуцкай памянной кнізе ў 1517 г. згадваецца жонка Андрэя Немировіча, што належала да нейкага княскага роду (верагодна, Гальшанскіх) (MAB RS. F 21—799, l. 12). Аднак гэта магла быць жонка Андрэя Якубавіча Нямірыч, які жыў у пачатку XVI ст.

3. У 1412 г. быў уключаны ў спіс студэнтаў Кракаўскага ўніверсітэта (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 98). У Літве першы раз згадваецца ў сувязі з падзеямі 1440 г. Памёр каля 1471 г.

4. Бацька — Ян Няміра. Жонка — Эльжбета (паходжанне не высветлена). Верагодна, не меў дзяцей, бо пасля смерці яго ўладанні адышлі да нашчадкаў Федзькі Неміровіча (РИБ. Т. 27. С. 440).

5. Сябе называў вотчыннікам Уселюба (KDKW. S. 222). Яму належаў таксама двор Ішкалдзь і інш. (Тамсама. S. 315). У 1445 г. атрымаў ад вялікага князя Казіміра Нясвіж (AGAD, Archiwum Radziwiłłów, spr. XV/1—1. S. 1).

6. 1463—1470 гг. — намеснік віцебскі. 1467 г. — намеснік смаленскі. 1467 г. — староста любуцкі і мцэнскі. 1471 г. — маршалак гаспадарскі.

7. У 1456 г. ездзіў з пасольствам у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 227); у 1471 г. — у Пскоў (ПСРЛ. Т. 8. С. 111).

У 1445 г. быў адным з камандуючых літоўскім войскам у вайне супраць Масквы (ПСРЛ. Т. 18. С. 192).

8. 16.11.1449 г. Мікалай Неміровіч фундаваў касцёл у Ішкалдзі (KDKW. S. 222—223). 10.06.1471 г. разам з жонкай зрабіў ахвяраванне на той жа касцёл (Тамсама. S. 312—313).

24.02.1492 г. у дакуменце Казіміра згадваецца, што Мікалай Неміровіч фундаваў таксама касцёл у Нясвіжы (KDKW. S. 439).

10.06.1471 г. запісаў частку ўладанняў жонцы Эльжбеце, з якіх яна павінна была клапаціцца пра яго памяць. Пасля яе смерці частку гэтых маёнткаў павінен быў атрымаць касцёл у Ішкалдзі, каб і далей захоўвалася памяць пра яго блізкіх (KDKW. S. 314—317).

Е. Ахманьскі прыпісвае яму фундацыю касцёла ва Уселюбе (Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 66). Верагодна, гэта была агульная фундацыя братоў.

1. Неміровіч Фёдар (Федзька)

1а. Федко Немирович.

2. Герб — Ястрабец.

3. У 1441 г. атрымаў людзей у Клецкай воласці (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 43).

4. Бацька — Ян Няміра. Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Сыны — Пётр і Андрэй. Яго дзеці сталі атрымальнікамі спадчыны Мікалая Неміровіча (РИБ. Т. 27. С. 440). Пётр Федзькавіч названы «братам» (г. зн. стрыечным) Якуба Янавіча Неміровіча (Тамсама. С. 248). Дачка — Ганна, жонка Барташа (магчыма, Табаравіча) (РИБ. Т. 20. С. 145).

1. Неміровіч Якуб

1a. Jacobus Nemiri.

2. Герб — Ястрабец.

3. У 1452 г. разам з братамі Андрэем і Янам выступае як сведка ў наданні Казіміра Віленскай кафедры (KDKW. S. 236).

4. Бацька — Ян Няміра.

7. Не выключана, што гэта яго (*nobilis* Якуб) у 1441 г. Казімір даслаў у ордэнскую дзяржаву (GStA PK, OBA 7911).

1. Неміровіч Ян

1a. Joannes Nemyrowicz, Joannes Nemiri, Ян Немирович.

2. Герб — Ястрабец.

3. Упершыню згадваецца ў 1432 г. Памёр пасля 1453 г.

4. Бацька — Ян Няміра. Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Сын — Якуб. Дачка — Кацярына, жонка Пятра Пашкевіча Струмілы (Jaszczołt T. Fundacje kościelne... S. 37).

6. 1444 г. — маршалак гаспадарскі. 1444 г. — староста клецкі.

7. Часта ўдзельнічаў у пасольствах: у 1432 г., пасля пераваротy Жыгімонта Кейстутавіча, быў яго паслом у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 480); у 1444 г. ездзіў у ордэнскую дзяржаву (LUB. Bd. 10. S. 16—17); у 1445 і 1446 г. як літоўскі прадстаўнік браў удзел у Пётркаўскім, а ў 1453 г. — у Парчэўскім сойме (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 6, 12, 136); у 1453 г. разам з Андрэем Саковічам і прадстаўнікамі Польшчы ўдзельнічаў у перагаворах пра шлюб Казіміра з дачкой імператара Альбрэхта II (Biblioteka XX. Czartoryskich w Krakowie. Teki Naruszewicza. Vol. 18. № 142).

1. Неміровіч Якуб Янавіч

1а. Jacobus Johannis Nyemyrowicz, Якуб Янович Немирович.

2. Герб — Ястрабец.

3. Упершыню згадваецца[55] ў наданні дзядзькі Мікалая Неміровіча касцёлу ў Ішкалдзі ад 10.06.1471 г. (KDKW. S. 317). 19.07.1494 г. згадваецца як нябожчык (РИБ. Т. 27. С. 557—558).

4. Бацька — Ян Неміровіч. Жонка — Свянтохна, першым мужам якой быў Андрэй Даўгердавіч, яшчэ жыла ў 1500 г. (РИБ. Т. 27. С. 820—821). Сыны — Вацлаў Няміра (РИБ. Т. 27. С. 197; MAB RS. F 1—31), Мікалай Бутрым (у 1507 г. згадваецца як уласнік Граўжышак — Błaszczyk G. Regesty... № 5, 89), Андрэй, Юрый. Дачка — Ядвіга.

6. 1482—1488 гг. — староста берасцейскі. 1483 г. — маршалак гаспадарскі. У першыя гады панавання Аляксандра быў старостам бранскім.

7. У 1472 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна (CEXV. T. 3. S. 172—173).

8. 27.11.1502 г. яго дачка Ядвіга пацвердзіла фундацыю свайго бацькі касцёлу ў Карказішках (Свянцянскі павет) (KDKW. S. 628—630), дзе пазней была пахавана (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 12... P. 591).

1. Нецевіч Алехна

1а. Олехно Нетевич.

2. ?

3. Згадваецца ў 1453—1489 гг.

4. Звесткі пра паходжанне бацькі не выяўлены. Брат — Ян (Івашка) (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 166). Сын — Багдан (РИБ. Т. 27. С. 209).

5. У 1453 г. атрымаў ад гаспадара людзей у Страўніцкай воласці (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 33).

[55] Я схільны адрозніваць двух Якубаў Неміровічаў: 1) форма тэстацыі дакумента Казіміра 1452 г. дазваляе меркаваць, што сведкі Неміровічы былі братамі; 2) сын Яна Неміровіча Якуб часцей за ўсё называецца Якубам Янавічам Неміровічам; 3) доўгі адрэзак часу, што адасабляе з'яўленне Якуба Неміровіча і Якуба Янавіча Неміровіча.

6. 1486—1489 гг. — староста аліцкі [літ. *Alytus*] і неманойцкі [літ. *Nemunaitis*]. У часы Казіміра быў таксама старостам пералайскім [літ. *Perloja*] (Lietuvos Metrika. 4-oji Teismų bylų knyga 4... P. 244).

1. Пац Доўкшавіч

1а. Patcz Dawtczowitcz, Pacz, Пац Довъкшевич.

2. Да Горадзенскай дамовы 1434 г. прыклаў пячатку са знакам негарадзельскага паходжання (AU. S. 101). Яго бацька Доўкша ў Гародлі атрымаў герб *Pirzchala*.

3. Упершыню згадваецца ў Горадзенскай дамове 1434 г. (AU. S. 104—105).

4. Бацька — Доўкша Кімантавіч. На пячатцы Паца 1434 г. было напісана імя дзеда — Кімантавіч. Доўкшавічам называецца ў некалькіх вялікакняскіх наданнях сярэдзіны XV ст. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 37, 64) і ў прысязе да Брэсцкага міру (1435 г.) у 1447 г. (GStA PK, OBA 9424). Вольф лічыць яго «пачынальнікам» роду Пацаў. Сын — Юрый.

5. Вотчынныя землі — у ваколіцах Горадні[56]. Ад вялікага князя атрымаў маёнткі ў Камянецкім павеце (Wysłouch S. Rozwój granic i terytorjum... S. 44).

6. 1434—1435 гг. — маршалак гаспадарскі. Пасля 1444 г. — староста камянецкі.

1. Пацэвіч Юрый

1а. Georgius Paczewicz, Georgius Paczowicz, Юри Пацевич.

2. Герб — Падвойная Лілея (Газдава).

3. Упершыню згадваецца ў 1480 г. Памёр у 1505/1506 г.

4. Бацька — Пац Доўкшавіч. Быў двойчы жанаты: з першай жонкай Анастасіяй (паходжанне не высветлена) меў сына Мікалая (ён ажаніўся з дачкой князя Аляксандра Юр'евіча Гальшанскага Аляксандрай); другая жонка — Федзька, дачка Яна Рагацінскага (яе першым мужам быў кобрынскі князь Іван Сямёнавіч, трэцім — Мікалай Радзівілавіч) (Wiśniewski J. Pac Jerzy... S. 704).

[56] 25.06.1511 г. Мікалай Юр'евіч Пацэвіч адзначае ўладанне ля Горадні, што належала яго продкам (РИБ. Т. 20. С. 753). Гл. таксама пра Кіманта.

6. 1480—1492 гг. — маршалак гаспадарскі. 1481 г. — староста ковенскі. 1486—1492 гг. — ваявода кіеўскі. 1492—1496 гг. — староста наваградскі. 1496—1500 гг. — намеснік полацкі. 1505 г. — староста мерацкі.

8. У 1495 г. разам з жонкай Анастасіяй, сынам, групай кіеўскіх святароў і баяраў упісаўся ў брацтва Св. Духа ў Рыме (Schäfer K. H. Die deutschen Mitglieder... S. 43; Wiesiołowski J. Pielgrzymowanie... S. 163).

1. Пратасевіч Рыгор

1а. Gregorius Prothasy, Hrehory Prothasy, Григореи Протасиевич.

2. —

3. Упершыню згадваецца як староста (ваявода) мцэнскі ў 1423 г., калі Вітаўт даслаў яго ваяваць супраць татараў (ПСРЛ. Т. 11. С. 238—239). Памёр пасля 1436 г.

4. Паходжанне не высветлена. Паходзіў, несумненна, з рускіх зямель ВКЛ.

5. У адным дакуменце адзначана яго вотчына — *de Ostrowek* (CEXV. T. 1. S. 71—72).

6. 1423—1436 гг. — староста (ваявода) мцэнскі (апошні год — у лагеры Свідрыгайлы).

7. У 1431 г. быў дасланы Свідрыгайлам да татараў. Там ён нейкі час быў у палоне (CEXV. T. 2. S. 256).

У часы Вітаўта і Свідрыгайлы згадваецца як актыўны ваенны кіраўнік. У 1431 г. трапіў у польскі палон (CEXV. T. 1. S. 70). Верны паплечнік Свідрыгайлы (напрыклад, ліст Свідрыгайлы 1436 г. — GStA PK, OBA 7160).

1. Пятковіч Станіслаў Міхайлавіч

1а. Stanislaus Michaelis Pethcovicz, Stanislaus Pyethkowycz, Станислав Михаилович Петковича.

2. Герб — Трубы.

3. Упершыню згадваецца ў 1477 г. Памёр у 1507 г.

4. Паходжанне не высветлена. Ідэнтыфікацыю ўскладняе тое, што абодва імёны па бацьку — папулярныя хрысціянскія

імёны. Герб павінен указваць на роднасныя сувязі з Осцікамі і Судзімонтамі. Брат — Марцін (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 95).

6. 1477—1483 гг. — маршалак гаспадарскі. 1498—1505 гг. — староста берасцейскі.

7. Вялікі палітычны ўплыў набыў у часы панавання Аляксандра.

1. Рагацінскі Ян

1а. Ивашко Рогатинскии.

2. ?

3. Упершыню згадваецца ў 1441 г.

4. Паходжанне не высветлена[57]. Жонка — дачка князя Андрэя Уладзіміравіча[58]. Дачка — Федзька (Фядора), якая выходзіла замуж тройчы: а) за кобрынскага князя Івана Сямёнавіча; б) за Юрыя Пацэвіча; в) за Мікалая Радзівілавіча.

Ян Длугаш адзначае, што ў 1431 г. Багдан Рагацінскі (*Bogdanus Rohatinski*) перайшоў на бок Свідрыгайлы (Annales seu cronicae... Liber XI. P. 30). Хутчэй за ўсё, размова ідзе пра таго ж Яна Рагацінскага, які пасля гэтага (*Iwaschko Przysluschycz Rohatinski*) згадваецца ў 1432 г. як староста ў Алеску (Тамсама. P. 66).

5. Вотчынныя землі, верагодна, знаходзіліся на Падляшшы. Каля сярэдзіны XV ст. пажыццёва атрымаў у валоданне Мельнік (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 57).

6. 1441 г. — староста клецкі. 1461 г. — староста камянецкі.

1. Рагоза

1а. Rohoza, Rahosza.

2. ?

---

[57] У Хроніцы Быхаўца апавядаецца, што ў сярэдзіне XV ст., у часе канфлікту, «адзін паляк высокага паходжання Андрэй Рагацінскі» таемна папярэдзіў літоўцаў пра намеры палякаў (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 139). Магчыма, ён быў братам Яна Рагацінскага. Яны маглі паходзіць з рускіх або мазавецкіх зямель, што ўваходзілі ў склад Польшчы.

[58] Дачка Яна Рагацінскага Федзька называе князя Андрэя Уладзіміравіча дзедам (Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków... T. 1. S. 139—140).

3. Упершыню згадваецца ў 1431 г. Цяжка сказаць, ці ідэнтычны Рагозу Якшычу, які ў сярэдзіне XV ст. атрымаў ад гаспадара 10 чалавек (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 26).

4. Звесткі пра паходжанне адсутнічаюць.

7. У 1431 г. Свідрыгайла дасылаў яго да магістра Ордэна (CEXV. T. 2. S. 256) і караля Польшчы (GStA PK. OF 14. S. 627—629). У 1432 г. па даручэнні Свідрыгайлы ізноў ездзіў да Ягайлы (Тамсама. S. 693). У 1431 г. разам з іншымі літоўскімі князямі і баярамі паручыўся перад каралём Польшчы за літоўскіх палонных (CEXV. T. 1. S. 70).

Чалавек атачэння Свідрыгайлы.

1. Радзівілавіч Мікалай

1а. Nicolaus Radivilowicz, Nicolaus Radziwilowicz, Nicolaus Radiwyl, Миколаи Ра(о)дивилович.

2. Герб — Трубы.

3. Упершыню згадваецца ў фундацыйным дакуменце свірскіх князёў 1463 г. (KDKW. S. 279). Памёр у 1509 г.

4. Бацька — Радзівіл Осцікавіч. Быў тройчы жанаты: а) з дачкой Яна Манівідавіча Сафіяй (з гэтага шлюбу нарадзіліся ўсе яго дзеці); б) з дачкой князя Івана Заслаўскага (імя невядомае); в) з дачкой Яна Рагацінскага Федзькай. Сыны — Мікалай, Ян, Юрый, Альберт. Дачкі — Ганна (жонка мазавецкага князя Конрада III) і Барбара, што стала манашкай-бернардзінкай (Kurczewski J. Biskupstwo wileńskie... S. 264; Petrauskas R. XV amžiaus Lietuvos bajorijos struktūra... P. 136).

5. Асноўныя вотчынныя землі знаходзіліся ў ваколіцах Кернава, Анікштаў і Ушполя. У дакуменце 1482 г. тытулаваў сябе або быў тытуляваны *heres in Wpniki* (KDKW. S. 381) і *de Musniki* (AGAD, dok. perg., № 7397).

6. 1477—1509 гг. — староста ўшпольскі і пянянскі. 1482—1486 гг. — намеснік смаленскі. 1486 г. — маршалак гаспадарскі. 1488—1490 гг. — староста наваградскі. 1488—1490 гг. — староста бельскі. 1488—1492 гг. — каштэлян троцкі. 1491—1509 гг. — ваявода віленскі і канцлер ВКЛ.

7. Найбольшага ўплыву дасягнуў у часы Аляксандра.

8. 15.10.1482 г. Мікалай Радзівілавіч зрабіў ахвяраванне на

касцёл ва Упніках, фундатарам якога быў яго бацька (KDKW. S. 381—382).

Пахаваны ў віленскім бернардзінскім касцёле, які быў ім шчодра адораны (Malczewska M. Latyfundium... S. 34; МРН. Т. 5. S. 200).

1. Раловіч Якуб

1а. Jacobus Ralowicz, Якуб Ралович.

2. Герб — Побуг.

4. Бацька — Рал (*Ralo*), які браў удзел у Гарадзельскай гербавай акцыі (AU. S. 53—54).

5. Сябе называў панам Гарадзілава (непадалёк ад Крэва ў Ашмянскім павеце) (*heres de Horodzylow* — KDKW. S. 198). Яго родзічы сведчылі, што іх продкі ў часы Вітаўта прыбылі ў Літву з Жамойці (Dubonis A. Įdomesni dokumentai... P. 178). Казімір на нейкі час даручыў яму кіраванне Пінскам (Wysłouch S. Rozwój granic i terytorjum... S. 10).

6. Каля сярэдзіны XV ст. — маршалак гаспадарскі.

7. У 1445 г. быў адным з камандуючых літоўскім войскам у вайне супраць Масквы (ПСРЛ. Т. 18. С. 192).

8. 02.02.1443 г. Якуб Раловіч фундаваў касцёл у Гарадзілаве (KDKW. S. 198—199), ахвяраванне на які 09.09.1498 г. зрабілі яго нашчадкі (Тамсама. S. 534—535).

1. Румбоўд Валімонтавіч

1а. Rumbold(us), Lampert alias Rambalt Wolymunthowicz, Ramold, Rumpoldus, Rombold, Rammolt, Romolt, Romald.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў Віленскай дамове з Польшчай 1401 г. (AU. S. 38). У канцы 1432 г. па загадзе Жыгімонта Кейстутавіча пакараны смерцю.

4. Бацька — Валімонт. Браты — Кезгайла, Яўнус, Шэдзібор, Гудзігерд, Судзівой. Імя і паходжанне жонкі не высветлены. Сын — Міхаіл.

5. У дакументах адзначаў Дзяволтву як асноўную вотчыну (CEXV. T. 1. S. 75). Меў таксама маёнткі ў Жамойці (Lietuvos

Metrika. Užrašymų knyga 10... P. 100, 111) і Свіслацкай воласці (KDKW. S. 86).

6. 1409—1411 гг. — староста жамойцкі. 1412—1432 гг. — маршалак земскі. 1422/23 г. — намеснік віцебскі.

7. У 1412, 1416, 1429 і 1430 г. ездзіў з пасольствамі ў Польшчу (Rachunki dworu króla Władysława Jagiełły... S. 401, 504; CEV. S. 842, 907).

У 1413 г. знаходзіўся сярод перагаворшчыкаў пры вырашэнні справы Бенедыкта Макры (Lites ac res gestae... T. 2. P. 136).

Адзін з найбольш уплывовых прадстаўнікоў знаці часоў Вітаўта. У 1409 г. арганізаваў паўстанне ў Жамойці. У гады панавання Свідрыгайлы трапіў у польскі палон. Падчас канфлікту Свідрыгайлы і Жыгімонта Кейстутавіча спачатку падтрымліваў Кейстутавіча. Аднак у канцы 1432 г. удзельнічаў у змове супраць яго, за што быў пакараны смерцю разам з братам Яўнусам (LUB. Bd. 8. S. 372—373).

8. Быў фундатарам алтара Румбоўда ў Віленскай кафедры (Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 89).

1. Румбоўдавіч Міхаіл

1а. Михаил Ромболтович.

2. Герб — Задора.

3. Згадваецца ў вялікакняскім наданні сярэдзіны XV ст. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 68).

4. Бацька — Румбоўд Валімонтавіч. Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

5. У гаспадарскім дакуменце адзначана, што яго вотчына знаходзілася ў Вількаміры (Тамсама).

7. У палітычным жыцці краіны не ўдзельнічаў.

1. Рымавідавіч Алехна

1а. Olechno Rimowydowicz, Олехно Римовидович.

2. Герб — Ляліва.

3. Упершыню згадваецца ў 1440/43 г. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 35).

4. Брат — Юрый. Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Сыны — Пётр, Станіслаў, Мікалай, Андрэй, Скабейка (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 91; Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 75). Продак Аляхновічаў, Кухмістравічаў, Іжыковічаў, Дабрагастайскіх.

6. 1447—1456 гг. — маршалак гаспадарскі.

1. Рымавідавіч Юрый (Юшка)

1а. Juschko Rimowydowicz, Юшко Римовидович.

2. Герб — Ляліва.

3. Упершыню згадваецца ў Хрыстмемельскай дамове 1432 г. (Napiersky K. E. Russisch-livländische Urkunden... S. 191).

4. Звестак пра паходжанне бацькі няма. Герб сведчыць пра роднасць з Манівідамі. Брат — Алехна. Жонка — Аляксандра (паходжанне не высветлена). Сын — Ян Забярэзінскі (гл.: Ян Юр'евіч Забярэзінскі). Пачынальнік лініі Забярэзінскіх.

5. Вотчынныя ўладанні — у Ашмянскім павеце. Маёнтак Забярэззе, што даў імя роду яго нашчадкаў, атрымаў ад Жыгімонта Кейстутавіча (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 6. S. 187; Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 6... P. 333). Вотчыннае ўладанне ў Ашмянах дзяліў з братам Алехнам (Тамсама).

1. Рэкуць

1а. Roeukutte, Ruckunde.

2. —

3. У 1384 г. згадваецца сярод верных Вітаўту баяраў (CEV. S. 4).

4. Верагодна, ідэнтычны згаданаму ў 1390 г. сярод верных Вітаўту жамойтаў *Ruckunde Jawschen son*[59] (CEV. S. 23—24). Сын — Воўчка Пётр.

5. Паходзіў з Меднікаў (Жамойць) (Тамсама).

---

[59] Слова «son» у публікацыі прапушчана, і так былі «створаны» дзве асобы. Гл. фотакопію дакумента — MAB RS. F 256—1092, l. 4.

Гэтага Рэкуця нельга звязваць са згаданым у канцы XIV ст. Буцівідам Рэкуцевічам, нашчадкі якога карысталіся пячаткай з гербам Ляліва.

1. Рэкутовіч Воўчка Пётр

1а. Petrus Wolczko Rukuthowicz, Rocuthowicz, Rokuthy.

2. У Гародлі атрымаў герб Дзялоша.

3. Упершыню выступае ў атачэнні Ягайлы падчас Грунвальдскай бітвы 1410 г. Памёр каля 1452 г.

4. Бацька — Рэкуць. Жонка — Маргарыта, сыны — Андрэй і Пётр (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 218)[60].

5. Перабраўся ў рускія землі, што знаходзіліся ў складзе Польшчы. У дакументах пісаўся як *de Klodno* (Клодна каля Львова) (Akta grodzkie i ziemskie... T. 5. S. 87).

6. Пасады ў Польшчы: 1435—1452 гг. — падкаморы львоўскі. 1443 г. — староста холмскі (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 217—218).

1. Сак Станіслаў

1а. Stanislaus Sak, Sack.

2. У Гародлі атрымаў герб Помян.

3. Упершыню выступае ў 1413 г. у Гародлі (AU. S. 53—54). Памёр пасля 1433 г.

4. Імя і паходжанне бацькі невядомыя. Сыны Андрэй (Андрушка), Васіль (Васька), Ян (Івашка), Станіслаў (Станька), Алехна, Пётр, Фёдар (Федзька).

Роднасць з Даўгердамі: а) той жа герб Помян; б) блізкасць уладанняў.

5. Гл. пра Андрэя Саковіча.

6. 1433 г. — староста дубініцкі.

1. Саковіч Алехна

1а. Олехно Сакович.

2. Герб — Помян. Праўда, Б. Мажэйка сцвярджае, што да яго ліста 1477 г. прывешана іншая пячатка (Możejko B. Kuchmistrz... S. 139—142).

[60] Цяжка сказаць, ці звязаны з гэтым родам згаданы ў 1489 г. намеснік маркаўскі Багдан Рэкуцевіч («Bohdanus Rehuthyewycz») (AGAD, dok. perg., № 6725).

4. Бацька — Станіслаў Сак[61]. Звесткі пра нашчадкаў адсутнічаюць.

5. Казімір надаў яму і яго братам маёнтак у Боліне, што раней належаў іх брату Стаўньку, які памёр (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 29).

6. 1477—1481 гг. — староста бельскі. 1481—1485 гг.— кухмістр двара вялікага князя. 1485 г. — староста Віленскага замка (*capitaheus Vilnensis vicegerens alias namyesthnyk*) (Rowell S. C. Anekdota ekklesiastika: 1.... P. 113).

1. Саковіч Андрэй (Андрушка)

1а. Andreas (Andruschko) Sakowicz, Андреи Сакович.

2. Герб — Помян.

3. У крыніцах з'яўляецца ў 1431 г. у дакуменце Чартарыйскай дамовы (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135). Памёр каля 1465 г.

4. Бацька — Станіслаў Сак. Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Сыны — Багдан, Юрый, Міхаіл. Дачка — Ганна, што выйшла замуж за Вайдылу з Ушакова.

5. Сябе называў панам Няменчына (*heres de Nemenczina* — KDKW. S. 150) і Груздава (Ашмянскі павет) (*heres de Hrusdowo* — Тамсама. S. 200). Яшчэ адно яго вотчыннае ўладанне — Мядзел.

6. 1434—1435 гг. — староста дубініцкі. 1440 г. — намеснік смаленскі. 1444—1458 гг. — намеснік полацкі. 1459—1465 гг. — ваявода троцкі. У часы Казіміра — староста мядзелскі. У 1455 г. названы найвышэйшым ваенным камандуючым (*ductor supremus exercitus*) (GStA PK, OBA 13725).

7. Адзін з самых уплывовых прадстаўнікоў літоўскай знаці часоў Казіміра. Вельмі часта ўдзельнічаў у пасольствах: у 1445, 1446, 1447 і 1451 г. ездзіў у ордэнскую дзяржаву (LUB. Bd. 10. S. 108, 130, 271; LUB. Bd. 11. S. 112); у 1447 і 1453 г. ездзіў у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 5. P. 33, 136); у 1458 г. — у Ноўгарад (ПСРЛ.

[61] Сцвярджэнне Б. Мажэйкі, што Алехна Саковіч паходзіў з іншага роду, грунтуецца толькі на геральдычным матэрыяле і не з'яўляецца пераканаўчым (Możejko B. Kuchmistrz...). Геральдычная традыцыя ў Літве ў XV ст. не была цвёрда замацаванай і неабавязкова дакладна адлюстроўвае родавую прыналежнасць асобы.

Т. 16. С. 198). У 1453 г. разам з Янам Неміровічам і прадстаўнікамі Польшчы ўдзельнічаў у перагаворах пра шлюб Казіміра з дачкой імператара Альбрэхта II (Biblioteka XX. Czartoryskich w Krakowie. Teki Naruszewicza. Vol. 18. № 142).

У 1445 г. быў адным з камандуючых літоўскім войскам у вайне з Масквой (ПСРЛ. Т. 18. С. 192).

8. 09.06.1434 г. Андрэй Саковіч разам з братамі зрабіў ахвяраванне на алтар Св. Сцяпана і Св. Лаўрына ў Віленскай кафедры (KDKW. S. 150). 03.02.1443 г. фундаваў касцёл у Груздаве (Тамсама. S. 200—201). 21.02.1457 г. фундаваў касцёл у Мядзеле (Тамсама. S. 252—253).

1. Саковіч Васіль (Васька)

1а. Basilius alias Waschko Sakowycz, Васко Сакович.

2. Герб — Помян.

3. Памёр каля 1473 г. У той год запісаў тры маёнткі, выслужаныя ў вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча, брату Яну (AGAD, dok. perg., № 7344).

4. Бацька — Станіслаў Сак. Жонка — Мілохна (паходжанне не высветлена). Сын — Сцечка. Дачка — Кацярына. Дзеці памерлі яшчэ да яго смерці. Іншыя яго ўладанні атрымаў у спадчыну Багдан Андрэевіч Саковіч (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 25... P. 75).

8. 25.07.1444 г. Васіль Саковіч разам з жонкай Мілохнай, дачкой Кацярынай і іншымі (неназванымі) дзецьмі зрабіў ахвяраванне віленскім францішканцам (KDKW. S. 203).

1. Саковіч Пётр

1а. Petrus Sakowicz.

2. Герб — Помян.

4. Бацька — Станіслаў Сак. Звесткі пра нашчадкаў адсутнічаюць.

6. 1447 г. — староста ковенскі.

7. Хутчэй за ўсё гэта ён быў ковенскім старостам *Vako*, які ў пачатку 1447 г. ездзіў да магістра Ордэна (LUB. Bd. 10. S. 200—201).

1. Саковіч Федзька

1а. Федько Сакович.

2. Герб — Помян.

3. Згадваецца толькі адзін раз: у 1440/1443 г. атрымаў людзей ад вялікага князя (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 68).

4. Бацька — Станіслаў Сак. Звестак пра нашчадкаў няма.

7. Магчыма, гэта ён (у крыніцы згадваецца толькі імя — Федзька) у 1439 г. быў старостам бельскім (Szybkowski S. Rec.... S. 158).

1. Саковіч Станіслаў (Станька)

1а. Станько Сакович.

2. Герб — Помян.

3. Згадваецца ў часы Жыгімонта Кейстутавіча і ў першыя гады панавання Казіміра (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 29, 44).

4. Бацька — Станіслаў Сак. Жонка — Васька.

5. Меў бенефецыйныя ўладанні ў Боліне і Уле, якія атрымаў ад Жыгімонта Кейстутавіча і Казіміра (Тамсама. P. 29).

1. Саковіч Ян (Івашка)

1а. Johannes (Iwasko) Sakowicz, Ивашко Сакович.

2. Герб — Помян.

4. Бацька — Станіслаў Сак. Паходжанне і імя жонкі не высветлены. Сын — Альберт (KDKW. S. 320).

5. Вотчынныя ўладанні знаходзіліся ў Няменчыне, дзе, акрамя таго, атрымаў людзей ад вялікага князя (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 27).

6. 1451 г. — староста вількейскі (*vicegerens*). 1472 г. — маршалак гаспадарскі.

7. У 1451 г. ездзіў з пасольствам да магістра Ордэна (GStA PK, OBA 10693); у 1472 г. — да татараў (Biblioteka XX. Czartoryskich w Krakowie. Teki Naruszewicza. Vol. 20. № 216).

1. [Саковіч] Багдан Андрэевіч

1а. Bohdan Andreyowicz, Bohdan Andruszkowicz, Богдан Андреевич.

2. Герб — Помян.

3. Упершыню згадваецца як пакаёвы гаспадара ў спісе палонных Ордэна 1454 г. пасля Хойніцкай бітвы (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102; Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 142). Памёр у 1490 г.

4. Бацька — Андрэй Саковіч. Імя і паходжанне жонкі невядомыя[62]. Дачка — Эльжбета (жонка Мікалая Мікалаевіча Радзівіла).

5. У спісе палонных адзначана яго паходжанне *heres de Wyaszenya* (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102). Вязынь — гэта непадалёк ад старой вотчыны Саковічаў Мядзела[63]. Вотчынныя землі меў таксама ў Ашмянскім павеце (Груздава).

6. 1463—1477 гг. — маршалак гаспадарскі. 1466—1474 гг. — староста браслаўскі. 1479/80—1484 гг. — намеснік полацкі. 1480—1490 гг. — маршалак земскі. 1484 — староста мядзелскі. 1484—1490 гг. — ваявода троцкі.

7. У 1473 г. удзельнічаў у вызначэнні мяжы з Лівоніяй (Описание... Вып. 3. С. 41—42); у 1474 і 1482 г. быў літоўскім паслом у Маскву (ПСРЛ. Т. 18. С. 250; Banionis E. Lietuvos Didžiosios... P. 204); у 1487 г. быў уключаны ў склад літоўскай дэлегацыі, што вяла перагаворы з прадстаўнікамі Ордэна (GStA PK, OBA 17295).

Адзін з самых уплывовых прадстаўнікоў літоўскай знаці канца панавання Казіміра. У 1485 г. кіраваў мабілізацыяй войска ВКЛ (Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... T. 1. S. 363).

8. 15.10.1475 г. Багдан Андрэевіч зрабіў ахвяраванне на парафіяльны касцёл у Груздаве, фундатарам якога быў яго бацька (KDKW. S. 341—345)[64].

---

[62] У дакуме́нце вялікага князя Аляксандра ад 23.08.1492 г. згадваецца ўдава Багдана Андрэевіча (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 31). Яшчэ жыла ў канцы 1502 г. (Lietuvos didžiojo kunigaikščio Aleksandro Jogailaičio dvaro sąskaitų knygos... P. 86).

[63] Вязань атрымаў у спадчыну яго брат Міхаіл, а пасля яго смерці — іншы брат Юрый (Jablonskis K. Archyvinės smulkmenos... P. 418—419). Аднак з дакумента Багдана 1475 г. вынікае, што і ён меў там сваю долю (KDKW. S. 341—345).

[64] Дакумент, безумоўна, з'яўляецца фальсіфікатам, але ён, несумненна, грунтуецца на аўтэнтычным наданні меншага аб'ёму.

1. [Саковіч] Міхаіл Андрэевіч

1а. Михаил Андреевич.

2. Герб — Помян.

4. Бацька — Андрэй Саковіч. Памёр маладым без нашчадкаў, а яго ўладанні падзялілі між сабой браты Багдан і Юрый (Jablonskis K. Archyvinės smulkmenos... P. 418).

1. [Саковіч] Юрый Андрэевіч

1а. Georgius Andruszkowicz, Юри Андреевич.

2. Герб — Помян.

4. Бацька — Андрэй Саковіч. Сыны — Ян і Альберт, якія паводле назвы свайго ўладання называліся Насілоўскімі.

8. У нейкім сваім уладанні (Данюшава?) фундаваў касцёл (KDKW. S. 343; Ochmański J. Biskupstwo wileńskie... S. 66).

1. Саковіч Альберт Янавіч

1а. Albertus Iwaskonis Sakowicz.

2. Герб — Помян.

3. Упершыню згадваецца ў фундацыйным дакуменце свірскіх князёў касцёлу ў Малым Мядзеле 1463 г. (KDKW. S. 279). Таксама выступае як сведка ў дакуменце 1471 г. (Тамсама. S. 320).

4. Бацька — Ян Саковіч. Меў дачку Ганну (KDKW. S. 717).

1. Сачка Ян

1а. Johannes Saczek, Saczko, Сачко.

2. ?

3. Згадваецца ў некалькіх дакументах 1445—1455 гг.

4. Ніякіх прамых даных пра яго паходжанне і роднасныя сувязі ў крыніцах няма. Магчыма, сын Ягінта.

6. 1445—1455 гг. — маршалак гаспадарскі.

8. 03.06.1450 г. — яго прашэнне папу пра перанасны алтар (Bullarium Poloniae... 6. S. 92).

1. [Солтан] Аляксандр Юр'евіч

1а. Александр Юревич.

2. Солтаны мелі свой герб негарадзельскага паходжання.

4. Звесткі пра паходжанне адсутнічаюць. Сыны — Аляксандр Солтан, Іван (Івашка), Андрэй, Юрый. Дачка (імя невядомае) выйшла за Багдана Храбтовіча, бо Ян Літавор Багданавіч Храбтовіч называў Солтана Аляксандравіча дзядзькам (па матчынай лініі) (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 73). Пасля смерці Солтана Ян Літавор апекаваўся яго дзецьмі (РИБ. Т. 20. С. 868—869).

6. 1443(?)—1454 гг. — падскарбі земскі.

8. Магчыма, гэта ён (*скарбнік зямскі літоўскі пан Аляксандр*) быў упісаны ў памянную кнігу Гарадзішча (Pomianyk of Horodyshche... P. 13).

1. Солтан Аляксандр Аляксандравіч

1а. Allexander Szolthan, Alexander Solthan, Alexander Soltan, Zolthan, Солтан Александрович.

4. Бацька — Аляксандр Юр'евіч. Сыны — Міхаіл, Іосіф (мітрапаліт кіеўскі), Аляксандр і Грынька (Boniecki A. Poczet rodów... S. 332).

5. Гл. пра Івана Солтана.

6. 1474 —1482 гг. — падскарбі дворны гаспадарскі. 1483—1490 гг. — староста слонімскі. 1482—1493 гг. — маршалак гаспадарскі. 1486—1487 гг. — староста наваградскі. 1492—1493 гг. — староста бельскі.

7. У 1486 г. ездзіў з пасольствам у Маскву (РИБ. Т. 27. С. 460); у 1492 г. — у Польшчу (Korczak L. Litewska rada wielkoksiążęca... S. 98).

У 1467—1469 гг. падарожнічаў у Іерусалім, наведаў папу Паўла II (у Рыме прысягнуў на царкоўную унію), двары заходнееўрапейскіх манархаў (Trimonienė R. Vakarų Europos valdovų...; Paravicini A., Paravicini W. Alexander Soltan ex Lithuania...; Bullarium Poloniae... 7. S. 162—163).

8. Быў фундатарам манастыра ў Жыровічах (Trimonienė R. Vakarų Europos valdovų... P. 102).

1. [Солтан] Андрэй Аляксандравіч

1а. Андреи Алéксандрович.

4. Бацька — Аляксандр Юр'евіч. Жонка — Ганна, дачка Багавіціна (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 19—20). Сын — Іван. Дачка выйшла за двараніна вялікага князя Аляксандра Яна (Івашку) Саву (АЛМ. Т. 1. Вып. 1. С. 164).

6. 1486—1498 гг. — падскарбі земскі.

1. [Солтан] Іван (Івашка) Аляксандравіч

1а. Johannes / Iwaszko Alexandrovicz, Иван Александрович, Ивашко Олександрович.

4. Бацька — Аляксандр Юр'евіч. Дачка (імя невядомае) выйшла замуж за гаспадарскага двараніна Аляксандра Кміту Стратовіча (AGAD, dok. perg., № 7423).

5. У папскім прывілеі ад 19.11.1471 г. адзначана, што ён — *de Poczampow* (Kutrzeba S., Fijałek J. Kopiarz rzymski Erazma Ciołka... S. 73). Верагодна, гэта Пачэпаў паміж Наваградкам і Слонімам. Непадалёк знаходзяцца таксама Жыровічы. Род меў нямала маёнткаў на Падляшшы (Wawrzyńczyk A. Rozwój wielkiej własności... S. 86).

6. 1473—1486 гг. — падскарбі земскі.

7. 1471 г. — падарожжа ў Рым да папы Сікста IV (Kutrzeba S., Fijałek J. Kopiarz rzymski Erazma Ciołka... S. 73).

1. [Солтан] Юрый Аляксандравіч

1а. Юри Александрович.

3. Згадваецца ў наданнях гаспадара 1482 і 1488 г. Адзначана, што ён брат Солтана [Аляксандра] (РИБ. Т. 27. С. 196, 251).

4. Бацька — Аляксандр Юр'евіч.

1. Страчэвіч Пётр Рачка

1а. Petrus Raczko Stroczewicz, Рачко Строчевич.

2. Герб — Зарэмба.

3. Упершыню згадваецца ў Горадзенскай дамове 1434 г. (AU. S. 104—105). У 1450 г. ужо не жыў (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 53).

4. Звесткі пра паходжанне бацькі адсутнічаюць. Браты — Воўчка і Ян. Жонка — Марыя. Дачка — Ганна Мілохна, жонка Глеба Вяжэвіча (Акты, издаваемые Виленскою комиссиею... Т. 11. С. 6—7).

5. На пячатцы, прывешанай да дамовы 1434 г., ёсць надпіс *de Plonka* (Палонка) (непадалёк ад Ваўкавыска) (AU. S. 101).

7. У 1440 г. разам з Андрэем Давойнавічам ездзіў у Польшчу (Długossii Joannis Historiae Polonicae... T. 4. P. 629).

8. 03.11.1437 г. Пётр Рачка Страчэвіч фундаваў касцёл у Палонцы (KDKW. S. 170—171).

1. Струміла Мацей (Мацка)

1а. Мацко Стромило, Мацко Стромилъко.

2. Герб — Дамброва.

3. Упершыню згадваецца ў судовай справе ў Мазовіі ў 1436/37 г. (Szybkowski S. O rządach... S. 200—201).

4. Бацька Павел. Браты — Юрый, Аляксандр, Кляменс, Пётр, Станіслаў. Сёстры — Ганна і Маргарыта. Паходжанне жонкі не высветлена. Сыны — Якуб, Мікалай, Станіслаў, Ян. Пачынальнік лініі Цеханавецкіх (Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy... S. 19).

5. Род паходзіў з Мазовіі (гл. пра Юрыя Струмілу)[65]. Меў таксама ўладанні на Падляшшы і ў Мядніках.

6. 1467 г. — староста медніцкі.

1. Струміла Пашкевіч Пётр

1а. Peter Strumilo, Петраш Стромилко, Петр Пашкович, Петрашко Пашкович.

2. Герб — Дамброва.

3. Упершыню згадваецца каля 1440/1443 г. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 20). Памёр каля 1486 г.

4. Бацька — Павел. Браты — Юрый Струміла (гл. пра яго), Мацей (Мацка), Аляксандр, Кляменс, Станіслаў.

[65] Тое, што Мацка Струміла быў старостам медніцкім, не абавязкова сведчыць пра тое, што (так мяркуе К. Пяткевіч) род паходзіў з Літвы (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 101).

Сёстры — Ганна і Маргарыта. Быў двойчы жанаты. Паходжанне першай жонкі не высветлена. З ёй меў сына Станіслава (пачынальніка лініі Кішкаў) і дачку Ганну, што выйшла замуж за князя Яна Свірскага, а пазней — за Каспара Германовіча (Tęgowski J. Rodowód kniaziów Świrskich... S. 146). Другой жонкай была Кацярына — дачка Яна Неміровіча. З ёй меў сына Мікалая і дачок — Ядвігу, Барбару і Петранэлію (яна выйшла замуж за Міхаіла Глінскага (Spieralski Z. Kiszka Stanisław... S. 515—517; Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowieccy... S. 20; Jaszczołt T. Fundacje kościelne... S. 37).

5. Род паходзіў з Мазовіі (гл. пра Юрыя Струмілу). Меў таксама ўладанні на Падляшшы і ў Меднікаў. Асноўная вотчына — Цеханавец.

6. 1463—1474 гг. — намеснік дарагічынскі. 1474—1477 гг. — каралеўскі кухмістр. 1483—1486 гг. — староста лідскі. 1483—1486 гг. — маршалак гаспадарскі.

7. Як староста дарагічынскі ўдзельнічаў у вызначэнні літоўска-мазавецкай мяжы (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo... S. 101). У 1484 г. кіраваў літоўскай дэлегацыяй на перагаворах пра межы з Ордэнам (тут ён названы *Peter Strumilo*) (GStA PK, OBA 17113). У 1486 г. ездзіў з пасольствам да крымскіх татараў (РИБ. Т. 27. С. 449 і далей). Там быў затрыманы і памёр.

8. Быў фундатарам касцёла ў падляшскай Чырвонцы (Jaszczołt T. Fundacje kościelne... S. 23).

1. Струміла Юрый (Юшка)

1a. Juschko alias Stromilo, Georgius Stromilo, Stramile, Stramidel, Stromil, Stromylo.

2. Герб — Дамброва.

3. Упершыню згадваецца ў 1428 г. як найвышэйшы дворны пакаёвы / падкаморы (Vitoldiana... S. 13—14). Памёр у 1485 г.

4. Бацька — Павел (хутчэй за ўсё, ён таксама называўся Струмілам). Браты — Мацей (Мацка), Аляксандр, Кляменс, Пётр, Станіслаў. Сёстры — Ганна і Маргарыта. Жонка — Алена, дачка Сцібора, які быў маршалкам мазавецкага князя. Іх дачка — Алена. Другая жонка — Эльжбета (Jakubczak S. Jerzy

Strumiłło... S. 248—253; Asadauskienė N. Kiškų giminė LDK... P. 75—84).

5. Паходзіў з Мазовіі (пісаўся — з Дмошына). Пазней перасяліўся на рускія землі Польшчы.

6. 1428 г. — найвышэйшы дворны пакаёвы / падкаморы. 1429 г. — падскарбі дворны. 1431 г. — староста бельскі (справамі Бельска займаўся ўжо ў часы Вітаўта — Rowell S. C. Anekdota ekklesiastika: 1.... P. 114). Пасады ў Польшчы: 1441—1485 гг. — дзяржаўца камёнкаўскі. 1461—1485 гг. — падкаморы львоўскі. 1478—1485 гг. — каштэлян рускіх зямель (Jakubczak S. Jerzy Strumiłło... S. 249—250, 253).

7. Ордэнскія ўраднікі неаднаразова згадвалі пра яго ваенныя подзвігі (напрыклад, 1431 г. — GStA PK, OBA 5658; 1433 г. — Тамсама, OBA 6438). Актыўна (і нярэдка самастойна) дзейнічаў на памежжы Польшчы — Ордэна — Мазовіі. Яго называлі *des alden heren grosfursten* [Вітаўта] *liephabir* (1432 г. — Тамсама, OBA 6119), *ein houptman hertzogs Segemunds uff der Littawschen grenitzen ken der Masaw* (1433 г. — Тамсама, OBA 6427). У 1435 г. Свідрыгайла ў лісце да вялікага магістра Ордэна сцвярджаў, што Струміла, які мае замак у Мазовіі непадалёк ад мяжы з Літвой, спрачаецца з Жыгімонтам Кейстутавічам з-за неаддадзенай платы і гатовы са сваім братам перайсці на службу да Свідрыгайлы (Тамсама, OBA 7000). У 1436 г. Струміла ўжо з'яўляўся падданым польскага караля, але яго браты і сёстры на той час жылі ў Літве (Najdawniejsze księgi sądowe mazowieckie. T. 3. S. 173).

8. У 1456 г. зрабіў ахвяраванне львоўскім францішканцам (Dumin S., Rachuba A., Sikorska-Kulesza J. Ciechanowiecc... S. 19). 24.09.1471 г. фундаваў капліцу ў касцёле ў Камёнцы (Tylus S. SAC. Dokumenty kaplicy... S. 11—12).

1. Судзівой Валімонтавіч

1a. Sandiwogius Wolymunthowicz, Sudziwoy Wolimuntowicz, Sudywogius, Sudywoy, Sudiway, Sudway, Sudewoye, Судивои.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў Чартарыйскай дамове 1431 г. (Бучинський Б. Кілька причинків... С. 135). Памёр у 1459 г.

4. Бацька — Валімонт. Браты — Румбоўд, Кезгайла, Яўнус, Шэдзібор, Гудзігерд. Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Сын — Станіслаў (Станька). Дачка (імя невядомае) — жонка Яна Вяжэвіча (KDKW. S. 380).

5. Як і іншыя Валімонтавічы, называў сябе вотчыннікам Дзяволтвы (AU. S. 101).

6. 1431, 1447—1459 гг. — староста ковенскі. 1441 г. — канцлер ВКЛ. 1445 г. — намеснік смаленскі. 1451—1459 гг. — каштэлян віленскі.

7. Пасля пераваротy Жыгімонта Кейстутавіча 1432 г. разам з братамі спачатку быў на баку новага князя, але ў канцы таго ж года браў удзел у змове супраць яго. Пасля гэтага быў пазбаўлены пасады старосты ковенскага. Уплывовы прадстаўнік літоўскай знаці ў часы Казіміра, падтрымліваў сяброўскія адносіны з Ордэнам. Неаднаразова ездзіў з пасольствамі ў ордэнскую дзяржаву: на даручэнне Свідрыгайлы — 1431 г. (GStA PK, OBA 5636), у часы Казіміра — 1445, 1446 (двойчы), 1447, 1448 г. (LUB. Bd. 10. S. 108, 130, 271, 288; GStA PK. OF 15. S. 427—432); ў 1432 г. як прадстаўнік літоўскага боку ўдзельнічаў у перагаворах з Польшчай і Ордэнам (GStA PK, OBA 6191).

У 1445 г. быў адным з камандуючых літоўскім войскам у вайне супраць Масквы (ПСРЛ. Т. 18. С. 192).

8. Фундаваў алтар у нейкім касцёле, бо вядомы яго алтарнік Мацей (KDKW. S. 255, 275).

1. Судзівоевіч Станіслаў (Станька)

1a. Stanke Sudywogewicz, Stanislaus Sandziwoiewicz, Станко Судивоевич.

2. Герб — Задора.

3. Упершыню згадваецца ў 1463 г. Памёр да 06.09.1481 г. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1... P. 101).

4. Бацька — Судзівой Валімонтавіч. Вядома толькі імя жонкі — Кацярына (Bullarium Poloniae... 7. S. 205). Звесткі пра нашчадкаў адсутнічаюць. У. Сямковіч меркаваў, што ад яго паходзілі Станкевічы (Semkowicz W. O litewskich rodach... T. 7. S. 11). Аднак той факт, што пасля яго смерці частка ўладанняў перайшла да пляменніцы Ганны і гаспадара (KDKW. S. 380;

АЛМ. Т. 1. Вып. 2. С. 68), сведчыць пра тое, што, хутчэй за ўсё, ён памёр бяздзетным.

5. Асноўныя вотчынныя ўладанні знаходзіліся ў ваколіцах Вількаміра. Меў дом і ўладанні ў Вільні і Коўне (KDKW. S. 311).

6. 1463—1476 гг. — староста горадзенскі. 1464—1475 гг. — маршалак гаспадарскі[66]. 1476 г. — маршалак земскі. 1478 г. — ваявода троцкі.

8. У 1468 г. фундаваў ковенскі бернардзінскі кляштар (МРН. Т. 5. S. 202). 04.04.1471 г. зрабіў ахвяраванне ковенскім бернардзінцам (KDKW. S. 310—311).

Перад 1469 г. аднавіў фундацыю касцёла ў Дзяволтве (Тамсама. S. 301). У гэтым дакуменце назваў сябе неафітам. Гэта, несумненна, рытарычны вобраз.

У сакавіку таго ж года падаў супліку папу пра царкоўнае свята. Мяркуючы па ўсім, сам ездзіў у Рым (KDKW. S. 301).

Быў фундатарам капліцы Св. Тройцы ў Віленскай кафедры (пазней — Судзівоева), на якую 30.05.1482 г. зрабіла ахвяраванне яго пляменніца Ганна (дачка Яна Вяжэвіча і жонка Пятра Янавіча Манцігердавіча). Там і быў пахаваны (KDKW. S. 379—380).

1. Судзімонт Доргевіч

1a. Sudimund Dorgewicz, Sudimunth, Sudymunth, Судимонът Доркгевич.

2. Герб — Трубы. Карыстаўся таксама знакам негарадзельскага паходжання (AU. S. 101).

3. Упершыню згадваецца ў 1409 г. як чашнік дворны (Vitoldiana... S. 74). Памёр каля сярэдзіны XV ст.

4. Бацька — Дорг, брат Крысціна Осціка (Puzyna J. Herb złożony Pawła Holszańskiego... S. 126—128; Antoniewicz M. Manifestacja... S. 406—408). Імя і паходжанне жонкі невядомыя. Сыны — Алехна, Міхаіл Кміта, Ян (Івашка). Дачкі (імёны невядомыя) — жонкі Яна Насутавіча і Радзівіла. На думку Тэнгоўскага, гэта быў Радзівіл Осцікавіч (Tęgowski J. Ślub tajemny... S. 249—252).

[66] У дакуменце ад 22.11.1474 г. названы вышэйшым («oberste») маршалкам гаспадарскім (CEXV. T. 3. S. 212—213).

5. Вотчынныя землі — у ваколіцах Кернава. Ад Жыгімонта Кейстутавіча атрымаў Хажова, але гэта магло быць наданнем новых уладанняў па суседстве са старымі.

6. 1409 г. — чашнік дворны. 1433—1434 гг. — староста крэўскі.

7. У 1431 г. ездзіў з пасольствам у Польшчу (GStA PK, OBA 5633); у 1434 г. Жыгімонт Кейстутавіч даслаў яго на Рацёнжскі з'езд, у якім павінны былі ўдзельнічаць прадстаўнікі Ордэна і Польшчы (Acten der Ständetage Preussens... Bd. 1. S. 650).

1. Судзімонтавіч Алехна (Аляксандр)

1a. Olechno (Allexander) Sudimontowicz, Olechno Sud(z)imuntowicz, Olechno Sudymonthowicz, Олехно Судимонътович.

2. Герб — Трубы.

3. Упершыню ў крыніцах сустракаецца ў 1446 г. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 65). Памёр у 1490 г.

4. Бацька — Судзімонт Доргевіч. Жонка — Ядвіга, дачка Яна Манівідавіча, якая памерла да 1489 г. (Polaczkówna H. Stemmata Polonica... S. 245; AGAD, dok. perg., № 6725)[67]. Браты — Міхаіл Кміта, Ян (Івашка). Дачкі — Сафія (жонка князя Аляксандра Юр'евіча Гальшанскага), Аляксандра (жонка польскага пана Мікалая Цянчынскага), адна дачка з невядомым імем (жонка Станіслава Янавіча Кезгайлавіча), Ядвіга (жонка Яна Контаўтавіча, потым Станіслава Барташавіча Монтаўтавіча, а яшчэ пазней Станіслава Янавіча Кезгайлавіча), Ганна і Даратэя, што стала манашкай-бернардзінкай (Kantak K. Bernardyni polscy. T. 1. S. 266—267).

5. У спісе палонных 1454 г. ён названы панам Ратамкі (пад Менскам) (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102). У іншых дакументах сваёй асноўнай вотчынай называе Хажова (*de Chozova* — KDKW. S. 214)[68]. Валодаў маёнткамі пад Горадняй і ў Турэйску (паміж Горадняй і Наваградкам), дзе ўжо ў 1446 г.

---

[67] Магчыма, што першай жонкай Алехны Судзімонтавіча была Ядвіга з «rzecież» з Малапольшчы (Kurtyka J. Tęczyńscy... S. 566). Калі гэта так, шлюб працягваўся вельмі нядоўга, бо ў 1458 г. Алехна быў жанаты з Ядвігай Манівідаўнай.

[68] Хажоўскімі называлі сябе таксама яго дачкі, у тым ліку Аляксандра, што выйшла замуж у Польшчу (напрыклад, «domina Allexandra consors generosi Nicolai Thenczynsis heres de Chozowa») (04.03.1494 г. — AGAD, dok. perg., № 6734).

меў людзей (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 65). Іншыя важныя ўладанні (атрыманыя ад Казіміра) — Астрошыцы, Воўпа і Сямяцічы.

6. 1448—1477 гг. — падчашы дворны. 1449—1453 гг. — вышэйшы дворны пакаёвы / падкаморы. 1458—1459 гг. — староста горадзенскі. 1463—1477 гг. — намеснік полацкі. 1477—1490 гг. — ваявода віленскі. 1478—1490 гг. — канцлер ВКЛ.

7. У спісе палонных Ордэна 1454 г. згадваецца як каралеўскі дваранін (Biskup M. Spisy jeńców polskich... S. 102). У Хроніцы Быхаўца сцвярджаецца, што ён камандваў літоўскім атрадам пад Хойніцамі (Lietuvos metraštis: Bychovco kronika... P. 141—142).

Хіба што, самы ўплывовы прадстаўнік літоўскай знаці напрыканцы панавання Казіміра. У 1482 г. папа Сікст IV адрасаваў яму асобнае брэвэ па пытанні экспедыцыі супраць туркаў (Elementa ad fontium editiones. Vol. 64. P. 52).

8. 04.04.1448 г. Алехна Судзімонтавіч фундаваў касцёл у Астрошыцах (Менскі павет) (KDKW. S. 214—215). 27.04.1478 г. разам з жонкай Ядвігай фундаваў касцёл у Воўпе, што непадалёк ад Ваўкавыска (Тамсама. S. 362—363). 13.08.1490 г. зрабіў ахвяраванне на касцёл у Хажове, фундатарам якога, верагодна, з'яўляўся (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1... P. 60).

Таксама фундаваў алтар *ad capellam regie in castro Vilnensis*. Там была пахавана яго жонка, а алтарнік гэтай капліцы павінен быў клапаціцца пра яе памяць (AGAD, dok. perg., № 6725).

26.02.1448 г. — яго супліка папу (Bullarium Poloniae... 6. S. 34)[69].

1. Судзімонтавіч Міхаіл Кміта

1а. Michal Sudymonthowicz Swach, Михаил(о) Судимонътович.

2. Герб — Трубы.

3. Згадваецца ў некалькіх дакументах сярэдзіны XVст. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 56). У 1461 г. прадаў

[69] Дакумент фундацыі царквы ў Сямяцічах 1431 г. — фальсіфікат (Maroszek J. Siemiatycze... S. 10—11). Існаванне царквы ў Сямяцічах не выклікае сумненняў, але асоба фундатара не высветлена.

землю брату Алехну (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 1... P. 83). Верагодна, неўзабаве памёр.

4. Бацька — Судзімонт Доргевіч. Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

8. У 1456 г. Міхаіл Кміта з Хажова фундаваў касцёл у Сямяцічах (Maroszek J. Siemiatycze... S. 7). Пазней патранат над гэтым касцёлам перайшоў у рукі яго брата Алехны. Пра яго ўтрыманне клапацілася дачка Алехны Аляксандра, да якой перайшоў у спадчыну маёнтак у Сямяцічах (AGAD, dok. perg., № 6795).

1. Судзімонтавіч Ян (Івашка)

1а. Ивашко Судимонътович.

2. Герб — Трубы.

3. Згадваецца ў некалькіх дакументах першай паловы XVст. (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 21, 23, 56).

4. Бацька — Судзімонт Доргевіч.

5. Сведчаннем яго прыналежнасці да гэтага роду з'яўляюцца ўладанні ў Хоўхле (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 23) непадалёк ад Крэва і Хажова.

8. У 1440/1447 г. са сваіх уладанняў зрабіў ахвяраванне на касцёл у Хоўхле (Тамсама). Памёр, верагодна, неўзабаве пасля гэтага, бо ўжо клапаціўся пра сваю душу.

1. Сунгайла Ян

1а. Johannes Sungal, Hannus Sungail, Sungail, Sungeyl, Sunygal, Sungal, Sungael, Songal, Czungal.

2. У Гародлі атрымаў герб Ліс. Меў таксама дагарадзельскі знак (CEV. S. 54, 208). Герб Ліс выкарыстоўваў ужо ў снежні 1414 г. (GStA PK, OBA 2155).

3. Упершыню згадваецца ў Горадзенскай дамове з Ордэнам 1398 г. (CEV. S. 54). Памёр пасля 1433 г.

4. Звесткі пра імя і паходжанне бацькі адсутнічаюць. Жонка — Марына (паходжанне не высветлена). Сыны — Фёдар (Федзька) і Ян (Івашка). Цяжка сказаць, кім была Марына, што жыла яшчэ ў 1462 г.: яго жонкай ці жонкай яго сына.

Роднасныя сувязі з князямі Свірскімі, якія мелі той жа герб Ліс. Уладанні Сунгайлаў і Свірскіх знаходзіліся па суседстве.

5. Вотчынныя землі — у Віленскім і Свянцянскім паветах (напрыклад: Варняны, Свіраны). Іншае яго ўладанне — *Sangailsdorf*, згаданы ў *Вегеберыхтах* паміж Гарадняй і Навагрудкам (SRP. Bd. 2. S. 707—708). Меў уладанне і дом у Вільні (KDKW. S. 305).

6. 1398—1423 гг. — староста ковенскі. 1413—1433 гг. — каштэлян троцкі.

7. Уплывовы прадстаўнік знаці эпохі Вітаўта. Падтрымліваў сувязі з Ордэнам, перапісваўся з ордэнскімі ўраднікамі. У 1403, 1405, 1409, 1423, 1424 г. ездзіў з пасольствамі ў ордэнскую дзяржаву (CEV. S. 121, 172, 683—684, 973). У 1404 г. разам з Манівідам і Чупурнам пасярэднічаў пры заключэнні перамір'я паміж жамойтамі і Ордэнам (Тамсама. S. 100, 121).

Ордэнскі ўраднік паведаміў, што ў 1433 г. Сунгайла, які тут названы «старым» (*alde Czungal*), з некалькімі літоўскімі панамі ўварваўся на тэрыторыю Ордэна (GStA PK, OBA 6561).

8. 08/13.03.1462 г. удава Яна Сунгайлы ці аднаго з яго сыноў Марына зрабіла ахвяраванне на касцёл у Варнянах, фундатарамі якога былі яна і яе муж (KDKW. S. 274—275).

1. Сунгайлавіч Фёдар (Федзька)

1а. Fedko Sangalowicz.

2. Герб — Ліс (да дамовы 1434 г. прывесіў пячатку свайго бацькі) (AU. S. 101).

3. Згадваецца ў Горадзенскай дамове 1434 г. (AU. S. 105).

4. Бацька — Ян Сунгайла. Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

1. Сунгайлавіч Ян (Івашка)

1а. Ивашко Сонъкгаилович.

2. Герб — Ліс.

3. У сярэдзіне XV ст. атрымаў ад Казіміра падданых (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 20).

4. Бацька — Ян Сунгайла. Звесткі пра жонку і нашчадкаў адсутнічаюць.

1. Табар Алехна

1а. Олехъно Табарь.

2. ?

3. Згадваецца ў 1473 г. як староста эйшышкскі (Dubonis A. Įdomesni dokumentai... P. 178).

4. Паходжанне не высветлена. Магчыма, бацька віленскага біскупа Альберта і маршалка гаспадарскага Баўтрамея (Барташа) Табаравіча[70].

5. Вотчынныя землі, верагодна, знаходзіліся ў Эйшышкскай і Мерацкай[71] валасцях.

6. 1473 г. — эйшышкскі староста.

1. Табутовіч Рачка (Якуб)

1а. Raczko Thabuthovicz, Jacobus Raczko.

2. Герб — Лебедзь.

3. Згадваецца ў дамовах 1433 і 1434 г. (AU. S. 94, 104—105).

4. Бацька — Табут, стрыечны брат Гайлігіна, які ў 1413 г. у Гародлі атрымаў герб Лебедзь. Брат — Станіслаў (Станька). Сыны — Мікалай, Юндзіл, Вацлаў, Ян (пра гэтага сына вядома толькі тое, што ён быў забіты братам Мікалаем) (Glinka J. Ród Klausucia...).

5. Вотчыннае ўладанне — Ваверка (Лідскі павет). Ад Жыгімонта Кейстутавіча атрымаў уладанні ў Горадзенскім павеце (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 25...: P. 66; Wiśniewski J. Dzieje osadnictwa w powiecie sejneńskim... S. 45).

6. 1434 г. — староста бельскі.

---

[70] Верагодна, меў яшчэ аднаго сына Яна: 1) у 1473 г. сын Табара Ян у Эйшышкскай воласці ажаніўся з удавой Манцівіла (Lietuvos Metrika. Užrašymų knyga 3... P. 24); 2) у 1499 г. віленскі біскуп Альберт Табар запісаў некаторыя ўладанні «брату» Яну Алехнавічу (АЛМ. Т. 1. Вып. 2. С. 16).

[71] Пад 1473 г. у кнігах Кракаўскага ўніверсітэта адзначана, што Альберт Табар — з Мерачы (Cracovia Lithuanorum... P. 46). Пра сувязі Альберта Табара з Эйшышкамі: Fijałek J. Kościoł... S. 160.

1. [Табутовіч] Вацлаў Рачковіч

1а. Wenceslaus Raczkowicz.

2. Герб — Лебедзь.

3. У 1451 г. у Кракаўскім універсітэце атрымаў ступень бакалаўра мастацтва. У спісы ўстановы быў занесены ў 1444 г. (Cracovia Lithuanorum... P. 36). Памёр у 1462 г.

4. Бацька — Рачка Табутовіч.

